КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
16 ліпеня 1999 г. № 295-З

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 1999 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 1999 года

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2000 г. № 377-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 47, 2/152) <H10000377>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 173-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/922) <H10300173>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 220-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 80, 2/969) <H10300220>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2003 г. № 227-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 83, 2/974) <H10300227>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 мая 2005 г. № 15-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 74, 2/1112) <H10500015>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 40-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 121, 2/1137) <H10500040>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 лістапада 2005 г. № 53-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 175, 2/1144) <H10500053>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 2005 г. № 71-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 1, 2/1168) <H10500071>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2005 г. № 82-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1179) <H10500082>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2006 г. № 95-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1192) <H10600095>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 чэрвеня 2006 г. № 122-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 92, 2/1219) <H10600122> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 18 верасня 2006 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2006 г. № 147-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 111, 2/1242) <H10600147>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2006 г. № 198-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 4, 2/1292) <H10600198>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2007 г. № 234-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 146, 2/1331) <H10700234> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 15 верасня 2007 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2007 г. № 251-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 170, 2/1348) <H10700251>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 2007 г. № 281-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 264, 2/1378) <H10700281>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 снежня 2007 г. № 288-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 291, 2/1385) <H10700288>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2007 г. № 290-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 1, 2/1387) <H10700290>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2007 г. № 297-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 1, 2/1394) <H10700297>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2008 г. № 308-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 6, 2/1405) <H10800308>- Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 12 лютага 2008 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 315-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1412) <H10800315>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 317-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1414) <H10800317>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 411-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1508) <H10800411>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 451-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 277, 2/1547) <H10800451>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2009 г. № 26-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 148, 2/1578) <H10900026>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2009 г. № 42-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 173, 2/1594) <H10900042>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 105-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 15, 2/1657) <H11000105> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 21 ліпеня 2010 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 107-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 14, 2/1659) <H11000107>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2010 г. № 122-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 120, 2/1674) <H11000122>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2010 г. № 223-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 4, 2/1775) <H11000223> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 22 студзеня 2011 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 12 мая 2011 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2010 г. № 223-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 4, 2/1775) <H11000223> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 22 студзеня 2011 г. і 12 мая 2011 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 284-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 78, 2/1836) <H11100284>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 302-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 83, 2/1854) <H11100302>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2011 г. № 309-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 127, 2/1861) <H11100309>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 318-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1870) <H11100318>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 322-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1874) <H11100322> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 чэрвеня 2012 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877) <H11100325>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 334-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 2, 2/1884) <H11100334> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 красавіка 2012 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2012 г. № 335-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 4, 2/1887) <H11200335>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 г. № 349-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 10, 2/1901) <H11200349> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 25 ліпеня 2012 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 417-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.07.2012, 2/1969) <H11200417> - Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 22 верасня 2012 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2014 г. № 165-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.07.2014, 2/2163) <H11400165>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2015 г. № 241-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.01.2015, 2/2239) <H11500241>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2015 г. № 242-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.01.2015, 2/2240) <H11500242>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2015, 2/2303) <H11500305>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 307-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 24.07.2015, 2/2305) <H11500307>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 356-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.01.2016, 2/2354) <H11600356> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 27 лютага 2016 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 4 красавіка 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 356-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.01.2016, 2/2354) <H11600356> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 27 лютага 2016 г. і 4 красавіка 2016 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 2016 г. № 358-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.04.2016, 2/2356) <H11600358>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2017 г. № 53-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 05.08.2017, 2/2491) <H11700053>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2018 г. № 93-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 20.01.2018, 2/2531) <H11800093>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 131-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.07.2018, 2/2569) <H11800131> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 29 кастрычніка 2018 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 29 студзеня 2019 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 131-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.07.2018, 2/2569) <H11800131> - унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 29 кастрычніка 2018 г. і 29 студзеня 2019 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2019 г. № 171-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.01.2019, 2/2609) <H11900171>

ЗМЕСТ

ЧАСТКА ПЕРШАЯ. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
РАЗДЕЛ I. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 1. Крымінальна-працэсуальнае заканадаўства
Артыкул 1. Законы, якія вызначаюць парадак крымінальнага працэсу
Артыкул 2. Задачы крымінальна-працэсуальнага закона
Артыкул 3. Межы дзеяння крымінальна-працэсуальнага закона
Артыкул 4. Дзеянне крымінальна-працэсуальнага закона ў дачыненні да замежных грамадзян і асоб без грамадзянства
Артыкул 5. Дзеянне крымінальна-працэсуальнага закона ў часе
Артыкул 6. Растлумачэнне некаторых паняццяў і найменняў, якія змяшчаюцца ў гэтым Кодэксе
ГЛАВА 2. Задачы і прынцыпы крымінальнага працэсу
Артыкул 7. Задачы крымінальнага працэсу
Артыкул 8. Законнасць у крымінальным працэсе
Артыкул 9. Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом
Артыкул 10. Забеспячэнне абароны правоў і свабод грамадзян
Артыкул 11. Недатыкальнасць асобы
Артыкул 12. Павага гонару і годнасці асобы
Артыкул 13. Ахова асабістага жыцця

Артыкул 14. Недатыкальнасць жылля і іншых законных валоданняў
Артыкул 15. Публічнасць крымінальнага працэсу
Артыкул 16. Прэзумпцыя невінаватасці
Артыкул 17. Забеспячэнне падазраванаму, абвінавачанаму права на абарону
Артыкул 18. Усебаковае, поўнае і аб'ектыўнае даследаванне акалічнасцей крымінальнай справы
Артыкул 19. Ацэнка доказаў па ўнутраным перакананні
Артыкул 20. Роўнасць грамадзян перад законам і роўнасць абароны іх правоў і законных інтарэсаў
Артыкул 21. Мова, на якой ажыццяўляецца вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе
Артыкул 22. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону
Артыкул 23. Галоснасць судовага разбору
Артыкул 24. Ажыццяўленне правасуддзя на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў
Артыкул 25. Пракурорскі нагляд у крымінальным працэсе
ГЛАВА 3. Крымінальнае пераследаванне
Артыкул 26. Крымінальныя справы публічнага, прыватна-публічнага і прыватнага абвінавачання
Артыкул 27. Абавязак ажыццяўлення крымінальнага пераследавання
Артыкул 28. Права грамадзян на ўдзел у крымінальным пераследаванні і абвінавачанні
Артыкул 29. Акалічнасці, якія выключаюць вядзенне па крымінальнай справе
Артыкул 30. Спыненне вядзення па крымінальнай справе з вызваленнем ад крымінальнай адказнасці
РАЗДЕЛ II. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ І ІНШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ
ГЛАВА 4. Суд
Артыкул 31. Суд
Артыкул 32. Склад суда
Артыкул 33. Паўнамоцтвы суда
ГЛАВА 5. Дзяржаўныя органы і службовыя асобы, якія ажыццяўляюць крымінальнае пераследаванне
Артыкул 34. Пракурор
Артыкул 35. Начальнік следчага падраздзялення
Артыкул 36. Следчы
Артыкул 37. Органы дазнання
Артыкул 38. Начальнік органа дазнання
Артыкул 38[1]. Выключаны
Артыкул 39. Асоба, якая праводзіць дазнанне
ГЛАВА 6. Удзельнікі крымінальнага працэсу, якія абараняюць свае ці прадстаўленыя правы і інтарэсы
Артыкул 40. Падазраваны
Артыкул 41. Правы і абавязкі падазраванага
Артыкул 42. Абвінавачаны
Артыкул 43. Правы і абавязкі абвінавачанага
Артыкул 44. Абаронца
Артыкул 45. Абавязковасць удзелу абаронцы
Артыкул 46. Запрашэнне, прызначэнне абаронцы
Артыкул 47. Адмова ад абаронцы
Артыкул 48. Правы і абавязкі абаронцы
Артыкул 49. Пацярпелы
Артыкул 50. Правы і абавязкі пацярпелага
Артыкул 51. Прыватны абвінаваўца
Артыкул 52. Грамадзянскі ісцец

Артыкул 53. Правы і абавязкі грамадзянскага істца
Артыкул 54. Грамадзянскі адказчык
Артыкул 55. Правы і абавязкі грамадзянскага адказчыка
Артыкул 56. Законныя прадстаўнікі падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая здзейсніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага, грамадзянскага істца
Артыкул 57. Правы і абавязкі законнага прадстаўніка падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца
Артыкул 57[1]. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага
Артыкул 57[2]. Правы і абавязкі прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага
Артыкул 58. Прадстаўнікі пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка
Артыкул 59. Правы і абавязкі прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка
Артыкул 59[1]. Асаблівасці ажыццяўлення ўдзельнікамі крымінальнага працэсу асобных правоў і выканання абавязкаў па крымінальных справах, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі
ГЛАВА 7. Іншыя ўдзельнікі крымінальнага працэсу
Артыкул 60. Сведка
Артыкул 60[1]. Адвакат сведкі
Артыкул 61. Эксперт
Артыкул 62. Спецыяліст
Артыкул 63. Перакладчык
Артыкул 64. Паняты
ГЛАВА 8. Меры для загарантавання бяспекі ўдзельнікаў крымінальнага працэсу і іншых асоб
Артыкул 65. Абавязак органа, які вядзе крымінальны працэс, прыняць меры для загарантавання бяспекі
Артыкул 66. Меры для загарантавання бяспекі
Артыкул 67. Нераскрыццё звестак аб асобе
Артыкул 68. Вызваленне ад яўкі на судовае пасяджэнне
Артыкул 69. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў кантролю і праслухоўвання перамоў
Артыкул 70. Асабістая ахова, ахова жылля і маёмасці
Артыкул 71. Змяненне пашпартных даных і замена дакументаў
Артыкул 72. Забарона на раскрыццё і выдачу звестак
Артыкул 73. Парадак прымянення мер бяспекі
Артыкул 74. Адмена мер бяспекі
Артыкул 75. Адказнасць за невыкананне абавязкаў прымяняць меры бяспекі
ГЛАВА 9. Акалічнасці, якія выключаюць магчымасць удзелу ў вядзенні па крымінальнай справе
Артыкул 76. Адводы, самаадводы і хадайніцтвы аб выключэнні з вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 77. Акалічнасці, якія выключаюць суддзю з удзелу ў разглядзе крымінальнай справы
Артыкул 78. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе крымінальнай справы
Артыкул 79. Адвод суддзі
Артыкул 80. Парадак вырашэння адводу, заяўленага суддзі
Артыкул 81. Адвод пракурора, дзяржаўнага абвінаваўцы
Артыкул 82. Адвод следчага і асобы, якая праводзіць дазнанне
Артыкул 83. Адвод сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі)
Артыкул 84. Адвод перакладчыка

Артыкул 85. Адвод эксперта
Артыкул 86. Адвод спецыяліста
Артыкул 87. Акалічнасці, якія выключаюць удзел у вядзенні па крымінальнай справе абаронцы, адваката сведкі, прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, а таксама панятога
РАЗДЕЛ III. ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ
ГЛАВА 10. Доказы
Артыкул 88. Доказы
Артыкул 89. Акалічнасці, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе
Артыкул 90. Выяўленне прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства
Артыкул 91. Паказанні падазраванага
Артыкул 92. Паказанні абвінавачанага
Артыкул 93. Паказанні пацярпелага
Артыкул 94. Паказанні сведкі
Артыкул 95. Заключэнне эксперта
Артыкул 96. Рэчыўныя доказы
Артыкул 97. Захоўванне рэчыўных доказаў
Артыкул 98. Меры, якія прымаюцца ў адносінах да рэчыўных доказаў пры вырашэнні крымінальнай справы
Артыкул 99. Пратаколы следчых дзеянняў, судовага пасяджэння і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў
Артыкул 100. Іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі
Артыкул 101. Матэрыялы, атрыманыя ў ходзе аператыўна-вышуковай дзейнасці
ГЛАВА 11. Даказванне
Артыкул 102. Даказванне
Артыкул 103. Збіранне доказаў
Артыкул 104. Праверка доказаў
Артыкул 105. Ацэнка доказаў
Артыкул 106. Прэюдыцыя
РАЗДЕЛ IV. МЕРЫ ПРАЦЭСУАЛЬНАГА ПРЫМУСУ
ГЛАВА 12. Затрыманне
Артыкул 107. Паняцце затрымання
Артыкул 108. Затрыманне з-за непасрэдна ўзніклага падазрэння ва ўчыненні злачынства
Артыкул 109. Права грамадзян на захоп асобы, якая ўчыніла злачынства
Артыкул 110. Парадак затрымання з-за непасрэдна ўзніклага падазрэння ва ўчыненні злачынства
Артыкул 111. Затрыманне абвінавачанага для прад'яўлення абвінавачання
Артыкул 112. Затрыманне абвінавачанага на падставе пастановы органа, які вядзе крымінальны працэс, да ўзяцця яго пад варту
Артыкул 113. Затрыманне асуджанага да вырашэння пытання аб адмене ўмоўнага непрымянення пакарання, адтэрміноўкі выканання пакарання ці ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання
Артыкул 114. Вызваленне затрыманага
Артыкул 115. Паведамленне аб затрыманні
ГЛАВА 13. Меры стрымання
Артыкул 116. Паняцце і віды мер стрымання
Артыкул 117. Падставы прымянення мер стрымання
Артыкул 118. Прымяненне і тэрмін дзеяння меры стрымання ў адносінах да падазраванага
Артыкул 119. Парадак прымянення, змянення і адмены меры стрымання
Артыкул 120. Падпіска аб нявыездзе і належных паводзінах
Артыкул 121. Асабістае паручыцельства

Артыкул 122. Перадача асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пад нагляд камандавання воінскай часці
Артыкул 123. Аддача непаўналетняга пад нагляд
Артыкул 124. Заклад
Артыкул 125. Хатні арышт
Артыкул 126. Узяцце пад варту
Артыкул 127. Тэрміны ўтрымання пад вартай і парадак іх прадаўжэння
ГЛАВА 14. Іншыя меры працэсуальнага прымусу
Артыкул 128. Падставы для прымянення іншых мер працэсуальнага прымусу
Артыкул 129. Абавязацельства аб яўцы
Артыкул 130. Прывод
Артыкул 131. Часовае адхіленне ад пасады
Артыкул 132. Накладанне арышту на маёмасць
Артыкул 132[1]. Часовае абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь
Артыкул 133. Выключаны
Артыкул 134. Парадак накладання грашовага спагнання і накіравання закладу ў даход дзяржавы
РАЗДЕЛ V. ХАДАЙНІЦТВЫ І СКАРГІ
ГЛАВА 15. Хадайніцтвы
Артыкул 135. Асобы, якія маюць права заявіць хадайніцтвы
Артыкул 136. Заява хадайніцтваў
Артыкул 137. Тэрміны разгляду і вырашэння хадайніцтваў
ГЛАВА 16. Абскарджанне і апратэставанне дзеянняў і рашэнняў органа, які вядзе крымінальны працэс
Артыкул 138. Права абскарджання дзеянняў і рашэнняў органа, які вядзе крымінальны працэс
Артыкул 139. Падача скаргаў
Артыкул 140. Тэрміны падачы скаргаў і парадак іх разгляду
Артыкул 141. Прыпыненне выканання рашэння ў сувязі з падачай скаргі
Артыкул 142. Парадак разгляду скаргаў на дзеянні і рашэнні органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора
Артыкул 143. Парадак абскарджання ў суд затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту
Артыкул 144. Судовая праверка законнасці і абгрунтаванасці прымянення затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту
Артыкул 145. Парадак апратэставання і абскарджання пастановы суддзі
Артыкул 146. Скаргі на прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар
Артыкул 147. Скаргі (пратэсты) на прыгавор, прысуд, пастанову суда
Артыкул 147[1]. Судовая праверка законнасці і абгрунтаванасці прымянення меры стрымання ці вядзення працэсуальных дзеянняў па пастановах старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі
РАЗДЕЛ VI. ІНШЫЯ АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 17. Грамадзянскі іск у крымінальным працэсе
Артыкул 148. Грамадзянскія іскі, якія разглядаюцца ў крымінальным працэсе
Артыкул 149. Прад'яўленне грамадзянскага іску
Артыкул 150. Прызнанне грамадзянскім істцом
Артыкул 151. Адмова ў прызнанні грамадзянскім істцом
Артыкул 152. Прызнанне грамадзянскім адказчыкам
Артыкул 153. Прымяненне правілаў аб падставах, умовах, аб'ёме і спосабе пакрыцця шкоды
Артыкул 154. Адмова ад грамадзянскага іску

Артыкул 155. Рашэнне па грамадзянскім іску
Артыкул 156. Забеспячэнне грамадзянскага іску і выканання прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці
Артыкул 157. Выкананне прыгавораў, пастаноў (прысудаў) суда ў частцы грамадзянскага іску
ГЛАВА 18. Працэсуальныя тэрміны, працэсуальныя выдаткі
Артыкул 158. Падлік тэрмінаў
Артыкул 159. Захаванне тэрміну
Артыкул 160. Прадаўжэнне тэрміну
Артыкул 161. Аднаўленне тэрміну
Артыкул 162. Працэсуальныя выдаткі
Артыкул 163. Спагнанне працэсуальных выдаткаў
ГЛАВА 19. Злучэнне, вылучэнне і аднаўленне крымінальных спраў
Артыкул 164. Злучэнне крымінальных спраў
Артыкул 165. Вылучэнне крымінальнай справы
Артыкул 165[1]. Аднаўленне крымінальных спраў
ЧАСТКА ДРУГАЯ. ДАСУДОВАЕ ВЯДЗЕННЕ
РАЗДЕЛ VII. РАСПАЧЫНАННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ
ГЛАВА 20. Нагоды і падставы да распачынання крымінальнай справы
Артыкул 166. Нагоды да распачынання крымінальнай справы
Артыкул 167. Падставы да распачынання крымінальнай справы
Артыкул 168. Заявы грамадзян
Артыкул 169. Яўка з пакаяннем
Артыкул 170. Паведамленне службовых асоб дзяржаўных органаў, іншых арганізацый
Артыкул 171. Паведамленне ў сродках масавай інфармацыі
Артыкул 172. Абавязковасць прыняцця і разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве
Артыкул 173. Парадак і тэрміны разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве
Артыкул 173[1]. Злучэнне і вылучэнне заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх
Артыкул 173[2]. Парадак накіравання органам дазнання заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім у орган папярэдняга следства і вяртання органам папярэдняга следства заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім органу дазнання
Артыкул 173[3]. Прыпыненне і аднаўленне правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве
Артыкул 174. Рашэнні, якія прымаюцца па заявах ці паведамленнях аб злачынстве
ГЛАВА 21. Парадак распачынання крымінальнай справы
Артыкул 175. Распачынанне крымінальнай справы публічнага абвінавачання
Артыкул 176. Распачынанне крымінальнай справы прыватна-публічнага абвінавачання
Артыкул 177. Накіраванне крымінальнай справы пасля яе распачынання
Артыкул 178. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы
Артыкул 178[1]. Азнаямленне з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве
Артыкул 179. Нагляд пракурора за законнасцю распачынання крымінальнай справы
РАЗДЕЛ VIII. ПАПЯРЭДНЯЕ РАССЛЕДАВАННЕ
ГЛАВА 22. Агульныя ўмовы папярэдняга расследавання
Артыкул 180. Органы, упаўнаважаныя законам ажыццяўляць папярэдняе следства і дазнанне
Артыкул 181. Абавязковасць папярэдняга следства
Артыкул 182. Падсследнасць
Артыкул 183. Пачатак правядзення папярэдняга расследавання
Артыкул 184. Месца правядзення папярэдняга расследавання
Артыкул 185. Правядзенне папярэдняга следства следчай групай
Артыкул 186. Дзейнасць органаў дазнання па крымінальных справах

Артыкул 187. Выключаны
Артыкул 188. Выключаны
Артыкул 189. Выключаны
Артыкул 190. Тэрмін правядзення папярэдняга следства
Артыкул 191. Заканчэнне правядзення папярэдняга следства
Артыкул 192. Агульныя правілы правядзення следчых дзеянняў
Артыкул 193. Пратакол следчага дзеяння
Артыкул 194. Пасведчанне факта адмовы ад падпісання ці немагчымасці падпісання пратакола следчага дзеяння
Артыкул 195. Абавязковасць растлумачэння і забеспячэння правоў удзельнікам следчага дзеяння
Артыкул 196. Абавязковасць разгляду хадайніцтваў
Артыкул 197. Меры апекі аб дзецях, утрыманцах і па забеспячэнні захаванасці маёмасці падазраванага, абвінавачанага
Артыкул 198. Недапушчальнасць раскрыцця даных папярэдняга расследавання
Артыкул 199. Прадстаўленне аб ліквідацыі парушэнняў закона, прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства
Артыкул 200. Удзел спецыяліста
Артыкул 201. Удзел перакладчыка
Артыкул 202. Удзел панятых
Артыкул 202[1]. Прымяненне гука- і відэазапісу пры правядзенні следчых дзеянняў без удзелу панятых
ГЛАВА 23. Агляд, агляданне, следчы эксперымент
Артыкул 203. Падставы для правядзення агляду
Артыкул 204. Парадак правядзення агляду
Артыкул 205. Агляд трупа. Эксгумацыя
Артыкул 206. Агляданне
Артыкул 207. Следчы эксперымент
ГЛАВА 24. Вобшук, адабранне, накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, праслухоўванне і запіс перамоў
Артыкул 208. Падставы для правядзення вобшуку
Артыкул 209. Падставы для правядзення адабрання
Артыкул 210. Парадак правядзення вобшуку і адабрання
Артыкул 211. Асабісты вобшук
Артыкул 212. Пратакол вобшуку ці адабрання
Артыкул 213. Накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, іх агляд і адабранне
Артыкул 214. Праслухоўванне і запіс перамоў
ГЛАВА 25. Допыт, вочная стаўка, прад'яўленне для апазнання, праверка паказанняў на месцы
Артыкул 215. Месца і час правядзення допыту
Артыкул 216. Парадак выкліку на допыт
Артыкул 217. Агульныя правілы правядзення допыту
Артыкул 218. Пратакол допыту
Артыкул 219. Прымяненне гука- і відэазапісу пры допыце
Артыкул 220. Парадак допыту пацярпелага і сведкі
Артыкул 221. Асаблівасці допыту непаўналетніх пацярпелага і сведкі
Артыкул 222. Вочная стаўка
Артыкул 223. Прад'яўленне для апазнання
Артыкул 224. Парадак прад'яўлення для апазнання
Артыкул 224[1]. Правядзенне допыту, вочнай стаўкі, прад'яўленне для апазнання з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі

Артыкул 225. Праверка паказанняў на месцы
ГЛАВА 26. Прызначэнне і правядзенне экспертызы
Артыкул 226. Падставы прызначэння экспертызы
Артыкул 227. Парадак прызначэння экспертызы
Артыкул 228. Абавязковае прызначэнне і правядзенне экспертызы
Артыкул 229. Правы падазраванага, абвінавачанага, абаронцы, пацярпелага і сведкі пры прызначэнні і правядзенні экспертызы
Артыкул 230. Правядзенне экспертызы ў экспертнай установе
Артыкул 231. Правядзенне экспертызы па-за экспертнай установай
Артыкул 232. Камісійная экспертыза
Артыкул 233. Комплексная экспертыза
Артыкул 234. Атрыманне ўзораў для параўнальнага даследавання
Артыкул 235. Змяшчэнне падазраванага ці абвінавачанага ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы
Артыкул 236. Змест заключэння эксперта, паведамлення аб немагчымасці дачы заключэння
Артыкул 237. Допыт эксперта
Артыкул 238. Прад'яўленне падазраванаму, абвінавачанаму, абаронцу, пацярпеламу і сведку заключэння эксперта
Артыкул 239. Дадатковая і паўторная экспертызы
ГЛАВА 27. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага, прад'яўленне абвінавачання, допыт абвінавачанага
Артыкул 240. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага
Артыкул 241. Пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага
Артыкул 242. Абавязковасць яўкі абвінавачанага
Артыкул 243. Прад'яўленне абвінавачання
Артыкул 244. Допыт абвінавачанага
Артыкул 245. Змяненне і дапаўненне абвінавачання
ГЛАВА 28. Прыпыненне і аднаўленне папярэдняга расследавання
Артыкул 246. Падставы, парадак і тэрміны прыпынення папярэдняга следства
Артыкул 247. Дзеянні следчага пасля прыпынення папярэдняга следства
Артыкул 248. Вышук абвінавачанага
Артыкул 249. Аднаўленне прыпыненага папярэдняга расследавання
ГЛАВА 29. Спыненне і аднаўленне папярэдняга расследавання па крымінальнай справе
Артыкул 250. Падставы да спынення папярэдняга расследавання і крымінальнага пераследавання
Артыкул 251. Пастанова аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання
Артыкул 252. Дзеянні следчага, пракурора пасля спынення папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання
Артыкул 253. Абскарджанне пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання ці крымінальнага пераследавання
Артыкул 254. Аднаўленне спыненага папярэдняга расследавання крымінальнай справы
ГЛАВА 30. Заканчэнне папярэдняга расследавання з перадачай крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд
Артыкул 255. Паведамленне аб заканчэнні папярэдняга расследавання
Артыкул 256. Азнаямленне пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў з крымінальнай справай
Артыкул 257. Азнаямленне абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы з крымінальнай справай
Артыкул 258. Пратакол азнаямлення з крымінальнай справай
Артыкул 259. Заява і вырашэнне хадайніцтваў

Артыкул 260. Пастанова аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд
Артыкул 261. Дадатак да пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд
Артыкул 262. Накіраванне крымінальнай справы пракурору
ГЛАВА 31. Дзеянні і рашэнні пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд
Артыкул 263. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню пракурорам па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд
Артыкул 264. Рашэнне пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд
Артыкул 265. Змяненне пракурорам меры стрымання і спіса асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне
Артыкул 266. Накіраванне пракурорам крымінальнай справы ў суд
ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ. СУДОВАЕ ВЯДЗЕННЕ
РАЗДЕЛ IX. ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ
ГЛАВА 32. Падсуднасць
Артыкул 267. Падсуднасць крымінальных спраў раённаму (гарадскому) суду
Артыкул 268. Падсуднасць крымінальных спраў абласному, Мінскаму гарадскому судам
Артыкул 269. Падсуднасць крымінальных спраў Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь
Артыкул 270. Выключаны
Артыкул 271. Тэрытарыяльная падсуднасць крымінальных спраў
Артыкул 272. Вызначэнне падсуднасці пры аб'яднанні крымінальных спраў
Артыкул 273. Перадача крымінальнай справы ў іншы суд
Артыкул 274. Перадача крымінальнай справы з суда, якому яна падсудная, у іншы суд
Артыкул 275. Недапушчальнасць спрэчак аб падсуднасці
ГЛАВА 33. Прызначэнне і падрыхтоўка судовага разбору
Артыкул 276. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд
Артыкул 277. Пытанні, якія падлягаюць высвятленню па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд
Артыкул 277^1. Падставы для правядзення папярэдняга судовага пасяджэння
Артыкул 278. Накіраванне крымінальнай справы па падсуднасці
Артыкул 279. Спыненне вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 280. Прыпыненне вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 280^1. Вяртанне крымінальнай справы пракурору
Артыкул 280^2. Парадак правядзення папярэдняга судовага пасяджэння
Артыкул 280^3. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню на папярэднім судовым пасяджэнні пры разглядзе крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве
Артыкул 280^4. Віды рашэнняў, якія прымае суддзя па выніках папярэдняга судовага пасяджэння
Артыкул 281. Прызначэнне судовага разбору
Артыкул 282. Тэрмін пачатку судовага разбору крымінальнай справы
Артыкул 283. Падрыхтоўка судовага разбору
Артыкул 284. Меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці
Артыкул 285. Забеспячэнне бакам магчымасці азнаямлення з крымінальнай справай
ГЛАВА 34. Агульныя ўмовы судовага разбору
Артыкул 286. Непасрэднасць, вуснасць і бесперапыннасць судовага разбору
Артыкул 287. Забеспячэнне галоснасці судовага разбору
Артыкул 288. Нязменнасць складу суда пры судовым разборы крымінальнай справы
Артыкул 289. Запасны суддзя ці народны засядацель
Артыкул 290. Старшыня судовага пасяджэння

Артыкул 291. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі)
Артыкул 292. Роўнасць правоў бакоў у судовым разборы
Артыкул 293. Удзел дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым разборы
Артыкул 294. Удзел абвінавачанага ў судовым разборы
Артыкул 295. Удзел абаронцы ў судовым разборы
Артыкул 296. Удзел пацярпелага ў судовым разборы
Артыкул 297. Удзел грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка ў судовым разборы
Артыкул 298. Удзел эксперта ў судовым разборы
Артыкул 299. Удзел спецыяліста ў судовым разборы
Артыкул 300. Удзел перакладчыка ў судовым разборы
Артыкул 301. Межы судовага разбору
Артыкул 302. Адкладанне судовага разбору і прыпыненне вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 303. Спыненне вядзення па крымінальнай справе на судовым пасяджэнні
Артыкул 303[1]. Вяртанне крымінальнай справы пракурору на судовым пасяджэнні
Артыкул 304. Рашэнне пытання аб меры стрымання і іншай меры працэсуальнага прымусу
Артыкул 305. Парадак вынясення прысудаў, пастаноў на судовым пасяджэнні
Артыкул 306. Распарадак судовага пасяджэння
Артыкул 307. Меры ўздзеяння за парушэнне парадку на судовым пасяджэнні
Артыкул 308. Пратакол судовага пасяджэння
Артыкул 309. Заўвагі на пратакол судовага пасяджэння
Артыкул 310. Разгляд заўваг на пратакол судовага пасяджэння
ГЛАВА 35. Падрыхтоўчая частка судовага пасяджэння
Артыкул 311. Адкрыццё судовага пасяджэння
Артыкул 312. Праверка яўкі на судовае пасяджэнне
Артыкул 313. Растлумачэнне перакладчыку яго правоў і абавязкаў
Артыкул 314. Выдаленне сведак з залы судовага пасяджэння
Артыкул 315. Абвяшчэнне складу суда і іншых удзельнікаў судовага пасяджэння
Артыкул 316. Высвятленне асобы абвінавачанага і своечасовасці ўручэння яму копій працэсуальных дакументаў
Артыкул 317. Растлумачэнне абвінавачанаму яго правоў і абавязкаў
Артыкул 318. Растлумачэнне пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам іх правоў і абавязкаў
Артыкул 319. Растлумачэнне эксперту яго правоў і абавязкаў
Артыкул 320. Растлумачэнне спецыялісту яго правоў і абавязкаў
Артыкул 321. Растлумачэнне права адводу і вырашэнне заяўленых адводаў
Артыкул 322. Заява і вырашэнне хадайніцтваў
Артыкул 323. Вырашэнне пытання аб магчымасці разгляду крымінальнай справы ў адсутнасць каго-небудзь з удзельнікаў крымінальнага працэсу
ГЛАВА 36. Судовае следства
Артыкул 324. Пачатак судовага следства
Артыкул 325. Парадак падачы і даследавання доказаў
Артыкул 326. Скарочаны парадак судовага следства
Артыкул 327. Допыт абвінавачанага
Артыкул 328. Абвяшчэнне паказанняў абвінавачанага
Артыкул 329. Допыт пацярпелага
Артыкул 330. Допыт сведкі
Артыкул 331. Выкарыстанне абвінавачаным, пацярпелым і сведкам пісьмовых нататак і дакументаў
Артыкул 332. Асаблівасці допыту непаўналетніх пацярпелых і сведак
Артыкул 333. Абвяшчэнне паказанняў пацярпелага і сведкі
Артыкул 334. Правядзенне экспертызы на судовым пасяджэнні

Артыкул 335. Допыт эксперта
Артыкул 336. Правядзенне дадатковай ці паўторнай экспертызы
Артыкул 337. Агляд рэчыўных доказаў
Артыкул 338. Абвяшчэнне пратаколаў следчых дзеянняў і дакументаў
Артыкул 339. Парадак абвяшчэння пратаколаў і дакументаў
Артыкул 340. Агляд мясцовасці і памяшкання
Артыкул 341. Правядзенне следчага эксперыменту
Артыкул 342. Прад'яўленне для апазнання
Артыкул 343. Агляданне
Артыкул 343[1]. Правядзенне допыту, апазнання з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі
Артыкул 344. Заканчэнне судовага следства
ГЛАВА 37. Судовыя спрэчкі і апошняе слова абвінавачанага
Артыкул 345. Змест і парадак судовых спрэчак
Артыкул 346. Апошняе слова абвінавачанага
Артыкул 347. Аднаўленне судовага следства
Артыкул 348. Выдаленне суда ў дарадчы пакой для пастановы прыгавору
ГЛАВА 38. Пастанова прыгавору
Артыкул 349. Пастанова прыгавору іменем Рэспублікі Беларусь
Артыкул 350. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да прыгавору
Артыкул 351. Тайна нарады суддзяў
Артыкул 352. Пытанні, якія суд вырашае пры пастанове прыгавору
Артыкул 353. Рашэнне пытання аб наяўнасці свядомасці ў абвінавачанага
Артыкул 354. Парадак нарады суддзяў пры калегіяльным разглядзе крымінальнай справы
Артыкул 355. Віды прыгавораў
Артыкул 356. Падставы пастановы абвінаваўчага прыгавору
Артыкул 357. Падставы пастановы апраўдальнага прыгавору
Артыкул 358. Пастанова прыгавору
Артыкул 359. Уводная частка прыгавору
Артыкул 360. Апісальна-матывацыйная частка абвінаваўчага прыгавору
Артыкул 361. Рэзалютыўная частка абвінаваўчага прыгавору
Артыкул 362. Апісальна-матывацыйная частка апраўдальнага прыгавору
Артыкул 363. Рэзалютыўная частка апраўдальнага прыгавору
Артыкул 364. Іншыя пытанні, якія падлягаюць вырашэнню ў рэзалютыўнай частцы прыгавору
Артыкул 365. Абвяшчэнне прыгавору
Артыкул 366. Вызваленне абвінавачанага з-пад варты
Артыкул 367. Уручэнне копіі прыгавору
Артыкул 368. Пытанні, якія вырашае суд адначасова з пастановай прыгавору
Артыкул 369. Даванне сустрэч з абвінавачаным
РАЗДЕЛ X. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ПРЫГАВОРАЎ, ПРЫСУДАЎ, ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ НЕ ЎСТУПІЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ (АПЕЛЯЦЫЙНАЕ ВЯДЗЕННЕ)
ГЛАВА 39. Агульныя палажэнні апеляцыйнага вядзення
Артыкул 370. Права апеляцыйных абскарджання і апратэставання прыгавору
Артыкул 371. Парадак апеляцыйных абскарджання і апратэставання прыгавору
Артыкул 372. Змест апеляцыйных скаргаў ці пратэстаў
Артыкул 373. Паведамленне аб пададзеных скаргах і пратэстах
Артыкул 374. Тэрміны апеляцыйных абскарджання і апратэставання прыгавору
Артыкул 375. Аднаўленне тэрміну на апеляцыйныя абскарджанне ці апратэставанне
Артыкул 376. Наступствы падачы апеляцыйнай скаргі ці прынясення апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 377. Абскарджанне і апратэставанне прысуду (пастановы) суда першай інстанцыі

ГЛАВА 40. Падрыхтоўка да разгляду і разгляд крымінальнай справы ў судзе апеляцыйнай (другой) інстанцыі
Артыкул 378. Прадмет і межы разгляду крымінальнай справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 379. Склад суда пры разглядзе крымінальных спраў па апеляцыйных скаргах і пратэстах
Артыкул 380. Паўнамоцтвы суддзі па падрыхтоўцы пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 381. Тэрміны разгляду крымінальнай справы ў апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 382. Адкрыты разгляд крымінальных спраў у апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 383. Асобы, якія ўдзельнічаюць у разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку
Артыкул 384. Падача дадатковых матэрыялаў у апеляцыйную інстанцыю
Артыкул 385. Парадак разгляду крымінальнай справы і паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі па даследаванні і ацэнцы доказаў
Артыкул 386. Вынясенне апеляцыйнага прысуду
Артыкул 387. Межы паўнамоцтваў суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 388. Адмена ці змяненне апраўдальнага прыгавору
Артыкул 389. Падставы для адмены ці змянення прыгавору
Артыкул 390. Неадпаведнасць высноў суда, выкладзеных у прыгаворы, фактычным абставінам крымінальнай справы
Артыкул 391. Істотныя парушэнні крымінальна-працэсуальнага закона
Артыкул 392. Няправільнае прымяненне крымінальнага закона
Артыкул 393. Неадпаведнасць прызначанага судом пакарання ці прымененых іншых мер крымінальнай адказнасці цяжару злачынства і асобе абвінавачанага
Артыкул 394. Наступствы адмены прыгавору з накіраваннем крымінальнай справы на новы разгляд
Артыкул 395. Адмена абвінаваўчага прыгавору са спыненнем вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 396. Змяненне прыгавору
Артыкул 397. Змест апеляцыйнага прысуду
Артыкул 398. Судовы разбор крымінальнай справы судом першай інстанцыі пасля адмены першапачатковага прыгавору
РАЗДЕЛ XI. ВЫКАНАННЕ ПРЫГАВОРУ
ГЛАВА 41. Парадак выканання прыгавораў, прысудаў, пастаноў суда
Артыкул 399. Уступленне прыгавору, прысуду, пастановы суда ў законную сілу і накіраванне іх да выканання
Артыкул 400. Абавязковасць выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда
Артыкул 401. Парадак накіравання да выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда
Артыкул 402. Суды, якія вырашаюць пытанні, звязаныя з прывядзеннем прыгавору, прысуду, пастановы ў выкананне
Артыкул 402[1]. Суды, якія ўстанаўліваюць, прадаўжаюць, спыняюць прэвентыўны нагляд і мяняюць патрабаванні прэвентыўнага нагляду
Артыкул 402[2]. Парадак вырашэння судом пытанняў, звязаных з прывядзеннем прыгавору, прысуду, пастановы ў выкананне, а таксама ўстанаўленнем, прадаўжэннем, спыненнем прэвентыўнага нагляду і змяненнем патрабаванняў прэвентыўнага нагляду
Артыкул 403. Разгляд судом хадайніцтваў аб зняцці судзімасці і ўключэнні часу адбывання папраўчых работ у агульны працоўны стаж
РАЗДЕЛ XII. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ПРЫГАВОРАЎ, ПРЫСУДАЎ, ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ (НАГЛЯДНАЕ ВЯДЗЕННЕ)
ГЛАВА 42. Вядзенне ў наглядной інстанцыі
Артыкул 404. Пратэст у парадку нагляду на прыгавор, прысуд, пастанову суда, якія ўступілі ў законную сілу

Артыкул 405. Прыпыненне выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда
Артыкул 406. Тэрміны перагляду ў парадку нагляду прыгавораў, прысудаў, пастаноў судоў
Артыкул 407. Суды, якія разглядаюць крымінальныя справы ў парадку нагляду
Артыкул 408. Права звароту са скаргай аб пераглядзе прыгавораў, прысудаў, пастаноў
Артыкул 408[1]. Змест скаргі
Артыкул 409. Выпатрабаванне крымінальнай справы
Артыкул 410. Прыняцце рашэння па выпатрабаванай крымінальнай справе
Артыкул 411. Парадак разгляду крымінальнай справы па пратэсце
Артыкул 412. Прысуды і пастановы суда, які разглядае пратэст
Артыкул 413. Падставы да адмены ці змянення прыгавору, прысуду, пастановы суда, якія ўступілі ў законную сілу
Артыкул 414. Межы правоў наглядной інстанцыі
Артыкул 415. Абавязковасць указанняў суда, які разглядае крымінальную справу ў парадку нагляду
Артыкул 416. Змест прысуду ці пастановы суда
Артыкул 417. Разбор крымінальнай справы пасля адмены першапачатковага прыгавору
РАЗДЕЛ XIII. ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ ПА АБСТАВІНАХ, ЯКІЯ НЯДАЎНА АДКРЫЛІСЯ
ГЛАВА 43. Аднаўленне вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся нанава
Артыкул 418. Падставы аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся
Артыкул 419. Тэрміны аднаўлення вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 420. Распачынанне вядзення з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся
Артыкул 421. Дзеянні пракурора пасля заканчэння праверкі ці расследавання абставін, якія нядаўна адкрыліся
Артыкул 422. Вырашэнне судом пытання аб аднаўленні вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся
Артыкул 423. Прысуд, пастанова суда, які разглядае заключэнне пракурора
Артыкул 424. Вядзенне па крымінальнай справе пасля адмены судовых рашэнняў
РАЗДЕЛ XIV. АСАБЛІВАСЦІ ВЯДЗЕННЯ ПА АСОБНЫХ КАТЭГОРЫЯХ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ
ГЛАВА 44. Вядзенне па крымінальных справах прыватнага абвінавачання
Артыкул 425. Парадак вядзення па крымінальных справах прыватнага абвінавачання
Артыкул 426. Распачынанне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання
Артыкул 427. Паўнамоцтвы суда па крымінальнай справе прыватнага абвінавачання да пачатку судовага разбору
Артыкул 428. Судовы разбор крымінальнай справы прыватнага абвінавачання
ГЛАВА 45. Вядзенне па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых асобамі ва ўзросце да васямнаццаці гадоў
Артыкул 429. Парадак вядзення па крымінальных справах аб злачынствах непаўналетніх
Артыкул 430. Парадак судовага разбору крымінальных спраў аб злачынствах непаўналетніх
Артыкул 431. Вылучэнне крымінальнай справы ў адносінах да непаўналетняга ў асобнае вядзенне
Артыкул 432. Прымяненне затрымання і мер стрымання ў адносінах да непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага
Артыкул 433. Парадак выкліку непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага
Артыкул 434. Допыт непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага
Артыкул 435. Удзел педагога ці псіхолага
Артыкул 436. Удзел законнага прадстаўніка непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага ў папярэднім следстве

Артыкул 437. Удзел законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачанага ў судовым разборы
Артыкул 438. Выдаленне непаўналетняга абвінавачанага з залы судовага пасяджэння
Артыкул 439. Пытанні, якія вырашае суд пры пастанове прыгавору непаўналетняму абвінавачанаму
Артыкул 440. Прымяненне судом у адносінах да непаўналетняга абвінавачанага прымусовых мер выхаваўчага характару
Артыкул 441. Вызваленне судом непаўналетняга асуджанага са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай ці спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы
ГЛАВА 46. Вядзенне па крымінальнай справе аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 442. Падставы прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 443. Парадак папярэдняга следства
Артыкул 444. Заканчэнне папярэдняга следства
Артыкул 445. Прызначэнне судовага разбору
Артыкул 446. Судовы разбор
Артыкул 447. Пытанні, якія вырашае суд пры прыняцці рашэння па крымінальнай справе
Артыкул 448. Прысуд (пастанова) суда
Артыкул 449. Абскарджанне і апратэставанне прысуду (пастановы) суда
Артыкул 450. Спыненне ці змяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 451. Аднаўленне крымінальнай справы ў адносінах да асобы, да якой прыменена прымусовая мера бяспекі і лячэння
ГЛАВА 47. Паскоранае вядзенне
Артыкул 452. Парадак паскоранага вядзення
Артыкул 453. Тэрмін паскоранага вядзення
Артыкул 454. Заканчэнне паскоранага вядзення
Артыкул 455. Дзеянні пракурора па крымінальных справах паскоранага вядзення
Артыкул 456. Правядзенне папярэдняга следства
Артыкул 457. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе паскоранага вядзення, якая паступіла ў суд
Артыкул 458. Разгляд крымінальнай справы на судовым пасяджэнні
Артыкул 459. Пастанова прыгавору па справе паскоранага вядзення без судовага разбору (завочнае вядзенне)
Артыкул 459[1]. Прыгавор па справе паскоранага вядзення без судовага разбору
Артыкул 459[2]. Пярэчанні на прыгавор, пастаноўлены без судовага разбору, наступствы іх падачы
ГЛАВА 48. Вядзенне па пакрыцці шкоды, прычыненай фізічнай ці юрыдычнай асобе незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс
Артыкул 460. Шкода, якая падлягае пакрыццю
Артыкул 461. Асобы, якія маюць права на пакрыццё шкоды
Артыкул 462. Парадак пакрыцця шкоды
Артыкул 463. Пакрыццё фізічнай шкоды
Артыкул 464. Пакрыццё маёмаснай шкоды
Артыкул 465. Ліквідацыя наступстваў маральнай шкоды
Артыкул 466. Меры для аднаўлення іншых правоў
Артыкул 467. Тэрміны падачы патрабаванняў
Артыкул 468. Абскарджанне рашэння аб пакрыцці шкоды
ГЛАВА 49. Вядзенне па крымінальных справах у адносінах да асобных катэгорый асоб
Артыкул 468[1]. Катэгорыі асоб, у адносінах да якіх прымяняецца асаблівы парадак вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 468[2]. Распачынанне крымінальнай справы. Прыцягненне ў якасці падазраванага ці абвінавачанага

Артыкул 468[3]. Затрыманне і іншыя меры працэсуальнага прымусу
Артыкул 468[4]. Асаблівасці выбрання меры стрымання і правядзення асобных следчых дзеянняў
ГЛАВА 49[1]. Вядзенне па крымінальнай справе ў адносінах да падазраванага (абвінавачанага), з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[5]. Парадак вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да падазраванага (абвінавачанага), з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[6]. Парадак заявы хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[7]. Разгляд пракурорам хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[8]. Парадак складання дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[9]. Накіраванне крымінальнай справы пракурору
Артыкул 468[10]. Дзеянні пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд
Артыкул 468[11]. Парадак судовага разбору крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве
Артыкул 468[12]. Перагляд прыгавору, вынесенага ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве
ГЛАВА 49[2]. Вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе ў выпадку смерці падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага
Артыкул 468[13]. Парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе ў выпадку смерці падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага
Артыкул 468[14]. Паведамленне аб магчымасці падаць заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе
Артыкул 468[15]. Парадак разгляду заяў аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе
Артыкул 468[16]. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы ці спыненне вядзення па крымінальнай справе
Артыкул 468[17]. Удзел прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе
Артыкул 468[18]. Прызнанне памерлай асобы падазраваным, прыцягненне памерлай асобы ў якасці абвінавачанага
Артыкул 468[19]. Заканчэнне папярэдняга расследавання з перадачай крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд
Артыкул 468[20]. Рашэнне пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд
Артыкул 468[21]. Накіраванне пракурорам крымінальнай справы ў суд
Артыкул 468[22]. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд
Артыкул 468[23]. Судовае вядзенне
Артыкул 468[24]. Пастанова прыгавору. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню судом
РАЗДЕЛ XV. МІЖНАРОДНАЯ ПРАВАВАЯ ДАПАМОГА ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ НА АСНОВЕ ПРЫНЦЫПУ ЎЗАЕМНАСЦІ
ГЛАВА 50. Падстава і ўмовы аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 469. Падстава для аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці

Артыкул 470. Агульная ўмова аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 471. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкліку асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 472. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на нейкі час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 473. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы для адбывання пакарання
Артыкул 474. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб прымяненні да асобы меры стрымання з мэтай выдачы
Артыкул 475. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання
Артыкул 476. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на нейкі час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 477. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы
Артыкул 478. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе
Артыкул 479. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы асобы
Артыкул 480. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў
ГЛАВА 51. Падставы для адмовы ў аказанні і адтэрміноўкі аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 481. Агульныя падставы для адмовы ў аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 482. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на нейкі час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 483. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы для адбывання пакарання
Артыкул 484. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання
Артыкул 485. Падставы для адтэрміноўкі выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання
Артыкул 486. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на нейкі час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 487. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы
Артыкул 488. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе
Артыкул 489. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы асобы

Артыкул 490. Падставы для адмовы ці адтэрміноўкі выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў
ГЛАВА 52. Патрабаванні да просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс, дакументаў і матэрыялаў, якія дадаюцца да яе. Парадак накіравання просьбаў органаў, якія вядуць крымінальны працэс
Артыкул 491. Форма і змест просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс
Артыкул 492. Дакументы і матэрыялы, якія дадаюцца да просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс
Артыкул 493. Парадак накіравання просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс
ГЛАВА 53. Кампетэнцыя Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 494. Паўнамоцтвы Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці
Артыкул 495. Парадак прыняцця рашэння па просьбе органа замежнай дзяржавы
Артыкул 496. Парадак прыняцця рашэння аб накіраванні просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс, і яго выканання
ГЛАВА 54. Парадак выканання просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 497. Падстава для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы і парадак яе выканання
Артыкул 498. Парадак уручэння працэсуальных і іншых дакументаў на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 499. Парадак выкліку асобы ў замежную дзяржаву на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 500. Парадак перадачы на нейкі час асобы на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 501. Парадак перадачы асобы для адбывання пакарання на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 502. Парадак выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання
Артыкул 503. Парадак выдачы на нейкі час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў
Артыкул 504. Парадак выканання судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе
Артыкул 505. Парадак перадачы прадметаў на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 506. Парадак правядзення іншых працэсуальных дзеянняў на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
ГЛАВА 55. Правы і абавязкі асобы, затрыманай ці да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, і яго абаронцы
Артыкул 507. Правы і абавязкі асобы, затрыманай ці да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы
Артыкул 508. Правы і абавязкі асобы, затрыманай ці да якой прыменена мера стрымання ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы
Артыкул 509. Абаронца асобы, затрыманай ці да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, яго правы і абавязкі
ГЛАВА 56. Затрыманне асобы ці прымяненне да яе меры стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы

Артыкул 510. Затрыманне асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы
Артыкул 511. Вызваленне асобы, затрыманай на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы
Артыкул 512. Меры стрымання, якія прымяняюцца да асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, парадак іх прымянення, змянення і адмены
Артыкул 512[1]. Асаблівасці ўтрымання пад вартай
Артыкул 513. Тэрміны ўтрымання асобы пад вартай, хатнім арыштам і парадак іх прадаўжэння
Артыкул 514. Вызваленне асобы з-пад варты, хатняга арышту
ГЛАВА 57. Абскарджанне рашэнняў і дзеянняў, звязаных з аказаннем міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах. Пакрыццё шкоды, прычыненай асобе
Артыкул 515. Парадак абскарджання пастаноў аб выдачы асобы замежнай дзяржаве і аб выдачы на нейкі час асобы замежнай дзяржаве
Артыкул 516. Судовая праверка законнасці пастаноў аб выдачы асобы замежнай дзяржаве і аб выдачы на нейкі час асобы замежнай дзяржаве
Артыкул 517. Парадак абскарджання затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту
Артыкул 518. Судовая праверка законнасці затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту
Артыкул 519. Пакрыццё шкоды, прычыненай асобе, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання
РАЗДЕЛ XVI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 58. Заключныя палажэнні
Артыкул 520. Парадак увядзення ў дзеянне гэтага Кодэкса
Дадатак

ЧАСТКА ПЕРШАЯ
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

РАЗДЗЕЛ I
АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ГЛАВА 1
КРЫМІНАЛЬНА-ПРАЦЭСУАЛЬНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

Артыкул 1. Законы, якія вызначаюць парадак крымінальнага працэсу*

1. Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, грунтуючыся на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае парадак дзейнасці органаў, якія вядуць крымінальны працэс, а таксама правы і абавязкі ўдзельнікаў крымінальнага працэсу.

2. Устаноўлены Крымінальна-працэсуальным кодэксам парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе з'яўляецца адзіным і абавязковым для ўсіх органаў і службовых асоб, якія вядуць крымінальны працэс, а таксама для іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу.

3. У выпадку супярэчнасці паміж нормамі гэтага Кодэкса і Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць палажэнні Канстытуцыі.

4. Міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, у крымінальным працэсе прымяняюцца нароўні з гэтым Кодэксам.

5. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь не вызначаны парадак аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах, то пры аказанні такой дапамогі прымяняецца парадак, устаноўлены гэтым Кодэксам.

---

*Часткі артыкулаў і заўваг (за выключэннем тых, якія складаюцца з адной часткі) у гэтым Кодэксе нумаруюцца арабскімі лічбамі з кропкай, пункты частак артыкулаў – арабскімі лічбамі з дужкай.

Артыкул 2. Задачы крымінальна-працэсуальнага закона

1. Задачамі крымінальна-працэсуальнага закона з'яўляюцца замацаванне належнай прававой працэдуры ажыццяўлення крымінальнага працэсу, забеспячэнне законных правоў і інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб, якім злачынствам прычынена фізічная, маёмасная ці маральная шкода, а таксама крымінальнае пераследаванне і абарона асоб, якія падазраюцца, абвінавачваюцца ў здзяйсненні прадугледжаных крымінальным законам грамадска небяспечных дзеянняў.

2. Крымінальна-працэсуальны закон закліканы спрыяць фарміраванню ў грамадстве павагі да правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, замацаванню справядлівасці.

Артыкул 3. Межы дзеяння крымінальна-працэсуальнага закона

1. Крымінальны працэс на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вядзецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам незалежна ад месца здзяйснення злачынства, калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь не ўстаноўлена іншае.

2. Правілы гэтага Кодэкса прымяняюцца таксама пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе аб злачынстве, учыненым на тэрыторыі дыпламатычнага прадстаўніцтва і консульскай установы Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве, на паветраным, марскім або рачным суднах, якія знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь пад сцягам або з апазнавальнымі знакамі Беларусі, калі названыя судны прыпісаны да партоў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Дзеянне крымінальна-працэсуальнага закона ў адносінах да замежных грамадзян і асоб без грамадзянства

1. Вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе аб злачынствах, учыненых замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, ажыццяўляецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з правіламі гэтага Кодэкса.

2. У дачыненні да асоб, якія валодаюць правам дыпламатычнай недатыкальнасці, працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, праводзяцца толькі па іх просьбе або з іх згоды. Згода на вядзенне гэтых дзеянняў просіцца праз Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Дзеянне крымінальна-працэсуальнага закона ў часе

Пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе прымяняецца крымінальна-працэсуальны закон, які дзейнічае адпаведна ў час дазнання, папярэдняга следства, разгляду справы судом і пры вырашэнні пытанняў, якія ўзнікаюць пры выкананні прыгавораў.

Артыкул 6. Растлумачэнне некаторых паняццяў і найменняў, якія змяшчаюцца ў гэтым Кодэксе

Паняцці і назвы, якія змяшчаюцца ў гэтым Кодэксе маюць, калі няма асаблівых указанняў, наступныя значэнні:

1) блізкія сваякі – бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, а таксама муж (жонка);

2) шкода – фізічная, маёмасная або маральная шкода, якая падлягае грашоваму вымярэнню;

3) дзяржаўны абвінаваўца – пракурор, які падтрымлівае дзяржаўнае абвінавачанне і ажыццяўляе іншую працэсуальную дзейнасць пры разглядзе крымінальнай справы судом першай інстанцыі;

4) дасудовае вядзенне – паскоранае вядзенне і вядзенне з дня паступлення заявы, паведамлення аб злачынстве да перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд для разгляду па сутнасці або спынення вядзення па справе, а таксама падрыхтоўка матэрыялаў па крымінальнай справе прыватным абвінаваўцам і бокам абароны;

4[1]) дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве – пагадненне, якое заключаецца ў пісьмовым выглядзе паміж падазраваным (абвінавачаным) і пракурорам, у якім вызначаюцца абавязацельствы падазраванага (абвінавачанага) па аказанні садзейнічання папярэдняму следству і ўмовы надыходу адказнасці падазраванага (абвінавачанага) пры выкананні ім указаных абавязацельстваў;

5) іншая мясцовасць – мясцовасць, якая знаходзіцца за межамі юрысдыкцыі і месца знаходжання адпаведных органа крымінальнага пераследавання і суда або месца жыхарства іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу;

6) жыллё – памяшканне, прызначанае для пастаяннага або часовага пражывання людзей (індывідуальны дом, кватэра, пакой у гасцініцы, дача, садовы домік і да т. п.), а таксама тыя яго складаныя часткі, якія выкарыстоўваюцца для адпачынку, захоўвання маёмасці або для задавальнення іншых патрэб чалавека (балконы, зашклёныя веранды, кладоўкі і да т.п.);

7) законнае валоданне – аб'екты валодання ўласніка ці іншага правамернага валодання;

8) законныя прадстаўнікі – бацькі, усынавіцелі, апекуны, папячыцелі падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага або грамадзянскага істца; прадстаўнікі арганізацый, пад апекай якіх знаходзяцца падазраваны, абвінавачаны, асоба, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелы ці грамадзянскі ісцец;

9) абарона – працэсуальная дзейнасць, якая ажыццяўляецца бокам абароны ў мэтах абвяржэння падазрэння ці абвінавачання або змякчэння абвінавачання, забеспячэння правоў і інтарэсаў падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, а таксама асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, кампетэнтнага прымаць рашэнні аб пытаннях аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах, аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальнай справе на аснове прынцыпу ўзаемнасці (далей – просьба органа замежнай дзяржавы) або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы;

10) заяўнік – усякая асоба, якая звярнулася ў суд або орган крымінальнага пераследавання ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, за абаронай свайго рэчаіснага ці меркаванага права або паведаміла, што ёй вядома пра прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне, што рыхтуецца, здзяйсняецца ці здзейснена,;

11) апеляцыйная скарга – скарга на прыгавор, які не ўступіў у законную сілу;

12) апеляцыйны пратэст – пратэсты пракурора, дзяржаўнага абвінаваўцы аб адмене ці змяненні прыгавору, які не ўступіў у законную сілу;

12[1]) асоба, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, – асоба, якая памерла пасля ўчынення злачынства да распачынання ў адносінах да яе крымінальнай справы ці ў перыяд папярэдняга расследавання злачынства, калі ў адносінах да гэтай асобы крымінальная справа не распачыналася, але маюцца дастатковыя даныя, якія паказваюць на здзяйсненне ёй гэтага злачынства;

13) асоба, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, – асоба, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, у стане бессвядомасці або захварэла пасля ўчынення злачынства псіхічным расстройствам (захворваннем);

13[1]) асоба, якая знаходзіцца ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы, – асоба, у дачыненні да якой па абвінавачанні ва ўчыненні злачынства на тэрыторыі дзвюх і болей дзяржаў праводзіцца комплекс аператыўна-вышуковых, інфармацыйна-даведачных і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне яе месцазнаходжання, затрыманне і ўзяцце пад варту з мэтай выдачы;

14) матэрыялы – дакументы і прадметы, якія з'яўляюцца складанай часткай дасудовага ці судовага вядзення або пададзеныя для далучэння да іх;

14[1]) выключаны;

15) начальнік следчага падраздзялення – старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, начальнік следчага кіраўніцтва, начальнік следчага аддзела ці аддзялення, а таксама іншага падраздзялення органа папярэдняга следства, у распараджэнні якога знаходзяцца пытанні папярэдняга следства, і іх намеснікі;

16) начны час – прамежак часу з 22 да 6 гадзін па мясцовым часе;

17) абвінавачанне – сцверджанне аб учыненні пэўнай асобай канкрэтнага грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, зробленае ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, а таксама працэсуальная дзейнасць, якая ажыццяўляецца бокам абвінавачання;

18) прысуд – любое, акрамя прыгавору і пастановы, рашэнне, вынесенае калегіяльным складам суда пры вядзенні па крымінальнай справе;

19) орган, які вядзе крымінальны працэс, – орган крымінальнага пераследавання і суд;

20) орган дазнання – дзяржаўны орган і службовая асоба, упаўнаважаныя законам ажыццяўляць дазнанне;

21) орган папярэдняга следства – Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь, следчыя падраздзяленні органаў дзяржаўнай бяспекі;

22) орган крымінальнага пераследавання – орган дазнання, следчы, пракурор;

23) позва – пісьмовае паведамленне аб выкліку ў орган крымінальнага пераследавання або ў суд для ажыццяўлення працэсуальных дзеянняў;

24) пастанова – любое, акрамя прыгавору і прысуду, рашэнне, вынесенае суддзёй або судом ці органам крымінальнага пераследавання пры вядзенні па матэрыялах ці крымінальнай справе;

25) праваперaемнік – асоба, да якой паводле закона або пагаднення непасрэдна ад іншай асобы перайшло ўстаноўленае права;

26) папярэдняе расследаванне – вядзенне папярэдняга следства, дазнання па крымінальнай справе;

27) старшыня – суддзя, які старшынствуе пры калегіяльным разглядзе крымінальнай справы або разглядае крымінальную справу аднаасобна;

28) прадстаўнікі – блізкія сваякі, члены сям'і пацярпелага, грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка, законныя прадстаўнікі; адвакаты, прадстаўнікі прафсаюзных і іншых грамадскіх аб'яднанняў, а таксама іншыя асобы, дапушчаныя да ўдзелу ў крымінальнай справе з дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс;

28[1]) прадстаўнікі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, – блізкія сваякі, члены сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі, дапушчаныя да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе паводле пастановы (прысуду) органа, які вядзе крымінальны працэс, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

29) прывод – прымусовае дастаўленне асоб, якія не з'явіліся без уважлівых прычын на выклік орган, які вядзе крымінальны працэс;

30) прыгавор – рашэнне, вынесенае судом першай інстанцыі па пытанні аб вінаватасці ці невінаватасці абвінавачанага, аб прымяненні ці непрымяненні да яго пакарання і па іншых пытаннях, якія падлягаюць вырашэнню;

31) вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе:

вядзенне па матэрыялах – сукупнасць працэсуальных дзеянняў і працэсуальных рашэнняў, якія здзяйсняюцца і выносяцца пры прыняцці і разглядзе заяў і паведамленняў аб злачынстве і паскораным вядзенні;

вядзенне па крымінальнай справе – сукупнасць працэсуальных дзеянняў і працэсуальных рашэнняў, якія здзяйсняюцца і выносяцца па канкрэтнай крымінальнай справе;

32) пракурор – Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь і падпарадкаваныя яму пракуроры, іх намеснікі і памочнікі, начальнікі кіраўніцтваў (аддзелаў) і іх намеснікі, пракуроры кіраўніцтваў і аддзелаў, якія дзейнічаюць у межах сваёй кампетэнцыі, калі іншае не агаворана ў адпаведных артыкулах гэтага Кодэкса;

33) пратэст у парадку нагляду – пратэст упаўнаважаных гэтым Кодэксам асоб аб адмене ці змяненні прыгавору, прысуду ці пастановы, якія ўступілі ў законную сілу;

33[1]) пратэст Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, – пратэст указаных асоб аб адмене ці змяненні пастановы старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, аб прымяненні меры стрымання ці вядзенні працэсуальных дзеянняў;

34) пратакол – дакумент, у якім засведчваюцца факт вядзення, змест і вынікі працэсуальных дзеянняў, складзены ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам;

35) працэсуальныя дзеянні – прадугледжаныя гэтым Кодэксам і праведзеныя ў адпаведнасці з яго палажэннямі дзеянні ўпаўнаважаных на гэта службовых асоб, якія здзяйсняюцца ў ходзе вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе;

36) працэсуальныя рашэнні – вынесеныя ў ходзе крымінальнага працэсу правамоцнымі на тое органамі ці службовымі асобамі рашэнні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам: прыгаворы, прысуды, пастановы;

37) сваякі – асобы, якая знаходзіцца ў сваяцкай сувязі, маюць агульных продкаў да прадзеда і прабабкі, а таксама муж (жонка), блізкія сваякі мужа (жонкі);

38) санкцыя пракурора – пісьмовае рашэнне пракурора ці яго намесніка аб правядзенні працэсуальных дзеянняў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

39) бок – асобы, якія ажыццяўляюць у крымінальным працэсе на пачатках спаборнасці функцыі абвінавачання ці абароны;

40) бок абвінавачання – дзяржаўны абвінаваўца, а таксама пацярпелы (прыватны абвінаваўца), грамадзянскі ісцец і іх прадстаўнікі;

41) бок абароны – абвінавачаны, яго законныя прадстаўнікі, прадстаўнікі памерлага абвінавачанага, абаронца, грамадзянскі адказчык і яго прадстаўнікі;

42) суд – любы арганізаваны на законных падставах суд Рэспублікі Беларусь, які разглядае крымінальныя справы калегіяльна ці аднаасобна;

43) суд першай інстанцыі – суд, правамоцны вынесці па крымінальнай справе прыгавор, прысуд ці пастанову;

44) суд апеляцыйнай (другой) інстанцыі – суд, які разглядае крымінальную справу па скарзе ці пратэсце боку на прыгавор, прысуд ці пастанову суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу;

45) суд нагляднай інстанцыі – суд, які разглядае ў парадку нагляду крымінальную справу па пратэсце ўпаўнаважаных гэтым Кодэксам асоб на прыгавор, прысуд ці пастанову суда першай або апеляцыйнай інстанцыі, якія ўступілі ў законную сілу;

46) суддзя – прафесійны суддзя любога суда, народны засядацель;

46[1]) патрабаванне пракурора – абавязковае да разгляду пісьмовае патрабаванне начальніку следчага падраздзялення, начальніку органа дазнання аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства, дапушчаных органам дазнання, асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым у ходзе дазнання, папярэдняга следства;

47) крымінальная справа – адасобленае вядзенне, якое праводзіцца органам крымінальнага пераследавання і судом наконт здзяйснення грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам;

48) крымінальнае пераследаванне – працэсуальная дзейнасць, якая ажыццяўляецца органам дазнання, асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым, пракурорам, прыватным абвінаваўцам у мэтах выяўлення факта і абставін учынення прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння і асобы, якая яго здзейсніла, а таксама для забеспячэння прымянення да такой асобы пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці ці прымусовых мер бяспекі і лячэння;

49) удзельнікі крымінальнага працэсу – суддзя, пракурор, дзяржаўны абвінаваўца, начальнік следчага падраздзялення, следчы, начальнік органа дазнання, асоба, якая праводзіць дазнанне, падазраваны, абвінавачаны, абаронца, пацярпелы, прыватны абвінаваўца, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, законныя прадстаўнікі і прадстаўнікі, прадстаўнікі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі), сведка, эксперт, спецыяліст, перакладчык, паняты, а таксама асоба, затрыманая або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным следстве з мэтай выдачы, і іншыя асобы, якія прымаюць удзел у крымінальным працэсе ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

50) хадайніцтва – просьба, звернутая да органа, які вядзе крымінальны працэс;

51) прыватная скарга – скарга на прысуд суда першай інстанцыі і пастанову суддзі, якія не ўступілі ў законную сілу;

52) прыватны пратэст – пратэст пракурора на прысуд суда першай інстанцыі і пастанову суддзі, якія не ўступілі ў законную сілу;

53) члены сям'і – блізкія сваякі, іншыя сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы і іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з удзельнікам крымінальнага працэсу і вядуць з ім агульную гаспадарку.

ГЛАВА 2

ЗАДАЧЫ І ПРЫНЦЫПЫ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ

Артыкул 7. Задачы крымінальнага працэсу

1. Задачамі крымінальнага працэсу з'яўляюцца абарона асобы, яе правоў і свабод, інтарэсаў грамадства і дзяржавы шляхам хуткага і поўнага расследавання злачынстваў, грамадска небяспечных дзеянняў асоб у стане бессвядомасці, выкрывання і прыцягнення да крымінальнай адказнасці вінаватых; забеспячэнне правільнага прымянення закона з тым, каб кожны, хто здзейсніў злачынства, быў справядліва пакараны і ні адзін невінаваты не быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці і асуджаны.

2. Устаноўлены гэтым Кодэксам парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе прызначаны забяспечыць законнасць і правапарадак, папярэджанне злачынстваў, абарону ад неабгрунтаванага абвінавачання ці асуджэння, незаконнага абмежавання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, а ў выпадку абвінавачання ці асуджэння невінаватага – неадкладную і поўную яго рэабілітацыю, кампенсацыю яму фізічнай, маёмаснай і маральнай шкоды, аднаўленне парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых і іншых правоў.

Артыкул 8. Законнасць у крымінальным працэсе

1. Суд, орган крымінальнага праследавання пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе абавязаны дакладна выконваць патрабаванні гэтага Кодэкса.

2. Парушэнне закона пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе недапушчальнае і цягне за сабой устаноўленую законам адказнасць і прызнанне, што рашэнні не маюць юрыдычнай сілы.

3. Доказы, атрыманыя з парушэннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, не маюць юрыдычнай сілы і не могуць з'яўляцца падставай для прыцягнення ў якасці абвінавачанага і пастановы прысуду.

Артыкул 9. Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом

1. Правасуддзе па крымінальных справах у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе толькі суд.

2. Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства, а таксама падвергнуты крымінальнаму пакаранню інакш чым паводле прыгавора суда і ў адпаведнасці з законам.

Артыкул 10. Забеспячэнне абароны правоў і свабод грамадзян

1. Суд, орган крымінальнага пераследавання абавязаны забяспечваць абарону правоў і свабод асоб, якія ўдзельнічаюць у крымінальным працэсе, ствараць прадугледжаныя гэтым Кодэксам умовы для яе ажыццяўлення, своечасова прымаць меры для задавальнення законных патрабаванняў удзельнікаў крымінальнага працэсу.

2. Абмежаванне правоў і свабод асоб, якія ўдзельнічаюць у крымінальным працэсе, дапускаецца толькі на падставах і ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. Ніхто не можа быць прымушаны да выканання абавязкаў, не прадугледжаных гэтым Кодэксам, або да адмовы ад сваіх правоў.

4. Ніхто не павінен прымушацца да дачы паказанняў і тлумачэнняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям'і, блізкіх сваякоў.

5. У выпадку прычынення злачынствам шкоды орган крымінальнага пераследавання, суд абавязаны прыняць меры да забеспячэння грамадзянскага іску.

6. Шкода, прычыненая асобе ў выніку парушэння яе правоў і свабод пры вядзенні па крымінальнай справе, падлягае пакрыццю ў прадугледжаным законам парадку.

7. Пры наяўнасці дастатковых даных аб тым, што пацярпеламу, сведку, эксперту ці іншым удзельнікам крымінальнага працэсу, а таксама членам іх сямей, блізкім сваякам і іншым асобам, якіх яны абгрунтавана лічаць блізкімі, пагражаюць забойствам, прымяненнем насілля, знішчэннем ці пашкоджаннем маёмасці або іншымі проціпраўнымі дзеяннямі, орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прыняць прадугледжаныя законам меры для аховы жыцця, здароўя і маёмасці гэтых асоб.

Артыкул 11. Недатыкальнасць асобы

1. Ніхто не можа быць затрыманы з-за падазрэння ва ўчыненні злачынства або ўзяты пад варту, хатні арышт у якасці меры стрымання, а таксама змешчаны ў арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы пры адсутнасці на тое законных падстаў і ў парушэнне парадку, прадугледжанага гэтым Кодэксам.

2. Орган крымінальнага пераследавання, суд абавязаны неадкладна вызваліць усялякага незаконна затрыманага ці ўзятага пад варту, хатні арышт або незаконна змешчанага ў арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар, а таксама асобу, якая ўтрымліваецца пад вартай, хатнім арыштам больш за тэрмін, прадугледжаны законам ці прыгаворам.

3. Ніхто з удзельнікаў крымінальнага працэсу не павінен падвяргацца насіллю, іншаму жорсткаму ці зневажальнаму чалавечую годнасць абыходжанню, а таксама без яго згоды падвяргацца медыцынскім і іншым доследам.

4. Утрыманне асобы, у дачыненні да якой прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатні арышт, а таксама асобы, затрыманай з-за падазрэння ва

ўчыненні злачынства, павінна ажыццяўляцца ва ўмовах, якія выключаюць пагрозу іх жыццю і здароўю.

Артыкул 12. Павага гонару і годнасці асобы

1. Пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе забараняюцца дзеянні і рашэнні, якія зневажаюць гонар і прыніжаюць годнасць або ствараюць небяспеку для жыцця і здароўя ўдзельнікаў крымінальнага працэсу.

2. Наступствы і матэрыяльнае пакрыццё маральнай шкоды, прычыненай пры здзяйсненні злачынства або незаконнымі дзеяннямі службовых асоб органа, які вядзе крымінальны працэс, ліквідуюцца і праводзяцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 13. Ахова асабістага жыцця

1. Кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў. Ніхто не можа пры вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе быць пазбаўлены ўказанага права ці абмежаваны ў ім інакш як на падставах і ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

2. Вобшук, накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, іх агляд і адабранне ва ўстановах сувязі, праслухоўванне і запіс перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў могуць праводзіцца толькі ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Артыкул 14. Недатыкальнасць жылля і іншых законных валоданняў

1. Недатыкальнасць жылля і іншых законных валоданняў фізічных і юрыдычных асоб гарантуецца законам. Ніхто не мае права ўвайсці ў жыллё і іншае законнае валоданне асобы супраць яе волі.

2. Вобшук, адабранне, агляд памяшканняў, правядзенне іншых працэсуальных дзеянняў, звязаных з уварваннем у жыллё і іншыя законныя валоданні, могуць праводзіцца толькі на падставах і ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

Артыкул 15. Публічнасць крымінальнага працэсу

1. Дзяржава гарантуе кожнаму абарону ад злачынных замахаў.

2. Дзяржаўныя органы, службовыя асобы, упаўнаважаныя ажыццяўляць крымінальнае пераследаванне, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для выяўлення злачынстваў і выяўлення асоб, якія іх учынілі, распачынання крымінальнай справы, прыцягнення вінаватых да прадугледжанай законам адказнасці і стварэння ўмоў для пастановы судом законнага, абгрунтаванага і справядлівага прыгавору.

Артыкул 16. Прэзумпцыя невінаватасці

1. Асоба, абвінавачаная ў здзяйсненні злачынства, лічыцца невінаватай, пакуль яе вінаватасць у здзяйсненні злачынства не будзе даказана ў прадугледжаным гэтым Кодэксам парадку і не будзе ўстаноўлена прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу.

2. Абвінавачаны не абавязаны даказваць сваю невінаватасць. Орган крымінальнага пераследавання, суд не мае права перакладваць абавязак даказвання на абвінавачанага.

3. Сумненні ў абгрунтаванасці прад'яўленага абвінавачання тлумачацца на карысць абвінавачанага.

4. Прыгавор не можа быць заснаваны на здагадках.

Артыкул 17. Забеспячэнне падазраванаму, абвінавачанаму права на абарону

1. Падазраваны, абвінавачаны маюць права на абарону. Гэта права яны могуць ажыццяўляць як асабіста, так і з дапамогай абаронцы ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

2. Орган крымінальнага пераследавання і суд абавязаны растлумачыць падазраванаму, абвінавачанаму іх правы і забяспечыць магчымасць абараняцца ўстаноўленымі законам сродкамі і спосабамі, а таксама забяспечыць ахову іх асабістых і маёмасных правоў.

3. У прадугледжаных законам выпадках асобы, якія ажыццяўляюць вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе, абавязаны забяспечыць удзел абаронцы падазраванага, абвінавачанага, а таксама абаронцы для ажыццяўлення абароны правоў і законных інтарэсаў памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага.

4. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, юрыдычная дапамога падазраванаму, абвінавачанаму аказваецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

5. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, абарона правоў і законных інтарэсаў памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

Артыкул 18. Усебаковае, поўнае і аб'ектыўнае даследаванне абставін крымінальнай справы

1. Орган крымінальнага пераследавання абавязаны прыняць усе прадугледжаныя законам меры для ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы, сабраць доказы, якія як выкрываюць, так і апраўдваюць абвінавачанага, высветліць абставіны, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння справы, абароны правоў і законных інтарэсаў асоб, якія ўдзельнічаюць у крымінальнай справе.

2. Суд, захоўваючы аб'ектыўнасць і бесстароннасць, забяспечвае бакам абвінавачання і абароны неабходныя ўмовы для рэалізацыі іх правоў. Рашэнне аб вінаватасці або невінаватасці абвінавачанага суд выносіць толькі на аснове дакладных доказаў, усебакова, поўна і аб'ектыўна даследаваных і ацэненых.

3. Забараняецца прымус да дачы паказанняў і тлумачэнняў шляхам насілля, пагроз і іншых незаконных мер.

Артыкул 19. Ацэнка доказаў па ўнутраным перакананні

1. Суд, орган крымінальнага пераследавання ацэньваюць доказы, кіруючыся законам і сваім унутраным перакананнем, заснаваным на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні ўсіх абставін крымінальнай справы ў іх сукупнасці.

2. Ніякія доказы для органа дазнання, следчага, пракурора, суда не маюць загадзя ўстаноўленай сілы.

Артыкул 20. Роўнасць грамадзян перад законам і роўнасць абароны іх правоў і законных інтарэсаў

1. Усе асобы, якія ўдзельнічаюць у крымінальным працэсе, роўныя перад законам і маюць права без усялякай дыскрымінацыі на роўную абарону іх правоў і законных інтарэсаў.

2. Вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе ажыццяўляецца на аснове роўнасці грамадзян перад законам незалежна ад іх паходжання, сацыяльнага, службовага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, палітычных і іншых перакананняў, адносін да рэлігіі, полу, адукацыі, мовы, роду і характару заняткаў, месца жыхарства і іншых абставін.

3. Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону. Выключэнні ў парадку вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе ў адносінах да асобных катэгорый асоб устанаўліваюцца гэтым Кодэксам.

4. Кожны мае права ў ходзе вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе на юрыдычную дапамогу для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, юрыдычнай дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў.

5. У выпадках, прадугледжаных законам, юрыдычная дапамога аказваецца за кошт дзяржаўных сродкаў.

Артыкул 21. Мова, на якой ажыццяўляецца вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе

1. Вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на беларускай і (або) рускай мовах.

2. Асобам, якія не валодаюць ці недастаткова валодаюць мовай, на якой вядзецца крымінальны працэс, забяспечваецца права вусна ці пісьмова рабіць заявы, даваць тлумачэнні і паказанні, заяўляць хадайніцтвы, падаваць скаргі, знаёміцца з крымінальнай справай, выступаць у судзе на роднай мове ці на мове, якой яны валодаюць. У гэтых выпадках яны маюць права бясплатна карыстацца паслугамі перакладчыка ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. Працэсуальныя дакументы ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку ўручаюцца падазраванаму, абвінавачанаму, а таксама іншым удзельнікам крымінальнага працэсу ў перакладзе на іх родную мову ці на мову, якой яны валодаюць.

Артыкул 22. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону

1. Суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону.

2. Якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па выкананні правасуддзя недапушчальнае і цягне за сабой адказнасць паводле закона.

3. Гарантыі незалежнасці суддзяў устаноўлены Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і іншымі законамі.

Артыкул 23. Галоснасць судовага разбору

1. Разбор крымінальных спраў ва ўсіх судах адкрыты.

2. Разбор крымінальнай справы на закрытым судовым пасяджэнні дапускаецца толькі ў інтарэсах забеспячэння аховы дзяржаўных сакрэтаў і іншай тайны, што ахоўваецца законам, а таксама па справах аб злачынствах, учыненых асобамі, які не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, па справах аб палавых злачынствах і іншых справах, каб прадухіліць раскрыццё звестак аб інтымных баках жыцця асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або звестак, што зневажаюць іх годнасць, і ў выпадку, калі гэтага патрабуюць інтарэсы загарантавання бяспекі пацярпелага, сведкі ці іншых удзельнікаў

крымінальнага працэсу, а таксама членаў іх сямей ці блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх яны абгрунтавана лічаць блізкімі.

3. Разбор спраў на закрытым судовым пасяджэнні ажыццяўляецца з выкананнем усіх правілаў судовага вядзення.

4. Па справах, разгледжаных на закрытым судовым пасяджэнні, публічна абвяшчаецца толькі рэзалютыўная частка прыгавору, прысуду, пастановы суда.

Артыкул 24. Ажыццяўленне правасуддзя на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў

1. Правасуддзе ажыццяўляецца на аснове спаборнасці і роўнасці бакоў абвінавачання і абароны.

2. Функцыі абвінавачання, абароны і ажыццяўлення правасуддзя аддзелены адна ад адной і не могуць быць ускладзены на адзін і той жа орган ці адну і тую ж службовую асобу.

3. Абавязак даказвання ў судовым разборы прад'яўленага асобе абвінавачання ўскладаецца на бок абвінавачання.

4. Бакі ў судовым разборы карыстаюцца роўнымі правамі па прадстаўленні і даследаванні доказаў, заяве хадайніцтваў, выказванні меркавання аб любым пытанні, якое мае значэнне для крымінальнай справы, удзеле ў судовых спрэчках.

5. Суд стварае неабходныя ўмовы для ажыццяўлення прадстаўленых бакам правоў і выканання імі працэсуальных абавязкаў.

Артыкул 25. Пракурорскі нагляд у крымінальным працэсе

1. Пракурор ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў пры вырашэнні заяў і паведамленняў аб злачынствах, у ходзе папярэдняга расследавання, за адпаведнасцю закону судовых рашэнняў па крымінальных справах і іх выкананнем.

2. Пракурор абавязаны на ўсіх стадыях крымінальнага працэсу своечасова прымаць прадугледжаныя законам меры для ліквідацыі парушэнняў закона, ад каго б гэтыя парушэнні ні зыходзілі.

ГЛАВА 3

КРЫМІНАЛЬНАЕ ПЕРАСЛЕДАВАННЕ

Артыкул 26. Крымінальныя справы публічнага, прыватна-публічнага і прыватнага абвінавачання

1. У залежнасці ад характару і цяжару здзейсненага злачынства крымінальнае пераследаванне і абвінавачанне ў судзе ажыццяўляюцца ў публічным, прыватна-публічным парадку і ў парадку прыватнага абвінавачання.

2. Справы аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 153, 177, часткай 1 артыкула 178, часткай 1 артыкула 179, артыкулам 189, часткай 1 артыкула 202, часткай 1 артыкула 203, часткай 1 артыкула 216, артыкулам 217, часткай 1 артыкула 316 і часткай 1 артыкула 317 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца справамі прыватнага абвінавачання, распачынаюцца асобай, пацярпелай ад злачынства, а ў выпадку яе няздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любым з яе дарослых блізкіх сваякоў ці членаў сям'і, яе законным прадстаўніком ці прадстаўніком юрыдычнай асобы і вядзенне па іх падлягае спыненню ў выпадку прымірэння яе з абвінавачаным.

3. Справамі прыватнага абвінавачання з'яўляюцца таксама справы аб злачынствах, прадугледжаных часткай 1 артыкула 205, часткай 1 артыкула 209, часткай 1 артыкула 211, часткай 1 артыкула 212 і часткай 1 артыкула 214 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, учыненых у адносінах да асобы, пацярпелай ад злачынства, членамі яе сям'і, блізкімі сваякамі або іншымі асобамі, якіх яна абгрунтавана лічыць блізкімі.

4. Справы аб злачынствах, прадугледжаных часткай 1 артыкула 149, артыкуламі150–152, часткай 1 артыкула 154, артыкулам 155, часткай 1 артыкула 166, часткай 1 артыкула 167, часткай 2 артыкула 178, артыкуламі186, 188, 201, 204, часткай 1 артыкула 218, артыкуламі 219, 255, 378 і часткай 1 артыкула 384 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца справамі прыватна-публічнага абвінавачання, распачынаюцца няйнакш як па заяве асобы, пацярпелай ад злачынства, яе законнага прадстаўніка ці прадстаўніка юрыдычнай асобы.

5. Пракурор мае права распачаць крымінальную справу аб злачынствах, указаных у частках 2 і 4 гэтага артыкула, і пры адсутнасці заявы асобы, пацярпелай ад злачынства, калі яны закранаюць істотныя інтарэсы дзяржавы і грамадства ці ўчынены ў адносінах да асобы, якая знаходзіцца ў службовай ці іншай залежнасці ад абвінавачанага або з-за іншых прычын не здольная самастойна абараняць свае правы і законныя інтарэсы. Справа, распачатая пракурорам, накіроўваецца для вядзення папярэдняга следства. Вядзенне па такой справе з-за прымірэння асобы, пацярпелай ад злачынства, з абвінавачаным у ходзе папярэдняга следства спыненню не падлягае.

5[1]. Пракурор распачынае крымінальную справу аб злачынствах, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, па заяве асобы, пацярпелай ад злачынства, пры адсутнасці ў яе звестак аб асобе, якая ўчыніла злачынства. Справа, узбуджаная пракурорам, накіроўваецца для вядзення папярэдняга следства.

6. Пракурор мае права ў любы момант далучыцца да судовага разбору справы аб злачынствах, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, і падтрымліваць абвінавачанне ў судзе, калі гэтага патрабуе абарона правоў грамадзян, дзяржаўных ці грамадскіх інтарэсаў. У гэтым выпадку вядзенне па крымінальнай справе з-за прымірэння асобы, пацярпелай ад злачынства, з абвінавачаным можа быць спынена толькі пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 89 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

7. Справы аб злачынствах, за выключэннем спраў, указаных у частках 2–4 гэтага артыкула, з'яўляюцца справамі публічнага абвінавачання.

8. Прымірэнне па справах, пералічаных у частках 2–4 гэтага артыкула, дапускаецца толькі да выдалення суда ў дарадчы пакой для пастановы прыгавору.

Артыкул 27. Абавязак ажыццяўлення крымінальнага пераследавання

1. Орган крымінальнага пераследавання ў межах сваёй кампетэнцыі абавязаны распачаць крымінальную справу ў кожным выпадку выяўлення прыкмет злачынства, прыняць усе прадугледжаныя законам меры да выяўлення прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння, выкрыцця асоб, вінаватых ва ўчыненні злачынства, і іх пакарання, а таксама прыняць меры для рэабілітацыі невінаватага.

2. Орган крымінальнага пераследавання абавязаны забяспечыць пацярпеламу доступ да правасуддзя і прыняць меры для забеспячэння пакрыцця прычыненай шкоды.

3. Свае паўнамоцтвы ў крымінальным працэсе орган крымінальнага пераследавання ажыццяўляе незалежна ад якіх бы там ні было органаў і службовых асоб і ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса.

4. Уздзеянне ў якой бы там ні было форме на орган крымінальнага пераследавання з мэтай перашкоды ўсебаковаму, поўнаму і аб'ектыўнаму даследаванню абставін крымінальнай справы забараняецца і цягне за сабой устаноўленую законам адказнасць.

5. Патрабаванні органа крымінальнага пераследавання, прад'яўленыя ў адпаведнасці з законам, абавязковыя для выканання ўсімі арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі.

Артыкул 28. Права грамадзян на ўдзел у крымінальным пераследаванні і абвінавачанні

1. Пацярпелы, а ў выпадку яго няздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яго смерці – любы з яго дарослых блізкіх сваякоў ці членаў сем'і, законны прадстаўнік маюць права ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, удзельнічаць у крымінальным пераследаванні абвінавачанага. Па справах прыватнага абвінавачання асоба, якая пацярпела ад злачынства, а ў выпадку яе няздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любы з яе дарослых блізкіх сваякоў ці членаў сем'і, законны прадстаўнік маюць права выстаўляць і падтрымліваць абвінавачанне супраць асобы, якая ўчыніла злачынства. Пацярпелы ці яго праваперaемнік маюць права ў любы момант вядзення па крымінальнай справе адмовіцца ад абвінавачання.

2. Пракурор у прадугледжаных гэтым Кодэксам выпадках мае права ажыццяўляць крымінальнае пераследаванне па справах прыватнага і прыватна-публічнага абвінавачання незалежна ад пазіцыі асобы, пацярпелай ад злачынства.

3. Адмова пракурора ад абвінавачання не пазбаўляе пацярпелага, грамадзянскага істца ці іх прадстаўнікоў права падтрымліваць абвінавачанне.

Артыкул 29. Абставіны, якія выключаюць вядзенне па крымінальнай справе

1. Крымінальная справа не можа быць распачата, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 часткі 1 гэтага артыкула, а па распачатай справе вядзенне падлягае спыненню:

1) з-за адсутнасці грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам;

2) з-за адсутнасці ў дзеянні складу злачынства;

3) з-за сканчэння тэрмінаў даўнасці;

4) паводле акта амністыі, калі ён ліквідуе прымяненне пакарання за ўчыненае грамадска небяспечнае дзеянне, а таксама акта амністыі або іншага акта замежнай дзяржавы, калі яны ліквідуюць прымяненне пакарання за грамадска небяспечнае дзеянне, учыненае на яго тэрыторыі асобай, крымінальнае пераследаванне якой ажыццяўляецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па просьбе органа замежнай дзяржавы;

5) з-за прымірэння асобы, пацярпелай ад злачынства, з абвінавачаным па крымінальных справах прыватнага абвінавачання, за выключэннем выпадкаў, указаных у частцы 5 артыкула 26 гэтага Кодэкса;

6) з-за адсутнасці заявы асобы, пацярпелай ад злачынства, калі крымінальная справа распачынаецца і разглядаецца няйнакш як па яе заяве, акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткай 5 артыкула 26 гэтага Кодэкса;

7) у дачыненні да памерлага, за выключэннем выпадкаў, калі вядзенне па крымінальнай справе неабходнае для рэабілітацыі памерлага;

8) у дачыненні да асобы, аб якой ёсць прыгавор па тым жа абвінавачанні, які ўступіў у законную сілу, або прысуд (пастанова) суда аб спыненні вядзення па крымінальнай справе на той жа падставе;

9) у дачыненні да асобы, аб якой ёсць неадмененая пастанова органа дазнання, следчага, пракурора аб спыненні вядзення па крымінальнай справе па тым жа абвінавачанні ці пастанова аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы;

10) у выпадку ўступлення ў сілу закона, які ліквідуе каральнасць дзеяння;

11) пры наяўнасці падстаў для вызвалення ад крымінальнай адказнасці, прадугледжаных артыкуламі Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

12) у выпадку адмовы службовай асобы (органа) у дачы згоды на распачынанне крымінальнай справы ў адносінах да асобы, названай у пунктах 1, 2, 5 і 6 артыкула 468^2 гэтага Кодэкса, або на прыцягненне такой асобы ў якасці падазраванага ці абвінавачанага па крымінальнай справе, распачатай у дачыненні да іншых асоб або з-за факта здзейсненага злачынства;

13) у дачыненні да асобы, крымінальнае пераследаванне якой па просьбе органа крымінальнага пераследавання аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальнай справе на аснове прынцыпу ўзаемнасці (далей – просьба органа крымінальнага пераследавання), накіраванай Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь у замежную дзяржаву, ажыццяўляецца на тэрыторыі гэтай замежнай дзяржавы з-за таго ж падазрэння, абвінавачання;

14) з-за факта ўчынення грамадска небяспечнага дзеяння, на прыцягненне да крымінальнай адказнасці за якое не атрымана згода дзяржавы, якая ажыццявіла выдачу асобы, у выпадку, калі такая згода з'яўляецца абавязковай.

2. Калі абставіны, указаныя ў пунктах 1, 2, 3, 4, 10 і 11 часткі 1 гэтага артыкула, выяўляюцца на стадыі судовага разбору, суд даводзіць разбор крымінальнай справы да канца і пастанаўляе апраўдальны прыгавор у выпадках, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 часткі 1 гэтага артыкула, ці спыняе вядзенне па крымінальнай справе з вызваленнем асобы ад крымінальнай адказнасці ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 3, 4, 10 і 11 часткі 1 гэтага артыкула.

3. Спыненне вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у пунктах 3 і 4 часткі 1 гэтага артыкула, дапускаецца толькі са згоды падазраванага ці абвінавачанага. Пры адсутнасці згоды абвінавачанага на спыненне вядзення па крымінальнай справе на ўказаных падставах суд даводзіць разбор крымінальнай справы да канца і пастанаўляе абвінаваўчы прыгавор з прызначэннем пакарання і вызваленнем ад яго адбывання або апраўдальны прыгавор. У выпадках, калі падазраваны (абвінавачаны) схаваўся ад органа крымінальнага пераследавання ці суда або яго месцазнаходжанне не выяўлена, дапускаецца спыненне вядзення па крымінальнай справе з прытрымліваннем патрабаванняў артыкулаў 83 і 85 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь на падставе, указанай у пункце 3 часткі 1 гэтага артыкула, без згоды падазраванага (абвінавачанага).

4. Калі абставіны, указаныя ў пунктах 3 (пры наяўнасці асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага) і 4 часткі 1 гэтага артыкула, выяўляюцца на стадыі разгляду заявы ці паведамлення аб злачынстве, правядзенне папярэдняга следства абавязковае.

5. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы, а таксама спыненне вядзення па крымінальнай справе на падставе, прадугледжанай пунктам 7 часткі 1 гэтага артыкула, не дапускаюцца, калі блізкія сваякі, члены сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі, якія могуць быць прызнаны прадстаўнікамі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, падалі заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. У такім выпадку вядзенне па матэрыялах і крымінальнай справе працягваецца ў парадку, устаноўленым главой 492 гэтага Кодэкса.

Артыкул 30. Спыненне вядзення па крымінальнай справе з вызваленнем ад крымінальнай адказнасці

1. У адпаведнасці з артыкуламі 86, 87, 88, 89 і 118 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь суд, пракурор ці следчы са згоды пракурора мае права спыніць вядзенне па крымінальнай справе і вызваліць асобу ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з:

1) прымяненнем мер адміністрацыйнага спагнання;

2) стратай дзеяннем ці асобай грамадскай небяспекі;

3) дзейным раскаяннем;

4) прымірэннем з пацярпелым;

5) наяўнасцю падстаў, прадугледжаных артыкулам 20 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у дачыненні да ўдзельніка злачыннай арганізацыі ці банды;

6) перадачай непаўналетняга пад нагляд бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць.

2. Пракурор спыняе вядзенне па крымінальнай справе з прычыны прыняцця акта аб вызваленні асобы ад крымінальнай адказнасці ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 88^1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

3. У выпадку, прадугледжаным пунктам 1 часткі 1 гэтага артыкула, пракурор прымяняе меры адміністрацыйнага спагнання, указаныя ў пункце 1 часткі 2 артыкула 86 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

4. Спыненне вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у пунктах 1–4 часткі 1 гэтага артыкула, не дапускаецца, калі супраць гэтага пярэчыць абвінавачаны.

РАЗДЗЕЛ II

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ І ІНШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ

ГЛАВА 4

СУД

Артыкул 31. Суд

1. Суд, з'яўляючыся органам судовай улады, ажыццяўляе правасуддзе па крымінальных справах і забяспечвае іх правільнае і законнае вырашэнне.

2. Крымінальная справа павінна быць разгледжана судом па сутнасці толькі ў адпаведнасці з прававой працэдурай, устаноўленай гэтым Кодэксам, і на аснове:

1) захавання падсуднасці канкрэтных крымінальных спраў;

2) фарміравання законнага, незалежнага, кампетэнтнага і бесстаронняга складу суда;

3) адводу суддзяў;

4) аддзялення функцыі ажыццяўлення правасуддзя ад функцый абвінавачання і абароны.

Артыкул 32. Склад суда

1. Крымінальныя справы ў судзе першай інстанцыі разглядаюцца аднаасобна ці калегіяльна. Калегіяльны разгляд крымінальных спраў ажыццяўляе суд у складзе суддзі і двух народных засядацеляў.

1^1. Прыцягненне народных засядацеляў да ўдзелу ў разглядзе крымінальных спраў праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

2. Суддзя аднаасобна:

1) вырашае пытанні, звязаныя з прызначэннем і падрыхтоўкай судовага разбору;

2) разглядае справы аб злачынствах, за якія максімальнае пакаранне, прадугледжанае крымінальным законам, не перавышае дзесяць гадоў пазбаўлення волі, за выключэннем спраў аб злачынствах непаўналетніх;

3) вырашае пытанні, звязаныя з выкананнем прыгавору.

3. Калегія ў складзе суддзі і двух народных засядацеляў разглядае справы аб:

1) злачынствах, за якія крымінальным законам прадугледжваюцца пакаранне звыш дзесяці гадоў пазбаўлення волі або пакаранне смерцю;

2) злачынствах непаўналетніх.

4. Разгляд крымінальных спраў у апеляцыйнай інстанцыі ажыццяўляецца ў складзе трох суддзяў, а ў нагляднай інстанцыі – у складзе не меншым за тры суддзі.

Артыкул 33. Паўнамоцтвы суда

1. Паўнамоцтвамі суда з'яўляюцца:

1) падрыхтоўка і прызначэнне судовага разбору;

2) разгляд крымінальных спраў па першай інстанцыі;

3) разгляд крымінальных спраў у апеляцыйным парадку і ў парадку нагляду, а таксама пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

4) накіраванне прыгавору да выканання і вырашэнне пытанняў, звязаных з выкананнем прыгавору, а таксама зняцце судзімасці;

5) разгляд крымінальных спраў з прымяненнем да асобы прымусовых мер бяспекі і лячэння.

2. На дасудовых стадыях крымінальнага працэсу ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, суддзя:

1) разглядае скаргі на дзеянні і рашэнні органа крымінальнага пераследавання на падставах і ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам;

2) выносіць пастановы аб прымяненні мер стрымання ў выпадку, прадугледжаным часткай 5 артыкула 144 гэтага Кодэкса;

3) выносіць пастановы па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, аб змяшчэнні асобы ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення судова-псіхіятрычнай экспертызы.

3. Калі пры судовым разглядзе крымінальнай справы будуць выяўлены парушэнні правоў і свабод грамадзян, а таксама парушэнні закона, дапушчаныя пры вядзенні дазнання, папярэдняга следства ці пры разглядзе справы ніжэйстаячым судом, суд можа вынесці прыватны прысуд (пастанову), які падлягае разгляду ў тэрмін не пазней за адзін месяц з дня паступлення з пісьмовым паведамленнем суду аб мерах, прынятых па прыватным прысудзе (пастанове).

4. Суд мае права вынесці прыватны прысуд (пастанову) і ў іншых выпадках, калі прызнае гэта неабходным.

ГЛАВА 5

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ І СЛУЖБОВЫЯ АСОБЫ, ЯКІЯ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЦЬ КРЫМІНАЛЬНАЕ ПЕРАСЛЕДАВАННЕ

Артыкул 34. Пракурор

1. Пракурор з'яўляецца службовай асобай, якая ў межах сваёй кампетэнцыі ажыццяўляе ад імя дзяржавы крымінальнае пераследаванне і падтрымлівае дзяржаўнае абвінавачанне ў судзе.

2. Пры ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў па наглядзе за выкананнем законаў на стадыях дасудовага вядзення пракурор незалежны і падпарадкоўваецца толькі закону.

3. Пракурор мае права прад'явіць да абвінавачанага ці да асобы, якая нясе матэрыяльную адказнасць за яе дзеянні, іск у абарону інтарэсаў пацярпелага, які знаходзіцца ў бездапаможным стане або з-за іншых прычын не здольны самастойна скарыстацца правам, якое яму належыць , а таксама прад'яўляць і падтрымліваць іскі ў інтарэсах юрыдычных асоб і дзяржавы.

4. У ходзе дасудовага вядзення па матэрыялах пракурор мае права знаёміцца з матэрыяламі аператыўна-вышуковай дзейнасці, што адносяцца да заявы ці паведамлення, якія разглядаюцца, даваць абавязковыя для выканання пісьмовыя ўказанні органам, упаўнаважаным законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, аб правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, распачынаць крымінальную справу і адмаўляць у яе распачынанні. У ходзе дасудовага вядзення па крымінальнай справе пракурор прымае крымінальную справу да свайго вядзення і даследуе яе ў поўным аб'ёме, карыстаючыся пры гэтым паўнамоцтвамі следчага, ці даручае яе расследаванне ніжэйстаячаму пракурору або адпаведнаму органу папярэдняга следства; ажыццяўляе нагляд за расследаваннем крымінальных спраў органам дазнання, следчым; ажыццяўляе працэсуальнае кіраўніцтва і нагляд за дзейнасцю ніжэйстаячага пракурора, які праводзіць папярэдняе следства.

5. Ажыццяўляючы нагляд за захаваннем законнасці пры правядзенні папярэдняга следства і дазнання, пракурор упаўнаважаны:

1) пісьмова выпатрабаваць ад ніжэйстаячага пракурора, следчага і органа дазнання для праверкі крымінальныя справы, матэрыялы, а таксама правяраць крымінальныя справы, матэрыялы;

2) забіраць у органа дазнання і перадаваць органу папярэдняга следства любую крымінальную справу ў адпаведнасці з падследнасцю, вызначанай артыкулам 182 гэтага Кодэкса;

3) асабіста праводзіць асобныя следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні пры санкцыянаванні прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў вядзенні следчага, а таксама папярэдняе следства ў поўным аб'ёме ў мэтах забеспячэння ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы;

3[1]) заключыць з падазраваным (абвінавачаным) дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве;

4) даручаць па распачатай і прынятай да свайго вядзення крымінальнай справе папярэдняе следства групе пракураў, а па ўзгадненні з начальнікамі адпаведных следчых падраздзяленняў – групе следчых, узначальваць гэту следчую групу;

5) адмяняць незаконныя і неабгрунтаваныя пастановы ніжэйстаячага пракурора, начальніка следчага падраздзялення, следчага, органа дазнання і асобы, якая праводзіць дазнанне, за выключэннем пастаноў, указаных у частцы 5 артыкула 35 і частцы 6 артыкула 38 гэтага Кодэкса, а таксама не адпаведныя закону ўказанні ніжэйстаячага пракурора, начальніка органа дазнання;

6) даваць ніжэйстаячаму пракурору, органам, упаўнаважаным законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, асобе, якая праводзіць дазнанне, абавязковыя для выканання пісьмовыя ўказанні аб правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, а таксама аб прымяненні мер для забеспячэння бяспекі;

7) прымяняць, змяняць ці адмяняць меры стрымання па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў вядзенні ў ніжэйстаячага пракурора, працягваць тэрмін утрымання пад вартай, хатняга арышту, тэрмін разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве і тэрмін папярэдняга расследавання;

8) спыняць вядзенне па крымінальнай справе ў выпадках і на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

9) вырашаць адводы і самаадводы;

10) вырашаць скаргі на рашэнні і дзеянні ніжэйстаячага пракурора, следчага, органа дазнання і асобы, якая праводзіць дазнанне, за выключэннем скаргаў, разгляд якіх аднесены законам да кампетэнцыі суда;

11) выносіць патрабаванне начальніку следчага падраздзялення, органу дазнання аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства, дапушчаных органам дазнання, асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым у ходзе дазнання, папярэдняга следства;

12) адхіляць ніжэйстаячага пракурора ад правядзення папярэдняга следства з перадачай справы іншаму пракурору ці ў орган папярэдняга следства, калі ім былі дапушчаны парушэнні законнасці пры яе расследаванні, або прыняць крымінальную справу да свайго вядзення і праводзіць папярэдняе следства асабіста;

13) звяртацца ў адпаведныя органы з прадстаўленнем аб пазбаўленні імунітэту ад крымінальнага пераследавання асоб, якія ім карыстаюцца, калі гэтыя асобы падлягаюць прыцягненню па крымінальнай справе ў якасці абвінавачанага па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў яго вядзенні ;

14) санкцыянаваць прымяненне меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, закладу; правядзенне вобшуку, агляду жылля ці іншага законнага валодання; накладанне арышту на маёмасць, якая знаходзіцца ў жыллі і іншым законным валоданні, на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні і іх адабранне; патрабаванне аб прадстаўленні інфармацыі і адабранне дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам; праслухоўванне і запіс перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў; выманне трупа з месца пахавання (эксгумацыя); змяшчэнне падазраванага ці абвінавачанага, які не ўтрымліваецца пад вартай, у судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар; адхіленне падазраванага ці абвінавачанага ад пасады ў выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам;

15) вяртаць крымінальныя справы ніжэйстаячаму пракурору, следчаму са сваімі пісьмовымі ўказаннямі, абавязковымі для выканання, аб правядзенні дадатковых следчых і іншых працэсуальных дзеянняў у выпадках і парадку, прадугледжаных пунктам 3 часткі 1 артыкула 264 гэтага Кодэкса, а таксама пры адмене пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання;

16) накіроўваць крымінальныя справы ніжэйстаячаму пракурору, следчаму для правядзення дадаткова папярэдняга расследавання ў выпадку перадачы судом крымінальнай справы пры пастанове апраўдальнага прыгавору за недаказанасцю ўдзелу абвінавачанага ва ўчыненні злачынства, калі асоба, якая ўчыніла злачынства, застаецца нявызначанай, або для правядзення папярэдняга расследавання ў выпадку перадачы судом крымінальнай справы, вылучанай у асобнае вядзенне ў сувязі з апраўданнем абвінавачанага па асобных пунктах абвінавачання за недаказанасцю ўдзелу ва ўчыненні злачынства ці пры апраўданні аднаго з некалькіх абвінавачаных за недаказанасцю ўдзелу ва ўчыненні злачынства;

17) накіроўваць крымінальную справу ў суд;

18) выкарыстоўваць іншыя паўнамоцтвы, дадзеныя яму гэтым Кодэксам.

6. Пры судовым разборы крымінальнай справы пракурор як дзяржаўны абвінаваўца мае права заяўляць адводы і хадайніцтвы; выказваць меркаванні наконт дзеянняў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд; падаваць суду доказы; змяняць складзены следчым спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне; даваць органу дазнання і органу папярэдняга следства абавязковыя для іх даручэнні па забеспячэнні падачы суду доказаў; прымяняць меры працэсуальнага прымусу для забеспячэння падачы суду доказаў; удзельнічаць у судовым даследаванні доказаў крымінальнай справы; змяняць, дапаўняць і прад'яўляць новае абвінавачанне; адмовіцца ад абвінавачання; пратэставаць супраць дзеянняў іншага боку; пярэчыць супраць неабгрунтаваных дзеянняў старшыні ці дзеянняў старшыні, якія ўяўляюцца яму няправільнымі на іншых падставах; патрабаваць унясення ў пратакол судовага пасяджэння пярэчанняў на ўказаныя дзеянні і запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; карыстацца іншымі паўнамоцтвамі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам.

7. Удзельнічаючы ў судовым разборы, пракурор абавязаны выконваць парадак судовага пасяджэння, падпарадкоўвацца законным распараджэнням старшыні, прымаць меры для забеспячэння яўкі на судовае пасяджэнне пацярпелых і сведак, у дачыненні да якіх

прыняты меры для загарантавання бяспекі, новых сведак, неабходнасць у допыце якіх узнікла пры рэалізацыі дзяржаўным абвінаваўцам паўнамоцтваў у парадку, прадугледжаным часткай 5 артыкула 302 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадках, прадугледжаных часткай 1 артыкула 302 гэтага Кодэкса, і выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

8. Пры судовым разборы крымінальных спраў удзел пракурора ў якасці дзяржаўнага абвінаваўцы абавязковы па справах публічнага і прыватна-публічнага абвінавачання, а таксама па справах прыватнага абвінавачання, распачатых пракурорам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 455 гэтага Кодэкса.

Артыкул 35. Начальнік следчага падраздзялення

1. Начальнік следчага падраздзялення абавязаны ажыццяўляць працэсуальнае кіраўніцтва расследаваннем, кантроль за законнасцю і своечасовасцю дзеянняў следчых па расследаванні злачынстваў, прымаць меры для найбольш поўнага, усебаковага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы.

2. Начальнік следчага падраздзялення мае права:

1) распачынаць крымінальныя справы;

2) даручаць вядзенне папярэдняга следства следчаму;

3) правяраць матэрыялы праверак па заявах ці паведамленнях аб злачынстве, якія знаходзяцца на разглядзе ў следчага, правяраць крымінальныя справы;

4) даваць указанні следчаму аб правядзенні папярэдняга следства, прыцягненні ў якасці абвінавачанага, кваліфікацыі злачынства і аб'ёме абвінавачання, накіраванні справы, правядзенні асобных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, прымяненні мер стрымання, а таксама аб прымяненні мер для забеспячэння бяспекі;

5) перадаваць крымінальную справу ад аднаго следчага іншаму, з аднаго следчага падраздзялення ў іншае;

6) накіроўваць, а таксама вяртаць органам дазнання для правядзення праверкі заявы ці паведамленні аб злачынстве, якія не змяшчаюць дастатковыя дадзеныя, што ўказваюць на прыкметы злачынства, з пісьмовым указаннем абставін, якія падлягаюць высвятленню ў ходзе праверкі, і магчымых мер для іх выяўлення;

7) асабіста разглядаць заявы ці паведамленні аб злачынстве і прымаць па ім рашэнні ў парадку, устаноўленым артыкулам 174 гэтага Кодэкса;

8) даручаць правядзенне папярэдняга следства па крымінальнай справе некалькім следчым, а таксама ўдзельнічаць у правядзенні папярэдняга следства па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў вядзенні следчага, і асабіста праводзіць папярэдняе следства, карыстаючыся пры гэтым паўнамоцтвамі следчага;

9) даручаць памочніку начальніка следчага падраздзялення правяраць крымінальныя справы і даваць па ім указанні;

10) вырашаць адводы і самаадводы;

11) вырашаць скаргі на рашэнні і дзеянні следчага, ніжэйстаячага начальніка следчага падраздзялення, за выключэннем скаргаў, разгляд якіх аднесены законам да кампетэнцыі суда;

12) працягваць тэрмін праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама ўстанаўліваць тэрмін правядзення такой

праверкі ў выпадку адмены пастаноў аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы або аб распачынанні крымінальнай справы;

13) працягваць тэрмін папярэдняга следства;

14) працягваць тэрмін паскоранага вядзення;

15) адмяняць незаконныя і неабгрунтаваныя пастановы следчага і ніжэйстаячага начальніка следчага падраздзялення, а таксама незаконныя і неабгрунтаваныя ўказанні ніжэйстаячага начальніка следчага падраздзялення, памочніка начальніка следчага падраздзялення;

16) уносіць пракурору прадстаўленне аб адмене незаконных і неабгрунтаваных пастаноў ніжэйстаячага пракурора, органа дазнання, а таксама санкцыянаваных пракурорам пастаноў ніжэйстаячага начальніка следчага падраздзялення, следчага.

3. Указанні памочніка начальніка следчага падраздзялення абскарджваюцца начальніку, які даў даручэнне аб праверцы крымінальнай справы.

4. Указанні па матэрыялах праверкі, якія знаходзяцца на разглядзе ў следчага, крымінальнай справе даюцца ў пісьмовай форме і абавязковыя да выканання. Пры нязгодзе следчага з атрыманымі ўказаннямі ён мае права, не прыпыняючы іх выканання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 4 артыкула 36 гэтага Кодэкса, падаць справу вышэйстаячаму начальніку следчага падраздзялення з пісьмовым выказваннем сваіх пярэчанняў.

5. Старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, пры правядзенні папярэдняга следства следчым Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па крымінальных справах аб цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынствах, а таксама аб злачынствах, прадугледжаных часткай 1 артыкула 210, часткамі 1 і 2 артыкула 211, часткай 1 артыкула 235, часткай 3 артыкула 281, часткай 3 артыкула 282, часткай 2 артыкула 424, часткай 2 артыкула 425, часткамі 1 і 2 артыкула 426, часткай 2 артыкула 427, артыкуламі 428, 429, часткай 1 артыкула 431, часткамі 1 і 2 артыкула 432 і часткай 1 артыкула 455 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, мае права вынесці матываваную пастанову аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, закладу; аб правядзенні вобшуку, агляду жылля ці іншага законнага валодання; аб накладанні арышту на маёмасць, якая знаходзіцца ў жыллі і іншым законным валоданні, на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні і іх адабранні, адабранні дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам; аб праслухоўванні і запісе перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў; аб выманні трупа з месца пахавання (эксгумацыі); аб змяшчэнні падазраванага ці абвінавачанага, які не ўтрымліваецца пад вартай, у судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар; аб адхіленні падазраванага ці абвінавачанага ад пасады ў выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам. Указаная пастанова не патрабуе санкцыянавання пракурорам. Копія адпаведнай пастановы на працягу 24 гадзін накіроўваецца Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь ці асобе, якая выконвае яго абавязкі.

6. Не дапускаюцца прымяненне меры стрымання ці правядзенне працэсуальных дзеянняў на падставе пастановы старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, у выпадку папярэдняй адмовы Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, у дачы санкцыі на іх прымяненне (правядзенне).

Артыкул 36. Следчы

1. Следчым з'яўляецца службовая асоба Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнай бяспекі, якая ажыццяўляе ў межах сваёй кампетэнцыі, прадугледжанай гэтым Кодэксам, папярэдняе следства.

2. Следчы абавязаны прымаць усе меры для ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы; ажыццяўляць крымінальнае пераследаванне асобы, у дачыненні да якой сабраны дастатковыя доказы, якія ўказваюць на ўчыненне ёй злачынства, шляхам прыцягнення яе ў якасці абвінавачанага, прад'яўлення абвінавачання, прымянення ў дачыненні да яе ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам меры стрымання, перадачы справы пракурору для накіравання ў суд. Следчы таксама абавязаны прыняць меры для загарантавання бяспекі ўдзельнікаў крымінальнага працэсу і іншых асоб у адпаведнасці з патрабаваннямі главы 8 гэтага Кодэкса.

3. Усе рашэнні аб правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў следчы прымае самастойна, за выключэннем выпадкаў, калі законам прадугледжана атрыманне санкцыі пракурора ці пісьмовага ўзгаднення рашэння органа крымінальнага пераследавання аб затрыманні асобы, і нясе поўную адказнасць за іх законнае і своечасовае выкананне.

4. У выпадку нязгоды следчага з указаннямі пракурора аб правядзенні дадатковых следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, дадзенымі ў парадку, устаноўленым пунктам 3 часткі 1 артыкула 264 гэтага Кодэкса, следчы мае права падаць справу вышэйстаячаму пракурору з пісьмовым выказваннем сваіх пярэчанняў, пры гэтым прыпыніўшы выкананне ўказанняў пракурора. У гэтым выпадку пракурор ці адмяняе ўказанне ніжэйстаячага пракурора, ці накіроўвае справу для правядзення папярэдняга следства начальніку следчага падраздзялення для перадачы яе іншаму следчаму. Пры нязгодзе следчага з указаннямі начальніка следчага падраздзялення аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, кваліфікацыі злачынства і аб'ёме абвінавачання следчы мае права, прыпыніўшы выкананне гэтых указанняў, абскардзіць іх вышэйстаячаму начальніку следчага падраздзялення. У гэтым выпадку вышэйстаячы начальнік следчага падраздзялення ці адмяняе ўказанне, ці накіроўвае справу ніжэйстаячаму начальніку следчага падраздзялення для арганізацыі правядзення папярэдняга следства.

5. Следчы мае права распачынаць крымінальную справу і адмаўляць у яе распачынанні, спыняць і прыпыняць папярэдняе следства па крымінальнай справе, праводзіць папярэдняе следства і выконваць усе следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, а таксама дазваляць сустрэчы блізкім сваякам і членам сям'і з асобай, якая ўтрымліваецца пад вартай, хатнім арыштам, па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў яго вядзенні.

6. Следчы мае права ў любы момант прыняць крымінальную справу да свайго вядзення і прыступіць да яе расследавання, не чакаючы правядзення органамі дазнання безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, прадугледжаных артыкулам 186 гэтага Кодэкса.

7. Следчы па крымінальнай справе, якую ён расследуе, а таксама пры разглядзе заявы ці паведамлення аб злачынстве мае права знаёміцца з матэрыяламі аператыўна-вышуковай дзейнасці, якія адносяцца да справы, што расследуецца, заявы ці паведамлення, якія разглядаюцца, даваць даручэнні органам, упаўнаважаным законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, аб правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і патрабаваць ад іх садзейнічання ў правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў. Такія даручэнні следчага даюцца ў пісьмовай форме і з'яўляюцца для ўказаных органаў абавязковымі для выканання.

8. Пастановы следчага, вынесеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, абавязковыя да выканання ўсімі арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі.

Артыкул 37. Органы дазнання

1. Дзяржаўнымі органамі і службовымі асобамі, упаўнаважанымі законам ажыццяўляць дазнанне, з'яўляюцца:

1) Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, спецыяльныя падраздзяленні па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю органаў унутраных спраў, тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў;

2) органы дзяржаўнай бяспекі – па крымінальных справах, аднесеных законам да іх вядзення;

3) ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь і транспартных войсках Рэспублікі Беларусь – ваенныя каменданты ваенных камендатур у зоне адказнасці ваенных камендатур, камандзіры воінскіх часцей, злучэнняў, начальнікі ваенных навучальных устаноў, арганізацый Узброеных сіл і гарнізонаў, а ў іншых войсках і воінскіх фарміраваннях – камандзіры воінскіх часцей, злучэнняў, начальнікі органаў пагранічнай службы, начальнікі ваенных устаноў – па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых асобамі, на якіх распаўсюджваецца статус ваеннаслужачых, а таксама аб злачынствах, учыненых грамадзянскім персаналам Узброеных сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў у сувязі з выкананнем імі службовых (працоўных) абавязкаў у размяшчэнні воінскай часці, злучэння, ваеннай навучальнай установы, установы, арганізацыі Узброеных сіл, гарнізона, органа пагранічнай службы ці яго падраздзялення;

4) начальнікі ўстаноў, якія выконваюць крымінальныя пакаранні ў выглядзе пазбаўлення волі, следчых ізалятараў – па крымінальных справах аб злачынствах супраць устаноўленага парадку нясення службы, учыненых супрацоўнікамі гэтых устаноў, а таксама па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых у размяшчэнні ўказаных устаноў;

5) Дзяржаўны пагранічны камітэт Рэспублікі Беларусь, тэрытарыяльныя органы пагранічнай службы, орган пагранічнай службы спецыяльнага прызначэння – па крымінальных справах аб злачынствах, якія выяўляюцца пры выкананні ўскладзеных на органы пагранічнай службы задач;

6) мытныя органы – па крымінальных справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 228–231, а таксама артыкуламі 328^1 і 333^1 (у частцы незаконнага перамяшчэння тавараў праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

7) органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь – па крымінальных справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 225–227, 233–235, 237–245 і 261^1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама аб карупцыйных злачынствах у эканамічнай сферы;

8) органы дзяржаўнага пажарнага нагляду – па крымінальных справах аб пажарах і парушэнні проціпажарных правілаў;

9) капітаны марскіх ці рачных суднаў, камандзіры паветраных суднаў, якія знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь, – па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых на суднах;

10) кіраўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь – па справах аб злачынствах, учыненых у межах тэрыторыі дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў.

2. На органы дазнання і службовых асоб у залежнасці ад характару злачынства ўскладаюцца:

1) прыём, рэгістрацыя і разгляд заяў і паведамленняў аб любым учыненым злачынстве, злачынстве, якое ўчыняецца, і злачынстве, якое рыхтуецца;

2) правядзенне праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве, прыняцце па іх рашэння ў адпаведнасці з артыкулам 174 гэтага Кодэкса;

3) вядзенне безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў па крымінальных справах;

4) правядзенне неабходных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і прыняцце іншых мер у мэтах выяўлення злачынстваў і выяўлення асоб, якія іх учынілі, а таксама папярэджанне і стрыманне злачынстваў.

Артыкул 38. Начальнік органа дазнання

1. Начальнікам органа дазнання з'яўляюцца кіраўнік органа дазнання, а таксама кожная са службовых асоб, пералічаных у частцы 1 артыкула 37 гэтага Кодэкса.

2. Начальнік органа дазнання арганізуе правядзенне неабходных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і прыняцце іншых мер у мэтах выяўлення злачынстваў і выяўлення асоб, якія іх учынілі, папярэджання і стрымання злачынстваў; забяспечвае поўнае і якаснае правядзенне безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў па крымінальных справах і матэрыялах да перадачы іх следчаму і выкананне даручэнняў следчага, суда, указанняў пракурора; ажыццяўляе кантроль за законнасцю і своечасовасцю дзеянняў асоб, якія праводзяць дазнанне.

3. Указанні пракурора, даручэнні следчага па крымінальных справах, дадзеныя ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, абавязковыя да выканання начальнікам органа дазнання. Абскарджанне гэтых указанняў вышэйстаячаму пракурору не прыпыняе іх выканання.

4. Па заявах і паведамленнях аб злачынстве, якія паступілі ў орган дазнання, начальнік органа дазнання даручае правядзенне праверкі, а па распачатых ім крымінальных справах даручае правядзенне дазнання; правярае матэрыялы праверак і крымінальныя справы, што знаходзіцца ў вядзенні ў асоб, якія праводзяць дазнанне, дае ім указанні аб правядзенні неабходных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і працэсуальных дзеянняў; перадае матэрыялы праверак і справы ад адной упаўнаважанай ім асобы, якая праводзіць дазнанне, іншай; даручае правядзенне дазнання некалькім асобам; мае права асабіста правесці дазнанне, у тым ліку прыняўшы справу да свайго вядзення; накіроўвае ў органы папярэдняга следства заявы ці паведамленні аб злачынствах разам з матэрыяламі праверкі па іх пры наяўнасці дастатковых даных, якія ўказваюць на прыкметы злачынства, у адпаведнасці з пунктам 3 часткі 1 артыкула 174 гэтага Кодэкса, а таксама крымінальныя справы.

5. Начальнік органа дазнання зацвярджае пастановы аб распачынанні ці аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб прыпыненні ці аб аднаўленні правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве, аб злучэнні ці вылучэнні заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх, аб затрыманні, аб прадаўжэнні тэрміну разгляду заяў і паведамленняў аб злачынствах, аб правядзенні вобшуку, агляду жылля ці іншага законнага валодання, адабрання, аб накладанні

арышту на маёмасць, паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, аб часовым абмежаванні права на выезд з Рэспублікі Беларусь, аб праслухоўванні і запісе перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў, аб адабранні дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам, аб прыводзе, аб прымяненні, змяненні і адмене меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, закладу, аб этапаванні, аб прымяненні мер для забеспячэння бяспекі. Акрамя таго, Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь – дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў пісьмова ўзгадняюць рашэнне органа крымінальнага пераследавання аб затрыманні асобы ў выпадку, прадугледжаным часткай 11 артыкула 108 гэтага Кодэкса.

6. Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, пры правядзенні папярэдняга следства па крымінальных справах следчым Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з падсследнасцю, вызначанай артыкулам 182 гэтага Кодэкса, а таксама пры правядзенні дазнання па крымінальных справах мае права вынесці матываваную пастанову аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, закладу; аб правядзенні вобшуку, агляду жылля ці іншага законнага валодання; аб накладанні арышту на маёмасць, якая знаходзіцца ў жыллі і іншым законным валоданні, на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні і іх адабранні, адабранні дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам; аб праслухоўванні і запісе перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў; аб выманні трупа з месца пахавання (эксгумацыі); аб змяшчэнні падазраванага ці абвінавачанага, які не ўтрымліваецца пад вартай, у судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар; аб адхіленні падазраванага ці абвінавачанага ад пасады ў выпадках і парадку, устаноўленых гэтым Кодэксам. Указаная пастанова не патрабуе санкцыянавання пракурорам. Копія адпаведнай пастановы на працягу 24 гадзін накіроўваецца Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь ці асобе, якая выконвае яго абавязкі.

7. Не дапускаюцца прымяненне меры стрымання ці правядзенне працэсуальных дзеянняў на падставе пастановы старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, у выпадку папярэдняй адмовы Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, у дачы санкцыі на іх прымяненне (правядзенне).

8. Указанні начальніка органа дазнання асобе, якая праводзіць дазнанне, даюцца ў пісьмовай форме і абавязковыя да выканання. Абскарджанне атрыманых указанняў пракурору не прыпыняе іх выканання.

9. Намеснікі начальніка органа дазнання валодаюць правамі і нясуць абавязкі, прадугледжаныя гэтым артыкулам.

Артыкул 38[1]. Выключаны

Артыкул 39. Асоба, якая праводзіць дазнанне

1. Асобай, якая праводзіць дазнанне, з'яўляецца службовая асоба, упаўнаважаная органам дазнання на ажыццяўленне дасудовага вядзення.

2. Асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права самастойна праводзіць безадкладныя следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні, выносіць працэсуальныя рашэнні, за выключэннем выпадкаў, калі гэтым Кодэксам прадугледжаны зацвярджэнне іх начальнікам органа дазнання, ці санкцыя пракурора, ці пісьмовае ўзгадненне рашэння органа крымінальнага пераследавання аб затрыманні асобы.

3. Асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права звярнуцца да начальніка органа дазнання з матываваным хадайніцтвам аб дачы ім даручэння адпаведным работнікам органа дазнання аб правядзенні безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

4. Пастановы асобы, якая праводзіць дазнанне, вынесеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса, па матэрыялах і крымінальных справах, якія знаходзяцца ў яго вядзенні, абавязковыя да выканання ўсімі арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі.

ГЛАВА 6

УДЗЕЛЬНІКІ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ, ЯКІЯ АБАРАНЯЮЦЬ СВАЕ ЦІ ПРАДСТАЎЛЕНЫЯ ПРАВЫ І ІНТАРЭСЫ

Артыкул 40. Падазраваны

1. Падазраваным з'яўляецца фізічная асоба, затрыманая з-за падазрэння ва ўчыненні злачынства, або асоба, у дачыненні да якой орган крымінальнага пераследавання ўзбудзіў крымінальную справу ці вынес пастанову аб:

1) прымяненні меры стрымання да вынясення пастановы аб прыцягненні яе ў якасці абвінавачанага;

2) прызнанні падазраваным.

2. Орган крымінальнага пераследавання не мае права ўтрымліваць затрыманага ў становішчы падазраванага больш за 72 гадзіны, а асобу, да якой прыменена мера стрымання, – больш за дзесяць сутак з моманту абвяшчэння падазраванаму пастановы аб прымяненні меры стрымання, уключаючы тэрмін затрымання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткамі 4 і 5 артыкула 108 гэтага Кодэкса.

3. Да моманту сканчэння тэрмінаў, устаноўленых часткай 2 гэтага артыкула, орган крымінальнага пераследавання абавязаны вызваліць падазраванага з-пад варты, адмяніць прымененую ў адносінах да яго меру стрымання або вынесці пастанову аб прыцягненні яго ў якасці абвінавачанага.

4. Орган крымінальнага пераследавання, суд абавязаны вызваліць падазраванага з-пад варты і адмяніць прымененую ў адносінах да яго меру стрымання да сканчэння тэрмінаў, устаноўленых часткай 2 гэтага артыкула, у выпадку прызнання падазрэння неабгрунтаваным.

5. Асоба перастае знаходзіцца ў становішчы падазраванага з моманту вынясення пастановы аб прыцягненні яе ў якасці абвінавачанага або аб спыненні крымінальнага пераследавання.

Артыкул 41. Правы і абавязкі падазраванага

1. Падазраваны мае права на абарону. Орган крымінальнага пераследавання абавязаны забяспечыць падазраванаму магчымасць ажыццяўляць права на абарону, якое належыць яму, усімі законнымі сродкамі і спосабамі.

2. Падазраваны мае права:

1) ведаць, у чым ён падазраецца, і атрымаць копію пастановы аб распачынанні супраць яго крымінальнай справы ці аб прызнанні яго падазраваным, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

2) неадкладна пасля затрымання ці абвяшчэння пастановы аб прымяненні меры стрымання атрымаць ад органа крымінальнага пераследавання, які ажыццявіў затрыманне ці вынес пастанову аб прымяненні меры стрымання, пісьмовае паведамленне аб належных яму правах, прадугледжаных гэтым артыкулам;

3) неадкладна пасля затрымання ці абвяшчэння пастановы аб прымяненні меры стрымання атрымаць ад органа крымінальнага пераследавання копію пастановы ці пратакола аб затрыманні, копію пастановы аб прымяненні меры стрымання, а таксама копію пастановы аб распачынанні крымінальнай справы, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

4) апавясціць праз орган крымінальнага пераследавання членаў сям'і ці блізкіх сваякоў аб месцы свайго ўтрымання пад вартай;

5) у выпадку затрымання ці прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту атрымаць да пачатку першага допыту ў якасці падазраванага юрыдычную кансультацыю адваката за кошт сродкаў мясцовага бюджэту;

6) мець абаронцу ці некалькіх абаронцаў з моманту абвяшчэння яму пастановы органа крымінальнага пераследавання аб распачынанні супраць яго крымінальнай справы, аб прызнанні яго падазраваным, аб затрыманні ці пастановы аб прымяненні меры стрымання; адмовіцца ад абаронцы і абараняць сябе самастойна; спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы;

7) бесперашкодна размаўляць са сваім абаронцам сам-насам і канфідэнцыяльна без абмежавання колькасці і працягласці размоў;

8) па яго хадайніцтве быць дапытаным пры ўдзеле абаронцы не пазней за 24 гадзіны з моманту фактычнага затрымання;

9) даваць паказанні ці адмовіцца ад дачы паказанняў;

10) падаваць доказы;

11) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

12) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

13) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

14) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заявы і заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння запісаў аб абставінах, якія, паводле меркавання, павінны быць адзначаны;

15) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс;

16) адклікаць пададзеную ім ці яго абаронцам скаргу;

17) абскардзіць у суд затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт ці прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы;

18) атрымліваць пакрыццё шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, а ў выпадку, калі падазрэнне не пацвердзілася, быць рэабілітаваным.

3. У парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, правы непаўналетняга падазраванага ажыццяўляюць разам з ім ці замест яго яго законныя прадстаўнікі.

4. Падазраваны абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа крымінальнага пераследавання;

2) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа крымінальнага пераследавання;

3) удзельнічаць у следчых і іншых працэсуальных дзеяннях, калі гэта прызнана неабходным органам крымінальнага пераследавання.

Артыкул 42. Абвінавачаны

1. Абвінавачаным з'яўляецца фізічная асоба, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага. Па справах прыватнага абвінавачання абвінавачаным з'яўляецца фізічная асоба, адносна якой суд прыняў заяву аб учыненым ёю злачынстве.

2. Асоба, у дачыненні да якой уступіў у законную сілу прыгавор суда, называецца:

1) асуджаным, калі прыгавор поўнасцю ці часткова абвінаваўчы;

2) апраўданым, калі прыгавор поўнасцю апраўдальны.

3. Асоба перастае знаходзіцца ў становішчы абвінавачанага з моманту спынення крымінальнага пераследавання або надыходу абставін, указаных у частцы другой гэтага артыкула.

Артыкул 43. Правы і абавязкі абвінавачанага

1. Абвінавачаны мае права на абарону. Орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны забяспечыць абвінавачанага магчымасць ажыццяўляць права на абарону, якое належыць яму, усімі законнымі сродкамі і спосабамі.

2. Абвінавачаны мае права:

1) ведаць, у чым ён абвінавачваецца, для чаго пры прад'яўленні абвінавачання неадкладна атрымаць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, копію пастановы аб прыцягненні яго ў якасці абвінавачанага, а па справах прыватнага абвінавачання – копію заявы асобы, пацярпелай ад злачынства, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

2) з моманту азнаямлення з пастановай аб прымяненні меры стрымання або з пастановай аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага атрымаць ад органа крымінальнага пераследавання пісьмовае паведамленне аб яго правах;

3) апавясціць праз орган, які вядзе крымінальны працэс, членаў сям'і ці блізкіх сваякоў аб месцы свайго ўтрымання пад вартай;

4) у выпадку прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту атрымаць да пачатку першага допыту ў якасці абвінавачанага юрыдычную кансультацыю адваката за кошт сродкаў мясцовага бюджэту;

5) мець абаронцу ці некалькіх абаронцаў з моманту прад'яўлення абвінавачання, адмовіцца ад абаронцы і абараняць сябе самастойна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы;

6) бесперашкодна размаўляць са сваім абаронцам сам-насам і канфідэнцыяльна без абмежавання колькасці і працягласці размоў;

7) па яго хадайніцтве быць дапытаным пры ўдзеле абаронцы;

8) даваць паказанні ці адмовіцца ад дачы паказанняў;

9) падаваць доказы;

10) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

11) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

12) заяўляць аб сваёй вінаватасці ці невінаватасці;

13) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

14) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны;

15) абскардзіць у суд затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт ці прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы;

16) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія цікавяць яго, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

17) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў крымінальнай справы, а таксама ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – у пасяджэннях судоў апеляцыйнай і наглядной інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе з-за абставін якія нядаўна адкрыліся;

18) патрабаваць унясення ў пратакол судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць на яго заўвагі;

19) выступаць у судовых спрэчках з прамовай і рэплікай у выпадку, калі ён самастойна ажыццяўляе сваю абарону;

20) прамаўляць апошняе слова на судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі;

21) атрымліваць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць яго правы і інтарэсы, а таксама копіі іскавай заявы, заявы па справах прыватнага абвінавачання, аб прымяненні меры стрымання і іншых мер працэсуальнага прымусу, аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай і хатняга арышту ў якасці меры стрымання, аб перадачы крымінальнай справы пракурору для

накіравання ў суд, аб прызначэнні судовага разбору, копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці нагляднай інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

22) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда;

23) адклікаць пададзеную ім ці яго абаронцам скаргу;

24) мірыцца з пацярпелым па справах прыватнага абвінавачання;

25) падаваць пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, які вядзе крымінальны працэс, ці якія сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

26) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

27) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку або старшыні;

28) атрымліваць пакрыццё шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, а ў выпадку, калі абвінавачанне не пацвердзілася, быць рэабілітаваным.

3. У парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, правы непаўналетняга абвінавачанага ажыццяўляюць яго законныя прадстаўнікі разам з ім ці замест яго.

4. Абвінавачаны абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) удзельнічаць у следчых і іншых працэсуальных дзеяннях, калі гэта прызнана неабходным органам, які вядзе крымінальны працэс.

Артыкул 44. Абаронца

1. Абаронцам у крымінальным працэсе з'яўляецца асоба, якая на падставах і ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, ажыццяўляе абарону правоў і законных інтарэсаў падазраванага ці абвінавачанага і аказвае ім юрыдычную дапамогу, а таксама ажыццяўляе абарону правоў і законных інтарэсаў памерлага падазраванага, абвінавачанага.

2. У якасці абаронцаў у крымінальным працэсе ўдзельнічаюць адвакаты, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь або грамадзянамі іншых дзяржаў у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Па хадайніцтве абвінавачанага прысудам (пастановай) суда ў якасці абаронцы ў судзе можа быць дапушчаны адзін з блізкіх сваякоў або законных прадстаўнікоў абвінавачанага.

4. Абаронца ўдзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе з моманту вынясення ў дачыненні да асобы пастановы аб распачынанні крымінальнай справы, а таксама з моманту фактычнага затрымання, прымянення меры стрымання, прызнання асобы падазраваным ці прад'яўлення абвінавачання. Адна і тая жа асоба не можа быць абаронцам двух падазраваных ці абвінавачаных, калі інтарэсы абароны аднаго з іх супярэчаць інтарэсам іншых.

5. Абаронца павінен неадкладна пасля прыняцця на сябе абароны паведаміць аб гэтым органу, які вядзе крымінальны працэс.

6. Адвакат, які дае юрыдычную кансультацыю падазраванаму ці абвінавачанаму ў выпадках, прадугледжаных пунктам 5 часткі 2 артыкула 41 і пунктам 4 часткі 2 артыкула 43 гэтага Кодэкса, лічыцца на гэты час іх абаронцам. Са згоды падазраванага ці абвінавачанага ён можа ўдзельнічаць у якасці абаронцы ў далейшым вядзенні па крымінальнай справе.

7. Удзел абаронцы ў вядзенні па крымінальнай справе спыняецца, калі:

1) падазраваны ці абвінавачаны скасавалі з ім дагавор або іншым чынам спынілі паўнамоцтвы абаронцы;

1[1]) прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага скасаваў з ім дагавор або іншым чынам спыніў паўнамоцтвы абаронцы;

2) орган, які вядзе крымінальны працэс, вызваліў абаронцу ад удзелу ў вядзенні па крымінальнай справе з прычыны выяўлення абставін, якія выключаюць яго ўдзел у крымінальным працэсе ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса;

3) орган, які вядзе крымінальны працэс, прыняў адмову падазраванага ці абвінавачанага ад абаронцы.

8. Падазраваны ці абвінавачаны не могуць спыніць паўнамоцтвы прызначанага абаронцы, які ўдзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, у выпадках, калі ўдзел абаронцы з'яўляецца абавязковым ці калі орган, які вядзе крымінальны працэс, не прыняў заяўленую імі адмову ад абаронцы.

Артыкул 45. Абавязковасць удзелу абаронцы

1. Удзел абаронцы ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе абавязковы, калі:

1) аб гэтым хадайнічаюць падазраваны ці абвінавачаны;

2) падазраваны ці абвінавачаны з'яўляюцца непаўналетнімі;

3) падазраваны ці абвінавачаны не валодаюць мовай, на якой адбываецца вядзенне па крымінальнай справе, або з'яўляюцца непісьменнымі;

4) падазраваны ці абвінавачаны з прычыны фізічных ці псіхічных недахопаў не могуць самастойна ажыццяўляць сваё права на абарону;

5) асоба падазраецца ці абвінавачваецца ва ўчыненні асабліва цяжкага злачынства;

6) паміж інтарэсамі падазраваных ці абвінавачаных ёсць супярэчнасці і калі хаця б адзін з іх мае абаронцу;

7) падазраваным ці абвінавачаным заяўлена хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве;

8) прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага хадайнічае аб удзеле абаронцы.

2. У выпадках, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, удзел абаронцы забяспечваецца з моманту вынясення пастановы аб распачынанні крымінальнай справы ў адносінах да асобы, з моманту фактычнага затрымання, прымянення меры стрымання, прызнання асобы падазраваным ці прад'яўлення абвінавачання, а таксама з моманту заявы падазраваным (абвінавачаным) хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве.

3. Калі пры наяўнасці абставін, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, абаронца не запрошаны самім падазраваным, абвінавачаным, іх законнымі прадстаўнікамі, а таксама іншымі асобамі па яго даручэнні або прадстаўнікамі памерлага падазраванага, абвінавачанага, органы крымінальнага пераследавання і суд абавязаны забяспечыць удзел абаронцы ў вядзенні па крымінальнай справе. У гэтых выпадках пастанова органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суддзі ці прысуд суда аб удзеле абаронцы з'яўляюцца абавязковымі для тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў.

Артыкул 46. Запрашэнне, прызначэнне абаронцы

1. Асобы, пералічаныя ў частках 2 і 3 артыкула 44 гэтага Кодэкса, удзельнічаюць у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці абаронцаў:

1) па запрашэнні падазраванага, абвінавачанага, іх законных прадстаўнікоў, а таксама блізкіх сваякоў, іншых асоб па просьбе ці са згоды падазраванага ці абвінавачанага. Орган, які вядзе крымінальны працэс, не мае права рэкамендаваць каму б там ні было запрашэнне пэўнага абаронцы;

11) па запрашэнні прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага;

2) па прызначэнні праз тэрытарыяльную калегію адвакатаў па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс.

2. Прызначэнне абаронцы праз тэрытарыяльную калегію адвакатаў па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, праводзіцца:

1) па хадайніцтве падазраванага ці абвінавачанага;

11) па хадайніцтве прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага;

2) для атрымання падазраваным ці абвінавачаным юрыдычнай кансультацыі за кошт сродкаў мясцовага бюджэту да пачатку першага допыту ў выпадку затрымання ці прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту;

3) у выпадку, калі ўдзел абаронцы ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе абавязковы, а падазраваны ці абвінавачаны не маюць абаронцы;

4) пры немагчымасці для выбранага падазраваным ці абвінавачаным абаронцы ўдзельнічаць у першым допыце падазраванага ці абвінавачанага не пазней за 24 гадзіны з моманту набыцця становішча абаронцы, або няяўцы яго ў той жа тэрмін для ўдзелу ў правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, або немагчымасці для абаронцы ўдзельнічаць у вядзенні па крымінальнай справе больш за трое сутак, калі падазраваны ці абвінавачаны настойваюць на яго ўдзеле ў вядзенні па крымінальнай справе.

3. У выпадках, прадугледжаных пунктам 4 часткі 2 гэтага артыкула, орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны прапанаваць падазраванаму, абвінавачанаму запрасіць іншага абаронцу.

4. Пры ўдзеле ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе некалькіх абаронцаў працэсуальнае дзеянне, у якім у адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса прадугледжаны ўдзел абаронцы, не можа быць прызнана незаконным з-за ўдзелу ў ім не ўсіх абаронцаў адпаведнага падазраванага, абвінавачанага.

5. Няяўка абаронцы, які ўдзельнічае ў вядзенні па справе, належным чынам апавешчанага аб месцы і часе правядзення следчага дзеяння з удзелам падазраванага ці абвінавачанага, не з'яўляецца перашкодай для правядзення следчага дзеяння пры наяўнасці пісьмовай згоды падазраванага ці абвінавачанага, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 2–5 часткі 1 артыкула 45 гэтага Кодэкса.

6. Абаронца ў пацвярджэнне сваіх паўнамоцтваў прадстаўляе органу, які вядзе крымінальны працэс, наступныя дакументы:

1) адвакат – пасведчанне адваката і ордар на права ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе;

2) блізкія сваякі абвінавачанага– дакументы, якія пацвярджаюць блізкія адносіны з абвінавачаным;

3) законныя прадстаўнікі – дакументы, якія пацвярджаюць іх права прадстаўляць інтарэсы абвінавачанага.

7. Загадчык юрыдычнай кансультацыі ці старшыня тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў абавязаны неадкладна, але не пазней за 24 гадзіны з моманту звароту вылучыць адваката для ажыццяўлення абароны падазраванага, абвінавачанага.

8. Загадчык юрыдычнай кансультацыі ці савет калегіі адвакатаў, а таксама орган, які вядзе крымінальны працэс, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа, у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, мае права вызваліць падазраванага, абвінавачанага поўнасцю ці часткова ад аплаты юрыдычнай дапамогі. У выпадку такога вызвалення загадчыкам юрыдычнай кансультацыі ці саветам калегіі адвакатаў аплата працы абаронцы праводзіцца за кошт сродкаў калегіі адвакатаў, у іншых выпадках – за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

9. Аплата працы адваката, які ўдзельнічае ў дазнанні, папярэднім следстве, судовым разборы па прызначэнні без заключэння дагавору з кліентам, праводзіцца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пакрыццё расходаў у гэтым выпадку можа быць ускладзена на асуджанага ці яго законнага прадстаўніка, за выключэннем расходаў па аплаце працы адваката пры дачы ім кансультацыі за кошт сродкаў мясцовага бюджэту падазраванаму ці абвінавачанаму да пачатку першага допыту.

Артыкул 47. Адмова ад абаронцы

1. Падазраваны ці абвінавачаны мае права адмовіцца ад абаронцы ў любы момант вядзення па матэрыялах ці крымінальнай справе. Адмова ад абаронцы прымаецца органам, які вядзе крымінальны працэс, толькі ў тым выпадку, калі яна заяўлена падазраваным ці абвінавачаным па ўласнай ініцыятыве і добраахвотна, а ў выпадку затрымання ці прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту – у прысутнасці абаронцы, з якім заключаны дагавор ці які прызначаны праз тэрытарыяльную калегію адвакатаў.

2. Не прымаецца адмова ад абаронцы ў сувязі з адсутнасцю сродкаў для аплаты юрыдычнай дапамогі ці іншымі абставінамі, якія сведчаць пра вымушаную адмову ад абаронцы.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс, не прымае заяўленую падазраваным ці абвінавачаным адмову ад абаронцы ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 2–7 часткі 1 артыкула 45 гэтага Кодэкса.

4. Адмова ад абаронцы не пазбаўляе падазраванага, абвінавачанага права ў далейшым хадайнічаць аб удзеле абаронцы ў вядзенні па крымінальнай справе. Калі хадайніцтва заяўлена да пачатку судовых спрэчак, яно падлягае задавальненню.

Артыкул 48. Правы і абавязкі абаронцы

1. Абаронца мае права:

1) ведаць, у чым падазраецца ці абвінавачваецца асоба, інтарэсы якой ён абараняе;

2) бесперашкодна бачыцца са сваім падабаронным сам-насам і канфідэнцыяльна без абмежавання колькасці і працягласці размоў;

3) прысутнічаць пры прад'яўленні абвінавачання;

3[1]) удзельнічаць у заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве;

4) удзельнічаць у допытах падазраванага, абвінавачанага, а таксама ў іншых следчых дзеяннях, якія праводзяцца з удзелам падазраванага, абвінавачанага;

5) знаёміцца з пастановамі аб распачынанні крымінальнай справы, аб прызнанні падазраваным, аб затрыманні, аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, аб прымяненні меры стрымання, з пратаколамі затрымання, допытаў і іншых следчых дзеянняў, праведзеных з удзелам падазраванага ці абвінавачанага ў адсутнасць абаронцы, і выпісваць з іх неабходныя звесткі, за выключэннем звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

6) пры вядзенні з яго ўдзелам следчых дзеянняў і ў судовым разборы задаваць з дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, пытанні падазраваным, абвінавачаным, а таксама пацярпелым, сведкам, экспертам, спецыялістам;

7) уносіць пісьмовыя заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколе следчага дзеяння, у якім ён прымаў удзел;

8) заяўляць у пісьмовай форме адводы і хадайніцтвы, накіраваныя на абарону інтарэсаў падазраванага, абвінавачанага;

9) падаваць доказы;

10) збіраць па сваёй ініцыятыве звесткі, якія адносяцца да абставін учыненага злачынства, і падаваць іх органу дазнання, асобе, якая праводзіць дазнанне, следчаму, суду, удзельнічаць у следчых дзеяннях, якія праводзяцца ў сувязі з падачай названых звестак;

11) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія цікавіць яго, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

12) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай, нагляднай інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе з-за абставін якія нядаўна адкрыліся;

13) патрабаваць унясення ў пратакол судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць на яго заўвагі;

14) выступаць у судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

15) атрымліваць копію пастановы аб прымяненні меры стрымання і іншых мер працэсуальнага прымусу, аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай і хатняга арышту, копію пастановы аб прызнанні падазраваным, аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, а таксама копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці нагляднай інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59[1] гэтага Кодэкса;

16) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда;

17) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт падазраванага ці абвінавачанага і абскардзіць рашэнне суда;

18) падаваць пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, які вядзе крымінальны працэс, ці якія сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

19) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

20) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку або старшыні.

11. Абаронца, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

2. Абаронца абавязаны выкарыстоўваць усе ўказаныя ў законе сродкі і спосабы абароны ў мэтах выяўлення абставін, якія апраўдваюць падазраванага, абвінавачанага, памякчаюць адказнасць абвінавачанага, і аказваць ім неабходную юрыдычную дапамогу.

3. Абаронца не мае права:

1) здзяйсняць якія-небудзь дзеянні супраць інтарэсаў падабароннага і перашкаджаць у ажыццяўленні правоў, якія яму належаць;

2) прызнаваць падабароннага звязаным з грамадска небяспечнымі дзеяннямі і вінаватым ва ўчыненні злачынства насуперак яго пазіцыі;

3) без даручэння падабароннага заяўляць аб яго прымірэнні з пацярпелым, прызнаваць грамадзянскі іск і адклікаць пададзеную падабаронным скаргу;

4) самавольна спыняць свае паўнамоцтвы і без згоды падабароннага перадавяраць паўнамоцтвы па ажыццяўленні абароны іншай асобе.

4. Абаронца абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс, для абароны правоў і законных інтарэсаў падазраванага ці абвінавачанага і аказання ім юрыдычнай дапамогі; пры немагчымасці яўкі – на працягу 24 гадзін паведаміць аб гэтым органу крымінальнага пераследавання і суду;

2) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) не раскрываць звесткі, якія сталі яму вядомыя ў сувязі з аказаннем ім юрыдычнай дапамогі, а таксама даныя папярэдняга расследавання і закрытага судовага пасяджэння.

5. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання і закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, абаронца нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

Артыкул 49. Пацярпелы

1. Пацярпелым прызнаецца фізічная асоба, якой прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем прычынена фізічная, маёмасная ці маральная шкода і ў адносінах да якой орган, які вядзе крымінальны працэс, вынес пастанову (прысуд) аб прызнанні яе пацярпелым.

2. Калі пры распачынанні крымінальнай справы падставы для прызнання асобы пацярпелым адсутнічаюць, указанае рашэнне прымаецца неадкладна пасля выяўлення такіх падстаў.

3. Калі пасля прызнання асобы пацярпелым будзе выяўлена адсутнасць падстаў для яе знаходжання ў становішчы пацярпелага, орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел гэтай асобы ў крымінальным працэсе ў якасці пацярпелага.

4. Па справах аб злачынствах, наступствам якіх стала смерць пацярпелага, правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 50 гэтага Кодэкса, ажыццяўляюць члены яго сем'і, блізкія сваякі ці законныя прадстаўнікі.

Артыкул 50. Правы і абавязкі пацярпелага

1. Пацярпелы мае права:

1) ведаць сутнасць абвінавачання;

2) даваць паказанні;

3) падаваць доказы;

4) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

6) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

7) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт падазраванага ці абвінавачанага і абскардзіць рашэнне суда;

8) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні, а таксама ў судовым пасяджэнні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння ці судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць на яго заўвагі;

9) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія цікавяць яго, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

10) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў крымінальнай справы, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай, нагляднай інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся;

11) выступаць пры адсутнасці ў яго прадстаўніка ў судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

12) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

13) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку або старшыні;

14) атрымліваць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць яго правы і інтарэсы, а па яго просьбе таксама бясплатна атрымліваць копіі гэтых рашэнняў, у тым ліку аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, аб прызначэнні судовага разбору, аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы або спыненні крымінальнага пераследавання, а таксама копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці нагляднай інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

15) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда;

16) адклікаць пададзеную ім ці яго прадстаўніком скаргу;

17) мірыцца з абвінавачаным па справах прыватнага абвінавачання;

18) падаваць пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, які вядзе крымінальны працэс, ці якія сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

19) атрымліваць пакрыццё расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе, і шкоды, прычыненай дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс;

20) атрымліваць назад маёмасць, забраную ў яго органам, які вядзе крымінальны працэс, у якасці рэчыўных доказаў ці на іншых падставах; арыгіналы афіцыйных дакументаў, якія належаць яму; маёмасць, якая належыць яму, забраная ў асобы, якая ўчыніла прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне;

21) мець прадстаўніка і спыняць паўнамоцтвы прадстаўніка.

2. Пацярпелы абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) даваць паказанні па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 1 часткі трэцяй артыкула 60 гэтага Кодэкса;

3) падаваць прадметы, дакументы, а таксама ўзоры, якія ёсць у яго, для параўнальнага даследавання па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс;

4) падвяргацца агляданню па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, у выпадку ўчынення ў адносінах да яго цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства;

5) падвяргацца па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, амбулаторнай экспертызе для праверкі здольнасці правільна ўспрымаць і даваць паказанні аб абставінах, якія падлягаюць выяўленню па крымінальнай справе, калі ёсць важкія падставы сумнявацца ў наяўнасці ў яго такой здольнасці, а таксама для высвятлення яго ўзросту;

6) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

7) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

3. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, пацярпелы нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

4. За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў ці за дачу заведама лжывых паказанняў пацярпелы нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкуламі 401 і 402 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

5. Пацярпелы карыстаецца правамі, якія належаць яму, і выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі асабіста ці праз свайго прадстаўніка.

6. У парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, правы непаўналетняга пацярпелага ажыццяўляе разам з ім ці замест яго яго законны прадстаўнік, а недзеяздольнага пацярпелага – замест яго законны прадстаўнік.

Артыкул 51. Прыватны абвінаваўца

1. Прыватным абвінаваўцам з'яўляюцца асоба, якая пацярпела ад злачынства, а ў выпадку яе няздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любы з яго дарослых блізкіх сваякоў ці членаў сем'і, яго законны прадстаўнік, прадстаўнік юрыдычнай асобы, якія падалі заяву ў суд у парадку, прадугледжаным артыкулам 426 гэтага Кодэкса, і падтрымліваюць абвінавачанне на судовым пасяджэнні, а таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец ці іх прадстаўнікі па справах публічнага і прыватна-публічнага абвінавачання, якія самастойна падтрымліваюць абвінавачанне на судовым пасяджэнні ў выпадку адмовы дзяржаўнага абвінаваўцы ад абвінавачання.

2. Прыватны абвінаваўца надзяляецца правамі, прадугледжанымі часткай 1 артыкула 50 гэтага Кодэкса.

Артыкул 52. Грамадзянскі ісцец

1. Грамадзянскім істцом прызнаецца фізічная ці юрыдычная асоба, у дачыненні да якой ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што ёй прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем прычынена шкода, што падлягае пакрыццю ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, якая падала ў ходзе вядзення па крымінальнай справе іскавую заяву, і ў адносінах да якой орган, што вядзе крымінальны працэс, вынес пастанову (прысуд) аб прызнанні яе грамадзянскім істцом.

2. Калі ў момант падачы асобай іскавай заявы дастатковыя падставы для прызнання яе грамадзянскім істцом адсутнічаюць, указанае рашэнне прымаецца неадкладна пасля выяўлення такіх падстаў.

3. Калі пасля прызнання асобы грамадзянскім істцом будзе выяўлена, што іскавая заява пададзена неналежнай асобай або з-за іншых прычын адсутнічаюць падставы для яе знаходжання ў становішчы грамадзянскага істца, орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел гэтай асобы ў крымінальным працэсе ў якасці грамадзянскага істца.

Артыкул 53. Правы і абавязкі грамадзянскага істца

1. Грамадзянскі ісцец у мэтах падтрымання прад'яўленага ім іску мае права:

1) ведаць сутнасць абвінавачання;

2) даваць тлумачэнні па прад'яўленым ім іску;

3) падаваць доказы;

4) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прыняцці мер забеспячэння прад'яўленага ім іску, а таксама аб прымяненні мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

6) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

7) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні, а таксама ў судовым пасяджэнні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння ці судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і прыносіць на яго заўвагі;

8) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску, у любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія адносяцца да грамадзянскага іску, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

9) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў крымінальнай справы, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай і наглядной інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

10) выступаць пры адсутнасці ў яго прадстаўніка ў судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

11) атрымліваць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць яго правы і інтарэсы, і па яго просьбе таксама бясплатна атрымліваць копіі гэтых рашэнняў, а таксама копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці наглядной інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

12) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда ў частцы, якая адносіцца да прад'яўленага ім іску;

13) адклікаць пададзеную ім ці яго прадстаўніком скаргу;

14) падаваць у частцы, якая адносіцца да прад'яўленага ім іску, пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, які вядзе крымінальны працэс, ці якія сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

15) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

16) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку ці старшыні;

17) мець прадстаўніка і спыняць паўнамоцтвы прадстаўніка;

18) падтрымліваць поўнасцю ці часткова грамадзянскі іск або адмовіцца ад яго ў любы момант вядзення па крымінальнай справе;

19) атрымліваць пакрыццё расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе, і шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс;

20) атрымліваць назад маёмасць, забраную ў яго органам, які вядзе крымінальны працэс, у якасці рэчыўных доказаў ці на іншых падставах; арыгіналы афіцыйных дакументаў, якія належаць яму; маёмасць, якая належыць яму, забраная ў асобы, якая ўчыніла прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне.

2. Грамадзянскі ісцец абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) забяспечваць падачу ў суд копій іскавай заявы па колькасці грамадзянскіх адказчыкаў;

3) падаваць прадметы і дакументы, якія ёсць у яго, па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс;

4) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

5) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

3. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, грамадзянскі ісцец нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

4. Грамадзянскі ісцец можа быць дапытаны ў якасці сведкі.

5. Грамадзянскі ісцец карыстаецца правамі, якія належаць яму і выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі асабіста ці праз свайго прадстаўніка.

6. У парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, правы непаўналетняга істца ажыццяўляе разам з ім ці замест яго законны прадстаўнік, а недзеяздольнага грамадзянскага істца – замест яго законны прадстаўнік.

Артыкул 54. Грамадзянскі адказчык

1. Грамадзянскім адказчыкам прызнаецца фізічная ці юрыдычная асоба, на якую паводле закона і ў сувязі з прад'яўленым у ходзе вядзення па крымінальнай справе іскам можа быць ускладзена матэрыяльная адказнасць за дзеянні абвінавачанага, які прычыніў шкоду ў выніку ўчынення прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння, і ў адносінах да якой орган, які вядзе крымінальны працэс, вынес пастанову (прысуд) аб прызнанні яе грамадзянскім адказчыкам.

2. Калі ў момант падачы іскавай заявы адсутнічаюць дастатковыя падставы для прызнання асобы грамадзянскім адказчыкам, адпаведнае рашэнне прымаецца неадкладна пасля выяўлення такіх падстаў.

3. Калі пасля прызнання асобы грамадзянскім адказчыкам будзе выяўлена, што на гэту асобу не можа быць ускладзена матэрыяльная адказнасць за дзеянні абвінавачанага або з-за іншых прычын адсутнічаюць падставы для яе знаходжання ў стане грамадзянскага

адказчыка, орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел гэтай асобы ў крымінальным працэсе ў якасці грамадзянскага адказчыка.

Артыкул 55. Правы і абавязкі грамадзянскага адказчыка

1. Грамадзянскі адказчык у мэтах абароны сваіх інтарэсаў у сувязі з прад'яўленым да яго іскам мае права:

1) ведаць змест прад'яўленага да яго іску;

2) даваць тлумачэнні па прад'яўленым да яго іску;

3) падаваць доказы;

4) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

6) добраахвотна ўносіць у дэпазіт суда грашовыя сродкі ў забеспячэнне прад'яўленага да яго іску;

7) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

8) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні, а таксама ў судовым пасяджэнні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння ці судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і прыносіць на яго заўвагі;

9) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску, у любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія адносяцца да грамадзянскага іску, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

10) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў крымінальнай справы, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай, нагляднай інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

11) выступаць пры адсутнасці ў яго прадстаўніка ў судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

12) атрымліваць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць яго правы і інтарэсы, а па яго просьбе таксама бясплатна атрымліваць копіі гэтых рашэнняў, а таксама копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці нагляднай інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

13) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда ў частцы, якая адносіцца да прад'яўленага да яго іску;

14) адклікаць пададзеную ім ці яго прадстаўніком скаргу;

15) падаваць у частцы, якая адносіцца да прад'яўленага да яго іску, пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, які вядзе крымінальны працэс, ці якія сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

16) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

17) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку ці старшыні;

18) мець прадстаўніка і спыняць паўнамоцтвы прадстаўніка;

19) прызнаць грамадзянскі іск у любы момант вядзення па крымінальнай справе;

20) атрымліваць пакрыццё шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс;

21) атрымліваць назад маёмасць, забраную ў яго органам, які вядзе крымінальны працэс, у якасці рэчыўных доказаў ці на іншых падставах, а таксама арыгіналы афіцыйных дакументаў, якія належаць яму.

2. Грамадзянскі адказчык абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) падаваць прадметы і дакументы, якія ёсць у яго, па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

4) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму аб справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

3. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, грамадзянскі адказчык нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

4. Грамадзянскі адказчык можа быць дапытаны ў якасці сведкі.

5. Грамадзянскі адказчык карыстаецца правамі, якія належаць яму, і выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі асабіста ці праз свайго прадстаўніка.

Артыкул 56. Законныя прадстаўнікі падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага, грамадзянскага істца

1. Законнымі прадстаўнікамі падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага, грамадзянскага істца з'яўляюцца іх бацькі, усынавіцелі, апекуны ці папячыцелі, якія прадстаўляюць пры вядзенні па крымінальнай справе інтарэсы адпаведна непаўналетніх ці недзеяздольных удзельнікаў крымінальнага працэсу. Законнымі прадстаўнікамі не могуць быць асобы, прызнаныя недзеяздольнымі.

2. Пры адсутнасці ў падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага, грамадзянскага істца законнага прадстаўніка з ліку ўказаных у частцы першай гэтага артыкула асоб орган, які вядзе крымінальны працэс, прызнае іх законным прадстаўніком орган апекі і папячыцельства.

3. Орган крымінальнага пераследавання ці суд сваёй пастановай (прысудам) прызнаюць і дапускаюць да ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе ў якасці законных прадстаўнікоў адпаведна падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага, грамадзянскага істца аднаго з бацькоў, усынавіцеляў, апекуноў ці папячыцеляў кожнага з іх або прадстаўнікоў арганізацый, пад апекай якіх яны знаходзяцца.

4. Не можа быць прызнаны і дапушчаны да ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе ў якасці законнага прадстаўніка:

1) пацярпелага ці грамадзянскага істца – асоба, якой ставіцца ў віну прычыненне прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем шкоды пацярпеламу або грамадзянскаму істцу;

2) падазраванага, абвінавачанага ці асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, – асоба, якой дзеяннем, што ставіцца ў віну падазраванаму ці абвінавачанаму, прадугледжаным крымінальным законам, прычынена шкода, а таксама асоба, якой прычынена шкода грамадска небяспечным дзеяннем.

5. Калі пасля прызнання асобы законным прадстаўніком падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца будзе выяўлена адсутнасць падстаў для знаходжання яе ў становішчы законнага прадстаўніка, орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел гэтай асобы ў крымінальным працэсе ў якасці законнага прадстаўніка.

Артыкул 57. Правы і абавязкі законнага прадстаўніка падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца

1. Законны прадстаўнік падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца, дапушчанага ў гэтай якасці да ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе, мае права:

1) ведаць сутнасць падазрэння, абвінавачання, змест прад'яўленага іску;

2) ведаць аб выкліках удзельніка крымінальнага працэсу, які прадстаўляецца ім, у орган, які вядзе працэс, і суправаджаць яго;

3) выключаны;

4) удзельнічаць па яго хадайніцтве ці хадайніцтве асобы, якая прадстаўляецца ім, , у следчых ці іншых працэсуальных дзеяннях, якія праводзяцца органам крымінальнага пераследавання з удзелам асобы, якая прадстаўляецца ім;

5) даваць тлумачэнні;

6) падаваць доказы;

7) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прымяненні мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

8) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

9) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

10) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт падазраванага або абвінавачанага і абскарджваць рашэнне суда;

11) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён ці ўдзельнік крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, удзельнічалі, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні, а таксама ў судовым пасяджэнні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння ці судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і прыносіць на яго заўвагі;

12) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія цікавяць яго, а законны прадстаўнік грамадзянскага істца – у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

13) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай, нагляднай інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

14) выступаць пры адсутнасці ў абвінавачанага, які прадстаўляецца ім, абаронцы ў судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

15) атрымліваць ад органа, што вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць правы і інтарэсы ўдзельніка крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, а таксама яго самога; па яго просьбе бясплатна атрымліваць копіі гэтых рашэнняў, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

16) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскарджваць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда, а законны прадстаўнік грамадзянскага істца – у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску;

17) адклікаць пададзеную ім скаргу;

18) падаваць у частцы, што адносіцца да інтарэсаў удзельніка крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, даведзеныя да яго ведама органам, што вядзе крымінальны працэс, ці сталі вядомымі яму ў выніку іншых абставін;

19) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

20) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку ці старшыні;

21) запрашаць для асобы, якую ён прадстаўляе, адпаведна абаронцу ці прадстаўніка і спыняць паўнамоцтвы запрошанага ім абаронцы і прадстаўніка;

22) атрымліваць пакрыццё шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, а законны прадстаўнік пацярпелага ці грамадзянскага істца таксама пакрыццё расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе;

23) атрымліваць назад маёмасць, забраную ў яго органам, які вядзе крымінальны працэс, у якасці рэчыўных доказаў ці на іншых падставах, а таксама арыгіналы афіцыйных дакументаў, якія належаць яму.

11. Законны прадстаўнік падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

2. Законны прадстаўнік падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца, дапушчанага ў гэтай якасці пры вядзенні па крымінальнай справе мае права:

1) адмовіцца ад абвінавачання, якое ён ажыццяўляе ў якасці прыватнага абвінаваўцы;

2) спыняць паўнамоцтвы абаронцы;

3) адклікаць скаргу на здзяйсненне ў адносінах да асобы, якую ён прадстаўляе, прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння;

4) прымірыцца па справах прыватнага абвінавачання з асобай, пацярпелай ад злачынства, ці абвінавачаным;

5) прад'яўляць грамадзянскі іск, адмовіцца ад прад'яўленага ім грамадзянскага іску ці прызнаць прад'яўлены да яго грамадзянскі іск.

3. Законны прадстаўнік падазраванага, абвінавачанага, асобы, што ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца не мае права здзяйсняць якія-небудзь дзеянні супраць інтарэсаў удзельніка крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, у тым ліку адмовіцца ад імя падазраванага, абвінавачанага ад абаронцы.

4. Законны прадстаўнік падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, пацярпелага ці грамадзянскага істца абавязаны:

1) падаваць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы, што пацвярджаюць яго паўнамоцтвы законнага прадстаўніка;

2) з'яўляцца на выклікі органа, што вядзе крымінальны працэс, для абароны інтарэсаў асобы, якую ён прадстаўляе;

3) падаваць прадметы і дакументы, якія ёсць у яго, па патрабаванні органа, што вядзе крымінальны працэс;

4) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

5) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму аб крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом;

6) удзельнічаць пры заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве ў выпадку заявы непаўналетнім падазраваным (абвінавачаным) хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве.

5. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, законны прадстаўнік нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 57[1]. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага

1. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе прадстаўляе інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, для абароны яго правоў і законных інтарэсаў у мэтах яго магчымай рэабілітацыі.

2. Орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй пастановай (прысудам) прызнае і дапускае да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, яго блізкіх сваякоў у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. Пры адсутнасці блізкіх сваякоў памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, а таксама ў выпадку непадачы імі заявы аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у прадугледжаны гэтым Кодэксам тэрмін орган, што вядзе крымінальны працэс, сваёй пастановай (прысудам) прызнае і дапускае да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, членаў яго сям'і, якія падалі заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага.

4. У якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, не могуць быць прызнаны і дапушчаны да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе:

1) непаўналетні;

2) асоба, якая з прычыны фізічных ці псіхічных недахопаў не можа самастойна абараняць правы і законныя інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага;

3) асоба, якой прычынена шкода злачынствам, якое інкрымінавана памерламу падазраванаму, абвінавачанаму, асобе, што падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага ;

4) саўдзельнік або асоба, падазраваная ці абвінавачаная ў саўдзеле ва ўчыненні інкрымінаванага памерламу падазраванаму, абвінавачанаму, асобе, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, злачынства.

5. Калі блізкія сваякі, члены сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, з'яўляюцца непаўналетнімі ці з прычыны фізічных ці псіхічных недахопаў не могуць самастойна абараняць правы і законныя інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, іх законныя прадстаўнікі маюць права ўдзельнічаць у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага.

Артыкул 57[2]. Правы і абавязкі прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага

1. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, мае права:

1) ведаць сутнасць падазрэння, абвінавачання ў адносінах да памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, і атрымліваць ад органа, што вядзе крымінальны працэс, копію пастановы аб распачынанні крымінальнай справы, аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, якую(якога) ён прадстаўляе, аб прызнанні падазраваным, аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, які(якая) прадстаўляецца ім, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59[1] гэтага Кодэкса;

2) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

3) падаваць доказы;

4) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) карыстацца дапамогай абаронцы для абароны правоў і законных інтарэсаў памерлага падазраванага, абвінавачанага ў мэтах яго магчымай рэабілітацыі, а таксама спыніць паўнамоцтвы абаронцы;

6) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца ў яго прысутнасці ці з яго ўдзелам;

7) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх удзельнічалі памерлы падазраваны, абвінавачаны, асоба, што падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны;

8) знаёміцца з пастановамі аб прызначэнні экспертыз і заключэннямі экспертаў ці паведамленнямі аб немагчымасці даць заключэнні;

9) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія цікавяць яго, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

10) пісьмова адмовіцца ад удзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе;

11) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў крымінальнай справы, а таксама ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, у пасяджэннях судоў апеляцыйнай інстанцыі і пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

12) патрабаваць унясення ў пратакол судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і прыносіць на яго заўвагі;

13) выступаць у судовых спрэчках з прамовай і рэплікай пры адсутнасці абаронцы ў памерлага абвінавачанага, якога ён прадстаўляе;

14) атрымліваць ад органа, які вядзе крымінальны працэс, паведамленні аб прыняцці рашэнняў, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, а таксама копіі іскавай заявы, заявы па справах прыватнага абвінавачання, пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, аб прызначэнні судовага разбору, копію прыгавору, прысуду (пастановы) суда апеляцыйнай ці наглядной інстанцыі ці іншага выніковага рашэння суда, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса;

15) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць пастанову аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда;

16) адклікаць пададзеную ім ці абаронцам скаргу;

17) падаваць пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу;

18) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

19) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку ці старшыні.

2. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, абавязаны:

1) падаваць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы (указваць звесткі), што пацвярджаюць яго роднасць (сваяцтва) з памерлым падазраваным, абвінавачаным, асобай, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, ці яго паўнамоцтвы законнага прадстаўніка або факт яго сумеснага пражывання з памерлым падазраваным, абвінавачаным, асобай, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, і вядзення з ім агульнай гаспадаркі;

2) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

4) падаваць прадметы і дакументы, што ёсць у яго, па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс;

5) прысутнічаць пры правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, калі гэта прызнаў неабходным орган крымінальнага праследавання;

6) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам, што вядзе крымінальны працэс.

3. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, што падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 58. Прадстаўнікі пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка

1. Прадстаўнікамі пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка з'яўляюцца асобы, якія ўпаўнаважаны ўказанымі ўдзельнікамі крымінальнага працэсу прадстаўляць іх інтарэсы пры вядзенні па крымінальнай справе і ў адносінах да якіх орган, што вядзе крымінальны працэс, вынес пастанову (прысуд) аб прызнанні іх прадстаўнікамі.

2. Калі пасля прызнання асобы прадстаўніком пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка будзе выяўлена адсутнасць падстаў для яго знаходжання ў становішчы прадстаўніка, орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел гэтай асобы ў крымінальным працэсе ў якасці прадстаўніка. Удзел прадстаўніка ў вядзенні па крымінальнай справе спыняецца таксама і ў выпадках, калі яго паўнамоцтвы спынены адпаведна пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам або калі прадстаўнік, які не з'яўляецца прызначаным у гэтай якасці адвакатам, адмовіўся ад далейшага ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе.

3. Пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык могуць мець некалькі прадстаўнікоў.

Артыкул 59. Правы і абавязкі прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка

1. Прадстаўнік пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка ажыццяўляе пры вядзенні па крымінальнай справе іх правы, акрамя правоў, неаддзельных ад іх асобы. Для абароны асобы, якую ён прадстаўляе, ён мае права:

1) ведаць сутнасць абвінавачання, змест прад'яўленага іску;

2) удзельнічаць у следчых ці іншых працэсуальных дзеяннях, якія праводзіць орган крымінальнага пераследавання, па яго хадайніцтве ці хадайніцтве ўдзельніка крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, або з яго ўдзелам;

3) даваць тлумачэнні;

4) падаваць доказы;

5) заяўляць адводы і хадайніцтвы, у тым ліку аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

6) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

7) пярэчыць супраць дзеянняў органа крымінальнага пераследавання і патрабаваць унясення яго пярэчанняў у пратакол следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, якое праводзіцца з яго ўдзелам;

8) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт падазраванага ці абвінавачанага і абскардзіць рашэнне суда;

9) знаёміцца з пратаколамі следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, у якіх ён ці ўдзельнік крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе, удзельнічалі, і рабіць заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколах; пры ўдзеле ў следчым ці іншым працэсуальным дзеянні, а таксама ў судовым пасяджэнні патрабаваць унясення ў пратакол указанага дзеяння ці судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, паводле

яго меркавання, павінны быць адзначаны; знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння і прыносіць на яго заўвагі;

10) з моманту атрымання паведамлення аб заканчэнні папярэдняга расследавання знаёміцца з крымінальнай справай і выпісваць з яе звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, а прадстаўнік грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка – у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску, за выключэннем названых у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса і звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі;

11) удзельнічаць у судовым пасяджэнні суда першай інстанцыі, у тым ліку ў даследаванні доказаў, а таксама ў пасяджэннях судоў апеляцыйнай, нагляднай інстанцый і пры вядзенні па крымінальнай справе па абставінах, якія нядаўна адкрыліся;

12) выступаць замест пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, які прадстаўляецца ім, у судовых спрэчках з прамовай і рэплікай;

13) падаваць скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку абскардзіць прыгавор ці іншае выніковае рашэнне суда, а прадстаўнікі грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка – у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску;

14) адклікаць пададзеную ім скаргу са згоды асобы, якую ён прадстаўляе;

15) падаваць пярэчанні на пратэсты дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора і скаргі іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу ў частцы, што адносіцца да інтарэсаў удзельніка крымінальнага працэсу, якога ён прадстаўляе;

16) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні наконт хадайніцтваў і прапаноў іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама аб пытаннях, якія вырашае суд;

17) пярэчыць супраць дзеянняў іншага боку ці старшыні;

18) са згоды асобы, якая прадстаўляецца ім, запрашаць для яе іншага прадстаўніка і перадавяраць прадстаўніцтва;

19) атрымліваць пакрыццё шкоды, прычыненай незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, а прадстаўнік пацярпелага ці грамадзянскага істца – таксама пакрыццё расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе.

11. Прадстаўнік пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

2. Прадстаўнік пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка ў выпадках, калі гэта спецыяльна агаворана ў выдадзенай яму даверанасці, а таксама кіраўнік адпаведнай юрыдычнай асобы, які прадстаўляе па пасадзе інтарэсы грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка і дзейнічае ў межах сваёй кампетэнцыі, маюць права ад імя свайго даверніка:

1) прымірыцца па справах прыватнага абвінавачання з абвінавачаным;

2) адмовіцца ад прад'яўленага яго даверникам грамадзянскага іску ці прызнаць грамадзянскі іск.

3. Прадстаўнік пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка абавязаны:

1) падаваць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы, якія пацвярджаюць яго паўнамоцтвы прадстаўніка;

2) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс, для абароны інтарэсаў асобы, якая прадстаўляецца ім;

3) падаваць прадметы і дакументы, якія ёсць у яго. па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс;

4) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

5) не раскрываць звесткі аб абставінах, якія сталі вядомымі яму па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

4. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, прадстаўнік нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 59[1]. Асаблівасці ажыццяўлення ўдзельнікамі крымінальнага працэсу асобных правоў і выканання абавязкаў па крымінальных справах, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі

1. Падлеглыя ўручэнню ці накіраванню ўдзельнікам крымінальнага працэсу копіі працэсуальных дакументаў, у якіх змяшчаюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля азнаямлення з імі захоўваюцца пры крымінальнай справе і ўручаюцца ўдзельнікам крымінальнага працэсу па іх хадайніцтве на час вядзення працэсуальных дзеянняў з іх удзелам.

2. Пры вядзенні па крымінальных справах, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны забяспечыць удзельнікам крымінальнага працэсу неабходныя ўмовы для ажыццяўлення імі сваіх правоў і выканання абавязкаў з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны ў прадугледжаных гэтым Кодэксам выпадках азнаёміць адпаведных удзельнікаў крымінальнага працэсу з працэсуальным дакументам ці яго копіяй, матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, з выкананнем патрабаванняў актаў заканадаўства.

Артыкул 60. Сведка

1. Сведкам з'яўляецца асоба, у адносінах да якой ёсць падставы меркаваць, што ёй вядомыя якія-небудзь акалічнасці аб крымінальнай справе, выкліканая органам, які вядзе крымінальны працэс, для дачы паказанняў або якая дае паказанні.

2. Не падлягаюць допыту ў якасці сведак:

1) падазраваны;

2) асобы, якія з прычыны ўзросту, фізічных ці псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць акалічнасці, якія падлягаюць выяўленню па крымінальнай справе, і даваць аб іх паказанні. Для вырашэння пытання аб здольнасці асобы правільна ўспрымаць акалічнасці, якія маюць значэнне для справы, і даваць аб іх паказанні можа прызначацца і праводзіцца амбулаторная экспертыза;

3) адвакаты, іх стажоры, памочнікі, іншыя работнікі адвакацкіх утварэнняў, юрыдычных кансультацый – для атрымання якіх-небудзь звестак, што могуць быць ім

вядомыя ў сувязі з аказаннем юрыдычнай дапамогі пры вядзенні па крымінальнай справе;

4) асобы, якім звесткі, што адносяцца да гэтай крымінальнай справы, сталі вядомыя ў сувязі з іх удзелам у вядзенні па крымінальнай справе ў якасці абаронцы, прадстаўніка, прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, адваката сведкі. Удзел у справе законных прадстаўнікоў падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, не выключае магчымасці допыту гэтых асоб у якасці сведак па іншых акалічнасцях, што маюць значэнне для справы;

5) пракурор, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) – аб акалічнасцях крымінальнай справы, якія сталі ім вядомыя ў сувязі з удзелам у вядзенні па крымінальнай справе, а суддзя – у сувязі з абмеркаваннем у дарадчым пакоі пытанняў, якія ўзніклі пры вынясенні судовага рашэння;

6) свяшчэннаслужыцель – аб акалічнасцях, вядомых яму са споведзі;

7) урач – без згоды асобы, якая звярнулася па медыцынскую дапамогу, з-за акалічнасцей, што з’яўляюцца прадметам урачэбнай тайны;

8) асоба, якая аказвае ці аказвала садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове органу, упаўнаважанаму законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, – без яе згоды і згоды органа, упаўнаважанага законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, якому гэта асоба аказвае ці аказвала садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове.

3. Сведка мае права:

1) не сведчыць супраць сябе самога, членаў сваёй сям'і і блізкіх сваякоў;

2) заяўляць адвод перакладчыку, які ўдзельнічае ў яго допыце;

3) уласнаручна запісваць свае паказанні ў пратаколе допыту ці сведчыць сваім подпісам у пратаколе следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння правільнасць запісу дадзеных ім паказанняў;

4) заяўляць хадайніцтвы і прыносіць скаргі на дзеянні органа, які вядзе крымінальны працэс, у тым ліку аб прыняцці мер для забеспячэння яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) атрымліваць пакрыццё расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе, і шкоды, прычыненай дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс;

6) запрашаць адваката для атрымання юрыдычнай дапамогі пры правядзенні працэсуальных дзеянняў з яго ўдзелам.

4. Сведка абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) праўдзіва паведаміць усё вядомае па справе і адказаць на пастаўленыя пытанні;

3) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях, якія сталі вядомымі яму аб справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом;

4) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс.

5. Сведка не можа быць прымусова падвергнуты экспертызе.

6. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, сведка нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

7. За адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў (за выключэннем асоб, указаных у пункце 1 часткі 3 гэтага артыкула) ці за дачу заведама лжывых паказанняў сведка нясе

адказнасць у адпаведнасці з артыкуламі 401 і 402 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 60[1]. Адвакат сведкі

1. Адвакат сведкі пры адсутнасці акалічнасцей, якія выключаюць яго ўдзел у крымінальным працэсе ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса, мае права:

1) аказваць юрыдычную дапамогу сведку пры правядзенні працэсуальных дзеянняў з удзелам гэтага сведкі;

2) з дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, задаваць пытанні гэтаму сведку;

3) заяўляць адвод перакладчыку, які ўдзельнічае ў допыце гэтага сведкі;

4) знаёміцца з пратаколам следчага і іншага працэсуальнага дзеяння, пры правядзенні якога ён аказваў юрыдычную дапамогу сведку, і ўносіць пісьмовыя заўвагі наконт правільнасці і паўнаты запісаў у пратаколе ўказанага дзеяння;

5) знаёміцца з запісам у пратаколе судовага пасяджэння паказанняў гэтага сведкі.

2. Няяўка адваката сведкі да часу, вызначанага сведку органам, які вядзе крымінальны працэс, для правядзення працэсуальнага дзеяння, не з'яўляецца перашкодай для правядзення такога дзеяння з удзелам сведкі.

3. Адвакат сведкі абавязаны:

1) прад'яўляць органу, які вядзе крымінальны працэс, пасведчанне адваката і ордар на права ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе;

2) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях, якія сталі вядомымі яму па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам, што вядзе крымінальны працэс.

4. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, адвакат сведкі нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 61. Эксперт

1. Экспертам з'яўляецца не зацікаўленая ў зыходзе крымінальнай справы асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў навуцы, тэхніцы, мастацтве, рамястве і іншых сферах дзейнасці, якой даручана правядзенне экспертызы.

2. Эксперт мае права:

1) знаёміцца з матэрыяламі, якія адносяцца да прадмета экспертызы, і выпісваць з іх неабходныя звесткі;

2) заяўляць хадайніцтвы аб даванні яму дадатковых матэрыялаў, неабходных для дачы заключэння, аб прыцягненні да правядзення экспертызы іншых экспертаў, аб прыняцці мер для загарантавання яго бяспекі, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

3) з дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, удзельнічаць у правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, задаваць асобам, якія дапытваюцца, і іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у гэтых дзеяннях, пытанні, што адносяцца да прадмета экспертызы;

4) даваць заключэнні як аб пастаўленых пытаннях, так і аб акалічнасцях, якія ўваходзяць у яго кампетэнцыю і выявіліся пры правядзенні экспертызы;

5) знаёміцца з пратаколам следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, а таксама ў адпаведнай частцы – з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць падлеглыя ўнясенню ў пратакол заўвагі адносна паўноты і правільнасці запісу яго дзеянняў і заключэння;

6) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка;

7) падаваць скаргі на дзеянні органа, што вядзе крымінальны працэс, якія абмяжоўваюць яго правы пры правядзенні экспертызы;

8) атрымліваць пакрыццё расходаў, панесеных пры правядзенні экспертызы;

9) атрымліваць пакрыццё панесеных ім расходаў і ўзнагароду за выкананую ім работу, якая не ўваходзіць у кола яго прамых службовых абавязкаў.

21. Эксперт, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

3. Эксперт не мае права без органа, што вядзе крымінальны працэс, весці перамовы з удзельнікамі крымінальнага працэсу аб пытаннях, звязаных з правядзеннем экспертызы; самастойна збіраць матэрыялы для даследавання; праводзіць даследаванні, якія могуць пацягнуць за сабой поўнае ці частковае знішчэнне аб'ектаў экспертызы або змяненне іх знешняга выгляду ці асноўных уласцівасцей, калі на гэта не было спецыяльнага дазволу органа, што вядзе крымінальны працэс.

4. Эксперт абавязаны:

1) даць абгрунтаванае і аб'ектыўнае заключэнне аб пастаўленых перад ім пытаннях;

2) адмовіцца ад дачы заключэння, калі пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў ці калі пададзеныя яму матэрыялы недастатковыя для адказу на гэтыя пытанні, а таксама адмовіцца ад далейшага правядзення экспертызы, калі ён прыйдзе да высновы аб немагчымасці дачы заключэння, аб чым пісьмова паведаміць асобе, якая даручыла яму правядзенне экспертызы, з абгрунтаваннем гэтай адмовы;

3) падаць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы, якія пацвярджаюць яго спецыяльную кваліфікацыю;

4) паведаміць па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, а таксама бакоў на судовым пасяджэнні звесткі аб сваім прафесійным вопыце і адносінах з асобамі, якія ўдзельнічаюць у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе;

5) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс, для прадстаўлення яго ўдзельнікам крымінальнага працэсу і дачы адказаў на іх пытанні, а таксама для растлумачэння зместу дадзенага ім заключэння;

6) падаць па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, каштарыс расходаў на правядзенне экспертызы, а таксама справаздачу аб панесеных расходах;

7) прытрымлівацца парадку пры правядзенні следчых дзеянняў і ў час судовага пасяджэння;

8) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях крымінальнай справы і іншыя звесткі, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з правядзеннем экспертызы, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

5. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, эксперт нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

6. За дачу заведама лжывага заключэння, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў эксперт нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкуламі 401 і 402 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 62. Спецыяліст

1. Спецыялістам з'яўляецца не зацікаўленая ў зыходзе крымінальнай справы асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў навуцы, тэхніцы, мастацтве, рамястве і іншых сферах дзейнасці, выкліканая органам, які вядзе крымінальны працэс, для ўдзелу і аказання садзейнічання ў правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў. Педагог ці псіхолаг, якія ўдзельнічаюць у допыце непаўналетніх падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, сведкі, таксама з'яўляюцца спецыялістамі.

2. Спецыяліст мае права:

1) ведаць мэту свайго выкліку;

2) адмовіцца ад удзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, калі ён не валодае спецыяльнымі ведамі і навыкамі;

3) задаваць пытанні ўдзельнікам следчага дзеяння з дазволу органа крымінальнага пераследавання і суда;

4) знаёміцца з пратаколам следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, а таксама ў адпаведнай частцы – з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць падлеглыя ўнясенню ў пратакол заўвагі адносна паўноты і правільнасці запісу ходу, зместу і вынікаў дзеянняў, якія праводзіліся пры яго ўдзеле;

5) падаваць скаргі на дзеянні органа, які вядзе крымінальны працэс, заяўляць хадайніцтва аб прыняцці мер для загарантавання бяспекі яго, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

6) атрымліваць пакрыццё панесеных ім расходаў і ўзнагароду за выкананую ім працу, якая не ўваходзіць у кола яго прамых службовых абавязкаў.

21. Спецыяліст, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

3. Спецыяліст абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс, для аказання яму неабходнага садзейнічання;

2) падаць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы, якія пацвярджаюць яго спецыяльную кваліфікацыю;

3) паведаміць па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, а таксама бакоў у судовым пасяджэнні звесткі аб сваім прафесійным вопыце і адносінах з асобамі, якія ўдзельнічаюць у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе;

4) удзельнічаць у правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, выкарыстоўваючы спецыяльныя веды, навыкі і навукова-тэхнічныя сродкі для выяўлення, замацавання і адабрання доказаў;

5) даваць тлумачэнні наконт дзеянняў, якія ён выконвае;

6) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

7) прытрымлівацца парадку пры правядзенні следчых дзеянняў і ў час судовага пасяджэння;

8) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях справы і іншыя звесткі, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з удзелам у вядзенні па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

4. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, спецыяліст нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 63. Перакладчык

1. Перакладчыкам з'яўляецца не зацікаўленая ў зыходзе крымінальнай справы асоба, якая валодае мовамі, веданне якіх неабходна для перакладу, і ўдзельнічае ў следчых і іншых працэсуальных дзеяннях у выпадках, калі падазраваны, абвінавачаны, іх абаронцы або пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык ці іх прадстаўнікі, а таксама сведкі і іншыя ўдзельнікі крымінальнага працэсу не валодаюць мовай, на якой адбываецца вядзенне па крымінальнай справе, а таксама для перакладу пісьмовых дакументаў. Перакладчыкам у адпаведнасці з гэтым Кодэксам лічыцца таксама асоба, якая разумее знакі глухога ці нямога і здольная гаварыць з імі знакамі.

2. Удзельнікі крымінальнага працэсу не маюць права прымаць на сябе абавязкі перакладчыка, хоць бы яны і валодалі неабходнымі для перакладу мовамі.

3. Перакладчык мае права:

1) адмовіцца ад удзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, калі ён не валодае ведамі, неабходнымі для перакладу;

2) задаваць асобам, якія прысутнічаюць пры ажыццяўленні перакладу, пытанні для ўдакладнення перакладу;

3) знаёміцца з пратаколам следчага ці іншага працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, а таксама ў адпаведнай частцы – з пратаколам судовага пасяджэння і рабіць заўвагі, якія падлягаюць унясенню ў пратакол, адносна паўнаты і правільнасці запісу перакладу;

4) падаваць скаргі на дзеянні органа, які вядзе крымінальны працэс, заяўляць хадайніцтвы аб прыняцці мер для загарантавання бяспекі яго, членаў сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён абгрунтавана лічыць блізкімі, а таксама маёмасці;

5) атрымліваць пакрыццё панесеных ім расходаў і ўзнагароду за выкананую ім працу, якая не ўваходзіць у кола яго прамых службовых абавязкаў.

31. Перакладчык, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства ці грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, якія змяшчаюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля атрымання допуску ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

4. Перакладчык абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс;

2) падаваць органу, які вядзе крымінальны працэс, дакументы, што пацвярджаюць яго кваліфікацыю перакладчыка;

3) дакладна і поўна выконваць даручаны яму пераклад;

4) сведчыць правільнасць перакладу сваім подпісам у пратаколе следчага і іншага працэсуальнага дзеяння, праведзенага з яго ўдзелам, а таксама ў працэсуальных дакументах, якія ўручаюцца ўдзельнікам крымінальнага працэсу ў перакладзе на іх родную мову ці іншую мову, якой яны валодаюць;

5) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс;

6) прытрымлівацца парадку пры правядзенні следчых, іншых працэсуальных дзеянняў і ў час судовага пасяджэння;

7) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях крымінальнай справы ці іншыя даныя, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з удзелам у вядзенні па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання ці судом.

5. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання ці закрытага судовага пасяджэння без дазволу органа, які вядзе крымінальны працэс, перакладчык нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

6. За заведама няправільны пераклад, а таксама адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў перакладчык нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкуламі 401 і 402 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 64. Паняты

1. Панятым з'яўляецца не зацікаўленая ў зыходзе крымінальнай справы дарослая асоба, якая ўдзельнічае ў правядзенні следчага дзеяння, для пасведчання яго факта, ходу і вынікаў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Паняты мае права:

1) ведаць, у правядзенні якога следчага дзеяння ён удзельнічае, хто кіруе яго правядзеннем і хто ўдзельнічае ў ім;

2) рабіць наконт следчага дзеяння заявы і заўвагі, які падлягаюць занясенню ў пратакол;

3) знаёміцца з пратаколам следчага дзеяння, у якім ён удзельнічаў;

4) падпісваць пратакол следчага дзеяння толькі ў той частцы, якая адлюстроўвае ўспрынятыя ім асабіста акалічнасці;

5) атрымліваць пакрыццё панесеных ім расходаў, звязаных з удзелам у правядзенні следчых дзеянняў.

3. Паняты абавязаны:

1) з'яўляцца на выклікі органа крымінальнага пераследавання;

2) паведаміць па патрабаванні органа крымінальнага пераследавання звесткі аб адносінах з асобамі, якія ўдзельнічаюць у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе;

3) засведчыць сваім подпісам у пратаколе следчага дзеяння факт правядзення гэтага дзеяння, яго ход і вынікі;

4) прытрымлівацца парадку пры правядзенні следчых дзеянняў;

5) падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа крымінальнага пераследавання;

6) не раскрываць звесткі аб акалічнасцях справы ці іншыя даныя, якія сталі яму вядомымі ў сувязі з удзелам у вядзенні па крымінальнай справе, калі ён быў папярэджаны аб гэтым органам крымінальнага пераследавання.

4. За раскрыццё даных папярэдняга расследавання без дазволу органа крымінальнага пераследавання паняты нясе адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

5. Паняты можа быць дапытаны ў якасці сведкі аб акалічнасцях, звязаных з правядзеннем следчага дзеяння, у якім ён удзельнічаў.

ГЛАВА 8
МЕРЫ ДЛЯ ЗАГАРАНТАВАННЯ БЯСПЕКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ І ІНШЫХ АСОБ

Артыкул 65. Абавязак органа, які вядзе крымінальны працэс, прымаць меры для загарантавання бяспекі

1. Орган, што вядзе крымінальны працэс, пры наяўнасці дастатковых даных, якія ўказваюць на тое, што маецца рэальная пагроза забойства, прымянення насілля, знішчэння ці пашкоджання маёмасці, ажыццяўлення іншых проціпраўных дзеянняў у адносінах да ўдзельніка крымінальнага працэсу, які абараняе свае ці прадстаўленыя правы і інтарэсы, а таксама іншага ўдзельніка крымінальнага працэсу, членаў яго сям'і і блізкіх у сувязі з яго ўдзелам у крымінальным працэсе, абавязаны прыняць прадугледжаныя законам меры для загарантавання бяспекі гэтых асоб і іх маёмасці.

2. Рашэнні аб прымяненні мер бяспекі прымаюцца:

1) пры выяўленні органам, што вядзе крымінальны працэс, акалічнасцей, якія ўказваюць на наяўнасць падстаў для прыняцця мер бяспекі;

2) у выпадку атрымання органам, што вядзе крымінальны працэс, іншай інфармацыі аб акалічнасцях, якія ўказваюць на наяўнасць падстаў для прыняцця мер бяспекі;

3) па заяве ўдзельніка крымінальнага працэсу аб неабходнасці прыняцця мер бяспекі.

3. Раскрыццё звестак аб мерах бяспекі, якія прымяняюцца ў адносінах да ўдзельнікаў крымінальнага працэсу, іх блізкіх сваякоў і членаў іх сямей або іншых асоб, якіх яны абгрунтавана лічаць блізкімі, а таксама ў адносінах да іх маёмасці, цягне за сабой адказнасць, устаноўленую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 66. Меры для загарантавання бяспекі

1. Да працэсуальных мер бяспекі адносяцца:

1) невыдаванне звестак аб асобе;

2) вызваленне ад яўкі на судовае пасяджэнне;

3) закрытае судовае пасяджэнне.

2. Да іншых мер бяспекі адносяцца:

1) выкарыстанне тэхнічных сродкаў кантролю;

2) праслухоўванне перамоў, якія вядуцца з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў сувязі, і іншых перамоў;

3) асабістая ахова, ахова жылля і маёмасці;

4) змяненне пашпартных даных і замена дакументаў;

5) забарона на выдачу звестак.

3. З улікам характару і ступені небяспекі для жыцця, здароўя, маёмасных і іншых правоў асоб, якія абараняюцца, могуць быць прыняты і іншыя меры загарантавання бяспекі, якія не супярэчаць гэтаму Кодэксу і іншым законам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 67. Нераскрыццё звестак аб асобе

1. Нераскрыццё звестак аб асобе заключаецца ў змяненні прозвішча, імя, імя па бацьку, іншых анкетных даных, змяненні звестак аб месцы жыхарства і працы (навучання) у заявах і паведамленнях аб злачынствах, матэрыялах праверак, пратаколах следчых і судовых дзеянняў, а таксама іншых дакументах органаў, якія вядуць крымінальны працэс, шляхам замены гэтай даных іншымі. Сапраўдныя даныя, узор подпісу, што будзе выкарыстоўвацца ў дакументах асобы, якая абараняецца, і пастанова аб прымяненні гэтай меры бяспекі неадкладна накіроўваюцца органам папярэдняга следства ці органам дазнання пракурору, які ажыццяўляе нагляд за папярэднім расследаваннем, і захоўваюцца ім паводле правіл сакрэтнага справаводства.

2. Правядзенне следчых дзеянняў з удзелам асобы, якая абараняецца, у ходзе папярэдняга расследавання, а таксама яе допыт на судовым пасяджэнні могуць ажыццяўляцца па-за візуальнай бачнасцю іншых асоб, у тым ліку асоб, якія знаходзяцца ў зале судовага пасяджэння, ці з прымяненнем мер, што забяспечваюць непазнавальнасць асобы, якая абараняецца, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе следчага дзеяння ці судовага пасяджэння.

Артыкул 68. Вызваленне ад яўкі на судовае пасяджэнне

1. Пацярпелы, грамадзянскі ісцец, іх прадстаўнікі, сведка, эксперт паводле пастановы (прысуду) суда могуць быць вызвалены ад яўкі на судовае пасяджэнне, калі гэтага патрабуюць інтарэсы загарантавання іх бяспекі ці бяспекі членаў іх сямей, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх яны абгрунтавана лічаць блізкімі, а таксама маёмасці, калі іншымі мерамі загарантаваць бяспеку немагчыма.

2. Пры вызваленні асобы, якая абараняецца, ад яўкі на судовае пасяджэнне ў судзе абвяшчаюцца паказанні, дадзеныя ім на папярэднім расследаванні, рэпрадуктуецца гука-, кіна- або відэазапіс яе допыту з выкананнем мер, якія забяспечваюць непазнавальнасць.

3. Допыт асобы, якая абараняецца, можа быць праведзены пры знаходжанні яе па-за залам судовага пасяджэння з выкарыстаннем відэатэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць яе непазнавальнасць.

Артыкул 69. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў кантролю і праслухоўвання перамоў

Пры наяўнасці яўнай пагрозы жыццю, здароўю, маёмасці асобы, якая абараняецца, па яе заяве ці з яе пісьмовай згоды могуць выкарыстоўвацца тэхнічныя сродкі кантролю, а таксама праводзіцца праслухоўванне перамоў, якія вядуцца з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў сувязі, і іншых перамоў у парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

Артыкул 70. Асабістая ахова, ахова жылля і маёмасці

Загарантаванне бяспекі ў выглядзе асабістай аховы, аховы жылля і маёмасці асобы, якая абараняецца, ажыццяўляюць органы ўнутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі паводле пастановы (прысуду) органа, што вядзе крымінальны працэс.

Артыкул 71. Змяненне пашпартных даных і замена дакументаў

Паводле пастановы (прысуду) органа, што вядзе крымінальны працэс, са згоды асобы, якая абараняецца, могуць быць праведзены змяненні яе пашпартных даных і замена дакументаў.

Артыкул 72. Забарона на раскрыццё **і выдачу звестак**

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, і службовыя асобы, якія гарантуюць прымяненне мер бяспекі, не маюць права раскрываць звесткі аб асобе, якая абараняецца, а таксама аб звароце падазраванага (абвінавачанага) да пракурора з хадайніцтвам аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве і прынятым па ўказаным хадайніцтве рашэнні.

2. Забараняецца выдача звестак аб асобе, якая абараняецца, з інфармацыйна-даведачных фондаў праваахоўных органаў, а таксама іншых арганізацый.

Артыкул 73. Парадак прымянення мер бяспекі

1. Пры наяўнасці падстаў для прыняцця мер бяспекі орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны на працягу сутак прыняць рашэнне аб іх прымяненні ці аб адмове ў прымяненні. Аб прынятым рашэнні выносіцца матываваная пастанова (прысуд). Пастанова (прысуд) аб прымяненні мер бяспекі неадкладна накіроўваецца для выканання ў орган унутраных спраў ці дзяржаўнай бяспекі па месцы жыхарства, працы ці навучання асобы, якая абараняецца. У неабходных выпадках аб прынятым рашэнні паведамляецца асобе, якая абараняецца.

2. Дзяржаўны орган, якому даручана ажыццяўленне мер бяспекі, неадкладна ўстанаўлівае пералік неабходных для абароны асобы ці яго маёмасці мер і ажыццяўляе іх рэалізацыю. Аб прынятых мерах бяспекі на працягу сутак паведамляецца органу, які вядзе крымінальны працэс і прыняў рашэнне аб іх прымяненні.

Артыкул 74. Адмена мер бяспекі

1. Меры бяспекі адмяняюцца, калі адпалі падставы іх прымянення, указаныя ў артыкуле 65 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку парушэння асобай, якая абараняецца, умоў ажыццяўлення гэтых мер, якое істотна абцяжарвае і робяць немагчымым іх прымяненне.

2. Адмена мер бяспекі дапускаецца толькі згодна з пастановай (прысудам) органа, які вядзе крымінальны працэс.

3. Пасля ўступлення прыгавору (прысуду, пастановы) у законную сілу адмена мер бяспекі праводзіцца па рашэнні начальніка органа ўнутраных спраў ці дзяржаўнай бяспекі па месцы знаходжання асобы, якая абараняецца, з абавязковым паведамленнем органу, які вядзе крымінальны працэс і прыняў рашэнне аб іх прымяненні, і асобе, якая абараняецца.

Артыкул 75. Адказнасць за невыкананне абавязкаў па прымяненні мер бяспекі

Службовыя асобы органа, які вядзе крымінальны працэс, і органа, які забяспечвае прымяненне мер бяспекі, а таксама службовыя асобы праваахоўных органаў, іншых арганізацый, вінаватыя ў непрыняцці ці неналежным ажыццяўленні мер бяспекі або ў раскрыцці звестак аб асобах, якія абараняюцца, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 9
АКАЛІЧНАСЦІ, ЯКІЯ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ УДЗЕЛУ Ў ВЯДЗЕННІ ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ

Артыкул 76. Адводы, самаадводы і хадайніцтвы аб выключэнні з вядзення па крымінальнай справе

1. Адводы, самаадводы і хадайніцтвы аб выключэнні з вядзення па крымінальнай справе заяўляюцца пры наяўнасці акалічнасцей, якія выключаюць удзел адпаведных асоб у крымінальным працэсе.

2. Суддзя, дзяржаўны абвінаваўца, пракурор, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абаронца, адвакат сведкі, прадстаўнікі пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі), эксперт, спецыяліст, перакладчык, паняты, якім вядомыя акалічнасці, што выключаюць іх удзел у крымінальным працэсе, абавязаны заявіць самаадвод.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс, мае права ў межах сваёй кампетэнцыі вырашаць заяўленыя адводы, самаадводы і хадайніцтвы аб выключэнні з вядзення па крымінальнай справе, а пры выяўленні акалічнасцей, якія выключаюць удзел адпаведнай асобы ў крымінальным працэсе, адхіляць яе ад удзелу ў вядзенні па справе па ўласнай ініцыятыве. Адвод, заяўлены асобе, упаўнаважанай вырашаць адводы, заяўленыя іншым асобам, павінен вырашацца ў першачарговым парадку.

4. У выпадку, калі адначасовы ўдзел у крымінальным працэсе некалькіх асоб выключаецца з-за блізкіх адносін або службовай ці асабістай залежнасці, з выключэнні па крымінальнай справе павінны ўстараняцца асобы, якія пазней іншых набылі становішча суддзі і іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу.

5. Адводы і самаадводы разглядаюцца і вырашаюцца неадкладна пасля іх заявы і паступлення.

Артыкул 77. Акалічнасці, якія выключаюць суддзю з удзелу ў разглядзе крымінальнай справы

1. Суддзя не можа ўдзельнічаць у разглядзе крымінальнай справы:

1) калі ён не з'яўляецца паводле закона належным суддзёй для разгляду гэтай крымінальнай справы;

2) калі ён з'яўляецца па гэтай справе пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці сведкам;

3) калі ён удзельнічаў у вядзенні па гэтай справе ў якасці эксперта, спецыяліста, перакладчыка, панятога, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора, прыватнага абвінаваўцы, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), абаронцы, адваката сведкі, законнага прадстаўніка падазраванага ці абвінавачанага, прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка;

4) калі ён з'яўляецца сваяком дзяржаўнага абвінаваўцы, пракурора, прыватнага абвінаваўцы, следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, абвінавачанага, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўніка, прадстаўніка памерлага абвінавачанага, абаронцы, адваката сведкі;

5) калі ёсць іншыя акалічнасці, якія даюць падставу лічыць, што суддзя асабіста, прама ці ўскосна, зацікаўлены ў зыходзе гэтай справы.

2. У склад суда, які разглядае крымінальную справу, не могуць уваходзіць асобы, якія з'яўляюцца сваякамі.

Артыкул 78. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе крымінальнай справы

1. Суддзя, які правяраў законнасць і абгрунтаванасць затрымання, узяцця пад варту і хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту, не можа ўдзельнічаць у разглядзе той жа справы ў судах першай і другой інстанцый ці ў парадку нагляду.

2. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе крымінальнай справы ў судзе першай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судзе другой інстанцыі ці ў парадку нагляду, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе справы ў судзе першай інстанцыі ў выпадку адмены прыгавору ці прысуду (пастановы) аб спыненні вядзення па справе, пастаноўленых (вынесеных) з яго ўдзелам.

3. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе крымінальнай справы ў судзе другой інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судзе першай інстанцыі ці ў парадку нагляду, а таксама ў новым разглядзе справы ў судзе другой інстанцыі пасля адмены прысуду, вынесенага з яго ўдзелам.

4. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду, не можа ўдзельнічаць у разглядзе той жа справы ў судах першай і другой інстанцый, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 5 гэтага артыкула.

5. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду ў пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, мае права ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах першай і другой інстанцый ці ў парадку нагляду, за выключэннем выпадкаў адмены пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь судовага рашэння, вынесенага з удзелам гэтага суддзі.

Артыкул 79. Адвод суддзі

1. Пры наяўнасці акалічнасцей, указаных у артыкулах 77 і 78 гэтага Кодэкса, суддзя абавязаны выключыцца з удзелу ў разглядзе крымінальнай справы. На гэтых жа падставах суддзі на судовым пасяджэнні можа быць заяўлены адвод дзяржаўным абвінаваўцам, пракурорам, прыватным абвінаваўцам, абвінавачаным, яго законным прадстаўніком, абаронцам, пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці іх прадстаўнікамі.

2. Адвод павінен быць заяўлены да пачатку судовага следства, калі падстава для адводу была вядомая да пачатку судовага пасяджэння.

3. Пазнейшая заява адводу дапускаецца толькі ў выпадку, калі падстава для яго стала вядомай боку, які заявіў адвод, пасля пачатку судовага следства.

Артыкул 80. Парадак вырашэння адводу, заяўленага суддзі

1. Пытанне аб адводзе суддзі, а таксама адводзе іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу на стадыі судовага разбору вырашае суд у дарадчым пакоі з вынясеннем прысуду.

2. Адвод, заяўлены суддзі, вырашаецца астатнімі суддзямі ў адсутнасць суддзі, які адводзіцца, ён мае права да выдалення суддзяў у дарадчы пакой публічна выкласці сваё тлумачэнне наконт заяўленага яму адводу. Пры роўнасці галасоў суддзя лічыцца адведзеным.

3. Адвод, заяўлены некалькім суддзям ці ўсяму складу суда, вырашае суд у поўным складзе большасцю галасоў.

4. Адвод, заяўлены суддзі, які разглядае справу аднаасобна ці разглядае скаргі аб прымяненні меры стрымання ці іншых мер працэсуальнага прымусу, вырашаецца суддзёй аднаасобна з вынясеннем пастановы.

5. У выпадку задавальнення заявы аб адводзе крымінальная справа, скарга або хадайніцтва перадаюцца ў вядзенне іншага суддзі.

6. Калі адначасова з адводам суддзі заяўлены адвод якому-небудзь з бакоў, сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі), перакладчыку, эксперту, спецыялісту, то ў першую чаргу вырашаецца пытанне аб адводзе суддзі.

Артыкул 81. Адвод пракурора, дзяржаўнага абвінаваўцы

1. Пракурор, дзяржаўны абвінаваўца не могуць прымаць удзел у вядзенні па крымінальнай справе пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы першай артыкула 77 гэтага Кодэкса.

2. Удзел пракурора ў правядзенні папярэдняга следства ці дазнання, а таксама падтрыманне ім дзяржаўнага абвінавачання не з'яўляюцца перашкодай для далейшага ўдзелу яго ў вядзенні па гэтай крымінальнай справе.

3. Пры наяўнасці падстаў для адводу пракурор, дзяржаўны абвінаваўца не могуць удзельнічаць у вядзенні па крымінальнай справе. На гэтых жа падставах пракурору, дзяржаўнаму абвінаваўцу можа быць заяўлены адвод падазраваным, абвінавачаным, іх законнымі прадстаўнікамі, абаронцам, а таксама пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці іх прадстаўнікамі.

4. Пытанне аб адводзе пракурора ў час дасудовага вядзення вырашае вышэйстаячы пракурор. Пытанне аб адводзе дзяржаўнага абвінаваўцы вырашае суд, які разглядае крымінальную справу.

Артыкул 82. Адвод следчага і асобы, якая праводзіць дазнанне

1. Следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, не могуць праводзіць папярэдняе расследаванне крымінальнай справы пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы 1 артыкула 77 гэтага Кодэкса. Іх ранейшы ўдзел у папярэднім расследаванні гэтай крымінальнай справы не з'яўляецца падставай для адводу.

2. Пры наяўнасці падстаў для адводу следчы і асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны выключыцца з правядзення папярэдняга расследавання. На гэтых жа падставах ім можа быць заяўлены адвод падазраваным, абвінавачаным, абаронцам, законнымі прадстаўнікамі, а таксама пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці іх прадстаўнікамі.

3. Пытанне аб адводзе следчага вырашае начальнік следчага падраздзялення, а пытанне аб адводзе асобы, якая праводзіць дазнанне, вырашае пракурор.

Артыкул 83. Адвод сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі)

1. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) не можа ўдзельнічаць у разглядзе крымінальнай справы пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы першай артыкула 77 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, калі ён з'яўляецца сваяком суддзі, які разглядае гэту крымінальную справу. Папярэдні яго ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе ў якасці сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі) не з'яўляецца падставай для адводу.

2. Пытанне аб адводзе сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі) вырашае суд, які разглядае крымінальную справу.

Артыкул 84. Адвод перакладчыка

1. Перакладчык не можа ўдзельнічаць у вядзенні па крымінальнай справе пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы першай артыкула 77 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку выяўлення яго некампетэнтнасці.

2. Пры наяўнасці гэтых падстаў для адводу перакладчыку можа быць заяўлены адвод падазраваным, абвінавачаным, іх законнымі прадстаўнікамі, абаронцам, дзяржаўным абвінаваўцам, прыватным абвінаваўцам, а таксама пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці іх прадстаўнікамі.

3. У выпадку выяўлення некампетэнтнасці перакладчыка адвод яму можа быць заяўлены і сведкам, чые паказанні ён перакладае, або яго адвакатам.

4. Папярэдні ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе асобы ў якасці перакладчыка не з'яўляецца падставай для яе адводу.

5. Пытанне аб адводзе перакладчыка пры правядзенні папярэдняга расследавання вырашае орган крымінальнага пераследавання, а на судовым пасяджэнні – суд, які разглядае крымінальную справу.

Артыкул 85. Адвод эксперта

1. Эксперт не можа прымаць удзел у вядзенні па крымінальнай справе:

1) пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы першай артыкула 77 гэтага Кодэкса. Папярэдні яго ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе ў якасці эксперта не з'яўляецца падставай для адводу;

2) калі ён знаходзіўся ці знаходзіцца ў службовай ці іншай залежнасці ад асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суддзі, абаронцы, падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўнікоў ці праводзіў па гэтай крымінальнай справе рэвізію;

3) у выпадку выяўлення яго некампетэнтнасці.

2. Не з'яўляецца падставай для адводу эксперта яго ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе ў якасці спецыяліста.

3. Пытанне аб адводзе эксперта вырашаецца ў парадку, прадугледжаным часткай пятай артыкула 84 гэтага Кодэкса.

Артыкул 86. Адвод спецыяліста

1. Спецыяліст не можа прымаць удзел у вядзенні па крымінальнай справе пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы першай артыкула 85 гэтага Кодэкса.

2. Папярэдні яго ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе ў якасці спецыяліста не з'яўляецца падставай для адводу.

3. Пытанне аб адводзе спецыяліста вырашаецца ў парадку, прадугледжаным часткай пятай артыкула 84 гэтага Кодэкса.

Артыкул 87. Акалічнасці, якія выключаюць удзел у вядзенні па крымінальнай справе абаронцы, адваката сведкі, прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, а таксама панятога

1. Абаронца, адвакат сведкі, а таксама прадстаўнік пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, паняты не могуць прымаць удзел у вядзенні па крымінальнай справе, калі яны:

1) раней удзельнічалі ў вядзенні па гэтай крымінальнай справе ў якасці суддзі, пракурора, следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), эксперта, спецыяліста, перакладчыка ці панятога;

2) далі паказанні ў якасці сведак аб акалічнасцях, якія маюць адносіны да гэтай крымінальнай справы;

3) з'яўляюцца сваякамі суддзі, пракурора, следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, ці сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), што прымаў або прымае ўдзел у расследаванні ці судовым разглядзе гэтай справы, ці з'яўляюцца сваякамі асобы, інтарэсы якой супярэчаць інтарэсам удзельніка крымінальнага працэсу, якія яны закліканы абараняць;

4) з'яўляюцца членамі сям'і ці блізкімі сваякамі абвінавачанага, якія скарысталіся правам не сведчыць супраць асобы, якая прыцягваецца да крымінальнай адказнасці па гэтай справе;

5) аказваюць ці раней аказвалі юрыдычную дапамогу асобе, інтарэсы якой супярэчаць інтарэсам падазраванага, які абараняецца імі, абвінавачанага ці пацярпелага, грамадзянскага істца або грамадзянскага адказчыка, якія прадстаўляюцца імі;

6) прызнаны ва ўстаноўленым законам парадку недзеяздольнымі.

11. Папярэдні ўдзел у вядзенні па гэтай крымінальнай справе асобы ў якасці панятога не з'яўляецца падставай для адводу панятога.

2. Пытанне аб адводзе абаронцы, адваката сведкі, прадстаўніка пацярпелага, грамадзянскага істца ці грамадзянскага адказчыка, а таксама панятога вырашаецца ў парадку, прадугледжаным часткай пятай артыкула 84 гэтага Кодэкса.

РАЗДЗЕЛ III
ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ

ГЛАВА 10
ДОКАЗЫ

Артыкул 88. Доказы

1. Доказамі з'яўляюцца любыя фактычныя даныя, атрыманыя ў прадугледжаным законам парадку, на аснове якіх орган, што вядзе крымінальны працэс, выяўляе наяўнасць ці адсутнасць грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, вінаватасць асобы, якая ўчыніла гэта дзеянне, або яе невінаватасць і іншыя акалічнасці, якія маюць значэнне для правільнага вырашэння крымінальнай справы.

2. Крыніцамі доказаў з'яўляюцца паказанні падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, сведкі; заключэнні эксперта; рэчыўныя доказы; пратаколы следчых дзеянняў, судовага пасяджэння і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі, атрыманыя ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

3. Доказы, атрыманыя на тэрыторыі замежнай дзяржавы па просьбе органа, які вядзе крымінальны працэс, аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальнай справе на аснове прынцыпу ўзаемнасці (далей – просьба органа, які вядзе крымінальны працэс) ці ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, завераныя і перададзеныя ва ўстаноўленым парадку гэтаму органу, маюць такую ж юрыдычную сілу, як калі б яны былі атрыманы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з правіламі гэтага Кодэкса.

Артыкул 89. Акалічнасці, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе

1. Пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства і судовага разбору крымінальнай справы падлягаюць даказванню:

1) наяўнасць грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам (час, месца, спосаб і іншыя акалічнасці яго ўчынення);

2) вінаватасць абвінавачанага ва ўчыненні злачынства;

3) акалічнасці, якія ўплываюць на ступень і характар адказнасці абвінавачанага (акалічнасці, якія памякчаюць і абцяжваюць адказнасць, характарызуюць асобу абвінавачанага);

4) характар і памер шкоды, прычыненай злачынствам;

5) акалічнасці, якія пацвярджаюць, што маёмасць набыта злачынным шляхам ці з'яўляецца даходам, атрыманым ад выкарыстання гэтай маёмасці.

2. Па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, акрамя таго, падлягаюць выяўленню наступныя акалічнасці:

1) узрост непаўналетняга (дата, месяц, год нараджэння);

2) умовы жыцця і выхавання;

3) ступень інтэлектуальнага, валявога і псіхічнага развіцця;

4) наяўнасць дарослых падбухторшчыкаў і іншых саўдзельнікаў.

Артыкул 90. Выяўленне прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства

Пры вядзенні па матэрыялах праверкі і крымінальнай справе органы крымінальнага пераследавання абавязаны выяўляць прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства.

Артыкул 91. Паказанні падазраванага

1. Паказанні падазраванага – гэта звесткі, паведамленыя падазраваным у вуснай ці пісьмовай форме на допыце, праведзеным на папярэднім следстве ці дазнанні ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 215–221 гэтага Кодэкса, а таксама пры правядзенні іншых следчых дзеянняў з яго ўдзелам.

2. Падазраваны мае права даць паказанні наконт падазрэння, якое ёсць супраць яго, а таксама наконт іншых вядомых яму акалічнасцей, якія маюць значэнне па крымінальнай справе, і доказаў, якія ёсць у справе.

Артыкул 92. Паказанні абвінавачанага

1. Паказанні абвінавачанага – гэта звесткі, паведамленыя абвінавачаным у вуснай ці пісьмовай форме на допыце, праведзеным на папярэднім следстве, дазнанні ці на судовым пасяджэнні ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 215–221, 244, 327 і 331 гэтага Кодэкса, а таксама пры правядзенні іншых следчых дзеянняў з яго ўдзелам.

2. Абвінавачаны мае права даць паказанні па прад'яўленым яму абвінавачанні, а таксама наконт іншых вядомых яму акалічнасцей, якія маюць значэнне па крымінальнай справе, і доказаў, якія ёсць у справе.

Артыкул 93. Паказанні пацярпелага

1. Паказанні пацярпелага – гэта звесткі, паведамленыя пацярпелым у вуснай ці пісьмовай форме на допыце, праведзеным на папярэднім следстве, дазнанні ці на судовым пасяджэнні ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 215–221, 329, 331 і 332 гэтага Кодэкса, а таксама пры правядзенні іншых следчых дзеянняў з яго ўдзелам.

2. Пацярпелы можа быць дапытаны аб любых акалічнасцях, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе, а таксама аб сваіх узаемаадносінах з падазраваным, абвінавачаным. Не могуць служыць доказамі звесткі, якія паведамляе пацярпелы, калі ён не можа назваць крыніцу свайго ведання.

Артыкул 94. Паказанні сведкі

1. Паказанні сведкі – гэта звесткі, паведамленыя сведкам у вуснай ці пісьмовай форме на допыце, праведзеным на папярэднім следстве, дазнанні ці на судовым пасяджэнні ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 215–221, 330–332 гэтага Кодэкса, а таксама пры правядзенні іншых следчых дзеянняў з яго ўдзелам.

2. Сведка можа быць дапытаны аб любых акалічнасцях, якія адносяцца да справы, у тым ліку аб асобе падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага і сваіх узаемаадносінах з імі і іншымі сведкамі. Не могуць служыць доказамі звесткі, які паведамляе сведка, калі ён не можа назваць крыніцу свайго ведання.

Артыкул 95. Заключэнне эксперта

1. Заключэнне эксперта – гэты працэсуальны дакумент, які сведчыць факт і ход даследавання экспертам матэрыялаў, дадзеных органам, што вядзе крымінальны працэс, і які змяшчае высновы аб пастаўленых перад экспертам пытаннях, заснаваныя на спецыяльных ведах эксперта ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці.

2. Заключэнне эксперта не з'яўляецца абавязковым для органаў крымінальнага пераследавання і суда, аднак нязгода іх з заключэннем павінна быць імі матывавана.

Артыкул 96. Рэчыўныя доказы

Рэчыўнымі доказамі прызнаюцца прадметы, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці былі аб'ектамі злачынных дзеянняў, а таксама грошы і іншыя каштоўнасці, здабытыя злачынным шляхам, і ўсе іншыя прадметы і дакументы, якія могуць служыць сродкамі для

выяўлення злачынства, высвятленні фактычных акалічнасцей крымінальнай справы, выяўлення вінаватых або абвяржэння абвінавачання ці змякчэння адказнасці абвінавачанага.

Артыкул 97. Захоўванне рэчыўных доказаў

1. Рэчыўныя доказы павінны быць апісаны ў пратаколах агляду і іншых следчых дзеянняў, па магчымасці сфатаграфаваны і далучаны да крымінальнай справы пастановай (прысудам) органа, які вядзе крымінальны працэс. Рэчыўныя доказы павінны захоўвацца пры крымінальнай справе і перадавацца разам з ёй.

2. Калі прадметы ў сілу іх грувасткасці ці іншых прычын не могуць захоўвацца пры крымінальнай справе або ў спецыяльна абсталяваных памяшканнях органаў, якія вядуць крымінальны працэс, яны павінны быць сфатаграфаваны або зафіксаваны на відэазапісе, па магчымасці ўпакаваны, апячатаны і перададзены на захоўванне. Асоба, якая прыняла рэчыўныя доказы на захоўванне, павінна быць папярэджана аб адказнасці за іх захаванасць, аб чым бяруцца падпіска і абавязацельства пры неабходнасці перадаць рэчыўныя доказы для правядзення следчых і іншых працэсуальных дзеянняў. Да матэрыялаў крымінальнай справы можа быць далучаны ўзор рэчыўнага доказу, дастатковы для параўнальнага даследавання. Аб перадачы рэчыўных доказаў на захоўванне і месцы іх знаходжання ўказваецца ў пастанове.

3. Рэчыўныя доказы захоўваюцца да ўступлення прыгавору ў законную сілу ці да сканчэння тэрміну на абскарджанне пастановы ці прысуду аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, але не больш за тры гады. У выпадках, калі спрэчка аб праве на прадмет падлягае вырашэнню ў парадку грамадзянскага судаводства, рэчыўныя доказы захоўваюцца да ўступлення ў законную сілу рашэння суда.

4. У асобных выпадках рэчыўныя доказы могуць быць вернуты іх уладальнікам і да сканчэння тэрмінаў, указаных у частцы 3 гэтага артыкула, калі гэта магчыма без урону для вядзення па крымінальнай справе.

5. Перадача рэчыўных доказаў для рэалізацыі ці іншага выкарыстання дапускаецца ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам аб працы з маёмасцю, канфіскаванай, арыштаванай ці накіраванай у даход дзяржавы.

6. Пры перадачы крымінальнай справы з органа дазнання ў орган папярэдняга следства ці з аднаго органа папярэдняга следства ў іншы, а таксама пры накіраванні справы пракурору ці ў суд, ці пры перадачы справы з аднаго суда ў іншы, ці з суда пракурору, ці пры накіраванні справы пракурорам ніжэйстаячаму пракурору, следчаму, органу дазнання рэчыўныя доказы адпраўляюцца разам са справай, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткамі 2, 4 і 5 гэтага артыкула.

Артыкул 98. Меры, якія прымаюцца ў адносінах да рэчыўных доказаў пры вырашэнні крымінальнай справы

У прыгаворы, прысудзе ці пастанове аб спыненні вядзення па крымінальнай справе павінна быць вырашана пытанне аб рэчыўных доказах. Пры гэтым:

1) прылады і сродкі ўчынення злачынства, якія належаць абвінавачанаму, падлягаюць канфіскацыі ці знішчаюцца;

2) прадметы, забароненыя да абарачэння, а таксама інфармацыя, распаўсюджванне якой забаронена і (ці) абмежавана, падлягаюць канфіскацыі ці знішчаюцца;

3) прадметы, якія не з’яўляюцца каштоўнымі і не могуць быць выкарыстанымі, падлягаюць знішчэнню, а ў выпадку хадайніцтва зацікаўленых асоб ці ўстаноў могуць быць выдадзены ім;

4) грошы і іншыя каштоўнасці, набытыя злачынным шляхам, паводле прыгавору суда ці пастановы органа крымінальнага пераследавання накіроўваюцца на пакрыццё шкоды ад злачынства пацярпеламу, іншай асобе або паводле прыгавору суда падлягаюць канфіскацыі. Іншыя рэчыўныя доказы выдаюцца іх законным

уладальнікам, а пры невыяўленні апошніх падлягаюць канфіскацыі. У выпадку спрэчкі аб іх прыналежнасці яна падлягае вырашэнню ў парадку грамадзянскага судаводства;

5) дакументы, якія з'яўляюцца рэчыўнымі доказамі, застаюцца пры крымінальнай справе на працягу ўсяго тэрміну яе захоўвання або перадаюцца зацікаўленым асобам ці ўстановам.

Артыкул 99. Пратаколы следчых дзеянняў, судовага пасяджэння і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў

Крыніцамі доказаў з'яўляюцца складзеныя ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, пратаколы следчых дзеянняў, якія сведчаць абставіны і факты, выяўленыя пры аглядзе, агляданні, выманні, вобшуку, прад'яўленні для апазнання, праверцы паказанняў на месцы, следчым эксперыменце, эксгумацыі; пратаколы следчых дзеянняў і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аб праслухоўванні і запісе перамоў, якія ажыццяўляюцца з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў сувязі, і іншых перамоў, складзеныя ва ўстаноўленым законам парадку і з дадаваннем адпаведнага запісу праслухоўвання, а таксама пратакол судовага пасяджэння, які адлюстроўвае ход судовых дзеянняў і іх вынікі.

Артыкул 100. Іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі

1. Іншыя дакументы прызнаюцца крыніцамі доказаў, калі абставіны і факты, выкладзеныя ў іх, засведчаны службовымі асобамі арганізацый ці грамадзянамі і маюць значэнне для крымінальнай справы.

2. Да іншых носьбітаў інфармацыі адносяцца матэрыялы фота- і кіназдымкі, гука- і відэазапісы і іншыя носьбіты інфармацыі, атрыманыя, выпатрабаваныя ці пададзеныя ў парадку, прадугледжаным артыкулам 103 гэтага Кодэкса.

3. Іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі далучаюцца да крымінальнай справы і застаюцца пры ёй на працягу ўсяго тэрміну яе захоўвання. У выпадку, калі канфіскаваныя і далучаныя да справы іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі патрабуюцца для бягучага ўліку, справаздачнасці і іншых правамерных мэтаў, яны могуць быць вернуты законнаму ўладальніку ці дадзены ў часовае карыстанне, калі гэта магчыма без урону для крымінальнай справы, або могуць быць перададзены іх копіі.

4. У выпадках, калі іншыя дакументы і іншыя носьбіты інфармацыі маюць прыкметы, указаныя ў артыкуле 96 гэтага Кодэкса, яны з'яўляюцца рэчыўнымі доказамі.

Артыкул 101. Матэрыялы, атрыманыя ў ходзе аператыўна-вышуковай дзейнасці

Матэрыялы, атрыманыя ў ходзе аператыўна-вышуковай дзейнасці, могуць быць прызнаны ў якасці крыніц доказаў пры ўмове, калі яны атрыманы і пададзены ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, правераны і ацэнены ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 11
ДАКАЗВАННЕ

Артыкул 102. Даказванне

1. Даказванне заключаецца ў збіранні, праверцы і ацэнцы доказаў з мэтай высвятлення акалічнасцей, якія маюць значэнне для законнага, абгрунтаванага і справядлівага вырашэння крымінальнай справы.

2. Абавязак даказвання наяўнасці падстаў крымінальнай адказнасці, віны абвінавачанага і іншых акалічнасцей, якія маюць значэнне па крымінальнай справе, ляжыць на органе крымінальнага перасследавання, а ў судовым разборы – на

дзяржаўным ці прыватным абвінаваўцу, за выключэннем крымінальных спраў паскоранага вядзення, якія разглядаюцца без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы.

Артыкул 103. Збіранне доказаў

1. Збіранне доказаў праводзіцца ў працэсе вырашэння заяў і паведамленняў аб злачынстве, паскоранага вядзення, дазнання, папярэдняга следства і судовага разбору шляхам правядзення допытаў, вочных ставак, прад'яўлення для апазнання, вымання, вобшукаў, аглядаў, следчых эксперыментаў, правядзення экспертыз і іншых працэсуальных дзеянняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Орган крымінальнага пераследавання, а таксама суд па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве ў межах сваёй кампетэнцыі мае права па матэрыялах і крымінальнай справе, якія знаходзяцца ў іх вядзенні, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, выклікаць любую асобу для правядзення следчых і іншых працэсуальных дзеянняў ці дачы заключэння ў якасці эксперта; рабіць агляды, вобшукі і іншыя прадугледжаныя гэтым Кодэксам следчыя дзеянні; патрабаваць ад арганізацый, службовых асоб і грамадзян, а таксама органаў, упаўнаважаных законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, падачы прадметаў і дакументаў, якія маюць значэнне для крымінальнай справы; патрабаваць правядзення рэвізій і праверак ад адпаведных органаў і службовых асоб. Патрабаванне органа крымінальнага пераследавання аб падачы інфармацыі, дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, што ахоўваецца законам, санкцыянуецца пракурорам.

3. Абаронца мае права падаваць доказы і збіраць звесткі, неабходныя для абароны правоў падазраванага, абвінавачанага і аказання ім юрыдычнай дапамогі, шляхам апытання фізічных асоб, а таксама запытваць даведкі, характарыстыкі і іншыя дакументы ці іх копіі; запытваць са згоды падазраванага, абвінавачанага меркаванні спецыялістаў для растлумачэння пытанняў, якія ўзнікаюць у сувязі з ажыццяўленнем абароны і патрабуюць спецыяльных ведаў. Пры гэтым абаронца не мае права аказваць незаконнае ўздзеянне на асоб пры атрыманні звестак у інтарэсах асобы, якую ён абараняе.

4. Доказы могуць быць пададзены дзяржаўным абвінаваўцам, прыватным абвінаваўцам, падазраваным, абвінавачаным, абаронцам, пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам, прадстаўнікамі, а таксама любымі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі.

Артыкул 104. Праверка доказаў

1. Сабраныя па матэрыялах і крымінальнай справе доказы падлягаюць усебаковай, поўнай і аб'ектыўнай праверцы органамі крымінальнага пераследавання і судом.

2. Праверка доказаў заключаецца ў іх аналізе, параўнанні з іншымі доказамі, якія ёсць у матэрыялах і крымінальнай справе, а таксама ў выяўленні іх крыніц, атрыманні іншых доказаў, якія пацвярджаюць ці абвяргаюць доказ, што правяраецца.

Артыкул 105. Ацэнка доказаў

1. Кожны доказ падлягае ацэнцы з пункту гледжання адноснасці, дапушчальнасці, дакладнасці, а ўсе пададзеныя доказы ў іх сукупнасці – з пункту гледжання дастатковасці для заканчэння папярэдняга расследавання і вырашэння крымінальнай справы ў судовым разборы.

2. Датычнымі да крымінальнай справы прызнаюцца доказы, пры дапамозе якіх высвятляюцца акалічнасці, што маюць значэнне для гэтай справы. Не з'яўляюцца датычнымі да справы доказы, якія не здольны высвятляць ці абвяргаць падлеглыя даказванню акалічнасці.

3. Дапушчальнымі прызнаюцца доказы, атрыманыя органам, які вядзе крымінальны працэс, ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку і з прадугледжаных законам крыніц.

4. Доказ прызнаецца недапушчальным, калі ён атрыманы з парушэннямі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзяніна ці патрабаванняў гэтага Кодэкса,

звязанымі з пазбаўленнем ці абмежаваннем правоў удзельнікаў крымінальнага працэсу ці парушэннем іншых правілаў крымінальнага працэсу.

5. Доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы і не могуць быць пакладзены ў аснову абвінавачання, а таксама выкарыстоўвацца для даказвання любой акалічнасці, указанай у артыкуле 89 гэтага Кодэкса.

6. Дакладнымі прызнаюцца доказы, калі яны адпавядаюць рэчаіснасці. У аснову працэсуальных рашэнняў, якія прымае орган крымінальнага пераследавання ці суд, могуць быць пакладзены толькі дакладныя доказы.

7. Дастатковымі прызнаюцца доказы, калі іх сукупнасць дазваляе высветліць акалічнасці, якія падлягаюць даказванню па крымінальнай справе.

Артыкул 106. Прэюдыцыя

1. Прыгавор па іншай крымінальнай справе, які ўступіў у законную сілу, абавязковы для органа, які вядзе крымінальны працэс, пры вядзенні па крымінальнай справе ў адносінах як да высветленых акалічнасцей, так і іх юрыдычнай ацэнкі.

2. Рашэнне суда па грамадзянскай справе, якое ўступіла ў законную сілу, абавязковае для органа, які вядзе крымінальны працэс, пры вядзенні па крымінальнай справе толькі па пытанні аб тым, ці мела месца само грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, аб памеры шкоды і не можа прадвызначаць высновы аб вінаватасці ці невінаватасці абвінавачанага.

РАЗДЗЕЛ IV
МЕРЫ ПРАЦЭСУАЛЬНАГА ПРЫМУСУ

ГЛАВА 12
ЗАТРЫМАННЕ

Артыкул 107. Паняцце затрымання

1. Затрыманне заключаецца ў фактычным затрыманні асобы, дастаўленні яе ў орган крымінальнага пераследавання і ў кароткачасовым утрыманні пад вартай у месцах і ўмовах, вызначаных законам.

2. Затрыманне можа быць прыменена толькі:

1) да асобы, падазраванай ва ўчыненні злачынства, за якое можа быць прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ці арышту;

2) да абвінавачанага для прад'яўлення абвінавачання або ў выпадку парушэння ўмоў прымененай да яго меры стрымання;

3) да асуджанага, у адносінах да якога ёсць прадстаўленне ўпаўнаважанага на тое органа аб адмене прыгавору, прысуду, пастановы суда аб умоўным непрымяненні пакарання, адтэрміноўкі выканання пакарання ці ўмоўна-датэрміновым вызваленні ад адбывання пакарання.

3. Затрыманне праводзіцца:

1) па якое непасрэдна ўзнікла падазрэнні ва ўчыненні злачынства;

2) на падставе пастановы органа крымінальнага пераследавання;

3) на падставе пастановы (вызначэння) суда аб затрыманні асуджанага да вырашэння пытання аб адмене ўмоўнага непрымянення пакарання, адтэрміноўкі выканання пакарання ці ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання.

Артыкул 108. Затрыманне па непасрэдна ўзніклым падазрэнні ва ўчыненні злачынства

1. Асобу, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства, можа быць затрымаць орган крымінальнага пераследавання, які дзейнічае ў межах сваёй кампетэнцыі пры наяўнасці любой з наступных падстаў:

1) калі асоба заспета пры ўчыненні прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння ці непасрэдна пасля яго ўчынення;

2) калі сведкі выпадку, у тым ліку і асоба, якая пацярпела ад злачынства, прама пакажуць на гэту асобу як на асобу, якая ўчыніла прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне ці захопяць яго ў парадку, прадугледжаным артыкулам 109 гэтага Кодэкса;

3) калі на гэтай асобе, пры ёй, на яе адзенні ці іншых рэчах, якія яна выкарыстоўвае, у яе жыллі, іншых памяшканнях, якія яна выкарыстоўвае, на рабочым месцы ці транспартным сродку выяўлены яўныя сляды, якія паказваюць на яе дачыненне да здзяйснення прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння;

4) калі ёсць іншыя дастатковыя падставы падазраваць ва ўчыненні злачынства асобу пры ўмове, што яна спрабавала ўцячы з месца злачынства ці ад органа крымінальнага пераследавання, ці не мае пастаяннага месца жыхарства, ці пражывае ў іншай мясцовасці, ці не высветлена яе прыналежнасць.

11. У выпадку адсутнасці падстаў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што асоба, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства, можа ўцячы ад органа крымінальнага пераследавання, і пры наяўнасці пісьмовага ўзгаднення рашэння аб яе затрыманні з Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, міністрам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь – дырэктарам дэпартамента фінансавых расследаванняў, якія дзейнічаюць у межах сваёй кампетэнцыі, гэту асобу можа затрымаць орган крымінальнага пераследавання.

2. Затрыманне на падставах, прадугледжаных часткамі 1 і 11 гэтага артыкула, можа праводзіцца да распачынання крымінальнай справы. Пры гэтым пытанне аб распачынанні крымінальнай справы павінна быць вырашана органам крымінальнага пераследавання на працягу 12 гадзін з моманту фактычнага затрымання. У выпадку адмовы ў распачынанні крымінальнай справы ці непрыняцця рашэння аб распачынанні крымінальнай справы ва ўказаны тэрмін затрыманы павінен быць вызвалены.

3. Затрыманне на падставах, прадугледжаных часткамі 1 і 11 гэтага артыкула, не можа працягвацца больш за 72 гадзіны з моманту фактычнага затрымання (уключаючы тэрмін, прадугледжаны часткай 2 гэтага артыкула), пасля сканчэння якіх затрыманы павінен быць вызвалены з-пад варты або ў адносінах да яго прыменена мера стрымання, прадугледжаная гэтым Кодэксам.

4. Затрыманне асобы, падазраванай ва ўчыненні асабліва цяжкіх злачынстваў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 124, артыкулам 126, часткай 2 артыкула 139, часткамі 1 і 3 артыкула 285, артыкуламі 286, 289, часткай 3 артыкула 357, артыкуламі 359, 360, 362, а таксама цяжкіх злачынстваў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 285 і часткай 3 артыкула 339 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, на падставах, прадугледжаных часткамі 1 і 11 гэтага артыкула, не можа працягвацца больш за дзесяць сутак з моманту фактычнага затрымання, пасля сканчэння якіх затрыманы павінен быць вызвалены з-пад варты або ў адносінах да яго павінна быць прыменена мера стрымання, прадугледжаная гэтым Кодэксам.

5. У выпадку прымянення ў адносінах да затрыманага меры стрымання абвінавачанне яму павінна быць прад'яўлена не пазней за дзесяць сутак з моманту фактычнага затрымання, а ў адносінах да асоб, указаных у частцы 4 гэтага артыкула, – не пазней за дваццаць сутак з моманту фактычнага затрымання.

Артыкул 109. Права грамадзян на захоп асобы, якая ўчыніла злачынства

1. Захоп асобы – дзеянні грамадзян па затрыманні асобы, якая ўчыніла злачынства, або для стрымання злачынства і для перадачы яе органу ўлады.

2. Кожны грамадзянін мае права захапіць і прымусова даставіць у орган улады асобу, заспетую ім пры ўчыненні злачынства ці спробе ўцячы непасрэдна пасля яго ўчынення.

3. У выпадку аказання супраціўлення асобай, указанай у частцы першай гэтага артыкула, да яе могуць быць прыменены меры падаўлення супраціўлення ў межах мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства. У выпадках, калі ёсць падставы меркаваць, што пры захопленай асобе знаходзяцца зброя або прадметы, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, грамадзянін, які захапіў яе, можа агледзець адзенне затрыманага і забраць для перадачы ў орган крымінальнага пераследавання прадметы, якія знаходзяцца пры ёй.

Артыкул 110. Парадак затрымання па непасрэдна ўзніклым падазрэнні ва ўчыненні злачынства

1. Неадкладна пасля дастаўлення затрыманага ў орган крымінальнага пераследавання службовая асоба, што ажыццявіла фактычнае затрыманне, складае пратакол, у якім указваюцца падставы, месца і час фактычнага затрымання (з указаннем гадзіны і хвілін), вынікі асабістага вобшуку, а таксама час складання пратакола. Пратакол абвяшчаецца затрыманаму і пры гэтым тлумачацца прадугледжаныя артыкулам 41 гэтага Кодэкса правы, у тым ліку права запрасіць абаронцу і даваць паказанні ў яго прысутнасці, што адзначаецца ў пратаколе. Пратакол падпісваюць асоба, якая яго склала, і затрыманы.

2. Орган дазнання, следчы, пракурор на працягу трох гадзін з моманту дастаўлення падазраванага ў орган крымінальнага пераследавання прымаюць рашэнне аб затрыманні, аб чым выносіцца пастанова, якая з'яўляецца прававой падставай для кароткачасовага ўтрымання пад вартай затрыманага ў месцах і на ўмовах, прадугледжаных законам, або прымаюць рашэнне аб вызваленні затрыманага. Пастанова абвяшчаецца затрыманаму.

3. Аб праведзеным затрыманні орган дазнання ці следчы абавязаны пісьмова паведаміць пракурору на працягу 24 гадзін з моманту вынясення пастановы аб затрыманні.

4. Затрыманы павінен быць дапытаны пра акалічнасці затрымання ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 215–219, 434 і 435 гэтага Кодэкса.

Артыкул 111. Затрыманне абвінавачанага для прад'яўлення абвінавачання

1. У выпадку, калі абвінавачаны знаходзіцца ў іншай мясцовасці або месца яго знаходжання невядомае, орган крымінальнага пераследавання мае права вынесці пастанову аб затрыманні гэтай асобы. Гэта пастанова павінна быць выканана органам дазнання, які знаходзіць указаную асобу.

2. Аб выкананні пастановы аб затрыманні неадкладна паведамляецца органу крымінальнага пераследавання, які вынес пастанову.

3. Затрыманне на падставах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, не можа доўжыцца больш за 72 гадзіны з моманту фактычнага затрымання. Затрыманаму можа не прад'яўляцца абвінавачанне ва ўказаны тэрмін, калі да сканчэння 72 гадзін з моманту затрымання ён вызвалены з-пад варты з прымяненнем меры стрымання, не звязанай з утрыманнем пад вартай, ці без прымянення ў адносінах да яго меры стрымання.

Артыкул 112. Затрыманне абвінавачанага на падставе пастановы органа, які вядзе крымінальны працэс, да ўзяцця яго пад варту

1. У выпадку, калі абвінавачаны парушыў умовы прымененай да яго меры стрымання, не звязанай з утрыманнем пад вартай, ці дадзенага ім пісьмовага абавязацельства з'яўляцца на выклік органа, які вядзе крымінальны працэс, і паведамляць яму аб перамене месца жыхарства, орган, які вядзе крымінальны працэс, мае права вынесці пастанову (прысуд) аб затрыманні гэтай асобы з адначасовым рашэннем ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку пытання аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

2. Затрыманне абвінавачанага ў парадку, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула, дапускаецца толькі ў выпадку, калі палажэнні гэтага Кодэкса дазваляюць

прымяніць да яго ў якасці меры стрымання ўзяцце пад варту. Пры гэтым затрыманне не можа цягнуцца больш за 72 гадзіны з моманту фактычнага затрымання.

Артыкул 113. Затрыманне асуджанага да вырашэння пытання аб адмене ўмоўнага непрымянення пакарання, адтэрміноўкі выканання пакарання ці ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання

1. Суд выносіць пастанову (прысуд) аб затрыманні асуджанага да вырашэння пытання аб адмене ўмоўнага непрымянення пакарання, адтэрміноўкі выканання пакарання ці ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання, калі ўпаўнаважаным на тое органам унесена прадстаўленне і пададзены матэрыялы, з якіх вынікае, што асуджаны не выконвае ўстаноўленыя для яго судом абавязкі і іншыя ўмовы, указаныя ў артыкулах 77, 78, 90 і 93 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

2. Тэрмін затрымання, прадугледжанага часткай першай гэтага артыкула, вызначае суд у межах сямі сутак з моманту фактычнага затрымання.

3. Суд накіроўвае пастанову (прысуд) аб затрыманні асуджанага для выканання органу дазнання. Аб выкананні пастановы (прысуду) аб затрыманні орган, яго які выканаў, неадкладна паведамляе суду.

Артыкул 114. Вызваленне затрыманага

1. Затрыманы падлягае вызваленню на падставе пастановы (прысуду) органа, які вядзе крымінальны працэс, у выпадках, калі:

1) не пацвердзілася падазрэнне ва ўчыненні асобай прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння;

2) адпалі падставы далейшага ўтрымання асобы пад вартай;

3) орган, які вядзе крымінальны працэс, выявіў, што затрыманне праведзена з парушэннямі патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам;

4) скончыўся тэрмін затрымання.

2. У выпадках, прадугледжаных пунктам 4 часткі першай гэтага артыкула, затрыманы вызваляецца кіраўніком адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай з паведамленнем органу, які вядзе крымінальны працэс і ажыццявіў затрыманне.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс і прыняў рашэнне аб вызваленні затрыманага, выдае даведку, у якой указваецца, кім ён быў затрыманы, падставы, месца і час затрымання, падставы, матывы і час вызвалення. Вызваленая асоба не можа быць ізноў затрымана па тым жа падазрэнні.

Артыкул 115. Паведамленне аб затрыманні

1. Аб затрыманні асобы і месцы знаходжання затрыманага орган, які вядзе крымінальны працэс і ажыццявіў затрыманне, абавязаны на працягу 12 гадзін з моманту фактычнага затрымання паведаміць каму-небудзь з дарослых членаў яе сям'і ці блізкім сваякам або даць магчымасць такога паведамлення самому затрыманаму.

2. Аб затрыманні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства орган, які вядзе крымінальны працэс і ажыццявіў затрыманне, па патрабаванні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства паведамляе ў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь не пазней за адны суткі з моманту затрымання для паведамлення дыпламатычнаму прадстаўніцтву ці консульскай установе дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці або звычайнага месца жыхарства затрыманых замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства.

ГЛАВА 13
МЕРЫ СТРЫМАННЯ

Артыкул 116. Паняцце і віды мер стрымання

1. Меры стрымання – гэта прымусовыя меры, якія прымяняюцца да падазраванага ці абвінавачанага для прадухілення ўчынення імі грамадска небяспечных дзеянняў,

прадугледжаных крымінальным законам, ці дзеянняў, якія перашкаджаюць вядзенню па крымінальнай справе, а таксама для забеспячэння выканання прыгавору.

2. Мерамі стрымання з'яўляюцца:

1) падпіска аб нявыездзе і належных паводзінах;

2) асабістае паручыцельства;

3) перадача асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пад нагляд камандавання воінскай часці;

4) аддача непаўналетняга пад нагляд;

5) заклад;

6) хатні арышт;

7) узяцце пад варту.

Артыкул 117. Падставы прымянення мер стрымання

1. Меры стрымання можа прымяняць орган, які вядзе крымінальны працэс, толькі ў тым выпадку, калі сабраныя па крымінальнай справе доказы даюць дастатковыя падставы меркаваць, што падазраваны ці абвінавачаны могуць уцячы ад органа крымінальнага пераследавання і суда; перашкодзіць папярэдняму расследаванню крымінальнай справы ці разгляду яго судом, у тым ліку шляхам аказання незаконнага ўздзеяння на асоб, якія ўдзельнічаюць у крымінальным працэсе, утойвання ці фальсіфікацыі матэрыялаў, якія маюць значэнне для справы, няяўкі без уважлівых прычын на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс; учыніць прадугледжанае крымінальным законам грамадска небяспечнае дзеянне; процідзейнічаць выкананню прыгавору.

2. Пры рашэнні пытання аб неабходнасці прымянення меры стрымання да падазраванага ці абвінавачанага павінны ўлічвацца характар падазрэння ці абвінавачання, асоба падазраванага ці абвінавачанага, іх узрост і стан здароўя, род заняткаў, сямейнае і маёмаснае становішча, наяўнасць пастаяннага месца жыхарства і іншыя акалічнасці.

3. Пры адсутнасці неабходнасці ў прымяненні меры стрымання ў падазраванага ці абвінавачанага бярэцца пісьмовае абавязацельства з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс.

Артыкул 118. Прымяненне і тэрмін дзеяння меры стрымання ў адносінах да падазраванага

Пры наяўнасці падстаў і з улікам акалічнасцей, указаных у артыкулах 107 і 108 гэтага Кодэкса, мера стрымання можа быць прыменена ў адносінах да падазраванага. У такіх выпадках абвінавачанне павінна быць прад'яўлена не пазней за дзесяць сутак з моманту прымянення меры стрымання, а калі падазраваны быў затрыманы, а затым у адносінах да яго прыменена мера стрымання, – у той жа тэрмін з моманту фактычнага затрымання. У выпадку прымянення меры стрымання ў адносінах да падазраванага ва ўчыненні злачынстваў, указаных у частцы чацвёртай артыкула 108 гэтага Кодэкса, абвінавачанне павінна быць прад'яўлена ў тэрмін, не пазнейшы за дваццаць сутак з моманту фактычнага затрымання. Калі ў гэты тэрмін абвінавачанне не будзе прад'яўлена, орган крымінальнага пераследавання абавязаны неадкладна адмяніць меру стрымання.

Артыкул 119. Парадак прымянення, змянення і адмены меры стрымання

1. Аб прымяненні, змяненні або адмене меры стрымання орган дазнання, асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якія выконваюць іх абавязкі, пракурор ці суддзя выносяць пастанову, а суд – прысуд, якія павінны быць матываваны, змяшчаць указанне на злачынства, у якім падазраецца ці абвінавачваецца асоба, і абгрунтаванне неабходнасці яе прымянення, змянення або адмены.

2. На стадыі папярэдняга расследавання меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту і закладу могуць прымяняцца пракурорам ці яго намеснікам або

старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, або органам дазнання ці следчым з санкцыі пракурора ці яго намесніка, а на стадыі судовага разбору – судом.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс, абвяшчае падазраванаму ці абвінавачанаму пастанову (прысуд) аб прымяненні, змяненні або адмене меры стрымання, растлумачвае ім парадак яе (яго) абскарджання і ўручае копію пастановы (прысуду). Выкананне ўказаных дзеянняў пацвярджаецца подпісамі падазраванага ці абвінавачанага і службовай асобы, якая абвясціла пастанову (прысуд) аб прымяненні меры стрымання.

4. Мера стрымання адмяняецца, калі ў ёй адпадае далейшая неабходнасць, ці мяняецца на больш строгую ці больш мяккую, калі гэта выклікаецца акалічнасцямі крымінальнай справы.

5. Адмена ці змяненне органам дазнання ці следчым меры стрымання, прымененай з санкцыі пракурора або яго намесніка, дапускаюцца толькі са згоды пракурора ці яго намесніка.

6. Пастанову (прысуд) аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту і хатняга арышту выконваюць органы дазнання.

Артыкул 120. Падпіска аб нявыездзе і належных паводзінах

1. Падпіска аб нявыездзе і належных паводзінах заключаецца ва ўзяцці ў падазраванага ці абвінавачанага пісьмовага абавязацельства не пакідаць пастаяннае ці часовае месца жыхарства без дазволу органа крымінальнага пераследавання ці суда, не перашкаджаць расследаванню крымінальнай справы і разгляду яе ў судзе, у прызначаны тэрмін з'яўляцца на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс.

2. У выпадку парушэння падазраваным ці абвінавачаным дадзенай ім падпіскі да яго можа быць прыменена больш строгая мера стрымання, аб чым яму павінна быць абвешчана пры ўзяцці падпіскі.

Артыкул 121. Асабістае паручыцельства

1. Асабістае паручыцельства заключаецца ў прыняцці на сябе асобамі, якія заслугоўваюць даверу, пісьмовага абавязацельства аб тым, што падазраваны ці абвінавачаны, знаходзячыся на волі, не ўцякуць ад органа крымінальнага пераследавання і суда, не будуць перашкаджаць расследаванню справы ці разгляду яе судом і не будуць займацца злачыннай дзейнасцю. Колькасць паручыцеляў не можа быць меншай за два.

2. Прымяненне ў якасці меры стрымання асабістага паручыцельства дапушчальнае толькі па пісьмовым хадайніцтве паручыцеляў і са згоды асобы, у адносінах да якой даецца паручыцельства.

3. Паручыцель дае падпіску аб асабістым паручыцельстве, у якой ён пацвярджае, што яму растлумачаны сутнасць падазрэння ці абвінавачання асобы, у адносінах да якой ён дае паручыцельства, адказнасць паручыцеля.

4. Калі падазраваны ці абвінавачаны ўчыніць дзеянні, для папярэджання якіх было прыменена асабістае паручыцельства, на кожнага паручыцеля можа быць накладзена судом грашовае спагнанне ў памеры ад ста да пяцісот базавых велічынь у парадку, прадугледжаным артыкулам 134 гэтага Кодэкса.

Артыкул 122. Перадача асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пад нагляд камандавання воінскай часці

1. Перадача асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пад нагляд камандавання воінскай часці заключаецца ва ўскладанні на камандаванне воінскай часці, злучэння, начальніка ваеннай установы, дзе служаць ці праходзяць

навучальныя ці іншыя зборы (заняткі) падазраваны ці абвінавачаны, абавязку па забеспячэнні іх належных паводзін.

2. Камандаванню, пад нагляд якога перадаецца падазраваны ці абвінавачаны, уручаецца копія пастановы (прысуду) аб прымяненні ўказанай меры стрымання. Аб устанаўленні нагляду камандаванне воінскай часці пісьмова паведамляе органу, які прымяніў гэту меру стрымання.

3. Камандаванне для выканання ўскладзенага на яго абавязку па наглядзе за падпарадкаванымі яму падазраваным ці абвінавачаным мае права прымаць адпаведныя меры, прадугледжаныя Дысцыплінарным статутам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, здольныя забяспечыць належныя паводзіны гэтых асоб і іх яўку на выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс.

4. У выпадках учынення падазраваным ці абвінавачаным дзеянняў, для папярэджання якіх была прыменена гэта мера стрымання, камандаванне абавязана неадкладна паведаміць аб гэтым органу, які прымяніў гэту меру стрымання.

Артыкул 123. Аддача непаўналетняга пад нагляд

1. Аддача непаўналетняга пад нагляд бацькоў, усынавіцеляў, апекуноў, папячыцеляў ці іншых асоб, якія заслугоўваюць даверу, а таксама адміністрацыі спецыяльнай дзіцячай установы, у якой ён знаходзіцца, заключаецца ў прыняцці на сябе кім-небудзь з указаных асоб пісьмовага абавязацельства аб тым, што непаўналетнія падазраваны ці абвінавачаны, знаходзячыся на волі, не ўцякуць ад органа крымінальнага пераследавання і суда, не будуць перашкаджаць расследаванню справы і разгляду яго судом і не будуць займацца злачыннай дзейнасцю.

2. Аддача непаўналетняга пад нагляд асоб, пералічаных у частцы першай гэтага артыкула, магчымая толькі па іх пісьмовым хадайніцтве. Пры гэтым ім паведамляецца аб характары злачынства і іх адказнасці ў выпадку парушэння прынятых на сябе абавязкаў па наглядзе.

3. Да асоб, якім быў аддадзены пад нагляд непаўналетні, у выпадку невыканання імі прынятага абавязацельства могуць быць прыменены меры спагнання, прадугледжаныя часткай чацвёртай артыкула 121 гэтага Кодэкса.

Артыкул 124. Заклад

1. Заклад заключаецца ва ўнясенні ці перадачы падазраваным, абвінавачаным або іншай фізічнай асобай у орган крымінальнага пераследавання, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа, а на стадыі судовага вядзення – у суд грашовых сродкаў, каштоўных папер, каштоўнасцей, нічым не абцяжараных і не выключаных з грамадзянскага абарачэння, іншай рухомай і нерухомай маёмасці, якія належаць заклададавальніку на праве прыватнай уласнасці, у мэтах забеспячэння яўкі падазраванага ці абвінавачанага на выклік органа крымінальнага пераследавання і суда. Заклад не прымяняецца ў адносінах да асоб, падазраваных ці абвінавачаных ва ўчыненні цяжкіх або асабліва цяжкіх гвалтоўных злачынстваў. Від і памер закладу вызначае орган, які вядзе крымінальны працэс і выкарыстоўвае гэту меру стрымання, з улікам цяжару злачынства і прычыненай ім маёмаснай шкоды, асобы падазраванага ці абвінавачанага, маёмаснага становішча заклададавальніка. Памер закладу не можа быць меншы за сто базавых велічыняў. Не можа прымацца ў якасці закладу маёмасць, на якую ў адпаведнасці з заканадаўствам не можа быць накіравана спагнанне. Ацэнка прадмета закладу ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб працы з маёмасцю, канфіскаванай, арыштаванай ці накіраванай у даход дзяржавы.

2. Нерухомая маёмасць, дапушчаныя да грамадзянскага абарачэння ў Рэспубліцы Беларусь каштоўныя паперы, каштоўнасці могуць быць прыняты ў заклад пры ўмове падавання сапраўдных экзэмпляраў дакументаў, якія пацвярджаюць права ўласнасці

заклададавальніка на маёмасць, якая перадаецца ў заклад, і адсутнасці абмежаванняў (абцяжарванняў) правоў на такую маёмасць.

3. Грашовыя сродкі, якія з'яўляюцца прадметам закладу, уносяцца на дэпазітны рахунак органа крымінальнага пераследавання ці суда. Аб прыняцці закладу орган крымінальнага пераследавання ці суд складае пратакол, копія якога ўручаецца заклададавальніку.

4. Заклададавальніку, калі ім не з'яўляецца сам падазраваны ці абвінавачаны, растлумачваецца сутнасць падазрэння ці абвінавачання асобы, у адносінах да якой прымяняецца гэта мера стрымання, што пацвярджаецца подпісамі асобы, у адносінах да якой прыменена гэта мера стрымання, заклададавальніка і службовай асобы, якая прымяніла гэту меру стрымання. Копія пастановы (прысуду) уручаецца заклададавальніку для ўнясення закладу.

5. У выпадку парушэння падазраваным ці абвінавачаным абавязацельстваў, звязаных з унесеным закладам, мера стрымання мяняецца на больш строгую, а заклад накіроўваецца ў даход дзяржавы па судовым рашэнні, вынесеным у парадку, прадугледжаным артыкулам 134 гэтага Кодэкса. У астатніх выпадках суд пры пастанове прыгавору ці вынясенні прысуду (пастановы) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе вырашае пытанне аб вяртанні закладу заклададавальніку. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе на стадыі папярэдняга расследавання заклад вяртаецца па пастанове следчага, пракурора.

6. Пры пастанове абвінаваўчага прыгавору сума закладу можа быць накіравана судом у кошт пакрыцця шкоды (урону), прычыненага злачынствам, калі заклад унесены падазраваным, абвінавачаным ці асобамі, якія нясуць матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні. У выпадку, калі заклад унесены іншай фізічнай асобай, накіраванне закладу ў кошт пакрыцця шкоды (урону) дапускаецца толькі з пісьмовай згоды заклададавальніка.

7. Заклад не можа быць прадметам канфіскацыі.

Артыкул 125. Хатні арышт

1. Хатні арышт заключаецца ў ізаляцыі падазраванага ці абвінавачанага ад грамадства без утрымання яго пад вартай, але з прымяненнем праваабмежаванняў, вызначаных пракурорам ці яго намеснікам, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, або судом.

2. Хатні арышт можа суправаджацца наступнымі мерамі, якія прымяняюцца як паасобку, так і ў дапушчальнай сукупнасці:

1) забаронай выхаду з жылля поўнасцю ці ў пэўны час;

2) забаронай тэлефонных перамоў, адпраўлення карэспандэнцыі і выкарыстання сродкаў сувязі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 5 часткі 2 гэтага артыкула;

3) забаронай кантактаваць з пэўнымі асобамі і прымаць каго б там ні было ў сябе;

4) прымяненнем электронных сродкаў кантролю, пералік якіх вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, і ўскладаннем абавязку насіць пры сабе гэтыя сродкі і абслугоўваць іх працу. Парадак прымянення, нашэння і абслугоўвання гэтых сродкаў устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

5) ускладаннем абавязку адказваць на кантрольныя тэлефонныя званкі ці іншыя сігналы кантролю, званіць па тэлефоне ці асабіста з'яўляцца ў пэўны час у орган дазнання ці іншы орган, які ажыццяўляе нагляд за паводзінамі падазраванага ці абвінавачанага;

6) устанаўленнем назірання за падазраваным ці абвінавачаным ці яго жыллём, а таксама аховай яго жылля ці адведзенага яму ў жыллі памяшкання;

7) іншымі падобнымі мерамі, якія забяспечваюць належныя паводзіны і ізаляцыю падазраванага, абвінавачанага ад грамадства.

3. Падставы і парадак прымянення ў якасці меры стрымання хатняга арышту, устанаўлення і прадаўжэння яго тэрміну, адмены хатняга арышту рэгулююцца адпаведнымі нормамі гэтага Кодэкса, якія адносяцца да меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

4. Мера стрымання ў выглядзе хатняга арышту пры парушэнні ўскладзеных на падазраванага ці абвінавачанага абавязкаў і ўстаноўленых для іх праваабмежаванняў можа быць зменена пракурорам, яго намеснікам, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, або следчым з санкцыі пракурора ці яго намесніка ці судом на ўзяцце пад варту.

5. Аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе хатняга арышту ў адносінах да замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства орган, які вядзе крымінальны працэс, паведамляе ў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь па патрабаванні замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства не пазней за адны суткі з моманту прымянення меры стрымання ў выглядзе хатняга арышту для паведамлення дыпламатычнаму прадстаўніцтву ці консульскай установе дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці або звычайнага месца жыхарства ўзятых пад хатні арышт замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства.

Артыкул 126. Узяцце пад варту

1. Узяцце пад варту ў якасці меры стрымання прымяняецца толькі ў адносінах да асобы, падазраванай ці абвінавачанай ва ўчыненні злачынства, за якое законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін большы за два гады, акрамя менш цяжкага злачынства супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці (за выключэннем кантрабанды, незаконнага экспарту ці перадачы ў мэтах экспарту аб'ектаў экспартнага кантролю, легалізацыі («адмывання») сродкаў, атрыманых злачынным шляхам). Да асоб, падазраваных ці абвінавачаных ва ўчыненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства супраць міру і бяспекі чалавецтва, дзяржавы, ваеннага злачынства, злачынства, звязанага з замахам на жыццё і здароўе чалавека, мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту можа быць прыменена па матывах аднаго толькі цяжару злачынства. У выключных выпадках гэта мера стрымання можа быць прыменена ў адносінах да падазраванага ці абвінавачанага па справах аб менш цяжкіх злачынствах супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці ці аб злачынствах, за якія законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да двух гадоў, калі яны не маюць пастаяннага месца жыхарства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці не высветлена іх асоба. Да падазраваных ці абвінавачаных, якія ўцяклі ад органаў крымінальнага пераследавання ці суда, названая мера стрымання можа быць прыменена незалежна ад учыненага злачынства і прадугледжанага за яго пакарання.

2. У пастанове (прысудзе) аб прымяненні гэтай меры стрымання павінны быць выкладзены падставы і матывы, паводле якіх узнікла неабходнасць ва ўзяцці падазраванага ці абвінавачанага пад варту.

3. Пры рашэнні пытання аб дачы санкцыі ці вынясенні пастановы аб узяцці пад варту пракурор ці яго намеснік або старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якія выконваюць іх абавязкі, абавязаны вывучыць усе матэрыялы, якія змяшчаюць падставы для ўзяцця пад варту, і ў неабходных выпадках асабіста дапытаць падазраванага ці абвінавачанага, а непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага – ва ўсіх выпадках.

4. Права даваць санкцыю на ўзяцце пад варту належыць Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь, пракурорам абласцей, горада Мінска, раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённым і прыраўнаваным да іх транспартным пракурорам і іх намеснікам. Узяцце пад варту можа быць прыменена таксама па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі.

5. Асоба, узятая пад варту, яе абаронца, законны прадстаўнік маюць права абскардзіць пастанову (прысуд) органа, які вядзе крымінальны працэс, у парадку, прадугледжаным артыкулам 143 гэтага Кодэкса.

6. У выпадку адмовы пракурора ці яго намесніка ў дачы санкцыі на ўзяцце пад варту паўторны зварот за санкцыяй у адносінах да адной і той жа асобы па той жа крымінальнай справе магчымы толькі пры ўзнікненні новых акалічнасцей, якія даюць падставу для прымянення гэтай меры стрымання. Указаныя правілы дзейнічаюць таксама пры паўторным прымяненні гэтай меры стрымання пасля яе адмены судом.

7. Калі пытанне аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ў адносінах да абвінавачанага ўзнікла на судовым пасяджэнні, то рашэнне аб гэтым прымае суд па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве.

8. Аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту орган крымінальнага пераследавання ці суд абавязаны паведаміць асобам, указаным у частцы 1 артыкула 115 гэтага Кодэкса, а таксама пры прымяненні гэтай меры стрымання ў адносінах да асоб, дзеці якіх застаюцца без апекі бацькоў, – не пазней за наступны дзень пасля прыняцця ўказанага рашэння паведаміць кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства гэтых асоб для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей, пры прымяненні гэтай меры стрымання ў адносінах да пенсіянера – паведаміць органу, які выплачвае яму пенсію, пры прымяненні гэтай меры стрымання ў адносінах да замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства – на патрабаванне замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства паведаміць аб гэтым у Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь не пазней за адны суткі з моманту прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту для паведамлення дыпламатычнаму прадстаўніцтву ці консульскай установе дзяржавы грамадзянскай прыналежнасці або звычайнага месца жыхарства ўзятых пад варту замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства.

9. Парадак і ўмовы ўтрымання асоб, узятых пад варту, вызначаюцца законам.

Артыкул 127. Тэрміны ўтрымання пад вартай і парадак іх прадаўжэння

1. Мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту пры папярэднім расследаванні крымінальнай справы не можа перавышаць два месяцы.

2. Тэрмін утрымання пад вартай лічыцца з часу ўзяцця падазраванага, абвінавачанага пад варту і да перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд. У гэты тэрмін залічваецца час знаходжання асобы ў месцах пазбаўлення волі (ізалятарах часовага ўтрымання і іншых месцах утрымання арыштаваных у органах унутраных спраў і іншых органах, якія ажыццяўляюць дасудовае вядзенне), час, на працягу якога асоба ўтрымлівалася пад вартай на тэрыторыі замежнай дзяржавы ў сувязі з выдачай яе Рэспубліцы Беларусь для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання, а таксама час прымусовага знаходжання ў судова-псіхіятрычным экспертным стацыянары, дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя асобы, змешчанай у гэты стацыянар (гэту дзяржаўную арганізацыю) з санкцыі пракурора ці яго намесніка або па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, ці па пастанове (прысудзе) суда.

3. Тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай больш за два месяцы ў час папярэдняга расследавання можа быць прадоўжаны да трох месяцаў пракурорамі раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённымі і прыраўнаванымі да іх транспартнымі пракурорамі ці іх намеснікамі толькі ў выпадку немагчымасці закончыць расследаванне ў тэрмін, указаны ў частцы 1 гэтага артыкула, пры адсутнасці падстаў для прымянення ў адносінах да абвінавачанага іншай меры стрымання. Далей (да шасці месяцаў) тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай прадаўжаюць пракуроры вобласці, горада Мінска ці іх намеснікі.

4. Прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай больш за шэсць месяцаў дапускаецца толькі ў адносінах да асоб, якія абвінавачваюцца ва ўчыненні цяжкіх ці асабліва цяжкіх злачынстваў, а таксама асоб, якія ўчынілі злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і не маюць пастаяннага месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пры наяўнасці падстаў меркаваць, што яны могуць уцячы ад следства і суда за межы Рэспублікі Беларусь, а таксама ў адносінах да асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай у замежнай дзяржаве ў сувязі з выдачай іх Рэспубліцы Беларусь для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання. У гэтым выпадку тэрмін утрымання пад вартай прадаўжаюць намеснікі Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь на тэрмін да дванаццаці месяцаў, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, – на тэрмін да васямнаццаці месяцаў.

41. Тэрмін утрымання пад вартай асобы, якая выдаецца Рэспубліцы Беларусь для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання, большы за васямнаццаць месяцаў, можа прадоўжыць Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, на час, неабходны:

1) для выдачы асобы Рэспубліцы Беларусь;

2) для заканчэння папярэдняга расследавання па крымінальнай справе пасля выдачы асобы Рэспубліцы Беларусь, але не больш чым на шэсць месяцаў. Пры гэтым тэрмін утрымання пад вартай не можа перавышаць гранічнага тэрміну пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, прадугледжанага за злачынства, ва ўчыненні якога асоба абвінавачваецца.

5. Следчы, лічачы неабходным прадаўжэнне тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай, выносіць матываваную пастанову аб распачынанні хадайніцтва аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай і падае яго адпаведнаму пракурору не пазней чым за пяць сутак да сканчэння тэрміну ўтрымання пад вартай, а пры прадаўжэнні ўказанага тэрміну больш чым на шэсць месяцаў – за дзесяць сутак.

6. Далейшае прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай у час папярэдняга расследавання не дапускаецца, і абвінавачаны падлягае неадкладнаму вызваленню з-пад варты. Пры гэтым у адносінах да абвінавачанага павінна быць прыменена іншая мера стрымання, прадугледжаная артыкулам 116 гэтага Кодэкса.

7. Рашэнне пракурора аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай можа быць абскарджана ў суд у парадку, прадугледжаным артыкулам 143 гэтага Кодэкса.

8. Пасля заканчэння папярэдняга расследавання і прад'яўлення абвінавачанаму і яго абаронцу крымінальнай справы для азнаямлення тэрмін утрымання пад вартай на час, неабходны для азнаямлення са справай, працягваецца ў парадку, устаноўленым часткамі 3, 4 і 5 гэтага артыкула.

9. У выпадку, калі азнаямленне абвінавачанага і яго абаронцы з крымінальнай справай да сканчэння гранічнага тэрміну ўтрымання пад вартай, устаноўленага часткай 4 гэтага артыкула, немагчымае, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, мае права не пазней за дзесяць сутак да сканчэння гэтага тэрміну распачаць хадайніцтва перад старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай на час, неабходны для азнаямлення абвінавачанага і яго абаронцы з крымінальнай справай.

10. Хадайніцтва Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, якая выконвае яго абавязкі, накіраванае ў парадку, прадугледжаным часткай 9 гэтага артыкула, разглядае суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аднаасобна з удзелам пракурора. Паводле меркавання суда ў судовым пасяджэнні могуць удзельнічаць абвінавачаны, яго законны прадстаўнік, абаронца.

11. Суддзя ў тэрмін не пазней за пяць сутак з дня атрымання хадайніцтва выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай да моманту заканчэння азнаямлення абвінавачанага і яго абаронцы з крымінальнай справай, але не больш за шэсць месяцаў;

2) аб адмове ў задавальненні хадайніцтва Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь і аб вызваленні асобы з-пад варты.

12. У выпадку паўторнага прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ў адносінах да падазраванага, абвінавачанага па адной і той жа справе, а таксама па злучанай з гэтай ці вылучанай з яе крымінальнай справе ў ходзе папярэдняга расследавання тэрмін утрымання пад вартай лічыцца з улікам часу, раней праведзенага пад вартай.

13. Па накіраванай пракурорам у суд крымінальнай справе тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай працягвае суд, у вядзенні якога знаходзіцца справа. Пытанне аб далейшым утрыманні абвінавачанага пад вартай суд разглядае ў тэрмін не большы за дзесяць сутак да сканчэння кожнага месяца тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай. Суд прысудам (пастановай) або працягвае тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай, або адмяняе ці змяняе меру стрымання. Абвінавачаны не можа ўтрымлівацца пад вартай па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў вядзенні любога суда, больш за шэсць месяцаў з дня паступлення крымінальнай справы ў суд і да пастановы прыгавору, а па справах у адносінах да асоб, якія абвінавачваюцца ва ўчыненні цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, – больш за дванаццаць месяцаў. Тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай з дня пастановы прыгавору і да яго ўступлення ў законную сілу не можа перавышаць тры месяцы, а па справах у адносінах да асоб, якія абвінавачваюцца ва ўчыненні цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, – шэсць месяцаў. Прысуд (пастанова) суда аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячы суд, рашэнне якога з'яўляецца канчатковым.

13[1]. Па крымінальнай справе ў адносінах да асобы, якая абвінавачваецца ва ўчыненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, калі разгляд крымінальнай справы судом да сканчэння тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай, прадугледжанага часткай 13 гэтага артыкула, немагчымы, а з-за акалічнасцей крымінальнай справы мера стрымання не можа быць зменена, суд, які разглядае крымінальную справу, мае права не пазней за дзесяць сутак да сканчэння гэтага тэрміну распачаць хадайніцтва перад Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай на час, неабходны для разгляду крымінальнай справы судом.

13[2]. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь не пазней за пяць сутак з дня атрымання хадайніцтва, указанага ў частцы 131 гэтага артыкула, выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай на час, неабходны для разгляду крымінальнай справы судом, але не больш за шэсць месяцаў;

2) аб адмове ў задавальненні хадайніцтва суда.

14. Пры накіраванні крымінальнай справы ў суд для новага судовага разбору пасля адмены прыгавору, па якім тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай, устаноўлены часткай 1 гэтага артыкула, скончыўся, а з-за акалічнасцей справы мера стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай не можа быць зменена, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай праводзіцца судом, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа, у парадку і межах, устаноўленых часткай 13 гэтага артыкула. Пры гэтым тэрмін утрымання пад вартай лічыцца без уліку часу, раней праведзенага пад вартай.

15. Пры вяртанні пракурорам ці яго намеснікам для правядзення дадаткова папярэдняга расследавання крымінальнай справы, па якой тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай, устаноўлены часткай 1 гэтага артыкула, скончыўся, а з-за акалічнасцей справы мера стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай не можа быць зменена, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай праводзіцца пракурорам, які

ажыццяўляе нагляд, ці яго намеснікам у межах аднаго месяца ў адпаведнасці з паўнамоцтвамі, вызначанымі часткамі 3 і 4 гэтага артыкула. Аб гэтым пракурорам ці яго намеснікам выносіцца адпаведная пастанова. Далейшае прадаўжэнне ўказанага тэрміну праводзіцца з улікам усяго часу знаходжання абвінавачанага пад вартай у межах і парадку, устаноўленых часткамі 2, 3 і 4 гэтага артыкула.

16. Тэрмін утрымання абвінавачанага пад вартай па справе, якая паступіла для накіравання ў суд, можа быць прадоўжаны пракурорам ці яго намеснікам на тэрмін да пяці сутак, па складаных і шматэпізодных крымінальных справах – да пятнаццаці сутак, а ў выпадку заявы абвінавачаным хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, – на час, неабходны для разгляду ва ўстаноўленым парадку гэтага хадайніцтва.

ГЛАВА 14
ІНШЫЯ МЕРЫ ПРАЦЭСУАЛЬНАГА ПРЫМУСУ

Артыкул 128. Падставы для прымянення іншых мер працэсуальнага прымусу

1. У мэтах забеспячэння прадугледжанага гэтым Кодэксам парадку папярэдняга расследавання і судовага разбору крымінальнай справы, належнага выканання прыгавору орган крымінальнага пераследавання ці суд мае права прымяніць да падазраванага ці абвінавачанага іншыя меры працэсуальнага прымусу: абавязацельства аб яўцы, прывод, часовае адхіленне ад пасады, накладанне арышту на маёмасць, часовае абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, орган крымінальнага пераследавання ці суд мае права прымяніць да пацярпелага, сведкі і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у крымінальным працэсе, меры працэсуальнага прымусу: абавязацельства аб яўцы, прывод, грашовае спагнанне.

Артыкул 129. Абавязацельства аб яўцы

Пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што падазраваны ці абвінавачаны, да якіх не прыменена мера стрымання, могуць ухіліцца ад удзелу ў следчых дзеяннях ці ў судовым разборы або ад яўкі на выклік без уважлівых прычын, у названых асоб можа быць узята пісьмовае абавязацельства своечасова з'яўляцца на выклік органа, які вядзе крымінальны працэс, а ў выпадку перамены месца жыхарства яны павінны неадкладна паведамляць аб гэтым.

Артыкул 130. Прывод

1. У выпадку няяўкі на выклік без уважлівых прычын падазраваны, абвінавачаны, а таксама пацярпелы, сведка могуць быць па матываванай пастанове органа дазнання, следчага, пракурора, дзяржаўнага абвінаваўцы, суддзі ці па прысудзе суда падвергнуты прыводу. Аб наяўнасці прычын, якія перашкаджаюць яўцы на выклік у прызначаны тэрмін, асоба, яго якая атрымала, абавязана паведаміць органу, які яго выклікаў.

2. Пастанова (прысуд) аб прыводзе абвяшчаецца асобе, у адносінах да якой яна(ён) вынесена(ы), перад яе(яго) выкананнем, што сведчыцца яе подпісам на пастанове (прысудзе).

3. Прывод не можа праводзіцца ў начны час.

4. Не падлягаюць прыводу непаўналетнія ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, цяжарныя жанчыны, хворыя асобы, якія з-за стану здароўя не могуць ці не павінны пакідаць месца свайго знаходжання, што пацвярджае ўрач, які працуе ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

5. Прывод праводзяць органы ўнутраных спраў. У выпадку немагчымасці выканання прыводу ў тэрміны, указаныя ў адпаведнай пастанове (прысудзе), аб

прычынах невыканання неадкладна паведамляецца органу (службовай асобе), паводле рашэння якога ажыццяўляецца прывод.

Артыкул 131. Часовае адхіленне ад пасады

1. Пракурор, яго намеснік або старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якія выконваюць іх абавязкі, а таксама следчы з санкцыі пракурора ці яго намесніка або суд мае права адхіліць ад пасады падазраванага ці абвінавачанага, калі ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што, застаючыся ў пасадзе, яны будуць перашкаджаць папярэдняму расследаванню і судоваму разбору крымінальнай справы, пакрыццю прычыненай злачынствам шкоды ці працягваць займацца злачыннай дзейнасцю, звязанай са знаходжаннем у гэтай пасадзе. Адхіленне ад пасады асоб, пасады якіх уключаны ў кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, дапускаецца толькі са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Адхіленне ад пасады заключаецца ў забароне падазраванаму ці абвінавачанаму выконваць службовыя паўнамоцтвы, выконваць працу, якую яны выконвалі, ці займацца дзейнасцю, якой яны займаліся, аб чым выносіцца адпаведная пастанова (прысуд), якая(і) падлягае неадкладнаму выкананню.

3. Часова адхіленыя ад пасады падазраваны ці абвінавачаны маюць права на штомесячную дзяржаўную дапамогу, калі яны не займаюцца іншай аплатнай дзейнасцю. У выпадку прымянення ў адносінах да падазраванага ці абвінавачанага, часова адхіленых ад пасады, меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту выплата штомесячнай дзяржаўнай дапамогі прыпыняецца.

4. Часовае адхіленне ад пасады адмяняецца прысудам суда або пастановай суддзі, пракурора ці яго намесніка, або пастановай старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, або пастановай следчага са згоды пракурора ці яго намесніка, калі ў гэтай меры адпадае неабходнасць. Адхіленне ад пасады асоб, пасады якіх уключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, адмяняецца толькі са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, калі ўказаныя асобы ва ўстаноўленым парадку не вызвалены ад пасады. Пастанова (прысуд) аб адмене часовага адхілення падазраванага ці абвінавачанага ад пасады накіроўваецца па месцы іх працы (службы).

Артыкул 132. Накладанне арышту на маёмасць

1. У мэтах забеспячэння пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненай злачынствам, спагнання даходу, атрыманага злачынным шляхам, грамадзянскага іску, іншых маёмасных спагнанняў, спецыяльнай канфіскацыі орган, які вядзе крымінальны працэс, мае права накласці арышт на маёмасць падазраванага, абвінавачанага ці асоб, якія нясуць паводле закона матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні.

2. Органам дазнання ці следчым з санкцыі пракурора ці яго намесніка, пракурорам ці яго намеснікам, судом можа быць накладзены арышт на маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці іншых асоб, для праверкі яе фактычнай прыналежнасці, крыніц паходжання і законнасці адчужэння, калі ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што гэта маёмасць была адчужана падазраваным, абвінавачаным у мэтах скрывання прыналежнасці ці крыніц паходжання такой маёмасці або для фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці, тэрарызму, экстрэмісцкай дзейнасці (экстрэмізму), арганізаванай групы, незаконнага ўзброенага фарміравання, злачыннай арганізацыі, распаўсюджвання ці фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння.

3. Арышт на маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці іншых асоб, накладаецца на час папярэдняга расследавання і (ці) судовага разбору.

4. У выпадку непацвярджэння фактычнай прыналежнасці маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці іншых асоб, падазраванаму, абвінавачанаму ці яе адчужэння ў мэтах скрывання прыналежнасці ці крыніц паходжання або для фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці, тэрарызму, экстрэмісцкай дзейнасці (экстрэмізму), арганізаванай групы, незаконнага

ўзброенага фарміравання, злачыннай арганізацыі, распаўсюджвання ці фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння, а таксама пры прыпыненні або спыненні папярэдняга расследавання рашэнне аб накладанні арышту на маёмасць, якая знаходзіцца ва ўласнасці іншых асоб, падлягае адмене. Пытанні, звязаныя з пакрыццём маёмаснай шкоды, прычыненай у сувязі з накладаннем арышту на маёмасць, вырашаюцца пасля адмены рашэння аб накладанні арышту на маёмасць у парадку грамадзянскага судаводства.

5. Накладанне арышт на маёмасць, якая знаходзіцца ў жыллі ці іншым законным валоданні, накладаецца толькі са згоды ўласніка (уладальніка) жылля ці іншага законнага валодання ці паўналетняй асобы, якая пражывае ў жыллі, або з санкцыі пракурора, яго намесніка, або па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, ці па пастанове (прысудзе) суда.

6. Арышт на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках і (ці) ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, а таксама на электронныя грошы накладаецца з санкцыі пракурора, яго намесніка або па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, ці па пастанове (прысудзе) суда.

7. Накладанне арышту на маёмасць заключаецца ў забароне, адрасаванай уласніку (уладальніку) маёмасці, на распараджэнне, а ў неабходных выпадках і карыстанне гэтай маёмасцю або ў адабранні маёмасці і перадачы яе на захоўванне.

8. Аб накладанні арышту на маёмасць выносіцца матываваная пастанова (прысуд) і складаецца пратакол вопісу арыштаванай маёмасці, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 10 гэтага артыкула. Копіі пастановы (прысуду) аб накладанні арышту на маёмасць і пратакола вопісу ўручаюцца ўласніку (уладальніку) маёмасці, а пры накладанні арышту на маёмасць, якая знаходзіцца ў жыллі ці іншым законным валоданні, уласніку (уладальніку) жылля ці іншага законнага валодання ці паўналетняй асобе, якая пражывае ў жыллі. Пры накладанні арышту на маёмасць можа ўдзельнічаць спецыяліст, у тым ліку для вызначэння кошту маёмасці.

9. У пастанове (прысудзе) аб накладанні арышту на маёмасць асоб, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, выкладаюцца акалічнасці, якія сталі падставай для прыняцця такога рашэння. Копіі пастановы (прысуду) аб накладанні арышту на маёмасць і пратакола вопісу ўручаюцца асобе, на маёмасць якой накладзены арышт.

10. Пры накладанні арышту на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках і (ці) ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, а таксама на электронныя грошы пратакол вопісу не складаецца, а ўласніку (уладальніку) уручаецца копія пастановы (прысуду) аб накладанні арышту на маёмасць. Пратакол вопісу складаецца ў выпадку накладання арышту на маёмасць, якая знаходзіцца на захоўванні ў банку і (ці) нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі.

11. Арышт у мэтах забеспячэння пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненага злачынствам, спагнання даходу, атрыманага злачынным шляхам, грамадзянскага іску, іншых маёмасных спагнанняў не можа быць накладзены на маёмасць, унесеную ці перададзеную ў якасці закладу ў парадку, устаноўленым артыкулам 124 гэтага Кодэкса, маёмасць згодна з дадаткам да гэтага Кодэкса, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, за выключэннем маёмасці, якая падлягае спецыяльнай канфіскацыі.

12. Пры накладанні (адмене) арышту на маёмасць, якая падлягае рэгістрацыі (дзяржаўнай рэгістрацыі), а таксама на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках і (ці) ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, бездакументарныя каштоўныя паперы, электронныя грошы пастанова (прысуд) органа, які вядзе крымінальны працэс, неадкладна накіроўваецца ў адпаведную арганізацыю (орган), якая ажыццяўляе рэгістрацыю (дзяржаўную рэгістрацыю) маёмасці, банк і (ці) нябанкаўскую крэдытна-фінансавую арганізацыю, дэпазітарый, арганізацыю, якая ажыццяўляе аперацыі з

электроннымі грашамі, для забеспячэння выканання (рэгістрацыі (дзяржаўнай рэгістрацыі), фіксацыі, адмены) арышту на маёмасць.

13. Пры накладанні арышту на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках і (ці) ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, а таксама на электронныя грошы расходныя аперацыі з імі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, спыняюцца ў поўным аб'ёме або ў межах сум, што вызначаюцца органам, які вядзе крымінальны працэс, што павінна быць адлюстравана ў пастанове (прысудзе) аб накладанні арышту на маёмасць.

14. Маёмасць, на якую накладзены арышт, можа быць адабрана і перададзена на захоўванне прадстаўніку мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, уласніку (уладальніку) гэтай маёмасці ці іншай асобе, якія павінны быць папярэджаны аб адказнасці за захаванасць маёмасці, аб чым бярэцца падпіска. У выпадку неабходнасці орган, які вядзе крымінальны працэс, мае права змяніць месца захоўвання адабранай маёмасці, аб чым выносіцца адпаведная пастанова (прысуд).

15. Адабранне на захоўванне арыштаваных грашовых сродкаў, якія знаходзяцца на рахунках і (ці) ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, ажыццяўляецца на рахунку органа, які вядзе крымінальны працэс, прызначаны для захоўвання грашовых сродкаў, на якія накладзены арышт, у бясспрэчным парадку спісання грашовых сродкаў, устаноўленым заканадаўствам.

16. Накладанне арышту на маёмасць адмяняецца пастановай (прысудам) органа, які вядзе крымінальны працэс, калі ў гэтым адпадае неабходнасць.

17. Паводле хадайніцтва падазраванага, абвінавачанага, асоб, якія нясуць паводле закона матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні, асоб, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, арышт на грашовыя сродкі можа быць адменены органам, што вядзе крымінальны працэс, у частцы, неабходнай для штомесячнага забеспячэння іх саміх і непрацаздольных асоб, якія знаходзяцца ў іх на ўтрыманні, у памеры бюджэту пражытачнага мінімуму, устаноўленага заканадаўствам, пры адсутнасці ў іх іншых даходаў ад законнай дзейнасці.

18. Пастанова (прысуд) аб накладанні арышту на маёмасць можа быць таксама адменена ў выпадку заявы падазраваным, абвінавачаным ці асобамі, якія нясуць па законе матэрыяльную адказнасць за іх дзеянні, хадайніцтва аб вызваленні маёмасці ад арышту для яе рэалізацыі ў мэтах пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненага злачынствам, выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, іншых маёмасных спагнанняў пад кантролем органа, які вядзе крымінальны працэс.

19. Пастанова (прысуд) аб накладанні арышту на маёмасць можа быць абскарджана ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Калі працэсуальныя адносіны, якія ўзніклі ў сувязі з накладаннем арышту на маёмасць, не ўрэгуляваны гэтым Кодэксам, то прымяняюцца нормы грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства, калі яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу.

Заўвага. Пад маёмасцю для мэт гэтага артыкула разумеюцца любыя рэчы, уключаючы наяўныя грашовыя сродкі і дакументарныя каштоўныя паперы, безнаяўныя грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках, ва ўкладах (дэпазітах) у банках і (ці) нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях, бездакументарныя каштоўныя паперы; электронныя грошы; маёмасныя правы, а таксама выключныя правы на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці.

Артыкул 132[1]. Часовае абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь

1. Пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што падазраваны ці абвінавачаны, якія не ўтрымліваюцца пад вартай, могуць ухіліцца ад удзелу ў следчых дзеяннях ці ў судовым разборы або ад яўкі на выклік без уважлівых прычын, пакінуўшы межы Рэспублікі Беларусь, орган дазнання, следчы, пракурор і суд маюць права часова абмежаваць іх права на выезд з Рэспублікі Беларусь.

2. Часовае абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь заключаецца ў забароне падазраванаму ці абвінавачанаму пакідаць межы Рэспублікі Беларусь, аб чым выносіцца адпаведная пастанова (прысуд).

3. Падазраванаму ці абвінавачанаму, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана, у сувязі з неабходнасцю іх удзелу ў крымінальным працэсе за межамі Рэспублікі Беларусь ці аказанні ім медыцынскай дапамогі, якая не можа быць аказана ў Рэспубліцы Беларусь, або ў сувязі з цяжкім захворваннем ці смерцю блізкага сваяка, які пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, можа быць дазволены выезд з Рэспублікі Беларусь на пэўны тэрмін, аб чым выносіцца адпаведная пастанова (прысуд).

4. Часовае абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь адмяняецца пастановай (прысудам) органа, які вядзе крымінальны працэс, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа, калі ў гэтай меры адпадае неабходнасць.

5. Орган, які вядзе крымінальны працэс, абвяшчае падазраванаму ці абвінавачанаму пастанову (прысуд) аб прымяненні ці адмене меры працэсуальнага прымусу ў выглядзе часовага абмежавання права на выезд з Рэспублікі Беларусь, растлумачвае ім парадак яе(яго) абскарджання і ўручае копію пастановы (прысуду). Выкананне ўказаных дзеянняў пасведчваецца подпісамі падазраванага ці абвінавачанага і службовай асобы, якая абвясціла пастанову (прысуд) аб прымяненні меры працэсуальнага прымусу.

6. Пры прымяненні меры працэсуальнага прымусу ў выглядзе часовага абмежавання права на выезд з Рэспублікі Беларусь, яе адмене, дазволе асобе выезду з Рэспублікі Беларусь на пэўны тэрмін орган, які вядзе крымінальны працэс, не пазней за адзін дзень з даты прыняцця адпаведнага рашэння ва ўстаноўленым парадку накіроўвае звесткі аб падазраваным ці абвінавачаным для ўключэння ў банк даных аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана, ці ў Спіс асоб, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана.

Артыкул 133. Выключаны

Артыкул 134. Парадак накладання грашовага спагнання і накіравання закладу ў даход дзяржавы

1. Грашовае спагнанне, прадугледжанае часткай 4 артыкула 121 гэтага Кодэкса, накладае суд. Падставай для гэтага з'яўляецца пратакол аб парушэнні, складзены органам крымінальнага пераследавання.

2. Закладу накіроўваецца ў даход дзяржавы ў выпадку, прадугледжаным часткай 5 артыкула 124 гэтага Кодэкса. Падставай для гэтага з'яўляецца пратакол аб парушэнні падазраваным ці абвінавачаным абавязацельстваў, звязаных з унесеным закладам.

3. У пратаколе ўказваюцца час і месца яго складання, кім ён складзены, звесткі аб асобе парушальніка, акалічнасці парушэння, выкладаецца тлумачэнне парушальніка. Пратакол падпісвае асоба, якая яго склала, і парушальнік У выпадку адмовы парушальніка ад падпісання пратакола ў ім робіцца запіс аб гэтым. Пратакол аб парушэнні накіроўваецца ў раённы (гарадскі) суд і падлягае разгляду суддзёй аднаасобна на працягу пяці сутак. На судовае пасяджэнне выклікаюцца парушальнік і асоба, якая склала пратакол, ці пракурор. Няяўка парушальніка без уважлівых прычын не перашкаджае разгляду пратакола. Прачытаўшы ўголас пратакол, суддзя выслухвае тлумачэнне парушальніка і меркаванне асобы, якая склала пратакол, або пракурора і выносіць матываваную пастанову аб накладанні грашовага спагнання, аб накіраванні закладу ў даход дзяржавы ці аб адмове ў гэтым. Копія пастановы накіроўваецца асобе, якая склала пратакол, і парушальніку.

4. Суддзя, які вынес пастанову аб накладанні грашовага спагнання, мае права адтэрмінаваць ці растэрмінаваць выкананне пастановы на тэрмін да трох месяцаў.

РАЗДЗЕЛ V
ХАДАЙНІЦТВЫ І СКАРГІ

ГЛАВА 15
ХАДАЙНІЦТВЫ

Артыкул 135. Асобы, якія маюць права заявіць хадайніцтвы

Удзельнікі крымінальнага працэсу маюць права звяртацца ў орган, які вядзе крымінальны працэс, з хадайніцтвамі аб правядзенні працэсуальных дзеянняў ці прыняцці працэсуальных рашэнняў для выяўлення акалічнасцей, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, забеспячэння правоў і законных інтарэсаў асобы, якая звярнулася з хадайніцтвам, ці асобы, якую яны прадстаўляюць.

Артыкул 136. Заява хадайніцтваў

1. Заява хадайніцтваў магчымая ў любой стадыі крымінальнага працэсу. У хадайніцтве павінна быць указана, для выяўлення якіх акалічнасцей неабходна правесці працэсуальнае дзеянне ці прыняць працэсуальнае рашэнне. Пісьмовыя хадайніцтвы дадаюцца да крымінальнай справы, вусныя заносяцца ў пратакол следчага дзеяння ці судовага пасяджэння.

2. Адхіленне хадайніцтва не пазбаўляе заяўніка права зноў звярнуцца з хадайніцтвам у той жа ці іншай стадыі крымінальнага працэсу.

Артыкул 137. Тэрміны разгляду і вырашэння хадайніцтваў

1. Хадайніцтва падлягае разгляду і вырашэнню непасрэдна пасля яго заявы. У выпадках, калі неадкладнае прыняцце рашэння аб хадайніцтве немагчымае, яно павінна быць вырашана не пазней за трое сутак з моманту яго заявы.

2. Хадайніцтва павінна быць задаволена, калі яно дапамагае ўсебаковаму, поўнаму і аб'ектыўнаму даследаванню акалічнасцей крымінальнай справы, забеспячэнню правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу ці іншых асоб.

3. У выпадку поўнай ці частковай адмовы ў задавальненні хадайніцтва орган, які вядзе крымінальны працэс, выносіць матываваную пастанову (прысуд), якая(ое) не пазней за трое сутак даводзіцца да ведама асобы, якая заявіла хадайніцтва. Рашэнне аб хадайніцтве можа быць абскарджана па агульных правілах падачы і разгляду скаргаў, устаноўленых гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 16
АБСКАРДЖАННЕ І АПРАТЭСТАВАННЕ ДЗЕЯННЯЎ І РАШЭННЯЎ ОРГАНА, ЯКІ ВЯДЗЕ КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Артыкул 138. Права абскарджання дзеянняў і рашэнняў органа, які вядзе крымінальны працэс

Дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, могуць быць абскарджаны ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку ўдзельнікамі крымінальнага працэсу, а таксама іншымі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі, калі працэсуальныя дзеянні і рашэнні, якія праводзяцца, закранаюць іх інтарэсы.

Артыкул 139. Падача скаргаў

1. Скаргі асоб, указаных у артыкуле 138 гэтага Кодэкса, на дзеянні і рашэнні органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, і следчага падаюцца пракурору, які ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў пры правядзенні папярэдняга расследавання, а скаргі на дзеянні і рашэнні следчага могуць падавацца таксама начальніку следчага падраздзялення. Скаргі на дзеянні і рашэнні пракурора падаюцца вышэйстаячаму пракурору, на дзеянні і рашэнні начальніка следчага падраздзялення – вышэйстаячаму начальніку следчага падраздзялення, а на дзеянні і рашэнні суда – у вышэйстаячы суд.

2. Скаргі на рашэнні органа крымінальнага пераследавання аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні папярэдняга расследавання крымінальнай справы, крымінальнага пераследавання, аб адмове ў распачынанні

вядзення з-за акалічнасцей, якія нядаўна адкрыліся, падаюцца адпаведнаму пракурору ці ў суд па месцы расследавання крымінальнай справы або разгляду заявы ці паведамлення аб злачынстве. Скаргі на рашэнні следчага аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні папярэдняга расследавання крымінальнай справы, крымінальнага пераследавання могуць быць таксама пададзены адпаведнаму начальніку следчага падраздзялення.

3. Адміністрацыя месцаў папярэдняга зняволення абавязана не пазней за адны суткі перадаць органу, які вядзе крымінальны працэс, скаргі асоб, затрыманых з-за падазрэння ва ўчыненні злачынства ці ўзятых пад варту ў якасці меры стрымання.

4. Службовая асоба, да якой паступіла скарга на яе ўласныя дзеянні ці рашэнні, абавязана на працягу 24 гадзін накіраваць скаргу адпаведнаму начальніку следчага падраздзялення, пракурору, а суддзя – у вышэйстаячы суд.

5. Скаргі могуць быць пададзены ў вуснай ці пісьмовай форме. Вусныя скаргі заносяцца ў пратакол, які падпісваюць заяўнік і службовая асоба, якая прыняла скаргу. Да скаргі могуць быць прыкладзены дадатковыя матэрыялы.

6. Асобе, якая не валодае мовай, на якой ажыццяўляецца вядзенне па крымінальнай справе, забяспечваецца права падаваць скаргі на роднай ці іншай мове, якой яна валодае.

Артыкул 140. Тэрміны падачы скаргаў і парадак іх разгляду

1. Скаргі на дзеянні і рашэнні органа, які вядзе крымінальны працэс, могуць быць пададзены на працягу ўсяго тэрміну правядзення дазнання, папярэдняга следства і судовага разбору. Скаргі на рашэнні аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні папярэдняга расследавання па крымінальнай справе або крымінальнага пераследавання падаюцца ў межах тэрміну даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, а ў выпадку, калі такія рашэнні прыняты на падставе, указанай у пункце 3 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, – у месячны тэрмін з дня прыняцця органам, які вядзе крымінальны працэс, адпаведнага рашэння. Скаргі на прыгаворы, пастановы (прысуды) судоў першай інстанцыі падаюцца ў тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

2. Забараняецца даручаць разгляд скаргі службовай асобе, дзеянні якой абскарджваюцца, або службовай асобе, якая зацвердзіла рашэнне, што абскарджваецца.

3. Разглядаючы скаргу, адпаведная службовая асоба абавязана ўсебакова праверыць выкладзеныя ў ёй доказы, выпатрабаваць пры неабходнасці дадатковыя матэрыялы і тлумачэнні.

4. Службовая асоба, якая разглядае скаргу, абавязана ў межах сваіх паўнамоцтваў неадкладна прыняць меры для аднаўлення парушаных правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу, а таксама іншых асоб, указаных у артыкуле 138 гэтага Кодэкса.

5. Калі неправамернымі дзеяннямі ці рашэннямі, якія абскарджваюцца, асобе прычынена шкода, ёй павінны быць растлумачаны права на пакрыццё ці ліквідацыю шкоды і парадак ажыццяўлення гэтага права, прадугледжаны главой 48 гэтага Кодэкса.

Артыкул 141. Прыпыненне выканання рашэння ў сувязі з падачай скаргі

1. Орган дазнання, асоба, якая праводзіць дазнанне, следчы, пракурор, чые дзеянні і рашэнні абскарджваюцца, а таксама начальнік следчага падраздзялення ці пракурор, які разглядае скаргу, маюць права прыпыніць выкананне рашэння, якое аспрэчваецца, за выключэннем скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай і хатняга арышту, а таксама на прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар.

2. Старшыня следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якія выконваюць іх абавязкі, чые

пастановы аб прымяненні меры стрымання ці правядзенні працэсуальных дзеянняў абскарджваюцца, маюць права прыпыніць выкананне рашэння, якое аспрэчваецца, за выключэннем скаргаў на затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт, а таксама на прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар.

Артыкул 142. Парадак разгляду скаргаў на дзеянні і рашэнні органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора

1. Начальнік следчага падраздзялення, пракурор ці суддзя на працягу дзесяці сутак пасля атрымання скаргі абавязаны разгледзець яе і паведаміць заяўніку аб выніках разгляду.

2. У выніку разгляду скаргі начальнікам следчага падраздзялення ці пракурорам можа быць прынята рашэнне аб поўным ці частковым яе задавальненні з адменай ці змяненнем рашэння, якое абскарджваецца, або аб адмове ў задавальненні скаргі. Прынятае пракурорам, начальнікам следчага падраздзялення рашэнне можа быць абскарджана вышэйстаячаму пракурору, начальніку следчага падраздзялення, якія абавязаны разгледзець скаргу па крымінальнай справе, якая знаходзіцца ў вядзенні органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, на працягу дзесяці сутак, а ў астатніх выпадках – не пазней за адзін месяц з дня яе паступлення.

3. Скаргу на адмову ў распачынанні крымінальнай справы, спыненне папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, адмову ў распачынанні вядзення з-за акалічнасцей, якія нядаўна адкрыліся, аднаасобна разглядае суддзя з удзелам пракурора па месцы расследавання крымінальнай справы або разгляду заявы ці паведамлення аб злачынстве.

4. У судовым пасяджэнні мае права прымаць удзел падазраваны, абвінавачаны, яго абаронца і законны прадстаўнік, прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык ці іх прадстаўнікі, а таксама асоба ці прадстаўнік дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, па заявах якіх была распачата крымінальная справа ці прынята рашэнне аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы.

5. Па скарзе на адмову ў распачынанні крымінальнай справы, спыненне папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, адмову ў распачынанні вядзення з-за акалічнасцей, якія нядаўна адкрыліся, суддзя выносіць матываваную пастанову аб задавальненні скаргі і адмене пастановы ці пакіданні скаргі без задавальнення. Пастанова суддзі аб адмене пастановы аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, аб адмове ў распачынанні вядзення з-за акалічнасцей, якія нядаўна адкрыліся, накіроўваецца кіраўніку адпаведнага органа для аднаўлення вядзення па справе ці для правядзення дадатковай праверкі па матэрыяле. Копія пастановы накіроўваецца пракурору.

6. Пастанова суддзі аб скарзе на адмову ў распачынанні крымінальнай справы, спыненне папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, адмову ў распачынанні вядзення з-за акалічнасцей, якія нядаўна адкрыліся, уступае ў законную сілу неадкладна, але можа быць абскарджана асобамі, указанымі ў частцы 4 гэтага артыкула, ці апратэставана пракурорам у адпаведнасці з правіламі главы 42 гэтага Кодэкса.

7. Асоба, якая падала скаргу на дзеянні і рашэнні органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, пастановы старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, аб прымяненні меры стрымання ці правядзенні працэсуальных дзеянняў, павінна быць апавешчана аб рашэнні, прынятым па скарзе, і далейшым парадку абскарджання. Адмова ў задавальненні скаргі павінна быць матывавана.

8. Адмена вышэйстаячым пракурорам ці судом пастаноў следчага ці пракурора аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці і спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у артыкуле 30 гэтага Кодэкса, дапускаецца на працягу аднаго года пасля іх вынясення.

Артыкул 143. Парадак абскарджання ў суд затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту

1. Скаргі асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, на затрыманне, прымяненне меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай падаюцца ў суд праз адміністрацыю месца папярэдняга зняволення, а скаргі асоб, якія ўтрымліваюцца пад хатнім арыштам, і іншых асоб на затрыманне, прымяненне меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту падаюцца ў орган, які вядзе крымінальны працэс.

2. Адміністрацыя месца папярэдняга зняволення абавязана на працягу 24 гадзін пасля атрымання скаргі накіраваць яе ў адпаведны орган, які вядзе крымінальны працэс, аб чым паведамляе асобе, якая падала скаргу, а таксама пракурору, старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобам, якія выконваюць іх абавязкі, і суду, які прыняў рашэнне аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ці аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай.

3. Орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны ў адносінах да затрыманага на працягу 24 гадзін, а ў адносінах да ўзятага пад варту, які ўтрымліваецца пад хатнім арыштам, – на працягу 72 гадзін з моманту атрымання скаргі накіраваць яе ў суд з дадаваннем матэрыялаў крымінальнай справы, якія пацвярджаюць законнасць і абгрунтаванасць затрымання, прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту. Суд мае права таксама выпатрабаваць іншыя матэрыялы, неабходныя для вырашэння скаргі. У выпадку паступлення некалькіх скаргаў у адносінах да адной і той жа асобы яны накіроўваюцца ў суд адначасова. Орган, які ажыццяўляе крымінальнае перасследаванне, а таксама суд, які вынес пастанову (прысуд) аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, ці прадоўжыў тэрмін утрымання пад вартай, хатняга арышту, мае права прадставіць свае абгрунтаванні законнасці і абгрунтаванасці затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту, прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту.

4. Падача скаргі не прыпыняе дзеянне рашэння аб затрыманні, узяцці пад варту, хатнім арышце ці прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту.

Артыкул 144. Судовая праверка законнасці і абгрунтаванасці прымянення затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту

1. Судовая праверка законнасці і абгрунтаванасці затрымання праводзіцца ў тэрмін, не большы за 24 гадзіны, а ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту – у тэрмін, не большы за 72 гадзіны з часу паступлення скаргі аднаасобна суддзёй па месцы папярэдняга расследавання крымінальнай справы, а прысуду (пастановы) суда аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту – аднаасобна суддзёй вышэйстаячага суда з абавязковым удзелам пракурора. Скаргі ў адносінах да адной і той жа асобы разглядаюцца ў адным вядзенні.

2. Разгляд скаргі праводзіцца на закрытым судовым пасяджэнні, у якім мае права прымаць удзел пацярпелы, яго прадстаўнік, абаронца (калі ён удзельнічае ў справе),

законныя прадстаўнікі падазраванага, абвінавачанага. Няяўка ўказаных асоб не перашкаджае разгляду скаргі.

3. У неабходных выпадках для ўдзелу ў разглядзе скаргі суддзя мае права выклікаць затрыманага, асобу, якая ўтрымліваецца пад вартай, хатнім арыштам.

4. У пачатку судовага пасяджэння суддзя абвяшчае, якая скарга падлягае разгляду, прадстаўляецца ўдзельнікам судовага пасяджэння, прадстаўляе пракурора і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), растлумачвае ўдзельнікам судовага пасяджэння іх правы і абавязкі і бярэ ў асоб, указаных у частцы другой гэтага артыкула, падпіску аб нераскрыцці даных закрытага судовага пасяджэння. Затым суддзя заслухоўвае асобу, якая падала скаргу, калі яна ўдзельнічае ў судовым пасяджэнні, і заключэнне пракурора.

5. Па выніках судовай праверкі суддзя выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб вызваленні затрыманага, адмене меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту і вызваленні яго з-пад варты, хатняга арышту ў выпадку выяўлення парушэння органам дазнання, следчым, пракурорам, судом патрабаванняў артыкулаў 108, 110, 114, 125–127 гэтага Кодэкса ці права падазраванага, абвінавачанага на абарону, неабгрунтаванасці прымянення затрымання, узяцця пад варту ці хатняга арышту або неадпаведнасці прад'яўленага абвінавачання зместу пастановы аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту. Пры гэтым суддзя абавязаны прымяніць у адносінах да асобы, вызваленай з-пад варты, хатняга арышту, іншую меру стрымання, прадугледжаную гэтым Кодэксам, і растлумачыць, што ў выпадку парушэння ўмоў прымененай судом меры стрымання асоба можа быць ізноў узята пад варту, хатні арышт;

2) аб пакіданні скаргі без задавальнення.

Артыкул 145. Парадак апратэставання і абскарджання пастановы суддзі

1. Пастанова суддзі па скарзе аб вызваленні затрыманага ці асобы, якая ўтрымліваецца пад вартай, хатнім арыштам, уступае ў законную сілу пасля сканчэння 24 гадзін з моманту вынясення. На працягу гэтага тэрміну яна можа быць апратэставана пракурорам, а таксама абскарджана пацярпелым ці яго прадстаўніком у вышэйстаячы суд. Прынясенне пратэсту ці падача скаргі прыпыняюць выкананне пастановы суддзі.

2. На пастанову суддзі аб пакіданні скаргі без задавальнення можа быць на працягу 24 гадзін пададзена скарга ў вышэйстаячы суд асобай, якая абскардзіла затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт ці прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту. У выпадку задавальнення скаргі вышэйстаячы суд абавязаны прымяніць у адносінах да асобы, якая вызваляецца з-пад варты ці хатняга арышту, іншую меру стрымання.

3. Пратэсты і скаргі на пастанову суддзі суда першай інстанцыі падаюцца праз суддзю, які вынес пастанову.

4. Вядзенне суда першай інстанцыі па праверцы законнасці затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту падлягае накіраванню разам з пратэстам або скаргай у вышэйстаячы суд на працягу 24 гадзін.

5. Пратэсты і скаргі на пастанову суддзі разглядаюцца аднаасобна суддзёй вышэйстаячага суда на працягу трох сутак з дня іх паступлення ў парадку, устаноўленым часткай другой артыкула 144 гэтага Кодэкса, з абавязковым удзелам пракурора.

6. Рашэнне вышэйстаячага суда па пратэсце або скарзе ўступае ў законную сілу неадкладна, з'яўляецца канчатковым, далейшаму абскарджанню не падлягае, але можа быць апратэставана ў парадку нагляду ўпаўнаважанымі на тое асобамі, указанымі ў артыкуле 404 гэтага Кодэкса.

7. Пасля ўступлення пастановы суддзі ў законную сілу яе копія не пазней за 24 гадзіны накіроўваецца асобе, якая падала скаргу, і пракурору, а ў выпадку прыняцця рашэння аб вызваленні асобы з-пад варты – неадкладна адміністрацыі месца ўтрымання асобы пад вартай для выканання.

8. Паўторнае абскарджанне законнасці затрымання або ўзяцця пад варту, хатняга арышту не дапускаецца. У выпадку пакідання без задавальнення скаргі на прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту дапускаецца паўторная падача скаргі пры кожным новым прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту.

9. Паўторнае прымяненне меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ці хатняга арышту пасля яе адмены пастановай суддзі магчымае толькі ў выпадках парушэння асобай, вызваленай з-пад варты, хатняга арышту, умоў прымененай у адносінах да яго суддзёй меры стрымання, а таксама пры адкрыцці новых акалічнасцей, якія даюць падставы для прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту па новым абвінавачанні.

Артыкул 146. Скаргі на прымусовае змяшчэнне ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар

Скаргі на прымусовае змяшчэнне асобы, якая не ўтрымліваецца пад вартай, у судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы падаюцца, разглядаюцца і вырашаюцца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 143–145 гэтага Кодэкса.

Артыкул 147. Скаргі (пратэсты) на прыгавор, прысуд, пастанову суда

Скаргі (пратэсты) на прыгавор, прысуд, пастанову суда першай інстанцыі падаюцца ў адпаведнасці з правіламі главы 39 гэтага Кодэкса. Скаргі (пратэсты), хадайніцтвы аб пераглядзе прыгавораў, прысудаў (пастаноў), якія ўступілі ў законную сілу, падаюцца ў адпаведнасці з правіламі главы 42 гэтага Кодэкса.

Артыкул 147[1]. Судовая праверка законнасці і абгрунтаванасці прымянення меры стрымання ці правядзення працэсуальных дзеянняў па пастановах старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі

1. Скаргі (пратэсты) на пастановы старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, падаюцца ў адпаведнасці з правіламі гэтай главы з улікам палажэнняў гэтага артыкула.

2. Скаргі асоб, указаных у артыкуле 138 гэтага Кодэкса, а таксама пратэсты Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, які выконвае яго абавязкі, на пастановы старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, аб прымяненні меры стрымання ці правядзенні працэсуальных дзеянняў падаюцца ў суд па месцы папярэдняга расследавання крымінальнай справы і падлягаюць разгляду на працягу трох сутак з дня паступлення. Падача скаргі (пратэсту) не прыпыняе выканання пастаноў указаных асоб.

3. Па выніках разгляду скаргі (пратэсту) суддзя выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб адмене меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту і вызваленні асобы з-пад варты, хатняга арышту ў адпаведнасці з пунктам 1 часткі 5 артыкула 144 гэтага Кодэкса;

2) аб адмене пастановы аб правядзенні працэсуальных дзеянняў або адмене меры стрымання, не ўказанай у пункце 1 гэтай часткі;

3) аб пакіданні скаргі (пратэсту) без задавальнення.

РАЗДЗЕЛ VI
ІНШЫЯ АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ГЛАВА 17
ГРАМАДЗЯНСКІ ІСК У КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

Артыкул 148. Грамадзянскія іскі, якія разглядаюцца ў крымінальным працэсе

1. У крымінальным працэсе разглядаюцца грамадзянскія іскі фізічных і юрыдычных асоб, а таксама пракурора аб пакрыцці фізічнай, маёмаснай ці маральнай шкоды, прычыненай непасрэдна злачынствам ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане бессвядомасці.

2. Ісцец пры прад'яўленні грамадзянскага іску ў крымінальным працэсе вызваляецца ад дзяржаўнай пошліны.

3. Даказванне грамадзянскага іску, прад'яўленага ў ходзе вядзення па крымінальнай справе, праводзіцца ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

4. Калі працэсуальныя адносіны, якія ўзніклі ў сувязі з грамадзянскім іскам, не ўрэгуляваны гэтым Кодэксам, то прымяняюцца нормы грамадзянскага працэсуальнага заканадаўства, калі яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу.

Артыкул 149. Прад'яўленне грамадзянскага іску

1. Фізічная ці юрыдычная асоба, якая панесла шкоду ад злачынства ці прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння асобы ў стане бессвядомасці, або іх прадстаўнікі маюць права прад'явіць грамадзянскі іск да абвінавачанага ці да асоб, якія нясуць матэрыяльную адказнасць за яго дзеянні з моманту распачынання крымінальнай справы да заканчэння судовага следства. Адмова ў іску, вынесеная ў парадку грамадзянскага судаводства, пазбаўляе іх права паўторнага прад'яўлення таго ж іску ў ходзе вядзення па крымінальнай справе.

2. У абарону інтарэсаў непаўналетніх, а таксама асоб, прызнаных ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі, грамадзянскі іск можа быць прад'яўлены іх законным прадстаўніком.

3. Грамадзянскі іск можа быць прад'яўлены як у пісьмовай, так і ў вуснай форме. Вусная заява заносіцца ў пратакол у парадку, прадугледжаным артыкуламі 150 і 308 гэтага Кодэкса.

4. Невыяўленне асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага, не перашкаджае прызнанню асобы грамадзянскім істцом у крымінальным працэсе.

5. Асоба, якая не прад'явіла грамадзянскі іск у крымінальным працэсе, а таксама асоба, чый іск судом пакінуты без разгляду, мае права прад'явіць яго ў парадку грамадзянскага судаводства.

6. У выпадках, калі гэтага патрабуе абарона правоў грамадзян, юрыдычных асоб, дзяржаўных ці грамадскіх інтарэсаў, грамадзянскі іск у крымінальным працэсе мае права прад'явіць пракурор.

7. Грамадзянскі іск у крымінальным працэсе разглядаецца судом разам з крымінальнай справай.

8. Калі грамадзянскі іск застаўся непрад'яўленым, суд пры пастанове прыгавору мае права па ўласнай ініцыятыве вырашыць пытанне аб пакрыцці шкоды, прычыненай злачынствам.

Артыкул 150. Прызнанне грамадзянскім істцом

1. Калі з матэрыялаў крымінальнай справы бачна, што злачынствам ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане бессвядомасці прычынена шкода фізічнай ці юрыдычнай асобе, орган крымінальнага пераследавання ці суд растлумачваюць ім ці іх прадстаўнікам права прад'явіць грамадзянскі іск, аб чым складаецца пратакол ці робіцца пісьмовае паведамленне.

2. Фізічная ці юрыдычная асоба, якая прад'явіла іск, прызнаюцца грамадзянскімі істцамі ў парадку, устаноўленым часткай першай артыкулаў 52, 56 і 58 гэтага Кодэкса. Асобе, якая прад'явіла іск, яго прадстаўніку абвяшчаецца пастанова (прысуд) аб прызнанні грамадзянскім істцом і тлумачацца правы, прадугледжаныя артыкуламі 53, 57 і 59 гэтага Кодэкса, аб чым робіцца адзнака ў пастанове (прысудзе), якая пасведчваецца подпісам грамадзянскага істца ці яго прадстаўніка.

Артыкул 151. Адмова ў прызнанні грамадзянскім істцом

1. Пры адсутнасці прадугледжаных артыкулам 149 гэтага Кодэкса падстаў для прад'яўлення грамадзянскага іску фізічнай ці юрыдычнай асобе, якая прад'явіла іск, можа быць адмоўлена ў прызнанні грамадзянскімі істцамі, аб чым орган, які вядзе крымінальны працэс, выносіць матываваную пастанову ці прысуд і растлумачвае права яго абскарджання.

2. Пастанова (прысуд) аб адмове ў прызнанні грамадзянскім істцом абвяшчаецца заяўніку пад распіску. Адмова пры правядзенні дазнання ці папярэдняга следства ў прызнанні асобы грамадзянскім істцом не пазбаўляе яго права прад'явіць грамадзянскі іск на судовым пасяджэнні.

Артыкул 152. Прызнанне грамадзянскім адказчыкам

Высветліўшы асобу, якая нясе матэрыяльную адказнасць за шкоду, прычыненую злачынствам ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане бессвядомасці, у выпадку прад'яўлення грамадзянскага іску ў ходзе вядзення па крымінальнай справе орган, які вядзе крымінальны працэс, прызнае гэту асобу грамадзянскім адказчыкам у парадку, устаноўленым артыкуламі 54 і 58 гэтага Кодэкса. Грамадзянскаму адказчыку ці яго прадстаўніку накіроўваецца копія пастановы (прысуду) аб прызнанні яго грамадзянскім адказчыкам.

Артыкул 153. Прымяненне правіл аб падставах, умовах, аб'ёме і спосабе пакрыцця шкоды

Пры разглядзе грамадзянскага іску, прад'яўленага ў крымінальным працэсе, падставы, умовы, аб'ём і спосаб пакрыцця шкоды вызначаюцца ў адпаведнасці з нормамі дзеючага заканадаўства. У выпадках, прадугледжаных законам, прымяняюцца міжнародныя пагадненні і нормы права дзяржавы, з якой заключаны дагаворы аб прававой дапамозе.

Артыкул 154. Адмова ад грамадзянскага іску

1. Фізічная ці юрыдычная асоба, а таксама пракурор мае права адмовіцца ад прад'яўленага імі грамадзянскага іску.

2. Заява істца аб адмове ад іску заносіцца ў пратакол следчага дзеяння ці судовага пасяджэння. Калі адмова істца ад іску выказана ў пісьмовай заяве, то яна далучаецца да крымінальнай справы.

3. Орган крымінальнага перасследавання прымае адмову ад іску ў любы момант правядзення папярэдняга расследавання крымінальнай справы, аб чым складаецца пастанова. Адмова ад іску можа быць прынята судом з вынясеннем пастановы (прысуду) у любы момант судовага разбору, але да выдалення суда ў дарадчы пакой для прыняцця рашэння.

4. Прыняцце адмовы ад іску цягне за сабой спыненне вядзення па ім.

5. Вымушаная адмова ад іску не прымаецца.

Артыкул 155. Рашэнне па грамадзянскім іску

1. Пры пастанове абвінаваўчага прыгавору ці вынясенні пастановы (прысуду) аб прымяненні прымусовай меры бяспекі і лячэння суд у залежнасці ад даказанасці падстаў і памераў грамадзянскага іску задавальняе прад'яўлены іск поўнасцю ці часткова або адмаўляе ў яго задавальненні. Памер маёмаснай шкоды, якая падлягае пакрыццю, вызначае суд зыходзячы з кошту маёмасці на дзень вынясення прыгавору,

пастановы (прысуду), а памер фізічнай і маральнай шкоды – зыходзячы з наяўных наступстваў.

2. У выпадках задавальнення іску поўнасцю ці часткова суд устанаўлівае і ўказвае ў прыгаворы, пастанове (прысудзе) тэрмін для добраахвотнага выканання прыгавору ў частцы грамадзянскага іску. Прымусовае выкананне праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

3. Пры немагчымасці правесці падрабязны разлік па грамадзянскім іску без адкладання разбору крымінальнай справы суд можа прызнаць за грамадзянскім істцом права на задавальненне іску і перадаць пытанне аб яго памерах на разгляд у парадку грамадзянскага судаводства.

4. Пры пастанове апраўдальнага прыгавору, а таксама вынясенні пастановы (прысуду) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе па прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння суд:

1) адмаўляе ў задавальненні грамадзянскага іску, калі не выяўлена грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, або не даказаны ўдзел абвінавачанага ці асобы, у адносінах да якой вырашалася пытанне аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння, ва ўчыненні злачынства ці прадугледжанага крымінальным законам грамадска небяспечнага дзеяння;

2) пакідае іск без разгляду ў выпадку апраўдання абвінавачанага з-за адсутнасці ў дзеянні складу злачынства або спынення вядзення па крымінальнай справе з-за адсутнасці падстаў для прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння да асобы, якая з-за характару ўчыненага ім дзеяння і свайго стану не ўяўляе небяспекі для грамадства.

5. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у пунктах 3–9 часткі першай артыкула 29 і артыкуле 30 гэтага Кодэкса, суд пакідае грамадзянскі іск без разгляду.

6. Калі на падставах, прадугледжаных пунктам 2 часткі чацвёртай і часткай пятай гэтага артыкула, вядзенне па крымінальнай справе спынена ў стадыі папярэдняга расследавання ці судовага разбору, фізічная ці юрыдычная асоба або іх прадстаўнікі маюць права прад'явіць іск у парадку грамадзянскага судаводства.

Артыкул 156. Забеспячэнне грамадзянскага іску і выканання прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці

1. Пры наяўнасці дастатковых даных аб прычыненні шкоды злачынствам ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане бессвядомасці, а таксама ў выпадку выяўлення маёмасці, якая падлягае спецыяльнай канфіскацыі, органы крымінальнага пераследавання абавязаны прыняць меры для забеспячэння грамадзянскага іску і выканання прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці, якая заключаецца ў выяўленні маёмасці, на якую можа быць накладзены арышт; накладанні ў парадку, прадугледжаным артыкулам 132 гэтага Кодэкса, арышту на маёмасць абвінавачанага ці асоб, якія нясуць матэрыяльную адказнасць за шкоду, прычыненую злачыннымі дзеяннямі абвінавачанага ці прадугледжаным крымінальным законам грамадска небяспечным дзеяннем асобы ў стане бессвядомасці; забеспячэнні захаванасці маёмасці да вырашэння крымінальнай справы ў судовым разборы.

2. Калі меры для забеспячэння грамадзянскага іску і выканання прыгавору ў частцы канфіскацыі маёмасці не былі прыняты ў стадыі папярэдняга расследавання, суд мае права да ўступлення прыгавору, пастановы (прысуду) у законную сілу пастанавіць аб прыняцці гэтых мер, якія прымаюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

Артыкул 157. Выкананне прыгавораў, пастаноў (прысудаў) суда ў частцы грамадзянскага іску

Пры задавальненні судом грамадзянскага іску прыгавор, а таксама пастанова (прысуд) аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння ў частцы грамадзянскага

іску выконваюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні.

ГЛАВА 18
ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ, ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ВЫДАТКІ

Артыкул 158. Падлік тэрмінаў

1. Тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам, лічацца гадзінамі, суткамі і месяцамі. Пры падліку тэрміну ўлічваецца і нерабочы час, але не прымаюцца пад увагу тая гадзіна і суткі, якімі пачынаецца цячэнне тэрміну.

2. Тэрмін, які падлічваецца гадзінамі, пачынае ісці пасля заканчэння гадзіны, у якой праведзена адпаведнае працэсуальнае дзеянне, і канчаецца ў адпаведную гадзіну заканчэння тэрміну.

3. Тэрмін, які падлічваецца суткамі і месяцамі, пачынае ісці з нуля гадзін наступных сутак і выходзіць у 24 гадзіны апошніх сутак ці апошняга дня адпаведнага месяца. Калі месяц не мае адпаведнага дня, тэрмін заканчваецца ў апошнія суткі гэтага месяца.

4. Калі заканчэнне тэрміну прыпадае на нерабочы дзень, то апошнім днём тэрміну лічыцца першы рабочы дзень, які ідзе следам за ім, акрамя выпадкаў падліку тэрміну пры затрыманні, утрыманні пад вартай, хатнім арышце і знаходжанні ў судова-псіхіятрычным экспертным стацыянары.

Артыкул 159. Захаванне тэрміну

Тэрмін не лічыцца прапушчаным, калі скарга, хадайніцтва ці іншы дакумент да сканчэння тэрміну здадзены на пошту, што пацвярджаецца наяўнасцю штэмпеля на канверце, заяўлены ці перададзены асобе, упаўнаважанай іх прыняць, а для асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай ці знаходзяцца ў судова-псіхіятрычным экспертным стацыянары, – калі скарга ці іншы дакумент здадзены да сканчэння тэрміну адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай ці ўпаўнаважанай на іх прыняцце асобе ў судова-псіхіятрычным экспертным стацыянары.

Артыкул 160. Прадаўжэнне тэрміну

У выпадку немагчымасці правядзення працэсуальных дзеянняў і прыняцця рашэнняў ва ўстаноўленыя тэрміны яны могуць быць прадоўжаны толькі ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

Артыкул 161. Аднаўленне тэрміну

1. Прапушчаны з-за ўважлівай прычыны тэрмін павінен быць адноўлены пастановай органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суддзі ці прысудам суда, у вядзенні якога знаходзіцца крымінальная справа. Адмова ў аднаўленні тэрміну можа быць абскарджана і апратэставана ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку.

2. Па хадайніцтве зацікаўленай асобы выкананне рашэння, абскарджанага з пропускам устаноўленага тэрміну, можа быць прыпынена органам крымінальнага пераследавання і судом да вырашэння пытання аб аднаўленні прапушчанага тэрміну.

Артыкул 162. Працэсуальныя выдаткі

1. Працэсуальныя выдаткі складаюцца з:

1) сум, якія выплачваюцца пацярпелым, грамадзянскім істцам і іх прадстаўнікам, сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам, панятым на пакрыццё іх расходаў па яўцы да месца правядзення працэсуальных дзеянняў і назад, па найме жылога памяшкання, а таксама ў якасці сутачных;

2) сум, якія выплачваюцца пацярпелым, грамадзянскім істцам і іх прадстаўнікам, сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам, панятым, якія не маюць пастаяннага заробку, за адцягненне іх ад звычайных заняткаў;

3) сум, якія выплачваюцца пацярпелым, грамадзянскім істцам і іх прадстаўнікам, сведкам, панятым, якія працуюць і маюць пастаянны заробак, у пакрыццё недаатрыманай імі заработнай платы за ўвесь час, затрачаны ў сувязі з выклікам у орган, які вядзе крымінальны працэс;

3[1]) сум, якія выплачваюцца асобам, што садзейнічаюць у правядзенні следчага дзеяння, у пакрыццё расходаў, панесеных імі ў сувязі з правядзеннем такога следчага дзеяння;

4) узнагароды, якія выплачваюцца экспертам, спецыялістам, перакладчыкам за выкананне імі сваіх абавязкаў у крымінальным працэсе, акрамя выпадкаў, калі гэтыя абавязкі выконваліся ў парадку службовага задання;

5) сум, якія выплачвае дзяржава арганізацыі, у якой працаваў эксперт, спецыяліст ці перакладчык, калі яны выконвалі свае абавязкі ў парадку службовага задання;

6) сум, якія выплачваюцца за аказанне абаронцамі юрыдычнай дапамогі ў выпадку вызвалення падазраванага, абвінавачанага ад яе аплаты або ўдзелу адваката пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства ці ў судовым пасяджэнні па прызначэнні без заключэння дагавору з кліентам;

7) сум, зрасходаваных на захоўванне і перасылку рэчыўных доказаў;

8) сум, зрасходаваных на правядзенне экспертызы ў экспертных установах, за выключэннем выпадкаў правядзення экспертызы ў дзяржаўных судова-экспертных установах;

8[1]) сум, зрасходаваных дзяржаўнымі судова-экспертнымі ўстановамі на набыццё расходных матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся для правядзення экспертызы, і бягучы рамонт экспертнага (спецыяльнага) абсталявання;

9) сум, зрасходаваных у сувязі з вышукам абвінавачанага, які схаваўся ад органа крымінальнага пераследавання і суда;

9[1]) сум штомесячнай дзяржаўнай дапамогі, якая выплачваецца ў выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 131 гэтага Кодэкса;

10) іншых расходаў, панесеных пры вядзенні па крымінальнай справе.

2. Сярэдні заробак, які захоўваецца за асобай, што выклікаецца ў якасці пацярпелага і яго прадстаўніка, сведкі, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і панятога, па месцы яго працы за ўвесь час, затрачаны ім у сувязі з выклікам у орган крымінальнага пераследавання ці ў суд, уключаецца ў працэсуальныя выдаткі па патрабаванні арганізацыі, якая выплаціла яго.

3. Сумы, указаныя ў пунктах 1–5 часткі 1 гэтага артыкула, выплачваюцца па пастанове органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, суддзі ці па прысудзе суда пасля выканання пералічанымі ў гэтых пунктах асобамі абавязкаў у крымінальным працэсе.

4. Пакрыццё расходаў, за выключэннем сум, указаных у пункце 81 часткі 1 гэтага артыкула, і выплата ўзнагароды праводзяцца з бюджэтных сродкаў, якія выдзяляюцца органам крымінальнага пераследавання і суду на гэтыя мэты, па пастанове (прысудзе) гэтых органаў. Парадак выплаты і памеры сум, якія падлягаюць выплаце, а таксама парадак падліку сум, указаных у пункце 81 часткі 1 гэтага артыкула, устанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Сумы, указаныя ў пункце 81 часткі 1 гэтага артыкула, спаганяюцца ў парадку, прадугледжаным артыкулам 163 гэтага Кодэкса.

Артыкул 163. Спагнанне працэсуальных выдаткаў

1. Працэсуальныя выдаткі спаганяюцца з асуджаных, абвінавачаных ці падазраваных ці могуць быць прыняты на кошт дзяржавы.

2. У выпадку прызнання абвінавачанага вінаватым суд абавязаны спагнаць з яго працэсуальныя выдаткі, за выключэннем сум, выплачаных перакладчыку, а таксама абаронцу ў выпадках, прадугледжаных часткай 4 гэтага артыкула. Працэсуальныя выдаткі спаганяюцца таксама з асобы, прызнанай вінаватай, але вызваленай ад пакарання, а таксама з асуджанай без прызначэння пакарання або з прымяненнем мер

адміністрацыйнага спагнання. Працэсуальныя выдаткі, указаныя ў пунктах 7–10 часткі 1 і частцы 2 артыкула 162 гэтага Кодэкса, могуць быць спагнаны па пастанове пракурора ў выпадку вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкуламі 20, 86, 88, 89 і 118 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ці спынення папярэдняга расследавання па крымінальнай справе на падставах, прадугледжаных пунктамі 3–5 і 11 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса.

3. Працэсуальныя выдаткі, звязаныя з удзелам у вядзенні па крымінальнай справе перакладчыка, прымаюцца на кошт дзяржавы. Калі перакладчык, эксперт ці спецыяліст выконвалі свае функцыі ў парадку службовага задання, аплата іх працы кампенсуецца дзяржавай арганізацыі, у якой яны працавалі.

4. Калі падазраваны ці абвінавачаны былі вызвалены ад аплаты за паслугі адваката, расходы на аплату працы адваката прымаюцца на кошт дзяржавы.

5. У выпадку апраўдання абвінавачанага ці спынення вядзення па крымінальнай справе ў адпаведнасці з пунктамі 1, 2, 7 і 10 часткі першай артыкула 29 і часткай другой артыкула 250 гэтага Кодэкса працэсуальныя выдаткі прымаюцца на кошт дзяржавы. Суд абавязвае абвінавачанага аплаціць працэсуальныя выдаткі, звязаныя з абвінавачаннем, па якім ён прызнаны вінаватым.

6. Працэсуальныя выдаткі прымаюцца на кошт дзяржавы ў выпадку выяўленай у прадугледжаным законам парадку маёмаснай неплацежаздольнасці асобы, з якой яны павінны быць спагнаны.

7. Калі па справе прызнаны вінаватымі некалькі асоб, суд пастанаўляе, у якім памеры працэсуальныя выдаткі павінны быць спагнаны з кожнай з іх. Суд улічвае пры гэтым характар віны, ступень адказнасці за ўчыненае злачынства і маёмасны стан асуджанага.

8. Па справах аб злачынствах непаўналетніх, якія не маюць маёмасці і самастойнага заробку, суд можа ўскласці выплату працэсуальных выдаткаў на бацькоў непаўналетняга ці асоб, іх якія замяняюць.

9. Пры апраўданні абвінавачанага па справе прыватнага абвінавачання суд спаганяе працэсуальныя выдаткі поўнасцю ці часткова з асобы, па заяве якой было пачата вядзенне па крымінальнай справе. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе з-за прымірэння пацярпелага з абвінавачаным працэсуальныя выдаткі спаганяюцца з абодвух ці з аднаго з іх.

ГЛАВА 19
ЗЛУЧЭННЕ, ВЫЛУЧЭННЕ І АДНАЎЛЕННЕ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ

Артыкул 164. Злучэнне крымінальных спраў

1. У адным вядзенні могуць быць злучаны крымінальныя справы па падазрэнні ці абвінавачанні некалькіх асоб ва ўчыненні ў саўдзеле аднаго ці некалькіх злачынстваў, справы па падазрэнні ці абвінавачанні некалькіх асоб ва ўчыненні ўзаемазвязаных па прадмеце злачынстваў, справы па падазрэнні ці абвінавачанні адной асобы ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, справы па падазрэнні ці абвінавачанні ў не абяцаным загадзя ўкрывальніцтве гэтых злачынстваў ці ў неданясенні аб іх, а таксама справы, распачатыя па факце знікнення асобы, і аб грамадска небяспечным дзеянні, прадугледжаным крымінальным законам, звязаным са знікненнем гэтай асобы. Недапушчальна злучаць справы аб злачынствах, па якіх адна і тая ж асоба з'яўляецца абвінавачаным і пацярпелым, за выключэннем спраў прыватнага абвінавачання.

11. Злучэнне крымінальных спраў дапускаецца ў выпадках, калі асобы, якія падлягаюць прыцягненню ў якасці абвінавачаных (падазраваных), не выяўлены, але ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што некалькі злачынстваў учынены адной асобай ці групай асоб.

2. Злучэнне крымінальных спраў праводзіцца пастановай органа крымінальнага пераследавання ці прысудам (пастановай) суда, у вядзенні якога знаходзіцца адна са спраў, якая расследуецца або разглядаецца.

3. Тэрмін вядзення па крымінальнай справе, у якой злучаны некалькі спраў, лічыцца з дня распачынання справы, якая распачата па часе першай. Пры гэтым у агульны тэрмін папярэдняга расследавання па такой справе ўключаецца ўвесь каляндарны час, фактычна затрачаны на яго правядзенне.

4. Парадак падліку агульнага тэрміну папярэдняга расследавання, прадугледжаны часткай 3 гэтага артыкула, не распаўсюджваецца на выпадкі злучэння некалькіх спраў, па якіх не былі выяўлены асобы, якія падлягаюць прыцягненню ў якасці абвінавачаных (падазраваных). У такіх выпадках агульным тэрмінам з'яўляецца найбольшы тэрмін вядзення па адной са злучаных спраў.

Артыкул 165. Вылучэнне крымінальнай справы

1. Орган крымінальнага пераследавання мае права вылучыць з крымінальнай справы ў асобнае вядзенне іншую крымінальную справу ў адносінах да:

1) асобных абвінавачаных па крымінальных справах па абвінавачанні некалькіх асоб у выпадках, указаных у пунктах 1–4 часткі 1 артыкула 246 гэтага Кодэкса;

2) непаўналетняга абвінавачанага, прыцягнутага да крымінальнай адказнасці разам з паўналетнімі абвінавачанымі;

3) абвінавачанага, які заявіў хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

4) падазраванага (абвінавачанага), з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве.

2. Справа можа быць вылучана ў асобнае вядзенне, калі ў ходзе папярэдняга расследавання высвятляецца адсутнасць сувязі паміж асобнымі злачынствамі або асобамі, якія іх учынілі, матэрыялы аб якіх маюцца ў адным вядзенні.

3. Па крымінальных справах аб некалькіх злачынствах з улікам месцаў учынення асобных злачынстваў, складанасці і працаёмкасці папярэдняга расследавання пракурор, а таксама следчы са згоды пракурора, прызнаўшы сабраныя доказы ў адносінах да канкрэтнага абвінавачанага па асобных абвінавачаннях дастатковымі для накіравання справы ў суд, мае права вынесці матываваную пастанову аб вылучэнні справы, прыняць меры да заканчэння па ёй правядзення папярэдняга расследавання і накіравання ў суд па гэтым абвінавачанні.

4. Вылучэнне крымінальнай справы дапускаецца пры ўмове, што гэта істотна не адаб’ецца на ўсебаковасці, паўнаце, аб'ектыўнасці даследавання акалічнасцей крымінальнай справы на судовым пасяджэнні.

5. Падлягае вылучэнню ў асобнае вядзенне крымінальная справа аб злачынстве, учыненым іншай асобай, аб якім стала вядома ў ходзе папярэдняга расследавання.

5[1]. Падлягае вылучэнню ў асобнае вядзенне крымінальная справа ў адносінах да памерлага падазраванага, абвінавачанага.

6. Могуць быць вылучаны з крымінальнай справы таксама матэрыялы, неабходныя для распачынання крымінальнай справы аб злачынстве, аб якім стала вядома.

6[1]. Падлягаюць вылучэнню з крымінальнай справы матэрыялы, якія не маюць адносін да крымінальнай справы. Такія матэрыялы вяртаюцца органу ці арганізацыі, якія іх падалі.

7. Вылучэнне ў асобнае вядзенне крымінальнай справы судом дапускаецца пры наяўнасці акалічнасцей, прадугледжаных часткай 2 артыкула 302, часткай 21 артыкула 368 і часткай 8 артыкула 468[23] гэтага Кодэкса.

8. Вылучэнне крымінальнай справы ці матэрыялаў праводзіцца па пастанове органа дазнання, асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора, прысудзе

(пастанове) суда. У вылучанай справе ці матэрыялах павінны змяшчацца арыгіналы або копіі працэсуальных дакументаў.

9. Тэрмін папярэдняга расследавання па вылучанай крымінальнай справе лічыцца з дня вынясення адпаведнай пастановы (прысуду) аб вылучэнні справы.

Артыкул 1651. Аднаўленне крымінальных спраў

1. Аднаўленне страчанай крымінальнай справы або яе асобных матэрыялаў праводзіцца па пастанове начальніка следчага падраздзялення, начальніка органа дазнання, пракурора, а ў выпадку страты крымінальнай справы або яе матэрыялаў у ходзе судовага вядзення – па прысудзе (пастанове) суда.

2. Аднаўленне крымінальнай справы праводзіцца па прадметах, копіях дакументаў, якія захаваліся і могуць быць прызнаны доказамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, і шляхам правядзення следчых і іншых працэсуальных дзеянняў.

3. Тэрміны правядзення дазнання, папярэдняга следства, утрымання пад вартай і хатняга арышту пры аднаўленні крымінальнай справы лічацца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 125, 127 і 190 гэтага Кодэкса.

ЧАСТКА ДРУГАЯ
ДАСУДОВАЕ ВЯДЗЕННЕ

РАЗДЗЕЛ VII
РАСПАЧЫНАННЕ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

ГЛАВА 20
НАГОДЫ І ПАДСТАВЫ ДА РАСПАЧЫНАННЯ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

Артыкул 166. Нагоды да распачынання крымінальнай справы

Нагодамі да распачынання крымінальнай справы з'яўляюцца:

1) заявы грамадзян;

2) яўка з пакаяннем;

3) паведамленне службовых асоб дзяржаўных органаў, іншых арганізацый;

4) паведамленне аб злачынстве ў сродках масавай інфармацыі;

5) непасрэднае выяўленне органам крымінальнага пераследавання звестак, якія паказваюць на прыкметы злачынства.

Артыкул 167. Падставы да распачынання крымінальнай справы

Падставамі да распачынання крымінальнай справы з'яўляюцца:

1) наяўнасць дастатковых даных, якія паказваюць на прыкметы злачынства, пры адсутнасці акалічнасцей, якія выключаюць вядзенне па крымінальнай справе;

2) знікненне асобы, калі на працягу дзесяці сутак з моманту падачы заявы аператыўна-вышуковымі мерапрыемствамі, праведзенымі ў гэты тэрмін, выявіць месцазнаходжанне асобы не з’яўляецца магчымым.

Артыкул 168. Заявы грамадзян

1. Заявы грамадзян аб злачынстве могуць быць вуснымі і пісьмовымі.

2. Пісьмовая заява павінна быць падпісана асобай, ад якой яна зыходзіць.

3. Вусная заява заносіцца ў пратакол, які падпісваецца заяўнікам і службовай асобай органа дазнання, асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым ці пракурорам, якія прынялі заяву. Пратакол павінен таксама змяшчаць звесткі аб заяўніку.

4. Заяўнік папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за заведама лжывы данос, аб чым у заяве ці пратаколе робіцца адзнака, якая засведчваецца подпісам заяўніка.

5. Ананімныя заявы не могуць служыць нагодай да распачынання крымінальнай справы.

6. У выпадку, калі ёсць падставы меркаваць, што заяўніку, членам яго сям'і, блізкім сваякам і іншым асобам, якіх ён абгрунтавана лічыць сваімі блізкімі, могуць пагражаць забойствам, прымяненнем насілля, знішчэннем ці пашкоджаннем маёмасці і

прымяненнем іншых проціпраўных дзеянняў, у заяве не ўказваюцца анкетныя дадзеныя заяўніка і не ставіцца яго подпіс.

Артыкул 169. Яўка з пакаяннем

1. Яўкай з пакаяннем лічыцца добраахвотнае паведамленне асобы аб учыненым ёй злачынстве, калі гэтай асобе яшчэ не абвешчана пастанова аб распачынанні ў адносінах да яе крымінальнай справы, аб прызнанні падазраваным, прымяненні меры стрымання і вынясенні пастановы аб прыцягненні яе ў якасці абвінавачанага.

2. У выпадку, калі асоба, якая з'явілася з пакаяннем, паведамляе аб учыненні злачынства сумесна з іншымі асобамі, асоба, якая з'явілася з пакаяннем, папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за заведама лжывы данос.

3. Заява аб пакаянні можа быць зроблена як у пісьмовай, так і вуснай форме і павінна быць перададзена заяўнікам органу дазнання, асобе, якая праводзіць дазнанне, следчаму ці пракурору. Вусная заява заносіцца ў пратакол, у якім падрабязна выкладаецца зробленая заява. Пратакол падпісваюць асоба, якая з'явілася з пакаяннем, і службовая асоба, якая прыняла заяву.

Артыкул 170. Паведамленне службовых асоб дзяржаўных органаў, іншых арганізацый

Паведамленне службовых асоб дзяржаўных органаў, а таксама іншых арганізацый аб злачынстве павінна быць зроблена ў пісьмовай форме. Да яго могуць дадавацца дакументы і іншыя матэрыялы, якія пацвярджаюць дакладнасць паведамлення аб злачынстве.

Артыкул 171. Паведамленне ў сродках масавай інфармацыі

1. Паведамленне аб злачынстве, распаўсюджанае ў сродках масавай інфармацыі, можа служыць нагодай да распачынання крымінальнай справы.

2. Службовая асоба сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюдзіла паведамленне аб злачынстве, па патрабаванні органа крымінальнага пераследавання абавязана перадаць дакументы і іншыя матэрыялы, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні і пацвярджаюць зробленае паведамленне.

3. Крыніца інфармацыі і імя асобы, якая падала звесткі, павінны быць названы толькі па патрабаванні органа, які вядзе крымінальны працэс, калі гэта неабходна для папярэдняга расследавання ці разгляду спраў, якія знаходзяцца ў яго вядзенні.

Артыкул 172. Абавязковасць прыняцця і разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве

1. Орган крымінальнага пераследавання абавязаны прыняць, зарэгістраваць і разгледзець заяву ці паведамленне аб любым учыненым ці рыхтаваным злачынстве. Заяўніку выдаецца дакумент аб рэгістрацыі прынятай заявы ці паведамлення аб злачынстве з указаннем службовай асобы, якая прыняла заяву ці паведамленне, і часу іх рэгістрацыі.

2. Неабгрунтаваная адмова ў прыёме заявы ці паведамлення аб злачынстве можа быць абскарджана пракурору ў парадку, устаноўленым артыкуламі 139, 141 і 143 гэтага Кодэкса.

3. Заява ці паведамленне аб злачынстве, якія паступілі ў суд, за выключэннем пададзеных у адпаведнасці з часткай першай артыкула 426 гэтага Кодэкса, накіроўваюцца пракурору, аб чым павінен быць апавешчаны заяўнік.

Артыкул 173. Парадак і тэрміны разгляду заяў і паведамленняў аб злачынстве

1. Рашэнне па заяве ці паведамленні павінна быць прынята ў тэрмін не пазней за трое сутак, а пры неабходнасці праверкі дастатковасці наяўнасці ці адсутнасці падстаў да распачынання крымінальнай справы – не пазней за дзесяць сутак.

2. Да распачынання крымінальнай справы могуць быць атрыманы тлумачэнні, узоры для параўнальнага даследавання, выпатрабаваны дадатковыя дакументы, прызначана праверка фінансава-гаспадарчай дзейнасці ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, праведзены агляд месца здарэння, трупа, мясцовасці, прадметаў, дакументаў, агляд, экспертызы, затрыманне і асабісты вобшук пры затрыманні, а таксама можа быць праведзена выманне трупа з месца пахавання (эксгумацыя).

3. У выпадку немагчымасці прыняцця рашэння ў тэрміны, указаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, гэты тэрмін можа быць прадоўжаны начальнікам следчага падраздзялення, а па матэрыялах, якія знаходзяцца ў органе дазнання ці ў пракурора, – пракурорам да аднаго месяца.

4. У неабходных выпадках вышэйстаячым начальнікам следчага падраздзялення, вышэйстаячым пракурорам тэрмін праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве можа быць прадоўжаны да трох месяцаў.

4[1]. У тэрмін правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве не ўключаецца час, на працягу якога яна была прыпынена на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

5. Пры накіраванні пракурорам у адпаведнасці з пунктамі 5 і 8 артыкула 179 гэтага Кодэкса матэрыялаў для правядзення дадатковай праверкі ім устанаўліваецца тэрмін да дзесяці сутак.

6. Пры адмене начальнікам следчага падраздзялення пастановы следчага аб распачынанні або аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы і накіраванні матэрыялаў для правядзення дадатковай праверкі ім устанаўліваецца тэрмін да дзесяці сутак.

7. Аб прадаўжэнні тэрміну праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве на працягу 24 гадзін апавяшчаецца заяўнік. Копія пастановы аб прадаўжэнні тэрміну праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве на працягу 24 гадзін накіроўваецца пракурору.

Артыкул 173[1]. Злучэнне і вылучэнне заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх

1. У адным вядзенні могуць быць злучаны заявы і паведамленні аб злачынстве і матэрыялы праверкі па іх з-за факта ўчынення адной асобай аднаго і таго ж ці некалькіх злачынстваў, з-за факта ўчынення некалькімі асобамі ў саўдзеле аднаго ці некалькіх злачынстваў, з-за факта ўчынення некалькімі асобамі ўзаемазвязаных па прадмеце злачынстваў, з-за факта не абяцанага загадзя ўкрывальніцтва гэтых злачынстваў ці неданясення аб іх, а таксама з-за факта знікнення асобы і грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, звязанага са знікненнем гэтай асобы.

2. Злучэнне заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх праводзіцца пастановай органа крымінальнага пераследавання, у вядзенні якога знаходзіцца адзін з матэрыялаў праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве.

3. Тэрмін вядзення па матэрыялах, у якіх злучаны некалькі заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх, лічыцца з дня рэгістрацыі заявы ці паведамлення аб злачынстве, якое зарэгістравана па часе першым. Агульным тэрмінам вядзення па такіх матэрыялах з'яўляецца найбольшы тэрмін разгляду адной(аго) са злучаных заяў і паведамленняў аб злачынстве.

4. Пры прыняцці рашэння, прадугледжанага пунктамі 1–4 часткі 1 артыкула 174 гэтага Кодэкса, органам крымінальнага пераследавання даецца ацэнка кожнаму з фактаў злачынстваў, заявы і паведамленні аб якіх і матэрыялы праверкі па якіх злучаны ў адным вядзенні.

5. Орган крымінальнага пераследавання мае права вылучыць са злучаных заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх у асобнае вядзенне заяву ці паведамленне аб злачынстве і матэрыялы праверкі па ёй(ім), калі прызнае сабраныя

матэрыялы праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве дастатковымі для прыняцця аднаго з рашэнняў, прадугледжаных пунктамі 1–4 часткі 1 артыкула 174 гэтага Кодэкса, а таксама калі ў ходзе вядзення па матэрыялах праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве высветліцца адсутнасць фактаў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, якія сталі падставай для злучэння заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх.

6. Вылучэнне заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх праводзіцца пастановай органа крымінальнага пераследавання. У вылучаных матэрыялах праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве павінны змяшчацца арыгіналы або копіі працэсуальных дакументаў.

7. Тэрмін вядзення па вылучаных матэрыялах праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве лічыцца з дня рэгістрацыі заявы ці паведамлення аб злачынстве, якія сталі падставай для правядзення праверкі.

8. Копіі пастаноў аб злучэнні і аб вылучэнні заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх на працягу 24 гадзін накіроўваюцца пракурору.

Артыкул 173[2]. Парадак накіравання органам дазнання заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім у орган папярэдняга следства і вяртання органам папярэдняга следства заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім органу дазнання

1. Рашэнне аб накіраванні заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім у орган папярэдняга следства пры наяўнасці дастатковых даных, якія паказваюць на прыкметы злачынства, прымае начальнік органа дазнання ў выглядзе матываванай пастановы.

2. Рашэнне аб вяртанні заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім органу дазнання ў адпаведнасці з пунктам 6 часткі 2 артыкула 35 гэтага Кодэкса прымае начальнік следчага падраздзялення ў выглядзе матываванай пастановы. Пры вяртанні заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па ім пастанова разам з заявай ці паведамленнем аб злачынстве і матэрыяламі праверкі па ім накіроўваецца пракурору з адначасовым пісьмовым паведамленнем органу дазнання.

3. Па заяве ці паведамленні аб злачынстве, якія паступілі для вяртання органу дазнання, і матэрыялах праверкі па іх пракурор у межах тэрміну правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве, прадугледжанага часткай 4 артыкула 173 гэтага Кодэкса, але не пазней за трое сутак, а па заяве ці паведамленні аб злачынстве, тэрмін праверкі па якой(якім) прадоўжаны больш за адзін месяц, – не пазней за пяць сутак прымае рашэнне аб накіраванні заявы ці паведамлення аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх у орган дазнання або адно з рашэнняў, прадугледжаных пунктамі 1, 2 і 4 часткі 1 артыкула 174 гэтага Кодэкса.

Артыкул 173[3]. Прыпыненне і аднаўленне правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве

1. Правядзенне праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве можа быць прыпынена матываванай пастановай органа дазнання, следчага ці пракурора пры наяўнасці адной з наступных падстаў, якія перашкаджаюць прыняццю рашэння, прадугледжанага пунктамі 1–4 часткі 1 артыкула 174 гэтага Кодэкса:

1) неатрымання адказу на міжнародны запыт;

2) неатрымання вынікаў экспертызы або праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

2. Гранічны агульны тэрмін прыпыненняў праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве не можа перавышаць тры месяцы.

3. Правядзенне дзеянняў, указаных у частцы 2 артыкула 173 гэтага Кодэкса, за выключэннем экспертызы і праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці, па прыпыненай праверцы па заяве ці паведамленні аб злачынстве не дапускаецца.

4. Прыпыненая праверка па заяве ці паведамленні аб злачынстве аднаўляецца матываванай пастановай органа дазнання, следчага ці пракурора пасля таго, як адпалі падставы для яе прыпынення або ўзнікла неабходнасць правядзення дадатковых дзеянняў, указаных у частцы 2 артыкула 173 гэтага Кодэкса.

5. Прыпыненая праверка па заяве ці паведамленні аб злачынстве можа быць адноўлена таксама матываванай пастановай:

1) начальніка следчага падраздзялення ў сувязі з адменай пастановы следчага аб прыпыненні правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве;

2) пракурора ў сувязі з адменай пастановы органа дазнання, следчага, начальніка следчага падраздзялення ці ніжэйстаячага пракурора аб прыпыненні правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве.

6. Аб прыпыненні і аднаўленні правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве на працягу 24 гадзін паведамляецца заяўніку. Копіі пастаноў аб прыпыненні і аб аднаўленні правядзення праверкі на працягу 24 гадзін накіроўваюцца пракурору. Пастанова аб прыпыненні правядзення праверкі можа быць абскарджана начальніку следчага падраздзялення, пракурору.

Артыкул 174. Рашэнні, якія прымаюцца па заявах ці паведамленнях аб злачынстве

1. Па атрыманай заяве ці паведамленні аб злачынстве або пры непасрэдным выяўленні прыкмет злачынства орган дазнання, начальнік следчага падраздзялення, следчы ці пракурор прымае адно з наступных рашэнняў:

1) аб распачынанні крымінальнай справы;

2) аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы;

3) аб перадачы заявы, паведамлення па падсследнасці, кампетэнцыі;

4) аб спыненні праверкі і растлумачэнні заяўніку права распачаць у судзе ў адпаведнасці з артыкулам 426 гэтага Кодэкса крымінальную справу прыватнага абвінавачання, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай 51 артыкула 26 гэтага Кодэкса.

2. Прыняцце рашэнняў па атрыманых заявах ці паведамленнях аб злачынствах:

звязаных са смерцю чалавека;

прадугледжаных артыкуламі 161, 162, 165, 302, 303, 305, 306 і 362–366 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

супраць палавой недатыкальнасці ці палавой свабоды, прадугледжаных артыкуламі 166–170 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

учыненых дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, службовымі асобамі, якія займаюць адказнае становішча, указанымі ў частцы 5 артыкула 4 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

учыненых службовымі асобамі пракуратуры, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі, фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь у сувязі з іх службовай ці прафесійнай дзейнасцю,

адносіцца да выключнай кампетэнцыі органаў папярэдняга следства ў адпаведнасці з іх падсследнасцю і пракурора з улікам асаблівасцей, устаноўленых главой 49 гэтага Кодэкса.

3. Аб прынятым рашэнні паведамляецца заяўніку і адначасова яму растлумачваецца права на абскарджанне рашэння.

31. Копія пастановы аб спыненні праверкі ў адпаведнасці з пунктам 4 часткі 1 гэтага артыкула на працягу 24 гадзін накіроўваецца заяўніку, асобе, у адносінах да якой

прынята рашэнне, і пракурору. Пры гэтым заяўніку, асобе, у адносінах да якой прынята рашэнне, растлумачваюцца права і парадак абскарджання пастановы, а таксама права азнаямлення з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве.

4. Пры накіраванні заявы ці паведамлення па падследнасці орган крымінальнага пераследавання абавязаны прыняць меры да прадухілення ці стрымання злачынства, а таксама да замацавання слядоў злачынства.

ГЛАВА 21
ПАРАДАК РАСПАЧЫНАННЯ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ

Артыкул 175. Распачынанне крымінальнай справы публічнага абвінавачання

1. Пры наяўнасці нагод і падстаў, прадугледжаных артыкуламі 166 і 167 гэтага Кодэкса, орган дазнання, следчы, пракурор выносяць пастанову аб распачынанні крымінальнай справы. Крымінальная справа распачынаецца па факце ўчыненага злачынства або ў адносінах да асобы, падазраванай ва ўчыненні злачынства.

2. У пастанове ўказваюцца час і месца яе вынясення, кім яна складзена, нагода і падстава да распачынання справы, артыкул крымінальнага закона, па прыкметах якога яна распачынаецца, даныя аб асобе, у адносінах да якой распачата крымінальная справа, а таксама далейшае накіраванне справы. Копія пастановы аб распачынанні крымінальнай справы на працягу 24 гадзін накіроўваецца пракурору. Аб прынятым рашэнні паведамляецца заяўніку.

3. У пастанове аб распачынанні крымінальнай справы па факце знікнення асобы артыкул Крымінальнага кодэкса не ўказваецца.

Артыкул 176. Распачынанне крымінальнай справы прыватна-публічнага абвінавачання

1. Крымінальныя справы аб злачынствах, пералічаных у частцы 4 артыкула 26 гэтага Кодэкса, распачынаюцца органам дазнання, следчым ці пракурорам у адпаведнасці з правіламі артыкула 175 гэтага Кодэкса няйнакш як па заяве асобы, пацярпелай ад злачынства, яе законнага прадстаўніка, прадстаўніка юрыдычнай асобы.

2. Калі паведамленне аб якім-небудзь злачынстве, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула, закранае істотныя інтарэсы дзяржавы ці грамадства або калі асоба, якая пацярпела ад злачынства, з прычыны бездапаможнага стану, залежнасці ад асобы, якая ўчыніла злачынства, ці з-за іншых прычын не ў стане абараніць свае правы і законныя інтарэсы, пракурор мае права распачаць крымінальную справу і пры адсутнасці заявы.

Артыкул 177. Накіраванне крымінальнай справы пасля яе распачынання

Пасля вынясення пастановы аб распачынанні крымінальнай справы:

1) пракурор накіроўвае крымінальную справу ў адпаведнасці з падследнасцю, вызначанай артыкулам 182 гэтага Кодэкса, ці ніжэйстаячаму пракурору або бярэцца за правядзенне папярэдняга следства;

2) начальнік следчага падраздзялення даручае вядзенне папярэдняга следства следчаму або бярэцца за правядзенне папярэдняга следства;

3) следчы бярэцца за правядзенне папярэдняга следства;

4) орган дазнання пасля правядзення безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў накіроўвае крымінальную справу для правядзення папярэдняга следства.

Артыкул 178. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы

1. Пры адсутнасці падстаў для распачынання крымінальнай справы орган дазнання, следчы, пракурор выносяць матываваную пастанову аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, у рэзалютыўнай частцы якой выкладаюцца рашэнне органа дазнання, следчага, пракурора аб адмове ў распачынанні крымінальнай

справы са спасылкай на пункт, частку і артыкул Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, у распачынанні крымінальнай справы па якіх адмаўляецца, адпаведны пункт часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, а таксама рашэнне аб лёсе забраных у ходзе правядзення праверкі слядоў, прадметаў і дакументаў.

2. Копія пастановы аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы на працягу 24 гадзін накіроўваецца заяўніку, асобе, у адносінах да якой прынята рашэнне, і пракурору. Пры гэтым заяўніку, асобе, у адносінах да якой прынята рашэнне, растлумачваюцца права і парадак абскарджання пастановы, а таксама права азнаямлення з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве. Копія пастановы аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, у якой змяшчаюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, заяўніку, асобе, у адносінах да якой прынята рашэнне, не накіроўваецца. Заяўнік, асоба, у адносінах да якой прынята рашэнне, апавяшчаюцца аб прынятым рашэнні, і ім растлумачваюцца права і парадак абскарджання пастановы, а таксама права азнаямлення з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве.

3. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы можа быць абскарджана начальніку следчага падраздзялення, пракурору ці ў суд.

4. Калі з атрыманай заявы ці паведамлення прасочваюцца парушэнні палітычных, працоўных, жыллёвых, сямейных і іншых правоў грамадзян, а таксама парушэнні законных інтарэсаў арганізацый, якія абараняюцца ў парадку грамадзянскага судаводства, то адначасова з адмовай у распачынанні крымінальнай справы зацікаўленым асобам павінны быць растлумачаны права і парадак звароту ў суд для аднаўлення парушаных правоў і інтарэсаў у парадку грамадзянскага судаводства.

Артыкул 178[1]. Азнаямленне з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве

1. Заяўнік, асоба, у адносінах да якой прынята рашэнне аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы або аб спыненні праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве, мае права звярнуцца ў орган крымінальнага пераследавання для азнаямлення з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве ў межах тэрміну даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, а ў выпадку, калі рашэнне прынята на падставе, прадугледжанай пунктам 3 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, – у месячны тэрмін з дня прыняцця органам крымінальнага пераследавання адпаведнага рашэння.

2. Орган крымінальнага пераследавання па заяве асоб, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, прад'яўляе ім для азнаямлення матэрыялы праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве ў падшытым і пранумараваным выглядзе, за выключэннем матэрыялаў, якія адносяцца да іншай заявы ці паведамлення аб злачынстве, у выпадку злучэння заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх і матэрыялаў, якія змяшчаюць звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам, і растлумачвае ім парадак, умовы і тэрміны азнаямлення з матэрыяламі, устаноўленыя гэтым артыкулам. Па просьбе асобы, якая ажыццяўляе азнаямленне з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве, рэпрадукуюцца фанаграмы, дэманструюцца відэазапісы, кінафільмы, слайды, калі гэтакія ёсць у матэрыялах.

3. Агульны тэрмін для азнаямлення з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве не можа перавышаць адзін месяц.

4. Аб азнаямленні з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. У пратаколе ўказваецца, якія матэрыялы прад'яўлены для азнаямлення.

Артыкул 179. Нагляд пракурора за законнасцю распачынання крымінальнай справы

Пракурор, які ажыццяўляе нагляд за законнасцю распачынання крымінальнай справы, мае права:

1) праверыць выкананне органам крымінальнага пераследавання патрабаванняў закона аб прыёме, рэгістрацыі і разглядзе заяў і паведамленняў аб злачынстве;

2) прадоўжыць тэрмін разгляду заявы ці паведамлення аб злачынстве па матэрыялах, якія знаходзяцца ў органе дазнання ці ў пракурора, у парадку, устаноўленым часткамі 3 і 4 артыкула 173 гэтага Кодэкса;

3) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб злучэнні ці вылучэнні заяў і паведамленняў аб злачынстве і матэрыялаў праверкі па іх;

4) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб прыпыненні правядзення праверкі па заяве ці паведамленні аб злачынстве і накіраваць матэрыялы для правядзення праверкі;

5) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні праверкі і накіраваць матэрыялы для правядзення дадатковай праверкі;

6) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы, аб спыненні праверкі і распачаць крымінальную справу;

7) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб распачынанні крымінальнай справы і адмовіць у распачынанні крымінальнай справы;

8) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб распачынанні крымінальнай справы і накіраваць матэрыялы для правядзення дадатковай праверкі;

9) адмяніць пастанову органа дазнання, следчага ці ніжэйстаячага пракурора аб распачынанні крымінальнай справы і спыніць вядзенне па крымінальнай справе, калі па ёй ужо праведзены следчыя дзеянні.

РАЗДЗЕЛ VIII
ПАПЯРЭДНЯЕ РАССЛЕДАВАННЕ

ГЛАВА 22
АГУЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ПАПЯРЭДНЯГА РАССЛЕДАВАННЯ

Артыкул 180. Органы, упаўнаважаныя законам ажыццяўляць папярэдняе следства і дазнанне

Папярэдняе следства па крымінальных справах праводзяць следчыя Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнай бяспекі, дазнанне па крымінальных справах праводзяць органы дазнання.

Артыкул 181. Абавязковасць папярэдняга следства

1. Папярэдняе следства абавязковае па ўсіх крымінальных справах, за выключэннем спраў аб злачынствах, указаных у частцы 2 артыкула 26 гэтага Кодэкса.

2. Правядзенне папярэдняга следства абавязковае таксама па ўсіх справах аб злачынствах, учыненых непаўналетнімі, а таксама аб прадугледжаных крымінальным законам грамадска небяспечных дзеяннях асоб у стане бессвядомасці ці асоб, якія захварэлі псіхічным расстройствам (захворваннем) пасля ўчынення злачынства.

Артыкул 182. Падследнасць

1. Папярэдняе следства па крымінальных справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, за выключэннем указаных у частцы 2 гэтага артыкула, а таксама па крымінальных справах, распачатых па фактах знікнення асоб у адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 167 гэтага Кодэкса, праводзяць следчыя Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

2. Па крымінальных справах аб злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 124–126, 229, 289–290[5], часткай 4 артыкула 294, часткай 4 артыкула 295, часткай 4 артыкула

309, часткай 3 артыкула 311, часткай 3 артыкула 322, часткай 3 артыкула 323, часткай 3 артыкула 324, часткай 2 артыкула 333, артыкуламі 356–361[3], 373–375 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, папярэдняе следства праводзяць следчыя органаў дзяржаўнай бяспекі.

3. Калі ў ходзе расследавання будуць выяўлены злачынствы, справы аб якіх адносяцца да падследнасці іншага органа папярэдняга следства, расследаванне працягвае орган, яго які ажыццяўляе, або падследнасць вызначае пракурор.

4. Пры злучэнні ў адным вядзенні спраў па абвінавачанні адной ці некалькіх асоб ва ўчыненні злачынстваў, падследных розным органам папярэдняга следства, расследаванне праводзіць орган, які па часе першы ўзбудзіў крымінальную справу, або падследнасць вызначае пракурор.

5. У мэтах забеспячэння ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання акалічнасцей крымінальнай справы па матываваным рашэнні Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, які выконвае яго абавязкі, справа можа быць перададзена ад аднаго органа папярэдняга следства іншаму незалежна ад падследнасці.

Артыкул 183. Пачатак правядзення папярэдняга расследавання

1. Папярэдняе расследаванне праводзіцца толькі пасля распачынання крымінальнай справы.

2. Следчы, орган дазнання, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны неадкладна ўзяцца за папярэдняе расследаванне па распачатай ці перададзенай ім справе. Аб прыняцці справы да свайго вядзення яны выносяць пастанову. Копія пастановы не пазней за 24 гадзіны накіроўваецца пракурору.

Артыкул 184. Месца правядзення папярэдняга расследавання

1. Папярэдняе расследаванне праводзіцца па месцы ўчынення злачынства, а ў выпадку, калі яго немагчыма вызначыць, па месцы яго выяўлення.

2. У мэтах забеспячэння найбольшай хуткасці, аб'ектыўнасці і паўнаты даследавання акалічнасцей крымінальнай справы папярэдняе расследаванне можа праводзіцца па месцы знаходжання падазраванага, абвінавачанага ці большасці сведак.

3. Следчы, выявіўшы, што гэта крымінальная справа яму не падследная, абавязаны правесці безадкладныя следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні і накіраваць справу па падследнасці.

4. У выпадку неабходнасці правядзення следчых і іншых працэсуальных дзеянняў у іншай мясцовасці следчы, орган дазнання мае права правесці іх асабіста або даручыць правядзенне гэтых дзеянняў следчаму, органу дазнання па тэрытарыяльнасці. Следчы можа даручыць правядзенне следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, правядзенне аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў органам, упаўнаважаным законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, па месцы папярэдняга расследавання ці па месцы іх правядзення. Даручэнне даецца ў пісьмовай форме і падлягае выкананню ў тэрмін не пазней за дзесяць сутак, калі іншы тэрмін не ўзгоднены са следчым, органам дазнання, які даў даручэнне.

5. У выпадку неабходнасці правядзення працэсуальных і іншых дзеянняў на тэрыторыі замежнай дзяржавы орган крымінальнага пераследавання мае права накіраваць адпаведную просьбу ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 185. Правядзенне папярэдняга следства следчай групай

1. Папярэдняе следства па крымінальнай справе ў выпадку складанасці ці працаёмкасці расследавання можа быць даручана групе следчых (следчай групе), аб чым указваецца ў пастанове аб распачынанні крымінальнай справы, ці выносіцца асобная пастанова. Рашэнне аб гэтым мае права прыняць пракурор, яго намеснік ці начальнік следчага падраздзялення. Рашэнне аб даручэнні расследавання крымінальнай справы групе следчых Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь і органаў дзяржаўнай бяспекі прымаецца начальнікамі следчых падраздзяленняў гэтых дзяржаўных органаў

або пасля ўзгаднення з імі. У пастанове павінны быць указаны ўсе следчыя, якім даручана правядзенне папярэдняга следства, у іх ліку следчы – кіраўнік следчай групы.

2. Кіраўнік следчай групы прымае крымінальную справу да свайго вядзення, арганізуе яе працу, кіруе дзеяннямі іншых следчых, прымае рашэнні аб злучэнні і вылучэнні спраў; спыненні вядзення па крымінальнай справе ў цэлым ці яе частцы; прыпыненні ці аднаўленні вядзення па крымінальнай справе; распачынанні хадайніцтваў аб прадаўжэнні тэрміну следства; прымяненні ў якасці мер стрымання ўзяцця пад варту, хатняга арышту і іх прадаўжэнні; прыцягненні ў якасці абвінавачанага.

3. Пастанову аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд складае кіраўнік следчай групы.

4. Кіраўнік следчай групы мае права ўдзельнічаць у следчых дзеяннях, якія праводзяцца іншымі следчымі, асабіста правесці следчыя дзеянні і прымаць рашэнні па справе.

5. Падазраваны, абвінавачаны, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, іх прадстаўнікі павінны быць азнаёмлены з пастановай аб папярэднім следстве па крымінальнай справе групай следчых, аб змяненні складу следчай групы і ім растлумачваецца права на адвод любога следчага са складу групы.

Артыкул 186. Дзейнасць органаў дазнання па крымінальных справах

1. Пры наяўнасці прыкмет злачынства орган дазнання перадае заяву ці паведамленне з сабранымі матэрыяламі праверкі па падследнасці, вызначанай артыкулам 182 гэтага Кодэкса, ці распачынае крымінальную справу. Кіруючыся правіламі гэтага Кодэкса, асоба, якая праводзіць дазнанне, па распачатай крымінальнай справе праводзіць безадкладныя следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні для выяўлення і замацавання слядоў злачынства: агляд, вобшук, адабранне, накладанне арышту на маёмасць, паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, праслухоўванне і запіс перамоў, прад'яўленне для апазнання, агляд, затрыманне, прымяненне меры стрымання і допыт падазраваных, допыт пацярпелых і сведак, атрыманне ўзораў для параўнальнага даследавання, прызначэнне экспертыз.

2. Аб выяўленым злачынстве і распачынанні крымінальнай справы орган дазнання неадкладна паведамляе пракурору.

3. Пасля выканання безадкладных следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, але не пазней за дзесяць сутак з дня распачынання крымінальнай справы орган дазнання абавязаны перадаць справу следчаму.

4. Пасля перадачы крымінальнай справы следчаму органы, упаўнаважаныя законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, могуць праводзіць па ёй следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні, праводзіць аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы толькі па даручэнні следчага. У выпадку перадачы следчаму справы, па якой не з’явілася магчымым высветліць асобу, якая ўчыніла злачынства, органы, упаўнаважаныя законам ажыццяўляць дазнанне, аператыўна-вышуковую дзейнасць, абавязаны правесці аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы для выяўлення асобы, якая ўчыніла злачынства, паведамляючы следчаму аб атрыманых выніках.

Артыкул 187. Выключаны

Артыкул 188. Выключаны

Артыкул 189. Выключаны

Артыкул 190. Тэрмін правядзення папярэдняга следства

1. Папярэдняе следства па крымінальных справах павінна быць закончана не пазней чым у двухмесячны тэрмін з дня распачынання крымінальнай справы і да перадачы справы пракурору для накіравання ў суд ці да дня спынення вядзення па справе.

2. У тэрмін папярэдняга следства не ўключаецца час, на працягу якога папярэдняе следства было прыпынена на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

3. Тэрмін папярэдняга следства, устаноўлены часткай 1 гэтага артыкула, можа быць прадоўжаны пракурорамі раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённымі і прыраўнаванымі да іх транспартнымі пракурорамі ці іх намеснікамі па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў вядзенні пракурора, да трох месяцаў. Пракурорамі вобласці, горада Мінска ці іх намеснікамі па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў вядзенні пракурора, тэрмін працягваецца да шасці месяцаў.

31. Тэрмін папярэдняга следства, устаноўлены часткай 1 гэтага артыкула, можа быць прадоўжаны начальнікам следчага аддзела раёна, горада, раёна ў горадзе і прыраўнаваных да яго аддзелаў ці асобай, якая выконвае яго абавязкі, да трох месяцаў. Начальнік вышэйстаячага следчага падраздзялення ці яго намеснік працягвае тэрмін да шасці месяцаў. Копія пастановы аб прадаўжэнні тэрміну папярэдняга следства на працягу 24 гадзін накіроўваецца адпаведнаму пракурору.

4. Далейшае прадаўжэнне тэрміну папярэдняга следства можа быць праведзена толькі ў выключных выпадках Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікамі.

5. Пры вяртанні, накіраванні пракурорам ці яго намеснікам крымінальнай справы для правядзення дадаткова папярэдняга следства, а таксама пры аднаўленні вядзення па крымінальных справах, па якіх яно было прыпынена ці спынена, следства праводзіцца ў тэрмін да аднаго месяца з дня прыняцця следчым справы да свайго вядзення. Далейшае прадаўжэнне тэрміну следства праводзіцца на агульных падставах у парадку, прадугледжаным гэтым артыкулам. Пры гэтым улічваецца і тэрмін, раней затрачаны на вядзенне па крымінальнай справе.

6. У выпадку неабходнасці прадаўжэння тэрміну следства следчы абавязаны скласці аб гэтым матываваную пастанову аб распачынанні хадайніцтва і падаць яго адпаведнаму пракурору, начальніку следчага падраздзялення ці іх намеснікам не пазней за трое сутак да сканчэння тэрміну следства.

Артыкул 191. Заканчэнне правядзення папярэдняга следства

1. Правядзенне папярэдняга следства заканчваецца вынясеннем пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, пастановы аб спыненні вядзення па крымінальнай справе або пастановы аб перадачы справы пракурору для накіравання ў суд для рашэння пытання аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння.

2. У выпадку, калі папярэдняе следства па крымінальнай справе ці кіраўніцтва следчай групай ажыццяўляў пракурор, вынясення пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд не патрабуецца.

Артыкул 192. Агульныя правілы правядзення следчых дзеянняў

1. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, прыцягваючы людзей да ўдзелу ў следчых дзеяннях, прадугледжаных гэтым Кодэксам, упэўніваюцца ў іх асобе, растлумачваюць ім правы і абавязкі, а таксама парадак правядзення следчага дзеяння.

2. Правядзенне следчых дзеянняў у начны час не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, якія адкладваць нельга.

3. Пры правядзенні следчых дзеянняў могуць прымяняцца тэхнічныя сродкі і выкарыстоўвацца навукова абгрунтаваныя спосабы выяўлення, фіксацыі і адабрання слядоў злачынства і рэчыўных доказаў. Прымяненне такіх сродкаў і спосабаў іншымі ўдзельнікамі следчага дзеяння дапускаецца з дазволу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне.

4. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права прыцягнуць да ўдзелу ў следчых дзеяннях работніка органа дазнання.

5. Выклік асобы, якая аказвае ці аказвала садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове органу, упаўнаважанаму законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці асобы, у адносінах да якой прыменены меры для загарантавання бяспекі, для правядзення следчых дзеянняў праводзіцца праз орган, упаўнаважаны законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці дзяржаўны орган, якому даручана прымяненне мер для забеспячэння бяспекі.

Артыкул 193. Пратакол следчага дзеяння

1. Пратакол следчага дзеяння складаецца ў ходзе правядзення следчага дзеяння ці непасрэдна пасля яго заканчэння.

2. Пратакол можа быць напісаны ад рукі ці выраблены з дапамогай тэхнічных сродкаў. Для забеспячэння паўнаты пратакола могуць быць прыменены стэнаграфаванне, кіназдымка, гука- і відэазапіс. Стэнаграфічны запіс, матэрыялы кіназдымкі, гука- і відэазапісы захоўваюцца пры крымінальнай справе.

3. У пратаколе ўказваюцца месца і дата правядзення следчага дзеяння, час яго пачатку і заканчэння з дакладнасцю да хвіліны, пасада і прозвішча асобы, якая склала пратакол, а таксама прозвішча, імя, імя па бацьку кожнай асобы, якая ўдзельнічае ў правядзенні следчага дзеяння, а ў неабходных выпадках і яе адрас і іншыя даныя аб асобе. У пратаколе выкладаюцца дзеянні ў тым парадку, у якім яны адбыліся, выяўленыя і істотныя для справы акалічнасці, а таксама заявы асоб, якія ўдзельнічалі ў правядзенні следчага дзеяння.

4. Калі пры правядзенні следчага дзеяння прымяняліся навукова-тэхнічныя сродкі выяўлення і замацавання слядоў злачынства (фатаграфаванне, кіназдымка, гука- і відэазапіс, выраб злепкаў і адбіткаў слядоў і інш.), складаліся чарцяжы, схемы, планы, то ў пратаколе павінны быць указаны таксама тэхнічныя сродкі, прымененыя пры правядзенні адпаведнага следчага дзеяння, умовы і парадак іх выкарыстання, аб'екты, да якіх гэтыя сродкі былі прыменены, і атрыманыя вынікі. Акрамя таго, у пратаколе павінна быць адзначана, што перад прымяненнем тэхнічных сродкаў аб гэтым было паведамлена асобам, якія ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння.

5. Пратакол прад'яўляецца для азнаямлення ўсім асобам, якія ўдзельнічалі ў правядзенні следчага дзеяння. Ім растлумачваецца права рабіць заўвагі, якія падлягаюць унясенню ў пратакол. Усе ўнесеныя ў пратакол заўвагі, дапаўненні і выпраўленні павінна быць агавораны і засведчаны подпісамі гэтых асоб.

6. Пратакол падпісваюць следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, дапытаная асобай, перакладчык, спецыяліст, панятыя і іншыя асобы, якія ўдзельнічалі ў правядзенні следчага дзеяння.

7. Да пратакола дадаюцца носьбіты інфармацыі, у тым ліку фатаграфічныя негатывы і здымкі, кінастужкі, дыяпазітывы, фанаграмы допыту, касеты відэазапісу, відэаграмы, чарцяжы, планы, схемы, злепкі і адбіткі слядоў, выкананыя пры правядзенні следчага дзеяння, а таксама адабраныя пры гэтым прадметы.

8. Пры неабходнасці загарантаваць бяспеку пацярпелага, яго прадстаўніка, сведкі, членаў сямей, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх яны абгрунтавана лічаць блізкімі, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права ў пратаколе следчага дзеяння, у якім удзельнічаюць пацярпелы, яго прадстаўнік, сведка, не прыводзіць даныя аб іх асобе. У гэтым выпадку следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны вынесці пастанову, у якой выкладаюцца прычыны прынятага рашэння аб захаванні ў тайне даных аб асобе ўдзельніка следчага дзеяння, указваюцца выдуманыя персанальныя даныя і прыводзіцца ўзор подпісу, якія яны будуць выкарыстоўваць у пратаколах следчых дзеянняў з яго ўдзелам.

Артыкул 194. Пасведчанне факта адмовы ад падпісання ці немагчымасці падпісання пратакола следчага дзеяння

1. Калі падазраваны, абвінавачаны, пацярпелы, сведка ці іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння, адмовяцца падпісаць пратакол следчага

дзеяння, аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе, якая завяраецца подпісам асобы, якая праводзіла следчае дзеянне.

2. Асобе, якая адмовілася падпісаць пратакол, павінна быць дадзена магчымасць даць тлумачэнне аб прычынах адмовы, якое заносіцца ў пратакол.

3. Калі падазраваны, абвінавачаны, пацярпелы, сведка з прычыны фізічных недахопаў ці стану здароўя не могуць падпісаць пратакол іх допыту, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права са згоды дапытваных запрасіць іншую асобу, якая сведчыць сваім подпісам правільнасць запісу іх паказанняў. Гэты пратакол падпісваюць следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, якія праводзілі допыт. У пратаколе іншага следчага дзеяння ў такіх выпадках робіцца адзнака аб немагчымасці яго падпісання ўказанымі асобамі, якая завяраецца подпісамі следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, і іншых асоб, калі яны ўдзельнічалі ў правядзенні гэтага следчага дзеяння.

Артыкул 195. Абавязковасць растлумачэння і забеспячэння правоў удзельнікам следчага дзеяння

Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны растлумачыць падазраванаму, абвінавачанаму, пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам, іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння, іх правы і забяспечыць магчымасць ажыццяўлення гэтых правоў у ходзе расследавання справы. Адначасова ім павінны быць растлумачаны ўскладзеныя на іх абавязкі і наступствы іх невыканання.

Артыкул 196. Абавязковасць разгляду хадайніцтваў

1. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны разгледзець усе заяўленыя па крымінальнай справе хадайніцтвы. Пры гэтым яны не маюць права адмовіць падазраванаму, абвінавачанаму, іх абаронцам, пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку, прадстаўнікам у допыце сведак, у правядзенні экспертыз і іншых следчых дзеянняў, калі акалічнасці, аб выяўленні якіх яны хадайнічаюць, могуць мець значэнне для справы.

2. Аб выніках разгляду хадайніцтва ў тэрмін не большы за трое сутак паведамляецца асобе, якая яго заявіла. Пры поўнай ці частковай адмове ў задавальненні хадайніцтва следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны вынесці пастанову з указаннем матываў адмовы.

Артыкул 197. Меры апекі аб дзецях, утрыманцах і для захавання маёмасці падазраванага, абвінавачанага

1. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, не пазней за наступны дзень пасля прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ў адносінах да падазраванага, абвінавачанага, калі дзеці ўказаных асоб застаюцца без апекі бацькоў, паведамляюць аб гэтым кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (маці ці бацькі) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей. Калі ва ўзятага пад варту падазраванага, абвінавачанага засталіся без нагляду і дапамогі састарэлыя бацькі, іншыя ўтрыманцы, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны прыняць меры для перадачы іх пад нагляд ці пад апеку сваякам або іншым асобам і ўстановам.

2. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны прыняць меры для захаванння маёмасці і жылля затрыманых ці ўзятых пад варту падазраванага, абвінавачанага.

3. Аб прынятых мерах апекі і мерах для захавання маёмасці і жылля пісьмова апавяшчаюцца падазраваны, абвінавачаны, і ім уручаецца копія пратакола вопісу маёмасці.

Артыкул 198. Недапушчальнасць раскрыцця даных папярэдняга расследавання

1. Даныя папярэдняга следства ці дазнання не падлягаюць раскрыццю. Яны могуць быць выдадзены толькі з дазволу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, і толькі ў тым аб'ёме, у якім імі будзе прызнана гэта магчымым, калі раскрыццё не супярэчыць інтарэсам папярэдняга расследавання і не звязана з парушэннем правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу. У выпадку атрымання ў ходзе вядзення па крымінальнай справе звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, неадкладна прымаюць меры для іх абароны ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

2. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права папярэдзіць абаронцу, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўнікоў, прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, сведак, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, панятых і іншых асоб, якія прысутнічаюць пры правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў, аб недапушчальнасці раскрыцця без іх дазволу звестак, якія ёсць у справе. У гэтых асоб бярэцца падпіска з папярэджаннем аб адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

3. Пры наяўнасці ў матэрыялах крымінальнай справы звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі ці іншай тайнай, якая ахоўваецца законам, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, папярэджваюць падазраванага, абвінавачанага, а таксама асоб, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, аб неабходнасці прытрымлівання імі патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах ці іншай тайне, якая ахоўваецца законам, а таксама аб адказнасці за раскрыццё звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі ці іншай тайнай, якая ахоўваецца законам, аб чым у іх бярэцца падпіска.

Артыкул 199. Прадстаўленне аб ліквідацыі парушэнняў закона, прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства

Выявіўшы пры вядзенні па матэрыялах праверкі ці крымінальнай справе парушэнні закона, прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства, орган крымінальнага пераследавання мае права ўнесці ў адпаведныя арганізацыі ці службовай асобе прадстаўленне аб прыняцці мер для ліквідацыі парушэнняў закона, прычын і ўмоў, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства, якое падлягае разгляду з абавязковым паведамленнем аб прынятых мерах у месячны тэрмін з дня атрымання прадстаўлення.

Артыкул 200. Удзел спецыяліста

1. Орган крымінальнага пераследавання мае права выклікаць для ўдзелу ў правядзенні следчага і іншага працэсуальнага дзеяння спецыяліста, не зацікаўленага ў зыходзе крымінальнай справы. Патрабаванне следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, аб выкліку спецыяліста абавязковае для кіраўнікоў арганізацый, дзе працуе спецыяліст.

2. Перад пачаткам правядзення следчага і іншага працэсуальнага дзеяння орган крымінальнага пераследавання ўпэўніваецца ў асобе і кампетэнтнасці спецыяліста, высвятляе яго адносіны да падазраванага, абвінавачанага і пацярпелага, растлумачвае спецыялісту яго правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 62 гэтага Кодэкса, і папярэджвае аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе і пацвярджаецца подпісам спецыяліста.

Артыкул 201. Удзел перакладчыка

1. У выпадках, прадугледжаных артыкулам 21 гэтага Кодэкса, орган крымінальнага пераследавання пры правядзенні следчых і іншых працэсуальных дзеянняў абавязаны забяспечыць удзел перакладчыка.

2. Перад пачаткам правядзення следчага і іншага працэсуальнага дзеяння, у якім удзельнічае перакладчык, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, упэўніваюцца ў асобе і кампетэнтнасці перакладчыка, высвятляюць яго адносіны да падазраванага, абвінавачанага і пацярпелага, растлумачваюць перакладчыку яго правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 63 гэтага Кодэкса, і папярэджваюць аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, а таксама аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў і за заведама няправільны пераклад, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе следчага і іншага працэсуальнага дзеяння, якая пацвярджаецца подпісам перакладчыка.

Артыкул 202. Удзел панятых

1. Следчыя дзеянні ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, праводзяцца з удзелам не менш двух панятых. У выпадках, якія адкладваць нельга, або пры адсутнасці рэальнай магчымасці забяспечыць удзел панятых следчае дзеянне праводзіцца з прымяненнем гука- і відэазапісу ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам. Немагчымасць прымянення гука- і відэазапісу з-за тэхнічных або іншых прычын не выключае працягу правядзення следчага дзеяння з удзелам панятых. Паводле меркавання органа крымінальнага пераследавання панятыя могуць удзельнічаць у правядзенні следчых дзеянняў і ў выпадках, не прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Перад пачаткам правядзення следчага дзеяння следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, растлумачваюць панятым мэту следчага дзеяння, іх правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 64 гэтага Кодэкса, папярэджваюць аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе следчага дзеяння, якая пацвярджаецца подпісамі панятых.

Артыкул 202[1]. Прымяненне гука- і відэазапісу пры правядзенні следчых дзеянняў без удзелу панятых

1. Гука- і відэазапіс павінен адлюстроўваць увесь ход следчага дзеяння. Гука- і відэазапіс часткі следчага дзеяння, а таксама паўтарэнне следчага дзеяння спецыяльна для запісу не дапускаюцца.

2. Фанаграма і відэаграма захоўваюцца пры крымінальнай справе і пасля заканчэння папярэдняга расследавання апячатваюцца.

ГЛАВА 23
АГЛЯД, АГЛЯДАННЕ, СЛЕДЧЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ

Артыкул 203. Падставы для правядзення агляду

Падставай для правядзення агляду месца здарэння, трупа, мясцовасці, памяшкання, жылля і іншага законнага валодання, прадметаў і дакументаў з'яўляецца наяўнасць дастатковых даных меркаваць, што ў ходзе гэтых следчых дзеянняў могуць быць выяўлены сляды злачынства і іншыя матэрыяльныя аб'екты, высветлены іншыя акалічнасці, якія маюць значэнне для крымінальнай справы.

Артыкул 204. Парадак правядзення агляду

1. Агляд ажыццяўляецца на месцы правядзення следчага дзеяння. Калі для правядзення агляду спатрэбіцца працяглы час ці агляд на месцы выяўлення слядоў злачынства і іншых матэрыяльных аб'ектаў мае значныя перашкоды, аб'екты павінны быць адабраны, упакаваны, апячатаны і без пашкоджанняў дастаўлены ў іншае зручнае для агляду месца.

2. У неабходных выпадках пры аглядзе выкарыстоўваюцца навукова-тэхнічныя сродкі, праводзяцца вымярэнні, складаюцца планы і схемы, вырабляюцца злепкі і адбіткі слядоў. Пры магчымасці адбіраюцца самі сляды разам з прадметам ці яго часткай.

3. Адабранню падлягаюць толькі тыя аб'екты, якія могуць мець адносіны да крымінальнай справы ці матэрыялаў. Забраныя аб'екты ўпакоўваюцца, апячатваюцца з подпісам следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, і асоб, якія ўдзельнічаюць у

аглядзе. У выпадку грувасткасці аб'ектаў, што адбіраюцца, якая выключае магчымасць іх упакоўкі і апячатвання, аб'екты, якія адбіраюцца, павінны быць падрабязна апісаны ў пратаколе следчага дзеяння з указаннем індывідуальных прыкмет, якія дазваляюць іх ідэнтыфікаваць, і зафіксаваны з прымяненнем тэхнічных сродкаў фіксацыі ходу і вынікаў правядзення следчага дзеяння на месцы выяўлення.

4. Усё выяўленае і адабранае пры аглядзе павінна быць прад'яўлена ўдзельнікам агляду.

5. Да ўдзелу ў аглядзе следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права прыцягнуць падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, сведку, а таксама спецыяліста.

6. Асобы, якія ўдзельнічаюць у аглядзе, маюць права звяртаць увагу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, на ўсё, што, па іх меркаванні, можа спрыяць высвятленню акалічнасцей разгляду заяў і паведамленняў аб злачынствах, акалічнасцей крымінальнай справы.

7. Агляд жылля і іншага законнага валодання праводзіцца толькі са згоды ўласніка ці паўналетніх асоб, якія пражываюць у ім, ці па пастанове следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора ці яго намесніка, якая павінна быць прад'яўлена да пачатку агляду, і з удзелам панятых. Калі жыллё ці іншае законнае валоданне з'яўляюцца месцам здарэння або захоўвання прылад і сродкаў учынення злачынства, іншых прадметаў са слядамі злачынства, а таксама рэчываў і прадметаў, за захоўванне якіх прадугледжана крымінальная адказнасць, і іх агляд адкладваць нельга, то ён можа быць праведзены па пастанове следчага, органа дазнання без санкцыі пракурора з наступным накіраваннем яму на працягу 24 гадзін паведамлення аб праведзеным аглядзе.

8. Пры аглядзе жылля і іншага законнага валодання павінна быць забяспечана прысутнасць паўналетняй асобы, якая пражывае ў ім. У выпадку немагчымасці яе прысутнасці запрашаюцца прадстаўнікі арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, ці мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Пры немагчымасці забяспечыць прысутнасць указаных асоб пры правядзенні агляду жылля ці іншага законнага валодання, якія з'яўляюцца месцам здарэння або захоўвання прылад і сродкаў учынення злачынства, іншых прадметаў са слядамі злачынства, дапускаецца правядзенне агляду без удзелу ўказаных асоб.

9. Агляд у памяшканнях арганізацый праводзіцца ў прысутнасці прадстаўнікоў адміністрацыі, а ў месцах, дзе захоўваюцца матэрыяльныя каштоўнасці, – у прысутнасці матэрыяльна адказнай асобы.

10. Агляд у памяшканнях, якія займаюцца дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі, а таксама прадстаўніцтвамі і ўстановамі замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый, якія ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь карыстаюцца дыпламатычным імунітэтам, а таксама ў памяшканнях, у якіх пражываюць супрацоўнікі гэтых прадстаўніцтваў і ўстаноў і іх сем'і, можа праводзіцца толькі па просьбе ці са згоды кіраўніка адпаведнага прадстаўніцтва ці ўстановы і ў яго прысутнасці.

11. Згода прадстаўніцтва ці ўстановы просіцца праз Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Пры правядзенні агляду абавязковая прысутнасць пракурора і прадстаўніка Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

12. Аб правядзенні агляду складаецца пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

Артыкул 205. Агляд трупа. Эксгумацыя

1. Вонкавы агляд трупа на месцы яго выяўлення праводзяць следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, як правіла, з удзелам спецыяліста ў галіне судовай медыцыны. Для агляду трупа могуць прыцягвацца таксама іншыя спецыялісты.

2. Неапазнаныя трупы падлягаюць абавязковаму фатаграфаванню і дактыласкапіраванню.

3. Пры неабходнасці вымання трупа з месца пахавання (эксгумацыі) для агляду старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобы, якія выконваюць іх абавязкі, а таксама следчы выносяць пастанову. Пастанова следчага павінна быць санкцыянавана пракурорам ці яго намеснікам. Пастанова абавязковая для адміністрацыі месца пахавання, членаў сям'і і сваякоў памерлага.

4. Выманне трупа з месца пахавання і яго агляд праводзяцца з удзелам асоб, указаных у частцы 1 гэтага артыкула.

5. Аб правядзенні вымання трупа з месца пахавання складаецца пратакол з прытрымліваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

Артыкул 206. Агляданне

1. Для выяўлення на целе чалавека асаблівых прыкмет, слядоў злачынства, цялесных пашкоджанняў, выяўлення стану ап'янення ці іншых уласцівасцей і прыкмет, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, калі для гэтага не патрабуецца правядзенне экспертызы, можа быць праведзена агляданне падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага. Аб правядзенні аглядання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць пастанову.

2. Пастанова аб правядзенні аглядання абавязковая для падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага. У выпадку адмовы яны могуць быць агледжаны прымусова.

3. Агляданне праводзіцца следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне, а пры неабходнасці – з удзелам урача ці іншага спецыяліста.

4. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, не прысутнічаюць пры агляданні асобы іншага полу, калі агляданне суправаджаецца агаленнем цела гэтай асобы. У гэтым выпадку агляданне праводзіцца ўрачом у прысутнасці панятых аднаго полу з асобай, якая аглядаецца.

5. Аб правядзенні аглядання складаецца пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

Артыкул 207. Следчы эксперымент

1. У мэтах праверкі і ўдакладнення даных, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, следчы мае права правесці следчы эксперымент шляхам узнаўлення дзеяння, абстаноўкі ці іншых акалічнасцей пэўнай падзеі. Пры гэтым правяраецца магчымасць успрымання якіх-небудзь фактаў, учынення пэўных дзеянняў, надыходу якой-небудзь падзеі, а таксама выяўляецца паслядоўнасць падзеі, якая адбылася, і механізм утварэння слядоў.

11. Следчы эксперымент у жыллі і іншым законным валоданні праводзіцца толькі са згоды ўласніка ці паўналетніх асоб, якія пражываюць у ім, або па пастанове следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора ці яго намесніка, якая павінна быць прад'яўлена да пачатку следчага эксперыменту, і з удзелам панятых або з прымяненнем гука- і відэазапісу.

2. У выпадку неабходнасці да ўдзелу ў следчым эксперыменце могуць прыцягвацца падазраваны, абвінавачаны, пацярпелы, сведка, спецыяліст, эксперт і асобы, якія праводзяць вопытныя дзеянні з іх згоды. Удзельнікам следчага эксперыменту растлумачваюцца яго мэты і парадак правядзення.

3. У неабходных выпадках пры правядзенні следчага эксперыменту праводзяцца вымярэнні, фатаграфаванне, гука- і відэазапіс, кіназдымка, складаюцца планы і схемы.

4. Аб правядзенні следчага эксперыменту складаецца пратакол з выкананнем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 24
ВОБШУК, АДАБРАННЕ, НАКЛАДАННЕ АРЫШТУ НА ПАШТОВА-

ТЭЛЕГРАФНЫЯ І ІНШЫЯ АДПРАЎЛЕННІ, ПРАСЛУХОЎВАННЕ І ЗАПІС ПЕРАМОЎ

Артыкул 208. Падставы для правядзення вобшуку

Падставай для правядзення вобшуку з'яўляецца наяўнасць дастатковых даных меркаваць, што ў якім-небудзь памяшканні ці іншым месцы або ў якой-небудзь асобы знаходзяцца прылады і сродкі ўчынення злачынства, прадметы, дакументы і каштоўнасці, якія могуць мець значэнне для крымінальнай справы, а таксама могуць быць выяўлены асобы і трупы, якія адшукваюцца.

Артыкул 209. Падставы для правядзення адабрання

Падставай для правядзення адабрання з'яўляюцца дастатковыя даныя аб наяўнасці пэўных прадметаў і дакументаў, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, калі дакладна вядома, дзе і ў каго яны знаходзяцца.

Артыкул 210. Парадак правядзення вобшуку і адабрання

1. Аб правядзенні вобшуку і адабрання следчым, органам дазнання выносіцца пастанова. Пастанова аб правядзенні вобшуку, а таксама адабрання дакументаў, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам, павінна быць санкцыянавана пракурорам ці яго намеснікам, за выключэннем выпадкаў іх правядзення па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі.

2. Адабранне ў жыллі ці іншым законным валоданні супраць волі ўласніка ці асоб, якія пражываюць у ім, праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі часткі сёмай артыкула 204 гэтага Кодэкса.

3. У выключных выпадках, калі ёсць рэальная асцярога, што аб'ект, які адшукваецца і падлягае адабранню, можа быць з-за прамаруджання з яго выяўленнем страчаны, пашкоджаны ці выкарыстаны ў злачынных мэтах або асоба, якая адшукваецца, можа ўцячы, вобшук можа быць праведзены без санкцыі пракурора з наступным накіраваннем яму на працягу 24 гадзін паведамлення аб праведзеным вобшуку.

4. Вобшук праводзіцца з удзелам панятых. У неабходных выпадках пры вобшуку і адабранні ўдзельнічае спецыяліст.

5. Да пачатку правядзення вобшуку ці адабрання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны прад'явіць пастанову аб іх правядзенні.

6. Пачынаючы вобшук, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, прапаноўваюць выдаць добраахвотна падлеглыя адабранню прылады і сродкі ўчынення злачынства, прадметы, дакументы і каштоўнасці, якія могуць мець значэнне для крымінальнай справы. Калі яны выдадзены добраахвотна і няма падстаў асцерагацца скрывання падлеглых адабранню прылад і сродкаў учынення злачынства, прадметаў, дакументаў і каштоўнасцей, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права не праводзіць далейшых пошукаў.

7. Пры правядзенні вобшуку могуць ускрывацца замкнёныя памяшканні і сховішчы, калі ўладальнік адмаўляецца добраахвотна іх адкрыць. Пры гэтым не павінны дапускацца не выкліканыя неабходнасцю пашкоджанні запораў дзвярэй і іншых прадметаў.

8. Пры правядзенні адабрання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, прапаноўваюць выдаць прадметы і дакументы, якія падлягаюць адабранню, а ў выпадку адмовы ў гэтым праводзяць адабранне прымусова.

9. Вобшук і адабранне ў жыллі і іншым законным валоданні, у памяшканнях арганізацый праводзяцца ў прысутнасці асоб, указаных у частках восьмай і дзявятай артыкула 204 гэтага Кодэкса.

10. Вобшук і адабранне ў памяшканнях, якія займаюцца дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі, а таксама прадстаўніцтвамі і ўстановамі

замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый, якія ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь карыстаюцца дыпламатычным імунітэтам, а таксама ў памяшканнях, у якіх пражываюць супрацоўнікі прадстаўніцтваў і ўстаноў і іх сем'і, праводзяцца з прытрымліваннем патрабаванняў, устаноўленых часткамі дзясятай і адзінаццатай артыкула 204 гэтага Кодэкса.

11. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны прымаць меры для таго, каб не былі выдадзены выяўленыя пры вобшуку і адабранні акалічнасці прыватнага жыцця асобы, якая займае гэтае памяшканне, ці іншых асоб.

12. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права забараніць асобам, якія знаходзяцца ў памяшканні ці месцы, дзе праводзяцца вобшук ці адабранне, і асобам, якія прыходзяць у гэта памяшканне ці месца, пакідаць яго, а таксама размаўляць адна з адной ці з іншымі асобамі да заканчэння вобшуку ці адабрання.

13. Пры правядзенні вобшуку і адабрання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны абмяжоўвацца адабраннем прадметаў і дакументаў, якія могуць мець адносіны да справы. Прадметы, дакументы і каштоўнасці, забароненыя да абарачэння, падлягаюць адабранню незалежна ад іх адносін да справы.

14. Прылады і сродкі ўчынення злачынства, прадметы, дакументы і каштоўнасці, якія адбіраюцца, прад'яўляюцца асобам, якія ўдзельнічаюць пры гэтым, упакоўваюцца і апячатваюцца на месцы вобшуку ці адабрання за подпісамі следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, і іншых удзельнікаў.

15. Адміністрацыя арганізацый мае права ў прысутнасці асобы, якая праводзіць адабранне, зрабіць копіі з адабраных дакументаў і іншых носьбітаў інфармацыі. Аб вырабе копій і адпаведнасці іх арыгіналам, якія адбіраюцца, робіцца адзнака ў пратаколе адабрання. Копіі, якія не адпавядаюць адабраным арыгіналам, з'яўляюцца несапраўднымі.

Артыкул 211. Асабісты вобшук

1. Пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 208, і з захаваннем патрабаванняў артыкула 210 гэтага Кодэкса следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, службовая асоба органа папярэдняга следства ці органа дазнання мае права правесці асабісты вобшук падазраванага ці абвінавачанага ў мэтах выяўлення і адабрання прылад і сродкаў учынення злачынства, прадметаў, дакументаў і каштоўнасцей, якія знаходзяцца на іх целе, у адзенні і рэчах, якія ёсць пры іх.

2. Асабісты вобшук можа быць праведзены без вынясення пастановы і без санкцыі пракурора, а таксама без удзелу панятых, калі ён праводзіцца пры затрыманні асобы ці ўзяцці яе пад варту, а таксама пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што асоба, якая знаходзіцца ў памяшканні ці іншым месцы, у якім праводзіцца вобшук, хавае пры сабе прыладу і сродак учынення злачынства, прадметы, дакументы і каштоўнасці, якія могуць мець значэнне для крымінальнай справы.

3. Асабісты вобшук праводзіцца толькі асобай таго ж полу, што і асоба, якая абшукваецца, з удзелам спецыялістаў і панятых таго ж полу.

Артыкул 212. Пратакол вобшуку ці адабрання

1. Асоба, якая праводзіць вобшук ці адабранне, складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

2. У пратаколе павінна быць таксама ўказана, у якім месцы і пры якіх абставінах былі выяўлены прадметы, дакументы і каштоўнасці, выдадзены яны добраахвотна ці адабраны прымусова. Усе прадметы, якія адбіраюцца, павінны быць пералічаны ў пратаколе з дакладным указаннем колькасці, меры, вагі, індывідуальных прыкмет і па магчымасці кошту.

3. Калі пры правядзенні вобшуку ці адабрання былі зроблены спробы знішчыць ці схаваць прадметы, дакументы і каштоўнасці, якія падлягаюць адабранню, гэта павінна быць адлюстравана ў пратаколе з указаннем прынятых мер.

4. Копія пратакола вобшуку ці адабрання ўручаецца пад распіску асобе, у якой яны былі праведзены, або паўналетняму члену яе сям'і, а пры іх адсутнасці – прадстаўніку арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду, ці мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Калі вобшук ці адабранне праводзіліся ў арганізацыі, копія пратакола ўручаецца пад распіску яе прадстаўніку.

Артыкул 213. Накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, іх агляд і адабранне

1. Пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што лісты, тэлеграмы, радыёграмы, бандэролі, пасылкі і іншыя паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні могуць змяшчаць звесткі, дакументы і прадметы, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, на іх можа быць накладзены арышт. Накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, агляд і адабранне іх у паштова-тэлеграфных установах праводзяцца па пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, або па пастанове следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора ці яго намесніка.

2. У пастанове ўказваюцца прозвішча, імя, імя па бацьку асобы, паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні якой павінны быць затрыманыя, дакладны адрас гэтай асобы; падставы для накладання арышту і правядзення адабрання; віды паштова-тэлеграфных і іншых адпраўленняў, якія падлягаюць арышту; тэрмін дзеяння арышту; назва ўстановы сувязі, на якую ўскладаецца абавязак затрымліваць паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні і неадкладна паведамляць пра гэта следчаму, органу дазнання.

3. Пастанова аб накладанні арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні, аб іх аглядзе і адабранні накіроўваецца следчым, органам дазнання ў адпаведную ўстанову сувязі, якой прапаноўваецца затрымліваць паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні і неадкладна паведамляць аб гэтым следчаму, органу дазнання.

4. Агляд, адабранне і зняцце копій з затрыманых паштова-тэлеграфных і іншых адпраўленняў праводзяцца следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне, ва ўстанове сувязі з удзелам прадстаўніка гэтай установы. У неабходных выпадках для ўдзелу ў правядзенні агляду і адабрання паштова-тэлеграфных і іншых адпраўленняў следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, мае права выклікаць адпаведнага спецыяліста, а таксама перакладчыка. У кожным выпадку агляду паштова-тэлеграфных і іншых адпраўленняў складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса, у якіх указваецца, кім і якія паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні былі агледжаны, скапіраваны і адпраўлены адрасату ці адабраны.

5. Накладанне арышту на паштова-тэлеграфныя і іншыя адпраўленні адмяняецца пастановай следчага, органа дазнання. У любым выпадку гэтая мера не можа ажыццяўляцца больш за тэрмін папярэдняга расследавання па крымінальнай справе.

Артыкул 214. Праслухоўванне і запіс перамоў

1. Па крымінальных справах аб цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынствах, калі ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што перамовы з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў сувязі і іншыя перамовы падазраванага, абвінавачанага і іншых асоб могуць змяшчаць звесткі, якія маюць значэнне для справы, з санкцыі пракурора ці яго намесніка або па

пастанове старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, дапускаюцца праслухоўванне і запіс гэтых перамоў.

2. Аб неабходнасці праслухоўвання перамоў і іх запісу следчы, орган дазнання выносяць матываваную пастанову, у якой указваюцца крымінальная справа і падставы, на якіх павінна праводзіцца гэтае следчае дзеянне; прозвішча, імя, імя па бацьку асоб, чые перагаворы падлягаюць праслухоўванню і запісу, і на працягу якога тэрміну; установа, якой даручаецца тэхнічнае ажыццяўленне праслухоўвання і запісу перамоў.

3. Пастанова накіроўваецца следчым, органам дазнання ў адпаведную ўстанову для выканання.

4. Праслухоўванне і запіс перамоў у любым выпадку не могуць ажыццяўляцца больш за тэрмін папярэдняга расследавання крымінальнай справы і адмяняюцца пастановай следчага, органа дазнання.

5. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, на працягу ўсяго ўстаноўленага тэрміну маюць права ў любы час выпатрабаваць фанаграму для агляду і праслухоўвання. Яна перадаецца следчаму, асобе, якая праводзіць дазнанне, у апячатаным выглядзе з суправаджальным лістом, у якім павінны быць указаны час пачатку і заканчэння запісу перамоў і неабходныя тэхнічныя характарыстыкі выкарыстаных сродкаў.

6. Агляд і праслухоўванне фанаграмы праводзяцца следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне, пры неабходнасці з удзелам спецыяліста, пра што складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса, у якім павінна быць дослоўна ўзноўлена частка фанаграмы перамоў, якая мае адносіны да крымінальнай справы. Фанаграма дадаецца да пратакола, пры гэтым яе частка, якая не мае адносін да справы, пасля заканчэння вядзення па крымінальнай справе знішчаецца.

ГЛАВА 25
ДОПЫТ, ВОЧНАЯ СТАЎКА, ПРАД'ЯЎЛЕННЕ ДЛЯ АПАЗНАННЯ, ПРАВЕРКА ПАКАЗАННЯЎ НА МЕСЦЫ

Артыкул 215. Месца і час правядзення допыту

1. Допыт праводзіцца па месцы правядзення папярэдняга расследавання. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права, калі прызнаюць гэта неабходным, правесці допыт па месцы знаходжання дапытванага.

2. Допыт не можа доўжыцца бесперапынна больш за чатыры гадзіны. Працяг допыту дапускаецца пасля перапынку не менш чым на адну гадзіну для адпачынку і прыняцця ежы, прычым агульная працягласць допыту на працягу дня не павінна перавышаць восем гадзін. У выпадку медыцынскіх паказанняў працягласць допыту ўстанаўліваецца на падставе заключэння ўрача, які працуе ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

Артыкул 216. Парадак выкліку на допыт

1. Пацярпелага, сведку, а таксама падазраванага, абвінавачанага, якія знаходзяцца на волі, выклікаюць на допыт павесткай. У ёй павінна быць указана, хто і ў якасці каго выклікаецца, да каго і па якім адрасе, час яўкі на допыт, а таксама наступствы няяўкі без уважлівых прычын.

2. Павестка ўручаецца асобе, якая выклікаецца, пад распіску. Пры адсутнасці асобы, якая выклікаецца, павестка ўручаецца пад распіску каму-небудзь з дарослых

членаў яе сям'і або адміністрацыі па месцы яго працы, якія абавязаны перадаць павестку выкліканаму на допыт. Дапытваны можа быць выкліканы з выкарыстаннем і іншых сродкаў сувязі.

3. Асобы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, абавязаны прыбыць на выклік на допыт. У выпадку іх няяўкі без уважлівых прычын яны могуць быць падвергнуты прыводу ў адпаведнасці з артыкулам 130 гэтага Кодэкса.

4. Асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай, выклікаюцца на допыт праз адміністрацыю месца зняволення.

5. Выклік на допыт у якасці пацярпелага ці сведкі асобы, якая не дасягнула шаснаццаці гадоў, праводзіцца праз яе бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў.

6. Выклік на допыт асобы, якая аказвае ці аказвала садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове органу, упаўнаважанаму законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці асобы, у адносінах да якой прыменены меры для загарантавання бяспекі, праводзіцца ў парадку, устаноўленым часткай 5 артыкула 192 гэтага Кодэкса.

Артыкул 217. Агульныя правілы правядзення допыту

1. Перад допытам следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, павінны высветліць даныя пра асобу дапытванага. Калі ўзнікаюць сумненні, ці валодае дапытваны мовай, на якой ажыццяўляецца вядзенне па крымінальнай справе, высвятляецца, на якой мове ён жадае даваць паказанні.

2. Асобе, выкліканай на допыт, паведамляецца, у якасці каго, па якой крымінальнай справе яна будзе дапытана, растлумачваюцца правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 41, 43, 50 і 60 гэтага Кодэкса, у тым ліку і права адмовіцца ад дачы паказанняў у адносінах да яе самой, членаў яе сям'і і блізкіх сваякоў, пра што робіцца адзнака ў пратаколе. Асоба, выкліканая на допыт у якасці пацярпелага ці сведкі, папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў.

3. Допыт пачынаецца з прапановы расказаць аб вядомых дапытванай асобе абставінах крымінальнай справы. Калі дапытваны гаворыць аб абставінах, якія яўна не адносяцца да крымінальнай справы, яму можа быць указана на гэта.

4. Пасля заканчэння свабоднага аповеду дапытванаму могуць быць зададзены пытанні, накіраваныя на ўдакладненне і дапаўненне паказанняў. Задаваць навадныя пытанні забараняецца.

5. Дапытваны мае права карыстацца дакументамі і запісамі, якія па яго хадайніцтве ці з яго згоды могуць быць далучаны да пратакола допыту.

6. У ходзе допыту следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, могуць прад'явіць дапытванаму рэчыўныя доказы і дакументы, а пасля заканчэння свабоднага аповеду абвясціць паказанні, якія ёсць у крымінальнай справе, узнавіць гука- і відэазапіс ці кіназдымку.

Артыкул 218. Пратакол допыту

1. Ход і вынікі допыту адлюстроўваюцца ў пратаколе, які складаецца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. Паказанні запісваюцца ад першай асобы і па магчымасці дослоўна. Пытанні і адказы на іх запісваюцца ў той паслядоўнасці, якая мела месца пры допыце. У пратаколе павінны знайсці адлюстраванне і тыя пытанні асоб, якія прымалі ўдзел у допыце, якія былі адведзены

следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне, ці на якія адмовіўся адказваць дапытваны, з указаннем матываў адводу ці адмовы.

2. Прад'яўленне рэчыўных доказаў і дакументаў, абвяшчэнне пратаколаў і ўзнаўленне гука- і відэазапісу, кіназдымкі следчых дзеянняў, а таксама паказанняў дапытванага падлягаюць абавязковаму адлюстраванню ў пратаколе.

3. У ходзе следчага дзеяння дапытваны можа вырабляць схемы, чарцяжы, малюнкі, дыяграмы, якія далучаюцца да пратакола, пра што ў ім робіцца адзнака.

4. Пасля свабоднага аповеду дапытваны мае права запісаць свае паказанні ўласнаручна. Пасля ўласнаручнага выкладання паказанняў і іх падпісання дапытваным следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, могуць задаць пытанні, накіраваныя на ўдакладненне і дапаўненне паказанняў.

5. Пасля заканчэння допыту пратакол прад'яўляецца для прачытання дапытванаму або чытаецца ўголас па яго просьбе. Патрабаванні дапытванага ўнесці ў пратакол дапаўненні і ўдакладненні падлягаюць абавязковаму выкананню.

6. Факт азнаямлення з паказаннямі і правільнасць іх запісу засведчвае дапытваны сваім подпісам у канцы пратакола. Дапытваным падпісвае таксама кожную старонку пратакола.

7. Калі ў допыце ўдзельнічаў перакладчык, то ён таксама падпісвае кожную старонку і пратакол у цэлым, а таксама пераклад уласнаручна запісаных паказанняў дапытванага.

8. У пратаколе ўказваюцца ўсе асобы, якія ўдзельнічалі ў допыце. Кожная з іх павінна падпісаць пратакол.

Артыкул 219. Прымяненне гука- і відэазапісу пры допыце

1. Па рашэнні следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, пры допыце падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага ці сведкі можа быць прыменены гука- і відэазапіс. Гука- і відэазапіс могуць быць прыменены таксама па просьбе падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага ці сведкі.

2. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, прымаюць рашэнне аб прымяненні гука- і відэазапісу і паведамляюць аб гэтым дапытванаму да пачатку допыту.

3. Гука- і відэазапіс павінен адлюстроўваць звесткі, указаныя ў артыкуле 218 гэтага Кодэкса, і ўвесь ход допыту. Гука- і відэазапіс часткі допыту, а таксама паўтарэнне спецыяльна для запісу паказанняў, дадзеных у ходзе таго ж допыту, не дапускаюцца.

4. Пасля заканчэння допыту гука- і відэазапіс поўнасцю ўзнаўляецца дапытванаму. Пасля заканчэння прагляду ці праслухоўвання ў дапытванага высвятляецца, ці мае ён дапаўненні ці ўдакладненні да сказанага ім, ці пацвярджае правільнасць запісу. Дапаўненні паказанняў да гука- і відэазапісу, зробленыя дапытваным, таксама заносяцца на фанаграму і відэаграму. Гука- і відэазапіс заканчваецца заявай дапытванага, якая сведчыць пра іх правільнасць.

5. Паказанні, атрыманыя ў ходзе допыту з прымяненнем гука- і відэазапісу, заносяцца ў пратакол допыту ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам. Пратакол допыту павінен таксама змяшчаць адзнаку аб прымяненні гука- і відэазапісу і паведамленні аб гэтым дапытванаму; звесткі аб тэхнічных сродках, умовах гука- і відэазапісу і факце іх прыпынення, прычыне і працягласці прыпынку; заявы дапытванага наконт прымянення гука- і відэазапісу; пасведчанне правільнасці

пратакола і гука- і відэазапісу дапытваным і следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне. Фанаграма і відэаграма захоўваюцца пры крымінальнай справе і пасля заканчэння папярэдняга расследавання апячатваюцца.

Артыкул 220. Парадак допыту пацярпелага і сведкі

1. Пацярпелыя і сведкі, выкліканыя па адной і той жа справе, дапытваюцца паасобку і ў адсутнасці іншых пацярпелых і сведак. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, прымаюць меры да таго, каб пацярпелыя і сведкі па адной справе да допыту не мелі зносін паміж сабой.

2. Перад допытам следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, упэўніваюцца ў асобе пацярпелага, сведкі і высвятляюць іх адносіны да падазраванага ці абвінавачанага, растлумачваюць ім працэсуальныя правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 50 і 60 гэтага Кодэкса, папярэджваюць аб крымінальнай адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў. Пры гэтым следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны растлумачыць, што пацярпелы ці сведка маюць права адмовіцца ад дачы паказанняў, якія выкрываюць ва ўчыненні злачынстваў іх саміх, членаў іх сямей і блізкіх сваякоў. Пацярпелы ці сведка, якія не скарысталіся гэтым правам, папярэджваюцца аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывых паказанняў. Аб растлумачэнні пацярпеламу ці сведку іх правоў і абавязкаў, папярэджанні аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад дачы паказанняў, а таксама за дачу заведама лжывых паказанняў робіцца адзнака ў пратаколе, якая сведчыцца подпісам дапытванай асобы.

3. Допыт пацярпелага і сведкі праводзіцца таксама ў парадку, прадугледжаным артыкулам 217 гэтага Кодэкса.

Артыкул 221. Асаблівасці допыту непаўналетніх пацярпелага і сведкі

1. Пры допыце непаўналетніх пацярпелага і сведкі ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў педагог ці псіхолаг удзельнічаюць абавязкова, а ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў – па меркаванні следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне. Пры допыце непаўналетніх пацярпелага і сведкі могуць удзельнічаць іх бацькі ці іншыя законныя прадстаўнікі.

2. Пацярпелы і сведка ва ўзросце да шаснаццаці гадоў не папярэджваюцца аб адказнасці за адмову ці ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў, ім толькі ўказваецца на неабходнасць гаварыць толькі праўду. Непаўналетнім пацярпеламу і сведку растлумачваюцца права адмовы ад дачы паказанняў, якія выкрываюць ва ўчыненні злачынства іх саміх, членаў сям'і і блізкіх сваякоў, а таксама іншыя працэсуальныя правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 50 і 60 гэтага Кодэкса, пра што робіцца адзнака ў пратаколе допыту, якая сведчыцца іх подпісам.

3. Прысутным пры допыце асобам, указаным у частцы 1 гэтага артыкула, растлумачваецца права рабіць падлеглыя занясенню ў пратакол заўвагі аб парушэнні правоў і законных інтарэсаў дапытваных, а таксама з дазволу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, задаваць пытанні дапытванаму. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права адвесці пытанне, але павінны занесці яго ў пратакол і ўказаць прычыну адводу.

Артыкул 222. Вочная стаўка

1. З мэтай ліквідацыі істотных супярэчнасцей у паказаннях раней дапытаных асоб следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права правесці вочную стаўку паміж дзвюма раней дапытанымі асобамі, у паказаннях якіх ёсць істотныя супярэчнасці.

2. Перад пачаткам вочнай стаўкі следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, растлумачваюць яе ўдзельнікам іх правы і абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, а таксама парадак правядзення гэтага следчага дзеяння. Калі вочная стаўка праводзіцца з удзелам пацярпелага і сведкі, то яны папярэджваюцца аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў, пра што робіцца адзнака ў пратаколе.

3. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, высвятляюць у асоб, паміж якімі праводзіцца вочная стаўка, ці ведаюць яны адзін аднаго і ў якіх адносінах знаходзяцца паміж сабой. Удзельнікам вочнай стаўкі пачаргова задаюцца пытанні па тых абставінах, для высвятлення якіх праводзіцца вочная стаўка. Асобы, паміж якімі праводзіцца вочная стаўка, могуць з дазволу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, задаваць пытанні адзін аднаму, пра што робіцца адзнака ў пратаколе.

4. Пры правядзенні вочнай стаўкі следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права прад'явіць далучаныя да крымінальнай справы рэчыўныя доказы і дакументы.

5. Абвяшчэнне паказанняў удзельнікаў вочнай стаўкі, якія змяшчаюцца ў пратаколах папярэдніх допытаў, а таксама ўзнаўленне гука- і відэазапісу гэтых паказанняў дапускаецца толькі пасля дачы імі паказанняў на вочнай стаўцы і занясення іх у пратакол, які складаецца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

6. У пратаколе вочнай стаўкі паказанні дапытваных асоб запісваюцца ў тым парадку, у якім яны даваліся. Кожны ўдзельнік вочнай стаўкі падпісвае свае паказанні і кожную старонку пратакола паасобку.

Артыкул 223. Прад'яўленне для апазнання

1. З мэтай выяўлення тоеснасці ці розніцы з асобай ці аб'ектам, якія раней назіраліся, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, могуць прад'явіць для апазнання асобу ці аб'ект падазраванаму, абвінавачанаму, пацярпеламу, сведку. Для апазнання могуць быць прад'яўлены труп і жывёла.

2. Асоба, якая апазнае, загадзя дапытваецца аб абставінах, пры якіх яна назірала апазнаваную асобу ці аб'ект, аб прыкметах і асаблівасцях, па якіх яна можа іх апазнаць.

Артыкул 224. Парадак прад'яўлення для апазнання

1. Асоба прад'яўляецца для апазнання разам з іншымі асобамі, па магчымасці падобнымі па знешнасці з апазнаванай. Агульная колькасць асоб, якія прад'яўляюцца для апазнання, павінна быць не меншай за тры.

2. Перад пачаткам прад'яўлення для апазнання апазнаванаму прапаноўваецца ў адсутнасці асобы, якая апазнае, заняць любое месца сярод прад'яўленых для апазнання асоб, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе.

3. Пры немагчымасці прад'яўлення асобы для апазнання можа быць праведзена апазнанне па яе фатаграфіі, прад'яўленай адначасова з фатаграфіямі іншых асоб, па магчымасці падобных па знешнасці з апазнаванай, у колькасці, не меншай за тры.

4. Прадмет прад'яўляецца ў групе аднародных прадметаў у колькасці, не меншай за тры.

5. Правіла, прадугледжанае часткамі 1–4 гэтага артыкула, не распаўсюджваецца на апазнанне трупа і жывёлы.

6. Калі асоба, якая апазнае, з'яўляецца пацярпелым ці сведкам, яна перад апазнаннем папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе.

7. Асобе, якая апазнае, прапаноўваецца паказаць на асобу ці прадмет, аб якіх яна дала паказанні. Навадныя пытанні не дапускаюцца.

8. Калі асоба, якая апазнае, паказала на адну з прад'яўленых ёй асоб ці на адзін з прадметаў, ёй прапаноўваецца патлумачыць, па якіх прыкметах ці асаблівасцях яна пазнала гэту асобу ці прадмет.

9. Апазнанне праводзіцца з удзелам панятых або з прымяненнем гука- і відэазапісу.

10. У мэтах загарантавання бяспекі асобы, якая апазнае, прад'яўленне асобы для апазнання можа быць праведзена ва ўмовах, якія выключаюць візуальнае назіранне апазнаваным за асобай, якая апазнае. У гэтых выпадках панятыя павінны знаходзіцца ў месцы знаходжання асобы, якая апазнае. Панятым і асобе, якая апазнае, павінна быць забяспечана магчымасць візуальнага назірання асоб, прад'яўленых для апазнання.

11. Аб прад'яўленні для апазнання складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. У пратаколе ўказваюцца ўмовы, ход, вынікі апазнання і па магчымасці дасло́ўна выкладаюцца тлумачэнні асобы, якая апазнае. Калі прад'яўленне асобы для апазнання праводзілася ва ўмовах, якія выключаюць візуальнае назіранне апазнаваным за асобай, якая апазнае, аб гэтым таксама робіцца адзнака ў пратаколе.

Артыкул 224[1]. Правядзенне допыту, вочнай стаўкі, прад'яўленне для апазнання з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі

1. Допыт пацярпелага, сведкі, вочная стаўка ці прад'яўленне для апазнання асоб і (ці) аб'ектаў з удзелам пацярпелага ці сведкі могуць быць праведзены дыстанцыйна з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі ў выпадках:

1) немагчымасці прыбыцця ўдзельніка працэсу для правядзення следчага дзеяння з-за стану здароўя ці з-за іншых уважлівых прычын;

2) неабходнасці загарантавання бяспекі ўдзельнікаў крымінальнага працэсу і іншых асоб у адпаведнасці з главой 8 гэтага Кодэкса;

3) калі пацярпелы, сведка з'яўляюцца непаўналетнімі.

2. Для забеспячэння правядзення следчага дзеяння з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі па месцы знаходжання ўдзельніка следчага дзеяння следчы па тэрытарыяльнасці накіроўвае даручэнне аб аказанні садзейнічання ў правядзенні следчага дзеяння ў парадку, прадугледжаным часткай 7 артыкула 36 ці часткай 4 артыкула 184 гэтага Кодэкса.

3. Допыт, вочная стаўка, прад'яўленне для апазнання асоб і (ці) аб'ектаў праводзяцца па агульных правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам палажэнняў гэтага артыкула.

4. Прымяненне сістэм відэа-канферэнц-сувязі пры правядзенні следчых дзеянняў павінна забяспечваць магчымасць рэалізацыі ўдзельнікамі следчага дзеяння іх правоў і выканання абавязкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам. Пры гэтым павінна забяспечвацца належная якасць выявы і гуку.

5. Ход і вынікі следчага дзеяння, праведзенага ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі, фіксуюцца тэхнічнымі сродкамі, якія выкарыстоўваюцца з яго адначасовым відэазапісам службовай асобай, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання, і адлюстроўваюцца ёй у пратаколе следчага дзеяння з улікам палажэнняў гэтага артыкула.

6. У пратаколе ўказваюцца:

1) месца і дата правядзення следчага дзеяння, час яго пачатку і заканчэння, пасада і прозвішча асобы, якая склала пратакол, пасада і прозвішча асобы, якая праводзіць следчае дзеянне, а таксама прозвішча, імя, імя па бацьку кожнай асобы, якая ўдзельнічае ў правядзенні следчага дзеяння, яе адрас і іншыя даныя аб асобе;

2) тэхнічныя сродкі, прымененыя пры правядзенні следчага дзеяння. У пратаколе павінна быць адзначана, што перад прымяненнем тэхнічных сродкаў аб гэтым апавешчаны асобы, якія ўдзельнічаюць у правядзенні следчага дзеяння;

3) аб растлумачэнні ўдзельнікам следчага дзеяння правоў і абавязкаў, прадугледжаных артыкуламі 50 і 60 гэтага Кодэкса, што сведчыцца іх подпісамі;

4) паказанні, атрыманыя ў ходзе правядзення следчага дзеяння, іншыя яго вынікі.

7. Службовая асоба, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання, абавязана знаходзіцца з удзельнікам следчага дзеяння да яго заканчэння. Пасля заканчэння следчага дзеяння службовая асоба, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання, абавязана поўнасцю ўзнавіць удзельніку следчага дзеяння відэазапіс следчага дзеяння.

8. Пасля заканчэння прагляду відэазапісу следчы высвятляе ва ўдзельнікаў следчага дзеяння, ці маюць яны якія-небудзь заўвагі аб яго змесце. Дапаўненні і заўвагі, зробленыя ўдзельнікамі следчага дзеяння, або сведчанне правільнасці відэазапісу заносяцца ў пратакол службовай асобай, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання.

9. Пратакол падпісваецца службовай асобай, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання, і ўдзельнікамі следчага дзеяння. Электронны носьбіт інфармацыі следчага дзеяння з прымяненнем сістэм відэа-канферэнц-сувязі ўпакоўваецца і апячатваецца службовай асобай, якая выконвае даручэнне аб аказанні садзейнічання. Пратакол і электронны носьбіт інфармацыі следчага дзеяння накіроўваюцца следчаму для далучэння да матэрыялаў крымінальнай справы.

10. Пратакол следчага дзеяння складаецца ў ходзе правядзення следчага дзеяння ці непасрэдна пасля яго заканчэння.

11. У выпадку прымянення ў адносінах да асобы, якая ўдзельнічае ў правядзенні следчых дзеянняў з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, мер бяспекі ў адпаведнасці з артыкулам 8 гэтага Кодэкса яна можа быць дапытана або з яе ўдзелам могуць быць праведзены вочная стаўка, апазнанне асобы з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі з адпаведнымі змяненнямі знешнасці і (ці) голасу, якія забяспечваюць непазнавальнасць асобы, якая абараняецца.

Артыкул 225. Праверка паказанняў на месцы

1. У мэтах выяўлення новых фактычных даных, удакладнення маршруту і месца, дзе адбываліся дзеянні, якія правяраюцца, а таксама для выяўлення дакладнасці паказанняў шляхам іх параўнання з абстаноўкай падзеі раней дадзеныя паказанні падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага ці сведкі могуць быць праверены ці ўдакладнены на месцы, звязаным з падзеяй, якая даследуецца.

11. Праверка паказанняў у жыллі і іншым законным валоданні праводзіцца толькі са згоды ўласніка ці дарослых асоб, якія пражываюць у ім, або па пастанове следчага з санкцыі пракурора ці яго намесніка, якая павінна быць прад'яўлена да пачатку праверкі паказанняў на месцы.

2. Праверка паказанняў на месцы заключаецца ў тым, што раней дапытаная асоба ўзнаўляе на месцы абстаноўку і акалічнасці падзеі, якая даследуецца; адшуквае і ўказвае на прадметы, дакументы, сляды, якія маюць значэнне для крымінальнай справы; дэманструе пэўныя дзеянні; паказвае, якую ролю ў падзеі, якая даследуецца, іграла тыя ці іншыя прадметы; звяртае ўвагу на змены ў абстаноўцы месца падзеі; канкрэтызуе і ўдакладняе свае ранейшыя паказанні. Якое-небудзь чужое ўмяшанне ў гэтыя дзеянні і навадныя пытанні недапушчальныя.

3. Праверка паказанняў на месцы праводзіцца з удзелам панятых або з прымяненнем гука- і відэазапісу, а ў неабходных выпадках – з удзелам спецыяліста.

4. Не дапускаецца адначасовая праверка паказанняў на месцы некалькіх асоб.

5. Праверка паказанняў на месцы пачынаецца з прапановы асобе ўказаць маршрут і месца, дзе яе паказанні будуць правярацца. Пасля свабоднага аповеду і дэманстрацыі дзеянняў асобе, паказанні якой правяраюцца, могуць быць зададзены пытанні. Гэтая асоба, а таксама іншыя ўдзельнікі крымінальнага працэсу маюць права патрабаваць дадатковага допыту іх у сувязі са следчым дзеяннем, якое праводзіцца.

6. У неабходных выпадках пры праверцы паказанняў на месцы праводзяцца вымярэнні, фатаграфаванне, гука- і відэазапіс, кіназдымка, складаюцца планы і схемы, адбіраюцца прадметы, дакументы, сляды і іншыя аб'екты, якія маюць значэнне для крымінальнай справы.

7. Аб праверцы паказанняў на месцы складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. У пратаколе падрабязна адлюстроўваюцца ўмовы, ход і вынікі праверкі паказанняў на месцы.

ГЛАВА 26
ПРЫЗНАЧЭННЕ І ПРАВЯДЗЕННЕ ЭКСПЕРТЫЗЫ

Артыкул 226. Падставы прызначэння экспертызы

1. Экспертыза прызначаецца ў выпадках, калі пры правядзенні дазнання, папярэдняга следства неабходныя спецыяльныя веды ў навуцы, тэхніцы, мастацтве ці рамястве.

2. Да распачынання крымінальнай справы ў адпаведнасці з артыкулам 173 гэтага Кодэкса дапускаецца прызначэнне судова-медыцынскай экспертызы для вызначэння прычын смерці і ступені цяжкасці цялесных пашкоджанняў і іншых экспертыз, высновы якіх могуць мець істотнае значэнне для рашэння пытання аб распачынанні крымінальнай справы. Не могуць прызначацца экспертызы, звязаныя з прымяненнем мер працэсуальнага прымусу ў адносінах да фізічных асоб.

Артыкул 227. Парадак прызначэння экспертызы

1. Прызнаўшы неабходным прызначэнне экспертызы, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць аб гэтым пастанову, у якой указваюцца падставы прызначэння экспертызы; прозвішча эксперта ці назва арганізацыі, у якой павінна быць праведзена экспертыза; пытанні, пастаўленыя перад экспертам; матэрыялы, якія даюцца ў распараджэнне эксперта. Пастанова следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, аб прызначэнні экспертызы абавязковая да выканання асобамі, арганізацыямі, якім яна адрасавана і ў кампетэнцыю якіх гэта ўваходзіць.

2. Экспертызу праводзяць спецыялісты экспертных устаноў, іншых дзяржаўных ці недзяржаўных арганізацый або іншыя дасведчаныя асобы, прызначаныя следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне.

3. Заключэнні ведамасных інспекцый, акты рэвізій, кансультацыі спецыялістаў, якія ёсць у крымінальнай справе, не выключаюць магчымасці прызначэння экспертызы па тых жа пытаннях.

4. Да накіравання пастановы для выканання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, абавязаны азнаёміць з ёй падазраванага, абвінавачанага, за выключэннем выпадкаў, калі абвінавачаны знаходзіцца ў вышуку, іх законных прадстаўнікоў, а таксама пацярпелага і сведку, якія падвяргаюцца экспертызе, і патлумачыць ім правы, устаноўленыя артыкулам 229 гэтага Кодэкса. Аб гэтым складаецца пратакол, які падпісваецца следчым, асобай, якая праводзіць дазнанне, і асобай, азнаёмленай з пастановай.

5. Пастанова аб прызначэнні судова-псіхіятрычнай экспертызы і заключэнне экспертаў не абвяшчаюцца асобам, калі іх псіхічны стан робіць гэта немагчымым.

6. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права прысутнічаць пры правядзенні экспертызы.

Артыкул 228. Абавязковае прызначэнне і правядзенне экспертызы

Прызначэнне і правядзенне экспертызы абавязковае, калі неабходна выявіць:

1) прычыну смерці, характар і ступень цяжкасці цялесных пашкоджанняў;

2) узрост падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, калі гэта мае значэнне для крымінальнай справы, а дакументы аб узросце адсутнічаюць ці выклікаюць сумненне;

3) псіхічны ці фізічны стан падазраванага, абвінавачанага, калі ўзнікае сумненне наконт іх свядомасці ці здольнасці самастойна абараняць свае правы і законныя інтарэсы ў крымінальным працэсе;

4) псіхічны ці фізічны стан пацярпелага, калі ўзнікае сумненне ў яго здольнасці правільна ўспрымаць абставіны, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, і даваць аб іх паказанні.

Артыкул 229. Правы падазраванага, абвінавачанага, абаронцы, пацярпелага і сведкі пры прызначэнні і правядзенні экспертызы

1. Пры прызначэнні і правядзенні экспертызы падазраваны, абвінавачаны, іх законныя прадстаўнікі і абаронца маюць права:

1) знаёміцца з пастановай аб прызначэнні экспертызы;

2) заяўляць адвод эксперту ці хадайнічаць аб адхіленні экспертнай установы ад правядзення экспертызы ў выпадку выяўлення абставін, якія ставяць пад сумненне незацікаўленасць у зыходзе крымінальнай справы кіраўніка экспертнай установы, у якой працуе дасведчаная асоба;

3) прасіць аб прыцягненні ў якасці экспертаў указаных імі асоб ці спецыялістаў канкрэтных судова-экспертных устаноў;

4) падаць дадатковыя пытанні для атрымання па іх заключэння эксперта;

5) прысутнічаць з дазволу следчага, асобы, якая праводзіць дазнанне, пры правядзенні экспертызы, даваць тлумачэнні эксперту;

6) знаёміцца з заключэннем эксперта ці паведамленнем аб немагчымасці даць заключэнне і выпісваць з іх неабходныя звесткі.

2. Правы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, маюць таксама пацярпелы і сведка, якія падвяргаюцца экспертызе.

3. Экспертыза сведкаў праводзіцца толькі з іх згоды, якая даецца імі пісьмова. Калі гэтыя асобы не дасягнулі паўналецця, пісьмовая згода на правядзенне экспертызы даецца іх бацькамі, усынавіцелямі ці апекунамі.

4. У выпадку задавальнення хадайніцтва, заяўленага асобай, указанай у частках 1 і 2 гэтага артыкула, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, адпаведна змяняюць ці дапаўняюць сваю пастанову аб прызначэнні экспертызы. У выпадку поўнай ці частковай адмовы ў задавальненні хадайніцтва следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць матываваную пастанову, якая абвяшчаецца пад распіску асобе, што заявіла гэта хадайніцтва.

5. Патрабаванні гэтага артыкула распаўсюджваюцца таксама і на выпадкі прызначэння і правядзення экспертыз да распачынання крымінальнай справы ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 173 і 226 гэтага Кодэкса.

6. Правы, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, падазраваны і абвінавачаны маюць пры прызначэнні экспертыз, якія тычацца высвятлення абставін, што маюць значэнне для выстаўленага ў адносінах да іх падазрэння ці абвінавачання. Дадзенае палажэнне распаўсюджваецца таксама на законных прадстаўнікоў і абаронцаў падазраваных і абвінавачаных.

Артыкул 230. Правядзенне экспертызы ў экспертнай установе

1. Пры правядзенні экспертызы ў экспертнай установе следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, накіроўваюць кіраўніку гэтай установы сваю пастанову і неабходныя матэрыялы.

2. Кіраўнік экспертнай установы:

1) даручае правядзенне экспертызы аднаму ці некалькім экспертам;

2) растлумачвае экспертам іх правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 61 гэтага Кодэкса, папярэджвае аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, а таксама аб крымінальнай адказнасці за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў ці за дачу заведама лжывага заключэння, аб чым бярэ ў іх падпіску, якая разам з заключэннем эксперта накіроўваецца следчаму, асобе, якая праводзіць дазнанне.

Артыкул 231. Правядзенне экспертызы па-за экспертнай установай

1. Калі экспертыза праводзіцца па-за экспертнай установай, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, да вынясення пастановы аб прызначэнні экспертызы павінны ўпэўніцца ў асобе чалавека, якому яны намераны даручыць правядзенне экспертызы, яго кампетэнтнасці, высветліць яго адносіны з падазраваным, абвінавачаным, пацярпелым і асобай, якая падвяргаецца экспертызе, і праверыць, ці няма падстаў для адводу эксперта.

2. Высветліўшы неабходныя звесткі, следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць пастанову аб прызначэнні экспертызы, уручаюць яе эксперту, растлумачваюць яму правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 61 гэтага Кодэкса, і папярэджваюць аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, а таксама аб крымінальнай адказнасці за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў ці за дачу заведама лжывага заключэння. Аб выкананні гэтых дзеянняў следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, робяць адзнаку ў пастанове аб прызначэнні экспертызы, якая сведчыцца подпісам эксперта.

Артыкул 232. Камісійная экспертыза

1. Камісійная экспертыза праводзіцца некалькімі экспертамі адной спецыяльнасці (профілю) у выпадку неабходнасці правядзення складаных экспертных даследаванняў.

2. Пры правядзенні камісійнай экспертызы эксперты сумесна аналізуюць атрыманыя вынікі і, прыйшоўшы да адзінага меркавання (высновы), складаюць і падпісваюць адзінае заключэнне ці акт аб немагчымасці даць заключэнне.

3. У выпадку рознагалосся паміж экспертамі кожны з іх ці частка экспертаў даюць асобнае заключэнне або эксперт, меркаванне якога разыходзіцца з высновамі большасці, фармулюе яго ў заключэнні асобна.

Артыкул 233. Комплексная экспертыза

1. Комплексная экспертыза праводзіцца экспертамі розных спецыяльнасцей у межах сваёй кампетэнцыі ў выпадках, калі для правядзення даследаванняў неабходныя пазнанні ў розных галінах ведаў.

2. У заключэнні комплекснай экспертызы павінна быць указана, якія даследаванні, у якім аб'ёме правёў кожны эксперт і да якіх высноў прыйшоў. Кожны эксперт падпісвае тую частку заключэння, у якой змяшчаюцца яго даследаванні і высновы.

3. Агульную выснову (высновы) робяць эксперты, кампетэнтныя ў ацэнцы атрыманых вынікаў. Калі падставай для канчатковай высновы камісіі ці яе часткі з'яўляюцца факты, выяўленыя адным з экспертаў (асобнымі экспертамі), то гэта павінна быць указана ў заключэнні. У выпадку рознагалосся экспертаў вынікі даследаванняў афармляюцца ў адпаведнасці з правіламі часткі трэцяй артыкула 232 гэтага Кодэкса.

4. Калі правядзенне экспертызы даручана экспертнай установе, то арганізацыя комплексных даследаванняў ускладаецца на яе кіраўніка.

Артыкул 234. Атрыманне ўзораў для параўнальнага даследавання

1. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, маюць права атрымаць узоры почырку ці іншыя ўзоры для параўнальнага даследавання ў падазраванага ці абвінавачанага.

2. Следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, таксама маюць права атрымаць узоры почырку ці іншыя ўзоры для параўнальнага даследавання ў пацярпелага, а таксама ў

сведкі з яго згоды ў выпадках, калі ўзнікла неабходнасць праверыць, ці не пакінуты імі сляды на месцы здарэння ці на рэчыўных доказах.

3. Пры атрыманні ўзораў для параўнальнага даследавання не павінны прымяняцца метады, небяспечныя для жыцця і здароўя чалавека, якія зневажаюць яго гонар і годнасць.

4. Аб атрыманні ўзораў для параўнальнага даследавання следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць пастанову. Атрыманне ўзораў праводзіцца ў неабходных выпадках з удзелам спецыялістаў, аб чым складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

5. Калі атрыманне ўзораў для параўнальнага даследавання з'яўляецца часткай экспертнага даследавання, яно праводзіцца экспертам. У такім выпадку звесткі аб гэтым дзеянні эксперт адлюстроўвае ў сваім заключэнні.

Артыкул 235. Змяшчэнне падазраванага ці абвінавачанага ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення экспертызы

1. Калі пры прызначэнні ці правядзенні судова-медыцынскай ці судова-псіхіятрычнай экспертызы ўзнікае неабходнасць у стацыянарным назіранні, то падазраваны ці абвінавачаны могуць быць змешчаны адпаведна ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар, аб чым указваецца ў пастанове аб прызначэнні экспертызы.

2. Змяшчэнне ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення адпаведна судова-медыцынскай ці судова-псіхіятрычнай экспертызы падазраванага ці абвінавачанага, якія не ўтрымліваюцца пад вартай, праводзіцца па пастанове следчага, органа дазнання з санкцыі пракурора ці яго намесніка ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 227–229 гэтага Кодэкса.

3. Час знаходжання падазраванага ці абвінавачанага ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя ці судова-псіхіятрычным экспертным стацыянары ўключаецца ў тэрмін утрымання пад вартай.

4. Калі пытанне аб неабходнасці прызначэння судова-медыцынскай ці судова-псіхіятрычнай экспертызы і змяшчэння абвінавачанага адпаведна ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя ці судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар узнікла на судовым пасяджэнні, то рашэнне аб гэтым прымае суд па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве, аб чым выносіцца прысуд (пастанова).

5. Пры змяшчэнні падазраванага ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар для правядзення стацыянарнай судова-псіхіятрычнай экспертызы тэрмін, на працягу якога яму павінна быць прад'яўлена абвінавачанне, перапыняецца да атрымання заключэння эксперта аб псіхічным стане падазраванага.

Артыкул 236. Змест заключэння эксперта, паведамлення аб немагчымасці дачы заключэння

1. Пасля правядзення даследавання з улікам яго вынікаў эксперт (эксперты) ад свайго імя складае заключэнне, у якім павінна быць указана, калі, дзе, кім (прозвішча, імя, імя па бацьку, адукацыя, спецыяльнасць, стаж працы па спецыяльнасці, вучоная ступень і вучонае званне, пасада, якая займаецца), на якой падставе праведзена экспертыза; адзнака, пасведчаная подпісам эксперта, аб тым, што ён папярэджаны аб адказнасці, устаноўленай заканадаўчымі актамі, а таксама аб крымінальнай адказнасці за адмову ці ўхіленне ад выканання без уважлівых прычын ускладзеных на яго абавязкаў ці за дачу заведама лжывага заключэння; хто прысутнічаў пры правядзенні экспертызы і якія даваў тлумачэнні; якія матэрыялы выкарыстоўваў эксперт і якія зрабіў даследаванні; пастаўленыя эксперту пытанні і яго матываваныя адказы. Калі пры правядзенні экспертызы эксперт выявіць абставіны, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, наконт якіх яму не былі пастаўлены пытанні, ён мае права ўказаць на іх у сваім заключэнні.

2. Заключэнне даецца ў пісьмовай форме і падпісваецца экспертам (экспертамі). Да яго павінны быць дададзены рэчыўныя доказы, узоры, якія засталіся пасля даследавання, былі атрыманы эксперыментальным шляхам і выкарыстоўваюцца для параўнання, а таксама фатаграфіі, схемы, графікі, табліцы і іншыя дадатковыя матэрыялы, якія пацвярджаюць высновы эксперта. Дадатак да заключэння таксама падпісвае эксперт.

3. Калі эксперт пераконваецца, што пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў ці дадзеныя яму матэрыялы непрыдатныя ці недастатковыя для дачы заключэння і не могуць быць дапоўнены, або калі стан навукі і экспертнай практыкі не дазваляе адказаць на пастаўленыя пытанні, ён складае матываванае паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння і накіроўвае яго ў орган, які вядзе крымінальны працэс і прызначыў экспертызу.

Артыкул 237. Допыт эксперта

1. Следчы мае права атрымаць тлумачэнне ад эксперта ў выпадку правядзення экспертызы да распачынання крымінальнай справы ці дапытаць эксперта для растлумачэння дадзенага ім заключэння. Эксперт можа выкласці свае адказы ўласнаручна. Пратакол допыту эксперта складаецца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

2. Атрыманне тлумачэння або допыт эксперта да падачы ім заключэння не дапускаюцца.

Артыкул 238. Прад'яўленне падазраванаму, абвінавачанаму, абаронцу, пацярпеламу і сведку заключэння эксперта

1. Заключэнне эксперта ці яго паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння, а таксама тлумачэнне ці пратакол допыту эксперта да заканчэння папярэдняга расследавання прад'яўляюцца падазраванаму, абвінавачанаму, абаронцу, а таксама па іх просьбе пацярпеламу і сведку, якія падвергліся экспертызе, што маюць права даваць свае тлумачэнні і заяўляць хадайніцтвы па высновах эксперта. У выпадку поўнай ці частковай адмовы ў задавальненні хадайніцтва следчы, асоба, якая праводзіць дазнанне, выносяць матываваную пастанову, якая пад распіску абвяшчаецца асобе, што заявіла хадайніцтва.

2. Аб азнаямленні з заключэннем эксперта, тлумачэннем або пратаколам яго допыту складаецца пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. У пратаколе адлюстроўваюцца зробленыя заявы ці хадайніцтвы.

3. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца і ў выпадках, калі экспертыза была праведзена да прыцягнення асобы ў якасці абвінавачанага або прызнання яго падазраваным ці пацярпелым, а таксама ў выпадках, калі экспертыза праведзена да распачынання крымінальнай справы.

Артыкул 239. Дадатковая і паўторная экспертызы

1. Пры недастатковай яснасці ці непаўнаце заключэння, а таксама ў выпадку ўзнікнення новых пытанняў у адносінах да раней даследаваных абставін можа быць прызначана дадатковая экспертыза, правядзенне якой даручаецца таму ж ці іншаму эксперту (экспертам).

2. У выпадку неабгрунтаванасці заключэння эксперта, наяўнасці сумненняў у яго правільнасці можа быць прызначана паўторная экспертыза, правядзенне якой даручаецца іншаму эксперту (экспертам).

3. Дадатковая і паўторная экспертызы прызначаюцца і праводзяцца з захаваннем патрабаванняў гэтай главы.

ГЛАВА 27
ПРЫЦЯГНЕННЕ Ў ЯКАСЦІ АБВІНАВАЧАНАГА, ПРАД'ЯЎЛЕННЕ АБВІНАВАЧАННЯ, ДОПЫТ АБВІНАВАЧАНАГА

Артыкул 240. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага

1. Пры наяўнасці дастатковых доказаў, якія даюць падставы для прад'яўлення асобе абвінавачання ва ўчыненні злачынства, следчы выносіць матываваную пастанову аб прыцягненні яе ў якасці абвінавачанага.

2. Следчы паведамляе абвінавачанаму аб дні прад'яўлення абвінавачання і адначасова растлумачвае яму права запрасіць абаронцу або хадайнічаць перад следчым аб забеспячэнні ўдзелу абаронцы.

3. Па крымінальных справах, па якіх у адпаведнасці з артыкулам 45 гэтага Кодэкса ўдзел абаронцы пры прад'яўленні абвінавачання абавязковы, следчы прымае меры для забеспячэння яго ўдзелу, калі абаронца не запрошаны самім абвінавачаным, яго законным прадстаўніком або іншымі асобамі па яго даручэнні.

Артыкул 241. Пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага

1. У пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага павінны быць указаны:

1) час і месца яе складання, кім складзена; прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая прыцягваецца ў якасці абвінавачанага, лічба, месяц, год і месца яе нараджэння;

2) апісанне злачынства, якое інкрымінуецца абвінавачанаму, з указаннем часу, месца яго ўчынення, а таксама іншых абставін, якія падлягаюць даказванню ў адпаведнасці з артыкулам 89 гэтага Кодэкса;

3) крымінальны закон (пункт, частка, артыкул), які прадугледжвае адказнасць за гэтае злачынства.

2. Пастанова павінна змяшчаць рашэнне аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачанага па справе, якая расследуецца.

3. Пры абвінавачанні ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, якія падпадаюць пад дзеянне розных артыкулаў крымінальнага закона, у пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага павінна быць указана, якія канкрэтныя дзеянні па кожных пункце, частцы, артыкуле крымінальнага закона ставяцца ў віну абвінавачанаму.

Артыкул 242. Абавязковасць яўкі абвінавачанага

1. Абвінавачаны, які не ўтрымліваецца пад вартай, выклікаецца для прад'яўлення абвінавачання і на допыт павесткай. Змест павесткі можа быць перададзены таксама тэлефанаграмай ці тэлеграмай.

2. У павестцы павінна быць указана, хто выклікаецца ў якасці абвінавачанага, куды, дзень і гадзіна яўкі, а таксама наступствы няяўкі.

3. Павестка ўручаецца абвінавачанаму пад распіску, а ў выпадку яго часовай адсутнасці – даросламу члену яго сям'і або адміністрацыі па месцы працы, якія абавязаны перадаць павестку выкліканаму на допыт абвінавачанаму. Абвінавачаны можа быць выкліканы з выкарыстаннем і іншых сродкаў сувязі. У выпадку няяўкі без уважлівых прычын абвінавачаны можа быць дастаўлены прыводам.

4. Абвінавачаны, які не ўтрымліваецца пад вартай, абавязаны прыбыць на выклік следчага ў прызначаны тэрмін.

5. Уважлівымі прычынамі няяўкі абвінавачанага на выклік следчага прызнаюцца:

1) захворванне, якое пазбаўляе абвінавачанага магчымасці прыбыць;

2) смерць члена сям'і ці блізкага сваяка;

3) стыхійныя бедствы;

4) іншыя абставіны, якія пазбаўляюць абвінавачанага магчымасці прыбыць у прызначаны тэрмін.

6. Аб прычынах няяўкі ў прызначаны тэрмін абвінавачаны абавязаны паведаміць следчаму.

7. Абвінавачаны, які ўтрымліваецца пад вартай, выклікаецца праз адміністрацыю месца зняволення.

Артыкул 243. Прад'яўленне абвінавачання

1. Абвінавачанне прад'яўляецца ў прысутнасці абаронцы, калі яго ўдзел абавязковы ці аб гэтым хадайнічалі абвінавачаны, яго законны прадстаўнік, і не пазней

за трое сутак з моманту вынясення пастановы аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачанага. У выпадку няяўкі абвінавачанага ці яго абаронцы абвінавачанне можа быць прад'яўлена і пасля сканчэння трох сутак.

2. Абвінавачанаму, дастаўленаму прыводам, абвінавачанне прад'яўляецца ў дзень прыводу. Пры гэтым следчы павінен прыняць меры для забеспячэння ўдзелу абаронцы пры прад'яўленні абвінавачання ў тых выпадках, калі ўдзел абаронцы абавязковы.

3. Следчы, упэўніўшыся ў асобе абвінавачанага і ў паўнамоцтвах абаронцы, законнага прадстаўніка, растлумачвае абвінавачанаму яго правы, прадугледжаныя артыкулам 43 гэтага Кодэкса, аб чым складаецца пратакол, і абвяшчае абвінавачанаму пастанову аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, растлумачвае яму сутнасць прад'яўленага абвінавачання.

4. Выкананне дзеянняў, указаных у частцы 3 гэтага артыкула, сведчыцца подпісамі абвінавачанага, абаронцы, законнага прадстаўніка і следчага на пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага з указаннем даты і гадзіны прад'яўлення абвінавачання.

5. У выпадку адмовы абвінавачанага ад подпісу следчы, абаронца, калі ён удзельнічаў пры прад'яўленні абвінавачання, законны прадстаўнік сведчаць на пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, што тэкст пастановы абвінавачанаму аб'яўлены і яму растлумачана сутнасць абвінавачання.

6. Абвінавачанаму ўручаюцца копіі пастановы аб прыцягненні яго ў якасці абвінавачанага і пратакола аб растлумачэнні яго правоў.

7. Копія пастановы аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага накіроўваецца пракурору.

Артыкул 244. Допыт абвінавачанага

1. Следчы абавязаны дапытаць абвінавачанага неадкладна пасля прад'яўлення яму абвінавачання. У выпадку адмовы абвінавачанага ад дачы паказанняў аб гэтым робіцца адзнака ў пратаколе яго допыту.

2. Допыт абвінавачанага праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі артыкулаў 215–219 гэтага Кодэкса.

3. Аб допыце абвінавачанага следчы складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкула 218 гэтага Кодэкса. У пратаколе першага допыту ўказваюцца даныя аб асобе абвінавачанага, у тым ліку прозвішча, імя, імя па бацьку, час і месца нараджэння, грамадзянства, адукацыя, сямейнае становішча, месца працы, род заняткаў ці пасада, месца жыхарства, судзімасць і іншыя звесткі, неабходныя для пасведчання асобы. У пратаколах наступных допытаў даныя аб асобе абвінавачанага, калі яны не змяніліся, можна абмежаваць указаннем яго прозвішча, імя і імя па бацьку.

4. Абвінавачаныя, выкліканыя з-за адной і той жа справы, дапытваюцца асобна. Следчы прымае меры для таго, каб яны не маглі размаўляць паміж сабой.

5. У пачатку допыту следчы павінен высветліць у абвінавачанага, ці жадае ён паведаміць свае адносіны да прад'яўленага абвінавачання, ці прызнае яго поўнасцю ці часткова або адмаўляе сваю віну ў прад'яўленым яму абвінавачанні, аб чым робіцца запіс у пратаколе допыту.

Артыкул 245. Змяненне і дапаўненне абвінавачання

1. Калі пры правядзенні папярэдняга расследавання ўзнікнуць падставы для змянення прад'яўленага абвінавачання ці яго дапаўнення, следчы абавязаны з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 240 і 241 гэтага Кодэкса вынесці новую пастанову аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага, абвясціць яе ў парадку, устаноўленым артыкулам 243 гэтага Кодэкса, і дапытаць абвінавачанага па новым абвінавачанні.

2. Калі ў ходзе папярэдняга расследавання прад'яўленае абвінавачанне ў якой-небудзь частцы не знайшло пацверджання, следчы сваёй пастановай спыняе

крымінальнае пераследаванне ў гэтай частцы, аб чым паведамляе абвінавачанаму і іншым удзельнікам крымінальнага працэсу.

3. Змяненне абвінавачання ў ходзе судовага разбору дапускаецца ў выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 301 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 28
ПРЫПЫНЕННЕ І АДНАЎЛЕННЕ ПАПЯРЭДНЯГА РАССЛЕДАВАННЯ

Артыкул 246. Падставы, парадак і тэрміны прыпынення папярэдняга следства

1. Папярэдняе следства прыпыняецца пры наяўнасці адной з наступных падстаў, якія перашкаджаюць яго працягу і заканчэнню:

1) невыяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага;

2) калі абвінавачаны ўцёк ад органа крымінальнага пераследу або калі з-за іншых прычын не выяўлена яго месцазнаходжанне;

3) калі месцазнаходжанне абвінавачанага вядомае, аднак адсутнічае рэальная магчымасць яго ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе ў сувязі з разглядам пытання аб выдачы замежнай дзяржавай, а таксама ў сувязі з немагчымасцю з-за аб'ектыўных прычын прыбыць да месца вядзення папярэдняга следства;

4) часовага псіхічнага расстройства (захворвання) ці іншага захворвання абвінавачанага, якія перашкаджаюць яго ўдзелу ў правядзенні працэсуальных дзеянняў і пасведчаны ўрачом, які працуе ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя;

5) немагчымасці правядзення следчых дзеянняў, без якіх не можа быць прынята рашэнне аб заканчэнні папярэдняга следства;

6) незнаходжання асобы, якая знікла без вестак.

2. Аб прыпыненні папярэдняга следства следчы выносіць матываваную пастанову, копію якой накіроўвае пракурору. Калі па крымінальнай справе накладзены арышт на маёмасць у адпаведнасці з часткай 2 артыкула 132 гэтага Кодэкса, у рэзалютыўнай частцы пастановы выкладаецца таксама ўказанне аб адмене арышту на маёмасць.

3. Калі па крымінальнай справе прыцягнуты два ці некалькі абвінавачаных, а падставы для прыпынення папярэдняга следства адносяцца не да ўсіх абвінавачаных, следчы мае права вылучыць у асобнае вядзенне і прыпыніць папярэдняе следства ў адносінах да асобных абвінавачаных ці прыпыніць вядзенне па ўсёй справе, калі па ёй не можа быць прадоўжана папярэдняе следства без удзелу ўсіх абвінавачаных.

4. У выпадках, прадугледжаных пунктамі 1, 2 і 6 часткі 1 гэтага артыкула, папярэдняе следства прыпыняецца толькі пасля сканчэння тэрміну яго вядзення; у выпадках, прадугледжаных пунктамі 3, 4 і 5 часткі 1 гэтага артыкула, яно можа быць прыпынена і да заканчэння тэрміну папярэдняга следства.

5. Да прыпынення папярэдняга следства следчы абавязаны выканаць усе следчыя дзеянні, правядзенне якіх магчымае ў адсутнасць абвінавачанага, прыняць усе меры для яго вышуку, а таксама для выяўлення асобы, якая ўчыніла злачынства, або для знаходжання асобы, якая знікла без вестак.

6. Вядзенне па крымінальнай справе, папярэдняе следства па якой прыпынена, падлягае спыненню пасля сканчэння тэрміну даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці, устаноўленага крымінальным законам, калі па справе няма звестак аб прыпыненні або перапынку тэрміну даўнасці.

Артыкул 247. Дзеянні следчага пасля прыпынення папярэдняга следства

1. Аб прыпыненні папярэдняга следства следчы абавязаны пісьмова паведаміць пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам і адначасова растлумачыць ім, што пастанова аб прыпыненні папярэдняга следства можа быць абскарджана пракурору. У выпадку прыпынення папярэдняга следства на

падставах, прадугледжаных пунктамі 3–5 часткі 1 артыкула 246 гэтага Кодэкса, аб гэтым апавяшчаюцца таксама абвінавачаны, яго абаронца і законны прадстаўнік.

2. Пасля прыпынення папярэдняга расследавання следчы:

1) у выпадках, прадугледжаных пунктам 1 часткі 1 артыкула 246 гэтага Кодэкса, прымае як непасрэдна, так і праз органы дазнання меры для выяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага;

2) у выпадках, прадугледжаных пунктамі 2 і 6 часткі 1 артыкула 246 гэтага Кодэкса, прымае меры для выяўлення месцазнаходжання абвінавачанага, вышуку абвінавачанага, які ўцёк, ці знаходжання асобы, якая знікла без вестак.

3. Вядзенне па крымінальнай справе, следства па якой прыпынена, не дапускаецца.

Артыкул 248. Вышук абвінавачанага

1. Пры адсутнасці звестак аб месцы знаходжання абвінавачанага следчы даручае вядзенне следства органу дазнання. Аб гэтым даручэнні ўказваецца ў пастанове аб прыпыненні папярэдняга следства ці выносіцца асобная пастанова.

2. Вышук абвінавачанага можа быць аб'яўлены як у час вядзення папярэдняга следства, так і адначасова з яго прыпыненнем.

3. Пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 117 гэтага Кодэкса, у адносінах да абвінавачанага, які знаходзіцца ў вышуку, можа быць прыменена мера стрымання. У выпадках, прадугледжаных артыкулам 126 гэтага Кодэкса, у адносінах да яго з санкцыі пракурора ці яго намесніка можа быць прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

4. У выпадку, калі ў абвінавачанага, які знаходзіцца ў вышуку, застаюцца дзеці без апекі бацькоў, аб яго вышуку не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння паведамляецца кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па яго месцы жыхарства для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.

5. У выпадку, калі адпала неабходнасць у вышуку абвінавачанага, следчы выносіць пастанову аб спыненні следства.

Артыкул 249. Аднаўленне прыпыненага папярэдняга расследавання

1. Прыпыненае папярэдняе расследаванне аднаўляецца матываванай пастановай следчага пасля таго, як:

1) адпалі падставы для прыпынення;

2) узнікла неабходнасць правядзення следчых дзеянняў, якія могуць быць ажыццёўлены без удзелу абвінавачанага.

2. Прыпыненае папярэдняе расследаванне можа быць адноўлена таксама матываванай пастановай пракурора, начальніка следчага падраздзялення ці іх намеснікаў у сувязі з адменай пастановы следчага аб прыпыненні папярэдняга расследавання.

3. Аб аднаўленні папярэдняга расследавання паведамляецца абвінавачанаму, яго абаронцу і законнаму прадстаўніку, а таксама пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам.

ГЛАВА 29
СПЫНЕННЕ І АДНАЎЛЕННЕ ПАПЯРЭДНЯГА РАССЛЕДАВАННЯ ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ

Артыкул 250. Падставы для спынення папярэдняга расследавання і крымінальнага пераследавання

1. Папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе спыняецца пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкуле 29, частках 1 і 2 артыкула 30 гэтага Кодэкса.

2. Пры недаказанасці ўдзелу падазраванага ці абвінавачанага ва ўчыненні злачынства, калі вычарпаны ўсе магчымасці для збірання дадатковых доказаў, супраць іх спыняецца крымінальнае пераследаванне ў сувязі з неўчыненнем імі таго

прадугледжанага крымінальным законам дзеяння, якое ім выстаўлялася ў падазрэнні ці абвінавачанні. Пасля сканчэння тэрміну папярэдняга расследавання вядзенне па крымінальнай справе прыпыняецца ў адпаведнасці з пунктам 1 часткі 1 артыкула 246 гэтага Кодэкса.

3. Калі па справе прыцягнута некалькі падазраваных, абвінавачаных, а падставы для спынення крымінальнага пераследавання адносяцца не ўсіх падазраваных ці абвінавачаных, то крымінальнае пераследаванне спыняецца ў адносінах да асобных падазраваных, абвінавачаных, аб чым выносіцца пастанова.

Артыкул 251. Пастанова аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання

1. Аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання следчы, пракурор выносяць матываваную пастанову, у якой указваюцца час і месца яе складання, прозвішча і пасада следчага, пракурора, выкладаюцца абставіны, якія паслужылі нагодай і падставай для распачынання крымінальнай справы, і вынікі яе расследавання з указаннем даных аб асобах, якія падазраваліся ці абвінавачваліся ва ўчыненні злачынства, а таксама крымінальна-прававой кваліфікацыі і мерах стрымання, якія прымяняліся. У выпадку спынення вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у пунктах 3 і 4 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, следчы, пракурор растлумачваюць падазраванаму ці абвінавачанаму прававы характар і прававыя наступствы прыняцця такога рашэння і высвятляюць у падазраванага ці абвінавачанага, ці згодны яны на спыненне вядзення па крымінальнай справе на гэтых падставах.

2. У рэзалютыўнай частцы пастановы выкладаецца рашэнне следчага, пракурора аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання са спасылкай на пункт, частку, артыкул гэтага Кодэкса, які паслужыў падставай для спынення папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, а таксама ўказанне аб адмене меры стрымання, меры часовага адхілення ад пасады, арышту на маёмасць, часовага абмежавання права на выезд з Рэспублікі Беларусь, а таксама аб лёсе рэчыўных доказаў.

3. У выпадках, калі спыненне папярэдняга расследавання па крымінальнай справе дапускаецца толькі са згоды падазраванага ці абвінавачанага, такая згода павінна быць адлюстравана ў пастанове.

4. Пры спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання на падставах, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 часткі 1 артыкула 29 і часткай 2 артыкула 250 гэтага Кодэкса, не дапускаецца ўключэнне ў пастанову фармулёвак, якія ставяць пад сумненне невінаватасць асобы, у адносінах да якой спынена папярэдняе расследаванне або крымінальнае пераследаванне. Копія пастановы, вынесенай следчым, на працягу 24 гадзін накіроўваецца пракурору.

Артыкул 252. Дзеянні следчага, пракурора пасля спынення папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання

1. Аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання і падставах яго спынення следчы, пракурор пісьмова паведамляюць падазраванаму, абвінавачанаму, іх абаронцам і законным прадстаўнікам, пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам, а таксама асобе ці прадстаўніку дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, па заявах якіх справа была распачата.

2. Асобам, указаным у частцы 1 гэтага артыкула, тлумачацца права азнаямлення з крымінальнай справай і парадак абскарджання пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання. Па просьбе гэтых асоб ім уручаецца копія пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання або крымінальнага пераследавання, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^1 гэтага Кодэкса.

3. Азнаямленне з крымінальнай справай праводзіцца з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 255–259 гэтага Кодэкса.

4. У выпадку спынення папярэдняга расследавання ці крымінальнага пераследавання на падставах, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 часткі 1 артыкула 29, пунктам 5 часткі 1 ці часткай 2 артыкула 30 гэтага Кодэкса, у адносінах да асобы па факце ўчынення ёй у перыяд праходжання дзяржаўнай, ваеннай службы ці службы ў ваенізаванай арганізацыі цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства супраць інтарэсаў службы або цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, звязанага з выкарыстаннем службовай асобай сваіх службовых паўнамоцтваў, копія пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання ці крымінальнага пераследавання накіроўваецца ў орган, які ажыццяўляе прызначэнне і пераразлік пенсій па месцы жыхарства гэтай асобы.

Артыкул 253. Абскарджанне пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання ці крымінальнага пераследавання

1. Пастанова следчага аб спыненні папярэдняга расследавання крымінальнай справы або крымінальнага пераследавання можа быць абскарджана падазраваным, абвінавачаным, іх абаронцамі і законнымі прадстаўнікамі, пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам ці іх прадстаўнікамі, прадстаўніком памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, а таксама асобай ці прадстаўніком дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, па заявах якіх была распачата крымінальная справа, пракурору, які ажыццяўляе нагляд за папярэднім расследаваннем, ці ў суд, ці начальніку следчага падраздзялення.

2. У выпадках, калі папярэдняе расследаванне крымінальнай справы або крымінальнае пераследаванне спынены пракурорам, пастанова можа быць абскарджана вышэйстаячаму пракурору ці ў суд.

Артыкул 254. Аднаўленне спыненага папярэдняга расследавання крымінальнай справы

1. Папярэдняе расследаванне крымінальнай справы аднаўляецца ў выпадку адмены пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання справы пракурорам, начальнікам следчага падраздзялення ці судом.

2. Аднаўленне спыненага папярэдняга расследавання дапускаецца толькі да сканчэння тэрміну даўнасці прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці, за выключэннем выпадкаў задавальнення пракурорам, начальнікам следчага падраздзялення ці судом скаргі аб адмене пастановы аб спыненні папярэдняга расследавання за сканчэннем тэрмінаў даўнасці прыцягнення асобы да крымінальнай адказнасці.

3. Аб аднаўленні спыненага папярэдняга расследавання пісьмова апавяшчаюцца падазраваны, абвінавачаны, іх абаронцы і законныя прадстаўнікі, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык ці іх прадстаўнікі, а таксама асоба ці прадстаўнік дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, па заяве якіх справа была распачата.

ГЛАВА 30
ЗАКАНЧЭННЕ ПАПЯРЭДНЯГА РАССЛЕДАВАННЯ З ПЕРАДАЧАЙ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ ПРАКУРОРУ ДЛЯ НАКІРАВАННЯ Ў СУД

Артыкул 255. Паведамленне аб заканчэнні папярэдняга расследавання

1. Прызнаўшы, што ўсе следчыя дзеянні па крымінальнай справе выкананыя, а сабраныя доказы дастатковыя для перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, следчы апавяшчае аб гэтым пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка ці іх прадстаўнікоў і растлумачвае ім права знаёміцца з крымінальнай справай, а таксама заяўляць хадайніцтвы аб дапаўненні папярэдняга расследавання ці прыняцці па справе іншых рашэнняў.

2. Аб заканчэнні вядзення па крымінальнай справе і аб праве знаёміцца з крымінальнай справай і заяўляць хадайніцтвы аб дапаўненні папярэдняга расследавання ці прыняцці па справе іншых рашэнняў следчы апавяшчае абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка, абаронцу, калі ён удзельнічае ў справе, і растлумачвае ім, што яны маюць права знаёміцца з крымінальнай справай як асабіста, так і з дапамогай абаронцы.

3. Выключана.

4. Адначасова з апавяшчэннем асоб, пералічаных у частках 1–3 гэтага артыкула, следчы прызначае час, у які пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі, а таксама абвінавачаны і яго законны прадстаўнік, абаронца могуць прыбыць для азнаямлення з крымінальнай справай. Яўку абвінавачанага, які ўтрымліваецца пад вартай, для азнаямлення з крымінальнай справай забяспечвае адміністрацыя месцаў утрымання пад вартай.

5. Крымінальная справа павінна быць прад'яўлена для азнаямлення абвінавачанаму не пазней чым за месяц да сканчэння гранічнага тэрміну ўтрымання абвінавачанага пад вартай, устаноўленага часткай чацвёртай артыкула 127 гэтага Кодэкса.

6. Калі абаронца абвінавачанага з-за ўважлівых прычын не можа прыбыць для азнаямлення са справай у прызначаны час, следчы адкладвае азнаямленне на тэрмін не большы за пяць сутак. У выпадку няяўкі абаронцы на працягу гэтага тэрміну следчы прымае меры да яўкі іншага абаронцы.

Артыкул 256. Азнаямленне пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў з крымінальнай справай

1. У выпадку яўкі пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў следчы растлумачвае ім парадак і ўмовы азнаямлення з крымінальнай справай, прадугледжаныя артыкулам 257 гэтага Кодэкса, а таксама тэрміны азнаямлення, устаноўленыя гэтым артыкулам, аб чым складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса і прад'яўляе для азнаямлення пацярпеламу і яго прадстаўніку крымінальную справу, за выключэннем матэрыялаў, пералічаных у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса. Грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі знаёмяцца з крымінальнай справай у той частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску.

1[1]. Пры наяўнасці ў матэрыялах крымінальнай справы звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі ці іншай тайнай, якая ахоўваецца законам, следчы папярэджвае пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў аб адказнасці за раскрыццё такіх звестак, аб чым у іх бярэцца падпіска.

2. Агульны тэрмін для азнаямлення ўсіх пацярпелых, грамадзянскіх істцоў, грамадзянскіх адказчыкаў і іх прадстаўнікоў з крымінальнай справай не можа перавышаць адзін месяц. Пры ўдзеле ў справе некалькіх пацярпелых, грамадзянскіх істцоў, грамадзянскіх адказчыкаў і іх прадстаўнікоў дапускаецца адначасовае азнаямленне іх з крымінальнай справай.

Артыкул 257. Азнаямленне абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы з крымінальнай справай

1. Пасля выканання патрабаванняў артыкула 255 гэтага Кодэкса следчы прад'яўляе абвінавачанаму, яго законнаму прадстаўніку і абаронцу крымінальную справу ў падшытым і пранумараваным выглядзе, за выключэннем матэрыялаў, пералічаных у частцы 8 артыкула 193 гэтага Кодэкса, і растлумачвае ім парадак, умовы і тэрміны азнаямлення са справай, устаноўленыя гэтым артыкулам, аб чым складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. Калі справа складаецца з некалькіх тамоў, следчы мае права прад'яўляць яе для азнаямлення абвінавачанаму, яго законнаму прадстаўніку і абаронцу часткамі. Па просьбе

абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка ці абаронцы следчы ўзнаўляе фанаграмы, дэманструе відэазапісы, кінафільмы, слайды, калі гэтакія прыкладзены да пратаколаў следчых дзеянняў.

2. Абвінавачаны, яго законны прадстаўнік і абаронца ў працэсе азнаямлення з крымінальнай справай маюць права выпісваць са справы звесткі ў любым аб'ёме, а таксама з дазволу следчага капіраваць матэрыялы крымінальнай справы, якія іх цікавяць, за выключэннем звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі. Пры наяўнасці ў крымінальнай справе звестак, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты ці іншую тайну, якая ахоўваецца законам, у абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы бярэцца падпіска з папярэджаннем аб крымінальнай адказнасці за іх раскрыццё.

3. Па хадайніцтве абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы яны могуць знаёміцца з крымінальнай справай разам ці асобна. Пачаткам азнаямлення з крымінальнай справай з'яўляецца прад'яўленне справы абвінавачанаму.

4. Незалежна ад колькасці абвінавачаных, прыцягнутых да адказнасці па крымінальнай справе, агульны тэрмін азнаямлення іх і іх законных прадстаўнікоў, абаронцаў са справай не можа перавышаць адзін месяц. У выключных выпадках тэрмін азнаямлення абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы з крымінальнай справай можа быць прадоўжаны пракурорам.

5. Пасля заканчэння азнаямлення абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы з крымінальнай справай следчы абавязаны пасля выканання патрабаванняў артыкула 256 гэтага Кодэкса высветліць, ці заяўляюць указаныя асобы хадайніцтвы і аб чым менавіта, у тым ліку хадайніцтва абвінавачанага аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, з яго згодай заплаціць крымінальна-прававую кампенсацыю ў якасці неабходнай умовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці, а таксама ці заяўлена абвінавачаным хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Копія хадайніцтва аб вызваленні абвінавачанага ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, далучаецца да крымінальнай справы.

Артыкул 258. Пратакол азнаямлення з крымінальнай справай

1. Аб азнаямленні з крымінальнай справай абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы, а таксама пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў следчы складае пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса. У пратаколе ўказваецца, якія матэрыялы прад'яўлены для азнаямлення і якія хадайніцтвы заяўлены.

2. Калі азнаямленне з крымінальнай справай абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы ці пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў адбывалася сумесна, то складаюцца адзіныя пратаколы.

Артыкул 259. Заява і вырашэнне хадайніцтваў

1. Хадайніцтвы абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцы, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка і іх прадстаўнікоў, заяўленыя вусна пасля азнаямлення з крымінальнай справай, заносяцца ў пратакол азнаямлення з крымінальнай справай і вырашаюцца ў тэрміны, прадугледжаныя артыкулам 137 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку, калі ўдзельнік крымінальнага працэсу заявіць аб намеры выкласці хадайніцтва ў пісьмовай форме, для яго падрыхтоўкі можа быць дадзены час да трох сутак, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе, а пісьмовае хадайніцтва затым далучаецца

да крымінальнай справы. Час падрыхтоўкі пісьмовага хадайніцтва ўваходзіць у тэрмін азнаямлення з крымінальнай справай.

3. Следчы не мае права адмовіць у задавальненні хадайніцтва аб выяўленні прадугледжаных артыкулам 89 гэтага Кодэкса абставін, якія маюць значэнне для крымінальнай справы. У такіх выпадках следчы абавязаны дапоўніць папярэдняе расследаванне, пры гэтым працяг азнаямлення з крымінальнай справай іншых удзельнікаў крымінальнага працэсу не перашкаджае задавальненню хадайніцтва, і ў выпадку яго задавальнення дадаткова праводзяцца следчыя дзеянні.

4. Пасля правядзення дадаткова следчых дзеянняў следчы абавязаны зноў паведаміць удзельнікам крымінальнага працэсу аб заканчэнні папярэдняга расследавання, даць ім магчымасць азнаёміцца з дадатковымі матэрыяламі справы, а па іх хадайніцтве – і з крымінальнай справай.

5. Тэрмін азнаямлення ўдзельнікаў крымінальнага працэсу з крымінальнай справай пасля правядзення дадаткова следчых дзеянняў не павінен перавышаць адзін месяц.

6. У выпадку поўнай ці частковай адмовы ў задавальненні заяўленага хадайніцтва следчы выносіць аб гэтым матываваную пастанову, копію якой накіроўвае заяўніку.

7. Адмова ў задавальненні хадайніцтва можа быць абскарджана пракурору.

Артыкул 260. Пастанова аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд

1. Выканаўшы патрабаванні артыкулаў 255–259 гэтага Кодэкса, следчы выносіць пастанову аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд.

2. У пастанове аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд павінны быць указаны:

1) час і месца яе вынясення, кім яна складзена;

2) звесткі аб асобе абвінавачанага;

3) грамадска небяспечнае дзеянне (дзеянні), прадугледжанае крымінальным законам, учыненае абвінавачаным;

4) крымінальны закон (пункт, частка, артыкул), які прадугледжвае адказнасць за ўчыненае грамадска небяспечнае дзеянне;

5) наяўнасць згоды абвінавачанага на выплату крымінальна-прававой кампенсацыі ў якасці неабходнай умовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 88 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

3. Пастанова павінна заканчвацца рашэннем следчага аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд.

Артыкул 261. Дадатак да пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд

Адначасова з пастановай аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд следчы падае пракурору даведку, у якой са спасылкай на лісты крымінальнай справы прыводзяцца даныя аб руху крымінальнай справы і тэрмінах расследавання; аб асобах, прыцягнутых у якасці абвінавачаных, і прад'яўленым ім абвінавачанні; аб мерах стрымання, скарыстаных у адносінах да іх, з указаннем часу ўтрымання пад вартай ці хатняга арышту; аб рэчыўных доказах; аб грамадзянскім іску, мерах, прынятых для яго забеспячэння, і аб магчымай канфіскацыі маёмасці; аб працэсуальных выдатках.

Артыкул 262. Накіраванне крымінальнай справы пракурору

1. Пасля падпісання следчым пастановы аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд справа не пазней чым праз суткі накіроўваецца пракурору, які ажыццяўляе нагляд.

2. Разам з крымінальнай справай следчы падае пракурору даведку аб выніках праведзенага па справе папярэдняга расследавання, а для падачы ў суд – спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне. У даведцы ўказваюцца звесткі аб асобе

абвінавачанага, сутнасць прад'яўленага яму абвінавачання з указаннем месца і часу ўчынення злачынства, яго спосабаў, матываў, наступстваў і іншых істотных абставін, выяўленых па справе і пастаўленых у віну ўсім абвінавачаным і кожнаму паасобку; звесткі аб пацярпелым; доказы, якія пацвярджаюць вінаватасць абвінавачанага; абставіны, якія памякчаюць і якія абцяжваюць яго адказнасць; доказы, якія прыводзяцца абвінавачаным у сваю абарону, і вынікі праверкі гэтых доказаў; крымінальны закон, які прадугледжвае адказнасць за ўчыненае злачынства, а таксама наяўнасць ці адсутнасць падстаў і ўмоў вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці. Даведка павінна змяшчаць спасылкі на тамы і лісты крымінальнай справы і не падлягае далучэнню да крымінальнай справы.

3. У спісе асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне, указваюцца іх месца жыхарства ці месца знаходжання і лісты крымінальнай справы, на якіх выкладзены іх паказанні ці заключэнні. У гэтым спісе асобна пад выдуманымі персанальнымі данымі ўказваюцца асобы, выклік якіх на судовае пасяджэнне праводзіцца праз орган, упаўнаважаны законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці дзяржаўны орган, якому даручана прымяненне мер для забеспячэння бяспекі, з указаннем гэтага органа.

ГЛАВА 31
ДЗЕЯННІ І РАШЭННІ ПРАКУРОРА ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ, ЯКАЯ ПАСТУПІЛА ДЛЯ НАКІРАВАННЯ Ў СУД

Артыкул 263. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню пракурорам па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд

1. Атрымаўшы ад следчага крымінальную справу з пастановай аб перадачы справы пракурору для накіравання ў суд, пракурор ці яго намеснік абавязаны праверыць:

1) ці мела месца дзеянне, пастаўленае ў віну абвінавачанаму, і ці ёсць ў гэтым дзеянні склад злачынства;

2) ці няма ў справе абставін, прадугледжаных артыкулам 250 гэтага Кодэкса, якія цягнуць за сабой яе спыненне;

21) ці заяўлена абвінавачаным хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, з яго згодай выплаціць крымінальна-прававую кампенсацыю ў якасці неабходнай умовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці або хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

3) ці абгрунтавана прад'яўленае абвінавачанне доказамі, якія ёсць у крымінальнай справе;

4) ці прад'яўлена абвінавачанне па ўсіх выяўленых і ўказаных у крымінальнай справе грамадска небяспечных дзеяннях абвінавачанага;

5) ці прыцягнуты ў якасці абвінавачаных усе асобы, выкрытыя ва ўчыненні злачынства;

6) ці правільна кваліфікаваны грамадска небяспечныя дзеянні абвінавачанага;

7) ці правільна прыменена мера стрымання і ці няма ў справе падстаў для яе змянення або адмены;

8) ці прыняты меры забеспячэння грамадзянскага іску і магчымай канфіскацыі маёмасці;

9) ці выяўлены прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі ўчыненню злачынства, і ці прынятыя меры для іх ліквідацыі;

10) ці праведзена даследаванне абставін крымінальнай справы ўсебакова, поўна і аб'ектыўна;

11) ці складзена пастанова аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд у адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса;

12) ці не дапушчаны пры правядзенні папярэдняга расследавання парушэнні крымінальна-працэсуальнага закона.

2. Пры наяўнасці падстаў для вызвалення ад крымінальнай адказнасці, прадугледжаных артыкулам 88 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пракурор ці яго намеснік неадкладна паведамляюць абвінавачанаму аб унясенні на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс, на працягу трох сутак з дня паведамлення крымінальна-прававой кампенсацыі як неабходнай умове для прыняцця рашэння аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці.

Артыкул 264. Рашэнне пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд

1. Пракурор ці яго намеснік, калі іншае не прадугледжана часткай 2 гэтага артыкула, абавязаны па крымінальнай справе, якая паступіла да іх, у тэрмін не большы за пяць сутак, а па складаных і шматэпізодных крымінальных справах – не большы за пятнаццаць сутак, прыняць адно з наступных рашэнняў:

1) накіраваць крымінальную справу ў суд, пагадзіўшыся з пастановай следчага. Пры гэтым пракурор ці яго намеснік маюць права выключыць сваёй пастановай асобныя пункты абвінавачання, змяніць кваліфікацыю дзеянняў абвінавачанага з прымяненнем закона аб менш цяжкім злачынстве, спыніць крымінальнае пераследаванне ў адносінах да асобных абвінавачаных;

2) спыніць папярэдняе расследаванне крымінальнай справы ў адносінах да ўсіх абвінавачаных і ў поўным аб'ёме на падставах, прадугледжаных артыкулам 250 гэтага Кодэкса;

3) вярнуць крымінальную справу следчаму са сваімі пісьмовымі ўказаннямі для правядзення дадаткова папярэдняга расследавання, а таксама для прад'яўлення новага абвінавачання ў выпадку неабходнасці яго дапаўнення, змянення на больш цяжкае ці на істотна адрознае па фактычных абставінах ад першапачатковага абвінавачання або для складання новай пастановы, калі складзеная па справе не адпавядае патрабаванням артыкула 260 гэтага Кодэкса. Аб вяртанні крымінальнай справы следчаму пракурорам ці яго намеснікам выносіцца пастанова.

2. У выпадку заявы абвінавачаным хадайніцтва аб вызваленні яго ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных артыкулам 88[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пракурор ці яго намеснік прымаюць рашэнне па крымінальнай справе пасля разгляду ва ўстаноўленым парадку гэтага хадайніцтва. Па выніках разгляду хадайніцтва пракурор ці яго намеснік накіроўваюць крымінальную справу ў суд у адпаведнасці з пунктам 1 часткі 1 гэтага артыкула або спыняюць папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе ў адпаведнасці з часткай 2 артыкула 30 гэтага Кодэкса.

Артыкул 265. Змяненне пракурорам меры стрымання і спіса асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне

1. Па крымінальнай справе, якая паступіла з пастановай аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, пракурор ці яго намеснік маюць права сваёй пастановай адмяніць ці змяніць раней прымененую меру стрымання або прымяніць меру стрымання, калі яна не была прыменена раней. У выпадку адмены, змянення ці прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту пракурор ці яго намеснік кіруюцца правіламі, прадугледжанымі артыкуламі 125 і 126 гэтага Кодэкса.

2. Пракурор ці яго намеснік маюць права таксама змяніць спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне.

Артыкул 266. Накіраванне пракурорам крымінальнай справы ў суд

1. Пракурор ці яго намеснік, пагадзіўшыся з пастановай следчага, неадкладна сваёй пастановай накіроўваюць крымінальную справу ў суд адпаведна падсуднасці і паведамляюць аб гэтым абвінавачанаму, яго абаронцу і законнаму прадстаўніку

пацярпелага, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам, растлумачыўшы пры гэтым, што ў далейшым усялякія хадайніцтвы і скаргі па справе накіроўваюцца непасрэдна ў суд.

2. Копію пастановы следчага аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд пракурор ці яго намеснік разам з паведамленнем накіроўваюць абвінавачанаму і пацярпеламу, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59[1] гэтага Кодэкса, з перакладам на іх родную мову ці на іншую мову, якой яны валодаюць. Калі пракурорам ці яго намеснікам былі зменены аб'ём абвінавачанняў ці кваліфікацыя грамадска небяспечнага дзеяння або прыменена, зменена ці адменена мера стрымання, указаным асобам накіроўваюцца копіі адпаведных пастаноў, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59[1] гэтага Кодэкса.

3. Разам з крымінальнай справай у суд накіроўваюцца пастанова следчага аб перадачы справы пракурору для накіравання ў суд і спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне.

4. У выпадку, калі пракурор папярэдне крымінальную справу расследаваў ці кіраваў следчай групай , то пасля выканання патрабаванняў артыкулаў 255–259 гэтага Кодэкса ён неадкладна сваёй пастановай накіроўвае крымінальную справу ў суд адпаведна падсуднасці з захаваннем патрабаванняў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула. Да пастановы дадаецца спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне.

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ
СУДОВАЕ ВЯДЗЕННЕ

РАЗДЗЕЛ IX
ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

ГЛАВА 32
ПАДСУДНАСЦЬ

Артыкул 267. Падсуднасць крымінальных спраў раённаму (гарадскому) суду

1. Раённаму (гарадскому) суду падсудныя ўсе крымінальныя справы аб усіх злачынствах, за выключэннем спраў, падсудных вышэйстаячым судам.

2. Суддзя аднаасобна разглядае справы аб злачынствах, за якія максімальнае пакаранне, прадугледжанае крымінальным законам, не перавышае дзесяць гадоў пазбаўлення волі, за выключэннем спраў аб злачынствах непаўналетніх.

Артыкул 268. Падсуднасць крымінальных спраў абласному, Мінскаму гарадскому судам

1. Абласному, Мінскаму гарадскому судам падсудныя крымінальныя справы аб злачынствах супраць міру і бяспекі чалавецтва, злачынствах супраць дзяржавы, а таксама аб злачынствах, за якія можа быць прызначана пакаранне смерцю.

11. Абласному, Мінскаму гарадскому судам падсудныя крымінальныя справы, у матэрыялах якіх змяшчаюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі.

2. Абласныя, Мінскі гарадскі суды маюць права прыняць у сваё вядзенне ў якасці суда першай інстанцыі любую крымінальную справу, падсудную ніжэйстаячаму суду.

Артыкул 269. Падсуднасць крымінальных спраў Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь

1. Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь падсудныя крымінальныя справы:

1) аб злачынствах, учыненых вышэйшымі службовымі асобамі дзяржавы, дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь і суддзямі;

2) перададзеныя ў гэты суд са згоды абвінавачанага і яго абаронцы ў мэтах забеспячэння аб'ектыўнасці судовага разбору ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 274 гэтага Кодэкса.

2. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь мае права прыняць у сваё вядзенне па ўласнай ініцыятыве любую крымінальную справу.

Артыкул 270. Выключаны

Артыкул 271. Тэрытарыяльная падсуднасць крымінальных спраў

1. Крымінальная справа падлягае разгляду ў судзе па месцы ўчынення злачынства.

2. Калі злачынства было пачата ў месцы дзейнасці аднаго суда, а скончана ў месцы дзейнасці іншага суда, справа падсудная суду па месцы заканчэння злачынства.

3. Калі месца ўчынення злачынства вызначыць немагчыма ці калі злачынствы ўчынены ў розных месцах, справы разглядаюцца судамі па месцы заканчэння папярэдняга расследавання або па месцы ўчынення аднаго са злачынстваў, апошняга ці найбольш цяжкага з іх.

Артыкул 272. Вызначэнне падсуднасці пры аб'яднанні крымінальных спраў

1. Пры абвінавачанні адной асобы ці групы асоб ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, крымінальныя справы аб якіх падсудныя рознаіменным судам, справа аб усіх злачынствах разглядаецца вышэйстаячым судом.

2. Выключана.

3. Справу, на тых ці іншых падставах падсудную адначасова некалькім аднайменным судам, разглядае суд па месцы заканчэння папярэдняга расследавання.

Артыкул 273. Перадача крымінальнай справы ў іншы суд

1. Суд, выявіўшы, што справа, якая знаходзіцца ў яго вядзенні, падсудная іншаму суду такога ж узроўню, мае права са згоды бакоў абвінавачання і абароны пакінуць крымінальную справу ў сваім вядзенні, але толькі ў выпадку, калі ён ужо распачаў яе разгляд на судовым пасяджэнні. Аднак калі справа падсудная вышэйстаячаму суду, яна ва ўсіх выпадках падлягае накіраванню паводле падсуднасці.

2. Перадача ў ніжэйстаячы суд справы, пачатай разглядам на судовым пасяджэнні вышэйстаячага суда, не дапускаецца.

Артыкул 274. Перадача крымінальнай справы з суда, якому яна падсудная, у іншы суд

1. У асобных выпадках у мэтах найбольш хуткага, усебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы са згоды бакоў абвінавачання і абароны яна можа быць перададзена для разгляду ў іншы аднайменны ці вышэйстаячы суд. Пры гэтым перадача справы дапускаецца толькі да пачатку яе разгляду на судовым пасяджэнні.

2. Пытанне аб перадачы справы на ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула падставах з аднаго суда ў іншы вырашае старшыня вышэйстаячага суда ці яго намеснік па прадстаўленні пракурора ці суда, якому падсудная справа, аб чым выносіцца пастанова.

3. Пытанне аб перадачы справы ў суд іншай вобласці, горада Мінска ці ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула падставах вырашае Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці яго намеснік, аб чым выносіцца пастанова.

Артыкул 275. Недапушчальнасць спрэчак аб падсуднасці

Спрэчкі аб падсуднасці між судамі не дапускаюцца. Усялякая крымінальная справа, накіраваная з аднаго суда ў іншы ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 272–274 гэтага Кодэкса, падлягае безумоўнаму прыняццю да вядзення тым судом, у які яна накіравана.

ГЛАВА 33
ПРЫЗНАЧЭННЕ І ПАДРЫХТОЎКА СУДОВАГА РАЗБОРУ

Артыкул 276. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд

1. Суддзя па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд, прымае адно з наступных рашэнняў:

1) аб накіраванні справы адпаведна падсуднасці;

2) выключаны;

3) аб прыпыненні вядзення па справе;

31) аб прызначэнні папярэдняга судовага пасяджэння;

4) аб прызначэнні судовага разбору.

2. Рашэнне па справе суддзя прымае ў форме пастановы, у якой павінны ўказвацца:

1) час і месца вынясення пастановы;

2) пасада і прозвішча суддзі, які вынес пастанову;

3) падставы і сутнасць прынятых рашэнняў.

3. Рашэнне павінна быць прынята не пазней за чатырнаццаць сутак з дня паступлення справы ў суд, а па справах, падсудных Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь, абласным, Мінскаму гарадскому судам, – у тэрмін да аднаго месяца. У выключных выпадках з улікам асаблівай складанасці і вялікага аб'ёму справы тэрмін можа быць прадоўжаны па пастанове старшыні суда адпаведна да аднаго і да трох месяцаў.

Артыкул 277. Пытанні, якія падлягаюць высвятленню па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд

Па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд, суддзя павінен высветліць:

1) ці падсудная справа гэтаму суду;

2) ці ёсць абставіны, якія цягнуць за сабой прыпыненне вядзення па справе;

3) ці падлягае змяненню ці адмене прымененая ў адносінах да абвінавачанага мера стрымання;

4) ці прыняты меры, якія забяспечваюць пакрыццё шкоды, прычыненай злачынствам, і магчымую канфіскацыю маёмасці;

5) ці падлягаюць задавальненню заявы і хадайніцтвы;

6) ці ёсць падставы для правядзення папярэдняга судовага пасяджэння, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 277^1 гэтага Кодэкса.

Артыкул 277^1. Падставы для правядзення папярэдняга судовага пасяджэння

1. Суддзя па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула, праводзіць папярэдняе судовае пасяджэнне ў парадку, устаноўленым артыкулам 280^2 гэтага Кодэкса.

2. Папярэдняе судовае пасяджэнне праводзіцца:

1) пры наяўнасці падстаў для вяртання крымінальнай справы пракурору ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 280^1 гэтага Кодэкса;

2) пры наяўнасці падстаў для спынення вядзення па крымінальнай справе;

3) для вырашэння пытання аб прызначэнні судовага разбору па крымінальнай справе ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве.

Артыкул 278. Накіраванне крымінальнай справы па падсуднасці

Суддзя, вырашаючы пытанне аб прызначэнні судовага разбору і выявіўшы, што крымінальная справа, якая паступіла, не падсудная гэтаму суду, накіроўвае яе сваёй

пастановай па падсуднасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі артыкулаў 267–275 гэтага Кодэкса.

Артыкул 279. Спыненне вядзення па крымінальнай справе

1. Суддзя на папярэднім судовым пасяджэнні выносіць пастанову аб спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у пунктах 3–11, 13 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, з захаваннем патрабаванняў часткі 3 артыкула 29 гэтага Кодэкса ці на падставах, прадугледжаных часткай 1 артыкула 30 гэтага Кодэкса, з захаваннем правілаў, устаноўленых часткай 4 артыкула 30 гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана часткай 5 артыкула 29 гэтага Кодэкса.

2. Прыняўшы рашэнне аб спыненні вядзення па справе, суддзя адмяняе меру стрымання і іншыя меры працэсуальнага прымусу, меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці і вырашае пытанне аб рэчыўных доказах. Копія пастановы суддзі аб спыненні вядзення па справе накіроўваецца пракурору, а таксама ўручаецца асобе, якая прыцягвалася да крымінальнай адказнасці, і пацярпеламу.

Артыкул 280. Прыпыненне вядзення па крымінальнай справе

1. Суддзя прыпыняе вядзенне па крымінальнай справе ў выпадках:

1) калі абвінавачаны ўцёк ад суда і яго месцазнаходжанне невядомае;

2) часовага псіхічнага парушэння (захворвання) ці іншага захворвання абвінавачанага, якія перашкаджаюць яго ўдзелу ў правядзенні працэсуальных дзеянняў і пасведчаныя ўрачом, які працуе ў дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

2. Аб прыпыненні вядзення па крымінальнай справе суддзя выносіць пастанову.

3. Пры прыпыненні вядзення па справе на падставе, прадугледжанай пунктам 1 часткі першай гэтага артыкула, суддзя абвяшчае вышук абвінавачанага, які ўцёк, і адначасова вырашае пытанне аб змяненні меры стрымання. Пры гэтым прысуд (пастанова) суда аб вышуку абвінавачанага накіроўваецца пракурору для арганізацыі вышуку. У выпадку, калі ў абвінавачанага, які знаходзіцца ў вышуку, застаюцца дзеці без апекі бацькоў, аб яго вышуку не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння паведамляецца кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па яго месцы жыхарства для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.

4. Вядзенне па справе аднаўляецца, калі адпалі падставы для яго прыпынення.

Артыкул 280[1]. Вяртанне крымінальнай справы пракурору

1. Крымінальная справа вяртаецца пракурору для ліквідацыі перашкод да яе разгляду судом у выпадках, калі:

1) папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе праведзена асобай пры наяўнасці падстаў, указаных у частцы 1 артыкула 77 гэтага Кодэкса, ці не вырашаны адвод, заяўлены следчаму, асобе, якая праводзіць дазнанне, пракурору;

2) у справе адсутнічаюць пастановы аб распачынанні крымінальнай справы, або вылучэнні крымінальнай справы, якая разглядаецца, у асобнае вядзенне, або аднаўленні прыпыненага папярэдняга расследавання, або прыняцці крымінальнай справы да вядзення, або прадаўжэнні тэрміну папярэдняга следства, або злучэнні крымінальных спраў, або правядзенні папярэдняга следства следчай групай, або перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд ці пастанова пракурора аб накіраванні крымінальнай справы ў суд, а таксама калі абвінавачаны ў парушэнне патрабаванняў артыкула 45 гэтага Кодэкса пры прад'яўленні абвінавачання не быў забяспечаны абаронцам;

3) у пастанове аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага не ўказаны крымінальны закон (пункт, частка, артыкул), які прадугледжвае адказнасць за злачынства, ва ўчыненні якога асоба абвінавачваецца.

2. Пракурор пасля вяртання крымінальнай справы судом прымае рашэнне ў адпаведнасці з артыкулам 264 гэтага Кодэкса.

Артыкул 280[2]. Парадак правядзення папярэдняга судовага пасяджэння

1. Папярэдняе судовае пасяджэнне праводзіць суддзя з удзелам пракурора, абвінавачанага, а таксама яго законнага прадстаўніка, абаронцы, перакладчыка, калі яны ўдзельнічаюць у вядзенні па крымінальнай справе. Калі пытанне тычыцца спынення крымінальнай справы на падставах, указаных у пункце 5 часткі 1 артыкула 29, пункце 4 часткі 1 артыкула 30 гэтага Кодэкса, на папярэдняе судовае пасяджэнне выклікаюцца пацярпелы і (ці) яго прадстаўнік.

2. У прызначаны час старшыня пасяджэння адкрывае папярэдняе судовае пасяджэнне і абвяшчае, якая крымінальная справа падлягае разгляду.

3. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) дакладае старшыні пасяджэння аб яўцы асоб, выкліканых на папярэдняе судовае пасяджэнне, і паведамляе аб прычынах няяўкі тых, хто адсутнічае. Няяўка без уважлівых прычын асоб (за выключэннем пракурора), своечасова апавешчаных аб дні правядзення папярэдняга судовага пасяджэння ў парадку, устаноўленым часткай 4 артыкула 281 гэтага Кодэкса, не перашкаджае яго правядзенню. Пры няяўцы пракурора папярэдняе судовае пасяджэнне адкладваецца.

4. Старшыня пасяджэння абвяшчае склад суда, паведамляе, хто з'яўляецца пракурорам, абаронцам, сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі) і перакладчыкам.

5. Старшыня пасяджэння засведчвае асобу абвінавачанага, высвятляе анкетныя даныя, указаныя ў частцы 1 артыкула 316 гэтага Кодэкса. Затым старшыня пасяджэння высвятляе асобу законнага прадстаўніка абвінавачанага, пацярпелага, яго прадстаўніка, калі яны ўдзельнічаюць у вядзенні па крымінальнай справе.

6. Старшыня пасяджэння растлумачвае ўдзельнікам папярэдняга судовага пасяджэння іх права заявы адводу суддзі, пракурору, сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі) і іншым удзельнікам папярэдняга судовага пасяджэння. Заяўленыя адводы суд вырашае ў парадку, прадугледжаным главой 9 гэтага Кодэкса.

7. Старшыня пасяджэння апытвае абвінавачанага, а таксама выкліканых на папярэдняе судовае пасяджэнне асоб, ці ёсць у іх хадайніцтвы. Заяўленыя хадайніцтвы суд вырашае ў парадку, прадугледжаным часткамі 2 і 4 артыкула 322 гэтага Кодэкса.

8. Разгляд крымінальнай справы пачынаецца з даклада старшыні пасяджэння, пасля чаго ён заслухоўвае, асоб якія з'явіліся на папярэдняе судовае пасяджэнне. Затым на папярэднім судовым пасяджэнні даследуюцца дакументы, якія ёсць у справе. Пасля гэтага заслухоўваецца меркаванне пракурора і абаронцы, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, аб пытаннях, якія вырашаюцца на папярэднім судовым пасяджэнні. Выслухаўшы меркаванне пракурора і абаронцы, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, старшыня пасяджэння выдаляецца ў дарадчы пакой для вынясення пастановы, якая павінна быць абвешчана на папярэднім судовым пасяджэнні.

Артыкул 280[3]. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню на папярэднім судовым пасяджэнні пры разглядзе крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве

Пры вырашэнні на папярэднім судовым пасяджэнні старшынёй пасяджэння пытання аб разглядзе крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, суд абавязаны пераканацца, што:

1) дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве было заключана добраахвотна і пры ўдзеле абаронцы, а ў выпадку, калі абвінавачаны з'яўляецца непаўналетнім, – таксама пры ўдзеле законнага прадстаўніка;

2) пракурор пацвердзіў выкананне абвінавачаным абавязкаў па аказанні садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, вышуку маёмасці, набытай злачынным шляхам, а таксама па

пакрыцці маёмаснага ўрону, выплаце даходу, атрыманага злачынным шляхам, або іншым загладжванні шкоды, прычыненай злачынствам.

Артыкул 280[4]. Віды рашэнняў, якія прымае суддзя па выніках папярэдняга судовага пасяджэння

1. Па выніках папярэдняга судовага пасяджэння суддзя прымае адно з наступных рашэнняў:

1) аб вяртанні крымінальнай справы пракурору;

2) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе;

3) аб прызначэнні судовага разбору.

2. Рашэнне суддзі прымаецца ў форме пастановы ў адпаведнасці з патрабаваннямі часткі 2 артыкула 276 гэтага Кодэкса. У пастанове аб прызначэнні судовага разбору ў агульным парадку вырашаюцца пытанні, указаныя ў артыкуле 281 гэтага Кодэкса.

Артыкул 281. Прызначэнне судовага разбору

1. Суддзя, выявіўшы, што адсутнічаюць падставы, якія перашкаджаюць разгляду крымінальнай справы ў судзе, прымае рашэнне аб прызначэнні судовага разбору.

2. У пастанове аб прызначэнні судовага разбору вырашаюцца наступныя пытанні:

1) аб месцы і часе судовага разбору;

2) аб разглядзе справы аднаасобна ці калегіяльна;

3) аб удзеле ў судовым разборы абаронцы, калі яго ўдзел абавязковы;

4) аб асобах, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне;

5) выключаны;

6) аб разглядзе справы на закрытым судовым пасяджэнні ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 287 гэтага Кодэкса.

3. Разам з пытаннямі, указанымі ў частцы другой гэтага артыкула, у пастанове павінны змяшчацца рашэнні аб прызначэнні судовага разбору, меры стрымання ў адносінах да абвінавачанага, даныя аб яго асобе і кваліфікацыя прад'яўленых яму абвінавачанняў.

4. Бакі не менш чым за пяць сутак павінны быць апавешчаны аб месцы і часе пачатку судовага разбору. Пры незахаванні гэтага тэрміну разгляд крымінальнай справы адкладваецца.

5. Выклік асобы, якая аказвае ці аказвала садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове органу, упаўнаважанаму законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці асобы, у адносінах да якой прыменены меры бяспекі, на судовае пасяджэнне праводзіцца праз орган, упаўнаважаны законам ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць, ці дзяржаўны орган, якому даручана прымяненне мер для загарантавання бяспекі.

Артыкул 282. Тэрмін пачатку судовага разбору крымінальнай справы

Судовы разбор крымінальнай справы павінен быць пачаты на судовым пасяджэнні не пазней за чатырнаццаць сутак з моманту вынясення суддзёй пастановы аб яго прызначэнні, а па справах асаблівай складанасці – не пазней за трыццаць сутак.

Артыкул 283. Падрыхтоўка судовага разбору

1. Пасля вынясення суддзёй пастановы аб прызначэнні судовага разбору сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі):

1) накіроўвае абвінавачанаму, прадстаўніку памерлага абвінавачанага і пацярпеламу з перакладам на іх родную мову ці на іншую мову, якой яны валодаюць, копію пастановы аб прызначэнні судовага разбору, а таксама копію пастановы аб меры стрымання ў адносінах да абвінавачанага, калі яна суддзёй была зменена ці адменена або прадоўжана ў выпадку знаходжання абвінавачанага пад вартай, хатнім арыштам;

2) выклікае на судовае пасяджэнне асоб, аб неабходнасці выкліку якіх суддзя зрабіў адзнаку ў пастанове аб прызначэнні судовага разбору;

3) па ўказанні суддзі прымае іншыя меры для падрыхтоўкі судовага разбору.

2. З дня вынясення пастановы аб прызначэнні судовага разбору і да ўступлення ў законную сілу прыгавору, прысуду і пастановы крымінальная справа не можа быць выпатрабавана з суда.

Артыкул 284. Меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці

У выпадку непрыняцця органам крымінальнага пераследавання мер, якія забяспечваюць пакрыццё шкоды, прычыненай злачынствам, і магчымую канфіскацыю маёмасці, суддзя абавязвае яго прыняць неабходныя меры забеспячэння.

Артыкул 285. Забеспячэнне бакам магчымасці азнаямлення з крымінальнай справай

Па хадайніцтве бакоў суддзя дае ім магчымасць азнаёміцца з крымінальнай справай, выпісваць з яе неабходныя звесткі ці капіраваць з дазволу суддзі матэрыялы справы, якія іх цікавяць.

ГЛАВА 34
АГУЛЬНЫЯ ЎМОВЫ СУДОВАГА РАЗБОРУ

Артыкул 286. Непасрэднасць, вуснасць і бесперапыннасць судовага разбору

1. У судовым разборы ўсе доказы, прад'яўленыя бакамі абвінавачання і абароны, падлягаюць непасрэднаму даследаванню. Суд павінен заслухаць паказанні абвінавачанага, пацярпелага, сведкаў, абвясціць і даследаваць заключэнні экспертаў, агледзець рэчыўныя доказы, абвясціць пратаколы і іншыя дакументы, правесці іншыя судовыя дзеянні для даследавання доказаў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Абвяшчэнне паказанняў, дадзеных пры правядзенні папярэдняга расследавання, магчымае ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

3. Пры скарочаным парадку судовага следства непасрэдна даследуюцца толькі тыя доказы, на якія пакажуць бакі.

3[1]. Допыт удзельнікаў працэсу, апазнанне асоб і (ці) аб'ектаў у ходзе судовага разбору могуць праводзіцца з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі паводле правіл гэтага Кодэкса.

4. Прыгавор суда можа быць заснаваны толькі на тых доказах, якія былі даследаваны ў судовым разборы, а пры скарочаным парадку судовага следства – і на доказах, атрыманых пры правядзенні папярэдняга расследавання і не аспрэчаных на судовым пасяджэнні бакамі.

5. Судовы разбор па кожнай крымінальнай справе вядзецца бесперапынна на працягу рабочага дня, акрамя выпадкаў абвяшчэння перапынку па хадайніцтве бакоў ці меркаванні суда.

Артыкул 287. Забеспячэнне галоснасці судовага разбору

1. Суд павінен забяспечыць адкрыты судовы разбор крымінальных спраў.

2. Закрытае судовае пасяджэнне дапускаецца па матываваным прысудзе (пастанове) суда толькі на падставах, прадугледжаных артыкулам 23 гэтага Кодэкса.

3. Суд мае права папярэдзіць асоб, якія ўдзельнічаюць у закрытым судовым пасяджэнні, аб недапушчальнасці раскрыцця без яго дазволу даных пасяджэння, аб чым у іх бярэцца падпіска з папярэджаннем аб адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 407 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У мэтах абароны звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі ці іншай тайнай, якая ахоўваецца законам, што змяшчаюцца ў матэрыялах крымінальнай справы, суд папярэджвае асоб, якія ўдзельнічаюць у закрытым судовым пасяджэнні, аб адказнасці за раскрыццё такіх звестак, аб чым у іх бярэцца падпіска.

4. Разгляд крымінальных спраў на закрытым судовым пасяджэнні ажыццяўляецца з захаваннем усіх правілаў гэтага Кодэкса. Прысуд (пастанова) суда аб разглядзе

справы на закрытым судовым пасяджэнні можа быць вынесены ў адносінах да ўсяго разбору або асобных яго частак.

5. У мэтах аховы тайны перапіскі і тэлеграфных паведамленняў асабістая перапіска і асабістыя тэлеграфныя паведамленні грамадзян могуць быць агучаны на адкрытым судовым пасяджэнні толькі са згоды асоб, паміж якімі гэта перапіска і тэлеграфныя паведамленні адбываліся. У адваротным выпадку такая перапіска і тэлеграфныя паведамленні абвяшчаюцца і даследуюцца на закрытым судовым пасяджэнні. Указаныя правілы прымяняюцца і пры даследаванні гука- і відэазапісу, які мае асабісты характар.

6. Прысутныя на адкрытым судовым пасяджэнні маюць права весці пісьмовы і магнітафонны запісы. Фота-, кіназдымка і відэазапіс дапускаюцца з дазволу старшыні на судовым пасяджэнні і са згоды бакоў.

7. Асобы, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, калі яны не з'яўляецца абвінавачанымі, пацярпелымі ці сведкамі па крымінальнай справе, не дапускаюцца ў зал судовага пасяджэння.

8. Прыгавор, прысуд (пастанова) суда абвяшчаюцца публічна. У выпадку разгляду крымінальнай справы на закрытым судовым пасяджэнні можа абвяшчацца толькі рэзалютыўная частка прыгавору, прысуду (пастановы).

Артыкул 288. Нязменнасць складу суда пры судовым разборы крымінальнай справы

1. Крымінальная справа павінна быць разгледжана адным і тым жа суддзёй ці ў адным і тым жа складзе суда.

2. У выпадку немагчымасці каго-небудзь з суддзяў працягваць удзельнічаць у судовым разборы ён замяняецца іншым суддзёй, і разбор крымінальнай справы пачынаецца спачатку, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 289 гэтага Кодэкса.

Артыкул 289. Запасны суддзя ці народны засядацель

Да калегіяльнага разгляду крымінальнай справы, якая патрабуе працяглага часу для судовага разбору, могуць прыцягвацца запасны суддзя і народны засядацель. Яны прысутнічаюць у зале судовага пасяджэння з пачатку разбору гэтай справы і ў выпадку выбыцця аднаго з суддзяў ці народных засядацеляў замяняюць яго. Пры гэтым разбор справы працягваецца.

Артыкул 290. Старшыня судовага пасяджэння

Старшыня кіруе судовым пасяджэннем, у інтарэсах правасуддзя прымае ўсе прадугледжаныя гэтым Кодэксам меры для забеспячэння роўнасці правоў бакоў, захоўваючы аб'ектыўнасць і бесстароннасць, стварае неабходныя ўмовы для ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы. Старшыня таксама забяспечвае захаванне распарадку судовага пасяджэння, растлумачвае ўдзельнікам судовага разбору іх правы і абавязкі. У выпадку пярэчанняў кагосьці з удзельнікаў супраць дзеянняў старшыні, калі гэтыя пярэчанні не будуць прыняты судом, яны заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 291. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі)

1. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) правярае яўку асоб, выкліканых на судовае пасяджэнне, па даручэнні старшыні ажыццяўляе іншыя працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

2. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) вядзе пратакол судовага пасяджэння. Ён абавязаны поўна і правільна выкладаць у пратаколе дзеянні і рашэнні суда, а таксама дзеянні ўдзельнікаў судовага разбору, якія мелі месца ў ходзе пасяджэння.

3. У выпадку рознагалосся са старшынёй наконт зместу пратакола сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) мае права прыкласці да пратакола свае заўвагі, якія разглядаюцца ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 309 і 310 гэтага Кодэкса.

4. Сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі) можа быць заяўлены адвод, які вырашаецца па правілах, устаноўленых артыкулам 83 гэтага Кодэкса. Папярэдні ўдзел у якасці сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі) не з'яўляецца падставай для адводу.

Артыкул 292. Роўнасць правоў бакоў у судовым разборы

Дзяржаўны, прыватны абвінаваўца, абвінавачаны, яго абаронца і законны прадстаўнік, прадстаўнік памерлага абвінавачанага, а таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі карыстаюцца роўнымі правамі на заяву адводаў і хадайніцтваў, падачу доказаў, удзел у іх даследаванні, выступленне ў судовых спрэчках, падачу суду пісьмовых фармулёвак аб пытаннях, указаных у пунктах 1–16 часткі 1 артыкула 352 гэтага Кодэкса, а таксама на ўдзел у разглядзе іншых пытанняў, якія ўзнікаюць пры судовым разборы крымінальнай справы.

Артыкул 293. Удзел дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым разборы

1. Па ўсіх справах публічнага і прыватна-публічнага абвінавачання, а таксама па справах прыватнага абвінавачання, распачатых пракурорам, удзел дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым разборы крымінальнай справы абавязковы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 455 гэтага Кодэкса.

2. Па складаных і шматэпізодных крымінальных справах дзяржаўнае абвінавачанне могуць падтрымліваць некалькі пракураў.

3. Пры няяўцы дзяржаўнага абвінаваўцы суд адкладвае судовы разбор. Аб няяўцы дзяржаўнага абвінаваўцы суд паведамляе вышэйстаячаму пракурору.

4. У выпадку немагчымасці ўдзелу дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым разборы крымінальнай справы дапускаецца яго замена, якая не перашкаджае далейшаму разгляду справы. Новаму дзяржаўнаму абвінаваўцу, які толькі што ўступіў у справу, павінен быць дадзены час, неабходны для падрыхтоўкі да ўдзелу ў судовым разборы.

5. Дзяржаўны абвінаваўца абвяшчае абвінавачанне, падае доказы і ўдзельнічае ў іх даследаванні, выкладае суду сваё меркаванне аб сутнасці абвінавачання, а таксама аб іншых пытаннях, якія ўзнікаюць падчас судовага разбору, выказвае суду прапановы аб прымяненні крымінальнага закона і прызначэнні абвінавачанаму пакарання, карыстаецца іншымі паўнамоцтвамі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам.

6. Дзяржаўны абвінаваўца прад'яўляе ці падтрымлівае прад'яўлены па крымінальнай справе грамадзянскі іск, калі гэтага патрабуе абарона правоў грамадзян, дзяржаўных ці грамадскіх інтарэсаў.

7. Падтрымліваючы абвінавачанне, дзяржаўны абвінаваўца кіруецца патрабаваннямі закона і сваім унутраным перакананнем, заснаваным на выніках даследавання ўсіх абставін справы. Дзяржаўны абвінаваўца можа змяніць абвінавачанне ў выпадку і парадку, прадугледжаных часткай 2 артыкула 301 гэтага Кодэкса, а таксама адмовіцца ад абвінавачання (поўнасцю ці часткова), калі прыйдзе да высновы, што яно не знайшло пацвярджэння ў судовым разборы.

8. У выпадку адмовы дзяржаўнага абвінаваўцы ад абвінавачання, калі ад абвінавачання адмовіліся таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец ці іх прадстаўнікі, суд сваім прысудам (пастановай) спыняе вядзенне па крымінальнай справе ў адпаведнасці з пунктам 2 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса. Калі пацярпелы, грамадзянскі ісцец ці

іх прадстаўнікі настойваюць на абвінавачанні, суд працягвае разбор і вырашае крымінальную справу ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам. Дзяржаўны абвінаваўца ў гэтым выпадку вызваляецца ад далейшага ўдзелу ў судовым разборы, а абвінавачанне падтрымліваюць пацярпелы, грамадзянскі ісцец ці іх прадстаўнікі. Пацярпеламу ці грамадзянскаму істцу па іх хадайніцтве суд павінен даць час для запрашэння прадстаўніка.

9. Па справах прыватнага абвінавачання ў судовым разборы абвінавачанне падтрымліваюць асобы, указаныя ў артыкуле 51 і частцы 4 артыкула 428 гэтага Кодэкса.

Артыкул 294. Удзел абвінавачанага ў судовым разборы

1. Судовы разбор крымінальнай справы судом першай інстанцыі адбываецца пры абавязковым удзеле абвінавачанага, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткамі 2 і 3 гэтага артыкула. Пры няяўцы абвінавачанага разбор справы павінен быць адкладзены. Суд мае права падвергнуць прыводу абвінавачанага, які не з'явіўся без уважлівых прычын, а таксама прымяніць ці змяніць у адносінах да яго меру стрымання.

2. Разбор крымінальнай справы пры адсутнасці абвінавачанага можа быць дапушчаны толькі ў выпадках, калі:

1) асоба, якая абвінавачваецца ва ўчыненні злачынства, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, ці менш цяжкага злачынства, прызнае сваю віну і хадайнічае аб разборы справы пры яго адсутнасці;

2) абвінавачаны знаходзіцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь і ўхіляецца ад яўкі на судовае пасяджэнне.

3. Разбор крымінальнай справы пры адсутнасці абвінавачанага адбываецца ў выпадку, калі надышла смерць абвінавачанага і прадстаўніком памерлага абвінавачанага, які ўдзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, не дадзена згода на яго спыненне на падставе, прадугледжанай пунктам 7 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса. Пры гэтым крымінальная справа разглядаецца ў парадку, устаноўленым главой 49^2 гэтага Кодэкса.

Артыкул 295. Удзел абаронцы ў судовым разборы

1. Абаронца абвінавачанага падае доказы, удзельнічае ў даследаванні доказаў, выкладае суду сваё меркаванне аб сутнасці абвінавачання і яго даказанасці, аб абставінах, якія памякчаюць адказнасць абвінавачанага ці апраўдваюць яго, аб прымяненні крымінальнага закона і прызначэнні пакарання, а таксама аб іншых пытаннях, якія ўзнікаюць у судовым разборы.

2. Пры няяўцы абаронцы разбор справы адкладваецца. Замена абаронцы праводзіцца па правілах, прадугледжаных часткай 3 артыкула 46 гэтага Кодэкса. Аб няяўцы абаронцы суд паведамляе савету тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў.

3. Замена абаронцы не перашкаджае далейшаму разгляду крымінальнай справы. Новаму дзяржаўнаму абвінаваўцу, які толькі што ўступіў у справу, павінен быць дадзены час, неабходны для падрыхтоўкі да ўдзелу ў судовым разборы.

Артыкул 296. Удзел пацярпелага ў судовым разборы

1. Судовы разбор крымінальнай справы судом першай інстанцыі адбываецца пры ўдзеле пацярпелага і (ці) яго прадстаўніка.

2. Пры няяўцы пацярпелага суд вырашае пытанне аб разборы крымінальнай справы ці адкладанні яго ў залежнасці ад таго, ці магчымыя пры адсутнасці пацярпелага поўнае высвятленне ўсіх абставін справы і абарона яго правоў і законных інтарэсаў. Калі на судовае пасяджэнне прыбыў прадстаўнік пацярпелага, суд вырашае гэта пытанне з улікам меркавання прадстаўніка.

3. Па хадайніцтве пацярпелага суд можа вызваліць яго ад прысутнасці на судовым пасяджэнні, абавязаўшы прыбыць у пэўны час для дачы паказанняў.

4. Па справах прыватнага абвінавачання няяўка без уважлівых прычын прыватнага абвінаваўцы на судовае пасяджэнне суда першай інстанцыі цягне за сабой спыненне вядзення па крымінальнай справе.

Артыкул 297. Удзел грамадзянскага істца і грамадзянскага адказчыка ў судовым разборы

1. У судовым разборы ўдзельнічаюць грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і прадстаўнікі.

2. Пры няяўцы без уважлівых прычын грамадзянскага істца ці яго прадстаўніка на судовае пасяджэнне суда першай інстанцыі грамадзянскі іск можа быць пакінуты без разгляду. За грамадзянскім істцом захоўваецца права прад'явіць іск у парадку грамадзянскага судаводства.

3. Суд мае права па хадайніцтве грамадзянскага істца ці яго прадстаўніка разгледзець грамадзянскі іск пры яго адсутнасці.

4. Суд разглядае грамадзянскі іск незалежна ад яўкі грамадзянскага істца ці яго прадстаўніка, калі прызнае гэта неабходным ці калі іск падтрымлівае пракурор.

5. Няяўка грамадзянскага адказчыка ці яго прадстаўніка не з'яўляецца перашкодай для разгляду грамадзянскага іску.

Артыкул 298. Удзел эксперта ў судовым разборы

1. Разбор крымінальнай справы на пасяджэнні суда першай інстанцыі адбываецца пры ўдзеле эксперта ў выпадках і парадку, прадугледжаных главой 26 гэтага Кодэкса.

2. Пры няяўцы эксперта і немагчымасці яго замены разбор крымінальнай справы адкладваецца.

Артыкул 299. Удзел спецыяліста ў судовым разборы

1. Разбор крымінальнай справы на пасяджэнні суда першай інстанцыі адбываецца пры ўдзеле спецыяліста ў выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 200 гэтага Кодэкса.

2. Пры няяўцы спецыяліста і немагчымасці яго замены разбор крымінальнай справы адкладваецца.

Артыкул 300. Удзел перакладчыка ў судовым разборы

1. Разбор крымінальнай справы на пасяджэнні суда першай інстанцыі адбываецца пры ўдзеле перакладчыка ў выпадках і парадку, прадугледжаных артыкуламі 21 і 201 гэтага Кодэкса.

2. Пры няяўцы перакладчыка і немагчымасці яго замены разбор крымінальнай справы адкладваецца.

Артыкул 301. Межы судовага разбору

1. Судовы разбор крымінальнай справы праводзіцца толькі ў адносінах да абвінавачанага і толькі па тым абвінавачанні, якое яму прад'яўлена ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам парадку.

2. Калі ў ходзе судовага следства ўзнікне неабходнасць у змяненні абвінавачання на больш цяжкае або ў прад'яўленні новага абвінавачання, якое пагаршае становішча абвінавачанага ці істотна адрозніваецца па сваім змесце ад раней прад'яўленага абвінавачання, суд па хадайніцтве дзяржаўнага абвінаваўцы абвяшчае перапынак на тэрмін да дзесяці сутак для складання ім новай пастановы аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага ў адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 241 гэтага Кодэкса. Пры працягу судовага разбору дзяржаўны абвінаваўца абвяшчае абвінавачанаму, яго

законнаму прадстаўніку, абаронцу, калі ён удзельнічае ў судовым пасяджэнні, дадзеную пастанову і дапытвае яго па новым абвінавачанні. Пасля допыту абвінавачанага дзяржаўным абвінаваўцам допыт абвінавачанага па новым абвінавачанні праводзяць іншыя ўдзельнікі судовага разбору. Копію гэтай пастановы суд уручае абвінавачанаму, законнаму прадстаўніку і абаронцу і дае ім час, неабходны для падрыхтоўкі да абароны. Калі пастанова аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага змяшчае звесткі, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, суд, не ўручаючы копію гэтай пастановы, абавязаны азнаёміць з ёй абвінавачанага, яго законнага прадстаўніка і абаронцу з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах і даць ім час, неабходны для падрыхтоўкі да абароны.

3. У выпадку прад'яўлення дзяржаўным абвінаваўцам на судовым пасяджэнні больш цяжкага абвінавачання, якое цягне за сабой змяненне падсуднасці, суд прымае рашэнне ў адпаведнасці з правіламі артыкула 278 гэтага Кодэкса.

3[1]. У выпадку злучэння судом крымінальных спраў па абвінавачанні адной і той жа асобы ва ўчыненні некалькіх злачынстваў дзяржаўны абвінаваўца пры прад'яўленні абвінавачання ў парадку, прадугледжаным часткай 2 гэтага артыкула, абавязаны скласці новую пастанову аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачанага з апісаннем усіх злачынстваў, якія інкрымінуюцца абвінавачанаму.

4. Дзяржаўны абвінаваўца мае права выключыць з абвінавачання асобныя пункты, а таксама кваліфікаваць дзеянні абвінавачанага па артыкуле Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае адказнасць за менш цяжкае злачынства, чым тое, ва ўчыненні якога асобе было прад'яўлена абвінавачанне. У гэтых выпадках складання новай пастановы аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага не патрабуецца, а пазіцыя дзяржаўнага абвінаваўцы заносіцца ў пратакол судовага пасяджэння.

5. Суд мае права змяніць кваліфікацыю злачынства незалежна ад пазіцыі дзяржаўнага абвінаваўцы, калі гэта не пагаршае становішча абвінавачанага і не парушае яго права на абарону.

Артыкул 302. Адкладанне судовага разбору і прыпыненне вядзення па крымінальнай справе

1. Пры немагчымасці разбору крымінальнай справы з прычыны няяўкі на судовае пасяджэнне каго-небудзь з выкліканых асоб суд сваім прысудам (пастановай) адкладвае разбор крымінальнай справы. Адначасова прымаюцца меры для выкліку ці прыводзе асоб, якія не з'явіліся. Пры гэтым дзяржаўны абвінаваўца прымае меры для забеспячэння ўдзелу ў судовым разборы пацярпелых, якія не з'явіліся, а таксама сведак абвінавачання.

2. Калі абвінавачаны ўцёк, а таксама ў выпадку часовага псіхічнага расстройства (захворвання) ці іншага захворвання абвінавачанага, якое выключае магчымасць яго яўкі на судовае пасяджэнне, суд прыпыняе вядзенне ў адносінах да гэтага абвінавачанага да яго вышуку ці папраўкі і працягвае разбор у адносінах да астатніх абвінавачаных. Вышук абвінавачанага, які скрываецца, абвяшчаецца прысудам (пастановай) суда з адначасовым рашэннем пытання аб змяненні раней прымененай у адносінах да яго меры стрымання. Пры гэтым прысуд (пастанова) суда аб вышуку абвінавачанага накіроўваецца пракурору для арганізацыі вышуку. У выпадку, калі ў абвінавачанага, які знаходзіцца ў вышуку, застаюцца дзеці без апекі бацькоў, аб яго вышуку не пазней наступнага дня пасля прыняцця рашэння паведамляецца кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па яго месцы жыхарства для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.

3. Пры прыпыненні вядзення па крымінальнай справе ў выпадку часовага псіхічнага расстройства (захворвання) ці іншага захворвання абвінавачанага суд павінен вырашыць пытанне аб адмене ці змяненні прымененай у адносінах да яго меры стрымання.

4. Пры неабходнасці правядзення экспертызы суд можа адкласці судовы разбор па крымінальнай справе на тэрмін яе правядзення.

5. Калі ў ходзе судовага разбору крымінальнай справы высветліцца, што прад'яўленых доказаў недастаткова для пастановы прыгавору, суд толькі па хадайніцтве бакоў прыпыняе вядзенне па справе на тэрмін да аднаго месяца і прапаноўвае дзяржаўнаму абвінаваўцу арганізаваць правядзенне дадаткова следчых і іншых працэсуальных дзеянняў у парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, для атрымання новых доказаў, якія пацвярджаюць або абвяргаюць прад'яўленае абвінавачанне. Па хадайніцтве дзяржаўнага абвінаваўцы ўказаны тэрмін можа быць прадоўжаны судом да двух месяцаў. З пададзенымі дзяржаўным абвінаваўцам дадатковымі матэрыяламі суд знаёміць абвінавачанага, яго абаронцу, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўнікоў, пасля чаго яны даследуюцца на судовым пасяджэнні ў звычайным парадку. Пры непадачы дзяржаўным абвінаваўцам дадатковых матэрыялаў суд прымае рашэнне на падставе даследаваных на судовым пасяджэнні доказаў.

6. Адкладзены судовы разбор крымінальнай справы ці прыпыненае вядзенне па справе аднаўляюцца, калі адпалі падставы, на якіх вядзенне па справе была адкладзена ці прыпынена.

Артыкул 303. Спыненне вядзення па крымінальнай справе на судовым пасяджэнні

1. Вядзенне па крымінальнай справе падлягае спыненню на судовым пасяджэнні:

1) калі будуць выяўлены абставіны, указаныя ў пунктах 3–11, 13 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана часткай 5 артыкула 29 гэтага Кодэкса;

2) пры адмове дзяржаўнага абвінаваўцы ад абвінавачання, калі ад абвінавачання адмовіліся таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец ці іх прадстаўнікі.

2. Суд мае права вызваліць абвінавачанага ад крымінальнай адказнасці і спыніць вядзенне па крымінальнай справе ў адпаведнасці з часткай 1 артыкула 30 гэтага Кодэкса адпаведна на падставах, прадугледжаных артыкуламі 20, 86, 87, 88, 89 і 118 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Пастанова суда аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці і спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставах, прадугледжаных артыкулам 88 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прымаецца пасля ўнясення абвінавачаным на дэпазітны рахунак суда крымінальна-прававой кампенсацыі.

3. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе адмяняюцца прымененыя меры стрымання і іншыя меры працэсуальнага прымусу, а таксама меры забеспячэння грамадзянскага іску і канфіскацыі маёмасці, вырашаецца пытанне аб рэчыўных доказах і растлумачваецца права на пакрыццё прычыненай шкоды. Копія прысуду (пастановы) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе накіроўваецца асобе, якая прыцягвалася ў якасці абвінавачанага, пацярпелага ці іх законным прадстаўнікам. У выпадку спынення вядзення па крымінальнай справе на судовым пасяджэнні на падставах, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 часткі 1 артыкула 29, пунктам 5 часткі 1 артыкула 30 гэтага Кодэкса, у адносінах да асобы па факце ўчынення ёй у перыяд праходжання дзяржаўнай, ваеннай службы ці службы ў ваенізаванай арганізацыі цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства супраць інтарэсаў службы або цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, звязанага з выкарыстаннем службовай асобай сваіх службовых паўнамоцтваў, копія прысуду (пастановы) аб спыненні вядзення на крымінальнай справе накіроўваецца ў орган, які ажыццяўляе прызначэнне і пераразлік пенсій па месцы жыхарства гэтай асобы.

4. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставе, прадугледжанай пунктам 2 часткі 1 гэтага артыкула, або пры спыненні на гэтай жа падставе вядзення па крымінальнай справе па асобных пунктах абвінавачання ці ў адносінах да аднаго з

некалькіх абвінавачаных, калі асоба, якая ўчыніла злачынства, застаецца нявыяўленай, суд па хадайніцтве дзяржаўнага абвінаваўцы выносіць пастанову (прысуд) аб перадачы крымінальнай справы пракурору для арганізацыі правядзення дадатковага папярэдняга расследавання і выяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага, ці аб вылучэнні крымінальнай справы ў асобнае вядзенне і перадачы вылучанай справы разам з далучанымі да крымінальнай справы рэчыўнымі доказамі пракурору для арганізацыі правядзення папярэдняга расследавання і выяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага.

Артыкул 303[1]. Вяртанне крымінальнай справы пракурору на судовым пасяджэнні

Крымінальная справа вяртаецца пракурору пры выяўленні на судовым пасяджэнні падстаў, прадугледжаных артыкулам 280[1] гэтага Кодэкса.

Артыкул 304. Рашэнне пытання аб меры стрымання і іншай меры працэсуальнага прымусу

1. У ходзе судовага разбору суд мае права прымяніць, змяніць ці адмяніць меру стрымання і іншую меру працэсуальнага прымусу ў адносінах да абвінавачанага.

2. Выключана.

3. Пасля сканчэння ўказанага ў частцы трынаццатай артыкула 127 гэтага Кодэкса тэрміну ўтрымання пад вартай суд павінен змяніць абвінавачанаму меру стрымання.

Артыкул 305. Парадак вынясення прысудаў, пастаноў на судовым пасяджэнні

1. Аб усіх пытаннях, якія суд вырашае падчас судовага разбору, ён выносіць прысуды (пастановы), якія падлягаюць абвяшчэнню на судовым пасяджэнні.

2. Прысуды (пастановы) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, аб прымяненні, змяненні ці адмене меры стрымання і іншых мер працэсуальнага прымусу, аб адводах, аб прызначэнні экспертызы, а таксама прыватныя прысуды выносяцца ў дарадчым пакоі і выкладаюцца ў выглядзе асобных дакументаў.

3. Усе іншыя прысуды (пастановы) па меркаванні суда выносяцца або ва ўказаным у частцы другой гэтага артыкула парадку, або на месцы ў зале судовага пасяджэння з занясеннем прысуду (пастановы) у пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 306. Распарадак судовага пасяджэння

1. Судовы разбор адбываецца ва ўмовах, якія забяспечваюць работу суда і бяспеку ўдзельнікаў крымінальнага працэсу.

2. Пры ўваходзе суддзі ў зал судовага пасяджэння сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) абвяшчае: «Прашу ўстаць. Суд ідзе». Усе прысутныя ў зале судовага пасяджэння ўстаюць, пасля чаго па запрашэнні старшыні пасяджэння займаюць свае месцы.

3. Усе ўдзельнікі судовага разбору звяртаюцца да суда са словамі «Высокі суд», даюць паказанні і робяць заявы стоячы. Адступленне ад гэтага правіла можа быць дапушчана з дазволу старшыні.

4. Усе ўдзельнікі судовага разбору, а таксама ўсе прысутныя ў зале судовага пасяджэння грамадзяне павінны падпарадкоўвацца распараджэнням старшыні аб захаванні парадку на судовым пасяджэнні. Асобы, якія знаходзяцца ў стане ап'янення, у зал судовага пасяджэння не дапускаюцца.

5. Асобы, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, у зал судовага пасяджэння не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі яны выкліканы судом.

Артыкул 307. Меры ўздзеяння за парушэнне парадку на судовым пасяджэнні

1. Пры парушэнні парадку на судовым пасяджэнні, непадпарадкаванні законным распараджэнням старшыні ўдзельнік судовага разбору папярэджваецца, што паўторнае

парушэнне парадку пацягне за сабой накладанне адміністрацыйнага спагнання і выдаленне яго з залы судовага пасяджэння. Выдаленне можа быць праведзена ў адносінах да любога ўдзельніка судовага разбору, акрамя дзяржаўнага і прыватнага абвінаваўцаў і абаронцы.

2. Калі з залы судовага пасяджэння быў выдалены абвінавачаны, то прыгавор павінен быць абвешчаны ў яго прысутнасці ці аб'яўлены яму пад распіску неадкладна пасля абвяшчэння.

3. Аб выдаленні з залы судовага пасяджэння ўдзельніка судовага разбору суд выносіць прысуд (пастанову).

4. Пры непадпарадкаванні дзяржаўнага абвінаваўцы ці абаронцы законным распараджэнням старшыні суд паведамляе аб гэтым адпаведна вышэйстаячаму пракурору, савету тэрытарыяльнай калегіі адвакатаў, кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў.

5. Іншыя ўдзельнікі судовага разбору, а таксама асобы, якія прысутнічаюць у зале судовага пасяджэння, але не з'яўляюцца ўдзельнікамі судовага разбору, у выпадку парушэння імі парадку на судовым пасяджэнні па распараджэнні старшыні выдаляюцца з залы судовага пасяджэння.

6. Калі ў дзеяннях парушальніка парадку на судовым пасяджэнні ёсць прыкметы злачынства, суд накіроўвае матэрыялы для распачынання супраць яго ў адпаведным парадку крымінальнай справы.

Артыкул 308. Пратакол судовага пасяджэння

1. На судовым пасяджэнні вядзецца пратакол.

2. Пратакол можа быць напісаны ад рукі ці падрыхтаваны з дапамогай тэхнічных сродкаў.

3. У пратаколе судовага пасяджэння абавязкова ўказваюцца месца і дата пасяджэння, час яго пачатку і заканчэння; якая крымінальная справа разглядаецца; назва і склад суда, сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі), перакладчык, дзяржаўны і прыватны абвінаваўцы, абаронца, абвінавачаны, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, прадстаўнікі, іншыя выкліканыя судом асобы; даныя аб асобе абвінавачанага і прымененая ў адносінах да яго мера стрымання; дзеянні суда ў тым парадку, у якім яны мелі месца; заявы, пярэчанні і хадайніцтвы ўдзельнікаў судовага разбору; прысуды (пастановы) суда, вынесеныя без выдалення ў дарадчы пакой; указанні на вынясенне прысудаў (пастаноў) у дарадчым пакоі; тлумачэнне ўдзельнікам судовага разбору іх правоў і абавязкаў; падрабязны змест паказанняў; пытанні, зададзеныя эксперту, і яго адказы; вынікі праведзеных на судовым пасяджэнні аглядаў і іншых дзеянняў па даследаванні доказаў; факты, якія асобы, што ўдзельнічаюць у судовым разборы, прасілі засведчыць у пратаколе; асноўны змест выступленняў бакоў у судовых спрэчках і апошняга слова абвінавачанага; указанне аб абвяшчэнні прыгавору і растлумачэнні парадку і тэрміну яго абскарджання; указанне аб растлумачэнні парадку і тэрміну азнаямлення з пратаколам судовага пасяджэння і падачы на яго заўваг. Акрамя таго, у пратаколе ўказваюцца факты, якія сведчаць аб парушэнні парадку на судовым пасяджэнні, калі яны мелі месца, асоба парушальніка, а таксама меры ўздзеяння, прынятыя судом у адносінах да парушальніка.

4. Для забеспячэння паўнаты пратакола могуць прымяняцца стэнаграфаванне, гука- ці відэазапіс. У гэтым выпадку стэнаграма, фанаграма ці відэазапіс дадаюцца да пратакола судовага пасяджэння, у якім робіцца адпаведны запіс.

5. Да пратакола судовага пасяджэння могуць дадавацца ў пісьмовай форме прамовы ўдзельнікаў судовых спрэчак, а таксама прапанаваныя імі фармулёўкі рашэнняў аб пытаннях, указаных у пунктах 1–16 артыкула 352 гэтага Кодэкса, па іх хадайніцтвах.

6. Пратакол павінен быць падрыхтаваны і падпісаны старшынёй і сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі) не пазней за дзесяць сутак пасля заканчэння судовага разбору. У ходзе судовага пасяджэння пратакол можа быць падрыхтаваны па частках, якія, як і пратакол у цэлым, падпісваюцца старшынёй і сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі).

7. Старшыня абавязаны забяспечыць бакам магчымасць азнаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння ў поўным аб'ёме ці з яго часткамі па меры іх падрыхтоўкі. Хадайніцтва аб азнаямленні з пратаколам судовага пасяджэння можа быць заяўлена на працягу дзесяці сутак з дня абвяшчэння прыгавору ці іншага выніковага рашэння суда першай інстанцыі.

8. Бакі, а таксама асоба, дапытаная на судовым пасяджэнні, маюць права хадайнічаць аб азнаямленні з запісам у пратаколе іх паказанняў. Такая магчымасць павінна быць дадзена не пазней за наступны дзень пасля заявы хадайніцтва.

Артыкул 309. Заўвагі па пратаколе судовага пасяджэння

1. На працягу пяці сутак пасля азнаямлення з пратаколам судовага пасяджэння бакі маюць права падаць заўвагі па пратаколе. Указаны тэрмін па хадайніцтве бакоў можа быць прадоўжаны да дзесяці сутак старшынёй на судовым пасяджэнні.

2. Няяўка бакоў без уважлівых прычын для азнаямлення з пратаколам судовага пасяджэння не прызнаецца парушэннем крымінальна-працэсуальнага закона, якое цягне за сабой адмену судовага рашэння па крымінальнай справе.

Артыкул 310. Разгляд заўваг па пратаколе судовага пасяджэння

1. Заўвагі аб пратаколе судовага пасяджэння разглядае ў тэрмін не большы за дзесяць сутак з дня іх паступлення ў суд старшыня, які ў неабходных выпадках мае права выклікаць асоб, якія іх падалі.

2. Па выніках разгляду заўваг старшыня выносіць матываваную пастанову аб засведчанні іх правільнасці або аб іх адхіленні. Заўвагі аб пратаколе і пастанове далучаюцца да пратакола судовага пасяджэння.

3. У выпадку вызвалення старшыні ад пасады ці яго смерці, а таксама ў іншых выпадках, якія выключаюць магчымасць разгляду ім заўваг, яны далучаюцца да пратакола судовага пасяджэння.

ГЛАВА 35
ПАДРЫХТОЎЧАЯ ЧАСТКА СУДОВАГА ПАСЯДЖЭННЯ

Артыкул 311. Адкрыццё судовага пасяджэння

У прызначаны час старшыня адкрывае судовае пасяджэнне і абвяшчае, якая крымінальная справа падлягае разбору.

Артыкул 312. Праверка яўкі на судовае пасяджэнне

Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) дакладвае старшыні аб яўцы ў суд бакоў і іншых асоб, выкліканых на судовае пасяджэнне, і паведамляе аб прычынах няяўкі тых, хто адсутнічае.

Артыкул 313. Растлумачэнне перакладчыку яго правоў і абавязкаў

Старшыня пасяджэння растлумачвае перакладчыку яго абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 63 гэтага Кодэкса, і папярэджвае аб крымінальнай адказнасці за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, а таксама за заведама няправільны пераклад, аб чым у перакладчыка бярэцца падпіска, якая далучаецца да пратакола судовага пасяджэння. Перакладчык таксама папярэджваецца аб іншай устаноўленай заканадаўчымі актамі адказнасці.

Артыкул 314. Выдаленне сведак з залы судовага пасяджэння

Сведкі, якія з'явіліся, да пачатку іх допыту выдаляюцца з залы судовага пасяджэння. Старшыня прымае меры да таго, каб не дапытаныя судом сведкі не размаўлялі з дапытанымі сведкамі, а таксама з іншымі асобамі, якія знаходзяцца ў зале судовага пасяджэння.

Артыкул 315. Абвяшчэнне складу суда і іншых удзельнікаў судовага пасяджэння

1. Старшыня пасяджэння абвяшчае склад суда, паведамляе, хто з'яўляецца дзяржаўным і прыватным абвінаваўцамі, абаронцам, пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам, прадстаўнікамі, а таксама сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі), экспертам, спецыялістам і перакладчыкам.

2. Калі на судовым пасяджэнні прысутнічаюць запасны суддзя ці народны засядацель, старшыня пасяджэння абвяшчае гэта.

Артыкул 316. Высвятленне асобы абвінавачанага і своечасовасці ўручэння яму копій працэсуальных дакументаў

1. Старшыня пасяджэння высвятляе асобу абвінавачанага, яго прозвішча, імя, імя па бацьку, дату і месца нараджэння, грамадзянства, ступень валодання мовай, на якой вядзецца судаводства, месца жыхарства, занятак, адукацыю, сямейнае становішча і іншыя даныя, якія датычацца яго асобы.

2. Старшыня пасяджэння высвятляе, ці ўручаны абвінавачанаму і калі менавіта копіі пастаноў аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, аб змяненні абвінавачання, калі яно мела месца, аб прызначэнні судовага разбору. Пры гэтым судовы разбор справы не можа быць пачаты раней за пяць сутак з дня ўручэння копій указаных дакументаў.

Артыкул 317. Растлумачэнне абвінавачанаму яго правоў і абавязкаў

Старшыня пасяджэння растлумачвае абвінавачанаму яго правы і абавязкі ў судовым разборы, прадугледжаныя артыкулам 43 гэтага Кодэкса.

Артыкул 318. Растлумачэнне пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам іх правоў і абавязкаў

Старшыня пасяджэння растлумачвае пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам іх правы і абавязкі ў судовым разборы, прадугледжаныя адпаведна артыкуламі 50, 53, 55, 57 і 59 гэтага Кодэкса. Пацярпеламу па справе прыватнага абвінавачання растлумачваецца яго права на прымірэнне з абвінавачаным.

Артыкул 319. Растлумачэнне эксперту яго правоў і абавязкаў

Старшыня пасяджэння растлумачвае эксперту яго правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 61 гэтага Кодэкса, і папярэджвае аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння ці адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, аб чым у эксперта бярэцца падпіска, якая далучаецца да пратакола судовага пасяджэння. Эксперт таксама папярэджваецца аб іншай устаноўленай заканадаўчымі актамі адказнасці.

Артыкул 320. Растлумачэнне спецыялісту яго правоў і абавязкаў

Старшыня пасяджэння растлумачвае спецыялісту яго правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 62 гэтага Кодэкса, і папярэджвае аб устаноўленай заканадаўчымі актамі адказнасці за адмову ці ўхіленне ад выканання сваіх абавязкаў.

Артыкул 321. Растлумачэнне права адводу і вырашэнне заяўленых адводаў

1. Старшыня пасяджэння растлумачвае бакам іх права заявы адводу складу суда, камусьці з суддзяў і іншым удзельнікам судовага разбору ў адпаведнасці з правіламі

главы 9 гэтага Кодэкса. Калі на судовым пасяджэнні прысутнічаюць запасны суддзя ці народны засядацель, ім таксама можа быць заяўлены адвод.

2. Заяўленыя адводы суд вырашае ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 79–87 гэтага Кодэкса.

Артыкул 322. Заява і вырашэнне хадайніцтваў

1. Старшыня пасяджэння апытвае бакі, ці ёсць у іх хадайніцтвы аб выкліку новых сведкаў, экспертаў і спецыялістаў і аб выпатрабаванні рэчыўных доказаў і дакументаў, а таксама іншыя хадайніцтвы. Асоба, якая заявіла хадайніцтва, абавязана ўказаць, для выяўлення якіх менавіта абставін неабходныя дадатковыя доказы.

2. Суд, выслухаўшы меркаванні астатніх удзельнікаў судовага разбору, павінен разгледзець кожнае заяўленае хадайніцтва, задаволіць яго, калі абставіны, якія падлягаюць высвятленню, маюць значэнне для крымінальнай справы, ці вынесці матываваны прысуд (пастанову) аб поўнай ці частковай адмове ў задавальненні хадайніцтва.

3. Суд не мае права адмовіць у задавальненні хадайніцтва аб допыце на судовым пасяджэнні ў якасці сведак асоб, якія з'явіліся ў суд па ініцыятыве бакоў.

4. Асоба, якой судом адмоўлена ў задавальненні хадайніцтва, мае права заявіць яго ў далейшым.

Артыкул 323. Вырашэнне пытання аб магчымасці разгляду крымінальнай справы ў адсутнасці кагосьці з удзельнікаў крымінальнага працэсу

Пры няяўцы кагосьці з удзельнікаў крымінальнага працэсу суд выслухоўвае меркаванні бакоў аб магчымасці разбору крымінальнай справы і выносіць прысуд (пастанову) аб адкладанні разбору ці аб яго працягу і аб выкліку на наступнае судовае пасяджэнне асоб, якія не з’явіліся, ці аб іх прыводзе.

ГЛАВА 36
СУДОВАЕ СЛЕДСТВА

Артыкул 324. Пачатак судовага следства

1. Судовае следства пачынаецца з абвяшчэння дзяржаўным абвінаваўцам прад'яўленага асобе абвінавачання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 455 гэтага Кодэкса, а па справах прыватнага абвінавачання – з выкладання заявы прыватным абвінаваўцам ці яго прадстаўніком.

2. Старшыня пасяджэння апытвае абвінавачанага, ці зразумелае яму абвінавачанне, растлумачвае сутнасць абвінавачання і высвятляе яго стаўленне да прад'яўленага абвінавачання.

Артыкул 325. Парадак падачы і даследавання доказаў

1. Першым падае доказы бок абвінавачання. Дзяржаўны абвінаваўца, а па справах прыватнага абвінавачання прыватны абвінаваўца ці яго прадстаўнік выкладаюць суду доказы, якія, па іх меркаванні, пацвярджаюць вінаватасць асобы ў здзейсненым злачынстве.

2. Парадак даследавання доказаў вызначае суд пасля ўзгаднення з бакамі. Аб пытаннях устанаўлення або змянення парадку даследавання доказаў суд выносіць прысуд (пастанову).

3. Абвінавачаны з дазволу старшыні пасяджэння мае права даваць паказанні ў любы момант судовага следства.

Артыкул 326. Скарочаны парадак судовага следства

1. У выпадку прызнання абвінавачаным сваёй віны і калі зробленае прызнанне не аспрэчваецца якімсьці з бакоў і не выклікае ў суда сумненняў, суд са згоды бакоў пасля допыту абвінавачанага і высвятлення ў яго, ці не з'яўляецца яго прызнанне вымушаным, мае права абмежавацца даследаваннем толькі тых доказаў, на якія пакажуць бакі, або абвясціць судовае следства закончаным і перайсці да судовых спрэчак. Пры гэтым суд павінен растлумачыць бакам, што адмова ад даследавання

доказаў цягне за сабой недапушчальнасць абскарджання ці апратэставання прыгавору на гэтай падставе.

2. Правілы, выкладзеныя ў частцы першай гэтага артыкула, не прымяняюцца па крымінальных справах аб злачынствах непаўналетніх, а таксама аб злачынствах, за ўчыненне якіх па законе могуць быць прызначаны пазбаўленне волі на тэрмін, большы за дзесяць год, ці пакаранне смерцю, і ў выпадках, калі хаця б адзін з абвінавачаных не прызнае сваю віну і справу ў адносінах да яго немагчыма вылучыць у асобнае вядзенне.

Артыкул 327. Допыт абвінавачанага

1. Перад допытам абвінавачанага старшыня пасяджэння растлумачвае яго права даваць паказанні наконт прад'яўленага абвінавачання і іншых абставін крымінальнай справы і звяртае яго ўвагу на тое, што ўсё ім сказанае можа быць выкарыстана супраць яго. Пры згодзе абвінавачанага даць паказанні першым яго дапытвае бок абвінавачання, а затым бок абароны. Старшыня пасяджэння адхіляе навадныя пытанні і пытанні, якія не маюць адносін да справы.

2. Суд задае пытанні абвінавачанаму пасля допыту яго бакамі, аднак удакладняльныя пытанні суд можа задаць пры допыце абвінавачанага любым з бакоў.

3. Допыт аднаго абвінавачанага пры адсутнасці іншага дапускаецца па хадайніцтве бакоў ці ініцыятыве суда, аб чым выносіцца прысуд (пастанова). У гэтым выпадку пасля вяртання выдаленага абвінавачанага ў залу судовага пасяджэння старшыня паведамляе яму змест паказанняў, дадзеных пры яго адсутнасці, і дае яму магчымасць задаваць пытанні абвінавачанаму, дапытанаму пры яго адсутнасці.

Артыкул 328. Абвяшчэнне паказанняў абвінавачанага

1. Абвяшчэнне паказанняў абвінавачанага, дадзеных пры дасудовым вядзенні, а таксама ўзнаўленне гуказапісу яго паказанняў, відэазапісу ці кіназдымкі допыту праводзяцца па меркаванні суда ці па хадайніцтве бакоў у наступных выпадках:

1) пры наяўнасці істотных супярэчнасцей паміж гэтымі паказаннямі і паказаннямі, дадзенымі на судовым пасяджэнні;

2) пры адмове абвінавачанага ад дачы паказанняў на судовым пасяджэнні;

3) калі справа разглядаецца пры адсутнасці абвінавачанага.

2. Правілы, прадугледжаныя часткай першай гэтага артыкула, распаўсюджваюцца таксама на выпадкі абвяшчэння паказанняў абвінавачанага, дадзеных раней у ходзе судовага разбору.

3. Не дапускаецца ўзнаўленне гука-, відэазапісу і кіназдымкі без папярэдняга абвяшчэння паказанняў, якія змяшчаюцца ў адпаведным пратаколе допыту ці пратаколе судовага пасяджэння.

Артыкул 329. Допыт пацярпелага

1. Пацярпелы дапытваецца ў адпаведнасці з правіламі допыту сведак, прадугледжанымі артыкулам 330 гэтага Кодэкса.

2. Пацярпелы з дазволу старшыні пасяджэння можа даваць паказанні ў любы момант судовага следства.

Артыкул 330. Допыт сведкі

1. Сведка дапытваецца пры адсутнасці іншага недапытанага сведкі.

2. Пры допыце старшыня пасяджэння высвятляе асобу сведкі, высвятляе яго адносіны да абвінавачанага і пацярпелага, растлумачвае грамадзянскі доўг і абавязак даваць праўдзівыя паказанні аб крымінальнай справе, а таксама адказнасць за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў. Сведку растлумачваецца таксама, што ён мае права адмовіцца ад дачы паказанняў у адносінах да яго самога, членаў яго сям'і ці блізкіх сваякоў. Асобам, вызваленым па законе ад абавязку даваць паказанні, але якія пажадалі іх даць, растлумачваецца адказнасць за дачу заведама лжывых паказанняў. У сведкі бярэцца падпіска аб тым, што яму растлумачаны яго абавязкі і адказнасць. Падпіска далучаецца да пратакола судовага пасяджэння.

3. Першымі дапытваюцца сведкі абвінавачання, а затым сведкі абароны. Пры гэтым першым задае пытанні той бок, па хадайніцтве якога гэты сведка выкліканы на судовае пасяджэнне. Суддзі задаюць пытанні сведку пасля допыту яго бакамі, аднак удакладняльныя пытанні яны могуць задаць у любы момант яго допыту.

4. Дапытаныя сведкі застаюцца ў зале судовага пасяджэння і не могуць яго пакінуць да заканчэння судовага следства без дазволу суда і згоды бакоў.

5. У выпадку, прадугледжаным артыкулам 193 гэтага Кодэкса, у мэтах загарантавання бяспекі сведкі, членаў яго сям'і, блізкіх сваякоў і іншых асоб, якіх ён лічыць сваімі блізкімі, без абвяшчэння сапраўдных даных аб асобе сведкі суд мае права правесці яго допыт па-за візуальным наглядам асоб, якія прысутнічаюць у зале судовага пасяджэння, аб чым судом выносіцца прысуд (пастанова).

Артыкул 331. Выкарыстанне абвінавачаным, пацярпелым і сведкам пісьмовых нататак і дакументаў

1. Абвінавачаны, пацярпелы і сведка могуць карыстацца пісьмовымі нататкамі. Гэтыя нататкі павінны быць прад'яўлены суду па яго патрабаванні.

2. Абвінавачанаму, пацярпеламу і сведку дазваляецца прачытанне дакументаў, якія ёсць у іх і датычацца іх паказанняў. Гэтыя дакументы прад'яўляюцца суду і па яго прысудзе (пастанове) могуць быць далучаны да крымінальнай справы.

Артыкул 332. Асаблівасці допыту непаўналетніх пацярпелых і сведак

1. Пры допыце пацярпелых і сведак ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, а па меркаванні суда і пры допыце гэтых асоб ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў удзельнічаюць педагог ці псіхолаг, а таксама могуць удзельнічаць бацькі ці іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетняга. Указаныя асобы з дазволу старшыні пасяджэння могуць задаваць пытанні пацярпеламу і сведку.

2. Перад допытам пацярпелага і сведкі, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, старшыня пасяджэння растлумачвае ім правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 50 і 60 гэтага Кодэкса. Аб адказнасці за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў і за дачу заведама лжывых паказанняў гэтыя асобы не папярэджваюцца і падпіска ў іх не бярэцца.

3. Па хадайніцтве бакоў ці па ініцыятыве суда допыт пацярпелага і сведкі, якія не дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, можа быць праведзены пры адсутнасці абвінавачанага, аб чым суд выносіць прысуд (пастанову). Пасля вяртання абвінавачанага ў залу судовага пасяджэння яму павінны быць паведамлены паказанні гэтых асоб і дадзена магчымасць задаваць ім пытанні.

4. Пацярпелы і сведка, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту, выдаляюцца з залы судовага пасяджэння пасля заканчэння іх допыту, акрамя выпадкаў, калі суд прызнае неабходным іх далейшую прысутнасць.

Артыкул 333. Абвяшчэнне паказанняў пацярпелага і сведкі

1. Абвяшчэнне паказанняў пацярпелага і сведкі, дадзеных пры дасудовым вядзенні, а таксама ўзнаўленне гуказапісу іх паказанняў, відэазапісу ці кіназдымкі допыту дапускаюцца па меркаванні суда ці па хадайніцтве бакоў у наступных выпадках:

1) пры наяўнасці істотных супярэчнасцей паміж гэтымі паказаннямі і паказаннямі, дадзенымі на судовым пасяджэнні;

2) пры адсутнасці на судовым пасяджэнні пацярпелага ці сведкі з-за прычын, якія выключаюць магчымасць іх яўкі;

3) пры наяўнасці абставін, прадугледжаных артыкулам 68 гэтага Кодэкса.

2. Калі пацярпелы ці сведка, вызваленыя па законе ад абавязку сведчыць супраць абвінавачанага, не далі згоды на дачу паказанняў на судовым пасяджэнні, іх паказанні, дадзеныя пры дасудовым вядзенні, не могуць быць абвешчаны. Не могуць быць таксама ўзноўлены гуказапіс іх паказанняў, відэазапіс ці кіназдымка допыту.

3. Не дапускаецца ўзнаўленне гука-, відэазапісу і кіназдымкі без папярэдняга абвяшчэння паказанняў, якія змяшчаюцца ў адпаведным пратаколе допыту ці пратаколе судовага пасяджэння.

Артыкул 334. Правядзенне экспертызы на судовым пасяджэнні

1. Па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве суд мае права прызначыць экспертызу. Экспертызу праводзяць эксперты, якія давалі заключэнне ў ходзе дасудовага вядзення, або іншыя эксперты, прызначаныя судом.

2. Экспертыза на судовым пасяджэнні праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі главы 26 гэтага Кодэкса.

3. На судовым пасяджэнні эксперт з дазволу старшыні мае права задаваць пытанні асобам, якія дапытваюцца, знаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы, удзельнічаць у аглядах, эксперыментах і іншых судовых дзеяннях, якія маюць дачыненне да прадмета экспертызы.

4. Пры неабходнасці перадачы эксперту ўзораў для параўнальнага даследавання прымяняюцца правілы артыкула 234 гэтага Кодэкса.

5. Пры высвятленні ўсіх абставін, якія маюць значэнне для дачы заключэння, старшыня пасяджэння прапаноўвае бакам падаць у пісьмовым выглядзе пытанні эксперту. Пастаўленыя пытанні павінны быць абвешчаны і аб іх заслуханы меркаванні ўдзельнікаў судовага разбору. Разгледзеўшы пытанні, суд сваім прысудам (пастановай) адхіляе тыя з іх, якія не датычацца крымінальнай справы ці кампетэнцыі эксперта, канчаткова фармулюе новыя пытанні, пасля чаго эксперт распачынае правядзенне экспертызы і складанне заключэння.

6. Эксперт дае заключэнне ў пісьмовай форме і абвяшчае яго на судовым пасяджэнні. Заключэнне разам з пытаннямі ўключаецца ў крымінальную справу. Эксперт мае права ўключыць у заключэнне высновы пра абставіны крымінальнай справы, якія адносяцца да яго кампетэнцыі, аб якіх яму не былі пастаўлены пытанні.

7. У выпадку выкліку на судовае пасяджэнне эксперта, які даў заключэнне ў ходзе дасудовага вядзення, суд можа пасля абвяшчэння заключэння, калі яно не выклікае пярэчанняў у бакоў, не прызначаць экспертызу і абмежавацца допытам эксперта.

Артыкул 335. Допыт эксперта

1. Пасля абвяшчэння заключэння эксперта, дадзенага ім у ходзе дасудовага вядзення ці на судовым пасяджэнні, эксперт можа быць дапытаны для растлумачэння ці ўдакладнення заключэння.

2. Пытанні эксперту задаюць бакі, пры гэтым першым задае бок, па хадайніцтве якога прызначана экспертыза. Суд мае права задаць эксперту пытанні ў любы момант допыту.

Артыкул 336. Правядзенне дадатковай ці паўторнай экспертызы

1. Суд можа прызначыць дадатковую ці паўторную экспертызу ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 239 гэтага Кодэкса, аб чым выносіць прысуд (пастанову).

2. Дадатковая ці паўторная экспертыза праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі артыкулаў 226–238 гэтага Кодэкса.

Артыкул 337. Агляд рэчыўных доказаў

1. Далучаныя да крымінальнай справы ў ходзе дасудовага вядзення і пададзеныя рэчыўныя доказы павінны быць агледжаны судом і прад'яўлены бакам. Агляд рэчыўных доказаў праводзіцца ў любы момант судовага следства як па хадайніцтве бакоў, так і па ініцыятыве суда. Рэчыўныя доказы могуць быць прад'яўлены для агляду сведкам, эксперту і спецыялісту. Асобы, якім прад'яўлены рэчыўныя доказы, маюць права звяртаць увагу суда на абставіны, звязаныя з аглядам.

2. Агляд рэчыўных доказаў можа праводзіць суд па месцы іх знаходжання ў адпаведнасці з правіламі часткі першай гэтага артыкула.

Артыкул 338. Абвяшчэнне пратаколаў следчых дзеянняў і дакументаў

1. Падлягаюць абвяшчэнню поўнасцю ці часткова пратаколы следчых дзеянняў, якія сведчаць аб абставінах і фактах, выяўленых пры аглядзе, адабранні, вобшуку, прад'яўленні для апазнання, следчым эксперыменце, праслухоўванні і запісе перамоў, якія вядуцца па тэхнічных каналах сувязі, і іншых перамоў абвінавачанага ці іншых асоб, а таксама дакументы, далучаныя да крымінальнай справы ці пададзеныя на судовым пасяджэнні, калі ў іх выкладзены ці засведчаны абставіны, якія маюць значэнне для крымінальнай справы. Пададзеныя суду дакументы могуць быць па прысудзе (пастанове) суда далучаны да крымінальнай справы.

2. Абвяшчэнне пратаколаў следчых дзеянняў і дакументаў праводзіцца ў любы момант судовага следства як па хадайніцтве бакоў, так і па ініцыятыве суда.

Артыкул 339. Парадак абвяшчэння пратаколаў і дакументаў

У выпадках, прадугледжаных артыкуламі 328, 331, 333 і 338 гэтага Кодэкса, паказанні абвінавачанага, пацярпелага, сведкі, а таксама пратаколы следчых дзеянняў і дакументы абвяшчаюцца па даручэнні суда бокам, які хадайнічаў аб іх абвяшчэнні, або судом.

Артыкул 340. Агляд мясцовасці і памяшкання

1. Агляд мясцовасці і памяшкання праводзіцца судом з удзелам бакоў, а пры неабходнасці – і з удзелам сведак, эксперта і спецыяліста. Аб правядзенні агляду памяшкання суд выносіць прысуд (пастанову).

2. Пасля прыбыцця на месца агляду старшыня пасяджэння абвяшчае аб працягу судовага пасяджэння, і суд распачынае агляд. Пры гэтым абвінавачанаму, пацярпеламу сведку, эксперту і спецыялісту могуць быць зададзены пытанні судом і бакамі ў сувязі з аглядам.

Артыкул 341. Правядзенне следчага эксперыменту

Следчы эксперымент праводзіцца судом з удзелам бакоў, а пры неабходнасці – і з удзелам сведак, эксперта і спецыяліста з захаваннем правілаў, прадугледжаных артыкулам 207 гэтага Кодэкса. Аб правядзенні следчага эксперымента суд выносіць прысуд (пастанову).

Артыкул 342. Прад'яўленне для апазнання

У выпадку неабходнасці прад'яўлення ў судзе для апазнання асобы ці аб'екта яно праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі артыкулаў 223 і 224 гэтага Кодэкса.

Артыкул 343. Агляданне

1. Агляданне на судовым пасяджэнні праводзіцца па прысудзе (пастанове) суда ў выпадках, прадугледжаных часткамі першай і другой артыкула 206 гэтага Кодэкса.

2. Агляданне, якое суправаджаецца агаленнем агляданага, праводзіць у асобным памяшканні ўрач, які складае і падпісвае акт аглядання. Пасля гэтага ўказаныя асобы вяртаюцца ў зал судовага пасяджэння, дзе ў прысутнасці бакоў паведамляюць суду аб слядах і прыкметах на целе агледжанага, калі яны выяўлены, адказваюць на пытанні бакоў і суддзяў. Акт аглядання далучаецца да крымінальнай справы.

Артыкул 343[1]. Правядзенне допыту, апазнання з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі

1. Допыт удзельнікаў працэсу, апазнанне асоб і (ці) аб'ектаў у ходзе судовага разбору могуць быць праведзены з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі ў выпадках:

1) немагчымасці непасрэднай прысутнасці ўдзельніка працэсу ў судзе з-за стану здароўя і з-за іншых уважлівых прычын;

2) неабходнасці загарантавання бяспекі ўдзельнікаў крымінальнага працэсу і іншых асоб у адпаведнасці з главой 8 гэтага Кодэкса;

3) правядзення допыту непаўналетняга ўдзельніка працэсу;

4) неабходнасці забеспячэння найбольш хуткага, усебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы.

2. Допыт удзельнікаў працэсу, апазнанне асоб і (ці) аб'ектаў з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі праводзяцца па агульных правілах допыту, апазнання, устаноўленых гэтым Кодэксам.

3. Прымяненне сістэм відэа-канферэнц-сувязі пры допыце ўдзельнікаў працэсу, апазнанні асоб і (ці) аб'ектаў павінна забяспечваць магчымасць удзельнікам працэсу, якія знаходзяцца ў судзе, што разглядае справу, непасрэдна задаваць пытанні і атрымліваць адказы ад асоб, якія дапытваюцца, ці асоб, якія ўдзельнічаюць у апазнанні, рэалізоўваць іншыя працэсуальныя правы і выконваць працэсуальныя абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам. Пры гэтым павінна забяспечвацца належная якасць выявы і гуку.

4. У мэтах высвятлення звестак аб асобе, якая дапытваецца, ці асобе, якая ўдзельнічае ў апазнанні, а таксама ўзяцця падпіскі ў выпадках, прадугледжаных часткай 2 артыкула 330 гэтага Кодэкса, у памяшканні, у якім знаходзіцца ўдзельнік працэсу, які дапытваецца з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі, і (ці) у якім (з якога) ажыццяўляецца апазнанне асобы і (ці) аб'екта, па даручэнні суда, які разглядае справу, абавязаны знаходзіцца сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) суда, па месцы знаходжання якога праводзяцца ўказаныя працэсуальныя дзеянні. Падпіска і пададзеныя пацярпелым, сведкам дакументы пасля заканчэння працэсуальнага дзеяння неадкладна накіроўваюцца старшыні на судовым пасяджэнні суда, які разглядае крымінальную справу.

5. Ход і змест працэсуальных дзеянняў, якія ажыццяўляюцца з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі, адлюстроўваюцца ў пратаколе судовага пасяджэння з наступным далучэннем да яго адпаведнага электроннага носьбіта інфармацыі, на якім зафіксаваны допыт ці апазнанне з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі.

6. У выпадку прымянення ў адносінах да асобы, якая ўдзельнічае ў правядзенні працэсуальных дзеянняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, мер для загарантавання бяспекі ў адпаведнасці з главой 8 гэтага Кодэкса яна можа быць дапытана або з яе ўдзелам можа быць праведзена апазнанне асобы з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі з адпаведнымі змяненнямі знешнасці і (ці) голасу, якія забяспечваюць непазнавальнасць асобы, якая абараняецца.

Артыкул 344. Заканчэнне судовага следства

1. Пасля заканчэння даследавання ўсіх доказаў старшыня пасяджэння апытвае бакі, ці жадаюць яны дапоўніць судовае следства і чым менавіта. У выпадку заявы хадайніцтваў аб дапаўненні судовага следства суд абмяркоўвае гэтыя хадайніцтвы і вырашае іх.

2. Пасля вырашэння хадайніцтваў і выканання неабходных судовых дзеянняў старшыня пасяджэння абвяшчае судовае следства закончаным.

ГЛАВА 37
СУДОВЫЯ СПРЭЧКІ І АПОШНЯЕ СЛОВА АБВІНАВАЧАНАГА

Артыкул 345. Змест і парадак судовых спрэчак

1. Пасля заканчэння судовага следства суд пераходзіць да судовых спрэчак, якія складаюцца з прамоў дзяржаўнага і прыватнага абвінаваўцаў, пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка ці іх прадстаўнікоў, абаронцы, абвінавачанага, які самастойна ажыццяўляе сваю абарону, ці яго законнага прадстаўніка. Паслядоўнасць выступленняў удзельнікаў судовых спрэчак устанаўлівае суд па іх прапановах, але ва ўсіх выпадках першым выступае дзяржаўны ці прыватны абвінаваўца.

2. Удзельнікі судовых спрэчак не маюць права спасылацца на доказы, якія не даследаваліся на судовым пасяджэнні. Пры неабходнасці прад'явіць суду для даследавання новыя доказы яны могуць хадайнічаць аб аднаўленні судовага следства.

3. Суд не можа абмяжоўваць працягласць спрэчак бакоў пэўным часам, але старшыня пасяджэння мае права спыняць удзельнікаў спрэчак, калі яны закранаюць абставіны, якія не маюць адносін да справы, што разглядаецца.

4. Пасля абвяшчэння прамоў усімі ўдзельнікамі судовых спрэчак кожны з іх можа выступіць яшчэ па адным разе з заўвагамі (рэплікамі) адносна сказанага ў іх прамовах. Права апошняй заўвагі (рэплікі) належыць абвінавачанаму ці яго абаронцу.

5. Кожны ўдзельнік судовых спрэчак можа падаць суду ў пісьмовай форме сваю прамову, а таксама прапанаваную ім фармулёўку рашэння аб пытаннях, указаных у пунктах 1–16 артыкула 352 гэтага Кодэкса. Прапанаваная фармулёўка не мае для суда абавязковай сілы.

Артыкул 346. Апошняе слова абвінавачанага

1. Пасля заканчэння судовых спрэчак старшыня пасяджэння дае абвінавачанаму апошняе слова. Ніякія пытанні да абвінавачанага ў час яго апошняга слова не дапускаюцца.

2. Суд не можа абмяжоўваць працягласць апошняга слова абвінавачанага пэўным часам, але старшыня пасяджэння мае права спыняць абвінавачанага ў выпадках, калі ён закранае абставіны, якія не маюць адносін да крымінальнай справы, што разглядаецца.

Артыкул 347. Аднаўленне судовага следства

Калі асобы, якія выступаюць у судовых спрэчках, ці абвінавачаны ў апошнім слове паведамяць аб новых абставінах, якія маюць значэнне для крымінальнай справы, суд па хадайніцтве бакоў ці па сваёй ініцыятыве аднаўляе судовае следства. Пасля заканчэння адноўленага судовага следства суд ізноў адкрывае судовыя спрэчкі і дае абвінавачанаму апошняе слова.

Артыкул 348. Выдаленне суда ў дарадчы пакой для вынясення прысуду

1. Заслухаўшы апошняе слова абвінавачанага, суд неадкладна выдаляецца ў дарадчы пакой для вынясення прысуду, аб чым старшыня пасяджэння абвяшчае прысутным у зале судовага пасяджэння.

2. Калі суд, знаходзячыся ў дарадчым пакоі, прыйдзе да высновы, што для правільнага вырашэння крымінальнай справы неабходна дадатковае даследаванне яе абставін, ён вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і аднаўляе судовае следства.

ГЛАВА 38
ПАСТАНОВА ПРЫГАВОРУ

Артыкул 349. Пастанова прыгавору іменем Рэспублікі Беларусь

Суды Рэспублікі Беларусь выносяць прысуды іменем Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 350. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да прыгавору

1. Прыгавор суда павінен быць законным. Прыгавор прызнаецца законным, калі ён пастаноўлены на аснове закона і з захаваннем усіх яго патрабаванняў.

2. Прыгавор суда павінен быць абгрунтаваным. Прыгавор прызнаецца абгрунтаваным, калі ён пастаноўлены на падставе толькі тых пададзеных суду доказаў, якія ўсебакова, поўна і аб'ектыўна даследаваны на судовым пасяджэнні.

3. Прыгавор суда павінен быць матываваным. Прыгавор прызнаецца матываваным, калі ў ім прыведзены доказы, на якіх заснаваныя высновы суда і матывы прынятых ім рашэнняў.

4. Прыгавор суда павінен быць справядлівым. Прыгавор прызнаецца справядлівым, калі пакаранне, прызначанае вінаватаму, вызначана ў адпаведнасці з артыкулам Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае адказнасць за здзейсненае злачынства, і з улікам яго асобы. Кожны невінаваты падлягае апраўданню.

Артыкул 351. Тайна нарады суддзяў

1. Прыгавор пастанаўляецца судом у дарадчым пакоі. У час пастановы прыгавору ў гэтым пакоі могуць знаходзіцца толькі суддзі, якія ўваходзяць у склад суда па гэтай крымінальнай справе. Прысутнасць запасных суддзяў і народных засядацеляў, а таксама іншых асоб не дапускаецца.

2. Пасля заканчэння рабочага часу, а таксама на працягу рабочага дня суд мае права зрабіць перапынак для адпачынку з выхадам з дарадчага пакоя. Суддзі не маюць права раскрываць меркаванні, якія мелі месца пры абмеркаванні і пастанове прыгавору.

3. Час абвяшчэння прыгавору павінен быць аб'яўлены ўдзельнікам судовага пасяджэння перад выдаленнем суддзяў у дарадчы пакой.

Артыкул 352. Пытанні, якія вырашае суд пры пастанове прыгавору

1. Пры пастанове прыгавору суд у дарадчым пакоі вырашае наступныя пытанні:

1) ці даказана, што мела месца дзеянне, ва ўчыненні якога абвінавачваецца асоба;

2) ці даказана, што дзеянне ўчыніў абвінавачаны;

3) ці з'яўляецца гэта дзеянне злачынствам і якім менавіта артыкулам Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледжана адказнасць за яго ўчыненне;

4) ці вінаваты абвінавачаны ва ўчыненні гэтага дзеяння;

5) ці маюцца абставіны, якія памякчаюць ці абцяжваюць адказнасць абвінавачанага;

6) ці падлягае абвінавачаны пакаранню за ўчыненае ім злачынства;

7) якое пакаранне павінна быць прызначана абвінавачанаму;

8) ці падлягае абвінавачаны дадатковаму пакаранню і якому менавіта;

9) ці маюцца падставы для пастановы прыгавору без прызначэння пакарання, з адтэрміноўкай выканання пакарання, з умоўным непрымяненнем пакарання ці з вызваленнем ад адбывання пакарання;

10) у папраўчай установе якога віду і ва ўмовах якога рэжыму павінен адбываць пакаранне асуджаны да пазбаўлення волі;

11) ці падлягае задавальненню грамадзянскі іск, на чыю карысць і ў якім памеры; аб спагнанні дзяржаўнай пошліны;

12) як абысціся з маёмасцю, на якую накладзены арышт;

13) як абысціся з рэчыўнымі доказамі;

14) на каго і ў якім памеры павінны быць ускладзены працэсуальныя выдаткі;

15) аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 101 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

16) аб меры стрымання і іншай меры працэсуальнага прымусу ў адносінах да абвінавачанага.

2. Калі асоба абвінавачваецца ва ўчыненні некалькіх злачынстваў, суд вырашае пытанні, указаныя ў пунктах 1–7 часткі першай гэтага артыкула, па кожным злачынстве паасобку.

3. Калі ва ўчыненні злачынства абвінавачваецца некалькі асоб, суд вырашае пытанні, указаныя ў частцы другой гэтага артыкула, у адносінах да кожнага абвінавачанага паасобку, вызначаючы ролю і ступень яго ўдзелу вы ўчыненым дзеянні.

Артыкул 353. Рашэнне пытання аб наяўнасці свядомасці ў абвінавачанага

1. У тых выпадках, калі ў ходзе папярэдняга расследавання ці судовага разбору ўзнікала пытанне аб наяўнасці свядомасці ў абвінавачанага, суд абавязаны пры вынясенні прысуду яшчэ раз абмеркаваць гэтае пытанне.

2. Прызнаўшы, што абвінавачаны ў час учынення грамадска небяспечнага дзеяння знаходзіўся ў стане бессвядомасці ці пасля ўчынення злачынства захварэў псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе яго магчымасці ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, суд выносіць рашэнне ў адпаведнасці з правіламі главы 46 гэтага Кодэкса.

Артыкул 354. Парадак нарады суддзяў пры калегіяльным разглядзе крымінальнай справы

1. Пры калегіяльным разглядзе крымінальнай справы пастанове прыгавору папярэднічае нарада суддзяў. Старшыня пасяджэння ставіць на вырашэнне пытанні ў парадку, указаным у артыкуле 352 гэтага Кодэкса.

2. Пры вырашэнні кожнага пытання ніхто з суддзяў не мае права ўстрымацца ад галасавання, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула. Усе пытанні вырашаюцца большасцю галасоў. Старшыня пасяджэння падае свой голас апошнім.

3. Суддзі, які галасаваў за апраўданне абвінавачанага і застаўся ў меншасці, даецца права ўстрымацца ад галасавання аб пытаннях прымянення крымінальнага закона. Калі іншыя суддзі разышліся ў меркаваннях аб кваліфікацыі злачынства ці аб меры пакарання, то голас, пададзены за апраўданне, далучаецца да голасу, пададзенага за кваліфікацыю па законе, які прадугледжвае менш цяжкае злачынства, і за прызначэнне менш строгага пакарання.

4. Выключная мера пакарання – пакаранне смерцю можа быць прызначана абвінавачанаму, прызнанаму вінаватым толькі па аднагалосным рашэнні ўсіх суддзяў.

5. Суддзя, які застаўся ў меншасці, мае права выкласці сваю асобную думку ў дарадчым пакоі ў пісьмовай форме. Асобная думка далучаецца да крымінальнай справы і абвяшчэнню ў зале судовага пасяджэння не падлягае.

6. Калі на прыгавор суда, па якім адзін з суддзяў застаўся пры асобнай думцы, не паступяць апеляцыйныя скарга ці пратэст, суд, які разглядаў крымінальную справу, пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу накіроўвае гэтую справу старшыні вышэйстаячага суда для рашэння пытання аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду.

Артыкул 355. Віды прыгавораў

1. Прыгавор суда можа быць абвінаваўчым ці апраўдальным.

2. Абвінаваўчы прыгавор можа быць вынесены:

1) з прызначэннем крымінальнага пакарання, якое падлягае адбыванню асуджаным;

2) з прымяненнем іншых мер крымінальнай адказнасці, прадугледжаных артыкуламі 77–79 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

3) з прымяненнем у адносінах да непаўналетніх прымусовых мер выхаваўчага характару;

4) з прызначэннем крымінальнага пакарання і вызваленнем ад яго адбывання.

Артыкул 356. Падставы вынясення абвінаваўчага прыгавору

1. Абвінаваўчы прыгавор пастанаўляецца толькі пры ўмове, што ў ходзе судовага разбору вінаватасць абвінавачанага ва ўчыненні злачынства пацверджана сукупнасцю даследаваных судом доказаў. Прыгавор не можа быць заснаваны на здагадках.

2. Пастанаўляючы абвінаваўчы прыгавор з прызначэннем пакарання асуджанаму, суд павінен дакладна вызначыць яго від, памер, тэрмін і пачатак падліку тэрміну адбывання пакарання.

3. Суд выносіць абвінаваўчы прыгавор з прызначэннем пакарання і вызваленнем ад яго адбывання ў выпадках, калі:

1) час утрымання абвінавачанага пад вартай па гэтай крымінальнай справе з улікам правілаў заліку папярэдняга заключэння, устаноўленых артыкулам 75 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, паглынае пакаранне, прызначанае судом;

2) пры наяўнасці абставін, прадугледжаных пунктамі 3 ці 4 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, абвінавачаны не выказаў згоды на спыненне вядзення па крымінальнай справе на ўказаных падставах.

4. Суд пастанаўляе абвінаваўчы прыгавор без прызначэння пакарання ў адпаведнасці з артыкулам 79 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама калі да моманту яго вынясення надышла смерць абвінавачанага.

Артыкул 357. Падставы вынясення апраўдальнага прыгавору

1. Апраўдальны прыгавор выносіцца:

1) калі адсутнічае грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам;

2) калі ў дзеяннях абвінавачанага адсутнічае склад злачынства;

3) калі не даказаны ўдзел абвінавачанага ва ўчыненні злачынства.

2. Апраўданне на любой з пералічаных падстаў азначае прызнанне невінаватасці абвінавачанага і цягне за сабой яго поўную рэабілітацыю.

Артыкул 358. Пастанова прыгавору

1. Пасля вырашэння пытанняў, указаных у артыкуле 352 гэтага Кодэкса, суд пераходзіць да пастановы прыгавору. Прыгавор выкладаецца на мове, на якой праходзіў судовы разбор, і складаецца з уводнай, апісальна-матывацыйнай і рэзалютыўнай частак.

2. Прыгавор можа быць напісаны ад рукі ці падрыхтаваны з дапамогай тэхнічных сродкаў адным з суддзяў, якія ўдзельнічаюць у яго пастанове, і падпісваецца ўсімі суддзямі. Суддзя, які застаўся пры асобнай думцы, не падпісвае прыгавор, аб чым насупраць яго прозвішча робіцца адзнака «асобная думка».

3. Выпраўленні, дапіскі, падчысткі ў тэксце прыгавору недапушчальныя.

Артыкул 359. Уводная частка прыгавору

Ва ўводнай частцы прыгавору ўказваюцца:

1) пастанова прыгавору іменем Рэспублікі Беларусь;

2) час і месца вынясення прыгавору;

3) найменне суда, які пастанавіў прыгавор, склад суда, дзяржаўны і прыватны абвінаваўцы, абаронца;

4) прозвішча, імя і імя па бацьку абвінавачанага, дата і месца яго нараджэння, грамадзянства, месца жыхарства, месца працы, занятак, адукацыя, сямейнае становішча і іншыя звесткі аб асобе абвінавачанага, якія маюць значэнне для крымінальнай справы;

5) артыкул Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае злачынства, ва ўчыненні якога асоба абвінавачваецца (пункт, частка, артыкул).

Артыкул 360. Апісальна-матывацыйная частка абвінаваўчага прыгавору

1. Апісальна-матывацыйная частка абвінаваўчага прыгавору павінна змяшчаць апісанне злачыннага дзеяння, прызнанага судом даказаным, з указаннем месца, часу, спосабу яго ўчынення, формы віны, матываў, мэтаў і наступстваў злачынства. У прыгаворы прыводзяцца доказы, на якіх заснаваны высновы суда аб вінаватасці абвінавачанага, і матывы, па якіх суд адхіліў іншыя доказы, а ў адносінах да абвінавачаных, з якімі заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, у прыгаворы таксама павінны змяшчацца высновы суда аб выкананні абвінавачаным абавязкаў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве. Указваюцца абставіны, якія памякчаюць і абцяжваюць адказнасць, а ў выпадку прызнання часткі

абвінавачання неабгрунтаванай ці выяўлення няправільнай кваліфікацыі злачынства – падставы і матывы змянення абвінавачання.

2. Суд абавязаны таксама ўказаць матывы рашэння ўсіх пытанняў, якія адносяцца да прызначэння крымінальнага пакарання, вызвалення ад яго ці ад яго рэальнага адбывання, прымянення іншых мер крымінальнай адказнасці або прымусовых мер бяспекі і лячэння.

3. У апісальна-матывацыйнай частцы павінна змяшчацца абгрунтаванне прынятых рашэнняў і па іншых пытаннях, указаных у артыкуле 352 гэтага Кодэкса.

4. У выпадку, указаным у частцы 1 артыкула 326 гэтага Кодэкса, суд у апісальна-матывацыйнай частцы абвінаваўчага прыгавору мае права ўказаць доказы вінаватасці абвінавачанага, не раскрываючы іх зместу.

Артыкул 361. Рэзалютыўная частка абвінаваўчага прыгавору

1. У рэзалютыўнай частцы абвінаваўчага прыгавору павінны быць указаны:

1) прозвішча, імя і імя па бацьку абвінавачанага;

2) рашэнне аб прызнанні абвінавачанага вінаватым ва ўчыненні злачынства;

3) крымінальны закон (пункт, частка, артыкул), па якім асоба прызнана вінаватай;

4) від, тэрмін і памер пакарання, прызначанага абвінавачанаму за кожнае злачынства, ва ўчыненні якога ён прызнаны вінаватым; канчатковая мера пакарання, якая падлягае адбыванню на падставе артыкулаў 72–74 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь; від папраўчай установы, у якой павінен адбываць пакаранне асуджаны да пазбаўлення волі, і ўмовы рэжыму;

5) працягласць выпрабавальнага тэрміну пры ўмоўным непрымяненні пакарання і абавязкі, якія ўскладаюцца на асуджанага;

6) рашэнне аб прызначэнні абвінавачанаму дадатковага пакарання;

7) рашэнне аб заліку часу папярэдняга ўзяцця пад варту, калі абвінавачаны да пастановы прыгавору быў затрыманы, ці да яго прымянялася мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, ці ён змяшчаўся ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар ці дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя;

8) рашэнне аб меры стрымання і іншай меры працэсуальнага прымусу ў адносінах да абвінавачанага да ўступлення прыгавору ў законную сілу.

2. Калі асобе прад'яўлена абвінавачанне па некалькіх артыкулах крымінальнага закона, то ў рэзалютыўнай частцы прыгавору павінна быць дакладна ўказана, па якіх з іх абвінавачаны апраўданы і па якіх асуджаны.

3. У выпадку вызвалення абвінавачанага ад адбывання пакарання ці вынясення прыгавору без прызначэння пакарання аб гэтым указваецца ў рэзалютыўнай частцы прыгавору.

Артыкул 362. Апісальна-матывацыйная частка апраўдальнага прыгавору

1. У апісальна-матывацыйннай частцы апраўдальнага прыгавору выкладаюцца сутнасць прад'яўленага абвінавачання, абставіны крымінальнай справы, выяўленыя судом; доказы, якія паслужылі падставай для апраўдання абвінавачанага; матывы, якія тлумачаць, чаму суд прызнае недакладнымі ці недастатковымі доказы, на якіх было заснавана сцверджанне аб вінаватасці абвінавачанага ва ўчыненні злачынства; матывы рашэння ў адносінах да грамадзянскага іску.

2. Не дапускаецца ўключэнне ў апраўдальны прыгавор фармулёвак, якія ставяць пад сумненне невінаватасць апраўданага.

Артыкул 363. Рэзалютыўная частка апраўдальнага прыгавору

У рэзалютыўнай частцы апраўдальнага прыгавору павінны быць указаны:

1) прозвішча, імя і імя па бацьку абвінавачанага;

2) рашэнне аб прызнанні абвінавачанага невінаватым і яго апраўданне, падставы апраўдання;

3) рашэнне аб адмене меры стрымання і іншай меры працэсуальнага прымусу, калі яна была прыменена;

4) рашэнне аб адмене мер забеспячэння пакрыцця шкоды і канфіскацыі маёмасці, калі такія меры былі прыняты.

Артыкул 364. Іншыя пытанні, якія падлягаюць вырашэнню ў рэзалютыўнай частцы прыгавору

У рэзалютыўнай частцы як абвінаваўчага, так і апраўдальнага прыгавору, акрамя пытанняў, пералічаных адпаведна ў артыкулах 361 і 363 гэтага Кодэкса, павінны быць указаны:

1) рашэнне па прад'яўленым грамадзянскім іску;

2) рашэнне пытання аб рэчыўных доказах;

3) рашэнне аб спагнанні працэсуальных выдаткаў;

4) растлумачэнне парадку і тэрміну апеляцыйнага абскарджання ці апратэставання прыгавору.

Артыкул 365. Абвяшчэнне прыгавору

1. Пасля падпісання прыгавору суд вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і старшыня пасяджэння абвяшчае прыгавор. Са згоды бакоў дапускаецца абвяшчэнне толькі рэзалютыўнай часткі прыгавору. Усе прысутныя ў зале судовага пасяджэння, не выключаючы складу суда, выслухоўваюць прыгавор стоячы.

2. Калі прыгавор выкладзены на мове, якой абвінавачаны не валодае, то ўслед за абвяшчэннем прыгавору ці сінхронна ён павінен быць перакладзены ўголас перакладчыкам на родную мову абвінавачанага ці на іншую мову, якой ён валодае.

3. Пасля абвяшчэння прыгавору старшыня пасяджэння растлумачвае бакам парадак і тэрмін апеляцыйнага абскарджання прыгавору, а таксама парадак і тэрміны азнаямлення з пратаколам судовага пасяджэння і прынясення на яго заўваг.

4. Пры прызначэнні пакарання з прымяненнем артыкулаў 77, 78 і 93 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь абвінавачанаму таксама тлумачацца наступствы парушэння ўмоў адбывання пакарання ці невыканання патрабаванняў, устаноўленых пры адтэрміноўцы выканання прыгавору.

5. Калі абвінавачаны асуджаны да выключнай меры пакарання – пакарання смерцю, старшыня пасяджэння растлумачвае яму права хадайнічаць аб памілаванні пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу.

Артыкул 366. Вызваленне абвінавачанага з-пад варты

Пры апраўданні абвінавачанага або пры пастанове абвінаваўчага прыгавору, прадугледжанага пунктамі 2–4 часткі 2 артыкула 355 гэтага Кодэкса, а таксама з прызначэннем крымінальнага пакарання ў выглядзе грамадскіх работ, штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых работ, абмежавання волі абвінавачаны, які знаходзіцца пад вартай, падлягае неадкладнаму вызваленню.

Артыкул 367. Уручэнне копіі прыгавору

1. Не пазней за пяць сутак пасля абвяшчэння прыгавору яго копія павінна быць уручана абвінавачанаму, абаронцу, дзяржаўнаму і прыватнаму абвінаваўцам. У той жа тэрмін копія прыгавору ўручаецца пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку, прадстаўнікам, калі ў суд паступіла просьба ад указаных асоб.

2. У выпадку, калі прыгавор змяшчае звесткі, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, не пазней за пяць сутак пасля яго абвяшчэння ўдзельнікам працэсу, указаным у частцы 1 гэтага артыкула, за выключэннем дзяржаўнага абвінаваўцы, уручаецца выпіска з прыгавору, якая складаецца з уводнай і рэзалютыўнай частак прыгавору і не змяшчае звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, а абвінавачаны павінен быць азнаёмлены з прыгаворам ці яго копіяй з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

3. Магчымасць азнаямлення з прыгаворам, які змяшчае звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, ці яго копіяй забяспечваецца па просьбе абаронцы, прыватнага

абвінаваўцы, а таксама пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўнікоў не пазней за пяць сутак з дня паступлення такой просьбы з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

Артыкул 368. Пытанні, якія суд вырашае адначасова з пастановай прыгавору

1. Суд не пазней за наступны дзень пасля пастановы абвінаваўчага прыгавору ў адносінах да абвінавачанага, асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, пакарання смерцю, калі дзеці ўказанай асобы застаюцца без апекі бацькоў, паведамляе аб гэтым кіраўніцтву (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей. Пры наяўнасці ў абвінавачанага, асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, пакарання смерцю, састарэлых бацькоў, іншых утрыманцаў, якія засталіся без нагляду, адначасова з пастановай абвінаваўчага прыгавору суд выносіць прысуд (пастанову) аб перадачы ўказаных асоб пад нагляд ці на апеку сваякам або іншым асобам і ўстановам, а пры наяўнасці ў яго маёмасці ці жылля, якія застаюцца без нагляду, – аб перадачы іх на захоўванне сваякам ці мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

11. У выпадку, калі абвінавачаны, асуджаны да пазбаўлення волі, уцёк да вынясення прыгавору, суд не пазней за наступны дзень пасля вынясення прыгавору выносіць прысуд (пастанову) аб яго вышуку для выканання прысуду.

2. У выпадку ўдзелу абаронцы ў справе па прызначэнні суд адначасова з пастановай прыгавору выносіць прысуд (пастанову) аб аплаце працы абаронцы за ажыццяўленне абароны.

21. Пры пастанове апраўдальнага прыгавору за недаказанасцю ўдзелу абвінавачанага ва ўчыненні злачынства, або пры апраўданні абвінавачанага па асобных пунктах абвінавачання за недаказанасцю ўдзелу ва ўчыненні злачынства, або пры апраўданні аднаго з некалькіх абвінавачаных за недаказанасцю ўдзелу ва ўчыненні злачынства, калі асоба, якая ўчыніла злачынства, застаецца нявыяўленай, суд выносіць пастанову (прысуд) аб перадачы крымінальнай справы пракурору для арганізацыі правядзення дадаткова папярэдняга расследавання і выяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага, ці аб вылучэнні крымінальнай справы ў асобнае вядзенне і перадачы вылучанай справы разам з далучанымі да крымінальнай справы рэчыўнымі доказамі пракурору для арганізацыі правядзення папярэдняга расследавання і выяўлення асобы, якая падлягае прыцягненню ў якасці абвінавачанага.

3. Працэсуальныя рашэнні, названыя ў частках 1 і 2 гэтага артыкула, могуць быць прыняты і пасля абвяшчэння прыгавору па заяве зацікаўленых асоб.

Артыкул 369. Даванне сустрэч з абвінавачаным

Пасля абвяшчэння прыгавору старшыня пасяджэння ці старшыня суда па просьбе членаў сям'і і блізкіх сваякоў абвінавачанага, які ўтрымліваецца пад вартай, павінен даць ім магчымасць сустрэчы з абвінавачаным.

РАЗДЗЕЛ X
ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ПРЫГАВОРАЎ, ПРЫСУДАЎ, ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ НЕ ЎСТУПІЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ (АПЕЛЯЦЫЙНАЕ ВЯДЗЕННЕ)

ГЛАВА 39
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АПЕЛЯЦЫЙНАГА ВЯДЗЕННЯ

Артыкул 370. Права апеляцыйнага абскарджання і апратэставання прыгавору

1. Абвінавачаны, яго абаронца і законны прадстаўнік, прадстаўнік памерлага абвінавачанага, а таксама пацярпелы, прыватны абвінаваўца і (ці) іх прадстаўнікі маюць права абскардзіць у апеляцыйным парадку прыгавор суда першай інстанцыі, які не ўступіў у законную сілу.

2. Права прынясення апеляцыйнага пратэсту належыць пракурору, які ўдзельнічаў у разглядзе крымінальнай справы ў якасці дзяржаўнага абвінаваўцы. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, пракуроры абласцей, горада Мінска, раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённыя і прыраўнаваныя да іх транспартныя пракуроры і іх намеснікі ў межах сваёй кампетэнцыі маюць права апратэставаць прыгавор незалежна ад удзелу ў судовым разборы крымінальнай справы. Пракурор пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам, абавязаны апратэставаць у апеляцыйным парадку кожны прыгавор, пастаноўлены з парушэннямі крымінальнага ці крымінальна-працэсуальнага закона.

3. Грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, іх прадстаўнікі маюць права абскардзіць у апеляцыйным парадку прыгавор у частцы, якая адносіцца да грамадзянскага іску.

4. Абвінавачаны, апраўданы судом, мае права абскардзіць у апеляцыйным парадку апраўдальны прыгавор у частцы матываў і падстаў апраўдання.

5. Прыгаворы, прысуды, пастановы Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь абскарджанню і апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягаюць.

Артыкул 371. Парадак апеляцыйных абскарджання і апратэставання прыгавору

1.Прыгаворы, якія не ўступілі ў законную сілу могуць быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку асобамі, указанымі ў артыкуле 370 гэтага Кодэкса, праз суд, які пастанавіў прыгавор:

1) прыгаворы раённых (гарадскіх) судоў – у абласны, Мінскі гарадскі суды;

2) прыгаворы абласных, Мінскага гарадскога судоў – у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

2. Апеляцыйныя скаргі падаюцца, а апеляцыйныя пратэсты прыносяцца праз суд, які пастанавіў прыгавор. Падача скаргі ці прынясенне пратэсту непасрэдна ў апеляцыйную інстанцыю не з'яўляюцца перашкодай для разгляду скаргі ці пратэсту. У гэтым выпадку скаргі і пратэсты накіроўваюцца ў суд першай інстанцыі для далучэння да крымінальнай справы.

3. Прыгавор, пастаноўлены пры паўторным разглядзе крымінальнай справы, можа быць абскарджаны ці апратэставаны ў агульным парадку.

Артыкул 372. Змест апеляцыйных скаргаў ці пратэстаў

1. Апеляцыйныя скарга ці пратэст павінны змяшчаць:

1) найменне суда, якому адрасуюцца скарга ці пратэст;

2) даныя аб асобе, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, з указаннем яе працэсуальнага становішча, месца жыхарства ці месца знаходжання;

3) указанне на прыгавор, які абскарджваецца ці апратэстоўваецца, і найменне суда, які пастанавіў гэты прыгавор;

4) доказы асобы, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, з указаннем на тое, у чым заключаецца няправільнасць прыгавору і ў чым заключаецца яго просьба;

5) пералік матэрыялаў, якія дадаюцца да скаргі ці пратэсту ;

6) дату і подпіс асобы, якая падала скаргу ці прынесла пратэст.

2. Апеляцыйныя скарга ці пратэст, у якіх ставіцца пытанне аб змяненні прыгавору на падставах, указаных у частцы 3 артыкула 396 гэтага Кодэкса, таксама павінны змяшчаць указанне, аб якім канкрэтна пагаршэнні становішча абвінавачанага ставіцца пытанне ў скарзе ці пратэсце. Калі апеляцыйная скарга пададзена ці апеляцыйны пратэст прынесены на падставе мяккасці прызначанага пакарання, у іх, акрамя таго,

павінна змяшчацца ўказанне, аб прызначэнні якога віду, тэрміну, памеру асноўнага і (ці) дадатковага пакарання просіць асоба, якая падала скаргу ці прынесла пратэст.

3. Калі скарга ці пратэст не адпавядаюць патрабаванням частак 1 ці 2 гэтага артыкула, што перашкаджае разгляду крымінальнай справы судом другой інстанцыі, то яны лічацца пададзенымі, але вяртаюцца суддзёй асобе, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, і прызначаецца тэрмін да дзесяці сутак для іх перасклaдання, аб чым выносіцца пастанова. Пры невяртанні скаргі ці пратэсту ва ўстаноўлены судом тэрмін скарга ці пратэст лічацца непаданымі.

4. Апеляцыйнае вядзенне пачынаецца з моманту прыняцця суддзёй апеляцыйных скаргі ці пратэсту.

Артыкул 373. Паведамленне аб пададзеных скаргах і пратэстах

1. Аб падачы скаргі ці прынясенні пратэсту суд першай інстанцыі паведамляе абвінавачанаму і іншым удзельнікам крымінальнага працэсу, інтарэсы якіх закранаюць скарга ці пратэст, а таксама пракурору, які ўдзельнічаў у разглядзе крымінальнай справы.

2. Абвінавачаны і іншыя ўдзельнікі крымінальнага працэсу маюць права азнаёміцца са скаргамі і пратэстамі, якія паступілі ў суд, і падаць на іх свае пярэчанні.

3. Абвінавачанаму па яго просьбе ўручаецца копія скаргі ці пратэсту. Калі ў апеляцыйнай скарзе пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы, іх прадстаўнікоў, апеляцыйным пратэсце пракурора змяшчаецца просьба аб адмене ці змяненні прыгавору на падставах, якія могуць пацягнуць за сабой пагаршэнне становішча абвінавачанага, іх копіі ўручаюцца абвінавачанаму, а копія пратэсту таксама і пацярпеламу незалежна ад яго просьбы.

4. Пярэчанні, якія паступілі на скаргу ці пратэст, далучаюцца да крымінальнай справы ці накіроўваюцца ў дадатак да яе на працягу сутак.

5. Аб адкліканні скаргі ці пратэсту апавяшчаюцца ўдзельнікі крымінальнага працэсу, інтарэсы якіх гэта закранае.

Артыкул 374. Тэрміны апеляцыйных абскарджання і апратэставання прыгавору

1. Апеляцыйныя скаргі і пратэсты на прыгавор суда першай інстанцыі могуць быць пададзены на працягу дзесяці сутак з дня абвяшчэння прыгавору, а абвінавачаным, які ўтрымліваецца пад вартай, – у той жа тэрмін з дня ўручэння яму копіі прыгавору.

1^1. Апеляцыйныя скаргі і пратэсты на прыгавор суда першай інстанцыі, які змяшчае звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, могуць быць пададзены на працягу дзесяці сутак з дня азнаямлення з прыгаворам ці яго копіяй.

2. На працягу тэрміну, устаноўленага для абскарджання і апратэставання прыгавору, крымінальная справа не можа быць выпатрабавана з суда. Пракурор, а таксама абвінавачаны, яго абаронца і законныя прадстаўнікі, пацярпелы, прыватны абвінаваўца, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі маюць права азнаёміцца ў судзе са скаргамі ці пратэстам, якія паступілі.

3. Апеляцыйныя скарга ці пратэст, пададзеныя з пропускам тэрміну, па пастанове суддзі вяртаюцца асобе, якая падала скаргу ці прынесла пратэст.

4. Дадатковыя апеляцыйныя скаргі і пратэсты і пісьмовыя пярэчанні на іх могуць быць пададзены ў апеляцыйную інстанцыю не пазней чым за трое сутак да пачатку разгляду крымінальнай справы.

Артыкул 375. Аднаўленне тэрміну на апеляцыйныя абскарджанне ці апратэставанне

1. У выпадку пропуску тэрміну на абскарджанне ці апратэставанне прыгавору з-за ўважлівых прычын асобы, якія маюць права на падачу апеляцыйнай скаргі ці прынясенне апеляцыйнага пратэсту, могуць хадайнічаць перад судом, які пастанавіў прыгавор, аб аднаўленні прапушчанага тэрміну. Пытанне аб аднаўленні прапушчанага

тэрміну вырашае суд, які пастанавіў прыгавор, а пры аднаасобным разглядзе справы – суддзя, якія маюць права выклікаць асобу, што распачала хадайніцтва, для дачы тлумачэнняў.

2. Прысуд суда, пастанова суддзі аб адмове ў аднаўленні прапушчанага тэрміну могуць быць абскарджаны ці апратэставаны ў агульным парадку ў вышэйстаячы суд, які мае права аднавіць прапушчаны тэрмін і разгледзець крымінальную справу па скарзе ці пратэсце па сутнасці.

Артыкул 376. Наступствы падачы апеляцыйнай скаргі ці прынясення апеляцыйнага пратэсту

1. Падача апеляцыйнай скаргі ці прынясенне апеляцыйнага пратэсту на прыгавор прыпыняюць яго прывядзенне ў выкананне.

2. Пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для абскарджання ці апратэставання, суд, які пастанавіў прыгавор, не пазней за адзін месяц па крымінальных справах, разгледжаных у скарочаным парадку судовага следства, а па іншых справах – не пазней за тры месяцы накіроўвае крымінальную справу са скаргамі, пратэстам і пярэчаннямі на іх, якія паступілі, у апеляцыйную інстанцыю і паведамляе зацікаўленым асобам аб дні разгляду справы ў апеляцыйнай інстанцыі.

3. Бакі не менш чым за пяць сутак да разгляду крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку павінны быць апавешчаны аб месцы і часе яе разгляду.

4. Асоба, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, мае права адклікаць іх да пачатку судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі. Пры гэтым абаронца можа рэалізаваць гэта права толькі з пісьмовай згоды абвінавачанага.

5. Асоба, якая абскардзіла ці апратэставала прыгавор, не пазней чым за трое сутак да пачатку судовага пасяджэння мае права змяніць або дапоўніць новымі доказамі сваю скаргу ці пратэст. Пры гэтым у дадатковым пратэсце пракурора ці яго заяве аб змяненні пратэсту, таксама як і ў дадатковай скарзе пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы ці іх прадстаўнікоў, пададзеных пасля сканчэння тэрміну абскарджання і апратэставання прыгавору, не можа быць пастаўлена пытанне аб пагаршэнні становішча абвінавачанага, калі такое патрабаванне не змяшчалася ў першапачатковых скарзе ці пратэсце.

Артыкул 377. Абскарджанне і апратэставанне прысуду (пастановы) суда першай інстанцыі

1. На прысуд суда і пастановы суддзі першай інстанцыі па крымінальнай справе можа быць пададзена прыватная скарга ці прынесены прыватны пратэст асобамі, указанымі ў артыкуле 370 гэтага Кодэкса, з наступнымі выключэннямі:

1) прысуды суда і пастановы суддзі, вынесеныя ў выпадках, прадугледжаных часткай 1 артыкула 33, пунктамі 1, 3 часткі 1 артыкула 280[4], артыкулам 303[1] гэтага Кодэкса, абскарджанню не падлягаюць, але могуць быць апратэставаны пракурорам;

2) прысуды суда і пастановы суддзі, вынесеныя ў выпадках, прадугледжаных артыкуламі 273, 274, 278–280, 302, 307, 310, 322, 323, 325, 327, часткай 5 артыкула 330, артыкуламі 334, 347, 402–403, 450 гэтага Кодэкса, абскарджанню і апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягаюць.

2. У выпадках абскарджання ці апратэставання прысуду (пастановы), вынесеных у час судовага разбору крымінальнай справы, які скончыўся пастановай прыгавору, справа падлягае накіраванню ў апеляцыйную інстанцыю толькі пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для абскарджання і апратэставання прыгавору.

3. Правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам адносна тэрмінаў, парадку падачы і разгляду апеляцыйных скаргаў і пратэстаў, распаўсюджваюцца на тэрміны, парадак падачы і разгляду прыватных скаргаў і прыватных пратэстаў.

ГЛАВА 40
ПАДРЫХТОЎКА ДА РАЗГЛЯДУ І РАЗГЛЯД КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ Ў СУДЗЕ АПЕЛЯЦЫЙНАЙ (ДРУГОЙ) ІНСТАНЦЫІ

Артыкул 378. Прадмет і межы разгляду крымінальнай справы судом апеляцыйнай інстанцыі

1. Па апеляцыйных скаргах і пратэстах суд апеляцыйнай інстанцыі правярае правільнасць высвятлення фактычных акалічнасцей крымінальнай справы і прымянення крымінальнага закона, а таксама захаванне пры разглядзе і вырашэнні крымінальнай справы судом першай інстанцыі нормаў крымінальна-працэсуальнага закона.

2. Пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку суд правярае законнасць, абгрунтаванасць, справядлівасць прыгавору па матэрыялах, якія ёсць у справе і дадаткова пададзены. Суд не звязаны доказамі апеляцыйных скаргі ці пратэсту і правярае справу ў поўным аб'ёме ў адносінах да ўсіх абвінавачаных, у тым ліку і тых, якія скаргаў не падалі і ў адносінах да якіх не быў прынесены апеляцыйны пратэст.

3. У выпадку выяўлення парушэнняў закона, якія цягнуць за сабой адмену або змяненне прысуду, суд кіруецца правіламі артыкулаў 386–389 гэтага Кодэкса.

Артыкул 379. Склад суда пры разглядзе крымінальных спраў па апеляцыйных скаргах і пратэстах

Крымінальныя справы па апеляцыйных скаргах і пратэстах разглядае суд апеляцыйнай інстанцыі ў складзе трох прафесійных суддзяў, адзін з якіх з'яўляецца старшынёй.

Артыкул 380. Паўнамоцтвы суддзі па падрыхтоўцы пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі

1. Суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі, вывучыўшы крымінальную справу, якая паступіла на апеляцыйны разгляд, мае права:

1) выклікаць на пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі абвінавачанага, які ўтрымліваецца пад вартай або хатнім арыштам, у выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 383 гэтага Кодэкса, або па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве выклікаць абвінавачанага, калі яго ўдзел у пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі не з'яўляецца абавязковым, але прызнаны неабходным;

2) па хадайніцтве бакоў або па ўласнай ініцыятыве выклікаць на пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі экспертаў, спецыялістаў, а таксама дапытаных у судзе першай інстанцыі пацярпелага, сведак для дачы тлумачэнняў па сутнасці дадзеных імі паказанняў або заключэнняў, калі прызнае гэта неабходным;

3) прыняць рашэнне аб разглядзе справы на закрытым судовым пасяджэнні ў выпадках, прадугледжаных часткай 2 артыкула 23 гэтага Кодэкса;

4) па хадайніцтвах бакоў, якія паступілі ў апеляцыйную інстанцыю, або па ўласнай ініцыятыве вырашыць пытанні аб меры стрымання ў дачыненні да абвінавачанага, аб выпатрабаванні неабходных дадатковых дакументаў, аб прызначэнні экспертызы, калі яе правядзенне магчымае па наяўных у справе або дадаткова пададзеных матэрыялах;

5) пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 65 гэтага Кодэкса, прыняць меры для загарантавання бяспекі ўдзельніка крымінальнага працэсу і членаў яго сям'і і блізкіх у парадку, устаноўленым артыкулам 73 гэтага Кодэкса;

6) прыняць іншыя меры для падрыхтоўкі да пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі і забеспячэнні магчымасці рэалізацыі бакамі правоў і законных інтарэсаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

7) вярнуць крымінальную справу ў суд першай інстанцыі, калі будзе выяўлена, што суд першай інстанцыі не выканаў патрабаванні артыкулаў 310, 372–376 гэтага Кодэкса, што перашкаджае апеляцыйнаму разгляду крымінальнай справы, – для ліквідацыі парушэнняў;

8) вярнуць апеляцыйныя скаргу ці пратэст асобе, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, у выпадку іх адклікання ва ўстаноўленым парадку і спыніць у сувязі з гэтым апеляцыйнае вядзенне;

9) спыніць апеляцыйнае вядзенне, калі будзе выяўлена, што справа не падлягае разгляду ў апеляцыйным парадку.

2. У мэтах забеспячэння прынятых мер да падрыхтоўкі пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі, указаных у пунктах 1, 2, 4 і 6 часткі 1 гэтага артыкула, разгляд справы можа быць перанесены суддзёй на іншы час у межах тэрмінаў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 381 гэтага Кодэкса, аб чым выносіцца пастанова і загадзя апавяшчаюцца бакі.

Артыкул 381. Тэрміны разгляду крымінальнай справы ў апеляцыйнай інстанцыі

1. Абласны, Мінскі гарадскі суды, Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь павінны разгледзець крымінальную справу, якая паступіла па апеляцыйнай скарзе ці пратэсце, у дзень, прызначаны судом першай інстанцыі, але не пазней за два месяцы з дня яе паступлення. У выключных выпадках старшыня ці намеснік старшыні адпаведнага суда могуць прадоўжыць гэты тэрмін, але не больш чым на адзін месяц.

2. У выпадку змянення ці прадаўжэння тэрміну разгляду крымінальнай справы ў апеляцыйнай інстанцыі ўдзельнікі крымінальнага працэсу, указаныя ў артыкуле 383 гэтага Кодэкса, павінны быць загадзя апавешчаны аб дні яе разгляду.

3. Не пазней чым за трое сутак да разгляду крымінальнай справы ў памяшканні суда апеляцыйнай інстанцыі ў агульнадаступным месцы павінна быць размешчана аб’ява аб часе яе разгляду.

Артыкул 382. Адкрыты разгляд крымінальных спраў у апеляцыйнай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі разглядае крымінальныя справы на адкрытым судовым пасяджэнні, за выключэннем выпадкаў, указаных у частцы 2 артыкула 23 гэтага Кодэкса.

Артыкул 383. Асобы, якія ўдзельнічаюць у разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку

1. У пасяджэнні суда, які разглядае крымінальную справу ў апеляцыйным парадку, могуць удзельнічаць пракурор, абаронца, прадстаўнік памерлага абвінавачанага, а таксама пацярпелы, прыватны абвінаваўца, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, іх прадстаўнікі. Удзел пракурора ў пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі абавязковы, калі крымінальная справа разгледжана судом першай інстанцыі з удзелам пракурора ці справа разглядаецца па пратэсце пракурора.

2. Пытанне аб удзеле ў пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі абвінавачанага вырашаецца на стадыі падрыхтоўкі судовага пасяджэння суддзёй, а пры разглядзе справы – судом. Абвінавачаны, які з'явіўся на судовае пасяджэнне, у любым выпадку дапускаецца да дачы тлумачэнняў.

3. Абвінавачаны, які ўтрымліваецца пад вартай ці хатнім арыштам, у адносінах да якога пададзена апеляцыйная скарга пацярпелым, прыватным абвінаваўцам ці іх прадстаўнікамі або прынесены апеляцыйны пратэст пракурорам на змяненне прыгавору на падставах, якія могуць пацягнуць за сабой пагаршэнне яго становішча, выклікаецца на пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі па яго хадайніцтве. Удзел абвінавачанага, якому прызначана пакаранне ў выглядзе пакарання смерцю, і яго абаронцы ў разглядзе крымінальнай справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі абавязковы. Пры разглядзе судом апеляцыйных скаргаў ці пратэстаў на змяненне прыгавору на падставах, якія могуць пацягнуць за сабой пагаршэнне становішча абвінавачанага, удзел абаронцы ў выпадках, указаных у артыкуле 45 гэтага Кодэкса, абавязковы.

4. Не з'яўляюцца перашкодай да разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі выпадкі, калі:

1) на судовае пасяджэнне не прыбылі асобы, за выключэннем указаных у частцы 3 гэтага артыкула, своечасова апавешчаныя аб дні разгляду крымінальнай справы;

2) абвінавачанаму не ўручаны копіі скаргі ці пратэсту, якія змяшчаюць просьбу аб адмене ці змяненні прыгавору на падставах, прадугледжаных часткамі 2 ці 3 артыкула 387 гэтага Кодэкса, калі ён адмовіўся ад іх атрымання ці ўцёк;

3) абвінавачаны не апавешчаны аб месцы і часе разгляду справы ў апеляцыйным парадку ў выпадку, калі ён уцёк.

Артыкул 384. Падача дадатковых матэрыялаў у апеляцыйную інстанцыю

1. У пацвярджэнне ці абвяржэнне доказаў, прыведзеных у скарзе ці пратэсце, асобы, указаныя ў артыкуле 370 гэтага Кодэкса, маюць права падаць у апеляцыйную інстанцыю дадатковыя матэрыялы як да разгляду крымінальнай справы, так і ў час яе разгляду.

2. Дадатковыя матэрыялы не могуць быць атрыманы шляхам правядзення следчых дзеянняў. Асоба, якая падае суду дадатковыя матэрыялы, абавязана паведаміць, якім шляхам яны атрыманы, у сувязі з чым узнікла неабходнасць іх падачы і з-за якіх прычын яны не былі пададзены ў суд першай інстанцыі. Аб прыняцці ці адхіленні дадатковых матэрыялаў суд, выслухаўшы меркаванні бакоў, выносіць прысуд. Дадатковыя матэрыялы, калі яны маюць значэнне для вырашэння крымінальнай справы, могуць паслужыць падставай для змянення прыгавору ці яго адмены са спыненнем вядзення па крымінальнай справе. У выпадках, калі дадатковыя матэрыялы патрабуюць праверкі і ацэнкі судом першай інстанцыі, прыгавор адмяняецца, а крымінальная справа накіроўваецца на новы судовы разбор.

Артыкул 385. Парадак разгляду крымінальнай справы і паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі па даследаванні і ацэнцы доказаў

1. Старшыня пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі адкрывае судовае пасяджэнне і абвяшчае, якая крымінальная справа падлягае разгляду. Затым ён упэўніваецца, хто прыбыў па крымінальнай справе, высвятляе, ці своечасова бакі апавешчаны аб дні разгляду крымінальнай справы, ці ўручаны копіі скаргі ці пратэсту абвінавачанаму і пацярпеламу ў выпадках, прадугледжаных часткай 3 артыкула 373 гэтага Кодэкса, пасля чаго суд вырашае пытанне аб магчымасці разгляду крымінальнай справы. Пасля гэтага старшыня пасяджэння абвяшчае склад суда, паведамляе, хто з'яўляецца пракурорам, перакладчыкам, і апытвае асоб, якія з'явіліся па справе, ці ёсць у іх заявы аб адводзе.

2. Старшыня пасяджэння апытвае асоб, якія з'явіліся па справе, аб хадайніцтвах, якія ёсць у іх. Па заяўленых хадайніцтвах суд выносіць прысуд.

3. Разгляд крымінальнай справы адкладваецца, калі:

1) на пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі не прыбылі асобы, удзел якіх з'яўляецца абавязковым па законе ці прызнаны неабходным судом (суддзёй) апеляцыйнай інстанцыі;

2) абвінавачанаму не была ўручана копія апеляцыйнай скаргі пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы, іх прадстаўнікоў, апеляцыйнага пратэсту пракурора, якія змяшчаюць просьбу аб адмене ці змяненні прыгавору на падставах, якія могуць пацягнуць за сабой пагаршэнне становішча абвінавачанага, а пацярпеламу – копія пратэсту на гэтых падставах, за выключэннем выпадкаў, калі абвінавачаны ўцёк ці адмовіўся ад іх атрымання;

3) бакі не своечасова апавешчаны аб месцы і часе разгляду крымінальнай справы, за выключэннем выпадкаў, калі абвінавачаны ўцёк ці адмовіўся ад атрымання паведамлення.

4. Разгляд крымінальнай справы пачынаецца з даклада аднаго з суддзяў суда апеляцыйнай інстанцыі, які выкладае сутнасць справы, скаргі ці пратэсту і пярэчанняў на іх. Пасля даклада суддзі асобы, якія падалі скаргі, даюць тлумачэнні, а пракурор выказвае сваё меркаванне па іх, а таксама аб законнасці, абгрунтаванасці, справядлівасці прыгавору. У выпадку разгляду справы па апеляцыйным пратэсце пасля выкладання суддзёй сутнасці справы пракурор абгрунтоўвае пратэст, а затым заслухоўваюцца тлумачэнні іншых удзельнікаў працэсу. У выпадку падачы дадатковых матэрыялаў старшыня пасяджэння ці суддзя знаёміць з імі асоб, указаных у артыкуле 383 гэтага Кодэкса, калі яны ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні.

5. Абвінавачаны, яго абаронца і законны прадстаўнік, пацярпелы, прыватны абвінаваўца, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі, калі яны ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні, даюць тлумачэнні.

6. Пацярпелыя, сведкі, дапытаныя ў судзе першай інстанцыі, эксперты, спецыялісты могуць быць выкліканы ў суд апеляцыйнай інстанцыі для дачы растлумачэнняў па сутнасці дадзеных імі паказанняў ці заключэнняў, калі іх выклік па хадайніцтве бакоў ці па сваёй ініцыятыве прызнаў неабходным суддзя ў ходзе падрыхтоўкі судовага пасяджэння ці суд апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе справы.

7. Пры разглядзе крымінальнай справы суд па хадайніцтве бакоў ці па ўласнай ініцыятыве таксама мае права:

1) прызначыць судова-псіхіятрычную ці іншую экспертызу, калі яе правядзенне магчымае па матэрыялах, якія ёсць у справе ці дадаткова пададзены;

2) даследаваць доказы, якія ёсць у крымінальнай справе і не былі даследаваны судом першай інстанцыі, і даць ім ацэнку, калі для гэтага не патрабуецца правядзення судовага разбору па першай інстанцыі;

3) даць ацэнку доказам, якія былі даследаваны судом першай інстанцыі, але не атрымалі ацэнку ў прыгаворы, калі для гэтага не патрабуецца правядзення судовага разбору па першай інстанцыі;

4) выпатрабаваць дакументы і іншыя звесткі аб стане здароўя, сямейным становішчы, мінулых судзімасцях і іншых даных аб асобе абвінавачанага;

5) выпатрабаваць іншыя дакументы і звесткі, якія маюць значэнне для вырашэння справы.

8. Аб адкладанні разбору крымінальнай справы ў выпадках, прадугледжаных часткай 3 і пунктам 1 часткі 7 гэтага артыкула, суд выносіць прысуд.

9. Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права даследаваць доказы з выкарыстаннем сістэм відэа-канферэнц-сувязі.

10. Заслухаўшы ўдзельнікаў судовага пасяджэння, суд выдаляецца ў дарадчы пакой для вынясення прысуду.

11. У выпадках заслухоўвання судом апеляцыйнай інстанцыі тлумачэнняў абвінавачанага, пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы, растлумачэнняў сведак, экспертаў, спецыялістаў па сутнасці дадзеных імі паказанняў ці заключэнняў у судзе першай інстанцыі, а таксама даследавання дадатковых матэрыялаў ход судовага пасяджэння фіксуецца з выкарыстаннем сродкаў аўдыя- і (ці) відэазапісу з далучэннем носьбітаў адпаведнай інфармацыі да матэрыялаў крымінальнай справы.

12. Меры ўздзеяння за парушэнне парадку судовага пасяджэння вызначаюцца правіламі артыкула 307 гэтага Кодэкса.

Артыкул 386. Вынясенне апеляцыйнага прысуду

1. У выніку разгляду крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку суд прымае адно з наступных рашэнняў:

1) пакідае прыгавор без змянення, а скаргі ці пратэст – без задавальнення;

2) адмяняе прыгавор і накіроўвае справу на новы судовы разбор у суд першай інстанцыі;

3) адмяняе прыгавор і спыняе вядзенне па крымінальнай справе;

4) змяняе прыгавор;

5) спыняе апеляцыйнае вядзенне ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 8 ці 9 часткі 1 артыкула 380 гэтага Кодэкса.

2. Пры вынясенні апеляцыйнага прысуду суд кіруецца патрабаваннямі артыкулаў 351, 354 і 358 гэтага Кодэкса.

3. Рэзалютыўная частка вынесенага апеляцыйнага прысуду неадкладна абвяшчаецца ў зале судовага пасяджэння старшынёй пасяджэння або адным з суддзяў пасля вяртання суда з дарадчага пакоя.

Артыкул 387. Межы паўнамоцтваў суда апеляцыйнай інстанцыі

1. Суд пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку мае права адмяніць або змяніць абвінаваўчы прыгавор на падставах, якія могуць пацягнуць за сабой паляпшэнне становішча абвінавачанага, незалежна ад зместу доказаў апеляцыйных скаргі ці пратэсту.

2. Абвінаваўчы прыгавор можа быць адменены ў сувязі з магчымым прымяненнем закона аб больш цяжкім злачынстве або за мяккасцю пакарання, а таксама на іншых падставах, якія могуць пацягнуць за сабой пагаршэнне становішча абвінавачанага пры новым разглядзе справы, толькі ў выпадках, калі на гэтых падставах пададзена апеляцыйная скарга пацярпелым, прыватным абвінаваўцам ці іх прадстаўнікамі або прынесены апеляцыйны пратэст пракурорам, а доказы, якія змяшчаюцца ў іх, і доказы, якія ёсць у справе, патрабуюць дадатковай праверкі і ацэнкі судом першай інстанцыі.

3. Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права змяніць абвінаваўчы прыгавор у сувязі з прымяненнем закона аб больш цяжкім злачынстве або прызначэннем больш строгага пакарання, а таксама і на іншых падставах, якія пагаршаюць становішча абвінавачанага, толькі ў выпадках, калі на гэтых падставах пададзена апеляцыйная скарга пацярпелым, прыватным абвінаваўцам ці іх прадстаўнікамі або прынесены апеляцыйны пратэст пракурорам.

Артыкул 388. Адмена ці змяненне апраўдальнага прыгавору

Апраўдальны прыгавор можа быць адменены ці зменены ў апеляцыйным парадку няйнакш як па скарзе пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы ці іх прадстаўнікоў, прадстаўніка грамадзянскага істца, або па скарзе абвінавачанага, апраўданага судом, або па пратэсце пракурора.

Артыкул 389. Падставы да адмены ці змянення прыгавору

1. Падставамі да адмены ці змянення прыгавору пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку з'яўляюцца:

1) неадпаведнасць высноў суда, выкладзеных у прыгаворы, фактычным абставінам крымінальнай справы;

2) істотнае парушэнне крымінальна-працэсуальнага закона;

3) няправільнае прымяненне крымінальнага закона;

4) неадпаведнасць прызначанага судом пакарання ці прымененых іншых мер крымінальнай адказнасці цяжару злачынства і асобе абвінавачанага.

2. Абвінаваўчы прыгавор ці іншыя рашэнні суда першай інстанцыі падлягаюць адмене з накіраваннем крымінальнай справы на новы судовы разбор, калі дапушчаныя судом першай інстанцыі парушэнні, указаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, з'яўляюцца неадольнымі ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

3. Апраўдальны прыгавор, прысуд аб спыненні вядзення па крымінальнай справе ці іншае рашэнне, вынесеныя на карысць абвінавачанага, не могуць быць адменены па матывах істотнага парушэння крымінальна-працэсуальнага закона, калі невінаватасць абвінавачанага не аспрэчваецца бакамі.

Артыкул 390. Неадпаведнасць высноў суда, выкладзеных у прыгаворы, фактычным абставінам крымінальнай справы

Прыгавор прызнаецца не адпаведным фактычным абставінам крымінальнай справы, калі:

1) высновы суда не пацвярджаюцца доказамі, даследаванымі на судовым пасяджэнні;

2) суд не ўлічыў абставін, якія маглі істотна паўплываць на яго высновы;

3) пры наяўнасці супярэчлівых доказаў, якія маюць істотнае значэнне для высноў суда, у прыгаворы не ўказана, на якіх падставах суд прыняў адзін з гэтых доказаў і адхіліў іншыя;

4) высновы суда, выкладзеныя ў прыгаворы, змяшчаюць істотныя супярэчнасці, якія паўплывалі ці маглі паўплываць на рашэнне пытання аб вінаватасці ці

невінаватасці абвінавачанага, на правільнасць прымянення крымінальнага закона ці вызначэнне меры пакарання.

Артыкул 391. Істотныя парушэнні крымінальна-працэсуальнага закона

1. Істотнымі парушэннямі крымінальна-працэсуальнага закона прызнаюцца такія парушэнні, якія шляхам пазбаўлення ці абмежавання гарантаваных законам правоў удзельнікаў крымінальнага працэсу пры судовым разглядзе крымінальнай справы ці іншым шляхам перашкодзілі суду ўсебакова, поўна і аб'ектыўна даследаваць абставіны крымінальнай справы і паўплывалі ці маглі паўплываць на пастанову законнага і абгрунтаванага прыгавору.

2. Прыгавор падлягае адмене ў любым выпадку, калі:

1) судом пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 303 гэтага Кодэкса, вядзенне па крымінальнай справе не было спынена;

2) прыгавор пастаноўлены незаконным складам суда;

3) крымінальная справа разгледжана пры адсутнасці абвінавачанага, акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткай 2 артыкула 294 гэтага Кодэкса;

4) крымінальная справа разгледжана без удзелу абаронцы ў тых выпадках, калі паводле закона яго ўдзел абавязковы;

5) судом неабгрунтавана адхілена хадайніцтва бакоў (боку), з прычыны чаго засталіся нявысветленымі такія абставіны, выяўленне якіх магло мець істотнае значэнне пры пастанове прыгавору, а таксама не была праведзена экспертыза, калі яе правядзенне па законе з'яўляецца абавязковым;

6) на судовым пасяджэнні не былі даследаваны доказы, аб існаванні якіх было вядома суду, якія маюць значэнне для праверкі доказаў аб невінаватасці абвінавачанага, прымяненні крымінальнага закона аб менш цяжкім злачынстве ці іншага паляпшэння становішча абвінавачанага;

7) не былі даследаваны абставіны, указаныя ў прысудзе (пастанове) суда, які накіраваў крымінальную справу на новы судовы разбор;

8) парушана тайна нарады суддзяў пры пастанове прыгавору;

9) прыгавор не падпісаны кімсьці з суддзяў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 354 гэтага Кодэкса;

10) у крымінальнай справе адсутнічае пратакол судовага пасяджэння.

Артыкул 392. Няправільнае прымяненне крымінальнага закона

Няправільным прымяненнем крымінальнага закона з'яўляюцца:

1) прымяненне закона, які не падлягае прымяненню;

2) непрымяненне закона, які падлягае прымяненню;

3) вытлумачэнне закона, якое супярэчыць яго дакладнаму сэнсу.

Артыкул 393. Неадпаведнасць прызначанага судом пакарання ці прымененых іншых мер крымінальнай адказнасці цяжару злачынства і асобе абвінавачанага

Не адпаведнымі цяжару злачынства і асобе абвінавачанага прызнаюцца пакаранне ці іншыя меры крымінальнай адказнасці, калі прызначанае судом першай інстанцыі пакаранне хоць і не выходзіць за межы, прадугледжаныя адпаведным крымінальным законам, але па сваім відзе, тэрміне, памеры, а іншыя меры крымінальнай адказнасці, прымененыя ў адпаведнасці з артыкуламі 77–79 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, па сваім прафілактычным, папраўчым і выпрабавальным уздзеянні з'яўляюцца яўна несправядлівымі як з прычыны мяккасці, так і з прычыны строгасці.

Артыкул 394. Наступствы адмены прыгавору з накіраваннем крымінальнай справы на новы разгляд

1. Адмяняючы прыгавор з накіраваннем крымінальнай справы на новы разгляд у суд першай інстанцыі, суд апеляцыйнай інстанцыі ўказвае ў прысудзе, ці павінна быць пачата вядзенне па крымінальнай справе са стадыі прызначэння судовага разбору ці са стадыі судовага разбору.

2. У выпадку адмены прыгавору з прычыны парушэнняў, дапушчаных пры судовым разборы справы ў судзе першай інстанцыі, справа накіроўваецца на новы судовы разбор у суд, які пастанавіў прыгавор, але ў іншым складзе ці ў іншы суд.

Артыкул 395. Адмена абвінаваўчага прыгавору са спыненнем вядзення па крымінальнай справе

Суд пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку адмяняе абвінаваўчы прыгавор і спыняе вядзенне па крымінальнай справе ў наступных выпадках:

1) пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкулах 29 і 30 гэтага Кодэкса;

2) калі доказамі, даследаванымі судом першай інстанцыі, прад'яўленае асобе абвінавачанне не пацверджана і няма падстаў для новага судовага разбору.

Артыкул 396. Змяненне прыгавору

1. Пры выяўленні парушэнняў закона, у тым ліку калі пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку будзе выяўлена, што судом першай інстанцыі няправільна прыменены крымінальны закон ці прызначана пакаранне, не адпаведнае цяжару злачынства і асобе абвінавачанага, суд апеляцыйнай інстанцыі можа, не накіроўваючы справу на новы судовы разбор, унесці неабходныя змяненні ў прыгавор з захаваннем патрабаванняў артыкула 387 гэтага Кодэкса.

2. Пры ўнясенні ў прыгавор суда першай інстанцыі змяненняў суд апеляцыйнай інстанцыі мае права з улікам палажэнняў часткі 1 артыкула 387 гэтага Кодэкса:

1) прымяніць закон аб менш цяжкім злачынстве і прызначыць абвінавачанаму пакаранне ў адпаведнасці з новай кваліфікацыяй дзеяння;

2) змякчыць прызначанае судом пакаранне, від папраўчай установы, умовы адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі;

3) унесці ў прыгавор іншыя змяненні, калі гэта не пацягне за сабой пагаршэння становішча абвінавачанага.

3. Па апеляцыйных скаргах пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы, іх прадстаўнікоў, апеляцыйным пратэсце пракурора суд апеляцыйнай інстанцыі мае права з улікам палажэнняў часткі 3 артыкула 387 гэтага Кодэкса:

1) не выходзячы за межы прад'яўленага абвінавачання ці за межы абвінавачання, падтрыманага пры судовым разборы крымінальнай справы ў судзе першай інстанцыі дзяржаўным ці прыватным абвінаваўцам, прымяніць закон аб больш цяжкім злачынстве і прызначыць у сувязі з гэтым больш строгае пакаранне;

2) павялічыць тэрмін, памер асноўнага і (ці) дадатковага пакаранняў, прызначыць больш строгі від пакарання, за выключэннем пажыццёвага зняволення і пакарання смерцю, калі прызначанае па прыгаворы суда першай інстанцыі пакаранне будзе прызнана яўна несправядлівым з прычыны мяккасці;

2^1) павялічыць тэрмін, памер асноўнага і (ці) дадатковага пакаранняў, прызначыць больш строгі від пакарання, за выключэннем пажыццёвага зняволення і пакарання смерцю, калі гэта выклікана няправільным прымяненнем нормаў крымінальнага закона, якія рэгулююць прызначэнне пакарання па правілах артыкулаў 49–57 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

3) прызначыць дадатковае пакаранне ў адпаведнасці з патрабаваннямі крымінальнага закона, калі яно неабгрунтавана не прызначана судом першай інстанцыі;

4) павялічыць тэрмін ці памер пакарання, прызначыць больш строгі від пакарання, калі гэта выклікана непрымяненнем або няправільным прымяненнем нормаў крымінальнага закона, якія рэгулююць прызначэнне пакарання па правілах артыкулаў 65, 66, 69, 69^1, 71–73 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама выключыць неабгрунтаванае прымяненне акта амністыі;

5) адмяніць асуджэнне з адтэрміноўкай выканання пакарання (артыкул 77 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), ці асуджэнне з умоўным непрымяненнем пакарання (артыкул 78 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), ці

асуджэнне без прызначэння пакарання (артыкул 79 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), ці асуджэнне з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару (артыкул 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) і прызначыць абвінавачанаму пакаранне, прадугледжанае крымінальным законам;

6) адмяніць асуджэнне без прызначэння пакарання (артыкул 79 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) ці асуджэнне з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару (артыкул 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), прызначыць пакаранне ў адпаведнасці з крымінальным законам і адтэрмінаваць яго выкананне ці пастанавіць аб яго ўмоўным непрымяненні пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкуламі 77 ці 78 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь адпаведна;

7) адмяніць асуджэнне з умоўным непрымяненнем пакарання (артыкул 78 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) і прымяніць адтэрміноўку выканання пакарання пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 77 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

8) павялічыць тэрмін адтэрміноўкі выканання пакарання ці выпрабавальны тэрмін пры асуджэнні абвінавачанага адпаведна з адтэрміноўкай выканання пакарання ці яго ўмоўным непрымяненнем, ускласці на абвінавачанага дадатковыя абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 77, 78 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, адмяніць адтэрміноўку дадатковага пакарання, прызначыць дадатковае пакаранне, калі будзе прызнана, што прымененых судом першай інстанцыі мер недастаткова для выпраўлення абвінавачанага;

9) змяніць фактычны пачатак падліку тэрміну адбывання пакарання ў сувязі з няправільным яго падлікам, невыкананнем судом першай інстанцыі правілаў складання пакаранняў ці заліку тэрміну ўтрымання пад вартай ці хатнім арыштам у тэрмін пакарання;

10) замяніць прызначаны судом першай інстанцыі абвінавачанаму больш мяккі від папраўчай установы, чым прадугледжана законам, і вызначаны судом першай інстанцыі рэжым адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, умовы адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі на больш строгія;

11) вызначыць лёс рэчыўных доказаў, маёмасці, на якую накладзены арышт, калі па іх не было прынята рашэнне судом першай інстанцыі або рашэнне пастаноўлена з парушэннем закона, калі для гэтага не патрабуюцца праверка і ацэнка доказаў судом першай інстанцыі;

12) прымяніць у адносінах да абвінавачанага палажэнні артыкулаў 106 і 107 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

13) прымяніць палажэнні артыкула 46^1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 397. Змест апеляцыйнага прысуду

1. Апеляцыйны прысуд складаецца з уводнай, апісальна-матывацыйнай і рэзалютыўнай частак.

2. Ва ўводнай частцы прысуду павінны быць указаны:

1) час і месца вынясення прысуду;

2) найменне і склад суда апеляцыйнай інстанцыі, які вынес прысуд;

3) асобы, якія падалі апеляцыйную скаргу ці прынеслі апеляцыйны пратэст;

4) звесткі аб абвінавачаным, у адносінах да якога разглядаецца крымінальная справа;

5) асобы, якія ўдзельнічалі ў разглядзе справы ў апеляцыйнай інстанцыі.

3. У апісальна-матывацыйнай частцы прысуду павінны быць выкладзены змест рэзалютыўнай часткі прыгавору; сціслы змест доказаў асобы, якая падала скаргу ці прынесла пратэст, а таксама пярэчанняў іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні суда апеляцыйнай інстанцыі; матывы прынятага рашэння. Калі скарга ці

пратэст пакінуты без задавальнення, указваюцца падставы, на якіх доказы, што змяшчаюцца ў скарзе ці пратэсце, прызнаны неабгрунтаванымі ці неістотнымі. Пры адмене ці змяненні прыгавору ўказваецца, патрабаванні якіх артыкулаў крымінальнага ці крымінальна-працэсуальнага закона парушаны і ў чым заключаюцца гэтыя парушэнні, а таксама ўказваюцца падставы, на якіх прызначанае судом першай інстанцыі пакаранне ці прымененыя іншыя меры крымінальнай адказнасці прызнаны не адпаведнымі цяжару злачынства і асобе абвінавачанага. У выпадку накіравання справы на новы судовы разбор указваецца, якія парушэнні закона павінны быць ліквідаваны. Указанні суда апеляцыйнай інстанцыі абавязковыя пры новым судовым разборы крымінальнай справы судом першай інстанцыі. Пры гэтым апеляцыйная інстанцыя не мае права прадвызначаць пытанні аб даказанасці ці недаказанасці абвінавачання, дакладнасці ці недакладнасці таго ці іншага доказу і перавагах адных доказаў перад іншымі, прымяненні судом першай інстанцыі таго ці іншага крымінальнага закона і аб меры пакарання, іншых мерах крымінальнай адказнасці.

4. У рэзалютыўнай частцы прысуду ўказваецца рашэнне суда апеляцыйнай інстанцыі па скарзе ці пратэсце.

Артыкул 398. Судовы разбор крымінальнай справы судом першай інстанцыі пасля адмены першапачатковага прыгавору

1. Пасля адмены першапачатковага прыгавору судовы разбор крымінальнай справы вядзецца ў агульным парадку.

2. Узмацненне пакарання, прымяненне закона аб больш цяжкім злачынстве або іншае пагаршэнне становішча абвінавачанага пры новым судовым разборы крымінальнай справы судом першай інстанцыі дапускаюцца толькі пры ўмове, калі першапачатковы прыгавор быў адменены па апеляцыйнай скарзе пацярпелага, прыватнага абвінаваўцы ці іх прадстаўнікоў або па апеляцыйным пратэсце пракурора ў сувязі з неабходнасцю прымянення закона аб больш цяжкім злачынстве або за мяккасцю пакарання ці іншых мер крымінальнай адказнасці, а таксама і на іншых падставах, якія цягнуць за сабой пагаршэнне становішча абвінавачанага.

РАЗДЗЕЛ XI
ВЫКАНАННЕ ПРЫГАВОРУ

ГЛАВА 41
ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ПРЫГАВОРАЎ, ПРЫСУДАЎ, ПАСТАНОЎ СУДА

Артыкул 399. Уступленне прыгавору, прысуду, пастановы суда ў законную сілу і накіраванне іх да выканання

1. Прыгавор, прысуд, пастанова суда ўступаюць у законную сілу пасля сканчэння тэрміну на апеляцыйныя абскарджанне і апратэставанне. Абскарджаныя ці апратэставаныя прыгавор, прысуд, пастанова суда ўступаюць у законную сілу з моманту прыняцця па іх рашэння судом апеляцыйнай інстанцыі.

2. Прыгавор, прысуд, пастанова суда, якія не падлягаюць апеляцыйным абскарджанню і апратэставанню, уступаюць у сілу з моманту іх абвяшчэння.

3.Прыгавор, прысуд, пастанова, якія ўступілі ў законную сілу, накіроўваюцца да выканання судом, які іх пастанавіў, не пазней за трое сутак з дня ўступлення іх у законную сілу ці вяртання крымінальнай справы з суда апеляцыйнай інстанцыі.

4. Абвінаваўчы прыгавор без прызначэння пакарання, а таксама прыгавор, які вызваляе абвінавачанага ад пакарання, ці апраўдальны прыгавор прыводзяцца ў выкананне неадкладна пасля яго абвяшчэння.

5. Прысуд і пастанова суда ўступаюць у законную сілу і накіроўваюцца да выканання пасля сканчэння тэрміну на іх абскарджанне і апратэставанне, а ў выпадку прынясення прыватных скаргаў ці пратэсту – пасля разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі.

6. Прысуд і пастанова суда, якія не падлягаюць абскарджанню і апратэставанню, уступаюць у законную сілу і накіроўваюцца да выканання неадкладна пасля іх вынясення.

7. Пратэст пракурора на пастанову суда аб умоўна-датэрміновым вызваленні, аб замене пакарання больш мяккім, аб вызваленні ад адбывання пакарання па захворванні прыпыняе выкананне пастановы.

7[1]. Аб прыпыненні выканання пастановы суда пракурор, які прынёс пратэст, паведамляе органам унутраных спраў па месцы жыхарства (месцы знаходжання) асуджаных або органам, якія загадваюць выкананнем пакарання.

7[2]. У выпадку адмены пастановы суда аб умоўна-датэрміновым вызваленні, аб вызваленні ад адбывання пакарання па захворванні асуджаныя накіроўваюцца для адбывання пакарання органамі ўнутраных спраў па іх месцы жыхарства (месцы знаходжання).

7[3]. У выпадку адмены пастановы суда аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім, аб замене пакарання больш мяккім па захворванні асуджаныя адбываюць раней прызначанае пакаранне з моманту прыняцця гэтага рашэння, аб чым паведамляецца органам, якія загадваюць выкананнем пакарання.

8. Суд, які пастанавіў прыгавор, вынес прысуд ці пастанову, абавязаны ажыццяўляць кантроль за іх выкананнем.

9. За выкананнем пакарання, прызначанага судом, наглядае пракурор.

Артыкул 400. Абавязковасць выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда

1.Прыгавор, прысуд і пастанова суда, якія ўступілі ў законную сілу, абавязковыя для выканання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь усімі фізічнымі і юрыдычнымі асобамі.

2. Невыкананне прыгавору, прысуду ці пастановы суда або перашкаджэнне іх выкананню цягнуць за сабой адказнасць па артыкуле 423 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 401. Парадак накіравання да выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда

1. Судом разам з копіяй прыгавору накіроўваецца пісьмовае распараджэнне аб выкананні прыгавору ў орган, які ў адпаведнасці з крымінальна-выканаўчым заканадаўствам абавязаны забяспечыць яго выкананне. У адносінах да пенсіянера, асуджанага да пазбаўлення волі, копія прыгавору накіроўваецца ў орган, які выплачвае пенсію. Пры асуджэнні асобы за ўчыненне ім у перыяд праходжання дзяржаўнай, ваеннай службы ці службы ў ваенізаванай арганізацыі цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства супраць інтарэсаў службы або цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, звязанага з выкарыстаннем службовай асобай сваіх службовых паўнамоцтваў, копія прыгавору, што ўступіў у законную сілу, накіроўваецца ў орган, які ажыццяўляе прызначэнне і пераразлік пенсій па месцы жыхарства гэтай асобы. У выпадку змянення прыгавору пры разглядзе крымінальнай справы ў апеляцыйным ці наглядным парадку да копіі прыгавору дадаюцца копіі прысуду ці пастановы суда апеляцыйнай ці нагляднай інстанцыі.

1[1]. Прыгавор, які змяшчае звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, накіроўваецца да выканання шляхам накіравання выпіскі з прыгавору, якая складаецца з уводнай і рэзалютыўнай частак прыгавору і не змяшчае звестак, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, з пісьмовым распараджэннем аб яго выкананні ў орган, які ў адпаведнасці з крымінальна-выканаўчым заканадаўствам абавязаны забяспечыць яго выкананне.

2. Органы, якія загадваюць выкананнем пакарання, у тэрмін не пазней за дзесяць сутак абавязаны паведаміць суду, які пастанавіў прыгавор, вынес прысуд, пастанову, аб прыняцці іх да выканання.

3. Суд мае права ў мэтах павышэння выхаваўчага ўздзеяння прыгавору, прысуду, пастановы накіраваць іх копіі па месцы працы, знаходжання адпаведнай установы адукацыі ці жыхарства асуджанага.

Артыкул 402. Суды, якія вырашаюць пытанні, звязаныя з прывядзеннем прыгавору, прысуду, пастановы ў выкананне

1. Пытанні адтэрміноўкі адбывання пакарання, змянення ці спынення прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння, спынення прымусовага лячэння ў адносінах да асоб, якія хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію і таксікаманію, вызвалення асуджанай ад адбывання пакарання, замены яго больш мяккім пакараннем ці накіравання асуджанай для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам, у адпаведнасці з часткай 4 артыкула 93 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама вызвалення ад пакарання ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору вырашаюцца судом, які пастанавіў прыгавор ці вынес прысуд, пастанову. Гэтым жа судом выпраўляюцца яўныя апіскі, падліковыя памылкі і недакладнасці, вырашаюцца ўсялякага роду сумненні і няяснасці, якія ўзнікаюць пры выкананні судовых рашэнняў, а таксама іншыя пытанні, не вырашаныя ў прыгаворы, прысудзе, пастанове суда, якія не закранаюць сутнасці высноў суда (прыгавору) і якія не цягнуць за сабой пагаршэння становішча асуджанага, а таксама спаганяюцца працэсуальныя выдаткі, калі яны не былі спагнаны пры пастанове прыгавору. Калі прыгавор, прысуд, пастанова выконваюцца па-за раёнам дзейнасці суда, які прыняў гэтыя судовыя рашэнні, указаныя пытанні вырашаюцца раённым (гарадскім) судом па месцы выканання прыгавору. Копіі прысуду, пастановы накіроўваюцца суду, які пастанавіў прыгавор.

2. Вызваленне ад пакарання з-за захворвання, умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання, замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем, перавод асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, перавод з адной папраўчай калоніі ці выхаваўчай калоніі ў іншую папраўчую калонію іншага віду, з папраўчай калоніі ў турму і з турмы ў папраўчую калонію вырашаюцца прысудам (пастановай) раённага (гарадскога) суда па месцы адбывання пакарання асуджаным незалежна ад таго, якім судом быў пастаноўлены прыгавор, вынесены прысуд ці пастанова.

3. Пытанні аб замене далейшага адбывання пажыццёвага зняволення пазбаўленнем волі або пакарання смерцю пажыццёвым зняволеннем вырашае суд, які пастанавіў прыгавор, ці аднайменны суд па месцы адбывання пакарання.

4. Пытанні аб адмене ўмоўнага непрымянення пакарання і накіравання асуджанага для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам у адпаведнасці з артыкулам 78 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аб вызваленні ад пакарання асуджанага, у дачыненні да якога выкананне пакарання адтэрмінавана на падставах, прадугледжаных артыкулам 77 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аб прадаўжэнні адтэрміноўкі выканання пакарання, а таксама аб адмене такой адтэрміноўкі і накіраванні асуджанага для адбывання пазбаўлення волі вырашаюцца прысудам (пастановай) раённага (гарадскога) суда па месцы жыхарства асуджанага ці суда, які пастанавіў прыгавор.

4[1]. Пытанні аб замене штрафу грамадскімі работамі ці прымусовымі мерамі выхаваўчага характару ў адпаведнасці з часткай 2 артыкула 111 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь вырашае суд, які пастанавіў прыгавор.

5. Вызваленне ад пакарання, змякчэнне пакарання або іншае паляпшэнне становішча асуджанага з прычыны ўступлення ў сілу крымінальнага закона, які мае ў адпаведнасці з артыкулам 9 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь адваротную сілу, праводзіць суд, які пастанавіў прыгавор, ці суд па месцы адбывання пакарання па

заяве асуджанага або па прадстаўленні органа, які загадвае выкананнем пакарання, ці наглядальнай камісіі.

Артыкул 402[1]. Суды, якія ўстанаўліваюць, прадаўжаюць, спыняюць прэвентыўны нагляд і мяняюць патрабаванні прэвентыўнага нагляду

1. Прэвентыўны нагляд за асобамі, указанымі ў частцы 3 і пункце 1 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае суд па месцы адбывання імі пакарання.

2. Прэвентыўны нагляд за асобай, указанай у пункце 2 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае суд па месцы жыхарства гэтай асобы.

3. Прэвентыўны нагляд працягвае суд па месцы жыхарства асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.

4. Выключана.

5. Выключана.

6. Прэвентыўны нагляд спыняе ў выпадках, указаных у пунктах 1–3 часткі 11 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, суд па месцы жыхарства асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.

7. Патрабаванні прэвентыўнага нагляду мяняе суд па месцы жыхарства асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.

Артыкул 402[2]. Парадак вырашэння судом пытанняў, звязаных з прывядзеннем прыгавору, прысуду, пастановы ў выкананне, а таксама ўстанаўленнем, прадаўжэннем, спыненнем прэвентыўнага нагляду і змяненнем патрабаванняў прэвентыўнага нагляду

1. Пытанні, звязаныя з выкананнем прыгавору (прысуду, пастановы), вырашае суддзя аднаасобна на судовым пасяджэнні з удзелам пракурора. Удзел пракурора не з'яўляецца абавязковым пры выпраўленні судом яўных апісак, падліковых памылак і недакладнасцей, вырашэнні ўсялякага роду сумненняў і няяснасцей, якія ўзнікаюць пры выкананні судовых рашэнняў, іншых пытанняў, не вырашаных у прыгаворы (прысудзе, пастанове) суда, якія не закранаюць сутнасці высноў суда (прыгавору) і не цягнуць за сабой пагаршэння становішча асуджанага, а таксама пры спагнанні працэсуальных выдаткаў, калі яны не былі спагнаны пры пастанове прыгавору.

2. На судовае пасяджэнне, як правіла, выклікаецца асуджаны. Калі пытанне тычыцца выканання прыгавору ў частцы грамадзянскага іску, выклікаецца таксама грамадзянскі ісцец.

3. Пры вырашэнні судом пытанняў аб вызваленні ад пакарання, аб змякчэнні пакарання ці аб іншым паляпшэнні становішча асуджанага ў адпаведнасці з артыкулам 9 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, аб вызваленні ад пакарання ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору, аб умоўна-датэрміновым вызваленні ад пакарання, аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем, аб пераводзе асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, аб пераводзе з адной папраўчай калоніі ці выхаваўчай калоніі ў іншую папраўчую калонію іншага віду, з папраўчай калоніі ў турму і з турмы ў папраўчую калонію на судовае пасяджэнне выклікаецца прадстаўнік органа, які загадвае выкананнем пакарання, а таксама запрашаецца прадстаўнік наглядальнай камісіі ці камісіі па справах непаўналетніх пры мясцовым выканаўчым і распарадчым органе.

4. Пры вырашэнні судом пытанняў аб вызваленні асуджанага ад адбывання пакарання з-за захворвання абавязковая прысутнасць старшыні ці члена ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, якая дала заключэнне.

5. Пры разглядзе судом пытанняў, звязаных са скарачэннем выпрабавальнага тэрміну асуджанаму з умоўным непрымяненнем пакарання, вызваленнем ад пакарання асуджанага, прадаўжэннем адтэрміноўкі выканання пакарання асуджанаму, у дачыненні да якога выкананне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі было адтэрмінавана, або звязаных з накіраваннем гэтых асоб для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам, а таксама з адтэрміноўкай адбывання пакарання асуджанай, вызваленнем яе ад адбывання пакарання, заменай яго больш мяккім пакараннем, накіраваннем асуджанай для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам, у адпаведнасці з часткай 4 артыкула 93 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, выклікаюцца прадстаўнікі органаў, якія кантралююць паводзіны асуджаных.

6. Пры разглядзе судом пытанняў устанаўлення, прадаўжэння ці спынення прэвентыўнага нагляду, а таксама змянення патрабаванняў прэвентыўнага нагляду выклікаюцца прадстаўнікі адміністрацыі папраўчай установы або органа ўнутраных спраў, а таксама асоба, у дачыненні да якой устанаўліваецца, працягваецца ці спыняецца прэвентыўны нагляд, а таксама мяняюцца патрабаванні прэвентыўнага нагляду.

6[1]. Пры ўстанаўленні судом у якасці патрабавання прэвентыўнага нагляду абавязку асобы не выязджаць за межы Рэспублікі Беларусь або пры адмене гэтага патрабавання прэвентыўнага нагляду, а таксама пры спыненні прэвентыўнага нагляду, які прадугледжвае ўказанае патрабаванне, суд не пазней за адзін дзень з даты прыняцця адпаведнага рашэння ва ўстаноўленым парадку накіроўвае звесткі аб асобе для ўключэння ў банк даных аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана, ці ў Спіс асоб, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана.

7. У прызначаны час старшыня адкрывае судовае пасяджэнне і абвяшчае, які матэрыял падлягае разгляду.

8. Сакратар судовага пасяджэння (сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі) дакладае старшыні аб яўцы асоб, выкліканых на судовае пасяджэнне, і паведамляе аб прычынах няяўкі адсутных.

9. Старшыня абвяшчае склад суда, паведамляе, хто з'яўляецца пракурорам, сакратаром судовага пасяджэння (сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі) і перакладчыкам.

10. Старшыня высвятляе асобу асуджанага. Пры гэтым высвятляюцца анкетныя даныя, указаныя ў частцы 1 артыкула 316 гэтага Кодэкса. Затым старшыня высвятляе асабістыя даныя і паўнамоцтвы іншых асоб, указаных у частках 2–6 гэтага артыкула.

11. Старшыня растлумачвае асуджанаму яго права заявы адводу складу суда, сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі) і перакладчыку. Заяўленыя адводы суд вырашае ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 79–87 гэтага Кодэкса.

12. Старшыня апытвае асуджанага, а таксама выкліканых на судовае пасяджэнне асоб, ці ёсць у іх хадайніцтвы. Вырашэнне заяўленых хадайніцтваў праводзіцца ў адпаведнасці з часткамі 2 і 4 артыкула 322 гэтага Кодэкса.

13. Разгляд справы пачынаецца з даклада суддзі, пасля чаго ён заслухоўвае асоб, якія з'явіліся на судовае пасяджэнне. Затым на судовым пасяджэнні даследуюцца дакументы, якія ёсць у справе. Пасля гэтага заслухоўваецца заключэнне пракурора. Пасля дачы пракурорам заключэння суддзя выдаляецца ў дарадчы пакой для вынясення пастановы, якая павінна быць абвешчана на судовым пасяджэнні.

Артыкул 403. Разгляд судом хадайніцтваў аб зняцці судзімасці і ўключэнні часу адбывання папраўчых работ у агульны працоўны стаж

1. Хадайніцтвы аб зняцці судзімасці ў адпаведнасці з артыкулам 98 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь разглядаюць раённыя

(гарадскія) суды па месцы жыхарства асоб, якія адбылі пакаранне, ці суд, які пастанавіў прыгавор.

2. Хадайніцтвы аб зняцці судзімасці разглядае суддзя аднаасобна на адкрытым судовым пасяджэнні з выклікам асуджанага, удзелам пракурора і прадстаўніка органа, які загадвае выкананнем пакарання і распачаў хадайніцтва.

3. Разгляд хадайніцтваў аб зняцці судзімасці і ўключэнні часу адбывання папраўчых работ у агульны працоўны стаж праводзіцца ў адпаведнасці з часткамі сёмай – трынаццатай артыкула 402^2 гэтага Кодэкса.

4. Паўторнае хадайніцтва аб зняцці судзімасці можа быць распачата не раней за адзін год з дня вынясення пастановы аб адмове.

5. Хадайніцтвы асоб аб уключэнні часу адбывання папраўчых работ у агульны працоўны стаж разглядаюць суддзі раённых (гарадскіх) судоў па месцы жыхарства асоб, якія адбылі папраўчыя работы, у парадку, прадугледжаным часткай другой гэтага артыкула.

6. Хадайніцтвы аб уключэнні часу адбывання папраўчых работ у агульны працоўны стаж могуць быць заяўлены на працягу года пасля іх адбыцця.

РАЗДЗЕЛ XII
ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ПРЫГАВОРАЎ, ПРЫСУДАЎ, ПАСТАНОЎ, ЯКІЯ ЎСТУПІЛІ Ў ЗАКОННУЮ СІЛУ(НАГЛЯДНАЕ ВЯДЗЕННЕ)

ГЛАВА 42
ВЯДЗЕННЕ Ў НАГЛЯДНАЙ ІНСТАНЦЫІ

Артыкул 404. Пратэст у парадку нагляду на прыгавор, прысуд, пастанову суда, якія ўступілі ў законную сілу

1. Прыгавор, прысуд, пастанова суда, якія ўступілі ў законную сілу, могуць быць перагледжаны ў парадку нагляду па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. Пратэсты ў парадку нагляду маюць права прыносіць:

1) Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь – на прыгаворы, прысуды, пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

11) намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь – на прыгаворы, прысуды, пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

2) старшыні абласнога, Мінскага гарадскога судоў, пракуроры абласцей, горада Мінска ў межах сваёй кампетэнцыі – на прыгаворы, прысуды, пастановы раённага (гарадскога) суда і апеляцыйныя прысуды судовай калегіі па крымінальных справах адпаведна абласнога, Мінскага гарадскога судоў.

3. Асоба, якая прынесла пратэст, мае права яго адклікаць. Адкліканне пратэсту дапускаецца да пачатку судовага пасяджэння, на якім пратэст падлягае разгляду.

Артыкул 405. Прыпыненне выканання прыгавору, прысуду, пастановы суда

1. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй маюць права прыпыніць да вырашэння справы ў парадку нагляду выкананне апратэставаных прыгавору, прысуду, пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, акрамя пастановы пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

11. Намеснікі Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй маюць права прыпыніць да вырашэння справы ў парадку нагляду выкананне апратэставаных прыгавору, прысуду, пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Старшыні абласнога, Мінскага гарадскога судоў, пракуроры абласцей, горада Мінска ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй маюць права прыпыніць да вырашэння справы ў парадку нагляду выкананне апратэставаных прыгавору, прысуду, пастановы раённага (гарадскога) суда і апеляцыйнага прысуду судовай калегіі па крымінальных справах адпаведна абласнога, Мінскага гарадскога судоў.

3. Пры наяўнасці даных, якія сведчаць аб яўным парушэнні закона, названыя ў гэтым артыкуле асобы маюць права адначасова з выпатрабаваннем крымінальнай справы прыпыняць выкананне прыгавору, прысуду, пастановы суда да іх апратэставання на тэрмін, не большы за тры месяцы.

Артыкул 406. Тэрміны перагляду ў парадку нагляду прыгавораў, прысудаў, пастаноў судоў

Перагляд у парадку нагляду абвінаваўчага прыгавору, прысуду, пастановы суда ў сувязі з неабходнасцю прымянення закона аб больш цяжкім злачынстве, за мяккасцю пакарання ці на іншых падставах, якія цягнуць за сабой пагаршэнне становішча асуджанага, а таксама перагляд апраўдальнага прыгавору або прысуду, пастановы суда аб спыненні вядзення па крымінальнай справе дапускаюцца на працягу аднаго года пасля ўступлення іх у законную сілу і толькі па пратэстах упаўнаважаных на тое службовых асоб, прынесеных на гэтых падставах.

Артыкул 407. Суды, якія разглядаюць крымінальныя справы ў парадку нагляду

1. Прэзідыумы абласнога, Мінскага гарадскога судоў разглядаюць крымінальныя справы па пратэстах на апеляцыйныя прысуды гэтых судоў і на прыгаворы, прысуды і пастановы раённых (гарадскіх) судоў, якія ўступілі ў законную сілу.

2. Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае крымінальныя справы па пратэстах на пастановы прэзідыумаў абласных, Мінскага гарадскога судоў ці пры адсутнасці кворуму ў прэзідыумах указаных судоў па пратэстах на прыгаворы, прысуды, пастановы раённых (гарадскіх) судоў, якія ўступілі ў законную сілу, а таксама прыгаворы, прысуды, пастановы абласных, Мінскага гарадскога судоў, калі яны не былі прадметам апеляцыйнага разгляду ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

3. Выключана.

4. Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае крымінальныя справы па пратэстах на прыгаворы і прысуды судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4^1. Пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае крымінальныя справы па пратэстах на пастановы прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці пры адсутнасці кворуму ў прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па пратэстах на прыгаворы, прысуды, пастановы раённых (гарадскіх) судоў, абласных, Мінскага гарадскога судоў, якія ўступілі ў законную сілу.

5. Калі ў разглядзе крымінальнай справы ў судзе першай ці апеляцыйнай інстанцыі прымала ўдзел большасць членаў прэзідыумаў абласнога, Мінскага гарадскога судоў, то старшыні абласнога, Мінскага гарадскога судоў ці пракуроры вобласці, горада Мінска, якія прынеслі пратэст, накіроўваюць крымінальную справу адпаведна Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь для абмеркавання пытання аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду ў судовую калегію па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

6. Калі ў крымінальнай справе, якая падлягае разгляду ў прэзідыумах абласнога, Мінскага гарадскога судоў, прымала ўдзел у судзе першай ці апеляцыйнай інстанцыі большасць членаў прэзідыума, то справа па пратэсце Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікаў

перадаецца на разгляд у парадку нагляду ў судовую калегію па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

6[1]. Калі ў крымінальнай справе, якая падлягае разгляду ў прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прымала ўдзел большасць членаў прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у судзе першай ці другой інстанцыі або ў парадку нагляду, то намеснікі Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, намеснікі Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, якія прынеслі пратэст, накіроўваюць крымінальную справу адпаведна Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь для рашэння пытання аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду ў пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

6[2]. Калі ў крымінальнай справе, якая падлягае разгляду ў прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па пратэсце Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, прымала ўдзел большасць членаў прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у судзе першай ці другой інстанцыі або ў парадку нагляду, справа перадаецца на разгляд у парадку нагляду ў пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

7. Крымінальныя справы па пратэстах на апеляцыйныя прысуды судоў і на прыгаворы, прысуды і пастановы, якія ўступілі ў законную сілу разглядаюцца пры наяўнасці большасці членаў прэзідыума адпаведнага суда або не менш чым двух трацей членаў пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 408. Права звароту са скаргай аб пераглядзе прыгавораў, прысудаў, пастаноў

1. Правам звароту са скаргай на падставах, указаных у артыкуле 389 гэтага Кодэкса, валодаюць асуджаны, апраўданы, іх абаронцы і законныя прадстаўнікі, прадстаўнік памерлага абвінавачанага, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык ці іх прадстаўнікі. Скарга падаецца ў пісьмовай форме.

2. Скарга павінна быць разгледжана не пазней за адзін месяц з дня яе паступлення, а ў выпадку выпатрабавання крымінальнай справы – не пазней за адзін месяц з дня паступлення справы. Тэрмін разгляду па скарзе, якая патрабуе дадатковага вывучэння і праверкі, можа быць прадоўжаны асобамі, указанымі ў артыкуле 404 гэтага Кодэкса, да двух месяцаў з дня паступлення справы. У выпадку значнага аб'ёму ці асаблівай складанасці крымінальнай справы тэрмін, прадугледжаны гэтым артыкулам, можа быць прадоўжаны ўказанымі асобамі да трох месяцаў.

3. Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь і іх намеснікам скарга ў парадку нагляду на прыгавор, прысуд, пастанову суда можа быць пададзена ў выпадку пакідання яе без задавальнення старшынямі абласных, Мінскага гарадскога судоў, пракурорамі абласцей, горада Мінска.

Артыкул 408. Змест скаргі

1. Скарга аб пераглядзе прыгавору, пастановы, прысуду павінна змяшчаць:

1) найменне органа (асобы), якому адрасуецца скарга;

2) даныя аб асобе, якая падала скаргу, з указаннем яе месца жыхарства ці месца знаходжання і працэсуальнага становішча;

3) указанне на прыгавор, пастанову (прысуд) і наступныя судовыя пастановы па справе, змест прынятых рашэнняў і найменні судоў, іх якія пастанавілі;

4) доказы асобы, якая падала скаргу, з указаннем на тое, у чым заключаецца няправільнасць прыгавору ці іншай судовай пастановы і ў чым заключаецца яе просьба;

5) подпіс асобы, якая падала скаргу.

2. Калі скарга раней падавалася ў наглядную інстанцыю, у ёй павінна быць указана на гэта, а таксама на рашэнне, прынятае па скарзе.

3. Да скаргі павінны быць прыкладзены завераныя судом копіі судовых пастаноў, вынесеных па справе, а таксама рашэнні ніжэйстаячай інстанцыі, калі яна разглядала

пададзеную ёй скаргу ў парадку нагляду. Да скаргі, пададзенай абаронцам ці прадстаўніком, павінен быць прыкладзены дакумент, які пацвярджае іх паўнамоцтвы.

4. Калі скарга не адпавядае патрабаванням часткі 1 гэтага артыкула, яна вяртаецца асобе, якая яе падала, не пазней за пяць сутак з моманту яе паступлення.

Артыкул 409. Выпатрабаванне крымінальнай справы

1. Асобы, указаныя ў артыкуле 404 гэтага Кодэкса, маюць права выпатрабаваць у межах сваёй кампетэнцыі любую крымінальную справу, акрамя справы, па якой пачаты судовы разбор, для вырашэння пытання аб прынясенні пратэсту на ўступіўшыя ў законную сілу прыгавор, прысуд, пастанову суда.

2. Права выпатрабавання крымінальных спраў з раённых (гарадскіх) судоў належыць таксама пракурорам раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённым і прыраўнаваным да іх транспартным пракурорам, якія ў неабходных выпадках уносяць вышэйстаячаму пракурору прадстаўленне аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду.

Артыкул 410. Прыняцце рашэння па выпатрабаванай крымінальнай справе

1. Убачыўшы, што прыгавор, прысуд ці пастанова суда па выпатрабаванай крымінальнай справе з'яўляюцца незаконнымі ці неабгрунтаванымі, асобы, указаныя ў артыкуле 404 гэтага Кодэкса, прыносяць пратэст і накіроўваюць справу з пратэстам у адпаведную наглядную інстанцыю.

2. У выпадку, калі асоба, якая выпатрабавала справу, не выявіла ў ім падставы для прынясення пратэсту, справа вяртаецца ў суд, з якога яна была выпатрабавана. Пратэст у гэтым выпадку не прыносіцца, аб чым паведамляецца асобам, па скаргах якіх справа была выпатрабавана для праверкі.

Артыкул 411. Парадак разгляду крымінальнай справы па пратэсце

1. Крымінальная справа па пратэсце на прыгавор, прысуд, пастанову суда, якія ўступілі ў законную сілу, разглядаецца нагляднай інстанцыяй на судовым пасяджэнні не пазней за адзін месяц, а пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – не пазней за тры месяцы з дня паступлення крымінальнай справы з пратэстам.

2. У разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду прымаюць удзел:

1) у прэзідыумах абласнога, Мінскага гарадскога судоў – пракуроры вобласці, горада Мінска або іх намеснікі;

2) у судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – пракурор, упаўнаважаны Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь;

3) у прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікі.

3. У неабходных выпадках на пасяджэнне суда, які разглядае крымінальную справу ў парадку нагляду, для дачы тлумачэнняў могуць быць запрошаны асуджаны, апраўданы, іх абаронцы, законныя прадстаўнікі, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, прадстаўнікі. Запрошаным на пасяджэнне асобам забяспечваецца магчымасць азнаямлення з пратэстам.

4. Крымінальную справу дакладвае старшыня суда ці па яго прызначэнні член прэзідыума ці суддзя, які раней не ўдзельнічаў у разглядзе справы. Дакладчык выкладае абставіны справы, змест прыгавору, прысуду, пастановы, пратэсту. Дакладчыку могуць быць зададзены пытанні суддзямі, якія разглядаюць справу. Калі ў судовым пасяджэнні ўдзельнічаюць асуджаны, апраўданы, іх абаронцы, законныя прадстаўнікі, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык, прадстаўнікі, яны маюць права пасля даклада суддзі даваць свае вусныя тлумачэнні.

5. Затым слова даецца пракурору для падтрымання прынесенага ім ці вышэйстаячым пракурорам пратэсту ці для дачы заключэння аб крымінальнай справе, якая разглядаецца па пратэсце старшыні суда ці яго намесніка.

6. У абмеркаванні пратэсту прымаюць удзел адпаведна толькі члены прэзідыумаў абласнога, Мінскага гарадскога судоў, прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Прэзідыумы абласнога, Мінскага гарадскога судоў, прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пленум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь выносяць пастанову, а судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – прысуд, якія прымаюцца большасцю галасоў. Пры роўнасці галасоў пратэст, разгледжаны ў прэзідыумах абласнога, Мінскага гарадскога судоў, прэзідыуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і пленуме Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, лічыцца пакінутым без задавальнення.

7. Прысуд (пастанова) суда нагляднай інстанцыі складаецца ў дарадчым пакоі. Рэзалютыўная частка вынесенага прысуду (пастановы) неадкладна абвяшчаецца ў зале судовага пасяджэння старшынёй або адным з суддзяў.

Артыкул 412. Прысуды і пастановы суда, які разглядае пратэст

1. У выніку разгляду крымінальнай справы ў парадку нагляду суд можа:

1) пакінуць пратэст без задавальнення;

2) адмяніць прыгавор і ўсе наступныя прысуды і пастановы і спыніць вядзенне па крымінальнай справе або перадаць яе на новы судовы разбор;

3) адмяніць апеляцыйны прысуд, а таксама наступныя прысуды і пастановы, калі яны былі вынесены, і перадаць справу на новы апеляцыйны разгляд;

4) адмяніць прысуды і пастановы, вынесеныя ў парадку нагляду, і пакінуць у сіле са змяненнем ці без змянення прыгавор суда і апеляцыйны прысуд;

5) унесці змяненні ў прыгавор, прысуд ці пастанову суда.

2. Суд, які разглядае справу ў парадку нагляду, пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 33 гэтага Кодэкса, выносіць прыватны прысуд (пастанову).

Артыкул 413. Падставы да адмены ці змянення прыгавору, прысуду, пастановы суда, якія ўступілі ў законную сілу

1. Падставамі да адмены ці змянення прыгавору пры разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду з'яўляюцца абставіны, указаныя ў артыкуле 389 гэтага Кодэкса.

2. Прысуды суда першай інстанцыі, пастановы суддзі, прысуды апеляцыйнай інстанцыі, прысуды і пастановы нагляднай інстанцыі падлягаюць адмене ці змяненню, калі суд, які разглядае пратэст, прызнае, што гэтым прысудам ці пастановай вынесена незаконнае ці неабгрунтаванае рашэнне судом першай інстанцыі, беспадстаўна пакінуты без змянення, адменены ці зменены вышэйстаячым судом папярэднія прысуды, пастановы ці прыгавор па крымінальнай справе, або калі пры разглядзе справы ў вышэйстаячым судзе былі дапушчаны парушэнні закона, якія паўплывалі ці маглі паўплываць на правільнасць вынесеных ім прысуду ці пастановы.

Артыкул 414. Межы правоў нагляднай інстанцыі

1. Пры разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду суд не звязаны доказамі пратэсту і абавязаны праверыць усё вядзенне па справе ў поўным аб'ёме. Калі па справе асуджана некалькі асоб, а пратэст прынесены ў адносінах да аднаго ці часткі асуджаных, суд абавязаны праверыць справу ў адносінах да ўсіх асуджаных.

2. Суд пры разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду можа змякчыць прызначанае асуджанаму пакаранне ці прымяніць закон аб менш цяжкім злачынстве, змяніць рэжым адбывання пакарання, змяніць фактычны пачатак падліку тэрміну адбывання пакарання ў сувязі з няправільным яго падлікам, залікам часу папярэдняга ўзяцця пад варту, выключыць прымяненне акта амністыі, устанавіць фактычны пачатак падліку тэрміну адбывання пакарання і вырашыць іншыя пытанні, звязаныя са змяненнем прыгавору, але не мае права прымяніць закон аб больш цяжкім злачынстве,

а таксама ўзмацніць пакаранне, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 4 і 10 часткі 3 артыкула 396 гэтага Кодэкса.

3. Прызнаўшы няправільным апраўданне абвінавачанага ці спыненне вядзення па крымінальнай справе ў судзе першай ці апеляцыйнай інстанцыі, таксама як і прызначэнне асуджанаму пакарання, па сваёй мяккасці не адпаведнага ўчыненаму, суд нагляднай інстанцыі мае права з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 388 і 389 гэтага Кодэкса адмяніць прыгавор ці прысуд і накіраваць справу на новы судовы разгляд адпаведна ў суд першай ці апеляцыйнай інстанцыі.

4. Калі беспадстаўнае спыненне вядзення па крымінальнай справе ці незаконнае змякчэнне пакарання асуджанаму былі дапушчаны пры разглядзе справы ў парадку нагляду, вышэйстаячая наглядная інстанцыя мае права адмяніць прысуд ці пастанову ніжэйстаячай нагляднай інстанцыі і пакінуць у сіле са змяненнем ці без змянення прыгавор суда і апеляцыйны прысуд.

5. У выпадку, калі па крымінальнай справе асуджана ці апраўдана некалькі абвінавачаных, суд не мае права адмяніць прыгавор, прысуд, пастанову ў частцы тых асуджаных ці апраўданых, у адносінах да якіх пратэст не прыносіцца, калі адмена прыгавору, прысуду, пастановы пагаршае іх становішча.

Артыкул 415. Абавязковасць указанняў суда, які разглядае крымінальную справа ў парадку нагляду

1. Указанні суда, які разглядае крымінальную справу ў парадку нагляду, абавязковыя пры другасным разглядзе справы судом.

2. Суд, які разглядае крымінальную справу ў парадку нагляду, не мае права выяўляць ці лічыць даказанымі факты, якія не былі выяўлены ў прыгаворы ці адхілены ім, а таксама не мае права прадвызначаць пытанні аб даказанасці ці недаказанасці абвінавачання, аб дакладнасці ці недакладнасці таго ці іншага доказу і аб перавагах адных доказаў перад іншымі, аб прымяненні судом першай інстанцыі таго ці іншага крымінальнага закона і аб меры пакарання.

3. Таксама суд пры разглядзе крымінальнай справы ў парадку нагляду, адмяняючы апеляцыйны прысуд, не мае права прадвызначаць высновы, якія могуць быць зроблены апеляцыйнай інстанцыяй пры другасным разглядзе справы.

Артыкул 416. Змест прысуду ці пастановы суда

1. Пастанова, вынесеная пры разглядзе крымінальнай справы прэзідыумамі абласнога, Мінскага гарадскога судоў, прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь або пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, ці прысуд судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у парадку нагляду павінны адпавядаць патрабаванням артыкула 397 гэтага Кодэкса.

2. Прысуд падпісваецца ўсім складам суда, пастанова прэзідыума – старшынёй пасяджэння прэзідыума, а пастанова пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – старшынёй пасяджэння і сакратаром пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

3. Прысуд ці пастанова суда далучаюцца да крымінальнай справы разам з пратэстам.

Артыкул 417. Разбор крымінальнай справы пасля адмены першапачатковага прыгавору

1. Пасля адмены першапачатковага прыгавору судовы разбор крымінальнай справы праводзіцца ў агульным парадку.

2. Узмацненне пакарання або прымяненне закона аб больш цяжкім злачынстве пры новым разглядзе крымінальнай справы судом першай інстанцыі дапускаюцца толькі пры ўмове, калі першапачатковы прыгавор быў адменены ў парадку нагляду за

мяккасцю пакарання ці ў сувязі з неабходнасцю прымянення закона аб больш цяжкім злачынстве.

РАЗДЗЕЛ XIII
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ ПА АБСТАВІНАХ, ЯКІЯ НЯДАЎНА АДКРЫЛІСЯ

ГЛАВА 43
АДНАЎЛЕННЕ ВЯДЗЕННЯ ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ З-ЗА АБСТАВІН, ЯКІЯ НЯДАЎНА АДКРЫЛІСЯ

Артыкул 418. Падставы аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся

1. Прыгавор, прысуд і пастанова суда, якія ўступілі ў законную сілу, могуць быць адменены і вядзенне па крымінальнай справе можа быць адноўлена з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся.

2. Падставамі аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, з'яўляюцца:

1) выяўленая прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, яўная лжывасць паказанняў пацярпелага, сведкі, заключэння эксперта, падложнасць рэчыўных доказаў, пратаколаў следчых і судовых дзеянняў і іншых дакументаў ці яўная няправільнасць перакладу, якія выклікалі пастанову незаконнага прыгавору, вынясенне незаконнага прысуду ці пастановы;

2) выяўленыя прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, злачынныя дзеянні службовых асоб органа крымінальнага пераследавання, якія выклікалі пастанову незаконнага прыгавору, вынясенне незаконных прысуду ці пастановы;

3) выяўленыя прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, злачынныя дзеянні суддзяў, учыненыя імі пры разглядзе гэтай справы;

4) выяўленыя праверкай ці расследаваннем у парадку, прадугледжаным артыкулам 420 гэтага Кодэкса, і выкладзеныя ў заключэнні пракурора іншыя абставіны, не вядомыя суду пры пастанове прыгавору, вынясенні прысуду ці пастановы, якія самі па сабе ці разам з раней выяўленымі акалічнасцямі сведчаць аб невінаватасці асуджанага ці аб учыненні ім іншага па ступені цяжару злачынства, чым тое, за якое ён асуджаны, або аб вінаватасці апраўданай асобы ці асобы, у дачыненні да якой вядзенне па справе было спынена, абставіны, якія сведчаць, што асуджаны, з якім было заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, паведаміў заведама фальшывыя звесткі ці наўмысна ўтаіў ад органа, які вядзе крымінальны працэс, абставіны, выяўленне якіх магло мець істотнае значэнне па крымінальнай справе.

3. Абставіны, пералічаныя ў пунктах 1–3 часткі 2 гэтага артыкула, могуць быць выяўлены, апрача прыгавору, прысудам суда, пастановай суддзі, пракурора, следчага, органа дазнання аб спыненні вядзення па крымінальнай справе за сканчэннем тэрміну даўнасці, паводле акта амністыі, калі ён адмяняе прымяненне пакарання за ўчыненае грамадска небяспечнае дзеянне, ці ў сувязі са смерцю абвінавачанага.

Артыкул 419. Тэрміны аднаўлення вядзення па крымінальнай справе

1. Перагляд абвінаваўчага прыгавору з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, на карысць асуджанага тэрмінамі не абмежаваны.

2. Смерць асуджанага не з'яўляецца перашкодай да аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, у мэтах рэабілітацыі.

3. Перагляд апраўдальнага прыгавору, прысуду ці пастановы аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, а таксама перагляд абвінаваўчага прыгавору па матывах мяккасці пакарання ці неабходнасці прымянення да асуджанага закона аб больш цяжкім злачынстве дапускаюцца толькі на працягу тэрмінаў даўнасці

прыцягнення да крымінальнай адказнасці, устаноўленых артыкулам 83 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і не пазней за адзін год з дня адкрыцця новых абставін.

4. Днём адкрыцця новых абставін лічыцца:

1) дзень уступлення ў законную сілу пастаноўленага прыгавору, вынесеных прысуду, пастановы на падставах, прадугледжаных пунктамі 1–3 часткі другой артыкула 418 гэтага Кодэкса;

2) дзень падпісання пракурорам заключэння аб неабходнасці аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, у выпадках, прадугледжаных пунктам 4 часткі другой артыкула 418 гэтага Кодэкса.

Артыкул 420. Распачынанне вядзення з-за абставін, якія нядаўна **адкрыліся**

1. Права распачынання вядзення з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, належыць пракурору.

2. Нагодамі да распачынання вядзення з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, служаць заявы грамадзян, паведамленні службовых асоб, дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, а таксама даныя, атрыманыя ў ходзе папярэдняга расследавання і судовага разбору іншых крымінальных спраў.

3. Калі ў атрыманай заяве ці паведамленні ёсць спасылка на наяўнасць прыгавору, пастаноўленага ў сувязі з абставінамі, указанымі ў пунктах 1–3 часткі другой артыкула 418 гэтага Кодэкса, пракурор арганізуе праверку па абставінах, якія нядаўна адкрыліся, выпатрабуе копію прыгавору і даведку суда аб уступленні яго ў законную сілу.

4. Калі ў заяве ці паведамленні ўказваецца на абставіны, пералічаныя ў пункце 4 часткі другой артыкула 418 гэтага Кодэкса, пракурор у межах сваёй кампетэнцыі выносіць пастанову аб распачынанні вядзення з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, і арганізуе расследаванне гэтых абставін. Пры гэтым расследаванне праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі главы 22 гэтага Кодэкса.

5. Калі пракурор не бачыць падстаў для распачынання вядзення з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, ён адмаўляе ў гэтым сваёй матываванай пастановай, аб чым паведамляе заяўнікам, якія могуць абскардзіць пастанову вышэйстаячаму пракурору ці ў суд.

Артыкул 421. Дзеянні пракурора пасля заканчэння праверкі ці расследавання абставін, якія нядаўна адкрыліся

1. Пасля заканчэння праверкі ці расследавання абставін, якія нядаўна адкрыліся, пры наяўнасці падстаў для аднаўлення вядзення па крымінальнай справе пракурор накіроўвае справу са сваім заключэннем, копіяй прыгавору ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 1–3 часткі другой артыкула 418 гэтага Кодэкса, ці матэрыяламі праверкі або расследавання ў выпадку, прадугледжаным пунктам 4 часткі другой таго ж артыкула гэтага Кодэкса, у адпаведны суд, кіруючыся пры гэтым часткай першай артыкула 422 гэтага Кодэкса.

2. Пры адсутнасці падстаў для аднаўлення вядзення па крымінальнай справе пракурор сваёй матываванай пастановай спыняе распачатае ім вядзенне з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся.

3. Пастанова аб спыненні вядзення па абставінах, якія нядаўна адкрыліся, даводзіцца да ведама зацікаўленых асоб з растлумачэннем ім права абскардзіць яе вышэйстаячаму пракурору.

Артыкул 422. Вырашэнне судом пытання аб аднаўленні вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся

1. Заключэнне пракурора аб неабходнасці аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, разглядаецца:

1) у адносінах да прыгавораў, прысудаў (пастаноў) раённых (гарадскіх) судоў – прэзідыумамі абласнога, Мінскага гарадскога судоў;

2) у адносінах да прыгавораў, прысудаў, пастаноў абласных, Мінскага гарадскога судоў – судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

3) у адносінах да прыгавораў, прысудаў, пастаноў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

4) у адносінах да пастаноў прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – пленумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Папярэдні разгляд крымінальнай справы ў апеляцыйным парадку ці ў парадку нагляду не перашкаджае яе разгляду ў той жа судовай інстанцыі ў парадку аднаўлення вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся.

3. Заключэнне пракурора аб аднаўленні вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, разглядаецца на судовым пасяджэнні ў адпаведнасці з правіламі артыкула 411 гэтага Кодэкса.

Артыкул 423. Прысуд, пастанова суда, які разглядае заключэнне пракурора

Разгледзеўшы заключэнне пракурора аб аднаўленні вядзення па крымінальнай справе з-за абставін, якія нядаўна адкрыліся, суд выносіць адзін(адну) з наступных прысудаў ці пастаноў:

1) аб адмене прыгавору, прысуду, пастановы суда і аб перадачы справы пракурору для правядзення новага папярэдняга расследавання ці ў адпаведны суд на новы судовы разбор;

2) аб адмене прыгавору, прысуду, пастановы суда і аб спыненні вядзення па крымінальнай справе, калі не патрабуецца новае папярэдняе расследаванне ці судовы разбор для прыняцця канчатковага рашэння па крымінальнай справе;

3) аб адхіленні заключэння пракурора.

Артыкул 424. Вядзенне па крымінальнай справе пасля адмены судовых рашэнняў

1. Папярэдняе расследаванне і судовы разбор па крымінальнай справе пасля адмены судовых рашэнняў па ёй у сувязі з абставінамі, якія нядаўна адкрыліся, а таксама абскарджанне і апратэстоўванне вынесеных новых судовых рашэнняў праводзяцца ў агульным парадку.

2. Пры судовым разборы крымінальнай справы, па якой быў адменены прыгавор у сувязі з абставінамі, якія нядаўна адкрыліся, суд першай інстанцыі не звязаны памерамі пакарання, прызначанага па адмененым прыгаворы.

РАЗДЗЕЛ XIV
АСАБЛІВАСЦІ ВЯДЗЕННЯ ПА АСОБНЫХ КАТЭГОРЫЯХ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ

ГЛАВА 44
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ ПРЫВАТНАГА АБВІНАВАЧАННЯ

Артыкул 425. Парадак вядзення па крымінальных справах прыватнага абвінавачання

Парадак вядзення па крымінальных справах прыватнага абвінавачання аб злачынствах, пералічаных у частках другой і трэцяй артыкула 26 гэтага Кодэкса, вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса, за выключэннямі, устаноўленымі гэтай главой.

Артыкул 426. Распачынанне крымінальных спраў прыватнага абвінавачання

1. Крымінальная справа прыватнага абвінавачання распачынаецца асобай, пацярпелай ад злачынства, а ў выпадку яе няздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя

выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любым з яе дарослых блізкіх сваякоў ці членаў сям'і, законным прадстаўніком ці прадстаўніком юрыдычнай асобы шляхам падачы ў раённы (гарадскі) суд заявы аб учыненні ў адносінах да яе злачынства, прадугледжанага часткамі 2 і 3 артыкула 26 гэтага Кодэкса.

2. Заява павінна змяшчаць найменне суда, у які яна падаецца; пераказ абставін злачынства, звесткі аб асобе, якая яго ўчыніла, і доказы, якія пацвярджаюць вінаватасць асобы ва ўчыненні злачынства; пералік асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне ў якасці сведак; звесткі аб перакладчыку, эксперце, спецыялісце і іншых асобах, якіх заяўнік лічыць неабходным выклікаць на судовае пасяджэнне. Заява падаецца суду ў копіях па колькасці асоб, у дачыненні да якіх узбуджаецца справа прыватнага абвінавачання.

3. З моманту прыняцця судом заявы асоба, якая падала яго, з'яўляецца прыватным абвінаваўцам, а асоба, у дачыненні да якой пададзена заява, – абвінавачаным. Заяўніку павінны быць растлумачаны яго правы, прадугледжаныя артыкулам 50 гэтага Кодэкса, аб чым складаецца пратакол, які падпісваецца суддзёй і асобай, якая падала заяву.

Артыкул 427. Паўнамоцтвы суда па крымінальнай справе прыватнага абвінавачання да пачатку судовага разбору

1. Суд, прызнаўшы, што заява не адпавядае патрабаванням часткі другой артыкула 426 гэтага Кодэкса, вяртае яе заяўніку для прывядзення ў адпаведнасць з устаноўленымі гэтай главой патрабаваннямі і ўстанаўлівае для гэтага тэрмін да дзесяці сутак. Паўторны зварот з заявай на тых жа падставах пасля пропуску ўказанага тэрміну не дапускаецца.

1[1]. У выпадку, калі абвінавачаны з'яўляецца непаўналетнім, суд сваёй пастановай накіроўвае крымінальную справу пракурору для арганізацыі правядзення папярэдняга следства.

2. Пры неабходнасці атрымання тлумачэнняў, заключэнняў спецыялістаў і іншых даных суд накіроўвае заяву ў орган дазнання для правядзення праверкі, якая павінна быць закончана ў тэрмін да дзесяці сутак.

3. Пры наяўнасці падстаў для прызначэння судовага разбору крымінальнай справы суд у тэрмін да дзесяці сутак з моманту паступлення заявы ці матэрыялаў праверкі, калі яна праводзілася, абавязаны выклікаць абвінавачанага, азнаёміць яго з крымінальнай справай, уручыць копію заявы, растлумачыць правы абвінавачанага на судовым пасяджэнні, прадугледжаныя артыкулам 43 гэтага Кодэкса. У выпадку няяўкі ў суд асобы, у дачыненні да якой пададзена заява, копія заявы і паведамленне з растлумачэннем правоў абвінавачанага, а таксама магчымасці прымірэння бакоў высылаюцца ёй па пошце.

4. Суд абавязаны растлумачыць бакам магчымасць прымірэння. У выпадку паступлення ад іх заяў аб прымірэнні вядзенне па крымінальнай справе судом спыняецца на падставе пункта 5 часткі першай артыкула 29 гэтага Кодэкса.

5. Калі прымірэнне паміж бакамі не дасягнута, суддзя пасля выканання патрабаванняў частак трэцяй і чацвёртай гэтага артыкула прызначае крымінальную справу да разбору на судовым пасяджэнні ў адпаведнасці з правіламі артыкула 281 гэтага Кодэкса.

Артыкул 428. Судовы разбор крымінальнай справы прыватнага абвінавачання

1. Разбор крымінальнай справы прыватнага абвінавачання на судовым пасяджэнні праводзіць суд па агульных правілах судовага разбору, за выключэннямі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

2. Судовы разбор павінен быць пачаты не пазней за чатырнаццаць сутак з моманту прыняцця судом заявы ці матэрыялаў праверкі, калі яна праводзілася. Калі асоба была затрымана ў адпаведнасці з правіламі артыкула 108 гэтага Кодэкса, крымінальная справа прыватнага абвінавачання падлягае разгляду на працягу 24 гадзін

з моманту яе паступлення ў суд. Пры гэтым абавязак па забеспячэнні яўкі ў суд гэтай асобы, а таксама асоб, ад якіх былі атрыманы тлумачэнні, ускладаецца на органы дазнання.

3. Пры прыняцці судом сустрэчнай заявы ад абвінавачанага па крымінальнай справе прыватнага абвінавачання абедзве крымінальныя справы прыватнага абвінавачання могуць быць злучаны і разглядацца ў адным вядзенні. Злучэнне спраў дапускаецца па пастанове суддзі да пачатку судовага пасяджэння. Пры злучэнні спраў у адным вядзенні асобы, якія падалі заявы, удзельнічаюць у судовым разборы адначасова ў якасці прыватнага абвінаваўцы і абвінавачанага. Для падрыхтоўкі да абароны ў сувязі з паступленнем сустрэчнай заявы і злучэннем спраў па хадайніцтве асобы, у дачыненні да якой пададзена сустрэчная заява, справа можа быць адкладзена на тэрмін не большы за трое сутак. Допыт гэтых асоб аб абставінах учынення ў адносінах да іх злачынства, выкладзеных імі ў сваіх заявах, праводзіцца па правілах допыту пацярпелага, а аб абставінах, выкладзеных у сустрэчных заявах, – па правілах допыту абвінавачанага.

4. Абвінавачанне на судовым пасяджэнні падтрымліваюць прыватны абвінаваўца ці яго прадстаўнік.

5. Судовае следства пачынаецца з выкладання сутнасці абвінавачання прыватным абвінаваўцам ці яго прадстаўніком. Пры разглядзе злучанай крымінальнай справы прыватнага абвінавачання сутнасць абвінавачання выкладаецца ў парадку паступлення заяў. Абвінаваўца прадстаўляе доказы, удзельнічае ў іх даследаванні, выкладае суду сваё меркаванне аб сутнасці абвінавачання, аб прымяненні крымінальнага закона і прызначэнні абвінавачанаму пакарання, а таксама па іншых пытаннях, якія ўзнікаюць у час судовага разбору. Прыватны абвінаваўца мае права адмовіцца ад абвінавачання.

6. Няяўка прыватнага абвінаваўцы ці яго прадстаўніка на судовае пасяджэнне суда першай інстанцыі без уважлівых прычын, указаных у частцы пятай артыкула 242 гэтага Кодэкса, цягне за сабой спыненне вядзення па крымінальнай справе.

ГЛАВА 45
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ, УЧЫНЕНЫХ АСОБАМІ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА ВАСЯМНАЦЦАЦІ ГАДОЎ

Артыкул 429. Парадак вядзення па крымінальных справах аб злачынствах непаўналетніх

1. Палажэнні гэтай главы прымяняюцца пры вядзенні па крымінальных справах аб злачынствах, учыненых асобамі, якія не дасягнулі на дзень учынення злачынства васямнаццацігадовага ўзросту.

2. Парадак вядзення па справах аб злачынствах непаўналетніх вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса, а таксама гэтай главой.

3. У выпадку дасягнення непаўналетнім падазраваным ці абвінавачаным васямнаццацігадовага ўзросту ўдзел:

1) абаронцы падазраванага ці абвінавачанага абавязковы і працягваецца да заканчэння вядзення па крымінальнай справе;

2) законных прадстаўнікоў падазраванага ці абвінавачанага ў папярэднім расследаванні ці ў судовым разборы спыняецца, аб чым у адпаведнасці з часткай пятай артыкула 56 гэтага Кодэкса орган, які вядзе крымінальны працэс, выносіць матываваную пастанову (прысуд);

3) педагога ці псіхолага пры допыце падазраванага ці абвінавачанага неабавязковы.

Артыкул 430. Парадак судовага разбору крымінальных спраў аб злачынствах непаўналетніх

Крымінальныя справы аб злачынствах непаўналетніх падлягаюць разгляду спецыяльнымі судамі па справах непаўналетніх або суддзямі, якія маюць спецыяльную падрыхтоўку.

Артыкул 431. Вылучэнне крымінальнай справы ў адносінах да непаўналетняга ў асобнае вядзенне

Крымінальная справа ў адносінах да непаўналетняга, які ўдзельнічаў ва ўчыненні злачынства разам з дарослымі, можа быць вылучана ў асобнае вядзенне ў ходзе папярэдняга следства, калі гэта не створыць перашкод для ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання абставін крымінальнай справы. Да непаўналетняга абвінавачанага, прыцягнутага па адной крымінальнай справе з дарослымі, прымяняюцца правілы гэтай главы.

Артыкул 432. Прымяненне затрымання і мер стрымання ў адносінах да непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага

1. Пры вырашэнні пытання аб прымяненні меры стрымання ў адносінах да непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага ў кожным выпадку павінна абмяркоўвацца магчымасць прымянення такой меры, як аддача непаўналетняга пад нагляд у парадку, прадугледжаным артыкулам 123 гэтага Кодэкса.

2. Затрыманне, а таксама ўзяцце пад варту, хатні арышт у якасці меры стрымання могуць прымяняцца да непаўналетняга пры наяўнасці падстаў, указаных у артыкулах 108, 111, 112 і 117 гэтага Кодэкса, толькі ў выпадках учынення менш цяжкага, цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства.

3. Аб затрыманні, узяцці пад варту ці прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай неадкладна апавяшчаюцца бацькі ці іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетняга.

Артыкул 433. Парадак выкліку непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага

Выклік непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага, якія не ўтрымліваюцца пад вартай, да следчага ці ў суд праводзіцца праз іх бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў, а калі непаўналетні ўтрымліваецца ў спецыяльнай дзіцячай установе, – праз адміністрацыю гэтай установы.

Артыкул 434. Допыт непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага

1. Допыт непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага не можа працягвацца без перапынку больш за дзве гадзіны, а ўвогуле – больш за чатыры гадзіны ў дзень.

2. Пры допыце непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага абаронца, удзел якога ў адпаведнасці з артыкулам 45 гэтага Кодэкса абавязковы, мае права з дазволу следчага, пракурора задаваць пытанні дапытванаму, а пасля заканчэння допыту знаёміцца з пратаколам і рабіць пісьмовыя заўвагі аб правільнасці і паўнаце запісу паказанняў.

Артыкул 435. Удзел педагога ці псіхолага

1. Пры допыце непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага ўдзел педагога ці псіхолага абавязковы.

2. Педагог ці псіхолаг мае права з дазволу следчага, пракурора задаваць пытанні падазраванаму ці абвінавачанаму, а пасля заканчэння допыту знаёміцца з пратаколам допыту і рабіць пісьмовыя заўвагі аб правільнасці і паўнаце зробленых у ім запісаў. Гэтыя правы следчы, пракурор растлумачваюць педагогу ці псіхолагу перад допытам непаўналетняга, аб чым робіцца адзнака ў пратаколе допыту.

3. Удзел педагога ці псіхолага пры допыце непаўналетняга абвінавачанага на судовым пасяджэнні вызначаецца правіламі частак першай і другой гэтага артыкула.

Артыкул 436. Удзел законнага прадстаўніка непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага ў папярэднім следстве

1. Пры наяўнасці ў непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў іх удзел у крымінальнай справе абавязковы.

2. Законны прадстаўнік дапускаецца да ўдзелу ў крымінальнай справе пастановай следчага з моманту першага допыту непаўналетняга ў якасці падазраванага ці абвінавачанага. Пры допуску да ўдзелу ў справе законнаму прадстаўніку тлумачацца яго правы, указаныя ў артыкуле 57 гэтага Кодэкса.

3. Следчы мае права пасля заканчэння папярэдняга следства вынесці пастанову аб непрад'яўленні непаўналетняму для азнаямлення тых матэрыялаў крымінальнай справы, якія могуць аказаць на яго адмоўнае ўздзеянне, а азнаёміць з гэтымі матэрыяламі яго законнага прадстаўніка.

4. Законны прадстаўнік можа быць адхілены ад удзелу ў крымінальнай справе, калі ў ходзе папярэдняга следства выяўлена, што яго дзеянні наносяць урон інтарэсам непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага. Аб гэтым следчы выносіць матываваную пастанову. У такім выпадку да ўдзелу ў справе павінен быць дапушчаны іншы законны прадстаўнік непаўналетняга.

5. Няяўка законнага прадстаўніка непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага, належным чынам апавешчанага аб месцы і часе правядзення следчых дзеянняў з удзелам непаўналетніх, не перашкаджае правядзенню следчых дзеянняў пры наяўнасці пісьмовай згоды на гэта непаўналетніх падазраванага ці абвінавачанага.

Артыкул 437. Удзел законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачанага ў судовым разборы

1. На судовае пасяджэнне павінны быць выкліканы бацькі ці іншыя законныя прадстаўнікі непаўналетняга абвінавачанага, якія карыстаюцца правамі, прадугледжанымі артыкулам 57 гэтага Кодэкса.

2. Законны прадстаўнік матываваным прысудам суда можа быць адхілены ад удзелу ў судовым разборы, калі ў ходзе судовага разбору выяўлена, што яго дзеянні наносяць урон інтарэсам непаўналетняга абвінавачанага. У гэтым выпадку суд павінен вырашыць пытанне аб допуску іншага законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачанага.

3. Няяўка законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачанага, належным чынам апавешчанага аб месцы і часе разгляду крымінальнай справы, які не заявіў хадайніцтва аб яго адкладанні, не перашкаджае разгляду крымінальнай справы, калі суд не палічыць яго ўдзел неабходным.

Артыкул 438. Выдаленне непаўналетняга абвінавачанага з зала судовага пасяджэння

1. Суд па хадайніцтве дзяржаўнага абвінаваўцы, абаронцы ці законнага прадстаўніка непаўналетняга абвінавачанага, а таксама па сваёй ініцыятыве мае права з улікам меркаванняў бакоў сваім прысудам выдаліць непаўналетняга абвінавачанага з залы судовага пасяджэння на час даследавання абставін, якія могуць аказаць на яго адмоўнае ўздзеянне.

2. Пасля вяртання непаўналетняга абвінавачанага ў залу судовага пасяджэння суд паведамляе яму змест разбору, які адбыўся ў яго адсутнасць, і дае непаўналетняму абвінавачанаму магчымасць задаць пытанні асобам, дапытаным без яго ўдзелу.

Артыкул 439. Пытанні, якія вырашае суд пры пастанове прыгавору непаўналетняму абвінавачанаму

1. Пры пастанове прыгавору непаўналетняму абвінавачанаму суд разам з пытаннямі, пералічанымі ў артыкуле 352 гэтага Кодэкса, абавязаны абмеркаваць пытанне аб прызначэнні пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, а таксама аб вызваленні ад пакарання ў адпаведнасці з главамі 15 і 16 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадках прызначэння пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі, суд паведамляе аб гэтым органу, які загадвае яго выкананнем, і ўскладае на яго кантроль за паводзінамі асуджанага.

Артыкул 440. Прымяненне судом у адносінах да непаўналетняга абвінавачанага прымусовых мер выхаваўчага характару

1. Калі па крымінальнай справе аб злачынстве, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, ці аб учыненым упершыню менш цяжкім злачынстве будзе прызнана, што непаўналетні, які ўчыніў гэта злачынства, можа быць выпраўлены без прымянення мер крымінальнага пакарання, суд мае права пастанавіць абвінаваўчы прыгавор і прызначыць яму прымусовыя меры выхаваўчага характару, прадугледжаныя артыкулам 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Копія прыгавору накіроўваецца ў орган, які загадвае выкананнем прымусовых мер выхаваўчага характару.

2. Кантроль за выкананнем непаўналетнім асуджаным патрабаванняў, прадугледжаных прызначанай яму прымусовай мерай выхаваўчага характару, ускладаецца па пастанове суддзі на орган, які загадвае выкананнем прымусовых мер выхаваўчага характару. У выпадку злоснага ўхілення непаўналетняга асуджанага на працягу тэрміну судзімасці ад выканання прымусовай меры выхаваўчага характару суддзя па прадстаўленні органа, які загадвае яе выкананнем, адмяняе прымусовую меру выхаваўчага характару і замяняе яе на больш строгую, прадугледжаную часткай другой артыкула 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 441. Вызваленне судом непаўналетняга асуджанага са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай ці спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы

1. Знаходжанне асуджанага ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай ці спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе можа быць спынена датэрмінова судом, калі непаўналетні выправіўся і няма неабходнасці ў далейшым прымяненні прымусовай меры выхаваўчага характару, а таксама ў выпадках узнікнення абставін, якія перашкаджаюць знаходжанню асуджанага ў гэтых установах. Пытанне аб спыненні яго знаходжання ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай ці спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе разглядаецца і вырашаецца па прадстаўленні органа, што загадвае выкананнем прымусовых мер выхаваўчага характару, аднаасобна суддзёй таго суда, які пастанавіў прыгавор, ці раённага суда па месцы жыхарства непаўналетняга асуджанага на працягу дзесяці сутак з дня паступлення прадстаўлення.

2. На судовае пасяджэнне выклікаюцца непаўналетні асуджаны, яго законны прадстаўнік, абаронца, пракурор і прадстаўнік органа, які загадвае выкананнем прымусовых мер выхаваўчага характару. Няяўка ўказаных асоб не перашкаджае разгляду матэрыялаў.

3. Па выніках разгляду матэрыялаў суддзя ў дарадчым пакоі выносіць пастанову, якая падлягае абвяшчэнню на судовым пасяджэнні.

4. Копія пастановы на працягу пяці сутак накіроўваецца законнаму прадстаўніку непаўналетняга асуджанага, у орган, што загадвае выкананнем прымусовых мер выхаваўчага характару, пракурору і ў суд, які пастанавіў прыгавор.

5. Пастанова можа быць абскарджана і апратэставана ў парадку нагляду.

ГЛАВА 46
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ АБ ПРЫМЯНЕННІ ПРЫМУСОВЫХ МЕР БЯСПЕКІ І ЛЯЧЭННЯ

Артыкул 442. Падставы прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння

1. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння, прадугледжаныя артыкулам 101 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прымяняюцца судом да асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні, прадугледжаныя крымінальным законам, у стане бессвядомасці ці захварэлых пасля ўчынення злачынства на псіхічнае расстройства (захворванне), якое пазбаўляе іх магчымасці ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, калі гэтыя асобы з-за характару ўчыненага імі дзеяння і свайго псіхічнага стану ўяўляюць небяспеку для грамадства.

2. Парадак крымінальнага працэсу па прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса і гэтай главой.

Артыкул 443. Парадак папярэдняга следства

1. Па справах аб прадугледжаных крымінальным законам грамадска небяспечных дзеяннях асоб у стане бессвядомасці, а таксама аб злачынствах асоб, якія захварэлі на псіхічнае расстройства (захворванне) пасля ўчынення злачынства, правядзенне папярэдняга следства абавязковае.

2. Пры правядзенні папярэдняга следства павінны быць высветлены наступныя абставіны:

1) час, месца, спосаб і іншыя абставіны ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам;

2) учыненне асобай грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам;

3) наяўнасць у асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, псіхічнага расстройства (захворвання) у мінулым, ступень і характар псіхічнага расстройства (захворвання) у момант учынення грамадска небяспечнага дзеяння і да часу вядзення па крымінальнай справе;

4) паводзіны асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, як да яго ўчынення, так і пасля;

5) характар і памер урону, прычыненага грамадска небяспечным дзеяннем, прадугледжаным крымінальным законам.

3. Накіраванне асобы на судова-псіхіятрычную экспертызу дапускаецца толькі пры наяўнасці дастатковых даных, якія паказваюць, што менавіта гэта асоба ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, у сувязі з якім распачата крымінальная справа і вядзецца папярэдняе следства.

4. Калі правядзенне следчых дзеянняў з удзелам асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, з прычыны псіхічнага стану гэтай асобы з'яўляецца немагчымым, следчы складае аб гэтым пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 193 і 194 гэтага Кодэкса.

Артыкул 444. Заканчэнне папярэдняга следства

1. Пасля заканчэння папярэдняга следства следчы выносіць пастанову аб:

1) спыненні вядзення па крымінальнай справе – у выпадках, прадугледжаных артыкулам 250 гэтага Кодэкса, ці ў выпадках, калі па характары ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, і сваім псіхічным стане асоба, якая ўчыніла гэта дзеянне, не ўяўляе небяспекі для грамадства;

2) перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд пры выяўленні падстаў для прымянення да асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, прымусовых мер бяспекі і лячэння.

2. У пастанове аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд павінны быць таксама выкладзены абставіны справы, выяўленыя ў ходзе папярэдняга следства, і падставы для прымянення судом прымусовых мер бяспекі і лячэння.

3. Пастанова разам з крымінальнай справай накіроўваецца пракурору, які пры згодзе з пастановай перадае справу ў суд, а пры нязгодзе вяртае справу для правядзення

дадаткова папярэдняга следства. Пры адсутнасці падстаў для прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння пракурор спыняе вядзенне па крымінальнай справе.

31. Калі папярэдняе расследаванне крымінальнай справы ці кіраўніцтва следчай групай ажыццяўляліся пракурорам, ім выносіцца пастанова аб спыненні вядзення па крымінальнай справе або аб накіраванні крымінальнай справы ў суд для вырашэння пытання аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння.

4. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе, калі па характары ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, і сваім псіхічным стане асоба, якая ўчыніла гэта дзеянне, не ўяўляе небяспекі для грамадства, але хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне), следчы ці пракурор у пяцідзённы тэрмін у пісьмовай форме паведамляюць аб ёй у арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства гэтай асобы ці кіраўніцтва аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта (камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта).

Артыкул 445. Прызначэнне судовага разбору

1. Пасля паступлення ў суд крымінальнай справы для прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння суддзя прызначае яе да разбору на судовым пасяджэнні, паведамляе аб гэтым пракурору, абаронцу і законным прадстаўнікам асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, выклікае пацярпелых, сведак, а ў неабходных выпадках – і экспертаў.

2. Суд мае права выклікаць на судовае пасяджэнне асобу, у дачыненні да якой разглядаецца крымінальная справа, калі гэтаму не перашкаджае характар яе захворвання.

Артыкул 446. Судовы разбор

1. Разбор крымінальнай справы, якая паступіла ў суд у парадку, прадугледжаным артыкулам 445 гэтага Кодэкса, адбываецца на судовым пасяджэнні ў адпаведнасці з правіламі глаў 35–38 гэтага Кодэкса з абавязковым удзелам пракурора і абаронцы.

2. На судовым пасяджэнні павінны быць даследаваны доказы, якія выяўляюць ці абвяргаюць учыненне гэтай асобай грамадска небяспечнага дзеяння, прадугледжанага крымінальным законам, заслухана заключэнне экспертаў аб псіхічным стане гэтай асобы і даследаваны іншыя абставіны, якія маюць значэнне для вырашэння пытання аб прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння.

Артыкул 447. Пытанні, якія вырашае суд пры прыняцці рашэння па крымінальнай справе

У працэсе судовага разбору крымінальнай справы павінны быць даследаваны і вырашаны наступныя пытанні:

1) ці мела месца грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам;

2) ці ўчыніла гэта дзеянне асоба, у дачыненні да якой разглядаецца крымінальная справа;

3) ці ўчыніла гэтая асоба грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, у стане бессвядомасці;

4) ці захварэла гэтая асоба пасля ўчынення злачынства на псіхічнае расстройства (захворванне), якое пазбаўляе яе магчымасці разумець сутнасць сваіх дзеянняў ці кіраваць імі, і ці не з'яўляецца гэта захворванне часовым псіхічным расстройствам (захворваннем), якое патрабуе толькі прыпынення вядзення па крымінальнай справе;

5) ці ўяўляе псіхічнае расстройства (захворванне) гэтай асобы небяспеку для яе ці іншых асоб або ці дае магчымасць прычынення ёй іншай шкоды;

6) ці падлягае прымяненню ў адносінах да гэтай асобы прымусовая мера бяспекі і лячэння і якая менавіта.

Артыкул 448. Прысуд (пастанова) суда

1. Прызнаўшы даказаным, што грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае крымінальным законам, учынена гэтай асобай у стане бессвядомасці ці што гэта асоба

пасля ўчынення злачынства захварэла на псіхічнае расстройства (захворванне), якое робіць немагчымым прызначэнне ці выкананне пакарання, суд выносіць прысуд (пастанову) у адпаведнасці з артыкуламі 101–105 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб прымяненні да яе прымусовай меры бяспекі і лячэння з указаннем якой менавіта.

2. Калі асоба, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, не ўяўляе небяспекі з-за свайго псіхічнага стану і характару ўчыненага ёй дзеяння, суд выносіць прысуд (пастанову) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе і непрымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння.

3. У выпадку, калі суд прызнае, што ўдзел асобы ва ўчыненні грамадска небяспечнага дзеяння не даказаны, таксама як і пры выяўленні абставін, прадугледжаных артыкуламі 29 і 30 гэтага Кодэкса, суд выносіць прысуд (пастанову) аб спыненні вядзення па крымінальнай справе на выяўленай ім падставе па-за залежнасцю ад наяўнасці і характару захворвання асобы.

4. Пры спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставах, указаных у частках 2 і 3 гэтага артыкула, копія прысуду (пастановы) суда ў пяцідзённы тэрмін накіроўваецца ў арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства гэтай асобы ці кіраўніцтва аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта (камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) для вырашэння пытанняў аб аказанні медыцынскай дапамогі ці аб накіраванні ў псіхіятрычны стацыянар.

5. Прызнаўшы, што бессвядомасць асобы, у дачыненні да якой разглядаецца крымінальная справа, не выяўлена ці што захворванне асобы не адмяняе прымянення да яе мер пакарання, суд сваім прысудам (пастановай) вяртае крымінальную справу пракурору для правядзення папярэдняга следства.

6. У прысудзе (пастанове) суда вырашаюцца пытанні, указаныя ў артыкуле 364 гэтага Кодэкса.

Артыкул 449. Абскарджанне і апратэставанне прысуду (пастановы) суда

Прысуд (пастанова) суда можа быць абскарджаны(а) на працягу дзесяці сутак абаронцам, законным прадстаўніком асобы, у дачыненні да якой разглядалася крымінальная справа, пацярпелым ці яго прадстаўніком і апратэставана пракурорам у той жа тэрмін у вышэйстаячы суд. Грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык ці іх прадстаўнікі маюць права абскардзіць прысуд (пастанову) суда ва ўказаны тэрмін у частцы, якая датычыцца грамадзянскага іску.

Артыкул 450. Спыненне ці змяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння

1. Суд спыняе ці змяняе прымусовыя меры бяспекі і лячэння па прадстаўленні адміністрацыі псіхіятрычнага стацыянара і заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўрачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі.

2. Пытанні аб спыненні ці змяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння разглядае суд, які вынес прысуд (пастанову) аб прымяненні такіх мер, у складзе, які вызначаецца на падставе пункта 2 часткі 2 і часткі 3 артыкула 32 гэтага Кодэкса.

3. Аб дні разгляду матэрыялаў суд апавяшчае законнага прадстаўніка асобы, да якой прыменена прымусовая мера бяспекі і лячэння, адміністрацыю псіхіятрычнага стацыянара, абаронцу і пракурора. Удзел у судовым пасяджэнні абаронцы і пракурора абавязковы, няяўка іншых асоб не перашкаджае разгляду матэрыялаў.

4. На судовым пасяджэнні даследуюцца прадстаўленне арганізацыі аховы здароўя, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўрачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі, выслухваюцца меркаванні асоб, якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні. Калі заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўрачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі выклікае сумненне, суд па хадайніцтве асоб,

якія ўдзельнічаюць у пасяджэнні, ці па сваёй ініцыятыве можа прызначыць судова-псіхіятрычную экспертызу, выпатрабаваць дадатковыя дакументы.

5. Суд спыняе ці змяняе прымусовую меру бяспекі і лячэння ў выпадку такога псіхічнага стану асобы, пры якім адпадае неабходнасць у прымяненні раней прызначанай меры або ўзнікае неабходнасць у прызначэнні іншай меры бяспекі і лячэння.

6. Аб спыненні ці змяненні, а таксама аб адмове ў спыненні ці змяненні прымусовай меры бяспекі і лячэння суд у дарадчым пакоі выносіць прысуд (пастанову) і абвяшчае яго (яе) на судовым пасяджэнні.

Артыкул 451. Аднаўленне крымінальнай справы ў адносінах да асобы, да якой прыменена прымусовая мера бяспекі і лячэння

1. Калі асоба, да якой з прычыны яе псіхічнага расстройства (захворвання) пасля ўчынення злачынства была прыменена прымусовая мера бяспекі і лячэння, будзе прызнана ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй урачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі ачунялай, суд на падставе заключэння гэтай камісіі ў адпаведнасці з артыкулам 402 гэтага Кодэкса выносіць прысуд (пастанову) аб спыненні прымянення прымусовай меры бяспекі і лячэння і вырашае пытанне аб накіраванні справы для правядзення папярэдняга расследавання, прыцягнення гэтай асобы ў якасці абвінавачанага і перадачы крымінальнай справы ў суд у агульным парадку.

2. Час, праведзены ў псіхіятрычным стацыянары, уключаецца ў тэрмін утрымання пад вартай.

ГЛАВА 47
ПАСКОРАНАЕ ВЯДЗЕННЕ

Артыкул 452. Парадак паскоранага вядзення

1. Пры наяўнасці прыкмет злачынстваў, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, ці менш цяжкіх злачынстваў, калі факт злачынства відавочны, вядома асоба, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства, і яна не адмаўляе ўчынення ёй гэтага злачынства, ажыццяўляецца паскоранае вядзенне.

2. Парадак паскоранага вядзення вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса, за выключэннямі, устаноўленымі гэтай главой.

3. Пры паскораным вядзенні да распачынання крымінальнай справы бяруцца тлумачэнні ад асобы, якая не адмаўляе ўчынення гэтага злачынства, сведак і іншых асоб пра абставіны ўчыненага злачынства, выпатрабуюцца даведка аб наяўнасці ці адсутнасці судзімасці ў асобы, якая не адмаўляе ўчынення злачынства, характарызуючыя даныя аб асобе і іншыя матэрыялы, якія маюць значэнне для разгляду справы на судовым пасяджэнні ці пастановы прыгавору без судовага разбору.

4. У асобы, якая не адмаўляецца ад учынення злачынства, бярэцца абавязацельства з'яўляцца на выклікі следчага і суда і паведамляць ім аб перамене месца жыхарства. У выпадку няяўкі асоба можа быць падвергнутая прыводу.

Артыкул 453. Тэрмін паскоранага вядзення

1. Паскоранае вядзенне павінна быць закончана не пазней чым за дзесяць сутак з дня паступлення ў орган папярэдняга следства заявы ці паведамлення аб злачынстве да перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд.

2. Тэрмін, устаноўлены часткай 1 гэтага артыкула, па матываванай пастанове следчага можа быць прадоўжаны да пятнаццаці сутак начальнікам следчага падраздзялення ці яго намеснікам.

Артыкул 454. Заканчэнне паскоранага вядзення

1. Прызнаўшы пададзеныя матэрыялы дастатковымі для распачынання крымінальнай справы і накіравання яе ў суд, следчы выносіць пастанову аб распачынанні крымінальнай справы, прымае яе да вядзення, прыцягвае ў якасці абвінавачанага асобу, якая падазраецца ва ўчыненні злачынства і не адмаўляецца ад яго ўчынення, у парадку, прадугледжаным артыкуламі 240–244 гэтага Кодэкса, вырашае

пытанне аб меры стрымання ў адносінах да абвінавачанага ў адпаведнасці з артыкуламі 116–126 гэтага Кодэкса, накладае арышт на маёмасць у парадку, прадугледжаным артыкулам 132 гэтага Кодэкса, а таксама выносіць рашэнне аб прызнанні асобы пацярпелым, грамадзянскім істцом, грамадзянскім адказчыкам і праводзіць допыт пацярпелых і сведак у адпаведнасці з артыкуламі 220 і 221 гэтага Кодэкса.

2. Выканаўшы дзеянні, пералічаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, следчы заканчвае на падставах і ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 255–262 гэтага Кодэкса, паскоранае вядзенне.

3. Пасля заканчэння азнаямлення абвінавачанага, яго абаронцы, пацярпелага з крымінальнай справай следчы апрача выканання патрабаванняў, прадугледжаных часткай 5 артыкула 257 гэтага Кодэкса, растлумачвае абвінавачанаму ва ўчыненні злачынства, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, які прызнае поўнасцю сваю віну і грамадзянскі іск, калі ён прад'яўлены, а таксама пацярпеламу парадак і наступствы вядзення па справе ў судзе ў адпаведнасці з часткай 4 артыкула 457, артыкуламі 459, 459^2 гэтага Кодэкса і высвятляе ў абвінавачанага, пацярпелага, ці згодны яны на пастанову абвінаваўчага прыгавору і прызначэнне пакарання, прымяненне іншых мер крымінальнай адказнасці без судовага разбору (у завочным вядзенні). Адносіны абвінавачанага, пацярпелага да вядзення па справе ў судзе ў парадку завочнага вядзення адлюстроўваюцца ў пратаколе азнаямлення з крымінальнай справай.

Артыкул 455. Дзеянні пракурора па крымінальных справах паскоранага вядзення

1. Пры паступленні ад следчага крымінальнай справы, закончанай у парадку паскоранага вядзення, пракурор ці яго намеснік абавязаны ў тэрмін, не большы за 24 гадзіны, праверыць гэту справу і на падставах і ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 263–266 гэтага Кодэкса, прыняць рашэнне аб яе далейшым руху.

2. Па крымінальнай справе ў адносінах да асобы, абвінавачанай ва ўчыненні менш цяжкага злачынства, а таксама пры адсутнасці згоды абвінавачанага і пацярпелага на правядзенне ў судзе завочнага вядзення па справе аб злачынстве, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пракурор ці яго намеснік у пастанове выказваюць меркаванне аб разглядзе крымінальнай справы без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы з прапановай аб прымяненні да абвінавачанага канкрэтнага пакарання ці іншых мер крымінальнай адказнасці. Аб накіраванні крымінальнай справы ў суд і прапанове аб разглядзе крымінальнай справы без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы пракурор ці яго намеснік паведамляюць абвінавачанаму і пацярпеламу па правілах артыкула 266 гэтага Кодэкса.

3. Пры наяўнасці згоды абвінавачанага і пацярпелага на завочнае вядзенне ў судзе па справе аб злачынстве, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пракурор ці яго намеснік у пастанове выказваюць меркаванне аб магчымасці пастановы прыгавору і прымянення да абвінавачанага пакарання, іншых мер крымінальнай адказнасці без судовага разбору і прапанову аб прымяненні да абвінавачанага канкрэтнага пакарання ці іншых мер крымінальнай адказнасці. Аб накіраванні крымінальнай справы ў суд і аб магчымасці пастановы прыгавору і прымянення да абвінавачанага пакарання, іншых мер крымінальнай адказнасці без судовага разбору пракурор ці яго намеснік паведамляюць абвінавачанаму і пацярпеламу па правілах артыкула 266 гэтага Кодэкса.

Артыкул 456. Правядзенне папярэдняга следства

Папярэдняе следства па крымінальных справах, распачатых у парадку паскоранага вядзення, праводзіцца следчым па агульных правілах гэтага Кодэкса:

1) калі выкананне працэсуальных і іншых дзеянняў, прадугледжаных часткай 3 артыкула 452 і артыкулам 454 гэтага Кодэкса, на працягу тэрміну, устаноўленага артыкулам 453 гэтага Кодэкса, немагчымае;

2) калі пракурор вярнуў крымінальную справу, закончаную ў парадку паскоранага вядзення, для правядзення папярэдняга следства;

3) калі злачынства ўчынена непаўналетнім, а таксама аб прадугледжаных крымінальным законам грамадска небяспечных дзеяннях асоб у стане бессвядомасці ці асоб, якія захварэлі псіхічным расстройствам (захворваннем) пасля ўчынення злачынства.

Артыкул 457. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе паскоранага вядзення, якая паступіла ў суд

1. Па крымінальнай справе, якая паступіла ад пракурора ў суд, суддзя праводзіць падрыхтоўчыя дзеянні і прымае рашэнні ў адпаведнасці з правіламі главы 33 гэтага Кодэкса і палажэннямі гэтага артыкула не пазней чым за пяць сутак з дня паступлення справы ў суд.

2. У пастанове аб прызначэнні судовага разбору ў адносінах да асобы, абвінавачанай ва ўчыненні менш цяжкага злачынства, а таксама па крымінальнай справе, па якой не дадзена згода абвінавачанага і пацярпелага на завочнае вядзенне па крымінальнай справе ў судзе, суддзя ўказвае аб разглядзе крымінальнай справы без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы ў адпаведнасці з часткай 2 артыкула 455 гэтага Кодэкса.

3. У выпадку прызначэння судовага разбору без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы на судовае пасяджэнне выклікаюцца абвінавачаны, абаронца, калі ён удзельнічае ў справе, а таксама пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі. Указаныя асобы, а таксама пракурор, які накіраваў крымінальную справу ў суд, павінны быць апавешчаны аб месцы і часе судовага разбору не менш чым за пяць сутак да яго пачатку.

4. Па атрыманай судом справе ў адносінах да асобы, абвінавачанай ва ўчыненні злачынства, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, па якой атрымана згода абвінавачанага, пацярпелага на пастанову прыгавору без судовага разбору, суддзя з улікам меркавання пракурора аб магчымасці завочнага вядзення па справе ў судзе прымае адно з наступных рашэнняў:

1) аб пастанове ў адносінах да абвінавачанага абвінаваўчага прыгавору без судовага разбору і выкліку бакоў;

2) аб прызначэнні судовага разбору ў адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула.

Артыкул 458. Разгляд крымінальнай справы на судовым пасяджэнні

1. Разгляд крымінальнай справы паскоранага вядзення на судовым пасяджэнні праводзіцца па агульных правілах судовага разбору, а ў выпадку, калі дзяржаўны абвінаваўца ў судовым разборы не ўдзельнічае, – і з выключэннямі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

2. Прызначэнне судовага разбору без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы не перашкаджае пракурору ў любы момант уступіць у судовы разбор для падтрымання абвінавачання.

3. Пры разглядзе крымінальнай справы без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы старшыня пасяджэння ў падрыхтоўчай частцы судовага пасяджэння высвятляе, ці ўручаны абвінавачанаму і калі менавіта працэсуальныя дакументы, пералічаныя ў частцы 2 артыкула 316 гэтага Кодэкса, а таксама ці апавешчаны ён і калі аб накіраванні пракурорам ці яго намеснікам крымінальнай справы ў суд і прапанове аб разглядзе крымінальнай справы без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы.

4. Няяўка на судовае пасяджэнне без уважлівых прычын пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўнікоў не перашкаджае разгляду справы па сутнасці.

5. Судовае следства пачынаецца без абвяшчэння прад'яўленага асобе абвінавачання і праводзіцца ў скарочаным парадку, за выключэннямі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

6. Як толькі старшынствуючы пасяджэння высветліць у абвінавачанага яго адносін да прад'яўленага абвінавачання, абвінавачанаму прапаноўваецца даць паказанні наконт прад'яўленага абвінавачання. Затым яму могуць задаць пытанні пацярпелыя, грамадзянскія істцы, іх прадстаўнікі, абаронца, грамадзянскі адказчык, яго прадстаўнік. Пасля чаго старшынствуючы павінен растлумачыць бакам наступствы правядзення судовага следства ў скарочаным парадку, прадугледжаныя часткай 1 артыкула 326 гэтага Кодэкса.

7. Калі прызнанне абвінавачаным сваёй віны нікім не аспрэчваецца і не выклікае ў суда сумненняў, то пасля допыту абвінавачанага і заслухоўвання паказанняў (тлумачэнняў) пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўнікоў, якія хадайнічалі аб допыце, суд абвяшчае судовае следства скончаным і пераходзіць да судовых спрэчак.

8. У выпадку непрызнання абвінавачанага сваёй віны поўнасцю ці ў частцы або калі судом прызнаны неабходным удзел дзяржаўнага абвінаваўцы ў судовым пасяджэнні, суд выносіць пастанову аб адкладанні судовага разбору і выкліку дзяржаўнага абвінаваўцы, пасля чаго разбор крымінальнай справы адбываецца на судовым пасяджэнні ў адпаведнасці з правіламі глаў 35–37 гэтага Кодэкса.

9. Не пазней за пяць сутак пасля абвяшчэння прыгавору па крымінальнай справе, разгледжанай судом у парадку паскоранага вядзення без удзелу дзяржаўнага абвінаваўцы, копія прыгавору павінна быць уручана судом пракурору, які накіраваў крымінальную справу ў суд.

Артыкул 459. Пастанова прыгавору па справе паскоранага вядзення без судовага разбору (завочнае вядзенне)

1. Прыгавор па справе паскоранага вядзення можа быць пастаноўлены суддзёй па матэрыялах крымінальнай справы без судовага разбору і выкліку бакоў у адносінах да асобы, абвінавачанай ва ўчыненні злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, калі абвінавачаны поўнасцю прызнае сваю віну і грамадзянскі іск, калі ён прад'яўлены, зробленае ім прызнанне не аспрэчваецца кім-небудзь з бакоў і не выклікае сумненняў у суддзі, а таксама не выклікаюць сумненні вінаватасць абвінавачанага, юрыдычная кваліфікацыя дзеяння і добраахвотнасць згоды абвінавачанага і пацярпелага на завочнае вядзенне ў судзе, адсутнічаюць іншыя перашкоды пастанове прыгавору без судовага разбору.

2. Не пазней за пяць сутак з дня пастановы прыгавору без судовага разбору яго копія павінна быць уручана судом абвінавачанаму, а таксама пракурору, які накіраваў крымінальную справу ў суд. Абаронцу, калі ён удзельнічаў у справе, пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам у гэты ж тэрмін суд накіроўвае паведамленне аб прынятым па крымінальнай справе рашэнні, а пры паступленні ад іх адпаведнай просьбы – уручаецца копія прыгавору.

Артыкул 459[1]. Прыгавор па справе паскоранага вядзення без судовага разбору

1. Прыгавор, пастаноўлены па справе паскоранага вядзення без судовага разбору, павінен адпавядаць агульным патрабаванням да прыгавору, прадугледжаным главой 38 гэтага Кодэкса, за выключэннямі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

2. Уводная частка прыгавору павінна адпавядаць патрабаванням артыкула 359 гэтага Кодэкса, а рэзалютыўная частка прыгавору складаецца з выкананнем палажэнняў артыкулаў 361 і 364 гэтага Кодэкса. Пры гэтым уводная частка прыгавору

павінна таксама змяшчаць указанне аб пастанове прыгавору ў парадку завочнага вядзення, а рэзалютыўная частка прыгавору – аб парадку і тэрмінах падачы пярэчанняў на прыгавор, пастаноўлены без судовага разбору.

3. Апісальна-матывацыйная частка прыгавору павінна змяшчаць апісанне злачыннага дзеяння, пацвярджаецца матэрыяламі крымінальнай справы, юрыдычную кваліфікацыю злачынства. Суддзя мае права ўказаць доказы вінаватасці, не раскрываючы іх зместу. У прыгаворы прыводзяцца абставіны, якія памякчаюць і якія абцяжваюць адказнасць, матывы рашэння пытанняў, якія адносяцца да прызначэння пакарання, прымянення іншых мер крымінальнай адказнасці, вырашэння грамадзянскага іску, лёсу маёмасці, на якую накладзены арышт, і рэчыўных доказаў.

Артыкул 459[2]. Пярэчанні на прыгавор, пастаноўлены без судовага разбору, наступствы іх падачы

1. Абвінавачаны, пракурор, які накіраваў справу ў суд, на працягу дзесяці сутак з моманту атрымання копіі прыгавору, пастаноўленага без судовага разбору, а абаронца, які ўдзельнічаў у справе, пацярпелы, грамадзянскі ісцец, грамадзянскі адказчык і іх прадстаўнікі — з моманту іх апавяшчэння аб прынятым рашэнні маюць права падаць у суд свае пярэчанні на прыгавор. Указанне ў пярэчаннях матываў нязгоды з прыгаворам неабавязковае.

2. У выпадку падачы ў тэрміны, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, пярэчанняў на прыгавор суда, пастаноўлены без судовага разбору, суддзя на працягу трох сутак выносіць пастанову аб адмене пастаноўленага ім прыгавору, а крымінальную справу неадкладна перадае старшыні суда ці яго намесніку для рашэння пытання аб яе перадачы іншаму суддзі і прызначэнні судовага разбору ў парадку, прадугледжаным часткай 1 артыкула 457 гэтага Кодэкса.

3. Прыгавор, пастаноўлены без судовага разбору, уступае ў законную сілу пасля сканчэння тэрміну падачы на яго пярэчанняў і накіроўваецца да выканання ў агульным парадку.

ГЛАВА 48
ВЯДЗЕННЕ ПА ПАКРЫЦЦІ ШКОДЫ, ПРЫЧЫНЕНАЙ ФІЗІЧНАЙ ЦІ ЮРЫДЫЧНАЙ АСОБЕ НЕЗАКОННЫМІ ДЗЕЯННЯМІ ОРГАНА, ЯКІ ВЯДЗЕ КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Артыкул 460. Шкода, якая падлягае пакрыццю

1. Шкода, прычыненая грамадзяніну ў выніку незаконнага затрымання, утрымання пад вартай і хатняга арышту, часовага адхілення ад пасады, змяшчэння ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар (псіхіятрычны стацыянар), асуджэння, прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння, кампенсуецца дзяржавай у поўным аб'ёме незалежна ад віны асобы, якая праводзіць дазнанне, органа дазнання, следчага, пракурора, старшыні Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асоб, якія выконваюць іх абавязкі, або суда.

2. На падставах, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула і адпаведнымі артыкуламі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, орган, які вядзе крымінальны працэс, у выпадку прызнання яго дзеянняў і рашэнняў незаконнымі абавязаны прыняць меры для пакрыцця фізічнай, маёмаснай і маральнай шкоды, прычыненай фізічнай асобе, і для аднаўлення парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых, іншых асабістых немаёмасных правоў фізічнай асобы, а таксама для пакрыцця маёмаснай шкоды і аднаўлення дзелавой рэпутацыі юрыдычнай асобы.

3. Фізічнай шкодай прызнаюцца шкодныя для здароўя і жыцця фізічнай асобы наступствы, якія надышлі ў выніку незаконных дзеянняў органа, які вядзе крымінальны працэс: расстройства здароўя, калецтва, надыход інваліднасці і іншыя наступствы, звязаныя з пагаршэннем фізічнага ці псіхічнага здароўя асобы, або надыход смерці. Фізічная шкода кампенсуецца ў грашовым выражэнні, уключаючы затраты на лячэнне,

страту часткі заробку ў сувязі з захворваннем, калецтвам або інваліднасцю ці затраты ў сувязі са стратай карміцеля і іншыя затраты.

4. Маёмаснай шкодай прызнаюцца страта фізічнай асобай заробку, пенсіі, дапамогі, маёмасных ільгот, якія яна страціла з прычыны незаконных дзеянняў органа, які вядзе крымінальны працэс; незаконныя адабранне і канфіскацыя маёмасці, незаконнае спагнанне штрафу, працэсуальных выдаткаў; затраты на атрыманне юрыдычнай дапамогі і іншыя расходы, панесеныя ў сувязі з вядзеннем па крымінальнай справе; фактычныя затраты і прамыя страты, панесеныя юрыдычнай асобай у выніку незаконных дзеянняў органа, які вядзе крымінальны працэс. Упушчаная выгада на падставах і ў парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, пакрыццю не падлягае.

5. Маральнай шкодай, наступствы якой падлягаюць ліквідацыі ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам, прызнаецца прычыненне духоўных ці фізічных пакут дзеяннямі, якія парушаюць асабістыя немаёмасныя правы грамадзяніна, у тым ліку знявага яго гонару і годнасці, а таксама прычыненне ўрону дзелавой рэпутацыі.

6. Парушэннямі працоўных, пенсійных, жыллёвых і іншых асабістых немаёмасных правоў фізічнай асобы прызнаюцца страта ёй ранейшай працы ці пасады, а таксама працоўнага стажу ці права на атрыманне належнай па законе пенсіі, страта права на займаную жылую плошчу , якія звязаны з незаконным прымяненнем мер працэсуальнага прымусу пры правядзенні папярэдняга расследавання і судовым разборы крымінальнай справы, незаконнае пазбаўленне воінскага ці спецыяльнага звання.

7. Маёмасная шкода кампенсуецца, а кампенсацыя фізічнай шкоды праводзіцца за кошт сродкаў рэспубліканскага ці мясцовага бюджэту (казны).

Артыкул 461. Асобы, якія маюць права на пакрыццё шкоды

1. Права на пакрыццё шкоды, указанай у артыкуле 460 гэтага Кодэкса, маюць:

1) абвінавачаны, апраўданы судом;

2) падазраваны ці абвінавачаны, крымінальнае пераследаванне супраць якіх спынена на падставах, прадугледжаных пунктамі 1, 2, 8 і 9 часткі 1 артыкула 29 і часткай 2 артыкула 250 гэтага Кодэкса;

3) асоба, незаконна змешчаная ў судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар (псіхіятрычны стацыянар), або асоба, да якой незаконна прыменена прымусовая мера бяспекі і лячэння;

4) юрыдычная асоба, якой у выніку незаконных дзеянняў органа, які вядзе крымінальны працэс, прычынены шкода або дзелавой рэпутацыі якой нанесены ўрон;

5) асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку спадчыннікамі асоб, указаных у пунктах 1–3 гэтага артыкула, члены сям'і памерлага;

6) асобы, указаныя ў артыкулах 49, 52, 54, 56, 57^1 і 58 гэтага Кодэкса.

2. Правілы гэтага артыкула не распаўсюджваюцца на выпадкі абгрунтаванага прымянення мер працэсуальнага прымусу, адмены абвінаваўчага прыгавору ці яго змянення з прычыны прыняцця акта амністыі, а таксама закона, які адмяняе крымінальную адказнасць, таксама як і на выпадкі, калі асоба добраахвотна абгаварыла сябе ва ўчыненні злачынства.

3. Права асоб, пералічаных у частцы 1 гэтага артыкула, на пакрыццё шкоды, указанай у артыкуле 460 гэтага Кодэкса, узнікае з моманту прызнання дзеянняў органа, які вядзе крымінальны працэс, незаконнымі.

Артыкул 462. Парадак пакрыцця шкоды

Пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкулам 460 гэтага Кодэкса, орган, які вядзе крымінальны працэс, абавязаны прызнаць за фізічнай або юрыдычнай асобай права на пакрыццё шкоды, аб чым выносіць пастанову (прысуд), у якой(ім) указваецца від прычыненай шкоды. Копія пастановы (прысуду), а ў неабходных выпадках і іншыя дакументы, якія пацвярджаюць факт прычынення шкоды, накіроўваюцца зацікаўленай

асобе ці яе прадстаўніку (спадчынніку) з растлумачэннем іх правоў і парадку звароту за пакрыццём шкоды, прадугледжаных гэтай главой.

Артыкул 463. Пакрыццё фізічнай шкоды

Грашовая кампенсацыя фізічнай шкоды праводзіцца ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі артыкулам 464 гэтага Кодэкса.

Артыкул 464. Пакрыццё маёмаснай шкоды

1. Фізічная ці юрыдычная асоба, яе прадстаўнік (спадчыннік) пасля атрымання дакументаў, указаных у артыкуле 462 гэтага Кодэкса, мае права звярнуцца з патрабаваннем аб пакрыцці маёмаснай шкоды ў орган, які вядзе крымінальны працэс, рашэннем якога за ёй прызнана права на пакрыццё шкоды на працягу тэрмінаў, прадугледжаных артыкулам 467 гэтага Кодэкса.

2. Не пазней за адзін месяц з дня паступлення патрабавання орган, які вядзе крымінальны працэс, вызначае памер падлеглай пакрыццю шкоды. У неабходных выпадках па яго даручэнні разлік праводзіцца фінансавымі і іншымі органамі. Пакрыццё шкоды праводзіцца ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

3. Копія пастановы (прысуду), завераная гербавай пячаткай, уручаецца асобе, якая звярнулася з патрабаваннем, для прад'яўлення ў органы, абавязаныя правесці выплату.

Артыкул 465. Ліквідацыя наступстваў маральнай шкоды

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, прызнаўшы права фізічнай асобы на ліквідацыю наступстваў маральнай шкоды, абавязаны прынесці асобе афіцыйныя прабачэнні за прычыненую шкоду; апублікаваць абвяржэнне звестак, якія няславяць асобу, у сродках масавай інфармацыі, калі такія звесткі былі апублікаваны ў ходзе дасудовага і судовага вядзення па крымінальнай справе; накіраваць па патрабаванні фізічнай асобы, яго законнага прадстаўніка (спадчынніка) у тэрмін да дзесяці дзён паведамленне аб адмене незаконных рашэнняў па месцы яго працы, службы, навучання ці жыхарства.

2. Кампенсацыя ў грашовым выражэнні за прычыненую маральную шкоду можа быць спагнана фізічнымі асобамі ў парадку грамадзянскага судаводства ў тэрміны, прадугледжаныя законам.

Артыкул 466. Меры для аднаўлення іншых правоў

1. Патрабаванні аб аднаўленні парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых ці іншых асабістых немаёмасных правоў фізічнай асобы вырашаюцца ва ўстаноўленым законам парадку. Калі патрабаванне не задаволена ці асоба не згодная з прынятым рашэннем, яна мае права звярнуцца ў суд у парадку грамадзянскага судаводства.

2. Асобам, незаконна пазбаўленым воінскіх і спецыяльных званняў, аднаўляюцца адпаведныя званні.

3. Аднаўленне дзелавой рэпутацыі юрыдычнай асобы ажыццяўляецца шляхам апублікавання абвяржэння звестак, якія няславяць юрыдычную асобу, у сродках масавай інфармацыі, калі такія звесткі былі апублікаваны ў ходзе дасудовага ці судовага вядзення па крымінальнай справе.

Артыкул 467. Тэрміны прад'яўлення патрабаванняў

1. Патрабаванні аб правядзенні грашовых выплат у пакрыццё маёмаснай шкоды ці грашовых кампенсацый за прычыненне фізічнай шкоды могуць быць прад'яўлены асобамі, пералічанымі ў артыкуле 461 гэтага Кодэкса, на працягу трох гадоў з дня атрымання дакументаў, указаных у артыкуле 462 гэтага Кодэкса.

2. Патрабаванні аб аднаўленні парушаных працоўных, пенсійных, жыллёвых і іншых асабістых немаёмасных правоў могуць быць прад'яўлены на працягу года з дня атрымання дакументаў, указаных у артыкуле 462 гэтага Кодэкса.

3. Тэрміны, указаныя ў частках першай і другой гэтага артыкула, прапушчаныя з-за ўважлівай прычыны, могуць быць адноўлены органам, які вядзе крымінальны працэс, які ў межах сваёй кампетэнцыі ў адпаведнасці з артыкулам 462 гэтага Кодэкса мае права прымаць рашэнне аб пакрыцці шкоды. Адмова ў аднаўленні тэрміну можа быць абскарджана ў парадку, прадугледжаным главой 16 гэтага Кодэкса.

Артыкул 468. Абскарджанне рашэння аб пакрыцці шкоды

Пастанова (прысуд) органа, які вядзе крымінальны працэс, у частцы памеру і аб'ёму пакрыцця шкоды або аб адмове ў яе пакрыцці можа быць абскарджана(ы) асобамі, пералічанымі ў артыкуле 461 гэтага Кодэкса, у парадку, прадугледжаным главой 16 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 49
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ У АДНОСІНАХ ДА АСОБНЫХ КАТЭГОРЫЙ АСОБ

Артыкул 468[1]. Катэгорыі асоб, у адносінах да якіх прымяняецца асаблівы парадак вядзення па крымінальнай справе

1. Патрабаванні гэтай главы прымяняюцца пры вядзенні па крымінальнай справе ў адносінах да:

1) асобы, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь;

2) дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь;

3) дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў;

4) суддзі;

5) народнага засядацеля ў перыяд выканання ім сваіх абавязкаў у судзе;

6) пракурора, начальніка следчага падраздзялення, следчага.

2. Парадак вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да асобы, указанай у частцы 1 гэтага артыкула, вызначаецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса з выключэннямі, устаноўленымі гэтай главой.

Артыкул 468[2]. Распачынанне крымінальнай справы. Прыцягненне ў якасці падазраванага ці абвінавачанага

Рашэнне аб распачынанні крымінальнай справы ў адносінах да асобы, указанай у частцы 1 артыкула 468[1] гэтага Кодэкса, або аб прыцягненні яе ў якасці падазраванага ці абвінавачанага па крымінальнай справе, распачатай у адносінах да іншых асоб або па факце ўчыненага злачынства, прымаецца ў адносінах да:

1) асобы, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, – Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, з папярэдняй згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

2) дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь – Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, з папярэдняй згоды адпаведнай палаты Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана пунктам 1 гэтага артыкула;

3) дэпутата абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў – пракурорам адпаведна вобласці, горада Мінска ці вышэйстаячым пракурорам або старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі;

4) дэпутата раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў – пракурорам адпаведна раёна, раёна ў горадзе, горада, міжраённым і прыраўнаваным да

яго транспартным пракурорам ці вышэйстаячым пракурорам або старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі;

5) суддзі – Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, з папярэдняй згоды службовай асобы, якая прызначыла суддзю (дзяржаўнага органа, які абраў яго), калі іншае не прадугледжана пунктам 1 гэтага артыкула;

6) народнага засядацеля – пракурорам, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, з папярэдняй згоды службовай асобы (органа), якая(які) зацвердзіла(ў) спісы народных засядацеляў;

7) пракурора, начальніка следчага падраздзялення, следчага – Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, старшынёй Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ці асобамі, якія выконваюць іх абавязкі, калі іншае не прадугледжана пунктам 1 гэтага артыкула.

Артыкул 468[3]. Затрыманне і іншыя меры працэсуальнага прымусу

1. Асоба, якая займае вышэйшую дзяржаўную пасаду Рэспублікі Беларусь, а таксама асоба, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, прызначаная на гэту пасаду Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, не могуць быць затрыманы і іншым чынам пазбаўлены асабістай волі без папярэдняй згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў учынення здрады дзяржаве або затрымання на месцы ўчынення злачынства.

2. Асоба, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, акрамя асоб, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, не можа быць затрымана і іншым чынам пазбаўлена асабістай волі без папярэдняй згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў учынення здрады дзяржаве, іншага асабліва цяжкага злачынства, а таксама затрымання на месцы ўчынення злачынства.

3. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь не могуць быць затрыманы і іншым чынам пазбаўлены асабістай волі без папярэдняй згоды адпаведнай палаты Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў учынення здрады дзяржаве, іншага асабліва цяжкага злачынства, а таксама затрымання на месцы ўчынення злачынства.

4. Суддзя, за выключэннем суддзі, пасада якога ўключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, народны засядацель не могуць быць затрыманы і іншым чынам пазбаўлены асабістай волі без папярэдняй згоды адпаведна службовай асобы, якая прызначыла суддзю (дзяржаўнага органа, які абраў яго), службовай асобы (органа), якая(які) зацвердзіла(ў) спісы народных засядацеляў, за выключэннем выпадкаў учынення здрады дзяржаве, іншага асабліва цяжкага злачынства, а таксама затрымання на месцы ўчынення злачынства.

5. Аб затрыманні асобы, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Главы дзяржавы Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, суддзі, народнага засядацеля, пракурорскага работніка органамі, якія ажыццявілі затрыманне, неадкладна паведамляецца ў пісьмовай форме:

1) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь – у адносінах да асобы, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь;

2) Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь – у адносінах да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь;

3) Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь – у адносінах да члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь;

4) Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ці яго намесніку – у адносінах да суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь;

5) Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і ў Вышэйшую кваліфікацыйную калегію суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – у адносінах да суддзяў судоў агульнай юрысдыкцыі;

6) службовай асобе (органу), якая(які) зацвердзіла(ў) спісы народных засядацеляў, – у адносінах да народнага засядацеля;

7) Генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь – у адносінах да пракурорскага работніка.

Артыкул 468[4]. Асаблівасці выбрання меры стрымання і правядзення асобных следчых дзеянняў

1. Пасля распачынання крымінальнай справы або прыцягнення асобы ў якасці падазраванага ці абвінавачанага па крымінальнай справе, узбуджанай у адносінах да іншых асоб або па факце ўчыненага злачынства, у парадку, устаноўленым артыкулам 468[2] гэтага Кодэкса, прымяненне меры стрымання, за выключэннем узяцця пад варту ці іншага пазбаўлення асабістай волі, правядзенне следчых дзеянняў у адносінах да такой асобы ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.

2. У выпадку, калі крымінальная справа ў адносінах да асобы, пасада якой уключана ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь, суддзі, пракурорскага работніка не была распачата ці такая асоба не была прыцягнута ў якасці падазраванага ці абвінавачанага па крымінальнай справе, распачатай у адносінах да іншых асоб або па факце ўчыненага злачынства, правядзенне следчых дзеянняў, якія выконваюцца з санкцыі пракурора, можа ажыццяўляцца толькі з санкцыі Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці асобы, які выконвае яго абавязкі. Асабісты вобшук у адносінах да гэтых асоб не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў затрымання на месцы ўчынення злачынства.

ГЛАВА 491
ВЯДЗЕННЕ ПА КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ Ў АДНОСІНАХ ДА ПАДАЗРАВАНАГА (АБВІНАВАЧАНАГА), З ЯКІМ ЗАКЛЮЧАНА ДАСУДОВАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

Артыкул 468[5]. Парадак вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да падазраванага (абвінавачанага), з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве

Парадак вядзення па крымінальнай справе ў адносінах да падазраванага (абвінавачанага), з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, вызначаецца правіламі гэтага Кодэкса з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

Артыкул 468[6]. Парадак заявы хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве

1. Хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве падае падазраваны (абвінавачаны) у пісьмовым выглядзе на імя пракурора. Указанае хадайніцтва падпісваецца падазраваным (абвінавачаным), яго абаронцам, а ў выпадку, калі падазраваны (абвінавачаны) з'яўляецца непаўналетнім, – таксама яго законным прадстаўніком.

2. Дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве не можа быць заключана з асобамі, якія ўчынілі грамадска небяспечнае дзеянне ў стане бессвядомасці. У выпадку прызнання асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, асобай у стане бессвядомасці дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве губляе сілу.

3. Дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве не можа быць заключана па крымінальных справах паскоранага вядзення, а таксама ў выпадку, калі садзейнічанне

падазраванага (абвінавачанага) заключаецца ў паведамленні звестак толькі аб сваім удзеле ў злачыннай дзейнасці.

4. У хадайніцтве аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве падазраваны (абвінавачаны) заяўляе аб прызнанні сваёй віны ва ўчыненні злачынства, указвае дзеянні, якія ён абавязваецца здзейсніць у мэтах аказання садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам, а таксама дзеянні для пакрыцця маёмаснага ўрону, выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, іншыя дзеянні, накіраваныя на загладжванне шкоды, прычыненай злачынствам. Падазраваны (абвінавачаны) таксама дадаткова можа ўзяць на сябе абавязацельства паведаміць вядомыя яму звесткі аб іншых злачынствах і асобах, якія іх учынілі.

5. Падазраваны (абвінавачаны) мае права заявіць хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве пасля распачынання крымінальнай справы і да абвяшчэння яму аб заканчэнні папярэдняга расследавання. У выпадку заявы падазраваным хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве ў перыяд правядзення дазнання крымінальная справа разам з хадайніцтвам аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве неадкладна перадаецца следчаму для правядзення далейшага расследавання.

6. Хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве падае падазраваны (абвінавачаны) або яго абаронца пракурору праз следчага.

7. Следчы на працягу трох сутак з моманту паступлення хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве накіроўвае ўказанае хадайніцтва пракурору разам з даведкай аб магчымасці або немагчымасці заключэння з падазраваным (абвінавачаным) дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве.

Артыкул 468[7]. Разгляд пракурорам хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве

1. Хадайніцтва падазраванага (абвінавачанага) аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве разглядае пракурор ці яго намеснік, які ажыццяўляе нагляд за выкананнем законаў у ходзе папярэдняга следства па крымінальнай справе, на працягу трох сутак з моманту паступлення. Хадайніцтва падазраванага (абвінавачанага) аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, які ўчыніў злачынства, за што адпаведным артыкулам Асаблівай часткі Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледжана пажыццёвае зняволенне ці пакаранне смерцю, разглядаецца Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці асоба, якая выконвае яго абавязкі, на працягу дзесяці сутак з моманту паступлення.

2. Па выніках разгляду пракурор ці яго намеснік прымаюць адно з наступных рашэнняў:

1) аб задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, на падставе якога складаецца ўказанае пагадненне;

2) аб адмове ў задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, аб чым выносяць пастанову.

3. Пастанова пракурора ці яго намесніка аб адмове ў задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве абскарджанню не падлягае.

Артыкул 468[8]. Парадак складання дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве

1. Пракурор ці яго намеснік, прыняўшы рашэнне аб задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, з удзелам падазраванага (абвінавачанага), яго абаронцы, а ў выпадку, калі падазраваны (абвінавачаны) з'яўляецца непаўналетнім, таксама яго законнага прадстаўніка складаюць дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве.

2. У дасудовым пагадненні аб супрацоўніцтве павінны быць указаны:

1) дата і месца складання пагаднення;

2) службовая асоба органа пракуратуры, якая заключае пагадненне;

3) прозвішча, імя і імя па бацьку падазраванага (абвінавачанага), які заключае пагадненне, дзень, месяц, год і месца яго нараджэння;

4) апісанне інкрымінаванага падазраванаму (абвінавачанаму) злачынства з указаннем часу, месца яго ўчынення, а таксама іншых абставін, якія падлягаюць даказванню ў адпаведнасці з артыкулам 89 гэтага Кодэкса;

5) прызнанне падазраваным (абвінавачаным) сваёй віны ва ўчыненні злачынства;

6) дзеянні, якія падазраваны (абвінавачаны) абавязваецца здзейсніць у мэтах аказання садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам, а таксама дзеянні для пакрыцця маёмаснага ўрону, выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, іншыя дзеянні, накіраваныя на загладжванне шкоды, прычыненай злачынствам;

7) нормы крымінальнага закона аб прызначэнні пакарання, якія могуць быць прыменены ў адносінах да падазраванага (абвінавачанага) пры выкананні ім абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве.

3. У дасудовым пагадненні аб супрацоўніцтве апрача звестак, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, таксама можа дадаткова змяшчацца абавязацельства падазраванага (абвінавачанага) паведаміць вядомыя яму звесткі аб іншых злачынствах і асобах, якія іх учынілі (у выпадку прыняцця падазраваным (абвінавачаным) на сябе такога абавязацельства).

4. Дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве падпісваюць пракурор ці яго намеснік, падазраваны (абвінавачаны), яго абаронца, а ў выпадку, калі падазраваны (абвінавачаны) з'яўляецца непаўналетнім, таксама яго законны прадстаўнік.

5. Хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, даведка следчага аб магчымасці або немагчымасці заключэння дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве далучаюцца да крымінальнай справы. У выпадку адмовы падазраванаму (абвінавачанаму) у задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве такое хадайніцтва, даведка следчага аб магчымасці або немагчымасці заключэння дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, пастанова пракурора ці яго намесніка аб адмове ў задавальненні хадайніцтва аб заключэнні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве да крымінальнай справы не далучаюцца, а захоўваюцца па правілах сакрэтнага справаводства.

Артыкул 468[9]. Накіраванне крымінальнай справы пракурору

Пасля заканчэння папярэдняга следства пры перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд у парадку, прадугледжаным артыкуламі 260–262 гэтага Кодэкса, следчы ў пастанове аб перадачы справы пракурору для накіравання ў суд указвае таксама аб выкананні (невыкананні) абвінавачаным абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве.

Артыкул 468[10]. Дзеянні пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд

1. Атрымаўшы ад следчага крымінальную справу з пастановай аб перадачы справы пракурору для накіравання ў суд, пракурор ці яго намеснік, апрача пытанняў, прадугледжаных артыкулам 263 гэтага Кодэкса, абавязаны праверыць, ці выканаў абвінавачаны абавязацельствы, прадугледжаныя дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве.

2. Прыняўшы рашэнне, прадугледжанае пунктам 1 часткі 1 артыкула 264 гэтага Кодэкса, пракурор ці яго намеснік пры накіраванні крымінальнай справы ў суд у парадку, прадугледжаным артыкулам 266 гэтага Кодэкса, у пастанове аб накіраванні справы ў суд таксама ўказваюць:

1) паўнату выканання абвінавачаным абавязацельстваў па аказанні садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам, а таксама па пакрыцці

маёмаснага ўрону, уплаце даходу, атрыманага злачынным шляхам, або іншым загладжванні шкоды, прычыненай злачынствам;

2) значэнне аказанага абвінавачаным садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам;

3) нормы крымінальнага закона аб прызначэнні пакарання, якія могуць быць прыменены ў адносінах да абвінавачанага;

4) звесткі аб злачынствах, выяўленых у выніку аказанага абвінавачаным садзейнічання папярэдняму следству, ці крымінальных справах, распачатых у выніку такога садзейнічання.

Артыкул 468[11]. Парадак судовага разбору крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве

1. Разбор крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, судом праводзіць па агульных правілах судовага разбору, прадугледжаных главамі 34–38 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

2. Пры разглядзе крымінальнай справы ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, таксама павінны быць даследаваны:

1) паўната выканання абвінавачаным абавязацельстваў па аказанні садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам, а таксама па пакрыцці маёмаснага ўрону, уплаце даходу, атрыманага злачынным шляхам, або іншым загладжванні шкоды, прычыненай злачынствам;

2) значэнне аказанага абвінавачаным садзейнічання папярэдняму следству ў раскрыцці злачынства, выкрыцці іншых саўдзельнікаў злачынства, пошуку маёмасці, набытай злачынным шляхам;

3) звесткі аб злачынствах, выяўленых у выніку аказанага абвінавачаным садзейнічання папярэдняму следству, ці крымінальных справах, распачатых у выніку такога садзейнічання.

Артыкул 468[12]. Перагляд прыгавору, вынесенага ў адносінах да абвінавачанага, з якім заключана дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве

Калі пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу будзе выяўлена, што асуджаны паведаміў заведама лжывыя звесткі ці наўмысна ўтаіў ад органа, які вядзе крымінальны працэс, абставіны, высвятленне якіх магло мець істотнае значэнне для крымінальнай справы, перагляд прыгавору ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным главой 43 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 49[2]
ВЯДЗЕННЕ ПА МАТЭРЫЯЛАХ І КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЕ Ў ВЫПАДКУ СМЕРЦІ ПАДАЗРАВАНАГА, АБВІНАВАЧАНАГА, АСОБЫ, ЯКАЯ ПАДЛЯГАЛА ПРЫЦЯГНЕННЮ Ў ЯКАСЦІ ПАДАЗРАВАНАГА, АБВІНАВАЧАНАГА

Артыкул 468[13]. Парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе ў выпадку смерці падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага

Парадак вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе ў выпадку смерці падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, устанаўліваецца агульнымі правіламі гэтага Кодэкса з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

Артыкул 468[14]. Паведамленне аб магчымасці падаць заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе

1. Калі ў ходзе вядзення па матэрыялах і крымінальнай справе блізкія сваякі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, самастойна не падалі заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, орган, які вядзе крымінальны працэс, да прыняцця рашэння па матэрыялах і крымінальнай справе ў адпаведнасці з пунктам 7 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса прымае меры для выяўлення блізкіх сваякоў памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законных прадстаўнікоў, адначасова пісьмова апавяшчае тых з іх, выявіць якіх з’явілася магчымым, аб праве прадстаўляць інтарэсы гэтай асобы для абароны яе правоў і законных інтарэсаў у мэтах яе магчымай рэабілітацыі шляхам падачы адпаведнай заявы ў тэрмін не пазней за дзесяць сутак з моманту атрымання паведамлення. Пры гэтым у паведамленні орган, які вядзе крымінальны працэс, указвае абставіны ўчыненага злачынства, крымінальны закон (пункт, частку, артыкул), які прадугледжвае адказнасць за інкрымінаванае памерламу падазраванаму, абвінавачанаму, асобе, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, злачынства, а таксама растлумачвае парадак і наступствы падачы заявы.

2. Блізкія сваякі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі, атрымаўшы паведамленне органа, які вядзе крымінальны працэс, маюць права ў тэрмін не пазней за дзесяць сутак з моманту атрымання такога паведамлення падаць заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, з прыкладаннем дакументаў, якія пацвярджаюць іх сваяцтва з памерлым падазраваным, абвінавачаным, асобай, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або паўнамоцтвы законнага прадстаўніка блізкага сваяка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага.

3. Члены сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі маюць права самастойна падаць заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, з прыкладаннем дакументаў (указаннем звестак), што пацвярджаюць факт іх сумеснага пражывання з памерлым падазраваным, абвінавачаным, асобай, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, і вядзення з ім(ёй) агульнай гаспадаркі або паўнамоцтвы законнага прадстаўніка члена сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, да моманту прыняцця органам, што вядзе крымінальны працэс, рашэння па матэрыялах і крымінальнай справе ў адпаведнасці з пунктам 7 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса.

Артыкул 468[15]. Парадак разгляду заяў аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, разглядае атрыманыя заявы аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, і на працягу пяці сутак з моманту паступлення апошняй з заяў сваёй пастановай (прысудам) прызнае і дапускае аднаго з заяўнікаў да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, пры наяўнасці падстаў і адсутнасці перашкод, прадугледжаных часткай 4 артыкула 57[1] гэтага Кодэкса.

2. У выпадку, калі прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе выказалі жаданне некалькі яго блізкіх сваякоў або іх законных прадстаўнікоў, орган, які вядзе крымінальны працэс, прапаноўвае ім на працягу сутак выбраць паміж сабой асобу, якая будзе прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, пісьмова паведаміўшы аб гэтым органу, які вядзе крымінальны працэс. Калі на працягу сутак блізкія сваякі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі не выбралі паміж сабой асобу, якая будзе прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, орган, які вядзе крымінальны працэс, вызначае гэтую асобу самастойна з улікам усіх абставін справы.

3. У выпадку, калі прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе выказалі жаданне некалькі членаў яго сем'і або іх законных прадстаўнікоў, орган, які вядзе крымінальны працэс, прапаноўвае ім на працягу сутак выбраць паміж сабой асобу, якая будзе прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, пісьмова паведаміўшы аб гэтым органу, які вядзе крымінальны працэс. Калі на працягу сутак члены сям'і памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, або іх законныя прадстаўнікі не выбралі паміж сабой асобу, якая будзе прадстаўляць інтарэсы памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, орган, які вядзе крымінальны працэс, вызначае гэтую асобу самастойна з улікам усіх абставін справы.

4. Копія пастановы (прысуду) аб прызнанні прадстаўніком памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, накіроўваецца ўказанай асобе з растлумачэннем яе правоў і абавязкаў, прадугледжаных артыкулам 57[2] гэтага Кодэкса.

5. Орган, які вядзе крымінальны працэс, сваёй матываванай пастановай (прысудам) спыняе ўдзел асобы ў крымінальным працэсе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у выпадку, калі выявіць наяўнасць перашкод,

прадугледжаных артыкулам 57[1] гэтага Кодэкса, для знаходжання асобы ў такім становішчы, а таксама ў выпадку смерці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага. У гэтых выпадках орган, які вядзе крымінальны працэс, у тэрмін не пазней за трое сутак з моманту вынясення адпаведнай пастановы (прысуду) самастойна прымае меры для замены гэтай асобы іншым блізкім сваяком, членам сям'і або іх законным прадстаўніком, заявы ад якіх ёсць у матэрыялах крымінальнай справы, у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам.

Артыкул 468[16]. Адмова ў распачынанні крымінальнай справы ці спыненне вядзення па крымінальнай справе

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, выносіць пастанову (прысуд) аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы ці аб спыненні вядзення па крымінальнай справе на падставе пункта 7 часткі 1 артыкула 29 гэтага Кодэкса, калі:

1) асобы, якія могуць быць прызнаны прадстаўнікамі памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, не падалі ва ўстаноўленым парадку заяву аб нязгодзе з адмовай у распачынанні крымінальнай справы ці спыненнем вядзення па крымінальнай справе і прыцягненні да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе ў якасці прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага;

2) прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, пісьмова адмовіўся ад далейшага ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе;

3) прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, без уважлівых прычын не з’явіўся на выклік органа, які вядзе крымінальны працэс.

2. Правілы, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 часткі 1 гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на выпадкі задавальнення судом хадайніцтва аб разборы справы ў адсутнасць прадстаўніка памерлага абвінавачанага.

Артыкул 468[17]. Удзел прадстаўніка памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, у вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе

1. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, абавязаны з'яўляцца н выклікі органа, які вядзе крымінальны працэс, за выключэннем выпадкаў, калі ёсць уважлівыя прычыны, якія выключаюць магчымасць яго яўкі. Аб наяўнасці такіх прычын указаная асоба абавязана своечасова паведаміць органу, які вядзе крымінальны працэс.

2. Прадстаўнік памерлага падазраванага, абвінавачанага, асобы, якая падлягала прыцягненню ў якасці падазраванага, абвінавачанага, пры наяўнасці ўважлівых прычын, якія выключаюць магчымасць яго ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе, мае права хадайнічаць аб замене яго іншым блізкім сваяком, членам сям'і або іх законным прадстаўніком, заявы ад якіх ёсць у матэрыялах крымінальнай справы. У гэтым выпадку орган, які вядзе крымінальны працэс, у тэрмін не пазней за трое сутак разглядае атрыманае хадайніцтва і прымае па ім рашэнне, якое даводзіцца да ведама заяўніка.

Артыкул 468[18]. Прызнанне памерлай асобы падазраваным, прыцягненне памерлай асобы ў якасці абвінавачанага

1. Пры наяўнасці падстаў для прызнання памерлай асобы падазраваным ці прыцягнення памерлай асобы ў якасці абвінавачанага і пры паступленні заявы, прадугледжанай артыкулам 468[14] гэтага Кодэкса, орган крымінальнага пераследавання выносіць у адносінах да памерлай асобы матываваную пастанову аб прызнанні

падазраваным ці аб прыцягненні ў якасці абвінавачанага ў парадку, устаноўленым артыкулам 241 гэтага Кодэкса.

2. Копія пастановы аб прызнанні памерлай асобы падазраваным ці аб прыцягненні памерлай асобы ў якасці абвінавачанага ўручаецца прадстаўніку памерлага падазраванага, абвінавачанага, а таксама абаронцу, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^{1} гэтага Кодэкса.

Артыкул 468^{19}. Заканчэнне папярэдняга расследавання з перадачай крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд

1. Прызнаўшы, што ўсе следчыя дзеянні па крымінальнай справе выкананы, а сабраныя доказы дастатковыя для прыняцця рашэння па крымінальнай справе і адсутнічаюць умовы для спынення вядзення па крымінальнай справе, прадугледжаныя артыкулам 468^{16} гэтага Кодэкса, следчы паведамляе аб гэтым прадстаўніку памерлага абвінавачанага, абаронцу, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, а таксама пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку ці іх прадстаўнікам, растлумачвае ім права знаёміцца з крымінальнай справай і заяўляць хадайніцтвы і выносіць пастанову аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд.

2. Азнаямленне прадстаўніка памерлага абвінавачанага, абаронцы, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, а таксама пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка ці іх прадстаўнікоў з крымінальнай справай праводзіцца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 255–259 гэтага Кодэкса.

3. Пасля заканчэння азнаямлення прадстаўніка памерлага абвінавачанага з крымінальнай справай следчы растлумачвае яму права адмовіцца ад далейшага ўдзелу ў вядзенні па крымінальнай справе і наступствы такой адмовы, а таксама высвятляе, ці ёсць якія-небудзь хадайніцтвы. У выпадку поўнай ці частковай адмовы ў задавальненні хадайніцтва следчы выносіць аб гэтым пастанову, якая даводзіцца да ведама заяўніка.

4. Пастанова аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд выносіцца ў парадку, устаноўленым артыкулам 260 гэтага Кодэкса. Да пастановы аб перадачы крымінальнай справы ў адносінах да памерлага абвінавачанага пракурору для накіравання ў суд дадаюцца дакументы, указаныя ў артыкулах 261 і 262 гэтага Кодэкса.

Артыкул 468^{20}. Рашэнне пракурора па крымінальнай справе, якая паступіла для накіравання ў суд

1. Атрымаўшы ад следчага крымінальную справу з пастановай аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, пракурор ці яго намеснік разглядаюць яе ў парадку, устаноўленым артыкулам 263 гэтага Кодэкса.

2. Пракурор ці яго намеснік абавязаны па атрыманай да іх крымінальнай справе ў тэрмін, не большы за пяць сутак, а па складаных і шматэпізодных крымінальных справах – не большы за пятнаццаць сутак, прыняць адно з рашэнняў, прадугледжаных артыкулам 264 гэтага Кодэкса.

Артыкул 468^{21}. Накіраванне пракурорам крымінальнай справы ў суд

1. Пракурор ці яго намеснік, пагадзіўшыся з пастановай следчага аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд, неадкладна сваёй пастановай накіроўваюць крымінальную справу ў суд па падсуднасці, паведамляюць аб гэтым прадстаўніку памерлага абвінавачанага, абаронцу, калі ён удзельнічае ў вядзенні па крымінальнай справе, пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам і растлумачваюць ім, што ў далейшым усялякія хадайніцтвы і скаргі па справе накіроўваюцца непасрэдна ў суд.

2. Копію пастановы следчага аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд пракурор ці яго намеснік разам з паведамленнем накіроўваюць прадстаўніку памерлага абвінавачанага і пацярпеламу, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59^{1} гэтага Кодэкса, з перакладам пры неабходнасці на іх

родную мову ці на іншую мову, якой яны валодаюць. Калі пракурорам ці яго намеснікам былі зменены аб'ём абвінавачання ці кваліфікацыя грамадска небяспечнага дзеяння, указаным асобам накіроўваецца копія адпаведнай пастановы, за выключэннем выпадку, указанага ў частцы 1 артыкула 59[1] гэтага Кодэкса.

3. Разам з крымінальнай справай у суд накіроўваюцца пастанова следчага аб перадачы крымінальнай справы пракурору для накіравання ў суд і спіс асоб, якія падлягаюць выкліку на судовае пасяджэнне.

Артыкул 468[22]. Паўнамоцтвы суддзі па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд

1. Па крымінальнай справе, якая паступіла ў суд у парадку, устаноўленым артыкулам 468[21] гэтага Кодэкса, суддзя праводзіць падрыхтоўчыя дзеянні і прымае рашэнне ў адпаведнасці з правіламі, прадугледжанымі главой 33 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку прыняцця рашэння аб прызначэнні судовага разбору аб гэтым апавяшчаюцца пракурор, абаронца, прадстаўнік памерлага абвінавачанага, пацярпелы, сведка і іншыя асобы.

Артыкул 468[23]. Судовае вядзенне

1. Разбор крымінальнай справы, якая паступіла ў суд у парадку, устаноўленым артыкулам 468[21] гэтага Кодэкса, адбываецца на судовым пасяджэнні па агульных правілах судовага разбору, прадугледжаных главамі 34–38 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, з абавязковым удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы.

2. У выпадку наяўнасці ўважлівых прычын, якія выключаюць магчымасць яўкі прадстаўніка памерлага абвінавачанага, судовае пасяджэнне адкладваецца. Аб наяўнасці такіх прычын указаная асоба абавязана своечасова паведаміць суду.

3. Прадстаўнік памерлага абвінавачанага мае права хадайнічаць аб разборы справы ў яго адсутнасць. У гэтым выпадку суд у тэрмін не пазней за трое сутак разглядае атрыманае хадайніцтва і прымае па ім адпаведнае рашэнне, якое даводзіцца да ведама заяўніка.

4. Прадстаўнік памерлага абвінавачанага пры наяўнасці ўважлівых прычын, якія выключаюць магчымасць яго ўдзелу ў судовым разборы, мае права хадайнічаць аб замене яго іншым блізкім сваяком, членам сям'і або іх законным прадстаўніком, заявы ад якіх ёсць у матэрыялах крымінальнай справы. У гэтым выпадку суд у тэрмін не пазней за трое сутак разглядае атрыманае хадайніцтва і прымае па ім адпаведнае рашэнне, якое даводзіцца да ведама заяўніка.

5. Судовае следства пачынаецца з абвяшчэння дзяржаўным абвінаваўцам пастановы аб прыцягненні памерлай асобы ў якасці абвінавачанага. Затым прадстаўніку памерлага абвінавачанага, калі ён удзельнічае ў судовым пасяджэнні, даецца магчымасць выкласці свае доказы аб невінаватасці памерлага абвінавачанага.

6. Даследаванне доказаў і судовыя спрэчкі праводзяцца ў адпаведнасці з артыкуламі 325 і 345 гэтага Кодэкса.

7. Пасля заканчэння судовых спрэчак суд неадкладна выдаляецца ў дарадчы пакой для пастановы прыгавору, аб чым старшыня пасяджэння абвяшчае прысутным у зале судовага пасяджэння.

8. У выпадку, калі смерць абвінавачанага надышла пасля накіравання крымінальнай справы ў суд да выдалення суда ў дарадчы пакой, вядзенне па крымінальнай справе ажыццяўляе суд па правілах, прадугледжаных гэтай главой, за выключэннем артыкулаў 468[18]–468[21] гэтага Кодэкса.

Артыкул 468[24]. Пастанова прыгавору. Пытанні, якія падлягаюць вырашэнню судом

1. Прыйшоўшы да высновы аб невінаватасці памерлага абвінавачанага, суд пастанаўляе апраўдальны прыгавор у адпаведнасці з артыкулам 357 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку апраўдання памерлага абвінавачанага працэсуальныя выдаткі, у тым ліку сумы, выплачаныя за аказанне абаронцам юрыдычнай дапамогі або ў выпадку ўдзелу адваката ў правядзенні дазнання, папярэдняга следства ці судовым разборы па прызначэнні без заключэння дагавору, прымаюцца на кошт дзяржавы.

3. Прызнаўшы даказаным, што злачынства ўчынена памерлым абвінавачаным, суд на падставе артыкула 356 гэтага Кодэкса пастанаўляе абвінаваўчы прыгавор без прызначэння пакарання.

4. У выпадку пастановы абвінаваўчага прыгавору суд мае права спагнаць з прадстаўніка памерлага абвінавачанага працэсуальныя выдаткі, якія ўзніклі пасля яго допуску органам, які вядзе крымінальны працэс, да ўдзелу ў вядзенні па матэрыялах і крымінальнай справе, за выключэннем сум, выплачаных перакладчыку. Працэсуальныя выдаткі прымаюцца на кошт дзяржавы ў выпадку выяўленай у прадугледжаным законам парадку маёмаснай неплацежаздольнасці прадстаўніка памерлага абвінавачанага, з якога яны павінны быць спагнаны.

5. Не пазней за пяць сутак пасля абвяшчэння прыгавору яго копія павінна быць уручана прадстаўніку памерлага абвінавачанага, абаронцу, дзяржаўнаму абвінаваўцу, якія маюць права яго абскардзіць ці апратэставаць у парадку, устаноўленым главой 39 гэтага Кодэкса. У той жа тэрмін копія прыгавору ўручаецца пацярпеламу, грамадзянскаму істцу, грамадзянскаму адказчыку і іх прадстаўнікам, калі ў суд паступіла просьба ад указаных асоб.

6. У выпадку, калі прыгавор змяшчае звесткі, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, не пазней за пяць сутак пасля яго абвяшчэння ўдзельнікам працэсу, указаным у частцы 5 гэтага артыкула, за выключэннем дзяржаўнага абвінаваўцы, уручаецца выпіска з прыгавору, якая складаецца з уводнай і рэзалютыўнай частак прыгавору і не змяшчае звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, а прадстаўнік памерлага абвінавачанага павінен быць азнаёмлены з прыгаворам з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

7. Магчымасць азнаямлення з прыгаворам, які змяшчае звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, ці яго копіяй забяспечваецца па просьбе абаронцы, а таксама пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, прадстаўнікоў не пазней за пяць сутак з дня паступлення такой просьбы з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

РАЗДЗЕЛ XV
МІЖНАРОДНАЯ ПРАВАВАЯ ДАПАМОГА ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ НА АСНОВЕ ПРЫНЦЫПУ ЎЗАЕМНАСЦІ

ГЛАВА 50
ПАДСТАВА І ЎМОВЫ АКАЗАННЯ МІЖНАРОДНАЙ ПРАВАВОЙ ДАПАМОГІ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ НА АСНОВЕ ПРЫНЦЫПУ ЎЗАЕМНАСЦІ

Артыкул 469. Падстава для аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці

Падставай для аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці з'яўляецца просьба органа замежнай дзяржавы, у якой змяшчаюцца палажэнні аб яе сутнасці і ўказваюцца звесткі аб крымінальнай справе, аб фактычных абставінах і прававой кваліфікацыі дзеяння, тэкст палажэнняў крымінальнага закона замежнай дзяржавы, якімі прадугледжваецца адказнасць за гэта дзеянне, звесткі аб памеры прычыненай шкоды, а таксама іншыя звесткі, неабходныя для яе выканання. Просьба органа замежнай дзяржавы павінна быць пададзена ў пісьмовай форме, заверана подпісам яго службовай асобы і змацавана гербавай пячаткай органа замежнай дзяржавы.

Артыкул 470. Агульная ўмова аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці

Агульнай умовай аказання міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці з'яўляецца наяўнасць:

1) заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, які вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў;

2) пісьмовага абавязацельства органа замежнай дзяржавы аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці;

3) пісьмовага абавязацельства органа замежнай дзяржавы аб захаванні ўмоў, прадугледжаных адпаведна артыкуламі 471–480 гэтага Кодэкса;

4) іншых дакументаў і матэрыялаў, неабходных для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы;

5) заверанага пісьмовага перакладу на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь просьбы органа замежнай дзяржавы і дададзеных да яе дакументаў і матэрыялаў, указаных у пунктах 1–4 гэтага артыкула.

Артыкул 471. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкліку асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкліку асобы ў замежную дзяржаву для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці пацярпелай, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўніка, сведкі, эксперта, можа быць выканана пры наяўнасці заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, які вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў, а таксама калі орган замежнай дзяржавы падасць пісьмовыя абавязацельствы, што асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба:

1) не будзе прыцягнута ў гэтай замежнай дзяржаве да крымінальнай, адміністрацыйнай, грамадзянска-прававой адказнасці, затрымана, узята пад варту ці падвергнута пакаранню ў сувязі з яе паказаннямі ці заключэннямі або за дзеянне, учыненае ім да перасячэння дзяржаўнай мяжы гэтай замежнай дзяржавы;

2) атрымае пакрыццё расходаў, звязаных з яе выклікам, у парадку, указаным органам замежнай дзяржавы.

2. Пісьмовае абавязацельства органа замежнай дзяржавы, прадугледжанае пунктам 1 часткі 1 гэтага артыкула, не выконваецца, калі асоба, якая прыбыла на выклік органа замежнай дзяржавы на тэрыторыю замежнай дзяржавы і мае магчымасць яе пакінуць, на працягу трыццаці сутак пасля атрымання афіцыйнага паведамлення аб тым, што яе прысутнасці больш не патрабуецца, не пакінула тэрыторыю гэтай замежнай дзяржавы ці калі такая асоба, пакінуўшы замежную дзяржаву, добраахвотна вярнулася на яе тэрыторыю. У гэты тэрмін не залічваецца час, на працягу якога асоба з-за не залежных ад яе абставін не магла пакінуць тэрыторыю замежнай дзяржавы.

Артыкул 472. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, можа быць выканана пры наяўнасці заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, які вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў, а таксама калі орган замежнай

дзяржавы падасць пісьмовыя абавязацельствы, што асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба:

1) будзе ўтрымлівацца пад вартай і будзе вернута ў Рэспубліку Беларусь у тэрмін, устаноўлены Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам;

2) не будзе прыцягнута ў гэтай замежнай дзяржаве да крымінальнай, адміністрацыйнай, грамадзянска-прававой адказнасці ці падвергнута пакаранню ў сувязі з яе паказаннямі або за дзеянне, учыненае ей да перасячэння дзяржаўнай мяжы гэтай замежнай дзяржавы;

3) будзе вызвалена з-пад варты і атрымае магчымасць бесперашкодна вярнуцца ў Рэспубліку Беларусь у выпадку, калі Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь паведаміць органу замежнай дзяржавы, што перададзеная на час асоба адбыла пакаранне ці вызвалена ад пакарання;

4) у выпадку, прадугледжаным пунктам 3 гэтай часткі, атрымае пакрыццё расходаў, звязаных з яе знаходжаннем на тэрыторыі замежнай дзяржавы і вяртаннем у Рэспубліку Беларусь, у парадку, указаным органам замежнай дзяржавы.

2. Пісьмовае абавязацельства органа замежнай дзяржавы, прадугледжанае пунктам 2 часткі 1 гэтага артыкула, не выконваецца, калі асоба, перададзеная на час замежнай дзяржаве, вызвалена з-пад варты і мае магчымасць пакінуць яе тэрыторыю, на працягу трыццаці сутак пасля атрымання афіцыйнага паведамлення аб тым, што яе прысутнасці больш не патрабуецца, не пакінула тэрыторыю гэтай замежнай дзяржавы ці калі такая асоба, пакінуўшы замежную дзяржаву, добраахвотна вярнулася на яе тэрыторыю. У гэты тэрмін не залічваецца час, на працягу якога асоба па незалежных ад яе абставінах не магла пакінуць тэрыторыю замежнай дзяржавы.

Артыкул 473. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы для адбывання пакарання

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы, асуджанай да пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для адбывання пакарання на яе тэрыторыі, можа быць выкананая, калі:

1) у адносінах да гэтай асобы ёсць прыгавор суда Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у законную сілу;

2) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, з'яўляецца грамадзянінам гэтай замежнай дзяржавы;

3) ёсць згода асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі гэтай замежнай дзяржавы;

4) ёсць пісьмовае абавязацельства органа замежнай дзяржавы аб выкананні прыгавору суда Рэспублікі Беларусь;

5) на момант атрымання такой просьбы гэтай асобе засталося адбываць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не менш чым шэсць месяцаў.

Артыкул 474. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб прымяненні да асобы меры стрымання з мэтай выдачы

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб прымяненні да асобы меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту з мэтай яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, можа быць выканана пры наяўнасці:

1) заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, што вядзе крымінальны працэс, аб прымяненні да гэтай асобы меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ці заверанай копіі судовага рашэння замежнай дзяржавы, якое ўступіла ў законную сілу, па крымінальнай справе аб прызначэнні ёй пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі;

2) пісьмовага абавязацельства органа замежнай дзяржавы аб наступнай падачы просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы гэтай асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання.

Артыкул 475. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, можа быць выканана пры наяўнасці заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, які вядзе крымінальны працэс, аб прымяненні да гэтай асобы меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ці заверанай копіі судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе, якое ўступіла ў законную сілу, аб прызначэнні ёй пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама калі орган замежнай дзяржавы падасць пісьмовыя абавязацельствы, што асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба:

1) не будзе падвяргацца без адпаведнага рашэння Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка ў гэтай замежнай дзяржаве крымінальнаму пераследаванню і (ці) не будзе асуджана або затрымана ў мэтах адбывання пакарання за злачынства, учыненае ёй да перасячэння дзяржаўнай мяжы гэтай замежнай дзяржавы, за выключэннем злачынства, якое паслужыла падставай для такой просьбы;

2) не будзе выдадзена ці перададзена трэцяй дзяржаве без адпаведнага рашэння Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка;

3) зможа свабодна пакінуць тэрыторыю гэтай замежнай дзяржавы пасля спынення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання або вызвалення ад пакарання.

2. Пісьмовыя абавязацельствы органа замежнай дзяржавы, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 часткі 1 гэтага артыкула, не выконваюцца, калі асоба, выдадзеная замежнай дзяржаве, якая знаходзіцца на тэрыторыі гэтай замежнай дзяржавы і мае магчымасць яе пакінуць, на працягу сарака пяці сутак пасля спынення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання або вызвалення ад пакарання не пакінула тэрыторыю гэтай замежнай дзяржавы ці калі такая асоба, пакінуўшы замежную дзяржаву, добраахвотна вярнулася на яе тэрыторыю. У гэты тэрмін не залічваецца час, на працягу якога асоба па незалежных ад яе абставінах не магла пакінуць тэрыторыю замежнай дзяржавы.

Артыкул 476. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, можа быць выкананая, калі адтэрміноўка выдачы асобы можа пацягнуць за сабой сканчэнне тэрміну даўнасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці ці ўскладніць расследаванне злачынства, пры наяўнасці пісьмовых абавязацельстваў органа замежнай дзяржавы, што асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба:

1) будзе ўтрымлівацца пад вартай і будзе вернута ў Рэспубліку Беларусь у тэрмін, устаноўлены Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам і не перавышае трох месяцаў;

2) не будзе падвяргацца без адпаведнага рашэння Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка ў гэтай замежнай дзяржаве крымінальнаму пераследаванню, за выключэннем злачынства, якое паслужыла падставай для такой

просьбы, а таксама не будзе асуджана або затрымана ў мэтах адбывання пакарання за злачынства, учыненае ім да перасячэння дзяржаўнай мяжы гэтай замежнай дзяржавы.

2. Па просьбе органа замежнай дзяржавы тэрмін, указаны ў пункце 1 часткі 1 гэтага артыкула, можа быць прадоўжаны Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам.

Артыкул 477. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы, можа быць выкананая, калі пададзены матэрыялы крымінальнай справы ці іх завераныя копіі, а таксама іх завераны пісьмовы пераклад на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь, прадметы, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншыя прадметы і дакументы, якія могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або абвяржэнні абвінавачання, заявы пацярпелых ці іх прадстаўнікоў аб ажыццяўленні крымінальнага пераследавання (пры іх наяўнасці) і звесткі аб пакрыцці шкоды, прычыненай злачынствам (пры наяўнасці такіх звестак).

Артыкул 478. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе ў адносінах да асобы, якая адбывае пакаранне на тэрыторыі замежнай дзяржавы, можа быць выканана, калі:

1) ёсць завераная копія судовага рашэння замежнай дзяржавы, што ўступіла ў законную сілу, па крымінальнай справе аб прызначэнні пакарання асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, і інфармацыя аб адбытай частцы пакарання;

2) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

3) ёсць згода асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на адбыванне пакарання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

4) на момант атрымання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, засталося адбываць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не менш за шэсць месяцаў;

5) дзеянне, учыненае асобай, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, з'яўляецца злачынствам у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 479. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы асобы

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь асобы, у дачыненні да якой прынята рашэнне органа іншай замежнай дзяржавы аб яе перадачы на час гэтай замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, або аб перадачы для адбывання пакарання ў дзяржаве, грамадзянінам якой яна з'яўляецца, або аб яе выдачы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, або аб выдачы на час для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, можа быць выканана пры наяўнасці заверанай копіі адпаведнага рашэння органа замежнай дзяржавы.

2. У выпадку ажыццяўлення транзітнай перавозкі асобы, указанай у частцы 1 гэтага артыкула, праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь паветраным транспартам без

пасадкі на яе тэрыторыі просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы асобы, не падаецца.

Артыкул 480. Умовы выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў, што служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншых прадметаў і дакументаў, якія могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або абвяржэнні абвінавачання, можа быць выканана пры наяўнасці заверанай копіі рашэння органа замежнай дзяржавы, які вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў, а таксама калі орган замежнай дзяржавы падасць пісьмовыя абавязацельствы, што:

1) гэтыя прадметы будуць бязвыплатна вернуты на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь у тэрмін, устаноўлены Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам, або пасля заканчэння вядзення па крымінальнай справе са згоды Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка будуць бязвыплатна перададзены непасрэдна асобам, якія маюць права на гэтыя прадметы, калі яны не адмовяцца іх прыняць;

2) правы трэціх асоб на гэтыя прадметы будуць захаваны.

ГЛАВА 51
ПАДСТАВЫ ДЛЯ АДМОВЫ Ў АКАЗАННІ І АДТЭРМІНОЎКІ АКАЗАННЯ МІЖНАРОДНАЙ ПРАВАВОЙ ДАПАМОГІ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ НА АСНОВЕ ПРЫНЦЫПУ ЎЗАЕМНАСЦІ

Артыкул 481. Агульныя падставы для адмовы ў аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці

Міжнародная прававая дапамога па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці не аказваецца, калі:

1) аказанне такой дапамогі можа нанесці ўрон суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспецы, правам і свабодам грамадзян або супярэчыць заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь;

2) дзеянне, у сувязі з якім паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, не з'яўляецца злачынствам у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь;

3) не захаваны ўмовы, прадугледжаныя главой 50 гэтага Кодэкса;

4) замежная дзяржава не захоўвае прынцып узаемнасці.

Артыкул 482. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, не выконваецца, калі:

1) адсутнічае згода асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на яе перадачу на час замежнай дзяржаве;

2) неабходна прысутнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, па крымінальнай справе, што знаходзіцца ў вядзенні органа, які вядзе крымінальны працэс;

3) перадача на час замежнай дзяржаве асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, можа пацягнуць за сабой парушэнне ўстаноўленых тэрмінаў адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.

Артыкул 483. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы для адбывання пакарання

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы, якая была асуджана да пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і з’яўляецца грамадзянінам гэтай замежнай дзяржавы, замежнай дзяржаве для адбывання пакарання на яе тэрыторыі, не выконваецца, калі:

1) ні адно з дзеянняў, якія пацягнулі за сабой пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, не прызнаецца злачынствам па крымінальным заканадаўстве гэтай замежнай дзяржавы;

2) пакаранне не можа быць выканана ў гэтай замежнай дзяржаве з прычыны сканчэння тэрміну даўнасці ці на іншай падставе, прадугледжанай заканадаўствам гэтай дзяржавы;

3) не пакрыта шкода, прычыненая злачынствам, учыненым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 484. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, не выконваецца, калі:

1) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

2) асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, дадзены статус бежанца, дадатковая абарона, прыстанішча ці часовая абарона ў Рэспубліцы Беларусь і яна не можа быць выдварана за межы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

3) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, не падлягае прыцягненню да крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь або вызвалена ад крымінальнай адказнасці ці адбывання пакарання за злачынства, якое паслужыла падставай для гэтай просьбы, у сувязі з прыняццем (выданнем) прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб амністыі ці аб памілаванні;

4) мэтамі гэтай просьбы з'яўляюцца крымінальнае пераследаванне ці пакаранне асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, па прыкмеце расы, полу, веравызнання, грамадзянства, нацыянальнасці, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы ці палітычных перакананняў;

5) дзеянне, ва ўчыненні якога абвінавачваецца асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, ці за якое яна асуджана, з'яўляецца воінскім злачынствам;

6) за злачынства, якое паслужыла падставай для гэтай просьбы, у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь ці крымінальным заканадаўствам замежнай дзяржавы прадугледжваюцца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін, меншы за адзін год, або больш мяккае пакаранне;

7) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, прыгаворана ў замежнай дзяржаве да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін, меншы за шэсць

месяцаў, або калі тэрмін неадбытай ёй часткі пакарання складае менш за шэсць месяцаў;

8) у адносінах да гэтай асобы ёсць не адмененая пастанова органа крымінальнага пераследавання аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы ці аб спыненні крымінальнага пераследавання, вядзення па крымінальнай справе або прыгавор ці пастанова (прысуд) суда Рэспублікі Беларусь, які (якая) уступіла ў законную сілу, аб спыненні вядзення па крымінальнай справе па тым жа дзеянні, у сувязі з якім паступіла гэта просьба;

9) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, адбыла пакаранне ці да яе былі прыменены іншыя меры крымінальнай адказнасці за злачынства, якое паслужыла падставай для гэтай просьбы;

10) у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь ці крымінальным заканадаўствам замежнай дзяржавы скончыўся тэрмін даўнасці прыцягнення асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, да крымінальнай адказнасці ці выканання ў адносінах да яе абвінаваўчага прыгавору;

11) за злачынства, якое паслужыла падставай для гэтай просьбы, у адпаведнасці з крымінальным заканадаўствам замежнай дзяржавы прадугледжваецца пакаранне ў выглядзе пакарання смерцю, а ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь пакаранне ў выглядзе пакарання смерцю не прадугледжваецца і калі орган замежнай дзяржавы не падаў пісьмовага абавязацельства, што смяротны прыгавор не будзе вынесены ці ў выпадку яго вынясення не будзе прыведзены ў выкананне;

12) ёсць судовае рашэнне Рэспублікі Беларусь, якое ўступіла ў законную сілу, аб прызнанні пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання незаконнай, яе адмене, адмене меры стрымання і вызваленні асобы;

13) крымінальнае пераследаванне асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, распачынаецца ў парадку прыватнага абвінавачання;

14) адсутнічае згода замежнай дзяржавы на выдачу асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, іншай замежнай дзяржаве ў выпадку, калі гэта асоба была выдадзена Рэспубліцы Беларусь па просьбе органа, які вядзе крымінальны працэс;

15) дзеянне, у сувязі з якім паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, учынена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці супраць інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

2. У выдачы асобы, у дачыненні да якой паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, можа быць адмоўлена, калі:

1) у Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца крымінальнае пераследаванне асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, за тое ж дзеянне, у сувязі з якім паступіла гэта просьба;

2) ёсць просьбы органаў некалькіх замежных дзяржаў, якія змяшчаюць палажэнні аб выдачы адной і той жа асобы, і калі гэта асоба выдадзена ці будзе выдадзена іншай замежнай дзяржаве;

3) орган замежнай дзяржавы ў выпадках, прадугледжаных часткамі 1 і 2 артыкула 502 гэтага Кодэкса, не прыняў асобу, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання.

Артыкул 485. Падставы для адтэрміноўкі выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання

Выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, у выпадках, калі ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца крымінальнае пераследаванне гэтай асобы ці калі гэта асоба адбывае пакаранне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць адтэрмінавана да спынення крымінальнага пераследавання гэтай асобы, прывядзення прыгавору ў выкананне, адбыцця пакарання або вызвалення ад яго, аб чым паведамляецца органу замежнай дзяржавы. Пасля спынення крымінальнага пераследавання гэтай асобы, прывядзення прыгавору ў выкананне, адбыцця пакарання або вызвалення ад яго такая просьба разглядаецца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

Артыкул 486. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, не выконваецца пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 484 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, калі выдача на час асобы замежнай дзяржаве можа пацягнуць за сабой парушэнне ўстаноўленых тэрмінаў адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.

Артыкул 487. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы, не выконваецца, калі:

1) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, не падлягае прыцягненню да крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь або вызвалена ад крымінальнай адказнасці ці адбывання пакарання за злачынства, якое паслужыла падставай для гэтай просьбы, у сувязі з прыняццем (выданнем) прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб амністыі ці аб памілаванні;

2) у адносінах да гэтай асобы ёсць не адмененая пастанова органа крымінальнага пераследавання аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы ці аб спыненні крымінальнага пераследавання, вядзення па крымінальнай справе або прыгавор ці пастанова (прысуд) суда Рэспублікі Беларусь, які (якая) уступіла ў законную сілу, аб спыненні вядзення па крымінальнай справе па тым жа дзеянні, у сувязі з якім паступіла гэта просьба;

3) у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь ці крымінальным заканадаўствам замежнай дзяржавы скончыўся тэрмін даўнасці прыцягнення асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, да крымінальнай адказнасці;

4) не пададзены матэрыялы крымінальнай справы ці іх завераныя копіі, а таксама іх завераны пісьмовы пераклад на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 488. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе ў адносінах да асобы, якая адбывае пакаранне на тэрыторыі замежнай дзяржавы, не выконваецца, калі:

1) адсутнічаюць судовае рашэнне замежнай дзяржавы, якое ўступіла ў законную сілу, па крымінальнай справе аб прызначэнні пакарання асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, і інфармацыя аб адбытай частцы пакарання;

2) адсутнічае згода асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на адбыванне пакарання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3) у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь ці крымінальным заканадаўствам замежнай дзяржавы скончыўся тэрмін даўнасці прыцягнення асобы, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, да крымінальнай адказнасці ці выканання ў дачыненні да яе абвінаваўчага прыгавору;

4) у Рэспубліцы Беларусь асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, прыцягнута да крымінальнай адказнасці або вызвалена ад крымінальнай адказнасці ці ў дачыненні да яе спынены крымінальнае пераследаванне, вядзенне па крымінальнай справе па тым жа дзеянні, у сувязі з якім паступіла гэта просьба;

5) Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь не прадугледжаны від пакарання, прызначаны судовым рашэннем замежнай дзяржавы;

6) на момант атрымання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, засталося адбываць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі менш за шэсць месяцаў;

7) асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, не падлягае крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 489. Падставы для адмовы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы асобы

Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб транзітнай перавозцы праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь асобы, у дачыненні да якой прынята рашэнне органа іншай замежнай дзяржавы аб яе перадачы на час гэтай замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, або аб перадачы для адбывання пакарання ў дзяржаве, грамадзянінам якой яна з'яўляецца, або аб яе выдачы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, або аб выдачы на час для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, не выконваецца пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 484 гэтага Кодэкса.

Артыкул 490. Падставы для адмовы ці адтэрміноўкі выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў

1. Просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншых прадметаў і дакументаў, якія могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або абвяржэнні абвінавачання, не выконваецца, калі не пададзены завераная копія рашэння органа замежнай дзяржавы, якая вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў, а таксама пісьмовыя абавязацельствы, прадугледжаныя артыкулам 480 гэтага Кодэкса.

2. Выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншых прадметаў і дакументаў, якія могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або

абвяржэнні абвінавачання, можа быць адтэрмінавана да заканчэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вядзення па крымінальнай справе, па якой яны з'яўляюцца рэчыўнымі доказамі.

ГЛАВА 52
ПАТРАБАВАННІ ДА ПРОСЬБЫ ОРГАНА, ЯКІ ВЯДЗЕ КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС, ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ, ЯКІЯ ДАДАЮЦЦА ДА ЯЕ. ПАРАДАК НАКІРАВАННЯ ПРОСЬБАЎ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ВЯДУЦЬ КРЫМІНАЛЬНЫ ПРАЦЭС

Артыкул 491. Форма і змест просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс

1. Просьба органа, які вядзе крымінальны працэс, складаецца ў пісьмовай форме на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь, завяраецца подпісам службовай асобы, якая яе склала, і змацоўваецца гербавай пячаткай органа, які вядзе крымінальны працэс.

2. У просьбе органа, які вядзе крымінальны працэс, указваюцца:

1) найменне органа, які вядзе крымінальны працэс і склаў просьбу;

2) найменне органа замежнай дзяржавы, якому яна накіроўваецца;

3) звесткі аб крымінальнай справе, аб фактычных абставінах і прававой кваліфікацыі дзеяння, тэкст палажэнняў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якімі прадугледжваецца адказнасць за гэта дзеянне, а таксама звесткі аб памеры прычыненай шкоды;

4) прозвішча, імя і імя па бацьку фізічнай асобы, дата яе нараджэння, грамадзянства, род заняткаў, месца жыхарства, месца знаходжання і іншыя даныя аб фізічнай асобе або найменне юрыдычнай асобы, яе месца знаходжання і іншыя даныя аб юрыдычнай асобе, у дачыненні да якой яна накіроўваецца;

5) палажэнні аб сутнасці просьбы, іншыя звесткі, неабходныя для яе выканання ці з падачай якіх замежная дзяржава звязвае аказанне міжнароднай прававой дапамогі.

3. У просьбе органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выкліку ў Рэспубліку Беларусь асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўніка, сведкі, эксперта, указваецца парадак пакрыцця расходаў, звязаных з яе выклікам.

4. Просьба органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, складаецца ў выпадках, калі:

1) дзеянне, ва ўчыненні якога абвінавачваецца асоба, у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь прызнаецца злачынствам, за ўчыненне якога прадугледжваюцца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін, не меншы за адзін год, або больш строгае пакаранне;

2) у адпаведнасці з прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, такая асоба асуджана да пазбаўлення волі на тэрмін, не меншы за шэсць месяцаў, або неадбытая ёй частка пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі складае не менш за шэсць месяцаў.

Артыкул 492. Дакументы і матэрыялы, якія дадаюцца да просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс

1. Да просьбы органа, што вядзе крымінальны працэс, дадаюцца пастанова органа, які вядзе крымінальны працэс, аб правядзенні адпаведных працэсуальных дзеянняў, іншыя дакументы і матэрыялы, неабходныя для яе выканання, дакументы, з падачай якіх замежная дзяржава звязвае аказанне міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці, ці іх завераныя копіі, а таксама завераны пісьмовы пераклад гэтай просьбы, іншых дакументаў і матэрыялаў, якія дадаюцца да яе, на дзяржаўную мову замежнай дзяржавы, якой яна накіроўваецца. Па ўзаемнай дамове паміж Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўным

Судом Рэспублікі Беларусь і органам замежнай дзяржавы пераклад указаных дакументаў можа быць ажыццёўлены на іншую мову.

2. Да просьбы органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы, падазраванай ці абвінавачанай ва ўчыненні злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або якая была асуджана ў Рэспубліцы Беларусь і знаходзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы, для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, дадаюцца завераныя копіі пастаноў органа, які вядзе крымінальны працэс, аб узяцці пад варту такой асобы і аб прыцягненні яе ў якасці абвінавачанага; для адбывання пакарання – завераная копія ўступіўшага ў законную сілу прыгавору аб прызначэнні гэтай асобе пакарання; калі асуджаны адбыў частку пакарання, – інфармацыя аб адбытай частцы пакарання.

3. Да просьбы органа крымінальнага пераследавання, якая змяшчае палажэнне аб крымінальным пераследаванні асобы, падазраванай ці абвінавачанай ва ўчыненні злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і якая знаходзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы , дадаюцца завераныя копіі матэрыялаў крымінальнай справы.

4. Да просьбы суда аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальнай справе на аснове прынцыпу ўзаемнасці (далей – просьба суда), якая змяшчае палажэнне аб выкананні прыгавору па крымінальнай справе, дадаюцца завераная копія прыгавору, што ўступіў у законную сілу; калі асуджаны адбыў частку пакарання ці да яго былі прыменены іншыя меры крымінальнай адказнасці, – інфармацыя аб адбытай частцы пакарання ці аб прымяненні іншых мер крымінальнай адказнасці.

Артыкул 493. Парадак накіравання просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс

Просьба органа, што вядзе крымінальны працэс, а таксама дакументы і матэрыялы, якія дадаюцца да яе, накіроўваюцца для прыняцця рашэння ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь ці ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь з улікам палажэнняў артыкула 494 гэтага Кодэкса.

ГЛАВА 53
КАМПЕТЭНЦЫЯ ГЕНЕРАЛЬНАЙ ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ВЯРХОЎНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА АКАЗАННІ МІЖНАРОДНАЙ ПРАВАВОЙ ДАПАМОГІ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ НА АСНОВЕ ПРЫНЦЫПУ ЎЗАЕМНАСЦІ

Артыкул 494. Паўнамоцтвы Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці

1. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні па просьбах органаў замежных дзяржаў і просьбах органаў крымінальнага пераследавання, якія змяшчаюць палажэнні аб:

1) уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальных справах;

2) выкліку асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўніка, сведкі, эксперта;

3) перадачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага;

4) перадачы асобы, асуджанай да пазбаўлення волі, для адбывання пакарання ў дзяржаве, грамадзянінам якой яна з'яўляецца;

5) прымяненні да асобы меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту з мэтай яе выдачы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання;

6) прыняцці мер для выяўлення месцазнаходжання асобы, падазраванай ці абвінавачанай ва ўчыненні злачынства або асуджанага, а таксама асобы, якая прапала без вестак;

7) выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання;

8) выдачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага;

9) крымінальным пераследаванні асобы;

10) транзітнай перавозцы асобы, у дачыненні да якой прынята рашэнне аб яе перадачы на час для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, або аб перадачы для адбывання пакарання ў дзяржаве, грамадзянінам якой яна з'яўляецца, або аб яе выдачы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, або аб выдачы на час для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага;

11) перадачы прадметаў, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншых прадметаў і дакументаў, што могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або абвяржэнні абвінавачання;

12) правядзення іншых працэсуальных дзеянняў.

2. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь прымае рашэнні па просьбах органаў замежных дзяржаў і просьбах судоў, якія змяшчаюць палажэнні аб:

1) уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў вядзенні судоў;

2) выкананні судовых рашэнняў па крымінальных справах.

3. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь прыкладаюць да просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс, пісьмовае абавязацельства ад імя Рэспублікі Беларусь аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі па крымінальных справах на аснове прынцыпу ўзаемнасці, а таксама пры неабходнасці ў залежнасці ад зместу просьбы – абавязацельствы аб захаванні ўмоў, аналагічных умовам, прадугледжаным адпаведна артыкуламі 471–480 гэтага Кодэкса.

4. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь прыкладае да просьбы органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, пісьмовае абавязацельства ад імя Рэспублікі Беларусь аб непрымяненні пакарання смерцю да асобы, у дачыненні да якой накіроўваецца просьба, калі орган замежнай дзяржавы звязвае выкананне гэтай просьбы з падачай такога абавязацельства.

5. Калі орган замежнай дзяржавы, якому накіравана просьба аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання ці адбывання пакарання, звязвае яе выкананне з падачай пэўных абавязацельстваў, Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь прыкладае да просьбы аб выдачы такія абавязацельствы, калі яны не супярэчаць заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 495. Парадак прыняцця рашэння па просьбе органа замежнай дзяржавы

1. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікі, разгледзеўшы просьбу органа замежнай дзяржавы, яго пісьмовыя абавязацельствы, іншыя дакументы і матэрыялы, неабходныя для яе выканання, прымаюць адно з наступных матываваных рашэнняў:

1) аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы;

2) аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы ў пэўнай частцы;

3) аб адтэрміноўцы ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы;

4) аб адмове ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы.

2. У рашэннях, прадугледжаных пунктамі 1 і 2 часткі 1 гэтага артыкула, указваюцца орган (органы) крымінальнага пераследавання ці суд (суды), якім даручаецца выкананне ці арганізацыя выканання просьбы органа замежнай дзяржавы (пэўнай часткі просьбы), палажэнні просьбы, якія падлягаюць выкананню, тэрміны выканання і іншыя звесткі, неабходныя для выканання.

3. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці яго намеснік прымаюць рашэнне па просьбе органа замежнай дзяржавы ў форме даручэння ці пастановы. Рашэнні, прадугледжаныя пунктамі 1–3 часткі 1 гэтага артыкула, прымаюцца ў форме даручэнняў. Рашэнні аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, а таксама рашэнне, прадугледжанае пунктам 4 часткі 1 гэтага артыкула, прымаюцца ў форме пастаноў.

4. Копія пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага ўручаецца ўказанай у пастанове асобе на працягу 24 гадзін з моманту вынясення адпаведнай пастановы.

5. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці яго намеснік прымаюць рашэнні па просьбах органаў замежных дзяржаў у форме пастаноў.

6. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь паведамляюць органу замежнай дзяржавы, які накіраваў просьбу, аб рашэнні, прынятым па яго просьбе. Калі прынята пастанова аб адмове ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь паведамляюць органу замежнай дзяржавы, які накіраваў просьбу, аб абставінах, якія перашкаджаюць яе выкананню.

Артыкул 496. Парадак прыняцця рашэння аб накіраванні просьбы органа, які вядзе крымінальны працэс, і яго выканання

1. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь, Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікі ў межах сваёй кампетэнцыі разглядаюць просьбу органа, які вядзе крымінальны працэс, і прымаюць рашэнне ў форме пастаноў аб накіраванні ў орган замежнай дзяржавы гэтай просьбы або аб адмове ў яе накіраванні. Аб прынятым рашэнні паведамляецца органу, што вядзе крымінальны працэс, які накіраваў просьбу.

2. Калі орган замежнай дзяржавы, якому накіравана просьба органа, што вядзе крымінальны працэс, звязвае яе выкананне з неабходнасцю выканання якіх-небудзь дадатковых умоў або падачай іншых дакументаў, такія ўмовы могуць быць выкананы або дакументы могуць быць пададзены па рашэнні Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікаў, калі гэта не супярэчыць заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь.

3. Пры накіраванні просьбы органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, органу замежнай дзяржавы паведамляецца, што калі ў ходзе судовага разбору кваліфікацыя злачынства, якое ставіцца ў віну, зменіцца, то асоба, у дачыненні да якой накіроўваецца просьба, можа быць асуджана толькі ў тым выпадку, калі злачынства па сваім новым складзе ўяўляе сабой злачынства, якое цягне за сабой выдачу асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання.

4. У накіраванні просьбы органа, што вядзе крымінальны працэс, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці)

адбывання пакарання, можа быць адмоўлена, калі цяжар і характар злачыннага дзеяння несувымерныя з выдаткамі, неабходнымі для выканання гэтай просьбы.

ГЛАВА 54
ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ПРОСЬБЫ ОРГАНА ЗАМЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Артыкул 497. Падстава для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы і парадак яе выканання

1. Падставай для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы з'яўляецца рашэнне Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікаў аб яе выкананні ці аб выкананні такой просьбы ў пэўнай частцы.

2. Просьба органа замежнай дзяржавы выконваецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам. Пры выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы можа быць прыменена працэсуальнае заканадаўства замежнай дзяржавы, калі гэта не супярэчыць заканадаўчым актам Рэспублікі Беларусь, а таксама могуць прысутнічаць прадстаўнікі органа замежнай дзяржавы і ўдзельнікі крымінальнага працэсу замежнай дзяржавы, калі аб гэтым указана ў рашэнні аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, прынятым Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь, Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці іх намеснікамі.

Артыкул 498. Парадак уручэння працэсуальных і іншых дакументаў на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальнай справе, уручае працэсуальныя і іншыя дакументы асобе, указанай у просьбе.

2. Аб уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальнай справе складаецца пратакол, у якім указваюцца месца, дата і спосаб іх уручэння, пасада, прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая ўручыла дакументы, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, іх якая атрымала. Пратакол падпісваецца гэтымі асобамі і змацоўваецца гербавай пячаткай органа, што вядзе крымінальны працэс, якому даручана выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы.

3. Працэсуальны ці іншы дакумент па крымінальнай справе, які не мае пісьмовага перакладу на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь або перакладзены на іншую мову, можа быць уручаны асобе з яе згоды. Калі асоба адмаўляецца прыняць такі працэсуальны ці іншы дакумент, орган, што вядзе крымінальны працэс, якому даручана выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы, накіроўвае ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь гэты дакумент і пратакол, складзены ў адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула, з указаннем у ім прычыны невыканання просьбы.

4. Калі органу, які вядзе крымінальны працэс і якому даручана выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы, што змяшчае палажэнне аб уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальнай справе, невядома месцазнаходжанне асобы, якой павінны быць уручаны такія дакументы, ён прымае меры для выяўлення месцазнаходжання гэтай асобы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

5. Калі ў тэрмін, вызначаны для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, што змяшчае палажэнне аб уручэнні працэсуальных і іншых дакументаў па крымінальнай справе, выявіць месцазнаходжанне асобы, якой яны павінны быць уручаны, акажацца немагчымым, орган, што вядзе крымінальны працэс, якому даручана выкананне такой просьбы, накіроўвае ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь ці Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь гэтыя дакументы з указаннем прычыны невыканання просьбы.

Артыкул 499. Парадак выкліку асобы ў замежную дзяржаву на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

1. Орган, які вядзе крымінальны працэс, на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, што змяшчае палажэнне аб выкліку асобы ў замежную дзяржаву для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўніка, сведкі, эксперта:

1) уручае выклік асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба;

2) растлумачвае асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, добраахвотнасць яе яўкі на выклік у замежную дзяржаву для ўдзелу ў працэсуальных дзеяннях на яе тэрыторыі, а таксама ўмовы, прадугледжаныя артыкулам 471 гэтага Кодэкса;

3) высвятляе, ці згодная асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на ўдзел у працэсуальных дзеяннях на тэрыторыі замежнай дзяржавы.

2. Аб уручэнні выкліку складаецца пратакол, у якім указваюцца месца, дата і спосаб яго ўручэння, пасада, прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая ўручыла выклік, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая яго атрымала, і звесткі аб дачы згоды або аб адмове ў дачы згоды на ўдзел гэтай асобы ў працэсуальных дзеяннях у якасці пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, іх прадстаўніка, сведкі, эксперта на тэрыторыі замежнай дзяржавы з указаннем прычыны адмовы. Пратакол падпісваецца гэтымі асобамі, змацоўваецца гербавай пячаткай органа, што вядзе крымінальны працэс, якому даручана выкананне просьбы органа замежнай дзяржавы, і накіроўваецца ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 500. Парадак перадачы на час асобы на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

1. У адпаведнасці з даручэннем аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, адміністрацыя папраўчай установы:

1) знаёміць асобу, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, з даручэннем аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, яе зместам, а таксама іншымі дакументамі і матэрыяламі, прыкладзенымі да яе, і ўручае ёй іх копіі;

2) растлумачвае асобе, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, добраахвотнасць яе перадачы на час замежнай дзяржаве для ўдзелу ў працэсуальных дзеяннях у якасці сведкі ці пацярпелага на яе тэрыторыі, а таксама ўмовы, прадугледжаныя артыкулам 472 гэтага Кодэкса;

3) паведамляе тэрмін, устаноўлены Генеральным пракурорам ці яго намеснікам, на які асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, можа быць перададзена;

4) высвятляе, ці згодная асоба, у дачыненні да якой паступіла такая просьба, на ўдзел у працэсуальных дзеяннях на тэрыторыі замежнай дзяржавы.

2. Аб выкананні даручэння, указанага ў абзацы першым часткі 1 гэтага артыкула, адміністрацыя папраўчай установы складае пратакол, у якім указваюцца месца і дата яго складання, пасада, прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая яго склала, а таксама прозвішча, імя і імя па бацьку асобы, у дачыненні да якой паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, і звесткі аб дачы згоды або аб адмове ў дачы згоды на ўдзел гэтай асобы ў працэсуальных дзеяннях у якасці сведкі ці пацярпелага на тэрыторыі замежнай дзяржавы з указаннем прычыны адмовы. Пратакол падпісваецца гэтымі асобамі, змацоўваецца гербавай пячаткай папраўчай установы і накіроўваецца ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь.

3. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь паведамляе органу замежнай дзяржавы, што накіраваў просьбу, якая змяшчае палажэнне аб перадачы на час асобы для правядзення на тэрыторыі замежнай дзяржавы працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, аб месцы, даце і часе перадачы органу замежнай дзяржавы гэтай асобы і забяспечвае яе дастаўку ў месца перадачы.

4. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь абавязаная паведаміць органу замежнай дзяржавы аб вызваленні з-пад варты асобы, перададзенай на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці сведкі ці пацярпелага, у выпадку адбыцця пакарання або вызвалення ад пакарання.

Артыкул 501. Парадак перадачы асобы для адбывання пакарання на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы асобы, асуджанай да пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для адбывання пакарання на тэрыторыі гэтай дзяржавы пры наяўнасці ўмоў, прадугледжаных артыкулам 473 гэтага Кодэкса, паведамляе органу замежнай дзяржавы, які накіраваў просьбу, аб месцы, даце і часе перадачы органу замежнай дзяржавы гэтай асобы і забяспечвае яе дастаўку ў месца перадачы.

Артыкул 502. Парадак выдачы асобы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання

1. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь на падставе пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання паведамляе органу замежнай дзяржавы, што накіраваў просьбу, якая змяшчае палажэнне аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, аб месцы, даце і часе перадачы органу замежнай дзяржавы гэтай асобы і забяспечвае яе дастаўку ў месца перадачы.

2. Па просьбе органа замежнай дзяржавы Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь могуць быць паўторна прызначаны месца, дата і час перадачы асобы, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, і забяспечана яе дастаўка ў месца перадачы, але не пазней чым за пятнаццаць сутак з першапачаткова прызначанай даты яе перадачы.

3. Калі орган замежнай дзяржавы ў выпадках, прадугледжаных часткамі 1 і 2 гэтага артыкула, не прыме асобу, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, гэта асоба вызваляецца з-пад варты.

Артыкул 503. Парадак выдачы на час асобы для правядзення працэсуальных дзеянняў

1. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь на падставе пастановы аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага паведамляе органу замежнай дзяржавы, што накіраваў просьбу, якая змяшчае палажэнне аб выдачы на час асобы, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, аб месцы,

даце і часе перадачы органу замежнай дзяржавы гэтай асобы і забяспечвае яе дастаўку ў месца перадачы.

2. Па просьбе органа замежнай дзяржавы Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь могуць быць паўторна прызначаны месца, дата і час перадачы асобы, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб яе выдачы на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, і забяспечана яе дастаўка ў месца перадачы, але не пазней чым за пятнаццаць сутак з першапачаткова прызначанай даты яе перадачы.

Артыкул 504. Парадак выканання судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе

1. Суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь на падставе пастановы Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выкананні судовага рашэння замежнай дзяржавы па крымінальнай справе, ці аб выкананні такой просьбы ў пэўнай частцы ў парадку, устаноўленым часткамі 1, 2, 7, 9 і 13 артыкула 402^2 гэтага Кодэкса, разглядае судовае рашэнне замежнай дзяржавы па крымінальнай справе і прызначае ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь такое ж пакаранне, якое ўказана ў судовым рашэнні замежнай дзяржавы. Пры гэтым суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь высвятляе асабістыя звесткі асобы, у дачыненні да якой паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, высвятляе даныя, указаныя ў частцы 1 артыкула 316 гэтага Кодэкса, і растлумачвае асобе яе права заявы адводу складу суда, сакратару судовага пасяджэння (сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі) і перакладчыку.

2. Заяўленыя адводы суд вырашае ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 79–81, 83, 84 і 87 гэтага Кодэкса.

3. Суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь апытвае асобу, у дачыненні да якой паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, ці ёсць у яе хадайніцтвы. Вырашэнне заяўленых хадайніцтваў праводзіцца ў адпаведнасці з часткамі 2 і 4 артыкула 322 гэтага Кодэкса.

4. Калі Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь за дзеянне прадугледжана пакаранне меншае, чым указана ў судовым рашэнні замежнай дзяржавы па крымінальнай справе, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь прызначае максімальнае пакаранне, прадугледжанае за ўчыненне такога дзеяння.

Артыкул 505. Парадак перадачы прадметаў на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

1. Орган крымінальнага пераследавання на падставе даручэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб перадачы прадметаў, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынных шляхам, або іншых прадметаў і дакументаў, якія могуць служыць сродкамі па выяўленні злачынства, высвятленні фактычных абставін крымінальнай справы, выяўленні вінаватых або абвяржэнні абвінавачання, ажыццяўляе ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса адабранне гэтых прадметаў, аглядае іх і перадае ў Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь разам з пратаколамі адпаведных працэсуальных дзеянняў.

2. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь перадае прадметы, якія служылі прыладамі і сродкамі ўчынення злачынства, ці захавалі на сабе сляды злачынства, ці здабыты злачынным шляхам, або іншыя прадметы і дакументы, якія могуць служыць сродкамі для выяўлення злачынства, высвятлення фактычных абставін крымінальнай

справы, выяўлення вінаватых або абвяржэння абвінавачання, органу замежнай дзяржавы, які накіраваў просьбу.

Артыкул 506. Парадак правядзення іншых працэсуальных дзеянняў на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

Іншыя працэсуальныя дзеянні на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, за выключэннем працэсуальных дзеянняў, указаных у артыкулах 498–505 гэтага Кодэкса, праводзяцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

ГЛАВА 55
ПРАВА І АБАВЯЗКІ АСОБЫ, ЗАТРЫМАНАЙ АБО ДА ЯКОЙ ПРЫМЕНЕНА МЕРА СТРЫМАННЯ НА ПАДСТАВЕ РАШЭННЯ АБ ВЫКАНАННІ ПРОСЬБЫ ОРГАНА ЗАМЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ АБО Ў СУВЯЗІ СА ЗНАХОДЖАННЕМ У МІЖНАРОДНЫМ ВЫШУКУ З МЭТАЙ ВЫДАЧЫ, І ЯЕ АБАРОНЦЫ

Артыкул 507. Правы і абавязкі асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы

1. Асоба, затрыманая або да якой прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, мае права:

1) ведаць аб абставінах, якія паслужылі падставай для яе затрымання або прымянення да яе меры стрымання;

2) неадкладна пасля затрымання або абвяшчэння пастановы аб прымяненні да яе меры стрымання атрымаць ад органа дазнання, што ажыццявіў затрыманне, або пракурора ці яго намесніка, якія прымянілі меру стрымання, пісьмовае паведамленне аб яе правах, прадугледжаных гэтым артыкулам, копіі пратакола і (ці) пастановы аб яе затрыманні або копію пастановы аб прымяненні да яе меры стрымання;

3) выказваць сваё меркаванне і даваць тлумачэнні;

4) паведаміць праз орган дазнання, што ажыццявіў затрыманне, або праз пракурора ці яго намесніка, якія прымянілі меру стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, членам сям'і ці блізкім сваякам аб месцы свайго ўтрымання пад вартай;

5) з моманту затрымання або прымянення меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту атрымаць юрыдычную кансультацыю адваката за кошт сродкаў мясцовага бюджэту;

6) на сустрэчы з членамі сям'і ці блізкімі сваякамі з дазволу Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь;

7) мець абаронцу ці некалькіх абаронцаў, адмовіцца ад абаронцы і абараняць сябе самастойна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы;

8) атрымліваць ад пракурора ці яго намесніка, якія прымянілі меру стрымання, паведамленні аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту;

9) абскардзіць у суд затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт ці прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту;

10) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

11) атрымаць з Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь копію пастановы аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання;

12) абскардзіць у суд пастанову аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання;

13) падаваць скаргі на дзеянні органа, які вядзе крымінальны працэс;

14) адклікаць пададзеную ёй або яе абаронцам скаргу.

2. Асоба, указаная ў абзацы першым часткі 1 гэтага артыкула, абавязана падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс.

3. Асоба, у дачыненні да якой вынесена пастанова аб яе выдачы на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, мае права:

1) мець абаронцу ці некалькіх абаронцаў, адмовіцца ад абаронцы і абараняць сябе самастойна, спыніць паўнамоцтвы свайго абаронцы;

2) карыстацца роднай мовай ці паслугамі перакладчыка;

3) атрымаць з Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь копію пастановы аб яе выдачы на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага;

4) абскардзіць у суд пастанову аб яе выдачы на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага.

Артыкул 508. Правы і абавязкі асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы

1. Асоба, затрыманая або да якой прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, мае правы, прадугледжаныя пунктамі 1–7, 10, 13 і 14 часткі 1 артыкула 507 гэтага Кодэкса, а таксама мае права:

1) атрымліваць ад пракурора ці яго намесніка, якія прымянілі меру стрымання, паведамленні аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай;

2) абскардзіць у суд затрыманне, узяцце пад варту ці прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай.

2. Асоба, указаная ў абзацы першым часткі 1 гэтага артыкула, абавязана падпарадкоўвацца законным распараджэнням органа, які вядзе крымінальны працэс.

Артыкул 509. Абаронца асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, яго правы і абавязкі

1. Абаронцам асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, з'яўляецца адвакат – грамадзянін Рэспублікі Беларусь або грамадзянін іншай дзяржавы ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Абаронца асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, мае права:

1) ведаць аб абставінах, якія паслужылі падставай для затрымання асобы, якая абараняецца ім, або прымянення да яе меры стрымання;

2) бесперашкодна размаўляць са сваім падабаронным сам-насам і канфідэнцыяльна без абмежавання колькасці і працягласці размоў;

3) знаёміцца з пратаколам і (ці) пастановай аб затрыманні асобы, якая абараняецца ім, або пастановай аб прымяненні да яе меры стрымання;

4) знаёміцца з копіяй пастановы аб выдачы асобы, якая абараняецца ім, замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час гэтай асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага;

5) падаваць скаргі на дзеянні органа, які вядзе крымінальны працэс;

6) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне асобы, якую ён абараняе ім, узяцце яе пад варту, хатні арышт, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту, а таксама абскардзіць прынятыя па іх рашэнні суда;

7) удзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на пастанову аб выдачы асобы, якую ён абараняе, замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці на пастанову аб выдачы на час гэтай асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага, а таксама абскардзіць прынятыя па іх рашэнні суда;

8) выказваць на судовым пасяджэнні меркаванні аб пытаннях, якія вырашае суд;

9) патрабаваць унясення ў пратакол судовага пасяджэння запісаў аб абставінах, якія, па яго меркаванні, павінны быць адзначаны;

10) адклікаць пададзеную ім або па даручэнні падабароннага пададзеную падабаронным скаргу.

3. Абаронца асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, мае правы, прадугледжаныя пунктамі 1–3, 5 і 8–10 часткі 2 гэтага артыкула, а таксама мае права ўдзельнічаць пры разглядзе судом скаргаў на затрыманне асобы, якую ён абараняе, узяцце яе пад варту, прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай і абскардзіць прынятыя па іх рашэнні суда.

4. Абаронца асобы, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы ці ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, абавязаны з'яўляцца на выклікі органа, што вядзе крымінальны працэс; пры немагчымасці яўкі – на працягу 24 гадзін паведаміць аб гэтым названаму органу. Пры адсутнасці магчымасці яўкі абаронцы на выклікі органа, што вядзе крымінальны працэс, асоба, затрыманая або да якой прыменена мера стрымання, ці гэты орган ва ўстаноўленым парадку запрашаюць іншага абаронцу.

ГЛАВА 56
ЗАТРЫМАННЕ АСОБЫ АБО ПРЫМЯНЕННЕ ДА ЯЕ МЕРЫ СТРЫМАННЯ НА ПАДСТАВЕ РАШЭННЯ АБ ВЫКАНАННІ ПРОСЬБЫ ОРГАНА ЗАМЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ АБО Ў СУВЯЗІ СА ЗНАХОДЖАННЕМ У МІЖНАРОДНЫМ ВЫШУКУ З МЭТАЙ ВЫДАЧЫ

Артыкул 510. Затрыманне асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы

1. Затрыманне асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы праводзіцца органам дазнання і не можа цягнуцца больш за 72 гадзіны з моманту фактычнага затрымання, пасля сканчэння якіх затрыманы павінен быць вызвалены з-пад варты або ў дачыненні да яго павінна быць прыменена мера стрымання, прадугледжаная гэтым Кодэксам.

2. Пасля дастаўлення ў орган дазнання асобы, затрыманай на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, службовай асоба, якая фактычна затрымала, складае пратакол, у якім указваюцца падстава, месца і час фактычнага затрымання (з указаннем гадзіны і хвілін), вынікі асабістага вобшуку, а таксама час складання пратакола. Пратакол абвяшчаецца затрыманаму. Пры гэтым яму растлумачваюцца правы, прадугледжаныя адпаведна артыкуламі 507 і 508 гэтага Кодэкса. Пратакол падпісваюць асоба, якая яго склала, і затрыманы.

3. Службовая асоба органа дазнання, куды дастаўлены затрыманы, на працягу трох гадзін з моманту фактычнага затрымання выносіць пастанову аб затрыманні, якая з'яўляецца прававой падставай для кароткачасовага ўтрымання пад вартай затрыманага, і на працягу 24 гадзін з моманту фактычнага затрымання паведамляе аб гэтым пракурору.

4. У пастанове аб затрыманні ўказваюцца:

1) прозвішча, імя, імя па бацьку затрыманага, дата яго нараджэння, грамадзянства, род заняткаў, месца жыхарства;

2) дакументы, на падставе якіх высветлена асоба затрыманага;

3) падставы затрымання;

4) злачынства, у сувязі з абвінавачаннем ва ўчыненні якога паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнні аб прымяненні да асобы меры стрымання з мэтай выдачы або аб яе выдачы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, або інфармацыя аб знаходжанні асобы ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы.

5. Пастанова аб затрыманні абвяшчаецца затрыманаму. Пры гэтым пад распіску яму ўручаецца копія пастановы.

Артыкул 511. Вызваленне асобы, затрыманай на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы

Асоба, затрыманая на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, падлягае вызваленню з-пад варты ў выпадку выяўлення абставін, якія з'яўляюцца падставамі для адмовы ў яе выдачы, па пастанове органа крымінальнага пераследавання, вынесенай на падставе пастановы Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка аб адмове ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы. У выпадку сканчэння тэрміну затрымання затрыманага вызваляе кіраўнік адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай з паведамленнем Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 512. Меры стрымання, якія прымяняюцца да асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, парадак іх прымянення, змянення і адмены

1. Да асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы прымяняецца мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту.

2. Да асобы, якая знаходзіцца ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы, прымяняецца мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

3. Пракурор ці яго намеснік да вынясення пастановы аб прымяненні да асобы, якая знаходзіцца ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы, меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту абавязаны ўзяць у яе тлумачэнне аб факце абвяшчэння яе ў міжнародны вышук з мэтай выдачы.

4. Аб прымяненні або змяненні меры стрымання да асобы на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, а таксама аб адмене меры стрымання да асобы на падставе пастановы Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка аб адмове ў выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы пракурор ці яго намеснік выносяць пастанову. Пастанова аб прымяненні, змяненні або адмене меры стрымання павінна быць матываванай і змяшчаць абгрунтаванне неабходнасці яе прымянення, змянення або адмены.

5. Пракурор ці яго намеснік абвяшчаюць асобе пастанову аб прымяненні або змяненні меры стрымання да яе на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа

замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, растлумачваюць парадак абскарджання пастановы і ўручаюць яе копію. Выкананне ўказаных дзеянняў зацвярджаецца подпісамі гэтай асобы і пракурора ці яго намесніка, якія вынеслі пастанову.

6. Пракурор ці яго намеснік, якія вынеслі на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы пастанову аб прымяненні да асобы меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, на працягу 24 гадзін з моманту яе вынясення апавяшчаюць аб гэтым Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь і паведамляюць у Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь аб прымяненні да гэтай асобы меры стрымання для апавяшчэння пасольства ці консульства дзяржавы, грамадзянінам якой яна з'яўляецца, а таксама апавяшчаюць аб гэтым сваякоў асобы, калі яны пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

7. Пракурор ці яго намеснік, што вынеслі пастанову аб прымяненні да асобы, якая знаходзіцца ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы, меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, на працягу 24 гадзін з моманту яе вынясення апавяшчаюць аб гэтым Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнае цэнтральнае бюро Інтэрпола і паведамляюць у Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь аб прымяненні да гэтай асобы меры стрымання для апавяшчэння пасольства ці консульства дзяржавы, грамадзянінам якой яна з'яўляецца, а таксама апавяшчаюць аб гэтым сваякоў асобы, калі яны пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

8. Парадак і ўмовы ўтрымання пад хатнім арыштам асобы, да якой на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы прыменена гэта мера стрымання, вызначаюцца часткамі 1–3 артыкула 125 гэтага Кодэкса. Мера стрымання ў выглядзе хатняга арышту пры парушэнні асобай ускладзеных на яе абавязкаў і ўстаноўленых для яе праваабмежаванняў можа быць зменена пракурорам ці яго намеснікам па месцы ўтрымання асобы пад хатнім арыштам на ўзяцце пад варту.

9. Парадак і ўмовы ўтрымання пад вартай асобы, узятай пад варту на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, вызначаюцца законам.

Артыкул 512[1]. Асаблівасці ўтрымання пад вартай

Рашэнне кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы аб узяцці асобы пад варту ці прызначэнні яму пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі з'яўляецца падставай для ўтрымання пад вартай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь асоб, якія:

1) транзітна перавозяцца па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

2) часова выдадзены Рэспубліцы Беларусь.

Артыкул 513. Тэрміны ўтрымання асобы пад вартай, хатнім арыштам і парадак іх прадаўжэння

1. Тэрмін утрымання пад вартай, хатнім арыштам асобы, да якой на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб прымяненні да яе меры стрымання з мэтай выдачы, прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту або да якой у сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, да падачы просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, не можа перавышаць сорак сутак з моманту яе затрымання.

2. Тэрмін утрымання пад вартай, хатнім арыштам асобы, да якой на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту, не можа перавышаць два месяцы з моманту яе затрымання.

3. Тэрмін утрымання пад вартай, хатнім арыштам асобы, указанай у частцы 2 гэтага артыкула, можа быць прадоўжаны на падставе матываванай пастановы:

1) да трох месяцаў – пракурорамі раёна, раёна ў горадзе, горада, міжраённымі і прыраўнаванымі да іх транспартнымі пракурорамі ці іх намеснікамі;

2) да шасці месяцаў – пракурорамі вобласці, горада Мінска ці іх намеснікамі;

3) да дванаццаці месяцаў – Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам.

Артыкул 514. Вызваленне асобы з-пад варты, хатняга арышту

1. Асоба, да якой на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту або да якой у сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, вызваляецца з-пад варты, хатняга арышту, калі:

1) паступіла паведамленне органа замежнай дзяржавы аб вызваленні гэтай асобы з-пад варты;

2) у Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь на працягу сарака сутак з моманту затрымання гэтай асобы не паступіла просьба органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання;

3) дадатковыя звесткі, неабходныя для выканання просьбы органа замежнай дзяржавы, якая змяшчае палажэнне аб выдачы гэтай асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання, запытаныя Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, не пададзены ў вызначаны тэрмін;

4) сталі вядомыя падставы для адмовы ў яе выдачы замежнай дзяржаве, прадугледжаныя гэтым Кодэксам;

5) ёсць пастанова суддзі аб вызваленні гэтай асобы з-пад варты, хатняга арышту, якая ўступіла ў законную сілу;

6) скончыўся тэрмін яе ўтрымання пад вартай, хатнім арыштам.

2. Асоба, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, падлягае вызваленню з-пад варты, хатняга арышту:

1) у выпадках, прадугледжаных пунктамі 1–4 часткі 1 гэтага артыкула, – па пастанове пракурора ці яго намесніка па месцы ўтрымання асобы пад вартай, хатнім арыштам, вынесенай на падставе рашэння Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь ці яго намесніка;

2) у выпадку, прадугледжаным пунктам 5 часткі 1 гэтага артыкула, – кіраўніком адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай асобы, калі асоба ўтрымліваецца пад вартай, або пракурорам ці яго намеснікам па месцы ўтрымання асобы пад хатнім арыштам;

3) у выпадку, прадугледжаным пунктам 6 часткі 1 гэтага артыкула, – пракурорам ці яго намеснікам па месцы ўтрымання асобы пад хатнім арыштам з вынясеннем пастановы або кіраўніком адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай асобы, калі асоба ўтрымліваецца пад вартай, з паведамленнем Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 57
АБСКАРДЖАННЕ РАШЭННЯЎ І ДЗЕЯННЯЎ, ЗВЯЗАНЫХ З АКАЗАННЕМ МІЖНАРОДНАЙ ПРАВАВОЙ ДАПАМОГІ ПА КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАВАХ. ПАКРЫЦЦЁ ШКОДЫ, ПРЫЧЫНЕНАЙ АСОБЕ

Артыкул 515. Парадак абскарджання пастаноў аб выдачы асобы замежнай дзяржаве і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве

1. Пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці

абвінавачанага на працягу дзесяці сутак з моманту атрымання копій гэтых пастаноў могуць быць абскарджаны асобамі, у дачыненні да якіх яны вынесены, ці іх абаронцамі ў абласны, Мінскі гарадскі суды па месцы знаходжання гэтых асоб.

2. Скарга на пастанову аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання падаецца праз адміністрацыю месца ўтрымання пад вартай асобы, а скарга на пастанову аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага – праз адміністрацыю папраўчай установы, якія на працягу 24 гадзін накіроўваюць скаргі ў адпаведны суд і паведамляюць аб гэтым Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

3. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь ці яго намеснік на працягу дзесяці сутак з дня паступлення паведамлення аб падачы скаргі на пастанову аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага падаюць у суд матэрыялы, якія пацвярджаюць законнасць прыняцця рашэння.

4. Падача скаргі на пастанову аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага цягне за сабой прыпыненне выканання адпаведнай пастановы.

Артыкул 516. Судовая праверка законнасці пастаноў аб выдачы асобы замежнай дзяржаве і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве

1. Судовая праверка законнасці пастаноў аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага праводзіцца не пазней за адзін месяц з дня паступлення скаргі ў суд аднаасобна суддзёй адпаведна абласнога, Мінскага гарадскога судоў на закрытым судовым пасяджэнні з удзелам пракурора і асобы, якая падала скаргу, і (ці) яе абаронцы.

2. У ходзе судовай праверкі судом не абмяркоўваюцца пытанні аб вінаватасці асобы, у дачыненні да якой вынесены пастановы аб яе выдачы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб яе выдачы на час замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага. Суд абмяжоўваецца праверкай адпаведнасці гэтаму Кодэксу вынесенай пастановы.

3. У пачатку судовага пасяджэння суддзя абвяшчае, якая скарга падлягае разгляду, прадстаўляецца ўдзельнікам судовага пасяджэння, прадстаўляе пракурора і сакратара судовага пасяджэння (сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі), растлумачвае ўдзельнікам судовага пасяджэння іх правы і абавязкі. Затым суддзя заслухоўвае асобу, якая падала скаргу, калі яна ўдзельнічае ў судовым пасяджэнні, яго абаронцу і пракурора.

4. Па выніках судовай праверкі законнасці пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага суддзя выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб прызнанні пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага законнай і аб пакіданні скаргі без задавальнення;

2) аб прызнанні пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання незаконнай, яе адмене, адмене меры стрымання і вызваленні асобы з-пад варты, хатняга арышту;

3) аб прызнанні пастановы аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага незаконнай і яе адмене.

5. Пастановы суддзі аб скаргах на пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання і аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага ўступаюць у законную сілу пасля сканчэння дзесяці сутак з моманту іх вынясення. На працягу гэтага тэрміну яны могуць быць апратэставаны пракурорам і (ці) абскарджаны асобай, якая падала скаргу, ці яе абаронцам у Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь. Прынясенне пратэсту і (ці) падача скаргі прыпыняюць выкананне пастановы суддзі.

6. Пратэст і (ці) скарга на пастанову суддзі падаюцца праз суддзю, які вынес пастанову.

7. Матэрыялы аб праверцы законнасці пастановы аб выдачы асобы замежнай дзяржаве для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання і (ці) адбывання пакарання ці аб выдачы на час асобы замежнай дзяржаве для правядзення працэсуальных дзеянняў з яе ўдзелам у якасці абвінавачанага разам з пратэстам і (ці) скаргай на пастанову суддзі на працягу 24 гадзін падлягаюць накіраванню ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

8. Пратэст і (ці) скарга на пастанову суддзі разглядаюцца аднаасобна суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь на закрытым судовым пасяджэнні не пазней чым за трое сутак з дня іх паступлення ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь з абавязковым удзелам пракурора.

9. Пастанова суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесеная аб пратэсце і (ці) скарзе на пастанову суддзі, з'яўляецца канчатковай.

10. Копіі пастановы суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесенай аб пратэсце і (ці) скарзе на пастанову суддзі, не пазней чым за 24 гадзіны накіроўваюцца асобе, якая падала скаргу, і пракурору.

Артыкул 517. Парадак абскарджання затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту

Затрыманне, узяцце пад варту, хатні арышт ці прадаўжэнне тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту абскарджвае асоба, затрыманая або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, ці яе абаронца ў парадку, устаноўленым артыкулам 143 гэтага Кодэкса.

Артыкул 518. Судовая праверка законнасці затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту

1. Судовая праверка законнасці затрымання, узяцця пад варту, хатняга арышту, праведзеных на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы ці ў сувязі са знаходжаннем асобы ў міжнародным вышуку з мэтай выдачы, ці прадаўжэння тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту праводзіцца ў парадку, прадугледжаным часткамі 1–4 артыкула 144 гэтага Кодэкса.

2. Па выніках судовай праверкі суддзя выносіць адну з наступных пастаноў:

1) аб вызваленні затрыманага, адмене меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту і вызваленні яго з-пад варты, хатняга арышту ў выпадку выяўлення неадпаведнасці гэтаму Кодэксу вынесенай пастановы аб затрыманні, прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, хатняга арышту ці аб прадаўжэнні тэрміну ўтрымання пад вартай, хатняга арышту або парушэння яго права на абарону;

2) аб пакіданні скаргі без задавальнення.

Артыкул 519. Пакрыццё шкоды, прычыненай асобе, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання

Пакрыццё шкоды, прычыненай асобе, затрыманай або да якой прыменена мера стрымання на падставе рашэння аб выкананні просьбы органа замежнай дзяржавы або ў сувязі са знаходжаннем у міжнародным вышуку з мэтай выдачы, незаконнымі дзеяннямі органа, які вядзе крымінальны працэс, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым главой 48 гэтага Кодэкса.

РАЗДЗЕЛ XVI
ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

ГЛАВА 58
ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 520. Парадак увядзення ў дзеянне гэтага Кодэкса

Гэты Кодэкс уводзіцца ў дзеянне спецыяльным законам.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь **А.Лукашэнка**

Дадатак

да Крымінальна-працэсуальнага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

Пералік маёмасці, на якую не можа быць накладзены арышт у мэтах забеспячэння пакрыцця ўрону (шкоды), прычыненай злачынствам, спагнання даходу, атрыманага злачынным шляхам, грамадзянскага іску, іншых маёмасных спагнанняў

1. Жылы дом, кватэра ці асобныя іх часткі, калі асоба, на маёмасць якой накладаецца арышт, і яе сям'я пастаянна ў іх пражываюць.

2. Зямельныя ўчасткі, на якіх размешчаны дом і гаспадарчыя пабудовы, а таксама зямельныя ўчасткі, неабходныя для вядзення сельскай ці падсобнай гаспадаркі.

3. Гаспадарчыя пабудовы і хатняя жывёла ў колькасці, неабходнай для задавальнення патрэбнасцей сям'і асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, а

таксама корм для жывёлы, калі асноўным заняткам асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, з'яўляецца сельская гаспадарка.

4. Насенне сельскагаспадарчых культур, неабходнае для чарговай сяўбы.

5. Прадметы хатняга абсталявання, начыння, адзення:

1) адзенне, абутак, бялізна, пасцельныя рэчы, кухоннае і сталовае начынне, якое было ў выкарыстанні (за выключэннем футравага і іншага каштоўнага адзення, сталовых сервізаў, прадметаў з каштоўных металаў, а таксама прадметаў, якія маюць мастацкую каштоўнасць);

2) мэбля, мінімальна неабходная для асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, і членаў яго сям'і;

3) усе дзіцячыя рэчы.

6. Прадукты харчавання ў колькасці, неабходнай для асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, і яе сям'і да новага ўраджаю, калі асноўным заняткам асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, з'яўляецца сельская гаспадарка, а ў астатніх выпадках – прадукты харчавання і грошы на агульную суму, роўную дзесяці базавым велічыням на асобу, на маёмасць якой накладаецца арышт, і кожнага з членаў яе сям'і.

7. Паліва, прызначанае для прыгатавання ежы і ацяплення жылога памяшкання сям'і асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт.

8. Інвентар (у тым ліку дапаможнікі і кнігі), неабходны для працягу прафесійных заняткаў асобы, на маёмасць якой накладаецца арышт, за выключэннем выпадкаў, калі інвентар выкарыстоўваўся для ўчынення злачынства.

9. Транспартныя сродкі, спецыяльна прызначаныя для перамяшчэння інвалідаў.

10. Міжнародныя і дзяржаўныя ўзнагароды і прызы, якімі ўзнагароджана асоба, на маёмасць якой накладаецца арышт, і члены яе сям'і.